2024

ACTA ALBARUTHENICA 24

Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego

Acta Albaruthenica

Rada Naukowa

Aleś Bielski (*Białoruski Uniwersytet Państwowy, Białoruś*)
Nina Barszczewska (*Uniwersytet Warszawski*, *Polska*)
Hienadź Cychun (*Narodowa Akademia Nauk Białorusi*, *Białoruś*)
Iryna Gaponenko (*Białoruski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Fernando Presa González (*Uniwersytet Complutense w Madrycie*, *Hiszpania*)
Bronisław Kodzis (*Uniwersytet Opolski*, *Polska*)
Oleg Łatyszonek (*Uniwersytet w Białymstoku*, *Polska*)
Aliaksandr Makarevich (*Mohylewski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Arnold McMillin (*Kolegium Uniwersyteckie w Londynie*, *Anglia*)
Anżeła Melnikava (*Homelski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Dorota Michaluk (*Uniwersytet Mikołaja Kopernika w Toruniu*, *Polska*)
Igor Nabytowycz (*Uniwersytet w Drohobyczu*, *Ukraina*)
Larysa Pisarek (*Uniwersytet Wrocławski*, *Polska*)
Mikalai Pryhodzich (*Białoruski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Tatciana Ramza (*Białoruski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Liudmila Sinkova (*Białoruski Uniwersytet Państwowy*, *Białoruś*)
Beata Siwek (*Katolicki Uniwersytet Lubelski Jana Pawła II*, *Polska*)
Aliaksandr Smalianchuk (*Polska Akademia Nauk*, *Polska*)
Halina Tychka (*Białoruski Uniwersytet Państwowy, Białoruś*)
Halina Tvaranovich (*Uniwersytet w Białymstoku*, *Polska*)

Katedra Białorutenistyki
Uniwersytetu Warszawskiego

Acta Albaruthenica

Tom 24

Warszawa 2024

Redakcja
prof. dr hab. Mikałaj Chaustowicz (redaktor naczelny)
dr hab. Radosław Kaleta, prof. UW (z-ca redaktora naczelnego)
dr hab. Mirosław Jankowiak (*język polski*)
dr Katarzyna Drozd-Urbańska (*język polski*)
dr Nadzieja Czukiczowa (*język białoruski*)
dr Angela Espinosa Ruiz (*język angielski*)

Sekretarze redakcji
mgr Maryla Chaustowicz, dr Angela Espinosa Ruiz

Projekt graficzny okładki
Paweł Kurza

Na okładce: *Miadźviadka Domeyków (1864–1876).* Akwarela Napoleona Ordy (1807–1883).
Plik znajduje się w Wikimedia Commons – repozytorium wolnych zasobów

Adres redakcji
Katedra Białorutenistyki
Uniwersytetu Warszawskiego
ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa
tel. (0 22) +48 22 55 34 252
http://www.albaruthenica.uw.edu.pl
e-mail: actaalba@gmail.com

Redaktor prowadząca
Dorota Dziedzic

Redakcja językowa
WUW

ISSN 1898-8091
e-ISSN 2720-698X

© Copyright © by Authors, 2024

Publication under the Commons Attribution 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
license (full text available at: https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0pl/)

Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego
02-678 Warszawa, ul. Smyczkowa 5/7
www.wuw.pl; e-mail: wuw@uw.edu.pl
Dział Handlowy WUW: tel. (48 22) 55 31 333; e-mail: dz.handlowy@uw.edu.pl

Skład i łamanie
Dariusz Górski

Druk i oprawa:
POZKAL

Да 100-годдзя з дня нараджэння Васіля Быкава

Z okazji 100. rocznicy urodzin Wasila Bykawa

On the occasion of the 100th anniversary of the birth of Vasil Bykaŭ

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Inesa Kuryan, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.1

Inesa Kuryan / Інэса Кур'ян

Akademia Humanistyczno-Ekonomiczna w Łodzi /
The University of Humanities and Economics in Lodz
ORCID: http://orcid.org/0000-0001-8265-2149
e-mail: inesa.kuryan@ahe.email

"Войнакультура" і "фантомы гісторыі": да прачытання Васіля Быкава

"War Culture" and "Historical Phantoms": Learning to Read Vasil Bykaŭ
"Wojnokultura" oraz "fantomy historyczne": nauka czytania Wasila Bykawa

ABSTRACT: This article is dedicated to a new reading of the literary works of Vasil Bykaŭ (1924–2003), an eminent Belarusian prose writer, who is regarded as war combatant and known for his exceptionally realistic, tragic, and autobiographical depictions of the 1941–1945 war. Bykaŭ, a Nobel Prize nominee, has been the subject of numerous scholarly studies. However, the author of this article considers the established critical positions to be polemical and introduces several contemporary literary and social categories to present the creative complex of the writer from a completely different perspective. This perspective is not about war memory, but instead views war as an imagined, metaphorical turn, even concealing true authorial content. Unfortunately, many readers to this day do not recognize many of Bykaŭ's metaphors and allegories, thus his prose, even on the eve of his 100th anniversary, can be classified as "unread texts." Therefore, there arises a need for a new look at Bykaŭ, based on providing the reader with specific literary tools that the writer uses in one of his outstanding prose works – "The Alpine Ballad" (1963). The aim is to demonstrate, through some interpretive methods, how Bykaŭ reveals his profound knowledge of European culture and bases his own creative concept on it, utilizing varied and complex stylistics. The considerations in the article conclude that the main theme of Vasil Bykaŭ's work is the patriotic concern for the return path of his country from a repressive-camp zone with a forcibly imposed to the roots "war culture" and culture shared with Europe.

KEYWORDS: "war culture," historical phantoms, imagined history and geography, masterful text stylistics, literary plan of escape and returning home.

Уводзіны

У 2024 г. выдатнаму беларускаму празаіку Васілю Быкаву споўнілася б 100 год. Варта звярнуць на гэта асаблівую ўвагу не таму, што гэта прыгожая круглая дата, не таму, што мы жадалі б пісьменніку дажыць да гэтай слаўнай гадавіны, а таму, што ад гэтае даты нам давядзецца чытаць яго крыху інакш, на жаль, пасмяротна, што здараецца нязрэдчас, даказваючы аўтару, як мы яго нарэшце зразумелі дый напоўніцу ацанілі.

Канешне, у вялікай меры дадзены артыкул – гэта даследчыцкая інтэрпрэтацыя, але ж літаратуразнаўчыя высновы – тонкая справа, рамяство з вялікім наборам інструментаў і фактаў, сукупнае прымяненне якіх дае новыя абгрунтаваныя эфекты.

Літаратурная інтэрпрэтацыя ні ў якай меры не адносіцца да суб'ектыўнага погляду на твор, наогул, існуюць каноны інтэрпрэтацыі, якія вымагаюць актуалізацыі, каб не атрымалася так, што масавае паглынанне і ўжыванне прынцыпаў аналізу з папярэдняе культуры, якая атачала В. Быкава, а мы перш за ўсё кажам пра культуру савецкіх часоў, цягнецца доўгія гады за пісьменнікам неадчэпным шлейфам, ствараючы наступствы інфляцыі і нават адштурхоўвання ягонай творчасці ў савецкае мінулае.

Таму, перш за ўсё, гэтыя новыя назіранні за ідэйнай канцэпцыяй творчасці В. Быкава маюць аксіялагічны характар. Можна, відаць, прысвяціць іх 100-гадоваму юбілею выдатнага беларускага празаіка, але больш істотнай прычынай іх абвяшчэння з'яўляецца знак часу, калі беларуская літаратура адчувае патрэбу ў грунтоўнай рэвізіі; калі ж камусьці да душы даўнейшыя шаблоны, яны ўсё-ткі недарэчна састарэлі, паколькі, прымяняючы іх да яскравага еўрапейскага інтэлектуала В. Быкава, нехта ставіць яго выключна на канвеер савецкай ваеннай прозы.

Творчасць В. Быкава ў межах "войнакультуры"

Пачнем з вылучэння такога грунтоўнага паняцця, ад якога значная частка еўрапейскай прасторы дзесяцігоддзямі была спрэс узалежнена, але з тае пары, як мы самі апынуліся ва ўмовах ваеннага часу, узнікла патрэба яго акцэнтаваць асобна. Гэтае паняцце – "в о й н а к у л ь т у р а". Яно паўстала ў нашых нядаўніх размовах пра Васіля Быкава, і я ўдзячная свайму калегу з Лодзі, доктару філалогіі Веславу Пшыбылу, што ён яго стварыў[1] як назву пэўнага кантэксту, у якім мы звыкліся разглядаць творчасць В. Быкава.

[1] Падаецца ў перакладзе з польскага словаўтварэння „wojnokultura".

Паспрабуем раскрыць сэнс новага паняцця “войнакультура”, што з’яўляецца прыкладам зменена карціны свету, а ў сучасным стылі яна вельмі ўдала называлася б постпраўдай або заместпраўдай, хоць у тагачасным перыядзе гэта была не зусім хлусня ці фэйкавыя навіны, а спрактыкаванае маніпуляванне ваенным трагізмам і гераізмам паводле пасляваеннай савецкай мадэлі прапаганды, якая, нібы імгла, ахутвала кожнага грамадзяніна, уздзейнічала на яго эмоцыі ды перакананні, у тым ліку праз літаратурны матэрыял пра вайну.

Праблема палягае на тым, што “войнакультура” вызначае чытацкае ўспрыняцце творчасці тагачасных пісьменнікаў, бо з’яўляецца часткай свядомасці і пранікае ў тканку крытычнага матэрыялу. Менавіта “войнакультура” цалкам фармалізавала ацэнку творчасці В. Быкава і па інерцыі рухаецца наперад, паўтараючыся нават у найноўшых развагах пра аўтара.

Як “войнакультура” перадвызначае ацэнкі творчасці В. Быкава? Па-першае, мы абмяжоўваем яго творчасць умовамі савецкай айчыннай вайны 40-х гадоў XX ст. і пачынаем у іх шукаць праўду і галоўную думку пісьменніка. Меркамі “войнакультуры” мы вызначаем цану жыцця яго персанажаў, распрацоўваем катэгорыю здрадніцтва і даём за жыццё здраднікаў марную капейчыну. Нам не падабаецца слова “расчалавечванне”, але тэарэтыкі “войнакультуры” адразу нам давядуць, што вайна – не Венера з марской пены, у ёй няма месца жаноцкай пачуццёвасці, і мы пачынаем палымяна асуджаць усё, што не адпавядае мужным нормам “войнакультуры”.

“Вялікі В. Быкаў, што ўздымаецца па-над эпохай”, “вялікі творчы свет В. Быкава, у якім ён шмат прадчуваў і перадвызначыў”, “вялікая вайна В. Быкава, якая вяртае грамадства з комы” – такая прыхільнасць да этыкетачнага падыходу без семантычнай напоўненасці ў ацэнцы творчасці В. Быкава таксама адносіцца да свету “войнакультуры”, якая ахвотна практыкуе павярхоўныя ацэнкі і выгадоўвае ў атмасферы хлуслівага ідэйнага канструкту ўсялякія сурагатныя меркаванні. Таму пра В. Быкава стала звычна гаварыць, што гэта пісьменнік, які выйшаў па-за межы айчыннай літаратуры, займае асаблівае месца, трапляе ў сусветны пантэон, але пры гэтым агульначалавечая вартасць В. Быкава вызначаецца толькі межамі Вялікай Айчыннай вайны і агульначалавечымі вартасцямі Вялікай Перамогі над фашызмам. Застаецца ўражанне, што В. Быкаву пад гэтымі пафаснымі шыльдамі гатовыя дараваць нібыта прызнанне савецкіх ідэалагічных пазіцый, у чым яго таксама часам папракаюць. Звычайна багатая крытычная літаратура пра пісьменніка паўтарае як асноўны тэзіс, што В. Быкаў неяк асабліва піша пра вайну, што ён знайшоў “свой спосаб суадносін з тым трагічным

часам”[2] [Moskwin 2019: 124]. Сталай з’яўляецца адсылка ягонай творчасці да “тых гадоў”, да “франтавой сітуацыі”, да “поля бітвы”, дзе В. Быкаў бескампрамісна, не зважаючы на напады непрыхільных крытыкаў, праяўляе наватарства, бо піша пра вайну аўтэнтычна і трывожна, камеральна, а не эпічна, але ж тэматыка ўсё роўна застаецца “ваеннай”, у цэнтры ўвагі “жаўнерскі лёс” [Barszczewski 1994: 73–82] з усім яго падрабязным рэалізмам.

Традыцыя “войнакультуры” перадвызначае нават эмацыйную напоўненасць крытычных ацэнак – для В. Быкава гэта “разбуральная моц нялюдскіх ваенных абставінаў”, адкуль нараджаецца вызначнік “пісьменніцкай мужнасці” аўтара, яго “пакутніцкіх пісьменніцкіх рэфлексіяў” [Максимович 2018: 136].

Насамрэч важкага літаратуразнаўчага матэрыялу пра В. Быкава шмат, у тым ліку замежнага, з якога можна цытаваць у нечым падобныя, але каштоўныя выказванні, аднак з сумам даводзіцца канстатаваць, што ўвесь гэты шматстаронкавы даробак фактычна не выходзіць за межы “войнакультуры”, а гэта азначае, што мы самі яшчэ не выйшлі з яе магутнага ідэалагічнага ўздзеяння і не паспрабавалі вывесці аднаго з найлепшых нашых празаікаў з таго самага вузкага акопу, які В. Быкаў нам, чытачам, адным накідам, па-мастацку, намаляваў, як уласную класічную метафару ў адным са сваіх першых твораў *Трэцяя ракета* (1961).

Новы погляд на прозу В. Быкава наўпрост робіцца неабходным дзеля раскрыцця сапраўднага яе значэння, вяртання чытацкай цікавасці з разуменнем тэкстаў, без галаслоўнай прапановы вокладак новых выданняў В. Быкава, за якімі зноў і зноў паўтараецца “войнакультурніцкі” наратыў.

Як пазбавіцца ад ілюзіяў “войнакультуры” ў ацэнках В. Быкава? Адным з пастулатаў “войнакультуры” з’яўляецца меркаванне, што жахі вайны па факце могуць мець пазітыўны ўплыў на грамадства, унутрана паглыбляюць і прасвятляюць людзей, служаць незвычайным ачышчальным сродкам і лучвом для хаатызаванага соцыуму. Моц трагізму перараджаецца нават у свайго роду ваенную тэасофію, што ў крытыцы да творчасці В. Быкава цалкам увасобілася ў шматлікіх рэцэнзіях ягонай знакамітай аповесці *Сотнікаў* (1970), хоць сам пісьменнік першаснай назвай[3] твора (*Ліквідацыя*) выразна падкрэсліваў галоўныя матывы яго паўстання – чалавек на вайне ніякі не герой і не Езус на Галгофе, а “не больш, чым аб’ект вынішчэння”[4] [Максимович 2018: 138]. Таму

[2] У польскім арыгінале: „własny sposób relacji o tym tragicznym czasie”.

[3] Прынята лічыць, што назву аповесці *Сотнікаў* зацвердзіў да першай публікацыі ў «Новом мире» рэдактар часопіса, вядомы савецкі пісьменнік-франтавік Аляксандр Твардоўскі.

[4] У арыгінале па-руску: «не более, чем объект истребления».

да сакральнага ў вайне можна, мабыць, аднесці адно дамову са смерцю падчас ліквідацыі чалавека за чалавекам у ваенных умовах: хто загіне першы, а хто наступны, на якой колькасці жыццяў атрымаецца адкупіцца ад смерці. Нездарма ў аўтара быў намер назваць экранізацыю ўзгаданай аповесці *Двое ў начы*, без маралізатарскага антаганізму Сотнікава і Рыбака, бо і той, і другі – ахвяры, акрамя таго, яны складаюць улюбёны для В. Быкава здвоены персанаж як сімвал “некатэгарычнага” імператыву ў яго асабістай этыцы, без навязвання безумоўных прынцыпаў. Хоць і ўзнёсла, але няслушна гаварыць пра асаблівы максімалізм ды хрысціянскі апафеоз Сотнікава, хутчэй, пра яго экстрэмальную вычарпанасць, чым пра ўнутранае рэлігійнае азарэнне [Максимович 2018: 141]. Аднак канчаткова абраны праз рэжысёрку Ларысу Шапіцька тытул фільма *Узыходжанне* (1976) схіляе аповесць у “войнакультурніцкі” дыскурс; такім чынам, тыповы быкаўскі твор пра вынішчэнне ўсіх непадпарадкаваных паднявольнаму рэжыму пераўтварыўся па ўсіх правілах “войнакультуры” ў хрысціянізаваную апалагетыку вайны – маўляў, без яе мы б не дазналіся, хто сярод нас святы, а хто здраднік, і гэта дасюль вызначае наш погляд на знакавы твор В. Быкава *Ліквідацыя*. На жаль, “войнакультура” надзвычай любіць маніпуляваць хрысціянскай сімволікай і развешваць цэтлікі Юдаў, бо гэта таксама доказ перакручвання праўды дзеля прыхавання рэальнай невымяральнай па страшных наступствах грамадскай катастрофы для ўсіх без выключэння, каб трансфармаваная свядомасць была ўдзячная ініцыятарам вайны, а куды болей – героям ды пераможцам. Гераічная смерць чалавека не можа быць абавязковай грамадскай павіннасцю, кажа нам В. Быкаў, але ж да такой думкі схіляе чытача менавіта “войнакультура”.

З існуючых даследаванняў В. Быкава асабліва прадуктыўнай была спроба апісаць ягоны філасофска-маральны комплекс, але ж яго абмежавалі ваенным матэрыялам, тое ж сталася з быкаўскай экзістэнцыяльнай канцэпцыяй зняволенага квазісправядлівым грамадствам чалавека – тут таксама і цярпенне, і боль, і страты, і экзістэнцыяльны выбар пераважна перанесеныя крытыкамі ва ўмовы ваеннага часу, то бок на “войнакультурніцкую” прастору, дзе балючае для пісьменніка пытанне “а што далей?” пераквалiфікавалася на тэму без патрэбы, бо тая вайна нібыта шчасліва адкінута ў мінулае, мірныя часы даўно ўсё кампенсавалі. В. Быкаў нават асобным фонам дадае ў сваіх творах матыў няўпэўненасці, адсутнасці адказу на гэтае пытанне, уключае ў пейзажыстыку расповеду свой класічны “расплывісты туман невядомасці” або “непралазную багну”.

Што азначае “вайна” ў творчасці В. Быкава?

Няма ў вайне дабрадзейства, не трэба яго там шукаць. Сапраўды, экзістэнцыяльны дыскурс В. Быкава значна шырэйшы – даваенны, ваенны, пасляваенны. Па вызначэнні, вайна з’яўляецца ахоўнай рэакцыяй агрэсіўнай грамадскай сістэмы перад яе распадам, яна, безумоўна, накіраваная на ўзмацненне хісткіх дзяржаўных канструктаў, дзе наспявае бунт ці разлом тэрытарыяльнай цэласнасці. Паколькі ж распаду немагчыма пазбегнуць, бо ён з’яўляецца аб’ектыўным сацыяльна-гістарычным механізмам на грунце працяглых няўдалых сацыятворных працэсаў, што ўжо адбыліся, а не адбудуцца пасля вайны, таму ваенная фаза самагубна іх паглыбляе, адцягванне непажаданага фіналу не абыходзіцца без жорсткіх мераў стрымлівання, прыпраўленых пасляваенным пафасам і абавязковым актыўным выкарыстаннем прапаганды. Аналітыка твораў В. Быкава часта намацвае ключавую для пісьменніка тэматыку немагчымасці бясконцага існавання ў абставінах “гіпертрафаваных ваенізаваных зносінаў”, у “атмасферы гіпербалізаванафатальнай падазронасці”, унутранага рэжымнага знясілення страхам і пачуццём віны[5] [Максимович 2018: 140]. Чалавека наўмысна пераўтвараюць у “палоннага ваеннай сістэмы”[6] [Максимович 2018: 138], з якой натуральным з’яўлялася б жаданне вымкнуць на волю, “а калі ўжо не суджана вырвацца на волю, загінуць недарма”, – як пісаў В. Быкаў у *Альпійскай баладзе* (1963), што з’яўляецца адной з галоўных формул ягонай творчасці.

Кожны разважлівы чалавек, які прайшоў савецкую айчынную вайну 1941–1945 гг., а такім жывым сведкам падзей акурат быў В. Быкаў, вымяраў вайну як этап распаду савецкай дзяржаўнай сістэмы, якая спрабавала прыхаваць сваю даваенную негуманнасць, заступіўшы яе ваеннай кульмінацыяй, шукаючы выключна знешнія прычыны разнапланавых унутраных праблем. Менавіта ўсведамляючы гэты механізм, В. Быкаў узяўся за пяро, распавядаючы пра гэта чытачам у першых сваіх аповесцях *Жураўліны крык* (1959), *Трэцяя ракета* (1961), *Альпійская балада* (1963), размясціўшы Беларусь у бягучы працэс распаду, патрыятычна даючы знакі суайчыннікам, што каманда “не высоўвацца з акопу” або “акопу не здаваць” азначае, што “з акопу” трэба шукаць выйсце. Як бачна па датах добра асэнсаваных В. Быкавым дэбютных

[5] У арыгінале поўная цытата па-руску: «Герои Быкова постоянно, прямо или косвенно ощущают на себе атмосферу гиперболизированно-фатальной подозрительности, внутреннего режимного устрашения, гипертрофированных военизированных отношений, межвольно прививая себе комплекс несомненной виновности».

[6] У арыгінале цытавана па-руску: «пленник военной системы».

твораў, аўтар актывізуе матыў “беларускіх уцёкаў” пасля смерці Сталіна, амністыі і рэабілітацыі вялікай колькасці вязняў яго рэжыму, але ў гэтым плане літаратура В. Быкава не сістэматызаваная і да сёння “непрачытаная”, бо звычайна нават перыяд адлігі ўспрымаўся савецкім асяроддзем у поўнай згодзе з пасляваенным трыумфам, энтузіязмам аднаўлення ды ўдзячнасцю нашчадкаў.

Даўно няма таямніцы з таго, што беларуская сітуацыя ад пачатку выкарыстоўвалася дзеля стрымлівання распаду Расейскай імперыі. Праблема слушнасці прарасейскага беларускага выбару абвастрылася пасля завяршэння Першай сусветнай вайны. Хутказменлівыя пасляваенныя падзеі пачатку ХХ ст. не абышліся без першага ўсведамлення ідэалагічнага падману саветамі, якое неўзабаве праявілася ў беларускіх літаратурных творах. У адказ на галасы праўды з міжваеннага перыяду савецкая ўлада ў 1930-я гг. рэпрэсавала ўсіх таленавітых беларускіх “праўдалюбаў”, вызначала кола літаратурных куміраў, складаючы з іх канон у адукацыйных праграмах, ствараючы нязменна аптымістычныя погляды на рэальнасць, адсочваючы і забараняючы “інакшыя”, чым надзейны, жыццярадасны і прагрэсіўны сацрэалізм, спосабы мыслення і літаратурнай крытыкі.

Беларусь надоўга патрапіла ў савецкі палітычны палон, складаныя грамадска-палітычныя ўмовы былі паднявольнымі рамкамі для літаратурнага працэсу, таму не варта на ўсіх суайчыннікаў пазіраць з дакорам. Ва ўмовах абмежаванняў і цэнзуры пісьменнікі здагадваліся выкарыстоўваць своеасаблівую метафарычнасць, па сутнасці, прыстасоўваючы ідэалагічныя і пажаданыя ўладай псеўдапатрыятычныя сродкі, каб незаўважна, амаль па-партызанску, давесці праўду ўцямліваму чытачу. Напрыклад, у крытыцы прозы В. Быкава не аднойчы заўважалася, як часта пісьменнік звяртаўся да партызанскай тэмы, не маючы ваеннага партызанскага досведу, але гэтая заўвага прайшла без належных высноў. Нам жа без жартаў трэба прызнаць тут аўтарскую метафару. Уся літаратура пра вайну В. Быкава акурат з’яўляецца ўнікальным прыкладам выкарыстання падобнай метафарычнасці як формы супраціву з паўсюдным “прыхаваным” ворагам. Наша навуковая задача – раскрыць гэтую метафарычнасць.

Не будзем у “войнакультурніцкім” стылі ўзносіць В. Быкава да статусу літаратурнага героя-партызана або празаіка-падпольшчыка, бо на самай справе ён не першы вынайшаў літаратурны спосаб ґаварыць праўду ва ўмовах савецкай постпраўды, але ён планамерна выкарыстоўваў тэхніку сэнсавай шматслойнасці для ўсёй уласнай творчасці, што дазваляе нам назваць В. Быкава пісьменнікам, які працаваў у сваім літаратурным “падполлі”. Чытач мімаволі адчувае, што аўтар пісаў

смела, але В. Быкаў пісаў не пра вайну, а выкарыстоўваючы вайну як алегорыю рэчаіснасці зусім для іншых аўтарскіх пасылаў. У дачыненні да творчасці В. Быкава звычайна не гучаць словы, што вайна для яго – умоўная адзінка, што словам "вайна" ён мог назваць увесь антыгуманны канструкт дзяржавы, які трымае ў прымусе народы, як у цесным акопе ці ў лагеры. Вядома, аніякая савецкая ваенная прапаганда не была матывам для ягонай творчасці, адсюль бясплоднымі будуць меркаванні, якія выводзяць пісьменніка ўсяго толькі на ролю аднаго з лепшых савецкіх пісьменнікаў пра вайну, змяшчаюць яго ў стандарты "войнакультуры".

Магчыма, хтосьці дадасць: "Ну так, ён пісаў не пра вайну, а пра людзей на вайне". Думаецца, аднак, што яго больш за ўсё непакоіла, што столькі год акопамі і магіламі перарытая яго родная зямля. Гэты размыты маштаб вайны, несупынны ваенны стан, укаранелая прысутнасць вайны ў культуры, у свядомасці людзей, яе стыхійныя абвастрэнні, лакальныя крывавыя бітвы і ахвяраваныя чалавечыя жыцці не перасталі быць спосабам жыцця Беларусі і суседзяў, а прымусова рэкрутаваны на гэтую бясконца працяглую чужую вайну народ даўно хоча "вярнуцца дадому". Таму ў сваіх творах пра шырока зразумелую "вайну" В. Быкаў несупынна разважае пра тое, як беларусам "вярнуцца дамоў", што іх чакае на шляху. Ён у роўнай ступені прапануе не прамы, а свядомасны план уцёкаў, як разам з тым папярэджвае пра найгоршыя наступствы – пра тое, як уцекачоў разарвуць сабакі, расстраляюць або павесяць, наракуць дэзерцірамі ці здраднікамі, на самай жа справе будуць шукаць спосаб, як пазбавіцца людзей, што не прынялі формулу жыцця ў "войнакультуры", у фармаце якой яе прапагандысты нават прозе В. Быкава прызначылі ідэйную ролю дзеля падтрымання перакручанай карціны свету.

Рэнесансная топіка замест ваеннага сацрэалізму ў *Альпійскай баладзе*

Менавіта на ваенным грунце недасведчанаму чытачу В. Быкава падаецца, што ён мае ў руках твор цалкам рэалістычны, а нават па-франтавому аўтабіяграфічны, што В. Быкаў сам з ахвотай уваходзіць у кантэкст ваеннай прапаганды, толькі падае яе неяк больш нетыпова.

Аднак чамусьці ніхто яшчэ не напісаў, што разам з В. Быкавым мы трапляем у топіку рэнесанснай гуманістыкі, сакавітую стылістыку еўрапейскай культуры, яскравай, поўнай паэтычных параўнанняў, якія выквечваюцца толькі ў другім, схаваным пласце быкаўскага "падпольна-метафарычнага" твора, калі ўсё ваеннае, шэрае, цвілое, лагернае, савецкае, спаленае разам з надзеямі, мы саскрабем са скуры гэтай

парадаксальнай прозы, адмыем, як у славутым купанні Джуліі ў *Альпійскай баладзе*. Праз “расплывісты туман невядомасці” мы выйдзем на сонечную макавую даліну і зразумеем, што В. Быкаў не піша пра вайну, вайна з’яўляецца толькі фантомам у яго творчасці.

Вернемся да паняцця літаратурнай інтэрпрэтацыі твора, прымем некалькі інтэрпрэтацыйных аксіём і абазначым яшчэ адзін важны літаратуразнаўчы сродак, на якім грунтуецца стылістыка пісьменніка В. Быкава і на што павінна абапірацца крытыка яго творчасці, каб змяніць спосаб прачытання быкаўскіх тэкстаў. Гэтае паняцце – “фантом гісторыі”.

Літаратуразнаўчыя аксіёмы падказваюць чытачу, што добры пісьменнік заўсёды пакідае для яго “інтэрпрэтацыйную перспектыву”, таму ніколі не трэба кіравацца першым уражаннем ад прачытання. Інтэрпрэтацыя – гэта не псаванне непарушнай гатовасці твора да чытання, а форма неабходнага крытычнага падыходу да тэксту. У больш прафесійных разглядах інтэрпрэтацыя з’яўляецца формай навуковага даследавання, што мае як філалагічны, так і інтэрдысцыплінарны характар.

Аксіёмай з’яўляецца палажэнне, што літаратурная творчасць заўсёды з’яўляецца паэтычнай, хоць, канешне, і рацыянальнай, таму чытаць і крытыкаваць твор найлепей з багажом разумовых рэфлексій, суаднясеннем тэксту з рэаліямі, а таксама стасуючы фантазію, бо яшчэ ў антычнай тэорыі пазнання Арыстоцеля *poiesis* азначала “творчасць”. Чытаючы, мы пераносімся да спецыфічнага філасофска-літаратурнага дыскурсу, дзе трэба шукаць і думкі, і паэзію, хоць, магчыма, цэлым пакаленням пісьменнікаў з сацрэалістычнага і “войнакультурніцкага” асяроддзя шмат з гэтага было недазволена.

Пісьменнік не абавязаны тлумачыць чытачу, што ён хоча сказаць сваім творам, ён спадзяецца, што чытач зразумее, а крытык раскрые тэкст яшчэ паўней. Пра гэта В. Быкаў часта гаворыць у сваіх інтэрв’ю. Калі не навучыцца думаць пра літаратурны тэкст, то ён застанецца непрачытаным. Магчыма, твор будзе проста нечым падабацца, вылучацца іншасцю і наватарствам, але адказ на пытанне “ў чым?” будзе банальным.

Такім чынам, інтэрпрэтацыя тэксту – складаная і захапляльная штука, у той жа меры, што і яго напісанне для аўтара. Яна вымагае не толькі літаратуразнаўчых, але і дадатковых гістарычна-палітычных ведаў, бо для аналізу прыдасца як унутраны, так і знешні навуковы інструментарый, што выходзіць за рамкі філалагічных дысцыплін. А вось ад прапагандысцкага інструментарыю трэба адмовіцца.

Можна падзяліць інтэрпрэтацыю на культурную ці гістарычную, нярэдка твор вымагае, як сказалі б сёння, геакрытычнага аналізу [Rdzanek 2015: 141–150]. Культурнае, гістарычнае або прасторавае напаўненне

твора паказвае важныя суадносіны аўтара з гэтымі катэгорыямі і вымярае ёмістасць ягонай паэтычнасці і фантазіі. Вельмі добрым таму прыкладам з'яўляецца знакамітая *Альпійская балада* В. Быкава, і варта менавіта на ёй паказаць новае "неваеннае" прачытанне пісьменніка.

Як мы казалі вышэй, В. Быкаў усёй сваёй творчасцю малюе для чытача-суайчынніка план уцёкаў з ізаляванага, негуманнага, рэпрэсіўна-мілітарызаванага асяроддзя. Еўрапейская антычная літаратура даўно прапанавала для апісання вандроўкі з выпрабаваннямі класічны топас з назвай *homo viator*, што вызначае не толькі сцежку падарожжа галоўнага героя, але і сцежку часу з рознымі храналагічнымі перанясеннямі ў прасторы. Ужыванне гэтага топасу ў *Альпійскай баладзе* абсалютна невыпадковае: В. Быкаў, можна сказаць, абраў любімую літаратурную трасу – у Італію праз Альпы да асноў і крыніц еўрапейскай культуры, што адначасова складала вялікую мару савецкага чалавека за жалезнай заслонай, тым больш адоранага мастацкімі талентамі, што мы добра ведаем з біяграфіі В. Быкава. У аповесці *Альпійская балада* – гэта мара і вызначаны шлях сімвалічнага вязня Івана Цярэшкі да культуры, супольнай з Еўропай у доўгай і цяжкай перспектыве будучыні. У самым пачатку твора беларускі палонны зачаравана глядзіць праз створаную выключнымі абставінамі адтуліну ў бетоннай сцяне на недасяжны фантастычны альпійскі краявід і наважваецца рушыць у складанае падарожжа, пакідаючы канцэнтрацыйны лагер, "у самаволку". Вось такі сучасны *homo viator*, такі Адысей у пошуках дарогі да дому. Канешне ж, Іван Цярэшка імкнецца не ў Трыест да партызанаў, бо В. Быкаў, мабыць, таксама прыдумаў гэта метафарычна. Нагадаем, што *Альпійская балада* пісалася ў 1963 г., час адлігі і мройных спадзяванняў на перамены, што надзвычай важна ўлічваць.

"Уяўная гісторыя" і "ўяўная геаграфія" як стылістычны сродак твораў Быкава

Варта звярнуць увагу, колькі рознабаковых мастацкіх перспектыў адкрывае перад намі пісьменнік В. Быкаў: ілюзіяй становіцца акурат перспектыва гераічных уцёкаў савецкага вязня з нямецкага канцэнтрацыйнага лагера. Усё ў гэтай фабуле адпавядае класіцы "вайнакультуры", але В. Быкаў дае нам падказкі з першых радкоў, што чытаць яго тэкст трэба ў вымярэннях рэальнага і прыдуманага:

> Ён упаў, спатыкнуўшыся аб штосьці, і адразу ж ускочыў – адчуў: трэба хутчэй ад гэтага месца, ад забітага камандафюрэра; пакуль не спахапіліся, трэба недзе зашыцца, схавацца, а можа, і прарвацца з завода. Але ў віхурыстым пыле, які накрыў цэх, амаль

> нічога не было відаць, і ён ледзьве не сунуўся ў чорную прорву варонкі, дзе была бомба. Па краі аббег яму <…>[7].

Тое, што мы чытаем – гэта так званая “ўяўная гісторыя”, а рэальную падказвае суаднясенне падзей, якія звязваюць аўтара, твор і бег сапраўдных гістарычных здарэнняў. В. Быкаў не быў вязнем канцлагера ў часы вайны, не ваяваў на тэрыторыі Італіі, не наведаў гэтай краіны, толькі ў 1996 г. быў узнагарожданы італьянскім ордэнам “За заслугі перад Італьянскай Рэспублікай” у сувязі з напісаннем менавіта гэтага вядомага твора *Альпійская балада* пра каханне ваеннапалоннага і італьянскай партызанкі Джуліі. “Уяўная гісторыя” з’яўляецца распаўсюджаным літаратуразнаўчым інструментам, які паводле творчай задумы аўтара можа табуіраваць яго сапраўдныя думкі. Выбух на канцлагерным заводзе, смерць камандафюрэра, віхурысты пыл, што накрыў цэх, імаверна, пераносяць нас у канец эпохі сталінізму з масавым вызваленнем палітвязняў з іншых месцаў пазбаўлення волі пасля смерці правадыра. Мы не можам гэтай здагадкі пацвердзіць без самога аўтара, але ж ён і не абавязаны нам гэтага тлумачыць, зыходзячы з тых літаратуразнаўчых аксіём, калі добры пісьменнік заўсёды пакідае для чытача “інтэрпрэтацыйную перспектыву”. Паколькі мы працуем з тэкстам выдатнага празаіка, цалкам дапускаем, што аўтар вырашыў нас пацешыць літаратурна-стылістычным прыёмам, які ўзнікае пры суаднясенні “ўяўнай гісторыі” і “рэальнай гісторыі” ў творы і можа быць названы “фантомам гісторыі”.

Еўрапейскае літаратуразнаўства назірае “фантомы гісторыі” з XVIII ст. у першых ангельскіх гістарычных раманах, якія, дарэчы, з дзяцінства любіў чытаць В. Быкаў, у творчасці іншых вядомых аўтараў, да прыкладу, рамантыкаў Фрыдрыха Шылера ці Адама Міцкевіча [Gregorek 1995: 55–56]. Гэта выключна цікавая стылістыка літаратурнага тэксту палягае на стварэнні “нібы гісторыі”, ці, карыстаючыся сучасным выразам, крыпта-здарэнняў, каб абудзіць фантазію чытача або схаваць перад цэнзурай сапраўдныя падзеі, але паспрабаваць патлумачыць рэальнасць. Мы бачым, што В. Быкаў як дасведчаны майстра выкарыстоўваў “фантомы гісторыі”, і галоўным фантомам у яго была менавіта савецкая айчынная вайна. Польскім даследчыкам Леапольдам Грэгорэкам такое аўтарскае мысленне трапна названае “мысленнем пра сучаснасць праз несучаснасць”[8] [Gregorek 1995: 62].

---

[7] Тут і далей цытуецца з беларускай электроннай бібліятэкі *Беларуская палічка*: https://knihi.com/Vasil_Bykau/Alpijskaja_balada.html.

[8] У арыгінале па-польску: „myślenie o współczesności w nieteraźniejszości”.

Зразумела, што перанясенне ў іншую гістарычную прастору суправаджаецца і геаграфічным перанясеннем, таму побач з "уяўнай гісторыяй" мы, напэўна, знойдзем тэкставыя прыклады "ўяўнай геаграфіі"[9] [Rdzanek 2015: 141. 143, 146]. І *Альпійская балада* гэта шматкроць пацвярджае:

> Ён узбег на самы верх прасценка, тут ужо стала відаць наваколле; яго абдало ветрам, які хутка разганяў пыл. Па бетоннай рабрыне, утрымліваючы раўнавагу рукамі, каб не зваліцца, дабраўся да краю абвалу – наперадзе праз якія тры крокі была вышчарбленая сцяна знешняй агароджы, а далей за ёю, быццам нічога ў цэлым свеце не сталася, ціха тулілася ў зеляніне некалькі домікаў, і зусім блізка ўгары, на схіле, рукой падаць, зелянеў лес і Альпы: яго надзея, яго жыццё або смерць – яго лёс. Іван акінуў усё гэта кароткім позіркам, сунуў у зубы пластмасавую рукаятку пісталета і скочыў.

Мы пачынаем усё больш разумець, які рэальны сэнс побач з уяўным нясуць такія метафары В. Быкава, як цэментны пыл, бетонны мур, што нечакана атрымаў прабоіну. Нам нават цяжка паверыць, што ўжо ў 1963 г. В. Быкаў упэўнена казаў пра еўрапейскі лёс Беларусі ў вельмі непрыкметным сказе *Альпійскай балады*: "...зусім блізка ўгары, на схіле, рукой падаць, зелянеў лес і Альпы: яго надзея, яго жыццё або смерць – яго лёс". Ну канешне, пісьменнік прафесійна стварыў гэты італьянскі краявід такім падобным да беларускага, падкрэсліваючы іх блізкую культурную прыроду. Ягоную "ўяўную геаграфію" працяла мастацкая вастрыня настальгіі па беларускім доме, у які трэба вярнуцца, таму яго герой рашуча "скочыў" наперад. У такой вытанчанай прасторавай гульні, калі В. Быкаў сумясціў краявід беларускі, аўстрыйскі, італьянскі, які нясе ў сабе глыбокае культурнае напаўненне, мае месца не проста "ўяўная геаграфія", а геаграфія літаратурная, што можна таксама назваць геаграфіяй паэтычнай, культурнай і нават гуманітарнай [Rdzanek 2015: 146]. Яна з мастацкай мэтай уводзіцца ў тэкст, каб не толькі прадэманстраваць аўтарскі культурны досвед і гуманітарную свядомасць, яна служыць стварэнню літаратурнай карты[10] ўсяго твора [Rdzanek 2015: 147], тым больш на грунце топікі *homo viator*.

Літаратурныя пейзажы ў прозе В. Быкава вынікаюць з не да канца рэалізаваных ім здольнасцяў да выяўленчага мастацтва: у багажы пісьменніка аж два гады навукі ў віцебскім мастацкім вучылішчы на аддзяленні жывапісу. Часам выказаныя ў адным слове "дамалёўкі" дэталяў

[9] У арыгінале па-польску: „geografia wyobrażona".
[10] Можна сказаць таксама: *kartografia literacka*.

пейзажу нагадваюць мазок пэндзля, што змяняе оптыку карціны, і мы быццам пераносімся ў іншы пейзаж:

> Скакаць, аднак, памарудзіў, апусціўся нагамі, каб было ніжэй, і тады адарваўся. Ён упаў на быльнёг, перахапіў у руку пісталет і з усяе сілы кінуўся па бульбоўніку ўздоўж высокай драцяной загародкі.
> Наперадзе дамоў ужо не было, на касагорыне спакойна ляжаў някошаны лужок – у бязветранай цішы драмалі рамонкі, лагодна гойдаліся мяцёлкі нейкай травы.

Мы бачым, што не толькі “ўяўная гісторыя”, але і “ўяўная геаграфія”, “уяўная тапаграфія” з амаль фантастычным прасторавым пераносам сталіся свядома абраным аўтарам літаратурным сродкам і ключом для інтэрпрэтацыі яго твораў. Літаратурная аналітыка твораў В. Быкава не можа абысціся без асаблівай увагі да гэтага аўтарскага інструментарыю – ён мае агульнакультурную вартасць, а таксама свядомасную і звязаную з аўтарскай памяццю айчынных месцаў.

Новы погляд на вядомыя быкаўскія літаратурныя вобразы

Нават на гэтым этапе аналізу *Альпійскай балады* В. Быкава ўсё больш далёкім нам падаецца каментар да твора, складзены ў чыста “войнакультурніцкім” духу: маўляў, галоўнай з’яўляецца тэма знаходжання савецкіх воінаў у нямецкім палоне і барацьба з фашызмам, што радавы чалавек, сяржант Цярэшка праявіў мужнасць у складаных абставінах і, загінуўшы сам, ратаваў італьянскую партызанку. “Войнакультура” настолькі моцна ўкаранілася ў крытыку да гэтага выдатнага быкаўскага твора, настолькі далёка пашырыла свае межы, што агляд выказванняў пра *Альпійскую баладу* як “значную прапанову на польскім чытацкім рынку”[11] часоў ПНР [Moskwin 2019: 125] пацвярджае, наколькі нязначна ПНР-аўскія ацэнкі пра дасканаласць аповесці адступалі ад зададзенай “войнакультурніцкай” схемы, а яна па-старому трымаецца пазіцыі, што гэта гераічнае прысвячэнне тым, хто ваяваў і загінуў у часы вайны, пакутная дарога да партызанаў, бітва са злом у гонар жыцця і кахання [Moskwin 2019: 126–127]. Іншымі словамі, Іван і Джулія не выклікалі ў польскай крытыкі жадання паразважаць пра рэнесансавы дуэт Рамэа і Джульеты.

Таму, відаць, крытыкам будзе нялёгка пагадзіцца з нашым новым поглядам на постаць Джуліі, а дакладней было б сказаць, на “паласатую постаць” італьянкі, рымлянкі ў пары з беларусам Іванам Цярэшкам.

---

[11] У арыгінале па-польску: „znacząca propozycja Bykawa na polskim rynku czytelniczym”.

Справа ў тым, што ў гэтым уяўным ваенным сюжэце Джулія – гэта Фартуна, багіня лёсу і поспеху з рымскага пантэона. Джулія – яе незвычайная, наўпрост геніяльная персаніфікацыя.

Зноў пацвярджаецца тэзіс, што ваенная проза В. Быкава перапоўнена прамымі і празрыстымі алюзіямі да еўрапейскай культуры. Прысутнасць Фартуны ў літаратуры Рэнесансу была абавязковым стылістычным элементам – багіня лёсу была спадарожніцай чалавека і нават яго *alter ego*, з кім можна было паспрачацца на жыццёвым шляху.

Такім чынам, В. Быкаў увёў у культурны кантэкст Беларусі сімволіку бачання нацыянальнага поспеху беларусаў у іншым тыпе культуры, а таксама ў іншым тыпе культурнай прасторы, чым распаўсюджаная і дазволеная беларуская лакальнасць ці сямейнасць. Нельга сказаць, што чытачам *Альпійскай балады* не рабіліся аўтарскія падказкі, бо слова "Фартуна" некалькі разоў адкрыта агучана ў кантэксце аповесці:

> – Мі будэм мнёго-мнёго ф о р т у н а... Я очен хочу ф о р т у н а. Должен біть человек ф о р т у н а. Правда, Іваніо?
> – Так, так...
> – Нон ф о р т у н а Джулія. Фіна. Фіна вітта Джулія, – журботна казала яна.

Ужыванне тут слова *fortuna*, а не *felicita* невыпадковае. В. Быкаў творча развівае вобраз Фартуны, не малюючы яе крылатай, юнацкай постаццю, а постаццю "паласатай", карыстаючыся даўняй сімволікай зменлівасці лёсу з белымі і чорнымі палоскамі, адважна дадаючы да яе "сучаснага" строю чырвоны трохкутнік вінкеля, што азначаў палітвязня ў канцэнтрацыйных лагерах. Прысутнічаюць у аповесці і іншыя знакі падарожжа з пераменлівай Фартунай – гэта і змена надвор'я, і пейзажы, дзе горы і даліны падмяняюць класічнае "кола Фартуны", якое чалавечаму лёсу забяспечвае ўздымы і падзенні.

Мы не можам адмовіць В. Быкаву падглядання за характарам Фартуны ў сярэднявечнай паэзіі, хоць бы ў Дантэ[12], які малюе Фартуну неадчэпнай, абыякавай да слёз і агіды чалавека, які спрабуе яе пазбавіцца. Магчыма, В. Быкаў уступіў у спрэчку пра Фартуну з Макіявеллі, што застаецца адкрытым пытаннем, бо ніхто дасюль не бачыў у "паласатай постаці" Джуліі такі важны літаратурны вобраз. Прынамсі, сёння можна сцвярджаць, што беларускі дыялог з Фартунай адбыўся на старонках быкаўскай прозы, таму гэта варта даследаваць далей, сам жа аўтар з непрыхаваным замілаваннем "піша" сваю гарэзлівую Фартуну-Долю, што акурат можа мець вельмі аўтабіяграфічнае аднясенне:

---

[12] Знакаміты пераклад *Боскай камедыі* Дантэ на расейскую мову Міхаілам Лазінскім акурат выйшаў у 1946 годзе.

Урэшце на прагалак між дрэў унізе выбегла лёгкая паласатая постаць на выгляд быццам падлетка, азірнулася, жвава неяк кінула позірк угору і згледзела яго.

Жанчына?! Гэта яго здзівіла і збянтэжыла, ён ледзьве не вылаяўся ад прыкрасці.

<…> дзяўчына ў доўгай, не па росце куртцы з падкасанымі рукавамі і чырвоным трохкутнікам вінкеля на грудзях. Яна хутка зірнула па баках, і ён заўважыў, як пад шапкаю чорных, даўнавата не стрыжаных валасоў радаснай жвавасцю бліснулі гэткія ж чорныя, нібы дзве масліны, вочы.
– Чао!

<…> яна, здаецца, зусім безуважная да небяспекі.

<…> таропка сунула ногі ў калодкі, якія дагэтуль трымала ў руках, і, заляскаўшы імі, падалася да яго.

Яна падатна і лёгка, ледзьве не ўпаўшы, шырока матлянулася за ім.

<…> коратка, нібы вінавата, зірнула на яго, у яе вачах бліснуў азарт і неслухмянасць распешчанай зухаватай дзяўчынкі.

<…> з-пад локця зірнула на яго ўгору вачыма, поўнымі не гневу, а нейкага гарэзнага здзіўлення.

Пасля зноў зірнула на яго і, па-дзіцячы няўмела выгаворваючы словы, нібы картавячы, паўтарыла ягоную лаянку.

– Ого!
– Ого, – паўтарыла, быццам перадражніла, яна.

Чарнявая прыгажосць гэтай дзяўчыны і незвычайная яе адвага ў гэтым іх болей чым складаным становішчы збівалі яго з тропу.

– Ты куды бяжыш? – хутка і сурова кінуў ён, пазіраючы ў дол, на яе падцятыя ў калодках цыбатыя ногі.
– Вас?
– Вас, вас! Куды бяжыш?
– Руссо бежішь – іх бежішь.

Ён спадылба кальнуў яе злосным позіркам, аднак на ўсім яе твары адбіваліся ўвага і старанне зразумець яго <…>.

<…> нават, здалося яму, чмыхнула: маўляў, што мне вісельня. І гэтая яе безразважная легкадумнасць.
– Смялячка! Расхрабрылася! Ну і бяжы! Толькі без мяне.

На нашых вачах адбываецца магія перамены жорсткага ваеннага тэксту ў твор, поўны весялосці Адраджэння.

Чыстым літаратурным мастацтвам В. Быкава і чарговай адсылкай да еўрапейскага выяўленчага мастацтва ў *Альпійскай баладзе* з'яўляецца наступная сцэна:

> Але і яго ногі, паколатыя на камянях і суччы, аж гарэлі знізу, асабліва дакучала ў хадзе л е в а я н а г а. Цяпер міжвольна прадаўжаючы хвіліну адпачынку, ён вырашыў паглядзець, што там, зазірнуў на вымытую дажджом падэшву.
> <…>
> У п я ц е б ы л а с т р э м к а, х л о п е ц п а с п р а б а в а ў в ы ц я г н у ц ь я е, д ы м і з э р н ы к о н ч ы к н і я к н е д а в а ў с я ў п а л ь ц ы.
> <…>
> Ён усё не мог узяцца за канец стрэмкі, і яна лёгенька і надзіва проста, па-таварыску прыгнулася, сцюдзёнымі тонкімі рукамі ашчаперыла яго вялізную ступню, пакалупалася ў ёй пальцамі і, раней чым ён паспеў даўмецца навошта, зубамі шчыпанула падэшву. Ён нерашуча тузануў нагу, але яна ўтрымала, зубы яе казытнулі па тоўстай скуры пяты, і, калі яна неўзабаве выпрасталася, у белых раўнюткіх яе зубах тырчала маленькая чорная стрэмка.
> Іван не здзівіўся і не падзякаваў, а, п а д ц я ў ш ы н а г у, з і р н у ў н а п я т у, п а ц ё р, п а с п р а б а в а ў н а с т у п і ц ь – с т а л а, з д а е ц ц а, л е п е й. Тады ён з ужо большай прыязнасцю, чым дагэтуль, паглядзеў на дзяўчыну, на яе мокры, смуглы і зноў ажывелы твар. Яна не адвяла ўсмешлівага сустрэчнага позірку, п а л ь ц а м і ў з я л а з з у б о ў с т р э м к у і п с т р ы к н у л а я е н а в е ц е р.

Напэўна, шмат хто ўзгадвае ў апісаных элементах (*падцятая левая нага, стрэмка ў пяце*) рымскую бронзавую скульптуру сярэдзіны I ст. да н. э., растыражаваную ў мармуровых, а нават гіпсавых версіях, – “Хлопчык, што вымае стрэмку”. Найбольш каштоўныя яе копіі захоўваюцца ў славутых музеях свету. Твор цытаваўся ў барэльефах і жывапісных палотнах. Яго нават прабавалі назваць інакш – “Нявольнік, што вымае стрэмку з нагі”. Вымала са сваёй памытай нагі стрэмку і Венера, а з кропляў крыві паўставалі чырвоныя кветкі. У культуры ўзнік сапраўдны культ антычнага хлопчыка, традыцыйна называнага Спінарыё. Нават натуршчыкі ў мастацкіх школах сядалі ў яго класічную позу. Не без іроніі можна дадаць, што ў СССР скульптура таксама стала культавай і з міжваенных часоў паўтаралася ў зонах адпачынку працоўных[13]. Напэўна, адносіны В. Быкава да славутага вобраза Спінарыё былі сакралізаваныя, паколькі пісьменнік марыў стаць мастаком і скульптарам. Антычная легенда робіць стрэмку ў пяце хлопчыка сімвалам гераічнай вытрымкі і пагарды да болю, які перашкаджае на шляху, але толькі калі мэце нішто не пагражае, стрэмку можна выцягнуць. Выцягванне стрэмкі сімвалізавала таксама і пазбаўленне ад памылак, што перашкаджалі ісці далей. Думаецца, што аналагічныя сэнсы ўкладаў сам В. Быкаў

[13] Напрыклад, створаная ў майстроўні Таганрогскага Дзяржкамгаса ў 1937 годзе, копія выявы антычнага хлопчыка была транспартаваная і ўсталяваная ў Нікіцкім батанічным садзе на Крымскім паўвостраве, пра што пішуць https://jalita.com/big_yalta/nikita/monuments.shtml.

у паэтычную антычную сцэну ў сваёй аповесці. Магчыма, у яго былі на той момант вельмі аптымістычныя спадзяванні на перамены ў час палітычнай адлігі ў СССР. Цікавай з’яўляецца і ягоная інтэрпрэтацыя гэтага вобразу ў сцэне са стрэмкай у *Альпійскай баладзе*.

Мы бачым, як вытанчана ў адным толькі абраным творы сплятае В. Быкаў сучаснасць і мінулае з перспектывай на будучыню, беларускую лакальнасць з еўрапейскай гуманістыкай, ніякім чынам не сыходзячы ў “войнакультуру”, малюючы іншыя карціны, чым толькі “гераічнае змаганне савецкага народа”. Цяпер быкаўскае слова “вайна” набывае глабальную філасофскую напоўненасць з трагізмам нялёкага вяртання да мірнай культурнай Еўропы. Нават выхад з мілітарызаванай краіны смерці вартуюць аўчаркі-цэрберы, з якімі, як у антычнай легендзе, каб жыць, трэба змагацца голымі рукамі.

Пры новым уважлівым прачытанні В. Быкаў становіцца правадніком еўрапейскага беларускага лёсу, задае яму безальтэрнатыўны напрамак, піша пра тое, што перадвызначанасць беларускага лёсу не ў тым, каб з ім змірыцца, а ў тым, каб рухацца далей па пакручастых сцяжынах. А можа, гэтая беларуская сцяжына не такая пакручастая, як нам падаецца, а спадарожнікаў пужаюць грозныя скалы, як у чарговай краявіднай замалёўцы выдатнага мастака слова – В. Быкава:

> Яны ўбачылі вышэй ад сябе голы, круты камяністы масіў і зусім побач на схіле сцежку. Яна бегла не ўніз і не ўгору, а асцярожна між камянёў прабілася наўскос па схіле. Была яна не дужа прыкметная ў гэтым хаосе скал <…>.

Мы ж праз новыя падыходы атрымліваем магчымасць пераканацца на прыкладзе творчасці В. Быкава, што таленавіты сумленны аўтар нават пры палітычна ўзалежненых умовах кіруецца выключна высокімі агульначалавечымі крытэрамі мастацкага твора.

References

Barszczewski Aleksander. 1994. *Wasil Bykau – pisarz żołnierskiego losu*, W: *W kręgu kultury białoruskiej. Studia i rozprawy*. Olsztyn: 73–82.

Gregorek Leopold. 1995. *Hiszpański syndrom Adama Mickiewicza*. „Zeszyty Naukowe Wyższej Szkoły Pedagogicznej w Bydgoszczy: Studia Filologiczne”, z. 38: *Filologia polska* (16): 51–76.

Maksimovič Valerij. 2018. *Tvorczestvo Vasila Bykova: ekzistencialnyj dyskurs*. „Studia Rossica Gedanensia” 5: 135–146 [Максимович Валерий. 2018. *Творчество Василя Быкова: экзистенциальный дискурс*. „Studia Rossica Gedanensia” 5: 135–146].

Moskwin Andriej. 2019. *Literatury białoruskiej rodowody niepokorne*. Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku.

Rdzanek Katarzyna. 2015. *O różnorodności kategorii przestrzennych*. „Teksty Drugie” 6: 141–150.

STRESZCZENIE: Artykuł poświęcony jest nowemu odbiorowi twórczości literackiej W. Bykawa (1924–2003), wybitnego prozaika białoruskiego, który jest uważany za kombatanta II wojny światowej piszącego o niej w sposób wyjątkowo realistyczny, tragiczny i autobiograficzny. O W. Bykawie, nominowanym do Literackiej Nagrody Nobla, napisano wiele solidnych prac naukowych. Autorka artykułu uważa jednak utrwalone w krytyce literackiej pozycje za polemiczne i wprowadza kilka aktualnych kategorii literaturoznawczych i społecznych, żeby pokazać twórczość pisarza zupełnie z innej strony, gdzie nie chodzi o pamięć wojenną, lecz o wojnę jako zwrot wyobrażony, metaforyczny, a nawet ukrywający prawdziwe treści autorskie. Niestety czytelnicy do dnia dzisiejszego nie rozpoznają wielu metafor i alegorii W. Bykawa, więc proza jego, nawet w przeddzień 100-letniej rocznicy pisarza, może być zakwalifikowana do „tekstów nieprzeczytanych". Właśnie dlatego powstała potrzeba nowego spojrzenia na W. Bykawa w oparciu na podanie czytelnikowi konkretnych środków literackich, które stosuje pisarz w jednym ze swoich wybitnych tekstów prozaicznych – *Alpejskiej balladzie* (1963), oraz za pomocą niektórych metod interpretacyjnych pokazać czytelnikowi, jak W. Bykaw ujawnia swoją głęboką znajomość kultury europejskiej i czyni to jako podstawę własnej twórczości, posługuje się rozmaitą i skomplikowaną stylistyką. Z rozważań w artykule wynika, że głównym tematem twórczości W. Bykawa jest patriotyczna troska o zmianę kierunku polityki państwa, w tym zaniechanie represji i powrót do wspólnych korzeni europejskich.

SŁOWA KLUCZOWE: „wojnokultura", fantomy historyczne, historia i geografia wyobrażana, mistrzowska stylistyka tekstu, literacki plan ucieczki i powrotu do domu.

АНАТАЦЫЯ: Артыкул прысвечаны новаму прачытанню літаратурнай творчасці В. Быкава (1924–2003), выдатнага беларускага празаіка, які ўспрымаецца як ветэран вайны 1941–1945 гг., што піша пра яе выключна трагічна, рэалістычна і аўтабіяграфічна. Пра В. Быкава, намінанта на Нобелеўскую прэмію, напісана шмат салідных навуковых прац. Аднак аўтарка артыкула лічыць прынятыя ў літаратуразнаўстве пазіцыі палемічнымі і ўводзіць некалькі актуальных літаратуразнаўчых і сацыяльных катэгорый, каб паказаць творчасць пісьменніка зусім з іншага боку, дзе гаворка вядзецца не пра ваенную памяць, а пра вайну ўяўную, выкарыстаную метафарычна, што хавае сапраўдны змест аўтарскага твора. На жаль, многія метафары і алегорыі В. Быкава чытачы і сёння не распазнаюць, таму яго прозу, нават напярэдадні 100-годдзя пісьменніка, можна аднесці да "непрачытаных тэкстаў". У сувязі з чым узнікла неабходнасць новага прачытання В. Быкава, каб паказаць чытачу спецыфічныя літаратурныя сродкі, якія пісьменнік выкарыстоўвае ў адным са сваіх выдатных твораў – *Альпійскай баладзе* (1963), а таксама з дапамогай некаторых інтэрпрэтацыйных прыёмаў патлумачыць чытачу, як В. Быкаў выяўляе сваё глыбокае веданне еўрапейскай культуры і робіць яе падставаю ўласнай творчасці. З развагаў у артыкуле вынікае, што асноўнай тэмай творчасці В. Быкава з'яўляецца патрыятычны клопат аб змене палітычнага кірунку дзяржавы, адмаўленне ад рэпрэсій і вяртанне да агульнаеўрапейскіх каранёў і вартасцяў.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: "войнакультура", фантомы гісторыі, уяўная гісторыя і геаграфія, майстэрскі стыль тэксту, літаратурны план уцёкаў і вяртання дадому.

Data przesłania artykułu: 30.05.2024
Data akceptacji artykułu: 20.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Inesa Kuryan – Polska, AHE w Łodzi, doktor nauk humanistycznych; specjalność naukowa: językoznawstwo polskie i białoruskie; zainteresowanie naukowe: polszczyzna i kultura Kresów Północno-Wschodnich.

Wybrane publikacje (2023–2024)

1. Kuryan Inesa. 2023. *Powieść Voranca Prežihova Doberdob w nowej interpretacji literackiej* (133–140)*. Slovenska literatura in umetnost v družbenih kontekstih*. Obdobja 42. Ljubljana, Založba Univerze v Ljubljani.
2. Kuryan Inesa. 2023. *Badania topiki unionistycznej w polskiej literaturze* „Literaturoznawstwo” nr 14, AHE w Łodzi: 6–11.
3. Kuryan Inesa. 2024. *Powieści Tadeusza Dołęgi-Mostowicza jako teksty autobiograficzne: uzupełnienie życiorysu oraz kompleksu ideowo-twórczego autora* (193–204). W: *Egodokumenty – samoświadectwa – egodokumentalność. Teoria i praktyka*. Toruń, Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika.

STUDIA i ARTYKUŁY

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Vieranika Bandarovich, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.2

Vieranika Bandarovich / Вераніка Бандаровіч

Badaczka niezależna / Independent researcher
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-1985-1759
e-mail: litarcoffee@gmail.com

Самаідэнтыфікацыя і моўныя прыярытэты беларускай моладзі 20-х гг. XXI ст.

Self-identification and linguistic priorities of Belarusian youth in the 20s of the 21st century
Samoidentyfikacja i priorytety językowe białoruskiej młodzieży w latach 20. XXI wieku

ABSTRACT: This study is the third in a series conducted among students of non-philological specialities of the Belarusian State University in 2022–2023. The subject of the study was the attitude of modern Belarusian youth to the Belarusian language and its place in the lives of young people of the 20s of the 21st century, self-identification of Belarusian students. In connection with the processes that have been taking place in Belarusian society since 2020, the topics of the place of the Belarusian language in it and self-determination of youth seem extremely relevant and promising for development. The purpose of the study was to identify the level of proficiency in the Belarusian language of non-philological students of the BSU, their assessment of both their own knowledge and teaching in secondary educational institutions of Belarus. The emotional component was also important: how does a modern young person relate to everything Belarusian and Belarusian-speaking in his environment, whether he has such an environment at all, whether he applies knowledge of the Belarusian language in practice, whether he considers himself to be part of the Belarusian nation. The study was conducted through anonymous questionnaires. The questionnaire was prepared by the author of this work for a practical purpose (to know the level of the audience with whom it will be necessary to work) and for a scientific purpose (to formalize the results of the research in an article). The results of the analysis of the answers to the questions of the questionnaire showed that it is not necessary to be Belarusian by origin to consider oneself Belarusian. The respondents defined both their own level of proficiency in the Belarusian language and the general level of its teaching as average; noted the insufficient number of Belarusian-speaking environment; revealed a high degree of their own responsibility for the fate of the titular language of the nation.

KEYWORDS: Belarusian language, questionnaire, Belarusian youth, Belarusian-speaking environment, nation, self-identification.

Пачатак XXI ст. у сусветным маштабе надзвычай багаты на падзеі, выклікі ды пагрозы. Каб выяўляць тэндэнцыі і прагназаваць будучыню, навукоўцы розных галін ведаў, у тым ліку лінгвісты, уключаюцца ў разнастайныя даследаванні сучаснага грамадства. Прадметам іх становяцца не толькі палітычныя, эканамічныя з'явы ды пытанні, але і надзвычай актуальныя нацыянальныя, моўныя праблемы, самаідэнтыфікацыя сучаснай моладзі, задача якой – стварацца будучыню.

Лінгвісты на тэрыторыі Беларусі і беларусы за межамі краіны на працягу апошняга дваццацігоддзя праводзілі апытанні сярод насельніцтва, канферэнцыі, круглыя сталы, абаранялі навуковыя работы па тэмах, звязаных са стаўленнем да тытульнай мовы нацыі, яе ролі ў грамадстве, з прыярытэтамі сучасных маладых людзей. Адно з самых значных падобных даследаванняў – кандыдацкая дысертацыя Алены Лянкевіч *Беларуская мова і змешаныя коды ў сацыялінгвістычным і псіхалінгвістычным аспектах: катэгорыя адносін да мовы ў грамадстве* [Лянкевіч 2014]. Варта адзначыць і сацыялагічныя апытанні як дзяржаўных беларускіх (Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі, Цэнтр сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ і інш.), так і недзяржаўных інстытуцый (лабараторыя "НовАК" і інш.), вынікі якіх з розных бакоў акрэсліваюць у тым ліку і сучасную моўную сітуацыю ў Беларусі [*37% беларусаў 2010*, online; *Аналітык БІСД* 2021, online; *Вынікі* 2009, online; Нікалаева 2021].

У дадзеным даследаванні мелася на мэце выявіць стаўленне сучаснай моладзі да беларускай мовы і яе месца ў жыцці маладых людзей 20-х гг. XXI ст., таксама важна было даведацца, як яны сябе ідэнтыфікуюць, кім лічаць і жадаюць каб іх успрымалі з пункту погляду нацыянальнасці.

Даследаванне – трэцяе і заключнае з шэрагу намі праведзеных за час працы са студэнтамі БДУ (2022–2023 гг.), – як і папярэднія, засноўваецца на анкетаванні студэнтаў-нефілолагаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, гэтым разам толькі геаграфічнага факультэта з улікам студэнтаў ваеннага факультэта, якія (паводле вучэбнай праграмы) наведвалі заняткі па беларускай мове (курс "Беларуская мова. Прафесійная лексіка") разам са студэнтамі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі спецыяльнасці "геаінфармацыйныя сістэмы". Вынікі першага падобнага даследавання былі прадстаўлены на канферэнцыі кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта „Język, literatura i kultura Białorusi. Z okazji 140. rocznicy urodzin klasyków literatury białoruskiej – Janki Kupały (1882–1942) i Jakuba Kołasa (1882–1956)" у чэрвені 2022 г. і апублікаваны ў зборніку да 65-годдзя гэтай кафедры *Спазнаючы Беларусь... Да 65-годдзя беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта* (Warszawa, 2023) [Бандаровіч 2023а: 198–214]. Вынікі другога агучваліся на канферэнцыі "Wielokulturowość

Europy Środkowo-Wschodniej: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości. Z okazji 20. rocznicy utworzenia Katedry Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej" (Warszawa, 13–14 października 2022), якую праводзіла кафедра міжкультурных даследаванняў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе Варшаўскага ўніверсітэта, і апублікаваны ў часопісе "Przegląd Środkowo-Wschodni" за 2023 г. [Бандаровіч 2023b: 277–294].

Вынікі 3-га, апошняга, анкетавання прапануюцца далей у табліцы.

Зводная табліца з вынікамі анкетавання студэнтаў-географаў БДУ за 07.02–28.02.2023

усяго апрацавана 85 анкет

1. Хто Вы па паходжанні?	бел. **76**	небел. **8**	не ведаю **1**
2. Кім сябе адчуваеце?	бел. **78**	небел. **4**	не ведаю/ цяжка адказаць **3**
3. Ці вывучалі бел. мову раней?	так **85**	не **–**	**–**
4. Дзе вывучалі?	дома **16 = 18,8 %**	у дзіц. садку **12** у школе / гімназіі **84** у ліцэі / каледжы **5**	не пазначана **1**
5. Узровень выкладання б. мовы ў школе/гімназ.	вельмі нізкі **–** нізкі **7**	сярэдні **39** вышэй за сярэдні **23**	высокі **14** вельмі высокі **2**
6. Ці здавалі экз./ЦТ па б. мове?	так **35**	не **50**	няма адказу **–**
7. Як ацэньваеце веданне б. мовы?	нездав. **10**	здавальн. **47 = 55,2 %**	добра **27** выдатна **1**
8. Як выкарыстоўваеце б. мову ў жыцці?	усюды і заўсёды **1** толькі дома **8** у бел/моўным асяроддзі **52**	выбіраю бел. мову у банкамаце **15** раблю запыты ў інтэрнэце **9** чытаю бел. маст. літ. **27**	не разм., не чыт., не пішу, але ХАЧУ **2** не разм., не чыт., не пішу і НЕ ХАЧУ **3**

9. Ці важная б. мова ў навакольным жыцці?	вельмі важная **26 = 30,5 %** важная **33 = 38,3 %**	не важная **4 = 4,7 %**	усё роўна **22 = 25,8 %**
10. Ці трэба б. мовы больш у ВНУ?	так **52 = 61 %**	не **30**	цяжка адказаць **3**
11. Што для Вас бел. мова?	атрыбут асобн. дзярж. **43 (4) = 50,5 %** атрыбут асобн. народа **62 (16) = 80 %**	каштоўнасць, якую варта зберагаць **55 (7) = 64,7 %** проста традыцыя **8 (4) = 9,4 %**	прадмет у навуч. установе **7 (1) = 8,2 %** нічога **–**
12. Што рабіць, каб б. мовай карысталіся ўсе?	кожнаму карыстацца мовай **39 = 45,8 %**	залежыць ад кіраўніцтва **23 = 27 %** залежыць ад кіраўніцтва і ад кожнага (2 адказы разам) **11,7 %**	навошта гэта рабіць? **6 = 7 %** свой адказ (асобна або разам з іншым): **19** адказаў = **22,3 %**

На пэўныя пытанні анкеты можна было даваць па некалькі адказаў, чым і скарысталіся рэспандэнты. Варта асобна пракаментаваць некаторыя вынікі апытання.

2-е пытанне “Кім сябе адчуваеце?”: у параўнанні з адказамі на першае пытанне атрымліваецца цікавая сітуацыя – адчуваюць сябе беларусамі больш рэспандэнтаў, чым пазначылі сябе беларусамі па паходжанні.

4-е пытанне “Дзе вывучалі беларускую мову?”: некалькі адказаў пазначылі 28 апытаных. З іх мінімум 3 першыя пункты пазначылі 5 апытаных; без першага пункта – 10 адказаў. Толькі ў школе / гімназіі вывучалі 57 чалавек. Толькі дома – 1.

Адзін адказ НЕбеларускі, якая не ведае, кім сябе адчувае, такі: “Быў беларускамоўны малады чалавек, які дапамог больш усіх пры вывучэнні”[1].

7-е пытанне “Як ацэньваеце сваё веданне беларускай мовы?”: шмат выпадкаў (30), калі рэспандэнты пазначаюць “нездавальняюча” або “здавальняюча”, а расшыфроўкай адказу выбіраюць “успрымаю на слых беларускую мову і пішу *добра*”, што, магчыма, сведчыць пра пэўны перфекцыянізм беларусаў, неадэкватную, заніжаную самаацэнку. Пры гэтым пазначаюць адказ “добра” або “выдатна” і расшыфроўку “ўспрымаю

[1] Тут і далей арфаграфія і пунктуацыя арыгінальных адказаў захаваныя.

на слых беларускую мову і пішу добра" 26 чалавек. Ёсць і адваротныя прыклады (іх 2): калі пазначаюць адказам "добра", а расшыфроўку даюць "успрымаю на слых беларускую мову добра, а пішу з цяжкасцю".

Звяртаюць на сябе ўвагу і такія адказы:

* небеларуска, якая не ведае, кім сябе адчувае, вывучала беларускую мову ў школе з дапамогай беларускамоўнага маладога чалавека пазначае адказам на 7 пытанне "здавальняюча", расшыфроўвае як "успрымаю беларускую мову на слых добра, а пішу з цяжкасцю" і дадае "чытаю добра, таму што шмат добрых аўтараў" – на наш погляд, вельмі каштоўны каментар;

* беларус, які лічыць сябе беларусам і вывучаў беларускую мову, ацэньвае свае веды на "здавальняюча" выбірае наступныя расшыфроўкі: "успрымаю на слых беларускую мову добра, а пішу з цяжкасцю" і "не размаўляю, не чытаю і не пішу па-беларуску і не хачу гэтага рабіць";

* беларус, які не адчувае сябе беларусам, вывучаў беларускую мову і ў дзіцячым садку, і ў школе, ацэньвае сваё веданне беларускай мовы "нездавальняюча", аднак расшыфроўкамі выбірае "ўспрымаю на слых беларускую мову і пішу добра" і "не размаўляю, не чытаю і не пішу па-беларуску і не хачу гэтага рабіць" – тут бачацца супярэчнасці, мяркуючы па далейшых адказах, нелюбоў да беларускай мовы прывілі настаўнікі і чалавек не жадае выкарыстоўваць трасянку, каментуе: «Либо чистый русский, либо белорусский»;

* усяго адказаў, дзе выбіраюць расшыфроўку "не размаўляю, не чытаю і не пішу па-беларуску і не хачу гэтага рабіць" – 3; пры гэтым расшыфроўку "не размаўляю, не чытаю і не пішу па-беларуску, але хацелася б" выбралі 2 рэспандэнты.

8-е пытанне – "Як выкарыстоўваеце беларускую мову ў жыцці?". Вядуць інстаграмную сетку на беларускай мове – 2 рэспандэнты. Сістэмная мова тэлефона беларуская – у 3-х рэспандэнтаў. Часам з сябрамі размаўляюць па-беларуску – 5 апытаных. Толькі на вучэбных занятках па беларускай мове гавораць па-беларуску – 3 рэспандэнты. А вось ніколі / ніяк не карыстаюцца беларускай мовай у жыцці – 9 апытаных.

Найбольш рэспандэнтаў карыстаюцца беларускай мовай у беларускамоўным асяроддзі, а другі па папулярнасці адказ на гэтае пытанне – чытаю беларускую мастацкую літаратуру. Такім чынам, каб пачаць размаўляць па-беларуску сучаснаму маладому чалавеку ў Беларусі патрэбна, каб навакольныя таксама размаўлялі. Падобнае ўжо было заўважана ў даследаванні 2009 года Надзеі Яфімавай і Віталя Сіліцкага, напрыклад [*Вынікі* 2009, online], а таксама ў згаданай дысертацыі А. Лянкевіч [Лянкевіч 2014]. Такая з'ява носіць у сацыялогіі назву "спіраль маўчання"

[*Спіраль маўчання*, online]. Гэта значыць, калі чалавек бачыць, што большасць думае ці робіць інакш, чым ён, то гэты чалавек свой пункт погляду выказваць не будзе, а далучыцца да большасці. Так, людзі схільныя прыхоўваць свае альтэрнатыўныя меркаванні, калі адчуваюць, што асяроддзе думае інакш.

9-е пытанне – "Ці важная беларуская мова ў навакольным жыцці?". У параўнанні з вынікамі папярэдніх двух апытанняў з вялікім адрывам лідзіруюць адказы "важная" і "вельмі важная" і параўнальна няшмат тых, каму ўсё роўна. Гэта ўсяляе пэўныя надзеі на моладзь.

11-е пытанне – "Што для Вас беларуская мова?". У асноўным (52 рэспандэнты) адзначалі па некалькі адказаў. Таксама ў табліцы ў графах, што адносяцца да гэтага пытання, у дужках паказана колькасць рэспандэнтаў, якія выбралі толькі адзін пэўны адказ. Такім чынам, усе адказы БЕЗ "атрыбут асобнай дзяржавы" – 42. Усе адказы, якія ўтрымліваюць "атрыбут асобнай дзяржавы" і "атрыбут асобнага народа" – 34. Усе адказы – БЕЗ "атрыбут асобнай дзяржавы" і "атрыбут асобнага народа" – 14.

На 12-е пытанне "Што рабіць, каб беларускай мовай карысталіся ўсе?" можна было даць свой адказ.

Свае адказы:

1. "Варта пачаць з сябе, сваім прыкладам паказаць, што мова – гэта адно з найважнейшых прыняццяў сябе як беларуса. Размаўляць на мове ў сваім асяродзі".

2. "На мой погляд беларуская мова знаходзіцца ў вельмі [страшным?] становішчы, і на цяперашні час мы не маем комплекс мер, якія б зручна паўплывалі на карыстанне беларускай мовы".

3. "З малых гадоў вывучаць дзяцей беларускай мове. Рускую мову зрабіць менее (важнай) для вывучання".

4. "Перавесці сістэму адукацыі пачынаючы з дзіцячага садка на беларускую мову, тады новыя пакаленні будуць пераважна размаўляць па-беларуску спачатку ў сваім асяроддзі, а потым гэта перайдзе і на астатняе грамадства".

5. "Прыняць <...> закон аб скасаванні двухмоў'я і аб выключным выкарыстанні адзінай дзяржаўнай мовы афіцыйнымі асобамі, на ТБ і г. д.".

6. "Распаўсюджваць беларускую мову; карыстацца ёю ў ва ўсіх выпадках; перацягваць сваякоў, сяброў у карыстанне роднай мовай. Пазбавіць рускую мову статусу дзяржаўнай мовы".

7. "Забараніць рускую мову".

8. “Калі кіраўніцтва зробіць беларускую мову адзінай у дзяржаве, будзе лепей, шмат людзей пераходзяць і размаўляюць”.

9. “Палюбіць мову”.

10. “Зрабіць адзінай дзяржаўнай мовай, далучаць да роднай мовы з дзяцінства”.

11. “Больш ужываць беларускую мову ў жыцці. Рабіць больш рэкламы і інш.”.

12. “Правесці палітыку беларусізацыі. Вывучаць мову з дзяцінства. Размаўляць на роднай мове кожны дзень”.

13. “Адводзіць больш часу на вывучэнне роднай мовы ў школах, ліцэях і г. д. Уводзіць родную мову ў паўсядзённую жызнь”.

14. “Стварацъ беларускамоўнае асяроддзе”.

15. “Зрабіць беларускую мову адзінай ва ўсёй краіне”.

16. “Трэба зрабіць мову адзінай афіцыйнай, але, на пачатак, зрабіць навучанне (школы і ўніверсітэты) толькі на беларускай мове, крамы і іншая сфера паслуг толькі на мове”.

17. “Праводзіць мерапрыемствы па-беларуску, у краме размаўляць па-беларуску, а таксама, каб этыкеткі і ўсе другое было па-беларуску”.

18. “Я лічу, што беларускую мову трэба ведаць кожнаму чалавеку, які нарадзіўся ў цудоўнай краіне Беларусь. Гэта наша (мова) гісторыя, традыцыя, незалежнасць, адметнасць, прыгажосць Беларусі. Кожнага чалавека немагчыма завлеч (навязаць) гаварыць по-беларуску. Больш яе выкарыстоўваць (зрабіць яму патрэбную срэду, дзе будуць карыстацца мовай)”.

19. «Не стоит быть таким особым в языке, лучше разговаривать на всем понятном языке, а белорусский просто знать на слух».

Некаторыя, на наш пункт погляду, найбольш значныя вынікі 3-х апытанняў, праведзеных у 2022 і 2023 гг., былі параўнаны і зведзены ў табліцу.

Параўнанне вынікаў 3-х апытанняў

Час апыт. / **Важныя пыт.**	**Люты – травень 2022**	**Верасень 2022**	**Люты 2023**
Беларуская мова вельмі важная або проста важная для:	**50,4 %** рэспандэнтаў	**65 %** рэспандэнтаў	**69,4 %** рэспандэнтаў
Беларускай мовы трэба больш у ВНУ для:	**40,5 %** рэспандэнтаў	**57,5 %** рэспандэнтаў	**61 %** рэспандэнтаў

Час апыт. / Важныя пыт.	Люты – травень 2022	Верасень 2022	Люты 2023
Беларуская мова – атрыбут асобнага народа для:	**32,3 %** рэспандэнтаў	**72,5 %** рэспандэнтаў	**80 %** рэспандэнтаў
атрыбут асобнай дзяржавы для:	**25,4 %** рэспандэнтаў	**32,5 %** рэспандэнтаў	**50,5 %** рэспандэнтаў
каштоўнасць для:	**28,9 %** рэспандэнтаў	**57,5 %** рэспандэнтаў	**64,7 %** рэспандэнтаў
Што трэба, каб бел. мовай карысталіся ўсе і заўсёды? Навошта гэта? – для:	**19,8 %** рэспандэнтаў	**17,5 %** рэспандэнтаў	**7 %** рэспандэнтаў
Залежыць ад кіраўніцтва для:	**31,4 %** рэспандэнтаў	**27,5 %** рэспандэнтаў	**27 %** рэспандэнтаў
Залеж. ад кожн. з нас:	**52,8 %** рэспандэнтаў	**35 %** рэспандэнтаў	**45,8 %** рэспандэнтаў

Такое параўнанне выявіла наступныя тэндэнцыі: павышэнне значэння беларускай мовы ў жыцці маладых людзей; з часам усведамляецца ўсё большае значэнне беларускай мовы як атрыбута асобнай дзяржавы; у 2023 г. у параўнанні з 2022 аказалася нашмат менш абыякавых да беларускай мовы ў навакольным асяроддзі апытаных; і па-ранейшаму самы папулярны адказ на пытанне пра лёс беларускай мовы "залежыць ад кожнага з нас".

Па словах аднаго з рэспандэнтаў, у справе падтрымкі беларускай мовы "варта пачаць з сябе...". Вельмі важна, што гэтая думка, калі не гучыць літаральна, дык прасочваецца з апытання ў апытанне і сведчыць пра ўсведамленне адказнасці маладых беларусаў у Беларусі на пачатку XXI ст. за лёс беларускай мовы. Яшчэ 10–15 гадоў таму асноўная адказнасць ускладалася на кіраўніцтва краінай [Міхайлоўская 2015]. Хоць на практыцы карыстацца актыўна беларускай мовай маладыя людзі схільныя хутчэй у беларускамоўным асяроддзі (тое ж паказвалі вынікі папярэдніх даследаванняў), якога, з аднаго боку, бракуе на сённяшні дзень у Беларусі, але, з іншага, сама ж моладзь і сярэдняе пакаленне яго нават у складанай цяперашняй сітуацыі ствараюць самастойна, афлайн

і анлайн. Што матывуе? Усведамленне сябе адметнымі, імкненне больш ведаць пра сябе, пра Беларусь і яе гісторыю ў эпоху глабалізацыі нават сярод тых, хто ў анкеце пазначыў, што па паходжанні небеларус.

References

37% belarusaŭ ličac', što movy peravažna ne hapae ŭ sfery rèklamy. 2010. Marketing.by. 24 maâ [online] https://marketing.by/novosti-rynka/37-belarusa-lichats-shto-movy-peravazhna-ne-khapae-sfery-reklamy/ [доступ: 22.05.2024] [*37% беларусаў лічаць, што мовы пераважна не хапае ў сферы рэкламы*. 2010. Marketing.by. 24 мая].

Analìtyk BÌSD: u belaruskaj moladzì vyrazna sfarmìravana nacyânal'naâ ì gramadzânskaâ ìdèntyčnasc'. 2021. Belta, 3 snežnâ [online] https://blr.belta.by/society/view/analityk-bisd-u-belaruskaj-moladzi-vyrazna-sfarmiravana-natsyjanalnaja-i-gramadzjanskaja-identychnasts-107682-2021/ [доступ: 22.05.2024] [*Аналітык БІСД: у беларускай моладзі выразна сфарміравана нацыянальная і грамадзянская ідэнтычнасць*. 2021. БелТА, 3 снежня].

Bandarovìč Veranìka. 2023a. *Belaruskaâ mova ŭ nefìlalagìčnym studènckìm asâroddzì Belaruskaga dzâržaŭnaga ŭnìversìtèta* (198–214). U: *Spaznaûčy Belarus'... Da 65-goddzâ belarusìstykì Varšaŭskaga ŭnìversìtèta*. Warszawa [Бандаровіч Вераніка. 2023а. *Беларуская мова ў нефілалагічным студэнцкім асяроддзі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта* (198–214). У: *Спазнаючы Беларусь... Да 65-годдзя беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта*. Warszawa].

Bandarovìč Veranìka. 2023b. *Mesca belaruskaj movy ŭ sučasnaj Belarusì.* "Przegląd Środkowo-Wschodni" t. 8: 277–294 [Бандаровіч Вераніка. 2023б. *Месца беларускай мовы ў сучаснай Беларусі*. "Przegląd Środkowo-Wschodni" t. 8: 277–294].

Lânkevič Alena. 2014. *Belaruskaâ mova i zmešanyâ kody ŭ sacyâlingvistyčnym i psihalingvistyčnym aspektah: katègoryâ adnosin da movy ŭ gramadstve*: dys. kand. filal. navuk: 10.02.01, 10.02.19. Belarus. dzârž. un-t. Minsk [Лянкевіч Алена. 2014. *Беларуская мова і змешаныя коды ў сацыялінгвістычным і псіхалінгвістычным аспектах: катэгорыя адносін да мовы ў грамадстве*: дыс. канд. філал. навук: 10.02.01, 10.02.19. Беларус. дзярж. ун-т. Мінск].

Mìhajloŭskaâ Snâžana. 2015. *Belaruskaâ mova: karystal'nìkì ì pryhìl'nìkì*. "Belaruskaâ dumka" № 4: 52–57 [Міхайлоўская Сняжана. 2015. *Беларуская мова: карыстальнікі і прыхільнікі*. "Беларуская думка" № 4: 52–57].

Nìkalaeva Nadzeâ. 2021. *Šmat pracavac' ì stac' prafesìânalam 08.12.2021* [online] https://zviazda.by/be/news/20211208/1638967363-shmat-pracavac-i-stac-prafesiyanalam [доступ: 18.05.2024] [Нікалаева Надзея. 2021. *Шмат працаваць і стаць прафесіяналам. 08.12.2021*].

*Spìral' maŭčannâ. "*Skarbnìca sènsaŭ" [online] https://www.zhalevich.com/by/skarbnica/spiral-maucanna.html [доступ: 20.05.2024] [*Спіраль маўчання.* "Скарбніца сэнсаў"].

Vynìkì sacyâlagìčnaga dasledavannâ "Nacyânal'naâ ìdèntyčnasc' vačamì belarusaŭ: hto my ì âkìmì my budzem?". 2009. BUDZMA.by. 14 kastryčnìka [online] https://budzma.org/news/vyniki-prezientacyi-sacyjalahichnaha-dasliedvannia-2009.html [доступ: 18.05.2024] [*Вынікі сацыялагічнага даследавання "Нацыянальная ідэнтычнасць вачамі беларусаў: хто мы і якімі мы будзем?"*. 2009. BUDZMA.by. 14 кастрычніка].

STRESZCZENIE: Niniejsze badanie jest trzecim z cyklu analiz przeprowadzonych wśród studentów kierunków niefilologicznych na Białoruskim Uniwersytecie Państwowym (BUP) w latach 2022–2023. Przedmiotem badań był stosunek współczesnej

młodzieży białoruskiej do języka białoruskiego i jego miejsca w życiu młodych ludzi lat 20. XXI w., a także samoidentyfikacja białoruskich studentów. W związku z procesami zachodzącymi w społeczeństwie białoruskim od 2020 r. tematyka miejsca języka białoruskiego i samoidentyfikacji młodzieży wydaje się niezwykle aktualna i perspektywiczna. Celem badania była identyfikacja poziomu znajomości języka białoruskiego wśród studentów kierunków niefilologicznych na BUP oraz ocena zarówno ich wiedzy własnej, jak i nauczania w szkołach średnich na Białorusi. Istotny był także komponent emocjonalny: jak współczesny młody człowiek odnosi się do wszystkiego, co białoruskie i białoruskojęzyczne w swoim otoczeniu, czy w ogóle takie środowisko ma, czy wykorzystuje w praktyce znajomość języka białoruskiego, czy uważa się za Białorusina. Badanie przeprowadzono metodą anonimowej ankiety. Kwestionariusz został przygotowany przez autorkę artykułu w celach praktycznych (aby poznać poziom odbiorców, z którymi miała pracować) i naukowych (aby na podstawie wyników badań napisać artykuł). Wyniki analizy odpowiedzi na pytania zawarte w ankiecie wykazały, że nie trzeba być Białorusinem z pochodzenia, aby uważać się za Białorusina. Respondenci zarówno swój własny poziom znajomości języka białoruskiego, jak i ogólny poziom jego nauczania określili jako przeciętny; podkreślili niewystarczającą liczbę środowisk białoruskojęzycznych, ujawnili wysoki stopień własnej odpowiedzialności za losy tytularnego języka narodu.

SŁOWA KLUCZOWE: język białoruski, ankieta, młodzież białoruska, środowisko białoruskojęzyczne, naród, samoidentyfikacja.

АНАТАЦЫЯ: Дадзенае даследаванне – трэцяе з цыкла праведзеных сярод студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2022–2023 гг. Прадметам даследавання сталі адносіны сучаснай беларускай моладзі да беларускай мовы і яе месца ў жыцці маладых людзей 20-х гг. XXI ст., самаідэнтыфікацыя беларускіх студэнтаў. У сувязі з працэсамі, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве пасля 2020 г., тэмы месца ў ім беларускай мовы і самавызначэння моладзі бачацца надзвычай актуальнымі і перспектыўнымі для распрацоўкі. За мэту даследавання ставілася выяўленне ўзроўню валодання беларускай мовай студэнтаў-нефілолагаў БДУ, ацэнка імі як уласных ведаў, так і выкладання ў сярэдніх навучальных установах Беларусі. Таксама важны быў эмацыйны складнік: як сучасны малады чалавек ставіцца да ўсяго беларускага і беларускамоўнага ў сваім акружэнні, ці мае ўвогуле такое акружэнне, ці прымяняе веды па беларускай мове на практыцы, ці адносіць сябе да беларускай нацыі. Даследаванне праводзілася шляхам ананімнага анкетавання. Анкета была падрыхтаваная аўтарам дадзенай працы з практычнай мэтай (ведаць узровень аўдыторыі, з якой давядзецца працаваць) і з навуковай (аформіць вынікі анкетавання ў артыкул). Вынікі аналізу адказаў на пытанні анкеты паказалі, што неабавязкова быць беларусам па паходжанні, каб лічыць сябе беларусам. Рэспандэнты вызначылі і ўласны ўзровень валодання беларускай мовай, і агульны ўзровень выкладання яе як сярэдні; адзначылі недастатковую колькасць беларускамоўных асяродкаў у Беларусі; выявілі высокую ступень уласнай адказнасці за лёс тытульнай мовы нацыі.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: беларуская мова, анкета, беларуская моладзь, беларускамоўнае асяроддзе, нацыя, самаідэнтыфікацыя.

Data przesłania artykułu: 20.07.2024
Data akceptacji artykułu: 30.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Vieranika Bandarovich / Вераніка Бандаровіч – Mińsk, Białoruś, badaczka niezależna; dr filologii; specjalność naukowa: historia języka białoruskiego; zainteresowania naukowe: językoznawstwo, socjolingwistyka, historia języków słowiańskich, etymologia.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Бандаровіч Вераніка. 2023. *Беларуская мова ў нефілалагічным студэнцкім асяроддзі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта* (198–214). У: *Спазнаючы Беларусь... Да 65-годдзя беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта*. Warszawa.
2. Бандаровіч Вераніка. 2023. *Месца беларускай мовы ў сучаснай Беларусі.* „Przegląd Środkowo-Wschodni" t. 8: 277–294.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Aksana Danilchyk, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.3

Aksana Danilchyk / Аксана Данільчык

Badaczka niezależna / Independent researcher
ORCID: http://orcid.org/0000-0002-1561-588X
e-mail: aksana.minsk@gmail.com

Актуалізацыя тэкстаў жаночай паэзіі міжваеннага перыяду і мадэляванне канона беларускай літаратуры

Actualization the texts of women's poetry of the interwar period and modeling the canon of Belarusian literature
Aktualizacja tekstów poezji kobiecej okresu międzywojennego i modelowanie kanonu literatury białoruskiej

ABSTRACT: The article examines the problem of modeling the retrospective literary canon of Belarusian literature of the 20th century through publishing strategies aimed at updating the work of Belarusian poetesses of the interwar period, using the example of the publication of books of selected works by Zinaida Bandaryna, Jaŭhenija Pfljaŭmbaŭm, Natallja Višneŭskaja by the women's publishing initiative "Pfljaŭmbaŭm". The relevance of the topic is determined by the need to understand the theoretical problem of forming a literary canon, taking into account gender balance, and bridging the gap in the historiography of Belarusian women's poetry. The purpose of the study is to conceptualize the work of the mentioned authors in the cultural-aesthetic and socio-ideological contexts of the last century, justifying the need for its inclusion in the institutional canon.

KEYWORDS: publishing strategy, literary canon, actualization of creativity, Belarusian poetry, Zinaida Bandaryna, Jaŭhenija Pfljaŭmbaŭm, Natallja Višneŭskaja.

Фарміраванне літаратурнага канона як на ўзроўні сістэмы сусветнай літаратуры, так і на ўзроўні нацыянальных літаратур шырока абмяркоўваецца апошнія дзесяцігоддзі ў акадэмічнай супольнасці, у тым ліку і беларускай, бо "ў кожнай краіне свая іерархія шэдэўраў і геніяў сусветнага пісьменства. Але, бадай, для кожнай краіны найбольш актуальнай з'яўляецца праблема канона ва ўласнай нацыянальнай

літаратуры" [Кісялёва 2017: 191]. Тым больш гэтая тэма актуальная для літаратур постсацыялістычных краінаў, калі многія тэксты перасталі лічыцца кананічнымі і апынуліся па-за межамі літаратурнага канона. Іншыя тэксты, якія на працягу доўгага часу заставаліся па-за ўвагай літаратуразнаўцаў, набываюць статус актуальных. "Літаратурны канон у Беларусі знаходзіцца ў руху. Пра гэта сведчаць як палеміка, якая час ад часу ўзгараецца, так і выданні і серыі з відавочна кананізатарскімі мэтамі" [Колер 2021: 137]. Пры гэтым праблема літаратурнай іерархіі і ў папярэднія дзесяцігоддзі неаднаразова ўздымалася ў беларускім навуковым і публіцыстычным дыскурсе. Пытанне літаратурнага канона востра паўстала ў канцы 1980-х гг. у сувязі з сацыяльна-палітычнымі зменамі ў краіне: у 1990 г. выйшла не аднойчы цытаваная кніга Міхася Мушынскага *І нічога апроч праўды: Якой быць гісторыі беларускай літаратуры*, дзе закраналіся праблемы пераацэнкі літаратуры сацыялістычнага рэалізму, якія шырока абмяркоўваліся і на старонках перыядычных выданняў на працягу даволі доўгага часу [гл.: Мушынскі 1990]. У 1998 г. быў надрукаваны палемічны артыкул Сяргея Дубаўца *Канец ружовага туману*, у якім крытык працягваў разважаць над узнятай праблемай:

> Апанэнты звычайна кажуць, што адбор прывядзе да збяднення літаратуры. Але гэта збядненне для тых, хто сумуе па савецкай ярархіі, хто дагэтуль думае пра золата, якое для чытача даўно ператварылася ў іржу і гной. Адсюль непапулярнасць літаратуры, яе разбэрсанасць, нявыстраенасць і неканвэртабэльнасць. Яна, поўная "дарагіх усім імёнаў", нікому не патрэбная. Прычым творцы ружовага туману пераблытаныя ў ёй з сапраўднымі клясыкамі і разбураюць тую сапраўдную ярархію, якая мусіць выбудоўвацца сёння [Дубавец 1998: 5].

Аўтар меў на ўвазе вызваленне літаратуры ад сацрэалістычнага канона, а гісторыі літаратуры ад твораў, напісаных у адпаведнасці з гэтым метадам. Тым не менш, мы лічым такі падыход як мінімум непрадуктыўным, бо аб'ектыўны аналіз літаратурнага працэсу вымагае вывучэння ўсяго даступнага корпуса тэкстаў, прыналежных да пэўнага часавага прамежку "<…> паспяховае стварэнне канона прадугледжвае, каб дадзенае грамадства мела дакладнае ўяўленне пра сябе і пра літаратуру, пэўны вобраз самога сябе, які перадаецца не толькі ўнутры грамадства, але і за яго межы" [Колер 2021: 132].

Расійскі даследчык Барыс Дубін вызначыў наступныя віды літаратурнага канона: "Можна гаварыць аб устойліва аднаўляльным, інстытуцыйным каноне (школа); актуальным каноне (літаратурная крытыка) і модным каноне (выдавецкія стратэгіі ў разліку на новую адукаваную, каляўніверсітэцкую публіку)" [Дубин 2010: 68]. Такім чынам, мы маем

магчымасць вызначыць, у якой ступені творчасць канкрэтнага аўтара суадносіцца з рознымі відамі літаратурнага канона і якое месца яна займае ў пісьменніцкай іерархіі пэўнага перыяду.

Аналізуючы межы фарміравання нацыянальнага літаратурнага канона, Лія Кісялёва вылучае часавыя, прасторавыя, ідэалагічныя, моўныя і ўласна эстэтычныя межы [гл.: Кісялёва 2017: 193], аднак неабходна пазначыць і гендарныя межы, інакш кажучы, наўмыснае (часцей) ці ненаўмыснае абмежаванне літаратурнага канона з пункту гледжання гендару. Да сённяшняга дня мае месца з'ява, калі ў даследаваннях літаратуры жаночая творчасць у лепшым выпадку толькі згадваецца, але не аналізуецца, паколькі відавочна для даследчыкаў не з'яўляецца прыярытэтнай і рэпрэзентатыўнай. Як прыклад – нядаўняя кніга Яўгена Гарадніцкага пра беларускую літаратуру другой паловы XX ст. з выразна маскуліннай вокладкай і такім самым выбарам аўтараў [гл.: Гарадніцкі 2022]. Аднак, як вядома, межы літаратурнага канона валодаюць пэўнай мабільнасцю і паддаюцца карэкціроўцы праз актуалізацыю тэкстаў ці аўтараў, якая адбываецца найперш дзякуючы а) публікацыі (або перадруку); б) крытычнаму асэнсаванню (пераасэнсаванню) / каментаванню апублікаванага тэксту; в) уключэнню тэксту ў гістарыяграфію літаратуры і ў літаратурны канон. Адсюль вынікае, што важна не толькі праводзіць даследчую працу, але і папулярызаваць творчасць жанчын, спрыяць вяртанню іх імёнаў у гісторыю беларускай літаратуры, фарміруючы ў некаторай ступені рэтраспектыўны модны канон. У 2023 г. адзначалася сто гадоў заснавання самай масавай беларускай пісьменніцкай арганізацыі першай паловы XX ст. "Маладняк", творчасць многіх яе сяброў стала кананічнай, але шэраг аўтараў, а дакладней аўтарак, усё яшчэ мае патрэбу ў актуалізацыі. Гэта найперш сяброўкі "Маладняка" Зінаіда Бандарына, Наталля Вішнеўская і Яўгенія Пфляўмбаўм. Спынімся на трох названых аўтарках, якія заявілі аб сабе сумеснай кнігай *Вершы*, выдадзенай у 1926 г., а дзякуючы праекту "Вершы" жаночай выдавецкай ініцыятывы "Пфляўмбаўм" у 2023 г. выйшлі іх новыя кнігі выбраных твораў: *Да новага заўтра* З. Бандарынай, *Неба мнагавокае* Н. Вішнеўскай, *Сонца* Я. Пфляўмбаўм.

Безумоўна, такія зборнікі ў пэўнай ступені адпавядаюць катэгорыі выданняў "з відавочна кананізатарскімі мэтамі", тым больш што персанальныя кнігі некаторых аўтарак, здадзеныя ў выдавецтва ў канцы 1920-х гг., так і не пабачылі свет. Аднак гэта ніякім чынам не змяншае значэнне падобных выданняў, бо дзякуючы ім з'яўляецца магчымасць актуалізаваць а) адзін з найбольш прадуктыўных перыядаў у гісторыі беларускай літаратуры; б) творчасць несправядліва забытых аўтарак / забытыя творы.

У кантэксце гендару для міжваеннага перыяду характэрныя дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі: з аднаго боку, дзякуючы першай хвалі фемінізму дзейнасць (= творчасць) жанчын заахвочвалася на ўзроўні інстытуцый, з другога боку, назіралася імкненне да маргіналізацыі творчых дасягненняў жанчын як толькі пытанне выходзіла за межы поля літаратуры (= мастацтва) і сутыкалася з полем улады. Адзначу, што такая тэндэнцыя характэрная не толькі для беларускай літаратуры, але, напрыклад, і для італьянскай [гл.: Spinazzè 2012], як у выпадку з Антоніяй Поццы (1912–1938), якую сёння называюць самай значнай італьянскай паэткай XX ст., аднак поўнафарматная актуалізацыя яе творчасці адбылася толькі ў канцы XX ст., а найбольш у пачатку XXI-га, дзякуючы актывізацыі гендарных даследаванняў і канцэптуалізацыі жаночага пісьма ў Італіі ў розных кантэкстах, у тым ліку і ў сувязі з распрацоўкай пытанняў літаратурнага канона, яго фарміравання і рэпрэзентатыўнасці. З гэтага пункту гледжання заслугоўвае ўвагі і праблема гістарыяграфіі італьянскай літаратуры, у прыватнасці паэзіі, з заўважным гендарным дысбалансам, а таксама вопыт яго пераадолення: "У гісторыі італьянскай літаратуры жаночае пісьмо заўсёды заставалася незаўважаным. Ва ўсе часы не хапала жывога сведчання жанчын, якое магло б даць чытачам новую, больш шырокую перспектыву" [Lorelli 2022, online]. Фокус на жаночую творчасць характэрны не толькі для сучаснай італьянскай літаратуры, але і для іншых культурных кантэкстаў. Як прыклад – фонд Данаты Піццы, які складаецца з калекцыі фотаздымкаў, зробленых выключна жанчынамі.

Сёння маргіналізацыя творчасці жанчын пераадольваецца ў Італіі дзякуючы ў тым ліку і такім выданням, як *Controcanone: la letteratura delle donne dalle origini a oggi. Con percorsi tematici su altri "esclusi" dal canone*, 2022 (*Контр-канон: жаночая літаратура ад вытокаў да нашых дзён. З тэматычным аналізам іншых "выключаных" з канона*) – анталогіі італьянскай літаратуры для старшай школы. Яе аўтар Джоні Л. Бертоліа (Johnny L. Bertolio) падкрэслівае, што нават калі жанчыны-літаратаркі былі ўганараваныя такімі прэміямі як Нобелеўская (напрыклад, Грацыя Дэледа [Grazia Deledda, 1871–1936]), гэта яшчэ не з'яўляецца падставай для іх уключэння ў школьную праграму [гл.: Bertolio 2022]. Выданне ёсць цікавым прыкладам новага падыходу да выкладання літаратуры, у яго аснову пакладзены храналагічны прынцып, пры гэтым аўтары-мужчыны не выключаюцца з гісторыі літаратуры, а адпаведным чынам "люструюць" тэмы, закранутыя жанчынамі – пісьменніцамі і мысляркамі. Варта згадаць і выданне *Fuori programma. Scrittrici italiane dal Novecento ad oggi* (Mimesis Edizioni, 2023) (*Па-за праграмай. Італьянскія пісьменніцы ад дваццатага стагоддзя па сённяшні дзень*), падрыхтаванае

Даніэлай Біні і Матэа Квінта, таксама найперш для выкладчыкаў старшай школы.

Метадалогія вывучэння літаратурнага канона прадугледжвае аналіз выданняў па гісторыі беларускай літаратуры. У самым грунтоўным – *Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя*, т. 2: *1921–1941* (1999) імя З. Бандарынай згадваецца два разы (с. 31, 41), Н. Вішнеўскай – два разы (с. 11, 16), Я. Пфляўмбаўм – адзін раз (с. 10). Заходнебеларускія паэткі згадваюцца наступным чынам: Зоська Верас адзін раз як супрацоўніца віленскай перыёдыкі 1920-х гг. Людвіка Войцік (с. 214), Ларыса Геніюш два разы ў кантэксце біяграфіі Уладзіміра Дубоўкі (с. 476, 498). Толькі Н. Арсенневай прысвечаны асобны артыкул, але ўжо ў 4-м томе ў раздзеле *Беларуская літаратура эміграцыі*. У кнізе Валерыя Максімовіча *Шыпшынавы край: Старонкі беларускай літаратуры 20–30-х гг. XX ст.: Дапаможнік для настаўнікаў* не згадваецца ніводнае жаночае імя [гл.: Максімовіч 2002]. У кнізе Ірыны Багдановіч *Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння* разглядаецца творчасць Н. Вішнеўскай і Н. Маркавай, але толькі як тыпова маладнякоўская ў раздзеле *У маладнякоўскім паэтычным коле (С. Дарожны, А. Вольны, Н. Вішнеўская, Н. Маркава)*. Аўтарка даследавання адзначае:

> Цікавую старонку ў гісторыі “Маладняка” ўпісалі жанчыны. У спісах маладнякоўскіх філій сустракаецца шмат жаночых імёнаў, якія, на жаль, так і не выявіліся ў літаратуры (Л. Кукла Г. Брэцкая[1], М. Рагоўская і інш.). Але ж многія з пачынаючых паэтэс пакінулі свой адметны след у літаратуры – гэта Зінаіда Бандарына, Наталля Вішнеўская, Наля Маркава, Яўгенія Пфляўмбаўм, Іда Чырвань [Багдановіч 2001: 307].

З другога боку, узнікае пытанне наконт даступнасці тэкстаў згаданых аўтарак, што пэўным чынам азначала б іх а) актуалізацыю, б) інстытуалізацыю. У той час як некаторыя хлопцы-маладнякоўцы паспелі выдаць па тры ці нават па чатыры паэтычныя кнігі, абсалютная большасць дзяўчат у міжваенны перыяд не выдала ніводнай. Аднак гэта не значыць, што кнігі не рыхтаваліся, вядома пра кнігу Я. Пфляўмбаўм *Мелодыі* і пра кнігу З. Бандарынай *Звоны-перазвоны*, якія так і не выйшлі.

Многія актыўныя ў 1920-х гг. аўткі ў пачатку 1930-хх гг. пакінулі Беларусь і перасталі ўдзельнічаць у літаратурным працэсе, бо гэта быў ці не адзіна магчымы спосаб пазбегнуць рэпрэсій. У выніку іх творчасць да пэўнага часу заставалася ўвогуле за межамі літаратурнага поля. Некаторыя з іх ніколі больш не вярнуліся да актыўнай творчай дзейнасці, іншыя нават пасля вяртання не здолелі рэалізаваць свае

[1] Памылка аўтаркі, насамрэч – Брэская.

планы, у тым ліку і з прычыны неспрыяльнага стаўлення з боку мужчынскага асяроддзя. Але не толькі гендарны аспект меў значэнне. Надзея Мандэльштам, удава расійскага паэта Восіпа Мандэльштама, пакінула трапныя заўвагі, датычныя стаўлення да публікацыі твораў свайго мужа былых калегаў па пяры:

> Перашкод да выдання кніг зашмат. Я не ведаю, што такое канкурэнцыя, якой нас палохаюць, але выдатна бачыла барацьбу за месца ў грамадстве, якая вялася ў нас усімі сродкамі. Калі пайшлі першыя чуткі аб мікаянаўскіх камісіях, многім стала не па сабе – і далёка не толькі тым, хто спрыяў выключэнню сапернікаў. Я чула шэпты пра тое, куды ж дзенуцца вяртанцы: а раптам ім захочацца заняць свае ранейшыя месцы. Колькі новых адзінак спатрэбіцца ў савецкіх установах, каб прыладзіць усе гэтыя натоўпы? Ніякай драмы, аднак, не адбылося: большасць вярнуліся ў такім стане, што ні аб якой актыўнай дзейнасці не думалі. Усё прайшло спакойна, і тыя, хто баяўся, што ім давядзецца пацясніцца, з палёгкай уздыхнулі. Іншая справа – літаратура. Старанна пабудаваны табель літаратурных рангаў падлягае актыўнай ахове, інакш абрынецца мноства ўстойлівых рэпутацый. Вось чаму так старанна супрацьдзейнічаюць выданню кніг нябожчыкаў. Зрэшты, і з жывымі абыходзяцца не лепей [Мандельштам 2013: 431].

Супрацьдзеянне адбывалася найперш па лініі моднага канона (выдавецтвы), і прыклады такога “супрацьдзеяння жывым” – стаўленне да твораў Н. Вішнеўскай і З. Бандарынай. У артыкуле *Тры паэткі, тры лёсы* адзначалася паблажлівае стаўленне да творчасці Н. Вішнеўскай з боку Алеся Звонака, пра здадзеную ў выдавецтва і нявыдадзеную ў канцы 1950-х гг. кнігу смяротна хворай З. Бандарынай *Выбраныя вершы* [гл.: Данільчык 2021]. Што ж дзіўнага ў тым, што ў пасляваенны перыяд Я. Пфляўмбаўм не захацела нават паспрабаваць вярнуцца ў літаратуру? Адзначу яшчэ адзін, магчыма, важны ў кантэксце літаратурнага канона момант: ні адна са згаданых паэтак не стала сябрам Саюза пісьменнікаў у 1930-я гг.: З. Бандарына ўступіла ў Саюз у сакавіку 1957 г., Я. Пфляўмбаўм – у 1989-м. Гэта значыць, што доўгі час іх творчасць заставалася па-за ўвагай вызначальнай у дадзены перыяд рэферэнтнай групы: літаратурных інстытуцый.

Пры гэтым на сённяшні дзень усё яшчэ застаецца вострым пытанне кантынуітэту або пераадолення дыскантынуітэту, паколькі творчасць З. Бандарынай, Н. Вішнеўскай, Я. Пфляўмбаўм ды іншых паэтак пакуль не стала часткай літаратурнага канона, які ўспрымаецца як рэпрэзентатыўны [гл.: Колер 2021: 132].

У 1989 г. было апублікавана эсэ С. Дубаўца *Тры паэзіі*, у якім, разважаючы аб беларускай жаночай паэзіі і апавядаючы пра постаці Н. Арсенневай, Л. Геніюш і Я. Пфляўмбаўм, аўтар адзначаў, што сярэдняму

пакаленню паэтак не ставала прыкладу. У выніку яны звярталіся да вобразаў Еўфрасінні Полацкай і Цёткі, а не да найбліжэйшых папярэдніц. І завяршае артыкул амаль рытарычным пытаннем: "Ці хутка адновіцца перарваная сувязь?" [Дубавец 1992: 205]. Такім чынам, публікацыя згаданых выданняў вырашае і пытанне кантынуітэту, паколькі нават у сучасных даследаваннях беларускай жаночай паэзіі часта міжваенны перыяд выпадае. Недастаткова ён разгледжаны і ў найноўшым выданні Ірыны Шматковай *Беларуская жаночая паэзія ХХ стагоддзя. Вучэбна-метадычны дапаможнік* (2023), аднак радуе, што пэўныя моманты літаратурнага працэсу 1920–1930-х гг. і ўдзелу ў ім жанчын хоць бы акрэслены.

Увогуле ў выніку паслядоўнай працы даследчыкаў у апошнія дзесяцігоддзі былі рэалізаваныя шматлікія праекты па актуалізацыі літаратурнай творчасці жанчын першай паловы ХХ ст.: гэта найперш кніга вершаў Ганны Брэскай *Настурцыі*, якая пабачыла свет дзякуючы намаганням Алеся Аркуша (2000), *Анталогія беларускай жаночай паэзіі*, складзеная Юрасём Пацюпам і апублікаваная ў чатырох нумарах гарадзенскай газеты "Саламея" (2001, № 10–13), "жаночы" нумар інтэрнэт-часопіса "Прайдзісвет" (2016), выданне анталогіі жаночай паэзіі міжваеннага перыяду *Бліскавіцы* (2017) і іншыя кнігі, у тым ліку ўжо згаданыя *Да новага заўтра* З. Бандарынай, *Неба мнагавокае* Н. Вішнеўскай, *Сонца* Я. Пфляўмбаўм (2023), шматлікія артыкулы. Апрача таго, у межах міжінстытуцыйнага праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця", прысвечанага стагоддзю "Маладняка", у лістападзе 2023 г. на сайце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з'явіўся віртуальны раздзел, прысвечаны Я. Пфляўмбаўм, першай сярод дзяўчат-маладняковак [Пфляўмбаўм, online]. У выніку створана аснова як для канцэптуалізацыі гендарна маркіраваных тэмаў беларускай паэзіі міжваеннага перыяду, так і для перагляду літаратурнага канона.

У сувязі з праблемай літаратурнага канона паўстае і наступнае пытанне: чаму творчасць згаданых беларускіх паэтак заслугоўвае таго, каб быць часткай інстытуцыйнага літаратурнага канона? Што новага паведамляюць іх тэксты ў адрозненне ад тэкстаў калег-мужчын? Чаму творчасць як мінімум З. Бандарынай, Н. Вішнеўскай і Я. Пфляўмбаўм можа быць вынесена за рамкі "маладнякоўскага паэтычнага кола" і разглядацца ў раздзеле персаналій? Пры гэтым заўважым, што не менш цікавыя творы былі напісаныя гэтымі паэткамі пасля Другой сусветнай вайны, аднак яны выходзяць за часавыя межы разгляданага ў дадзеным артыкуле перыяду, хоць, безумоўна, творчасць кожнай аўтаркі вымагае комплекснага разгляду.

У свой час выбіраючы для аналізу "маладнякоўскай" паэзіі творчасць Н. Вішнеўскай і Н. Маркавай, І. Багдановіч адзначыла:

> Нягледзячы на тое, што гэта быў суб'ектыўны выбар <...>, ён усё роўна адлюстроўвае маладнякоўскія стылявыя і арганізацыйныя тэндэнцыі, дае ўяўленне аб тым, як адбіваўся ўплыў майстроў на творчым абліччы шарагоўцаў. Падабенства ахоплівае сферу ідэалогіі – адбіццё ў мастацкіх вобразах грамадскай тэорыі "класавасці"; паэтыку – вытрымванне стылёвага прыёму супастаўлення "старога" і "новага", "учарашняга" і "сённяшняга", "мінулага" і "будучага"; топіку – топасы "завірухі", "віхуры", "рання", "радасці" і іншыя, паслядоўна адбітыя ў паэзіі ўсіх згаданых намі маладнякоўцаў [Багдановіч 2001: 316].

Аднак творчасць З. Бандарынай і Я. Пфляўмбаўм выходзіць за межы акрэсленых стылістычных рамак, акрамя таго, у вершах Я. Пфляўмбаўм большасць гэтых прыкмет амаль цалкам адсутнічае, а калі і прысутнічае, то акцэнт робіцца на іншых эстэтычных маркерах [гл.: Данільчык 2016]. Творчасць З. Бандарынай вылучаецца эстэтычнымі эксперыментамі і гендарнай маркіраванасцю тэкстаў [гл.: Данільчык 2011], паэтка найбольш актыўна адгукалася на надзённую праблематыку. Шмат намаганняў па вяртанні імя З. Бандарынай у літаратуру прыкладаў Станіслаў Шушкевіч, але яго артыкулы апавядалі адно пра біяграфію пісьменніцы [гл.: Шушкевіч 1978].

На дэбютны агульны зборнік трох згаданых аўтарак *Вершы* (1926) былі напісаныя дзве невялікія станоўчыя рэцэнзіі [гл.: Байкоў 1926; Паляшук 1926] у Савецкай Беларусі, а таксама некалькі водгукаў у Заходняй. Але менавіта творчасць З. Бандарынай была "кананізавана" Максімам Гарэцкім у кнізе *"Маладняк" за пяць гадоў* (1928), дзе ён пісаў: "Бандарына паміж пяснярак «Маладняка» вызначаецца большай сувяззю з грамадскасцю, з сучаснасцю і асаблівай шчырасцю пачуцця" [Гарэцкі 1984: 254]. Апрача таго, у раздзеле персаналій да згаданай кнігі *Біяграфічна-крытычны слоўнік сучасных выдатных і тыповых маладнякоўцаў* з жанчын М. Гарэцкі ўключыў толькі З. Бандарыну. Крытык адзначыў наступныя рысы яе паэтычнай творчасці:

> У вершы *Апошняя вясна* – асабістыя перажыванні, каханне і развітанне з маладосцю, з каханнем. Глыбокае і далікатнае пачуццё. Элегічнасць. Прыгожая ясная думка, разам з некаторай нервовасцю. Строфіка звычайная, рытмы лёгкія, далікатныя. Вобразы – з прыроды і навакольнага жыцця, заўсёды вельмі далікатныя, пяшчотныя, паэтычныя, але цалкам рэалістычныя, без усякіх сентыментальных салодкасцей. Даволі добрая мова, хоць часам трапляюцца расіянізмы [Гарэцкі 1984: 266].

Для інстытуцыйнага канона (вывучэння ў навучальных установах) можна прапанаваць вершы З. Бандарынай *Адыйшоўшым* (сацыялізацыя жанчыны) і згаданы М. Гарэцкім верш *Апошняя вясна*, дзе ў дыялогу лірычнай гераіні з каханым супрацьпастаўляецца мужчынскае і жаночае:

А ў полі дзесь…
Ды ты не зразумееш…
Табе больш любы горад і завод,
Прамені любіш ты электрыкі, і зменнасць,
І грукат, гул трамваяў і аўто…
<…>
– А я, а я?! І для мяне завеі,
Элегію сумлівую заўюць,
Бо з першым променем, што ласкава прыгрэе,
Спаткаю я – апошнюю вясну…
[Бандарына 2023: 52]

З. Бандарына – аўтарка паэтычнага зборніка *Веснацвет* (1931), адзінай уласнай кнігі "маладняковак", выдадзенай у міжваенны перыяд. На кнігу былі напісаныя дзве супярэчлівыя, з сённяшняга пункту гледжання, разгромныя рэцэнзіі (Юлі Дворкінай і Эдуарда Галубка), аднак важны сам факт індывідуалізацыі паэткі. Да гэтага ў БССР з сучасніц толькі Н. Арсеннева была ўганаравана рэцэнзіяй М. Байкова на зборнік *Пад сінім небам* ("Полымя" 1927).

Э. Галубок пісаў:

> Ранейшая літаратурная дзейнасць Зіны Бандарынай, хоць і была нязначная сваімі памерамі і мастацкімі каштоўнасцямі, насіла на сабе выразныя адзнакі дробнабуржуазнай ідэалогіі, і вельмі часта ў яе творах мы бачылі выразныя нацыянал-дэмакратычныя ўплывы, якія знаходзілі сабе адбітак у вершах, дзе ў сумных і змрочных фарбах апявалася Беларусь і сум па сваёй роднай старонцы. Наяўнасць гэтых момантаў у вершах З. Бандарынай дала повад М. Гарэцкаму замаскаваць змест вершаў пісьменніцы, які, па яго словах, быў бясспрэчна каштоўным, і сцвярджаць, што творчасць З. Бандарынай адрозніваецца ад іншых пісьменнікаў сваёй элегічнасцю, пяшчотнасцю і далікатнасцю і што ў вершах яе адбіта "прыгожая ясная думка, але з некаторай нервовасцю" [Галубок 1931: 113].

Нагадаем, што ў 1930 годзе М. Гарэцкі быў арыштаваны і асуджаны да высылкі, такім чынам яго выказванні маглі не ўспрымацца рэферэнтнай групай як аўтарытэтныя. Апрача таго, Э. Галубок абвінавачвае паэтку, што міма яе вершаў прайшлі калектывізацыя і пяцігадовы план: "вершы Зіны Бандарынай, замест палітычнай насычанасці, у яшчэ больш падкрэсленым выглядзе даюць нам матывы індывідуалізму, тэмы свайго «я»" [Галубок 1931: 115].

Ю. Дворкіна ў сваю чаргу абвінавачвае аўтарку ў песімізме, асабліва ў вершах другога раздзела кнігі:

> Шмат у якіх вершах мы знаходзім гэты пэсымізм, які сведчыць, што вельмі надуманай і абстрактнай зьяўляецца радасць у вершах папярэдняга раздзелу. Мы наглядаем амаль поўны адрыў асабістага ад грамадзкага. Праўда,

> у некаторых вершах яна быццам імкнецца вырашыць гэтае пытаньне, але наколькі гэта вырашэньне конкрэтна, жыццёва можна бачыць з наступнага вершу *Над возерам* [Дворкіна 1931: 199].

З. Бандарына – адзіная з паэтак-жанчын удзельнічала ў палеміцы аб паэзіі ў газеце "ЛіМ" з артыкулам *Маё слова ў спрэчках* (1933), абараняючы сваё права на інтымную лірыку:

> Аднак, я загаварылася і, напэўна, не аднойчы выклікала вялічэзнае абурэнне нашых крытыкаў, выбачайце!? Але ці можа жанчына-паэтка абыйсці тэму злучнасці грамадзкай і інтымнай лірыкі?! Хіба можна, абараняючыся, ня прыгадаць вялікага Гайнэ, гэтага пяшчотнага лірыка і гострага палітычнага барацьбіта, які ў сваіх вершах і паэмах, апяваючы каханьне і бічуючы кайзэраўскі ўрад, паказаў нязвычайную шырыню сваёй геніяльнасці. У нас у гэтай злучнасьці новае а[д]ценне – падвойнасць і вершы "для себя". Наш масавы друк патрабуе акрэсьленай тэматыкі. Патрэбнасьць гаварыць "во весь голос" сама дыктуе гэтую тэматыку. Аднак, застаецца ня вырашанае сваё жаночае, інтымнае і яго напаўголасы, напаўтоны. Але і яно патрабуе права на жыцьцё і прызнаньне [Бандарына 1933: 2].

Сёння здаецца неверагодным, што аўтаркам даводзілася абараняць сваё права на мастацкае ўвасабленне ў паэзіі інтымных эмоцый і перажыванняў, аднак да гонару паэткі адзначым, што яна, прынамсі, паспрабавала гэта зрабіць. І гэта быў важны крок у час падрыхтоўкі да ўтварэння адзінай пісьменніцкай арганізацыі, галоўнай творчай задачай якой стала папулярызацыя дасягненняў сацыялізму.

Згадваючы рэцэнзію Ю. Дворкінай, З. Бандарына заўважае:

> Прынамсі калісьці т. Дворкіна ("Маладняк", № 9), крытыкуючы мой *Веснацвет*, абвінавачвала мяне ў няшчырасці, базуючыся на разыходжаннях у гэтак званай грамадзкай і асабістай лірыцы. Так і цяпер – я пішу вершы палітычна актуальныя і больш таго, для "Работніцы і калгасніцы", старанна працуючы над больш простай і даступнай формай, стымул дзеля іх – новы творчы дзень будаўніцтва, пульс звязаны з маім пульсам. Мяне глыбока хвалюе кожная перамога, і ў гэтым вялізнае маральнае задавальненьне. Аднак, пэўныя творчыя няўдачы, вузка асабістыя перажыванні жанчыны таксама нараджаюць лірыку, і мне цяжка вырашыць яе мастацкую вартасьць. Тады прыходзіць патрэба ў крытыцы грамадзкасьці і неабходнасьць дыскусійнай трыбуны [Бандарына 1933: 2].

Na koniec chciałabym dodać, że rodzicom dzieci porozumiewających się w języku białoruskim często brakuje wspólnoty i wzajemnego dzielenia się doświadczeniem, które mogłyby zachęcić wahających się do podjęcia podobnych działań.

Dlatego celem moich badań jest zbieranie materiału i przekazywania go pedagogom i ośrodkom edukacyjnym, do których zwracają się dzieci mające doświadczenie edukacji rodzinnej. W pracy z tymi dziećmi warto pamiętać, że mimo iż ich dwujęzyczność może wydawać się utrudnieniem, tak naprawdę jest ona wyzwaniem i ważną podstawą dla ich dalszego rozwoju. Zadaniem pedagogów jest zatem zrozumienie motywacji i dużej pracy rodziców, żeby nie zniekształcić tych pozytywnych efektów, lecz zmniejszyć trudności wynikające z dwujęzyczności i dwukulturowości.

References

Atlas języków. Pochodzenie i rozwój języków świata. 2003. Red. Comrie, Polinsky, Matthews. New York: Facts On File.

Bandura Albert. 1971. *Social Learning Theory.* Morristown: General Learning Press.New.

Bahdanovich Hanssen Natallia, Mamonka Volha. 2021. *Parental involvement in Early Childhood Education in Belarus*. W: *Parental Engagement and Early Childhood Education Around the World*. Red. S. Garvis, S. Phillipson, H. Harju-Luukkainen, A.R. Sadownik. New York: Routledge.

Czykwin Elżbieta, Misiejuk Dorota. 1998. *Dwujęzyczność i dwukulturowość w perspektywie psychopedagogicznej.* Białystok: Trans Humana.

Earl Babbie. 2005. *Badania społeczne w praktyce*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

Belstat. 2019a. *Education in the Republic of Belarus. Statistical book*. Minsk: National Statistical Committee of the Republic of Belarus [online] https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/78b/78bd508ae57d14b1772e94903ba90b80.pdf [dostęp: 19.07.2024].

Belstat. 2019b. *Wyniki spisu ludności 2019 roku* [online] https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/naselenie-i-migratsiya/naselenie/statisticheskie-izdaniya/index_41897/ [BY] [dostęp: 19.07.2024].

Bourdieu Pierre, Passeron Jean-Claude. 1990. *Reproduction in Education, Society and Culture.* London. SAGE Publications.

Ferlazzo Larry, Hammond Lorie. 2009. *Building Parent Engagement in Schools*. New York: Linworth Publishing.

Garvis Susanne, Phillipson Sivanes, Harju-Luukkainen Heidi, Sadownik Alicja Renata. 2021. *Parental Engagement and Early Childhood Education Around the World.* New York: Routledge.

Haugen Einar. 1953. *The Norwegian Language in America, a Study in Bilingual Behavior,* Volume 2: *The American Dialects of Norwegian*. Philadelphia: University of Pennsylvania Press.

Haugen Einar. 1962. *Schizoglossia and the linguistic norm*. W: *Monograph Series on Languages and Linguistics* No. 15. Red. E. Wobdworth, R.J. Di Pietro. Washington, D. C.: Georgetown University.

Howe Neil, Strauss William. 2000. *Millennials rising: The Next Great Generation*. New York: Vintage Books.

Język białoruski zagrożony wyginięciem. Władze nie widzą problemu. 2014. [online] https://www.polskieradio.pl/75/921/artykul/1020468,jezyk-bialoruski-zagrozony-wyginieciem-wladze-nie-widza-problemu [dostęp: 20.06.2024].

Kaleta Radosław. 2015. *Polsko-białoruska lapsologia glottodydaktyczna*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki.

Kaleta Radosław. 2018. *Błędologia w glottodydaktyce białorutenistycznej*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki.

Kalita Inna. 2010. *Sovremennaâ Belarus': âzyki i nacional'naâ identičnost'.* Ústí nad Labem: PF UJEP. [Калита И.В. 2010. *Современная Беларусь: языки и национальная идентичность.* Ústí nad Labem: PF UJEP].

Kołodziej Anna, Burzyńska-Wentland Lidia. 2009. *Strajki szkolne w Prusach Zachodnich w latach 1906–1907*. „Biuletyn Historii Wychowania" 25: 159–166.

Konstytucja Rzeczypospolitej Polskiej z dnia 2 kwietnia 1997 r. [online] [dostęp: 20.06.2024].

Lipińska Ewa. 2003. *Język ojczysty, język obcy, język drugi.* Kraków: Wydawnictwo Uniwersytetu Jagiellońskiego.

Lukašanec Aljaksandr. 2014. *Bielaruskaja mova ŭ XXI stahoddzi: razviccë sistèmy i prablemy funkcyjanavannja.* Minsk: Belaruskaja navuka [Лукашанец Аляксандр. 2014.

Беларуская мова ў XXI стагоддзі: развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання. Мінск: Беларуская навука].

Marvan Jiří. 2008. *Introducing Europe to Europeans Through Their Language: One Europe for Centuries – the Euro-Czech View.* Praga: School of Czech Studies.

Michajloŭskaja Sniažana. 2015. *Bielaruskaja mova: karystaĺniki i prychiĺniki.* „Bielaruskaja dumka" № 4: 52–57 [Міхайлоўская Сняжана. 2015. *Беларуская мова: карыстальнікі і прыхільнікі*. „Беларуская думка" № 4: 52–57].

Milewski Jan. 2005. *Wstęp do materiałów konferencyjnych*. W: *Stosunki polsko-białoruskie w województwie Białostockim w latach 1939–1956*. Red. J.J. Milewski, A. Pyżewska. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej.

Morgan Nikola S. 2016. *Engaging Families in Schools: Practical Strategies to Improve Parental Involvement.* New York: Taylor & Francis.

Nahornaja Aliena. 2021. *Mova 404: bielaruskaja mova ŭ Bielarusi: reaĺnyja historyi*. [online] https://www.mova404.info/book[dostęp: 20.06.2024] [Нагорная Алена. 2021. *Мова 404: беларуская мова ў Беларусі: рэальныя гісторыі*]. E-book: Umovy dlja movy].

Nikitorowicz Jerzy. 2017. *Etnopedagogika w kontekście wielokulturowości i ustawicznie kształtującej się tożsamości*. Kraków: Impuls.

Odrowąż-Coates Anna. 2017. *Peaceful expansion of the English language in Europe. A tool of integration or quiet colonization?* „Multicultural Studies" III (1): 115–125.

Pieciuch Ewelina. 2017. *Zaangażowanie – klucz do sukcesu w wychowaniu dziecka.* W: *Sukces jako zjawisko edukacyjne*. Vol. II. Red. W. Żłobicki, M. Homeniuk. Wrocław: Instytut Pedagogiki Uniwersytetu Wrocławskiego.

Skutnabb-Kangas Tove. 1981. *Bilingualism or not. The education of minorities*. Clevedon, Avon: Multilingual Matters. E-book [online] https://archive.org/details/bilingualismorno0000skut[dostęp: 20.06.2024].

Solomon Mattie Lee. 2011. *Missing Link? Parent Discussions About Their Role in the Education of Their Children*. Bloomington: iUniverse.

Troupe Kasan. 2021. *Education's Missing Link: Parental Engagement.* Kingston: LMH Publishing.

UNDP. 2024. *Human Development Report 2023/2024* [online] https://hdr.undp.org/content/human-development-report-2023-24 [dostęp:19.07.2024].

Vyniki sacyjalahičnaha dasliedvannia "Nacyjanaĺnaja identyčnasć vačami bielarusaŭ: chto my i jakimi my budziem? 2009 [online] https://budzma.org/news/vyniki-prezientacyi-sacyjalahichnaha-dasliedvannia-2009.html?sphrase_id=710327 [dostęp: 18.06.2024] [*Вынікі сацыялагічнага даследвання "Нацыянальная ідэнтычнасць вачамі беларусаў: хто мы і якімі мы будзем?* 2009].

Wacławek Maria, Wtorkowska Maria. 2019. *Polaków stosunek do edukacji – w kręgu językowo-kulturowych stereotypów*. „Z Teorii i Praktyki Dydaktycznej Języka Polskiego" 28: 105–126.

Winiarczyk Justyna. 2023. *Twoje dziecko może mówić także po angielsku.* E-book https://englishspeakingmum.pl/twoje-dziecko-moze-mowic-takze-po-angielsku.

STRESZCZENIE: W artykule zwrócono uwagę na temat powiązany zarówno z językoznawstwem, jak i pedagogiką, a mianowicie edukację językową w kręgu rodziny. Na szczególną uwagę zasługuje fakt, że pomimo rosnącego zainteresowania takim zjawiskiem, jakim jest tzw. dwujęzyczność zamierzona, w literaturze naukowej znajdujemy wciąż mało badań i informacji na ten temat. Proces uczenia się nowego języka jako drugiego przy jednoczesnym zachowaniu języka rodzinnego dziecka jest obciążony uprzedzeniami i uwarunkowaniami społeczno-politycznymi. Temat

jest szczególnie dotkliwy dla rodziców posługujących się językiem zagrożonym wyginięciem (na przykład białoruskim), gdyż muszą oni stanąć przed dylematem: pozostać przy swoim tradycyjnym języku i kulturze czy wybrać język powszechnie używany w społeczeństwie, w którym pozostają. Jak pokazują badania, wybór języka w takim razie staje się wyborem nie tylko narzędzia komunikacji, ale także kulturowym i tożsamościowym. Tak dzieje się w białoruskich rodzinach, które decydują się zachować język białoruski dla swoich dzieci lub wybierają język angielski do komunikowania z dzieckiem. Przedmiotem niniejszych badań są działania edukacyjne i motywy rodziców (obywateli Białorusi, mieszkających w Białorusi lub w innych krajach europejskich jako pierwsze pokolenie migracji) mające na celu systematyczne i zorganizowane nauczanie dzieci języka białoruskiego/angielskiego. Badania przeprowadzono w formie wywiadów pogłębionych z siedmiorgiem Białorusinów pochodzących z pokolenia millenialsów (1981–1995) i wychowującymi dzieci w wieku 3–12 lat. W trakcie wywiadów zadawano pytania dotyczące działań edukacyjnych zmierzających do celowego, zorganizowanego nauczania dzieci języków w rodzinie oraz plusów i minusów dwujęzyczności dzieci z punktu widzenia respondentów. Pięcioro rodziców używało języka białoruskiego do komunikacji w rodzinie i nauczania dzieci, a dwoje – angielskiego, chociaż wszyscy biegle władali językiem rosyjskim (a czasem także innymi językami). Badania stanowią pracę przygotowawczą w ramach rozprawy doktorskiej. Główne założenia badawcze to: a) edukacja rodzinna nie tylko może być zorganizowana, zamierzona i motywowana, lecz także może odgrywać wiodącą rolę w rozwoju umiejętności językowych dziecka; b) działania edukacyjne rodziców mogą być bardzo interesujące dla nauczycieli języków obcych, zwłaszcza tych pracujących z dziećmi dwujęzycznymi. Wyniki badań wykazały, że działania edukacyjne wybierane przez rodziców do nauki języka białoruskiego i angielskiego cechowały się podobieństwem i mogły zostać podzielone na kilka kluczowych grup. Oznacza to, że badanie i kategoryzacja tych działań mogłoby być przydatne w tworzeniu wspólnego podejścia do nauki języka od najmłodszych lat. Badania mogłyby także pomóc nauczycielom w nauczaniu dzieci dwujęzycznych, posługujących się językiem białoruskim lub jakimkolwiek innym językiem jako językiem komunikacji w rodzinie.

SŁOWA KLUCZOWE: edukacja rodzinna, dwujęzyczność zamierzona, motywacja rodziców, wczesny rozwój dziecka, język białoruski, język angielski.

АНАТАЦЫЯ: У артыкуле звяртаецца ўвага на тэму, якая спалучае ў сабе пытанні як з мовазнаўства, так і педагогікі, – сямейнае моўнае выхаванне. Гэтая тэма зацікавіла аўтара па прычыне таго, што, нягледзячы на рост цікавасці да практык сямейнага навучання і так званага свядомага двумоўя, у навуковай літаратуры ўсё яшчэ вельмі мала даследаванняў і інфармацыі па ёй. Працэс вывучэння новай мовы пры захаванні сямейнай мовы дзіцяці па-ранейшаму суправаждаецца прадузятым стаўленнем і сацыяльна-палітычным кантэкстам. Тэма гэтая асабліва актуальная для бацькоў, якія размаўляюць на мове, што знаходзіцца пад пагрозай знікнення (напрыклад, беларускай), бо яны вымушаная стаць перад выбарам: прытрымлівацца сваёй традыцыйнай мовы і культуры альбо выбраць больш распаўсюджаны варыянт. Як паказвае даследаванне, свядомы выбар мовы камунікацыі можа быць не толькі выбарам лінгвістычным, але таксама выбарам культуры і самаідэнтыфікацыі. Так адбываецца ў беларускіх сем'ях, якія вырашаюць захаваць беларускую мову, навучаючы ёй сваіх дзяцей ці выбіраюць англійскую мову як гарантыю будучага поспеху для

дзіцяці. Прадметам даследавання ў артыкуле з'яўляецца навучальная дзейнасць і матывы бацькоў (грамадзян Рэспублікі Беларусь, што жывуць у самой рэспубліцы ці іншых еўрапейскіх краінах у якасці першага пакалення імігрантаў), накіраваныя на сістэматычнае і арганізаванае навучанне дзяцей беларускай / англійскай мове. Даследаванне праводзілася ў форме глыбінных інтэрв'ю з сямю беларусамі з пакалення міленіялаў (1981–1995), якія выхоўваюць дзяцей 3–12 гадоў. Інтэрв'ю ўключала ў сябе пытанні аб дзеяннях бацькоў у мэтах навучання дзяцей мовам, а таксама пытанні аб прычынах выбару мовы навучання і камунікацыі і пытанні аб плюсах і мінусах дзіцячага білінгвізму, з пункту гледжання рэспандэнтаў. Пяцёра бацькоў у сямейных зносінах і навучанні дзяцей выкарыстоўвалі беларускую мову і двое – англійскую, але ўсе добра валодалі рускай (а часам і іншымі мовамі). Даследаванне праводзілася ў рамах падрыхтоўкі да напісання кандыдацкай працы. Асноўныя гіпотэзы даследавання: а) сямейнае выхаванне можа быць не толькі арганізаваным, мэтанакіраваным і матываваным, але яно таксама можа адыгрываць вядучую ролю ў развіцці моўных навыкаў дзіцяці; б) навучальная дзейнасць бацькоў можа прадстаўляць цікавасць для прафесійных выкладчыкаў мовы, асабліва для тых, хто працуе з двухмоўнымі дзецьмі. Вынікі даследавання паказалі, што ў працэсе выкладання мовы абраная бацькамі навучальная дзейнасць мела шмат агульных тэхнік як для англійскай, так і для беларускай. Гэта азначае, што даследаванне і апісанне гэтай дзейнасці можа быць карысным для стварэння агульнага падыходу да вывучэння мовы з самага ранняга ўзросту. Даследаванне магло б таксама дапамагчы настаўнікам у выхаванні дзяцей-білінгваў, якія выкарыстоўваюць беларускую ці іншую мову як мову сямейных зносін.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: сямейнае выхаванне, свядомае двухмоўе, матывацыя бацькоў, ранняе развіццё дзіцяці, беларуская мова, англійская мова.

Data przesłania artykułu: 12.06.2024
Data akceptacji artykułu: 30.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Hanna Halavina – Polska, Uniwersytet w Białymstoku, Szkoła Doktorska Nauk Społecznych; mgr; specjalność naukowa: lingwistyka; zainteresowania naukowe: wielojęzyczność, wielokulturowość, pogranicze polsko-białoruskie.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Halavina Hanna. 2022. *History and Perspectives of Intercultural Dialog Between Poland and Belarus. Based on Biographies of Prominent Personalities*. "Polish Journal of Educational Studies" 74, № 1: 65–74.
2. Halavina Hanna. 2023. *Wpływ pandemii COVID-19 na proces edukacji w Polsce i Białorusi*. W: *Postpandemiczna rzeczywistość. Jak Koronawirus zmienił świat?* Red. K. Kuźmicz, K. Woźniak, K.K. Bach. Białystok: Wydawnictwo UwB.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Uladzislaŭ Ivanoŭ, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.6

Uladzislaŭ Ivanoŭ / Уладзіслаў Іваноў

Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт /
European Humanities University
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-1493-0017
e-mail: uladzislau.ivanou@ehu.lt

Моўная няўпэўненасьць і каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы ў сучаснай беларускай мове: сацыялінгвістычны аналіз[1]

Linguistic insecurity and colonialist hypercorrect forms in Belarusian language: a sociolinguistic analysis
Niepewność językowa i kolonialistyczne formy hiperpoprawne w języku białoruskim: analiza socjolingwistyczna

ABSTRACT: The article is devoted to the sociolinguistic analysis of language insecurity faced by modern Belarusian speakers. The object of the study is the language insecurity of Belarusian-speaking people, and the subject of the research is one of the central manifestations of language insecurity – hypercorrection or, more precisely, hypercorrect forms in the language that speakers use as a result of long-term Russification and loss of competence in their native language. In connection with this, the research analyses not just hypercorrect forms in the language, but primarily those that arose as a result of colonial activity – the dominance of the Russian language, Russification. The relevance of the topic is emphasised by the events of 2020, the intensification of Russification in Belarus, the mass flight of hundreds of thousands of Belarusians outside the country, and a new surge of interest in the Belarusian language, both in conditions of exile and under dictatorship. In such conditions, language uncertainty only increased, and the number of hypercorrect forms – especially colonialist – in the language increased, as evidenced by the analysis of the Belarusian-language press and virtual portals. The following methods are used in the research: analysis of secondary materials, comparative methods and case studies. However, the article attempts to assess the scale of language uncertainty and the spread of colonialist hypercorrect forms in the language, taking into account two standards – official and classical.

[1] Tekst artykułu jest drukowany w redakcji autorskiej [*red.*].

KEYWORDS: linguistic insecurity, hypercorrection, (colonialist) hypercorrect forms, glottophagy, Schizoglossia, Belarusian Classical Orthography, reformed Belarusian orthography.

Уступ

Моўная сытуацыя ў Беларусі здаўна моцна палітызаваная, залежная пераважна ад экстралінгвістычных чыньнікаў: геапалітыкі, слабой дзяржаўнай ідэнтычнасьці, русіфікацыі і расейскамоўнасьці ўласных палітычна-эканамічных элітаў, залежнасьці ад Расеі і расейскай мовы і г. д. [Cychun 2006; *Праявы моўнай дыскрымінацыі*… 2022; Нагорная 2024]. Гэта варта ўлічваць пры аналізе любой моўнай і сацыялінгвістычнай зьявы, якая датычыць беларускай мовы. Як вынікае з падзеяў 2020 г. і іх наступстваў, факт існаваньня беларускай дзяржавы зусім ня спрошчвае сытуацыі і часта не спрыяе разьвіцьцю беларускай мовы: беларускамоўныя асобы зьведваюць ціск з боку ўладаў, а беларуская мова амаль адсутнічае ў публічнай прасторы [*Праявы моўнай дыскрымінацыі*… 2022; Lutsevich 2024; Нагорная 2024]. Аднак беларуская мова афіцыйна прызнаная як адна зь дзяржаўных моваў, яна выкладаецца ў школах і ВНУ, часам сымбалічна прысутнічае ў афіцыйнай публічнай прасторы. Яшчэ большае сымбалічнае і практычнае значэньне беларуская мова мае для грамадзянскай супольнасьці, для беларусаў у выгнаньні і асабліва для дыяспары. Зрэшты, пратэсты 2020 г. і іх уціск, які прывёў да масавых арыштаў, хапуну і беспрэцэндэнтнай зьявы палітычных зьняволеных, а таксама чарговай вялікай хвалі выезду беларусаў за межы, вярнулі ў позву дня пытаньне значнасьці і ролі беларускай мовы для беларусаў XXI ст. [Coakley 2022; *Language as a protest* 2024]. Беларуская грамадзянская супольнасьць, якая апынулася ў выгнаньні, актуалізавала пытаньне беларускай мовы, якую выбрала за своеасаблівы сымбаль змаганьня за новую дэмакратычную Беларусь [Tsikhanouskaya 2023]. Назіраецца пэўная салідарнасьць сярод беларусаў (часта расейскамоўных у мінулым), якія ў выгнаньні беларусізуюцца і якасна пераасэнсоўваюць ролю беларускай мовы [Вячорка 2022; Фрыдман 2024]. Пасьля 2020 г. можна казаць пра новую хвалю нутранай беларусізацыі грамадзянскай супольнасьці. З сацыялінгвістычнага пункту гледжаньня, вельмі цікава назіраць за тым, што адбываецца ў дачыненьні і стаўленьні да беларускай мовы пасьля 2020 г. Нароўні з масавай падтрымкай нутранай беларусізацыі назіраюцца розныя супрацьлеглыя тэндэнцыі: частка расейскамоўных беларусаў працягваюць захоўваюць сваю спэцыфічную ідэнтычнасьць, у цэнтры якой месьціцца расейская мова; часам праўляюцца выпадкі беларусафобіі сярод беларусаў/-ак: ня толькі ў Беларусі

ва ўмовах дыктатуры множацца выпадкі афіцыйнай беларусафобіі (адмова ад традыцыі беларускай лацінкі, ад трансьлітарацыі на аснове беларускай мовы [Kamusella 2021; *Навязванне заходніх каштоўнасцей*… 2023; *Беларускай лацінкі на шыльдах*… 2023; Акудовіч 2023; *Русіфікацыя на маршы*… 2023]) і беларусафобіі з боку прарасейскіх актывістаў-ак накшталт Вольгі Бондаравай і Эльвіры Мірсалімавай [Карбалевіч 2024], але і ва ўмовах выгнаньня (напрыклад, адмова ад беларускіх формаў імёнаў і іх трансьлітарацыя з расейскай мовы: Volha – Olga, Siarhiej – Serguei, Uładzimir – Vladimir і г. д.) [*Стамілася быць Вольхай*… 2023; *Беларусы ЗША* 2023]. Такім парадкам, на фоне ўзмацненьня ролі і важнасьці беларускай мовы для прадэмакратычнай супольнасьці часам назіраюцца супрацьлеглыя і супярэчныя тэндэнцыі ў разьвіцьці беларускай мовы, якія варта разглядаць у (дэ)каляніялісцкім рэчышчы.

У выніку шматгадовай і нават некальківекавой русіфікацыі, а таксама ў выніку адсутнасьці рэальнай падтрымкі беларускай мовы ў межах незалежнай Беларусі, у беларусаў-ак узьнікла моўная няўпэўненасьць, зьява здаўна вядомая ў сацыялінгвістыцы [Calvet 1998; Cychun 2006]. Моўная беларуская кампэтэнцыя часта згубленая альбо слабая, адсутнічае інстытуцыйная падтрымка беларускамоўных, інстытут перакладніцтва цалкам русіфікаваны, існуе некалькі стандартаў беларускай мовы (тарашкевіца, "афіцыйны правапіс") – усё гэта стварае сытуацыю шызаглёсіі і ў многіх беларусаў-ак няўпэўненасьць, распаўсюд зьявы трасянкі і арыентаваньне на пэўную і прэстыжную мову – расейскую.

Назіраецца і іншая зьява сярод *новабеларускамоўных* асобаў, якія беларусізуюцца – гіпэркарэкцыя, дакладней распаўсюд гіпэркарэктных формаў у мове як адна з галоўных праяваў моўнай няўпэўненасьці: так, ва ўмовах дамінаваньня расейскай мовы і яшчэ слабой ці хісткай кампэтэнцыі ў беларускай мове многія беларускамоўныя асобы бяз гнуткасьці і натуральнасьці ўжываюць мову, множаць трасянку ці, наадварот, кніжную мову. Часта гіпэркарэктныя формы ў мове ператвараюцца ў каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы, у якіх адбіваецца сьлед расейскай мовы (*кніжны магазін* замест *кнігарня*, *ножык-раскладанік* замест *сьцізорык*; *Вільнюс*[2] замест *Вільня*, *Каўнас* замест *Коўна*, *Алітус* замест *Аліта*, *Шаўляй* замест *Шаўлі*, *Варэ(е)на* замест *Араны*, *Няры(і)с* замест *Вяльля*, *яўрэй* замест *жыд* і г. д.) [Лемцюгова 2015; Вячорка 2019; Дубавец 2023; Вольскі 2023].

[2] Вільнюс, Каўнас і пад. – не зьяўляюцца русіцызмамі, а летуанізмамі ў беларускай мове, аднак расейскі сьлед тут навідавоку: дадзеныя варыянты геаграфічных назваў зьявіліся ў афіцыйнай беларускай мове пад уплывам расейскай нормы. У *тарашкевіцы* ж засталіся традыцыйныя назвы: Вільня, Коўна і пад.

Мэтай дадзенага артыкула зьяўляецца спроба прааналізаваць сацыялінгвістычную сытуацыю вакол беларускай мовы, якая склалася пасьля 2020 г., ахапіць асноўныя і другарадныя тэндэнцыі ў разьвіцьці мовы і стаўленьні да яе як унутры краіны, так і ў значных беларускіх супольнасьцях у выгнаньні. Асаблівы акцэнт робіцца на выяўленьні зьявы моўнай няўпэўненасьці, якая праяўляецца ў множаньні (каляніялісцкіх) гіпэркарэктных формаў у сучаснай беларускай мове.

Мэтадалягічна артыкул базуецца на:

– аналізе другарадных матэрыялаў (беларускіх СМІ, беларускіх і замежных мовазнаўчых дасьледаваньняў, перапісу насельніцтва, праваабарончых справаздачаў),
– параўнаньні з досьведам іншых моваў (аксытанскай, летувіскай, расейскай), а таксама параўнаньні двух стандартаў беларускай мовы (тарашкевіцы і афіцыйнага правапісу),
– кейс-стады: паглыбленым дэталёвым дасьледаваньні канкрэтнага выпадку (або выпадкаў) у кантэксьце рэальнага сьвету [Feagin, Orum, Sjoberg 1991]. У нашым выпадку маецца на ўвазе дасьледаваньне выпадку перадачы летувіскіх назваў уласных па-беларуску і як гэта выяўляе і падкрэсьлівае агульную зьяву моўнай няўпэўнасьці і каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў у мове. Такім парадкам, фокус на кейсе і ягоны рознабаковы аналіз дапамогуць лепш зразумець агульную зьяву.

Прааналізаваць дадзеныя зьявы і тэндэнцыі ў разьвіцьці беларускай мовы пасьля 2020 г. нам дапамогуць наступныя сацыялінгвістычныя канцэпты:

Моўная няўпэўненасьць: звычайна гэты сацыялінгвістычны канцэпт аб'ядноўвае пачуцьцё трывогі, зьбянтэжанасьці або адсутнасці ўпэўненасьці носьбіта ці носьбіткі мовы адносна выкарыстаньня ім або ёй мовы. Французскі сацыялінгвіст Люі-Жан Кальвэ ўдакладняе: "Пад моўнай няўпэўненасьцю падразумяваецца такая сытуацыя, калі носьбіты мовы лічаць сваю мову малакаштоўнай, нязначнай і імкнуцца да іншай больш прэстыжнай мовы, мадэлі, якой, праўда, не валодаюць" [Calvet 1998]. Да ўсяго, Люі-Жан Кальвэ адрозьнівае некалькі тыпаў моўнай няўпэўненасьці: гэта можа быць выключна моўная, граматычная няўпэўненасьць, выкліканая клясава-эканамічным чыньнікам і няведаньнем прэстыжнай формы мовы, а таксама гэта можа быць моўная няўпэўненасьць, выкліканая экстрамоўнымі чыньнікамі: дамінаваньнем ці ўплывам іншай мовы, русіфікацыяй у беларускім выпадку і пад. [Calvet 1999 : 168].

Гіпэркарэкцыя / гіпэркарэктныя формы ў мове: памылковае абагульненьне граматычных правілаў пад дзеяньнем сацыялінгвістычнага ціску. Іншымі словамі, моўцы, якія імкнуцца адпавядаць правілам, што

трактуюцца як прэстыжныя, адзіна дакладныя, насамрэч ствараюць і агучваюць няправільныя формы. Звычайна гіпэркарэкцыя вынікае з моўнай няўпэўненасьці, некампэтэнтнасьці [Labov 1966; Kreja 1969; Winford 1978; Bourdieu 1978]. Гіпэркарэкцыя фіксуецца сярод носьбітаў і носьбітак менш прэстыжных моваў, якія спрабуюць стварыць формы, зьвязаныя з высокапрэстыжнымі стандартамі, нават у сытуацыях, калі носьбіты гэтых стандартаў гэтага ня робяць. Гіпэркарэкцыя сустракаецца ў многіх мовах і ўсюды, дзе кантактуюць некалькі моваў і/або моўных стандартаў [Labov 1972: 126]. Гіпэркарэкцыя адбываецца пераважна з-за моўных зьяваў (аналёгіі, кантамінацыі і г. д.), якія выкарыстоўваюцца няправільна і ў меркаваных фармальных і стандартызаваных сытуацыях: моўца спрабуе кампэнсаваць моўную няўпэўненасьць, якую адчувае [Berrendonner 1998]. Але часам гіпэркарэкцыя мае і экстрамоўныя карані [Francard 1997; Mortamet 2023]: уплыў іншай і пераважна больш прэстыжнай ці паноўнай мовы (напрыклад, расейскай на беларускую мову). Прыкладам гіпэркарэкцыі / гіпэркарэктнай формы ў сучаснай беларускай мове можна лічыць тэрмін “Вялікі шолам” замест дакладнага “Вялікі шлем” – многія моўцы памылкова абеларушчваюць панятак.

Каляніялісцкая гіпэркарэкцыя / каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы: зьява, якая выходзіць па-за межы клясычнай гіпэркарэкцыі (граматычнай, лексычнай, артаграфічнай, фанэтычнай) у вымярэньне сацыяльнае, экстралінгвістычнае і да якой дадаецца каляніялісцкі чыньнік, чыньнік русіфікацыі ў выпадку беларускай мовы. У такой сытуацыі моўца звычайна лепш валодае адной мовай (расейскай), але ўжывае і другую мову (беларускую). З улікам дамінаваньня расейскай мовы і русіфікацыі беларускай мовы беларускія моўцы часта сумняюцца ў веданні беларускай мовы, бо гэтая мова ўжываецца ў значна меншым аб’ёме і радзей. Вельмі часта і беларускія моўцы, і мовазнаўцы ў выніку русіфікацыі і паступовага пагоршаньня ўласнай кампэтэнцыі ў маргінальнай мове пачынаюць раўняцца на сынтаксічныя, лексычныя і стылістычныя стандарты мовы дамінаваньня, калёніі, імпэрыі (расейскай): [Сцяцко 2002; Гарбацкі 2019: 103–104]. Няўпэўненасьць і гіпэркарэктныя формы з каляніялісцкім ухілам у беларускай мове на сяньняшнім этапе найбольш актыўна праяўляюцца на прыкладзе такіх тэмаў, як тапанімія, трансьлітарацыя імёнаў і прозьвішчаў ці фэмінізацыя мовы. Каляніялісцкі ўплыў расейскай мовы асабліва моцна “чытаецца” тут: афіцыйная беларуская мова адмовілася ад уласнай традыцыі фэмінізацыі назваў пасадаў і перайшла да нормы расейскай мовы [Бушлякоў 2013: 83; Гарбацкі 2019]. У 2023–2024 гг. найбольш тыповай каляніялісцкай гіпэркарэктнай формай у беларускай мове сталася назва “Вільнюс” замест традыцыйнай “Вільня”.

Шызаглёсія: сытуацыя моўнай няўпэўненасьці або моўнага комплексу, калі людзі сутыкаюцца з больш чым адной разнавіднасьцю сваёй роднай мовы. Тэрмін быў уведзены Эйнарам Хаўгенам у 1962 г. [Haugen 1962]. Часта сустракаецца ў грамадзтвах, дзе існуюць дзьве і больш разнавіднасьцяў адной мовы, адна зь якіх лічыцца «няправільнай», а другая – прэстыжнай стандартнай ідыёмай [Bucci і Baxter 1984]. У беларускім выпадку ўсё яшчэ ўскладняецца дамінаваньнем расейскай мовы і суіснаваньнем двух стандартаў мовы: тарашкевіцы і афіцыйнага правапісу. У выніку існаваньня некалькіх моваў (расейская і беларуская) і некалькіх стандартаў беларускай мовы (афіцыйны правапіс і тарашкевіца) звычайныя моўцы губляюцца, трапляюць у сытуацыю шызаглёсіі і ў выніку ў сытуацыю моўнай няўпэўненасьці.

Глётафагія: або паглынаньне адной мовы іншай, панятак, уведзены французскім сацыялінгвістам Люі-Жанам Кальвэ ў кнізе *Лінгвістыка і каляніялізм* [Calvet 1974: 55–56], як нэгатыўны сцэнар маргіналізацыі мовы ва ўмовах каляніяліскацга прыгнёту. У беларускім выпадку найбольш карысным зьяўляецца аналіз сытуацыі, якая вядзе, па словах Л.-Ж. Кальвэ, да "поўнай глётафагіі". Калянізацыя мовы праяўляецца разнастайна: замена ўласных словаў масавымі русізмамі, зьмены ў этнаніміі, тапаніміі, наўмыснае стрымліваньне разьвіцьця лексыкі, маргіналізацыя стандартаў мовы, якія разьвіваюцца самастойна (тарашкевіца), фізычнае вынішчэньне крытычных мовазнаўцаў, стылістычная асыміляцыя, фармаваньне падпарадкаванага русіфікаванага мовазнаўства, прэзэнтацыя Беларусі ў сьвеце ў русацэнтрычнай традыцыі, адсутнасьць перакладных слоўнікаў, слабое разьвіцьцё перакладу і пераклад праз пасярэдніцтва мовы імпэрыі, распаўсюджаньне моўнай няўпэўненасьці і пад. [Calvet 1974: 79; Гарбацкі 2019: 104–105]. Зрэшты, у артыкуле панятак "глётафагія" шчыльна зьвязаны з тэмай асваеньня іншамоўных найменьняў у беларускай мове (на прыкладзе летувіскіх найменьняў). Цяперашняя сытуацыя з асваеньнем іншамоўных найменьняў ускладняецца тым, што іншамоўныя словы асвойваюцца ў беларускай мове выключна праз расейскую мову – беларуская фанэтыка амаль ня ўлічваецца [Саўка 2021: 7], што зьяўляецца яшчэ адной праявай глётафагіі.

Vergonha: (на аксытанскай мове азначае сорам, вымаўляецца *бэргонья*): выпрацоўка французскімі ўладамі (асабліва ў гістарычнай пэрспэктыве) нэгатыўнага стаўленьня да аксытанскай мовы, пачуцьця сораму і комплексу непаўнавартасьці ў аксытанцаў/-ак [Joubert 2010]. Дадзены панятак у дачыненьні да беларускай мовы пашырае параўнаўчае вымярэньне аналізу каляніялісцкіх практыкаў з боку імпэрскіх моваў, скіраваных на паслабленьне і вынішчэньне меншых

і мінарытарных моваў. Моўны сорам – зьява вядомая і ў беларускай культуры [Ivanoŭ 2022: 55–72].

Моўная няўпэўненасьць беларускамоўных і каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы

У працы разглядаецца сучасны стан (2020 – пачатак 2024 г.) моўнай няўпэўнасьці беларусаў і каляніялісцкая гіпэркарэкцыя, якія выразна праявіліся пасьля пратэстаў 2020 г., калі адбылася моцная салідарная дзейнасьць беларускай грамадзянскай супольнасьці, у тым ліку ў тоеснасным і моўным вымярэньні. Распачатая ў 2022 г. Расеяй вайна ва Ўкраіне стала дадатковым моцным штуршком у разьвіцьці моўнай тоеснасьці беларусаў-ак. Раптоўны моцны інтарэс беларусаў да ўласнай мовы быў абумоўлены гвалтам і пагрозай з боку як прарасейскага беларускага рэжыму, так і самой Расеі: расейская мова сталася мовай гвалту, вайны і дыктатуры, што выклікала пытаньні ў многіх беларусаў, у тым ліку расейскамоўных. Пэўная нутраная беларусізацыя грамадзянскай супольнасьці ў выгнаньні праявілася ня толькі ў дэкляцыі важнасьці беларускай мовы і ў пераходзе на беларускую мову значнай часткі ўчорашніх расейскамоўных беларусаў, а таксама ў пашырэньні зьявы моўнай няўпэўненасьці і каляніялісцкай гіпэркарэкцыі. Цягам 2021–2023 гг. у сеціве істотна пашырыўся кантэнт беларускамоўных старонак, парталаў, СМІ, якія былі забароненыя ў Беларусі (“Наша Ніва”, “Новы Час”, “Радыё Свабода”, “Радыё Рацыя”, “Будзьма”). Якраз матэрыялы гэтых рэсурсаў былі прааналізаваныя з мэтай выяўленьня зьявы няўпэўненасьці і (каляніялісцкіх) гіпэркарэктных формаў у мове.

Аднак дадзеныя зьявы – няўпэўненасьць і каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы ў мове – не паўсталі ў выніку пратэстаў 2020 г., яны датуюцца яшчэ часамі Расейскай імпэрыі, калі беларуская мова была забароненая, зьведзеная да дыялекту расейскай мовы і калі ўсяляк у беларускага насельніцтва выпрацоўваўся комплекс ніжэйшасьці. Таму моўная няўпэўненасьць беларусаў мае даўнія карані, якія сягаюць у час Расейскай, а потым і савецкай імпэрыі, калі беларускія землі былі захопленыя і калянізаваныя. А таму і панятак каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы цалкам апраўданы.

У пэрыяд 2020 – пачатак 2024 г. падчас вітка нутранай беларусізацыі, якая гэтым разам адбываецца без усялякай сувязі зь дзяржавай, а пераважна насупор ёй і выключна зь ініцыятывы грамадзянскай супольнасьці, каляніялісцкія гіпэкарэктныя формы асабліва выразна пачалі праяўляцца ў выкарыстаньні зрусіфікаванай моўнай спадчыны для апісаньня беларускіх назваў геаграфічных і імёнаў уласных. Як здаўна

ўдала падкрэсьліў французскі сацыялінгвіст Ж.-Л. Кальвэ, “права называць і апісваць сябе і сваю геаграфію ня дадзена калёніі, пэрыфэрыі, а толькі мэтраполіі, цэнтру” [Calvet 1974 : 56], у беларускім выпадку – Маскве і расейскай мове. Па словах мовазнаўцы Валянціны Лемцюговай, у межах імпэрыі Беларусь зьведала “тапанімічны генацыд” [Лемцюгова 2015 : 339], і ў XXI ст. беларусы нават у межах уласнай дзяржавы ўвайшлі з скажонай і русіфікаванай тапанімічнай і антрапанімічнай спадчынай. Афіцыйная зрусіфікаваная беларуская мова прадукавала і прадукуе расейскую карціну сьвету, а да беларускай мовы дыяспары і мяншыні ў самой Беларусі – тарашкевіцы – распаўсюджвалася скептычнае ці нават нэгатыўнае стаўленьне. Не зважаючы на афіцыйнае дзьвухмоўе, веды і кампэтэнцыі беларусаў у беларускай мове значна саступаюць узроўню валоданьня расейскай мовай.

Улічваючы гэтыя сацыялінгвістычныя акалічнасьці, цалкам зразумелымі становяцца прычыны і маштаб моўнай няўпэўненасьці і распаўсюду каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў у мове ў XXI ст.: зрусіфікаваная сыстэма адукацыі, слабая ці пасіўная моўная кампэтэнцыя вялікай часткі мястовых беларусаў толькі ўзмацняюць моўную няўпэўненасьць ва ўмовах выгнаньня і эканамічна-сацыяльнай прэкарнасьці.

Зрэшты, да моўнай няўпэўненасьці можна аднесьці ня толькі блытаніну ў выкарыстаньні словаў “адчыніць”, “адкрыць”, “цяпер” і “зараз”, але і частае ўжываньне трасянкі ці русізмаў. Праявай моўнай няўпэўненасьці на публічным калектыўным узроўні да ўсяго, зьяўляецца перакручаная, а часам проста памылковая трансьлітарацыя ў дакумэнтах (напрыклад, у пашпартах) беларускіх уласных імёнаў (Genadz замест Hienadź, Volga замест Volha ці Ivanov замест Ivanoŭ). Наагул няведаньне ўладамі і многімі беларус-к-амі традыцыі ўласнай лацінкі і трансьлітарацыі, прынятай міжнароднай асацыяцыяй славістаў, – гэта таксама прыклад моўнай няўпэўненасьці, успадчыненай з часоў імпэрыі. Скрайняя форма моўнай няўпэўненасьці – жаданьне зьмяніць існую моўную, культурную ідэнтычнасьць і выбраць упэўненую, стабільную мадэль (расейскую, польскую і пад.): такія праявы таксама фіксуюцца сярод беларусаў як унутры краіны, так і ў выгнаньні. Хвалі зьмены беларус-к-амі прозьвішчаў і імёнаў у лацінкавым варыянце (Volha – Olga, Siarhiej – Serguei) часта таксама вынікаюць з моўнай няўпэўненасьці [*Стамілася быць Вольхай*… 2023; *Беларусы ЗША* 2023].

Што датычыць каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў, якія вынікаюць з моўнай няўпэўненасьці, то найбольш яскравым прыкладам зьяўляюцца паняткі “яўрэй”, “яўрэйка” і вытворныя. Слова пад уплывам русіфікацыі здаўна сталася нормай у афіцыйнай беларускай мове, прыгэтым традыцыйныя нэўтральныя ў беларускай мове словы “жыд”,

“жыдоўка” і вытворныя былі змаргіналізаваныя і на расейскі манер зьведзеныя да абразаў. Але гэтыя апошнія варыянты застаюцца нормай у тарашкевіцы. Аднак часта сярод новатарашкевічанцаў, то бок тых, хто нядаўна перайшоў на тарашкевіцу, спрацоўвае каляніялісцкая гіпэркарэкцыя, і моўцы не адважваюцца ўжываць слова “жыд”, прыўносяць у тарашкевіцу русізм “яўрэй”. А часам няўпэўненыя моўцы шукаюць нэўтральны, бясьпечны, на іх думку, варыянт – “габрэй”. Такім парадкам, зьява каляніялісцкай гіпэркарэкцыі вядомая моўцам абодвух стандартаў: афіцыйнага і клясычнага правапісаў.

Да каляніялісцкай гіпэркарэкцыі можна аднесці таксама і тое, як беларускія моўцы пад уплывам стылістычнай нормы расейскай мовы пазьбягаюць і не ўжываюць фэмінітываў, альбо робяць гэта няўпэўнена, непасьлядоўна. Слова “намесьніца” – найбольш тыповы прыклад: многія журналісты, а таксама іншыя моўцы часта сумняюцца наконт ужываньня фэмінітыву слова “намесьнік” і таму часьцяком у размове дазваляюць сабе фэмінітыў, але на пісьме праз няўпэўненасьць самі карэктуюць сябе і пакідаюць маскулінітыў для азначэньня жанчыны. Падобнае назіраецца і зь іншымі фэмінітывамі.

Асаблівую актуальнасьць апошнім часам набыла зьява каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў у сучаснай мове на прыкладзе беларуска-летувіскіх кантактаў. Таму прапаную падрабязна спыніцца на гэтым выпадку.

Кейс-стады: перадача летувіскіх уласных назваў па-беларуску

Практычна зразумець зьяву моўнай няўпэўненасьці і каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў у беларускай мове можна на актуальным прыкладзе ўзмацьненьня гіпэркарэкцыі ва ўмовах, з аднаго боку, павялічэньня інтарэсу саміх беларусаў-ак да роднай мовы пасьля 2020 г., а з другога боку, ва ўмовах выгнаньня і пераезду ў суседнія краіны. Нас цікавіць асабліва выпадак Летувы. Так, на 1 верасьня 2023 г. у Летуве пражывала больш за 60.000 беларусаў [*З пачатку году ў Літву*… 2023]. Калі да вайны ва Ўкраіне стаўленьне да беларусаў было досыць пазытыўнае, пасьля таго, як рэжым А. Лукашэнкі пасіўна падтрымаў расейскі бок, стаўленьне пачало мяняцца ў бок стрыманасьці, а часам і нэгатыўнасьці [*Apklausa parodė tikrąjį vaizdą*… 2024]. Прыгэтым многія беларускія асацыяцыі, рухі грамадзянскай супольнасьці, а таксама бізнэс-структуры перабраліся ў Летуву, асабліва ў Вільню. Так, у Вільню перабраўся Саюз беларускіх пісьменьнікаў, часткова калектыў “Будзьма”, частка незалежных журналістаў і журналістак аселі ў Летуве. Таксама офіс

Сьвятланы Ціханоўскай месьціцца ў Вільні. Задоўга да 2020 г. у Вільні знайшоў прытулак Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт у выгнаньні. Такім парадкам, беларуская і беларускамоўная прысутнасьць у Вільні значна ўзмацьнілася. Падаецца, дэмакратычны кантэкст павінен быў спрыяць дзейнасьці беларусаў і іх далейшай нутранай беларусізацыі ў Летуве, аднак сытуацыя пагоршылася на тле вайны ва Ўкраіне.

Дадзены кантэкст важны для разуменьня зьявы каляніялісцкай гіпэркарэкцыі, і асабліва каляніялісцкіх гіпэркарэктных формаў у беларускай мове. Кейс-стады базуецца на аналізе віртуальнай беларускамоўнай прэсы (“Новы Час”, “Наша Ніва”), інфармацыйных парталаў (“Радыё Свабода”, Беларуская служба Польскага Радыё і “Радыё Рацыя”), старонак культурніцкіх праектаў (“Будзьма”), выдавецтваў у выгнаньні (Скарына, Пфляўмбаўм, Gutenberg, Вясна), а таксама моўных дэбатаў, якія завязаліся ў беларускамоўнай супольнасьці наконт ужываньня летувіскіх геаграфічных назваў па-беларуску (Вільня / Вільнюс, Коўна/Каўнас і пад.), а таксама наконт ужываньня формаў “літоўскі” і/ці “летувіскі” [Вячорка 2019; Дубавец 2023; Вольскі 2023]. Добрыя знаўцы і прапагатары беларускай мовы (няхай і не мовазнаўцы па адукацыі) – Сяргей Дубавец, Лявон Вольскі – на сучасным этапе слушна і ўпарод за мовазнаўцаў зьвярнулі ўвагу на чарговае пашырэньне ў беларускім узусе летуанізаванай праз русіфікаванае пасярэдніцтва формы “Вільнюс”. Тады як у тарашкевіцы ўсталяваная адзіная норма “Вільня” [Вячорка 2019], у афіцыйнай беларускай мове існуюць два варыянты: у гістарычнай пэрспэктыве “Вільня” і ў сучаснай “Вільнюс”. Цяпер жа зь ініцыятывы некаторых дзеячоў (Сяргей Будкін), якія апынуліся ў выгнаньні, чуваць заклікі “Адпусьціць Вільню, прыняць Вільнюс” [Дубавец 2023]. Падобны заклік дзейнічае як каляніялісцкая гіпэркарэкцыя: цалкам адкідваецца і ігнаруецца гісторыя, традыцыя і эстэтыка мовы і дадзенага слова ў беларускай мове. С. Дубавец вельмі слушна называе гэтую тэндэнцыю як “самапрыніжэньне” [Дубавец 2023]: беларусаў пазбаўляюць гісторыі мовы, прапануюцца словы, варыянты зь іншых моваў, што руйнуе доўгую супольную гісторыю паміж даўнімі суседзямі, зноў уводзіцца непатрэбнае пасярэдніцтва іншай культуры і мовы – расейскай, якая будуе культурны мост паміж Летувой і Беларусьсю, быццам гэтыя культуры ня ў сілах справіцца самастойна. У межах палітычна-карэктнага і каляніялісцкай гіпэркарэкцыі многія іншыя беларускія культурныя актары “адпускаюць Вільню і прымаюць Вільнюс”: так, у 2020-м – пачатку 2024 г. форма “Вільнюс” сустракаецца ў пэўнай частцы артыкулаў “Новага Часу”, яшчэ часьцей дадзеная форма, хоць і нароўні зь “Вільняй”, выкарыстоўваецца на старонцы “Будзьмы”. У афіцыйным і адзіным дзяржаўным беларускамоўным штодзённіку – газэце “Звязда” – амаль не сустракаецца

форма “Вільня”, а пераважна “Вільнюс”. Прыгэтым газэта “Наша Ніва”, партал “Радыё Свабода”, “Радыё Рацыя” і Беларуская служба Польскага Радыё выкарыстоўваюць выключна традыцыйную форму “Вільня”.

Каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы перадаюць элемэнт самапрыніжэньня, аб чым піша С. Дубавец. Да ўсяго, варта глядзець шырэй на гэтую зьяву: беларуская мова была русіфікаваная і ў беларусаў здаўна праяўляецца моўная няўпэўненасьць у апісаньні ўласных геаграфічных назваў: Мінск замест Менск, Гродна замест Горадня, Брэст замест Берасьце і г. д. Паступова самапрыніжэньне з нутрыбеларускага поля перайшло ў вонкавае поле, калі паводле каляніялісцкай лёгікі беларусы пачалі карэктаваць, мяняць і часта насупор традыцыі і гістарычна-эстэтычным напрацоўкам тапанімічныя назвы суседніх культураў. Аднак прыгэтым ніхто не крытыкуе і ня ставіць пад сумнеў моўныя нормы летувіскай мовы ў падачы беларускіх геаграфічных назваў: Gardinas – Горадня, Brasta – Берасьце, Vija – Іўе і пад. Таксама ніхто ня ставіць пад сумнеў падачы летувіскіх назваў у польскай традыцыі: Wilno, Kowno. Гэта сьведчыць аб тым, што летувіскім і польскім моўцам не ўласьцівая каляніялісцкая гіпэркарэкцыя.

Каб паўней зразумець і ахапіць праблематыку, варта ўлічваць вымярэньне традыцыі і стандартаў беларускай мовы (*тарашкевіца* і *афіцыйны правапіс*), якія часам прынцыпова па-рознаму перадаюць уласныя назвы. Праўда, унутры тарашкевіцы часам таксама назіраецца разыходжаньне ў азначэньнях панятку “Летува”: так, калектыў “Радыё Свабоды”, а таксама выдавецтва “Вясна” на чале зь Сяргеем Шупам, калектыў “Запісаў БІНіМу” і мовазнаўца В. Вячорка прытрымліваюцца формаў “Літва”, “літоўскі”, “літовец”, “літоўка” [Вячорка, Шупа 2020]. Тады як дыяспарнікі лёнданскай Скарынаўкі (Леў Гарошка, Аляксандар Надсан), а таксама некаторыя беларусы Канады (напрыклад, Сяргей Хмара) з 1950-х гг. аддавалі перавагу паняткам “Летува”, “летувіскі”, такім парадкам, прынцыпова тэрміналягічна адрозьніваючы сучасную Летувіскую Рэспубліку ад гістарычнай Літвы [Санько 2020; Краўцэвіч 2020; Гарбацкі 2020]. Згодна з тарашкевіцкай дыяспарнай моўнай традыцыяй, паняткі “летувіскі”, “летувіская”, “летувіс”, “летувіска” як вытворныя ад назвы “Летува” азначаюць цяперашнюю Летувіскую Рэспубліку. Тарашкевіцкая ж традыцыя базуецца перадусім на саманазьве “Lietuva”, то бок улічваецца арыгінальная саманазва. Падобнае мы назіраем у іншых сытуацыях: “Сіям” замест ці нароўні з формай “Тайлянд”, “Ніпон” замест ці нароўні з формай “Японія” і г. д. Апрача таго, што ў тарашкевіцы ўлічваецца і паважаецца саманазва “Lietuva”, як ужо пазначалася, існуе яшчэ адна прычына ўжываньня дадзенага панятку: тэрміналягічнае адрозьненьне гістарычнай Літвы і сучаснай

Летувы. Дарэчы, падобнае тэрміналягічнае адрозьненьне існуе ў французскай мове: Lithuanie з “h” азначае гістарычную Літву і ВКЛ, тады як варыянт Lituanie без “h” – сучасную Летуву.

Варта пазначыць, што пэўны час сучасныя лёнданскія скарынаўцы выкарыстоўвалі дзьве формы “летувіскі” ў знак павагі да айцоў-заснавальнікаў Скарынаўкі, а таксама часам “літоўскі” як вынік моўнай няўпэўненасьці і хісткасьці нормы. Няма сумневу, адсутнасьць аднаго варыянту і інтэлектуальныя спрэчкі вакол дакладнасьці азначэньняў Літвы / Летувы, а таксама аўтарытэт мовазнаўцы В. Вячоркі і выдаўца, перакладніка С. Шупы часта спрычыньваюцца да ўзмацьненьня няўпэўненасьці моўцаў.

Таксама ў разрэзе двух стандартаў беларускай мовы – тарашкевіцы і наркамаўкі (афіцыйнага правапісу) – неабходна разумець і аналізаваць асноўныя адрозьненьні ў перадачы летувіскіх уласных назваў (тапонімаў і антрапонімаў). Афіцыйны правапіс, які трапіў пад наўпросты русіфікатарскі ўплыў, працягвае прадукаваць зьяву каляніялісцкай гіпэркарэкцыі, цалкам адмовіўшыся ад традыцыйных назваў: Вільня (на карысьць адначасова зрусіфікаванай і летуанізаванай формы Вільнюс), Коўна (на карысьць Каўнас) і г. д. Разгорнуты сьпіс летувіскіх тапанімічных аб’ектаў і іх адрозная перадача ў тарашкевіцы і наркамаўцы пададзеныя ніжэй:

Летувіская назва	**Тарашкевіца**	**Наркамаўка**
Vilnius	Вільня	Вільнюс
Kaunas	Коўна	Каўнас
Alytus	Аліта	Алітус
Zarasai	Езяросы	Зарасай
Neris	Вяльля	Нярыс, Вілія
Šiauliai	Шаўлі	Шаўляй
Druskininkai	Друскенікі	Друскінінкай
Pabradė	Падброддзе	Пабрадзе
Švenčionys	Сьвянцяны	Швянчоніс
Varėna	Араны	Варэна
Vievis	Еўе	Віевіс
Nemenčinė	Немянчын	Нямянчыне
Trakai	Трокі	Тракай

Так, наркамаўскія моўцы ў выніку русіфікацыі адмовіліся ад традыцыйных беларускіх назваў летувіскіх тапонімаў і перайшлі на формы, прынятыя ў расейскай мове. Сярод новатарашкевічанцаў таксама часам фіксуецца зьява каляніялісцкай гіпэркарэкцыі: пад уплывам наркамаўскага стандарту некаторыя моўцы, якія нядаўна перайшлі на тарашкевіцкі стандарт, прадукуюць штучныя ў тарашкевіцы варыянты: напрыклад, часам замест “Вільня” кажуць “Вільнюс” і г. д.

Наступны важны лексычны пласт, які варта прааналізаваць у сьвятле каляніялісцкай гіпэркарэкцыі і моўнай няўпэўненасьці, – летувіскія антрапонімы, у прыватнасьці дзявочыя, жаночыя імёны і іх перадача па-беларуску. Зноў афіцыйны і клясычны правапісы па-рознаму перадаюць некаторыя летувіскія імёны і прозьвічшы, у якіх сустракаецца летувіскі гук [ė]. Гэта вузкае доўгае ***е*** пярэдняй артыкуляцыі, найбольш блізкім да яго ў сыстэме фанэмаў беларускай мовы зьяўляецца гук пярэдняга раду [‘е]. Таму пішам –е: *Біруц**е***, *Адамавічуц**е*** і пад. [Сьвяжынскі: 1985; Саўка: 2021]. Але на практыцы сучасная афіцыйная беларуская мова прапануе памылковы варыянт: *Бірутэ*, *Адамавічутэ*, а таксама *Жэмайтэ*, *Грыбаўскайтэ*, *Сыманайцітэ*, *Казлаўскайтэ* і г. д. Такім парадкам, на афіцыйным роўні праяўляецца каляніялісцкая гіпэркарэкцыя: выдавецтвы, рэдакцыі наркамаўскай традыцыі як у эпоху БССР, так і цяпер распаўсюджваюць дадзеную памылку [*Літоўскія апавяданні* 1957; *Прэзыдэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ*… 2011; *Грыбаўскайтэ мае намер*… 2014; *Пантыфік прыняў*… 2019]. Цікава, што афіцыйныя мовазнаўцы зьвярталі на гэта ўвагу – так, Уладзімер Сьвяжынскі ў 1985 г. пісаў аб гэтай праблеме і памылцы ў часопісе “Беларуская лінгвістыка” [Сьвяжынскі 1985: 60]. Аднак голас мовазнаўцы застаўся непачутым. Прыгэтым у сучаснай тарашкевіцы назіраем пераважна карэктныя формы з *–е*: *Жэмайце*, *Грыбаўскайце, Сыманайціце*, *Казлаўскайце* і пад. Хоць “Радыё Свабода” ў мінулым часе выкарыстоўвала памылковую форму Грыбаўскайтэ [*Прэзыдэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ*… 2011]. Навідавоку выпадак каляніялісцкай гіпэркарэктнай формы, калі беларускія моўцы робяць памылку пад уплывам расейскай мовы, раўнаньня на расейскую норму: *Грибаускайте* → *Грыбаўскайтэ*.

Нарэшце, яшчэ раз зьвернем увагу на паняткі “яўрэй-габрэй-жыд” у сьвятле каляніялісцкай гіпэркарэкцыі і ў зьвязцы зь летувіскай мовай: прыклад летувіскай (а таксама, між іншым, польскай) моваў дэманструе, якімі адрознымі шляхамі разьвіваліся нашыя мовы. Калі да русіфікацыі беларускай мовы слова “жыд” было нэўтральным і нарматыўным, то ў выніку пераносу сэнсу з расейскай мовы ў беларускую слова “жыд” у афіцыйнай беларускай мове ў 30-я гг. ХХ ст. сталася ненарматыўным. У той жа час у беларускай мове, якой карысталіся беларусы Вільні, Заходняй

Беларусі ў межах Польшчы “жыд” заставалася нормай. Пазьней слова “жыд” і вытворныя захаваліся ў беларускай мове дыяспары. Праўда, і там у выніку каляніялісцкай гіпэркарэкцыі заўважаецца звужэньне ягонага выкарыстаньня і пераход да формы “габрэй”. У летувіскай жа мове словы *žydas*, *žydė* захаваліся як адзіная норма, не зважаючы на спробы за савецкім часам, а таксама потым у незалежнай Летуве паставіць пад сумнеў іх нэўтральнасьць [*Ar keisti žodį „žydas“*]. То бок летувіская мова ў гэтым выпадку пазьбегла каляніялісцкага ўплыву расейскай мовы і каляніялісцкай гіпэркарэкцыі.

Падсумоўваючы, варта пазначыць, што аналіз выпадку перадачы летувіскіх уласных назваў па-беларуску закранае надзвычай складаную і палітызаваную тэму сацыялінгвістычнага поля, якая ўскладняецца русіфікацыяй унутры Беларусі, наяўнасьцю двух стандартаў беларускай мовы і гуманітарнай крызай беларускай навукі, гуманістыкі, калі пасьля 2020 г. вучоныя апынуліся ў выгнаньні.

Заканчэньне

Моўная няўпэўненасьць і ейная тыповая праява – гіпэркарэкцыя – зьявы ўнівэрсальныя і ўласьцівыя ў розных ступенях усім мовам [Labov 1966; Bourdieu 1978]. У сацыялінгвістыцы адрозьніваюць некалькі кшталтаў моўнай ці лінгвістычнай няўпэўненасьці: выключна моўная, граматычная няўпэўненасьць, выкліканая клясава-эканамічным чыньнікам і няведаньнем прэстыжнай формы мовы, а таксама гэта можа быць моўная няўпэўненасьць, выкліканая цалкам экстрамоўнымі чыньнікамі: дамінаваньнем ці ўплывам іншай мовы, русіфікацыяй у беларускім выпадку і пад. [Calvet 1999 : 168]. Часам моўная няўпэўненасьць можа быць індывідуальнай, зьвязанай з псыхалягічнай няўпэўненасьцю чалавека [Bernstein 1973]. Моўцы як мільённых, так і мінарытарных моваў зьведваюць няўпэўненасьць і выкарыстоўваюць гіпэркарэктныя формы. Аднак, не зважаючы на ўнівэрсальнасьць зьявы, унутры некаторых, як правіла, мінарытарных, уразьлівых і калянізаваных моваў, назіраюцца спэцыфічныя выпадкі. Так, беларуская мова, якая здаўна зьведвае стасункі падпарадкаваньня, залежнасьці ад мовы імпэрыі – расейскай, увасабляе цікавы выпадак з пункту гледжаньня зьявы моўнай няўпэўненасьці. Перадусім няўпэўненасьць беларускіх моўцаў, выкліканая ня нутранымі моўнымі чыньнікамі, а экстрамоўнымі – русіфікацыяй. Русіфікацыя як праява, рэсурс каляніялісцкай палітыкі імпэрыі стварыла іншую спэцыфічную зьяву – *каляніялісцкую гіпэркарэкцыю,* дакладней *каляніялісцкія гіпэркарэктныя формы*. Гэтыя паняткі цалкам новыя, створаныя ў межах дадзенага дасьледаваньня. Звычайна ў сацыялінгвістыцы мова йдзе пра

гіпэркарэкцыю, аднак у беларускім выпадку я прапаную ахапіць вымярэньне каляніялісцкага ўплыву, вынікам якога сталася каляніялісцкая гіпэркарэкцыя, якая выходзіць па-за межы клясычнай гіпэркарэкцыі (граматычнай, лексычнай, артаграфічнай, фанэтычнай) у вымярэньне сумежнае сацыяльнае, экстралінгвістычнае.

Ale czy ptaki są dla R. Baradulina tylko „pretekstem do ujęcia w sztuce" [Poller 2004: 228]? Odpowiedź na to pytanie wymaga odniesienia się do osoby autora oraz spojrzenia „z lotu ptaka" na całokształt jego twórczości. Wielka miłość literata do kraju rodzimego znalazła swoje ujście w jego poezji, wszak jest ona na wskroś przesiąknięta białoruskim patriotyzmem. Utwory artysty są przepełnione nawiązaniami do dzieł kultury, obyczajów, wydarzeń historycznych i symboli, które konstytuują białoruską tożsamość narodową. Nie sposób nie wspomnieć, iż strofy poetyckie R. Baradulina przedstawiają „encyklopedycznie szeroki obraz piękna naturalnego Białorusi" [McMillin 2009: 137 (tłum. własne)]. Tym niemniej pragnienie encyklopedyzacji białoruskiej flory i fauny nie jest wystarczająco przekonującym tłumaczeniem dla jej bogatej obecności na kartach jego utworów. Zdaniem autora tego tekstu, R. Baradulin wlicza w pojęcie ojczyzny całą przyrodę wraz z jej odnogami: roślinną i zwierzęcą. Owa baradulińska relacja jest czymś więcej niż tylko zwyczajną więzią terytorialną, co wynika z jego przekonania o realnym oddziaływaniu przyrody na kulturę i poczucie tożsamości. Wersy pisarza niejednokrotnie dotyczą przemian społecznych i cywilizacyjnych odbywających się na Białorusi (urbanizacja, odpływ Białorusinów do miast, technicyzacja i mechanizacja prac), które nie pozostają bez wpływu na i tak kruchą, jedynie częściowo uformowaną białoruską tożsamość narodową. Dlatego można uznać, iż spod warstwy ptasich motywów u R. Baradulina przebija się echo

otwierającego ten tekst Sommerowskiego pytania, które z kolei jest dalekim pogłosem niemego krzyku samego twórcy: „A co z naszą Białorusią”?

References

Baradulin Ryhor. 2005. *Ksty*. Minsk: Rymska-katalickaja parafija Svjatoha Symona i Svjatoj Aleny [Барадулін Рыгор. 2005. *Ксты.* Мінск: Рымска-каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены].

Baradulin Ryhor. 2008. *Vybranyja tvory*. Minsk: Belaruski Knihazbor [Барадулін Рыгор. 2008. *Выбраныя творы.* Мінск: Беларускі Кнігазбор].

Baradulin Ryhor. 2013. *Ksty. Vydanne čacvërtae, dapoŭnenane*. Minsk: Rymska-katalickaja parafija Svjatoha Symona i Svjatoj Aleny [Барадулін Рыгор. 2013. *Ксты. Выданне чацвёртае, дапоўненане.* Мінск: Рымска-каталіцкая парафія Святога Сымона і Святой Алены].

Biblia Jerozolimska. Wydanie pierwsze. 2006. Poznań: Pallottinum.

Borowski Oded. 1992. *Agriculture* (95–98). W: *The Anchor Bible Dictionary. Volume 1 A–C*. Red. D. N. Freedman [i in.]. New York: Doubleday.

Bosak C. Pius. 2018. *Leksykon wszystkich zwierząt biblijnych*. Kraków: Wydawnictwo Petrus.

Dučyc Ljudmila. 2004. *Dzjady*. U: *Belaruskaja mifalohija. Ènciklapedyčny sloŭnik*. Rèd. S. San′ko, T. Valodzina, U. Vasilevič [i inš.]. Minsk: Belarus′. [Дучыц Людміла. 2004. *Дзяды.* У: *Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік*. Рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. Мінск: Беларусь].

ÈSBM (*Ètymalahičny sloŭnik belaruskaj movy*). 1989. Tom 5. K–L. Uklad. V. U. Martynaŭ, II. Lučyc′-Fedarèc. Rèd. V.U. Martynaŭ. Minsk: Belaruskaja navuka [ЭСБМ (*Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*). 1989. Том 5. К–Л. Уклад. В.У. Мартынаў, І.І. Лучыць-Федарэц. Рэд. В.У. Мартынаў. Мінск: Беларуская навука].

ÈSBM (*Ètymalahičny sloŭnik belaruskaj movy*). 2006. Tom 11. R–S. Rèd. H.A. Cyxun. Minsk: Belaruskaja navuka [ЭСБМ (*Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*). 2006. Том 11. Р–С. Рэд. Г.А. Цыхун. Мінск: Беларуская навука].

Forstner Dorothea OSB. 2001. *Świat symboliki chrześcijańskiej. Leksykon*. Przeł. W. Zakrzewska, P. Pachciarek, R. Turzyński. Warszawa: Instytut Wydawniczy PAX.

Franciszek. 2015. *Encyklika Laudato si*. Watykan: Libreria Editrice Vaticana.

Ganowicz-Bączyk Anita. 2015. *Narodziny i rozwój etyki środowiskowej*. „Studia Ecologiae et Bioethicae” T. 13. Nr 4: 39–63.

Guardini Romano. 1969. *Upadek czasów nowożytnych* [tyt. org. *Das Ende der Neuzeit*]. Tłum. Z. Włodek. Kraków: Wydawnictwo Znak.

Gura Aleksandr. 2002. *Lastočka*. V: *Slavânskaâ mifologiâ. Ènciklopedičeskij slovar′*. Red. S.M. Tolstaâ [i dr.]. Moskva: Meždunarodnye otnošeniâ [Гура Александр. 2002. *Ласточка*. В: *Славянская мифология. Энциклопедический словарь*. Ред. С.М. Толстая [и др.]. Москва: Международные отношения].

Klimčuk Fëdar, Jaškin Ivan [rèd.]. 1995. *Leksičnyja landšafty Belarusi: Žyvël′ny svet*. Minsk: Navuka i tèxnika [Клімчук Фёдар, Яшкін Іван [рэд.]. 1995. *Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет*. Мінск: Навука і тэхніка].

Kopaliński Władysław. 2006. *Słownik symboli*. Warszawa: Oficyna Wydawnicza RYTM.

Kornhauser Jakub, Polak Marcin, Tryjanowski Piotr, Wójtowicz Aleksander. 2022. *„Który tak śpiewa?”. Uwagi wstępne* (7–20). W: *„Który tak śpiewa?”. Ptaki w kulturze*. Red. J. Kornhauser, M. Polak, P. Tryjanowski, A. Wójtowicz. Kraków: Wydawnictwo Universitas.

Kulczycka Dorota. 2004. *O symbolice ptaków w twórczości Juliusza Słowackiego.* Zielona Góra: Oficyna Wydawnicza Uniwersytetu Zielonogórskiego.

Malaš Leanila. 1989. *Pasah*. U: *Ètnahrafija Belarusi: èncyklapedyja*. Hal. rèd. Ivan Šamjakin. Minsk: Belaruskaja saveckaja èncyklapedyja [Малаш Леаніла. 1989. *Пасаг.* У: *Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя*. Гал. рэд. І. Шамякін. Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя].

Maloxa Miraslava. 2004. *Jablynja*. U: *Belaruskaja mifalohija. Èncyklapedyčny sloŭnik*. Rèd. S. San'ko, T. Valodzina, U. Vasilevič [i inš.]. Minsk: Belarus' [Малоха Міраслава. 2004. *Яблыня*. У: *Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік*. Рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. Мінск: Беларусь].

Marczewski Anotni. 2017. *Interpretacje motywu kruka z opowiadania o Potopie*. „Verbum Vitae". T. 32: 55–70.

McMillin W. Arnold. 2009. *Ryhor Baradulin – a poet for all seasons*. „Annus Albaruthenicus". T. 10: 121–169.

Miłosz Czesław. 1981. *Dolina Issy*. Kraków: Wydawnictwo Literackie.

Miłosz Czesław. 2015. *Wiersze wszystkie*. Kraków: Wydawnictwo Znak.

Mrozek Andrzej, Szczepanowicz Barbara. 2007. *Atlas zwierząt biblijnych. Miejsce w Biblii i symbolika*. Kraków: Wydawnictwo WAM.

Poller Tomasz. 2004. *Przyroda, cywilizacja, kultura w refleksji Adama Mickiewicza*. „Państwo i społeczeństwo IV". Nr 2: 221–230.

Salavej Lija. 2004a. *Zjazjulja*. U: *Belaruskaja mifalohija. Èncyklapedyčny sloŭnik*. Rèd. S. San'ko, T. Valodzina, U. Vasilevič [i inš.]. Minsk: Belarus' [Салавей Лія. 2004. *Зязюля*. У: *Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік*. Рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. Мінск: Беларусь].

Salavej Lija. 2004b. *Knihaŭka*. U: *Belaruskaja mifalohija. Èncyklapedyčny sloŭnik*. Rèd. S. San'ko, T. Valodzina, U. Vasilevič [i inš.]. Minsk: Belarus' [Салавей Лія. 2004. *Кнігаўка*. У: *Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік*. Рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. Мінск: Беларусь].

Siedlecki Michał. 2017. *Litewskie konteksty Czesława Miłosza Viktoriji Daujotytė i Mindaugasa Kvietkauskasa. Wokół rozważań o duchowej ojczyźnie poety* (533–563). W: *Zagadnienia bilingwizmu. Seria I: Dwujęzyczni pisarze litewscy i polscy.* Red. A. Baranow, J. Ławski. Vilnius–Białystok: Uniwersytet w Białymstoku, Książnica Podlaska im. Łukasza Górnickiego, Wydawnictwo Prymat.

Sommer Piotr. 2022. *Lata praktyki*. Poznań: Wojewódzka Biblioteka Publiczna i Centrum Animacji Kultury w Poznaniu.

Svensson Lars [tekst i mapy], Killian Mullarney, Dan Zetterström. 2012. *Przewodnik Collinsa. Ptaki Europy i obszaru śródziemnomorskiego*. Warszawa: MULTICO Oficyna Wydawnicza.

Šybeka Zaxar. 2003. *Narys historyi Belarusi*. Minsk: Èncyklapedyks [Шыбека Захар. 2003. *Нарыс гісторыі Беларусі*. Мінск: Энцыклапедыкс].

TSBM (*Tlumačal'ny sloŭnik belaruskaj movy*). 1984. Tom 5. Kniha 2. U–JA. Rèd. K.K. Atraxovič. Minsk: Belaruskaja saveckaja èncyklapedyja imja Petrusja Broŭki [ТСБМ (*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*). 1984. Том 5. Кніга 2. У–Я. Рэд. К. К. Атраховіч. Мінск: Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі].

Valodzina Taccjana, Saxuta Jaŭhen. 2004. *Ptuški*. U: *Belaruskaja mifalohija. Èncyklapedyčny sloŭnik*. Rèd. S. San'ko, T. Valodzina, U. Vasilevič [i inš.]. Minsk: Belarus' [Валодзіна Таццяна, Сахута Яўген. 2004. *Птушкі.* У: *Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік*. Рэд. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. Мінск: Беларусь].

Vjačorka Vincuk. 2022. *Lës belaruskaha slova. Knihaŭka: nazva ptuški i symbal' njazlomnas'ci* [online] https://www.svaboda.org/a/knihauka/31887307.html [доступ: 04.05.2024]. [Вячорка Вінцук. 2022. *Лёс беларускага слова. Кнігаўка: назва птушкі і сымбаль нязломнасьці*].

Wójtowicz Aleksander. 2022. *Gawron, czyli nowoczesność. Wokół Gniazda Białozora Marii Rodziewiczówny* (105–118). W: *„Który tak śpiewa?". Ptaki w kulturze*. Red. J. Kornhauser, M. Polak, P. Tryjanowski, A. Wójtowicz. Kraków: Wydawnictwo Universitas.
Zuënak Vasil'. 2010. *Vybranyja tvory*. Minsk: Belaruski Knihazbor [Зуёнак Васіль. 2010. *Выбраныя творы*. Мінск: Беларускі Кнігазбор].

STRESZCZENIE: Artykuł zawiera bliższy ogląd motywu ptaków w twórczości Ryhora Baradulina na podstawie wybranych przykładów z tomu poezji *KSTY*. Analizie zostały poddane utwory o tematyce duchowej (Biblia, religia), patriotycznej (Białoruś) oraz rodzinnej (motyw matki), w które zostały wplecione ptasie motywy. Praktycznie wszystkie gatunki ptaków spotykane w tomie występują na Białorusi. Wykazano, że recepcja ornitonimów w twórczości poety obejmuje bardzo zróżnicowane konteksty – od naturalistycznych, po religijne i ludowe, aż po zupełnie autorskie interpretacje. Ustalono również, eż oprócz funkcji artystycznej awifauna w twórczości R. Baradulina pełni funkcję patriotyczną, na co wskazuje jego własne rozumienie pojęcia ojczyzny, zgodnie z którym świat przyrody jest jej integralnym czynnikiem, mającym swój udział w formowaniu tożsamości narodowej i kultury.

SŁOWA KLUCZOWE: Ryhor Baradulin, ptaki, duchowość, Bóg, Białoruś, matka, symbol, metafora.

АНАТАЦЫЯ: Прадмет даследавання – птушыныя матывы ў паэзіі Рыгора Барадуліна на прыкладзе выбраных твораў зборніка *КСТЫ*. Былі прааналізаваны вершы на духоўныя (Біблія, рэлігія), патрыятычныя (Беларусь) і сямейныя (маці) тэмы з пункту гледжання выкарыстання ў іх вобразаў птушак. Практычна ўсе гатункі птушак, якія сустракаюцца ў *КСТАХ*, выступаюць на тэрыторыі Беларусі. У ходзе аналізу было выяўлена, што рэцэпцыя аўтарам арнітонімаў ахоплівае вельмі розныя кантэксты, між іншым, натуралістычныя, рэлігійныя, народныя, а таксама аўтарскія інтэрпрэтацыі. Аўтар артыкула прыйшоў да высновы, што, апроч мастацкай, арнітафаўна выконвае патрыятычную функцыю ў творах пісьменніка, на што ўказвае разуменне паэтам паняцця „радзіма", згодна з якім прырода з'яўляецца яе часткай і спрычыняецца да фармавання нацыянальнай тоеснасці ды культуры.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: Рыгор Барадулін, птушкі, духоўнасць, Бог, Беларусь, маці, сімвал, метафара.

Data przesłania artykułu: 10.05.2024
Data akceptacji artykułu: 20.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Mariusz Kaliciński – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; mgr; specjalność naukowa: literaturoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: literatura białoruska w XX wieku, polsko-białoruskie związki literackie.

Adres: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa, Polska.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Kaliciński Mariusz. 2023. *Relacje pomiędzy Bogiem a człowiekiem w twórczości Ryhora Baradulina na podstawie tomu poezji* KSTY. "Acta Albaruthenica" № 23: 315–326.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Alena Lepishava, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.10

Alena Lepishava / Алена Лепішава

Badaczka niezależna / Independent researcher
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-3779-7394
e-mail: elupiseva@gmail.com

"Тэатр унутранай эміграцыі" Канстанціна Сцешыка

«Theatre of Internal Emigration» by Konstantin Steshyk
"Teatr wewnętrznej emigracji" Konstantina Steszika

ABSTRACT: The article focuses on one of the notable trends in the development of recent Belarusian dramaturgy, conventionally labelled as the 'theatre of inner emigration.' This trend stands alongside two others – the 'theatre-barricade' (exemplified by performances like *Gloomy Sunday* and *Dogs of Europe* by Belarus Free Theatre, as well as plays like *Offended. Belarus* by Andrei Kureichik and *Happy Birthday, Beloved! / From Russia with Love* by Diana Balyko) and the 'theatre of conformism' (plays by Vlada Olhovskaya staged at Yanka Kupala Theatre). The 'theatre of inner emigration' trend is examined through the plays by Konstantin Steshyk from various years, collected in the anthology 'Leteli kacheli' (Moscow: Gorodets, 2024). Manifestations of 'inner emigration' are analysed by looking at the significant topoi that shape the artistic structure of these plays, such as the protagonist, the conflict, and the chronotope, the significance of which is substantiated in the article.

KEYWORDS: modern Belarusian drama, 'theatre of inner emigration', 'theatre-barricade', 'theatre of conformism', existential type of artistic consciousness.

Канстанцін Сцешык – выдатны беларускі (рускамоўны) драматург, нарадзіўся ў 1979 г. у Салігорску, дэбютаваў у друку ў сярэдзіне 2000-х, сцвердзіў сябе ў тэатральна-драматургічнай прасторы Беларусі і замежжа дзякуючы п'есам: *Мужчина – Женщина – Пистолет*, адзначанай Міжнароднай прэміяй "Евразия-2005", *Красная шапочка* (спецприз на конкурсе "Свободный театр-2005"), *Спасательные работы на берегу воображаемого моря* (адзін з пераможцаў фестывалю-конкурсу маладой драматургіі "Любимовка–2006"), *Время быть пеплом* (фіналіст "Любимовки–2012"), *Летели качели* (першае месца на конкурсе

“Ремарка–2017”), а таксама спектаклям, сярод якіх найбольш вядомыя *Время быть пеплом* (рэжысёрка – Наталія Лапіна; Санкт-Пецярбург, 2013), *Родные и близкие* (рэжысёр – Уладзімір Шчэрбань; Мінск-Лондан, 2012), *Спички* ў версіі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (рэжысёрка – Таццяна Ларына, Мінск, 2017), *Грязнуля* на сцэне Цюменскага вялікага драматычнага тэатра (2017), *Летели качели* на тэатральнай платформе “Ельцин Центра” (Екацярынбург, 2018), *Псибо* ў фармаце чыткі ў Цэнтры беларускай драматургіі (ЦБД) пры Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі (РТБД) у Мінску ў 2019 г.

Прычыны звароту ў гэтым артыкуле да творчасці К. Сцешыка знаходзяцца на сутыкненні розных фактараў, як знешніх у дачыненні да літаратуры, так і непасрэдна эстэтычных, метадалагічных. Так, імя драматурга дасюль мае легітымны статус у культурнай прасторы Беларусі 2020-х. К. Сцешык, мабыць, адзіны з рускамоўных аўтараў, не ангажаваных ідэалагічна, прадстаўлены на афішах дзяржаўных тэатраў, у адрозненне ад шэрагу калегаў. На жаль, сёння імёны Мікалая Халезіна, Дзіяны Балыка, Андрэя Курэйчыка прыбраныя з рэпертуару па палітычных прычынах. Што тычыцца К. Сцешыка, то падчас тыдня беларускай драматургіі ў РТБД “Канцэнтрацыя” 25 лютага – 3 сакавіка 2024 г. былі прадстаўлены ажно дзве яго п’есы ў перакладзе на беларускую мову: *Мароз* у фармаце чыткі (праект ЦБД) і спектакль *Камень дурасці* (рэжысёр – Дзмітры Зімін).

Не менш важная метадалагічная прычына звароту да творчасці К. Сцешыка: яна яшчэ не станавілася аб’ектам дэталёвага літаратуразнаўчага аналізу, у адрозненне ад творчасці Паўла Пражко, Дзмітрыя Багаслаўскага, Мікалая Рудкоўскага, Дзіяны Балыка, Андрэя Іванова, пра што сведчаць манаграфіі [Гончарова 2015; *Поколение RU белорусской драматургии*... 2020; Руднев 2018]. Згадаем, што П. Пражко і Д. Багаслаўскаму прысвечаны асобныя тамы ў 7-томнай анталогіі сучаснай беларускай драматургіі (дасюль самага буйнога выдання ў рэчышчы беларускай драмы) пад рэдакцыяй Андрэя Масквіна [*Nowa dramaturgia białoruska* 2011–2018].

Варта акрэсліць і непасрэдна эстэтычныя прычыны абрання п’ес К. Сцешыка ў якасці аб’екта навукова-крытычнай рэфлексіі. Ёсць падставы разглядаць ягоны мастацкі ўніверсум у рэчышчы “экзістэнцыяльнага тыпу мастацкай свядомасці”, дамінавальным у беларускай літаратуры асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі. У дадзеным выпадку прапаную звярнуцца да канцэпцыі расійскай даследчыцы Валянціны Заманскай, якая вылучыла экзістэнцыяльную парадыгму руска-еўрапейскай літаратуры як метазместавую катэгорыю. Неабходна падкрэсліць, што гэты зварот носіць крытычны характар: падзяляючы

шэраг назіранняў аўтаркі кнігі *Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века* (Москва, 2002), варта, тым не менш, адзначыць пэўную недасканаласць магістральнага тэрміна, які мае занадта шырокае тлумачэнне. Пішучы пра “экзістэнцыяльны тып свядомасці” як пра дамінанту ў літаратуры розных перыядаў, для якой характэрны экзістэнцыяльная сітуацыя, “знешняя сюжэтная неймавернасць”, “расколатая свядомасць персанажа”, які пазнаў “усеагульны і ўсёпаглынальны абсурд быцця”, “алагічнасць слова”[1] [Заманская 2002: 98], выстройваючы тыпалагічныя ланцужкі “С. Кьеркегор – Ф. Цютчаў – Л. Талстой – Ф. Дастаеўскі – А. Шапэнгаўэр – Ф. Ніцшэ – Ф. Кафка – А. Белы – Л. Андрэеў — <…> У. Набокаў – Г. Іванаў – Ю. Мамлееў” і інш. [Заманская 2002: 8], даследчыца фактычна вызначае светаўспрыманне любога крызіснага перыяду, аднак не імкнецца тлумачыць розніцу паміж, напрыклад, поглядам на свет Л. Талстога і Ф. Кафкі ці Уладзіміра Набокава.

Асаблівага тлумачэння патрабуе і тэрмін “унутраная эміграцыя”, які, з нашага пункту гледжання, мае два значэнні і таму можа разглядацца ў двух ракурсах. Па-першае, у якасці пэўнай плыні творчай аўтарэфлексіі, рэакцыі на сацыяльна-культурныя ўмовы існавання творчай асобы ў таталітарным грамадстве. У гэтым выпадку ён карэлюе з непадцэнзурнай інтэнцыяй літаратурнага жыцця, “літаратурай супраціву”, у прыватнасці, у Нямеччыне 1930-х, з савецкім “саміздатам”; вектары яго навукова-крытычнага асэнсавання судакранаюцца з усім спектрам гуманітарных ведаў: антрапалогіяй, сацыяльнай філасофіяй, культуралогіяй і інш. Такім чынам, у першым значэнні “ўнутраную эміграцыю” карэктна разглядаць як адну з форм эталагічнага самапазіцыянавання ў сферы драматургіі і тэатра[2], побач з “тэатрам-барыкадай”, які можна разглядаць як інварыянт “тэатра палітычнага” [Пави 1991: 358]. (Яго беларускі варыянт бачыцца ў дзейнасці Беларускага свабоднага тэатра (БСТ) з акрэсленым стаўленнем да палітычных працэсаў у краіне і замежжы ў 2020-я праз пастаноўкі *Gloomy Sunday* пра фальсіфікацыю вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 9 жніўня 2020 г., *Сабакі Эўропы* паводле матываў рамана Альгерда Бахарэвіча з яскравымі палітычнымі акцэнтамі (рэжысёр абодвух – М. Халезін), а таксама ў п’есах А. Курэйчыка *Обиженные. Беларусь* (2020), сцэнічна рэалізаванай у розных краінах свету, Д. Балыка *С днём рождения, любимая! / From Russia with love* (2022),

[1] Тут і далей працы расійскіх даследчыкаў цытуюцца ў перакладзе на беларускую. – *А. Л.*

[2] У гэтым значэнні тэрмін выкарыстоўвае Ірына Лаппо, аўтарка прадмовы да калектыўнай манаграфіі, прысвечанай найноўшай беларускай драматургіі [Lappo 2023: 9].

у якой адлюстравана ўспрыманне пачатку паўнамаштабнага ваеннага ўварвання Расіі ва Украіну, “т э а т р а м к а н ф а р м і з м у”, да якога належыць асноўны масіў беларускага дзяржмастацтва, у прыватнасці, п’есы Улады Альхоўскай, якія займелі топ-пазіцыю ў беларускіх тэатрах[3], і пастаноўкі ваенна-патрыятычнай тэматыкі[4].

У другім значэнні “ўнутраная эміграцыя” можа быць разгледжана як інварыянт “экзістэнцыяльнага тыпу мастацкай свядомасці”, які прадугледжвае паглыбленне ва ўнутраны свет як адмаўленне ад уключанасці ў знешні, гранічна дэфармаваны, не спрыяльны для самавыяўлення асобы, у тым ліку нацыянальнага. Такое светаадчуванне, рэалізаванае ў тэксце, маркіравана “маргінальнасцю”, сацыяльнай і экзістэнцыяльнай, яскравым пачуццём “памежжа”, “перыферыі”. У геапалітычным плане яно прадстаўлена ў “новай драме” постсавецкага перыяду, пра што піша крытык Павел Руднеў. У гэтым плане п’есы К. Сцешыка маюць выразныя тыпалагічныя паралелі з творамі прадстаўнікоў “тальяцінскай школы” (Вадзіма Ляванава, Міхаіла Дурнянкова, Юрыя Клаўдзіева) з яе міфам пра тэхнагенны горад як “агрэсіўнае асяроддзе <…> якое часцей за ўсё або заяўлена на моўным узроўні, або апасродкавана выражана праз адчуванне горада, і гэтае асяроддзе з’ядае чалавека, не пакідаючы яму магчымасці самарэалізацыі” [Журчева 2016: 293], а таксама з вучнямі Мікалая Каляды (“уральская школа”)[5].

Пры гэтым нельга не згадаць беларускі інварыянт прачытання ментальнасці “перыферыі” ў кантэксце праблемы нацыянальнай самаідэнтычнасці. Шляхамі яе рашэння ў філасофска-культуралагічным дыскурсе стала кадыфікаванне катэгорый нацыянальнага быцця праз “код адсутнасці” [Акудовіч 2007], “ускраік сусьветнага коміксу” [Бабкоў 2010: 152], “парадоксы нацыянальнай ментальнасці” [Чернявская 2015). Аднак у дачыненні да драматургіі К. Сцешыка паўстае заканамернае пытанне: ці звязаныя праявы феномена “ўнутранай эміграцыі” менавіта з нацыянальнай самаідэнтычнасцю? Відавочна, пра праблему нацыянальнага ў п’есах К. Сцешыка можна казаць толькі апасродкавана з прычыны неартыкуляванасці яе на ўзроўні мовы, як, напрыклад,

---

[3] П’есы *Трикстер клуб* і *6 утра, американо* ідуць у Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры (рэжысёр – Андрэй Гузій), *Хайп* — у Мінскім абласным драматычным тэатры (рэжысёр – Уладзімір Анісенка).

[4] На сцэне НАТ імя Янкі Купалы спектаклі гэтай тэматыкі складаюць амаль трэць рэпертуару. Гл.: [online] https://kupalauski.by/performances/[доступ: 02.05.2024].

[5] Эстэтычна прадуктыўным бачыцца вяртанне ў практыку ЦБД міжнародных драматургічных лабараторый з куратарамі-драматургамі з Украіны (Павел Ар’е), Расіі (Міхаіл Дурнянкоў, Яраслава Пуліновіч), сярод якіх хацелася б бачыць прадстаўнікоў тэатральна-драматургічнага мастацтва з іншых краін.

у некаторых рускамоўных творах. Сярод іх – *Любое место, где остались следы* (2021) Марыі Бяльковіч з беларускамоўнымі фрагментамі адпаведна з эталагічным заданнем твора – раскрыць гістарычную траўму сучаснага беларуса праз досвед 2020 г. і досвед пакаленняў, а таксама *SEXTILIS* (2022), створаная пад псеўданімам Ex-son, з жанравым азначэннем “дыялогі жніўня”, у якой персанажы ў эпізодах максімальнага сацыяльнага ціску пераходзяць на беларускую.

На гэтым фоне п’есы К. Сцешыка вылучае адсутнасць выразнага нацыянальна-культурнага кампанента на ўзроўні мовы. “Унутраная эміграцыя” становіцца ў іх формулай-адлюстраваннем чалавека і свету, рэалізацыя якой, падаецца, не выключае праяў нацыянальнага, пададзенага не праз мову, а праз такія топасы ўнутранай структуры, як герой, канфлікт, хранатоп. Пад тэрмінам “топас” варта разумець канстанты мастацкага ўніверсуму драматурга, унікальнага і герметычнага, арганізаванага як метатэкст, пазбаўлены істотных змен на працягу 20-гадовага на сёння творчага шляху К. Сцешыка. Пра гэта сведчаць абранне ў якасці персанажаў п’ес розных гадоў асоб з рэдукаваным сацыяльна-псіхалагічным малюнкам, раскрытым праз “метадзеянне” – пазнанне ўласнага небыцця, з якім сутыкаюцца як Хлопчык-дым (*Спасательные работы на берегу воображаемого моря*, 2006), так і пасажыры згарэлага ў лесе аўто (*Мороз*, 2022); парадаксальныя сітуацыі, пададзеныя як адзіная магчымая форма існавання канфлікту, замкнутага на абвостраным перажыванні дысгарманічнасці свету як наканаванага і нязменнага [немагчымасць выйсці па-за межы таксічных стасункаў у п’есе *Мужчина – женщина – пистолет* (2005) адпавядае немагчымасці вярнуцца дамоў у п’есе *Друг мой*, 2020)]; гранічна рэлятыўны хранатоп з адзнакамі небяспекі, знешняй і ўнутранай, у межах якога персанажы хутчэй за ўсё развіваюцца з жыццём (*Спички*, 2015; *Голова,* 2021). Таму праблематычна казаць пра дынаміку творчага почырку К. Сцешыка, звычайна кадыфікаваную праз “перыяды творчасці”, а таксама пра тыпалагічныя сувязі, праявы якіх хутчэй вонкавыя, чым сэнсаўтваральныя для разумення канцэпцыі чалавека і свету, “унікальнай”, паводле азначэнняў П. Руднева і Д. Данілава, падчас удзелу ў складанні апошняга выдадзенага зборніка п’ес К. Сцешыка *Летели качели* (2024).

Сярод вылучаных топасаў мастацкай структуры ў п’есах драматурга найбольш распрацаваны г е р о й, асаблівасці якога часткова закраналіся ў манаграфіі Святланы Ганчаровай-Грабоўскай [Гончарова 2015: 9]. Кідаецца ў вочы яго асацыяльнасць. Між тым, у дачыненні да аўтарскай стратэгіі К. Сцешыка нельга казаць пра абстрагаванне ад сацыяльнага зрэзу рэчаіснасці. Тэксты драматурга выкарыстоўваліся ў якасці матэрыялу для дакументальнага выказвання ў спектаклі БСТ *Мы.*

Самоидентификация (2011) побач з тэкстамі П. Расолькі і П. Пражко. Згадаем і Лабараторыю сацыяльнага (дакументальнага) тэатра Валянціны Мароз пры "Еўрапейскім каледжы Liberal Arts у Беларусі" (ECLAB), у межах якой выйшаў спектакль *11 апреля* (2020) пра выбухі ў мінскім метро ў 2011 г. Яго тэкставая аснова складалася з 20 інтэрв'ю, апрацаваных К. Сцешыкам і Л. Чыканасам.

Іншая справа, што герой К. Сцешыка пазбаўлены яскравага сацыяльна-псіхалагічнага малюнка. Назіраецца рэдукцыя характарыстык асобы да імя (Толя, Маша, Максим у п'есе *Спички*, Миша, Оля, Отец, Мать у п'есе *Ловушка для птиц*. Я, Василь у п'есе *Мороз* інш.), прозвішча (Палкин, Пухов у п'есе *Голова*). Пры гэтым важная роля ў раскрыцці персанажа надаецца пазасцэнічнаму часу-прасторы: сэнсавы акцэнт падае на "былое" (*Летели качели*, *Друг мой*), якое паўстае як маркер квазібіяграфіі, сурагату жыцця, дэманструючы гнасеалагічную калізію паміж "падавалася – апынулася", якую Уладзімір Катаеў знаходзіў у п'есах Антона Чэхава [Катаев 1979: 21]. Аднак, у адрозненне ад А. Чэхава, а пасля А. Вампілава і "поствампілаўскай хвалі" 1970–1980-х гг. ці ў тыпалагічна блізкіх да іх п'есах А. Паповай, у творах К. Сцешыка ў якасці суб'екта канфліктагеннай сферы выступае не герой, а чытач /глядач, бо на ўзроўні яго свядомасці адбываецца распадабненне свету існага і іншабыцця, да якога, па сутнасці, належыць мастацкі свет драматурга. Гэтае назіранне падаецца важным для жанравага азначэння п'ес К. Сцешыка, большасць якіх можна разглядаць праз "джала" – разнавіднасць італьянскага фільма жахаў з элементамі трылера і эротыкі, што было прадэманстравана Настай Васілевіч (складальніцай анталогіі сучаснай беларускай драматургіі *Внутри слов*, у якую ўвайшла п'еса *Голова* [*Внутри слов* 2023]) у даследаванні, прысвечаным аўтарскім канцэпцыям у найноўшых п'есах [Василевич 2021].

Неўзабаве паўстае пытанне, звязанае з праявай нацыянальна-культурнага кампанента на ўзроўні героя ў творах К. Сцешыка: наколькі яго адасабленне ад соцыуму і шырэй – ад жыцця матываванае нацыянальнай ментальнасцю?[6] Адсутнасць такой матывацыі (напрыклад, праз непасрэднае выказванне ў форме маналога ці дыялогу) падаецца вонкавай. Карэктней казаць пра спробу драматурга праз сюжэтную арганізацыю, асаблівасці хранатопу, у тым ліку праз эмацыйную атмасферу, разгорнутыя рэмаркі раскрыць татальны трагізм як індывідуальнага быцця, так і калектыўнага падсвядомага, што робіць лёс героя падпарадкаваным сусвету, у якім спрадвеку ўсё ненадзейна, няўяўна, дзе кожны крок пагражае стратай жыцця.

[6] Падрабязней гл. [Лепишева 2018].

Так, у п’есе *Спички* (2015) у нязначных эпізодах паўсядзённага жыцця жыхароў аднаго з мікрараёнаў Мінска (важныя тапанімічныя маркеры хранатопу: маршрут аўтобуса № 31 ад ДС Уручча да могілак у Калодзішчах) з сустрэчамі на кухні, каля пад’езда паўстае светаадчуванне цэлага пакалення – прадчуванне трагічнай наканаванасці лёсу. Пра гэта сведчаць спевы з градацыяй вусцішу “жизнь пришла на кончике ножа” / “смерть пришла на кончике ножа”, зыход праз хваробу Максіма, а праз сацыяльны гвалт – Толі, гатоўнасць Антона да самагубства, постаць Сабачніцы як увасаблення “панфобіі” – татальнай нянавісці, агрэсіі (у адрозненне ад лакальнай з пэўнымі сацыяльнымі каардынатамі) [Эпштейн 2023: 26], што адпавядае асаблівасцям хранатопу з элементамі “танаталістычнага гратэску” (ваўкі, анімістычная прырода, сімвал-лейтматыў агню ў міфалагізаваных эпізодах)[7]. У створанай пазней п’есе *Голова* гэту функцыю будзе выконваць “гратэскавы суб’ект” – адлюстраванне хтанічнасці свету[8].

Змяшчэнне ў цэнтры такога мастацкага ўніверсуму героя – жыхара сучаснага горада з рэдукаванымі, але ж пазнавальнымі сацыяльна-псіхалагічнымі каардынатамі – не прадугледжвае яго нацыянальнага самавызначэння. Больш за тое, супярэчыць такому вектару самаідэнтыфікацыі – “сутыкненню героя з самім сабой як культурным Іншым і / або Іншымі як культурнымі артэфактамі і / або носьбітамі “іншых”, “чужых” каштоўнасцей, згодна з канцэпцыяй Сяргея Лаўлінскага і Ільміры Балацян [Лавлинский, Болотян 2019: 140]. Таму ёсць падставы разглядаць адмаўленне героя ад нацыянальнай (і іншых форм) самавызначэння як “мінус-прыём”, пад якім разумеецца адмова ад увядзення ў тэкст прадказальнага элемента.

Нарэшце, к а н ф л і к т у п’есах К. Сцешыка пазбаўлены магчымасці развівацца, замкнёны на ўзроўні сітуацыі “постканфліктнага характару”, калі па-за межамі сцэнічнага дзеяння ўжо адбылося распадабненне ўзаемаадносін героя і свету [Каблукова 2003: 93]. На сцэне мадэлюецца сітуацыя, якая праз вонкавасць нагадвае “некрытычную экзістэнцыяльную сітуацыю” ў працах філосафаў-экзістэнцыялістаў [Аббаньяно 1998; Больнов 1999] як уяўна бяспечную, падкрэслена побытавую, а насамрэч пагрозлівую для знаходжання чалавека ў модусе “сапраў-

---

[7] Азначэнне прыёму прапанавана па аналогіі з “анімалістычным гратэскам” у даследаваннях Жанны Некрашэвіч-Кароткай, прадстаўленых у рэфераце *Анімалістычныя гратэскі і іх рэцэпцыя ў беларускай літаратуры: ад Міхала Карыцкага да Максіма Багдановіча* на Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Мова, літаратура і культура Беларусі ў Польшчы і свеце” (Варшава, 25–26 сакавіка 2024 г.).

[8] Вядомы тэрмін Натана Тамарчанкі ўдакладнілі даследчыкі найноўшых драматургічных тэкстаў [Лагода, Павлов 2019: 78].

днасці". Адсюль – лейтматывы "страчанага раю" – сурагату мары, якой няма нават на авансцэне "ўнутранага" жыцця персанажа, што ярка ўвасоблена, напрыклад, у п'есе *Летели качели*, у якой зварот да квазібіяграфіі Ягора Летава сігналізуе пра татальную неўладкаванасць герояў у сучасным свеце.

Апрача героя і канфлікту, феномен "унутранай эміграцыі" ў п'есах К. Сцешыка ярка праяўлены праз х р а н а т о п, гранічна рэлятыўны, пазбаўлены канкрэтных каардынатаў часу і прасторы (асобныя прыкметы пададзены пункцірна праз рэмаркі). Адзін з найбольш рэпрэзентатыўных у гэтым плане спектакляў *Родные и близкие* на сцэне БСТ (рэжысёр – У. Шчэрбань; Мінск, 2012). Яго прасторава-часавая арганізацыя маніфестуе "недастатковую субстанцыянальнасць" рэчаіснасці, у якой прадметы "не маюць безумоўнага зместу, слаба ўкаранёныя ў быцці, а само быццё трымаецца аслабелымі ўнутранымі сувязямі" [Кузнецов 2019: 276]. Гэта абумовіла стык рэальных і ірэальных планаў, пераход ад будзённай пэўнасці да ўмоўна-метафарычнага выяўлення.

Так, "рэальны" (які адпавядае аб'ектыўнай рэчаіснасці) узровень хранатопу амаль нівелюецца, бо побытавая сфера цікавіць драматурга менш за ўсё, дамінуе "перцэптуальны" з асаблівым прынцыпам эстэтычнага засваення не праз лагічна-рацыянальнае (светаразуменне), а праз інтуіцыю, напружана-эмацыйнае перажыванне (светаадчуванне), што абумоўлівае яскравую "аўтарскую прысутнасць" у тэксце праз выкарыстанне сродкаў "нетрадыцыйнага мімезіса": парадаксальную сітуацыю, рэдукцыю прычынна-выніковых сувязяў, адсутнасць псіхалагічных матываровак героя, код "драмы абсурду"[9].

"Рэальны" ўзровень рэлятыўнага хранатопу падаецца *"рэальна-ірэальным"*, паколькі час-прастора сцэнічнага дзеяння балансуюць на мяжы жыцця і фантасмагорыі, што стварае адчуванне няўстойлівасці быцця. У цэнтры ўвагі – смерць блізкага чалавека (цёткі, таты, сястры, мачыхі, брата), раскрытая праз маналогі па-за сцэнай. Можна казаць пра прыём "наратыўнага Голасу", які стварае "ілюзію аўтаномнасці, суверэннасці свядомасці, самакаштоўнасці «я»" [Малюціна 2014: 30]. Фантасмагарычнасць узнікае і ў выніку паслядоўнага, сюжэтна нематываванага ўсведамлення зыходу, пададзенага ў рэтраспектыве, што стварае эфект "экзістэнцыяльных скразнякоў", які нагадвае эмацыйную атмасферу фільмаў Дэвіда Лінча, а ў празаічным варыянце – "метафарычныя скразнякі", пабудаваныя на стылёвых зрухах у творах Андрэя Платонава, Людмілы Петрушэўскай [Липовецкий 1994: 230].

[9] У артыкуле выкарыстоўваецца тэрміналагічны апарат даследаванняў хранатопу Алены Крыклівец [Крикливец 2014].

Узнікае налажэнне двух часавых пластоў *былога / цяперашняга*, актуалізуецца праблема памяці як прарыву ў іншую рэчаіснасць. Яе сцэнічнае рашэнне ажыццяўляецца праз сімвалы-лейтматывы (люстэрка, фотаздымкі), гукавое афармленне (музычны кантрапункт – пераход да какафоніі, напрыклад, натхнёная ігра на акардэоне дзядзькі Андрэя пераходзіць у надрыўны плач па ім, спевы Рамана – у лямант падчас бойкі яго братоў [*Двоеточие*]), гульня святлаценяў (дым як адзін з асноўных “прасторавых матываў”: спроба закрыць яго ў слоіку як захаванне ўспамінаў; цёмныя паўтоны). Напрыклад, наведванне пакоя памерлай цёткі суправаджаецца яе адбіткам у люстэрку (*Английский*), фотаздымкі памерлых дзядзькі Андрэя (*Пальцы*), таты з аднайменнай навелы становяцца сімваламі-лейтматывамі памяці, дэманстрацыя іх гледачу стварае праекцыю з сучаснага ў былое, ілюзію няўяўнай мяжы быцця / небыцця.

Пры ўсёй герметычнасці мастацкага свету ў метатэксце К. Сцешыка нельга не заўважыць градацыю саспенсу – таго, што ў рэфлексіі Міхаіла Эпштэйна абазначана як “пераход ад гратэску да апакаліпсісу” [Эпштейн 2023: 8]. П’есы апошніх гадоў *Голова*, *Мороз* прачытваюцца ў кантэксце сацыяльных працэсаў 2020-х, адлюстроўваюць адмысловае бачанне рэчаіснасці, якая з’язджае ў неканвенцыйную плоскасць. Сумежныя формулы прапануе найноўшая сацыяльная камунікацыя: “постпраўда”, “постыронія” становяцца маркерамі татальнай рэлятыўнасці свету, квінтэсэнцыяй ментальнага досведу канца XX ст., зафіксаванага “другой прозай” з яе сюррэчаіснасцю, дэманстратыўнай анаміяй (формула “жрать свою норму” Уладзіміра Сарокіна). На пэўныя паралелі мастацкага ўніверсуму К. Сцешыка і Юрыя Мамлеева ўказваў П. Руднеў [Руднев 2024: 8].

У гэтым аспекце п’есы К. Сцешыка 2020-х увасабляюць далейшае развіццё ўяўленняў пра эрзац-свет, які адпавядае светаадчуванню чалавека XXI ст. з яго татальнай фрустрацыяй, атапічнасцю сацыяльнага дзеяння, культурнай сублімацыяй (яшчэ ярчэй выражанай у П. Пражко) – рэакцыямі на сацыяльны ландшафт таталітарных дзяржаў. Падаецца, што творы беларускага драматурга прапануюць адмысловую мастацкую мову для ўвасаблення паглыблення ў стан сацыяльнай і экзістэнцыяльнай “перыферыі”, зафіксаваны праз такія філасофскія, культуралагічныя азначэнні, як “антысвет” філосафа М. Эпштэйна [Эпштейн 2023], “некрапалітыка” замест “біяпалітыкі” Фуко, паводле Сяргея Мядзведзева і Андрэя Макарычава[10].

[10] У артыкуле звернемся да ранейшай працы Сяргея Мядзведзева [Медведев 2018], нягледзячы на выхад у свет кнігі: Andrey Makarychev, Sergei Medvedev. 2024. *Biopower in Putin’s Russia: From Taking Care to Taking Lives*. Hardcover: Central European University Press, якая мае цэнзурныя абмежаванні ў Беларусі.

Асаблівую цікавасць выклікае п'еса *Голова* (2021), у якой падкрэслена ў будзённых каардынатах выяўляецца выпадзенне рэчаіснасці ў татальна рэлятыўную плоскасць. У аснове сюжэта – раптоўная знаходка адным з сяброў дзяцінства Палкіным жывой галавы, якая мае здольнасць прадказваць будучыню, але не можа размаўляць. Назва як "моцная пазіцыя тэксту" сведчыць пра прамую паралель паміж п'есамі К. Сцешыка і *Галавой* (1990) Ігара Сідарука, адной з самых рэпрэзентатыўных у кантэксце неаабсурдысцкай інтэнцыі беларускай эксперыментальнай драматургіі 1990-х. Але канцэпцыя чалавека і свету, змадэляваная К. Сцешыкам, больш адпавядае не сацыяльнаму абсурду папярэдніка, які звяртаўся да "эклектычнай паэтыкі" дзеля адлюстравання нематываваных зменаў палітычнай улады [Шаблоўская 2020: 81], а абсурду хтанічнаму, які патрабуе хутчэй візуальных сродкаў рэалізацыі. Згадаем эмацыйную атмасферу фільмаў Сяргея Балабанава (перш за ўсё *Груз 200*), "чорных камедый" Гошы Крыжоўнікава і інш. Танатас становіцца тут катэгорыяй светаадчування, увасабляецца ў "гратэскавым суб'екце" Галаве, якая абсалютызуе Нішто па-за межамі сацыяльна-палітычных каардынатаў. Дзеянне п'есы выстройваецца як паступовае спасціжэнне ўласнага знаходжання ў небыцці, па-за рэальным жыццём, звязаным з логікай актыўнасці Пухава, здольнага забіць галаву, пра што чытач / глядач здагадваецца раней за персанажаў, у якіх трансгрэсія свядомасці адбываецца ў фінале:

> ПУХОВ. Так нельзя! Так нельзя! *Такое не может*…
> В конце концов от головы остались только ошмётки костей, розовые комки и заляпанные кровью стол и полотенце. Пухов остановился, весь перемазанный, с глазами навыкате и где-то присутствующий, но *явно не здесь*.
> ПАЛКИН. Ты мне руку сломал, ты… гной!
> ПУХОВ. Ну, вот теперь всё правильно. Никаких фокусов.
> Он выронил на пол трубу и вышел из квартиры. Палкин проводил Пухова взглядом, баюкая сломанную руку. Потом посмотрел на меня.
> ПАЛКИН. Вот и нет ничего, Костя. *Вообще ничего*.
> *Одна только боль*.
> Я ничего не ответил[11].
>
> [Стешик 2024: 294]

Паступовае ўсведамленне знаходжання ў небыцці, да якога рэцэпіент падводзіцца дзякуючы логіцы развіцця сюжэта, рэплікам з эфектам раптоўнасці, маркіраваным лейтматывам *нішто* (пазначаны ў цытаце курсівам), фактычнай невырашальнасці першапачатковай сітуацыі,

[11] Курсіў наш. – *А. Л.*

характэрна і для п’есы *Мороз*, у якой аварыя ў лесе скончаецца, па сутнасці, сыходам персанажаў у нябыт, пададзеным праз рэмарку:

> Я прикрыл глаза. Василь был прав – Я на самом деле согрелся. Немножко, но согрелся. По крайней мере, теперь в море не плавали ледяные глыбы-убийцы. Я сбросил с себя полотенце и пошел навстречу маме, медленно выходящей из воды [Стешик 2024: 325].

Эмацыйная танальнасць гэтых твораў адрозніваецца ад атмасферы п’ес 2000-х тым: праз трагікамічнасць персанажаў, неўладкаваных у сацыяльным свеце, яскрава праступаюць трагічныя акцэнты, звязаныя з гранічнай неўладкаванасцю на больш глабальным ўзроўні – анталагічным. “Унутраная эміграцыя” набывае значэнне не адасобленасці ад сацыяльнай рэчаіснасці, а знаходжання ў нябыце.

Папулярнасць п’ес К. Сцешыка сведчыць пра тое, што такі тып светаадчування запатрабаваны тэатральна-драматургічнай практыкай, рэзануе з тыпам светаадчування беларускага чытача / гледача, нягледзячы на адсутнасць у мастацкай структуры п’ес адсылак да канкрэтнага часу-прасторы. Гэта спрыяе захаванню спектакляў па п’есах драматурга ў рэпертуары дзяржаўных тэатраў і галоўнае – робіць яго эталагічны мэсэдж наднацыянальным, не губляючым, аднак, сувязі з сацыяльнымі каардынатамі, што сфарміравалі стаўленне герояў да жыцця з яскравымі праявамі хтанічнасці.

References

Abban'âno Nikolo. 1998. *Struktura èkzistencii. Vvedenie v èkzistencializm. Pozitivnyj èkzistencializm*. Per. s it. A. Zorina. SPb.: Aletejâ [Аббаньяно Николо. 1998. *Структура экзистенции. Введение в экзистенциализм. Позитивный экзистенциализм*. Пер. с ит. А. Зорина. СПб.: Алетейя].

Akudovič Valiancin. 2007. *Kod adsutnasci: asnovy bielaruskaj mientaĺnasci*. Minsk: Lohvinaŭ [Акудовіч Валянцін. 2007. *Код адсутнасці: асновы беларускай ментальнасці*. Мінск: Логвінаў].

Babkoŭ Ihar. 2010. *Z archivu epochi: try manifesty*. “Topos” №1: 146–154 [Бабкоў Ігар. 2010. *З архіву эпохі: тры маніфэсты*. “Topos” №1: 146–154].

Bol'nov Otto Fridrih. 1999. *Filosofiâ èkzistencializma*. Per. s nem. S. Nikulina. SPb.: Lan' [Больнов Отто Фридрих. 1999. *Философия экзистенциализма*. Пер. с нем. С. Никулина. СПб.: Лань].

Černâvskaâ Ûliâ. 2015. *Pât' paradoksov nacional'nogo samosoznaniâ belorusov. “Index”* [online] http://www. index.org.ru/journal/15/15-chern.html [dostup: 10.07.2020] [Юлия Чернявская. 2015. *Пять парадоксов национального самосознания белорусов. “Index”*].

Èpštejn Mihail. 2023. *Antimoral'. Bobok i panfobiâ* (26–30). V: *Russkij antimir: politika na grani apokalipsisa*. New York: Franc Tireur USA [Эпштейн Михаил. 2023. *Антимораль. Бобок и панфобия* (26–30). В: *Русский антимир: политика на грани апокалипсиса*. New York: Franc Tireur USA].

Gončarova-Grabovskaâ Svetlana. 2015. *Russkoâzyčnaâ dramaturgiâ Belarusi na rubeže XX–XXI vv. (problematika, žanrovaâ strategiâ).* Minsk : BGU [Гончарова-Грабовская Светлана. 2015. *Русскоязычная драматургия Беларуси на рубеже XX–XXI вв. (проблематика, жанровая стратегия)*. Минск : БГУ].

Kablukova Natal'â. 2003. *Poètika dramaturgii L. Petruševskoj: dis. … kand. filol. nauk: 10.01.01*; Tom. gos. un-t. Tomsk [Каблукова Наталья. 2003. *Поэтика драматургии Л. Петрушевской: дис. … канд. филол. наук: 10.01.01*; Том. гос. ун-т. Томск].

Kataev Vladimir. 1979. *Proza Čehova*. Moskva: Izd-vo MGU [Катаев Владимир. 1979. *Проза Чехова*. Москва: Изд-во МГУ].

Kriklivec Elena. 2014. *Hudožestvennyj mir V. Astaf'eva i V. Koz'ko: specifika prostranstvenno-vremennoj organizacii: monografiâ*. Vitebsk: VGU im. P.M. Mašerova [Крикливец Елена. 2014. *Художественный мир В. Астафьева и В. Козько: специфика пространственно-временной организации: монография*. Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова].

Kuznecov Il'â. 2019. *Real'nost'* (276–283). V: *Èksperimental'nyj slovar' novejšej dramaturgii*. Red. S. Lavlinskij, L. Mnih. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL [Кузнецов Илья. 2019. *Реальность* (276–283). В: *Экспериментальный словарь новейшей драматургии*. Ред. С. Лавлинский, Л. Мних. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL].

Lagoda Mariâ, Pavlov Andrej. 2019. *Grotesknyj sub"ekt* (78–84). V: *Èksperimental'nyj slovar' novejšej dramaturgii*. Red. S. Lavlinskij, L. Mnih. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL [Лагода Мария, Павлов Андрей. 2019. *Гротескный субъект* (78–84). В: *Экспериментальный словарь новейшей драматургии*. Ред. С. Лавлинский, Л. Мних. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL].

Lappo Irina. 2023. *Wstęp do polskiego wydania* (7–10). W: *Szkice o najnowszum teatrze Białoruskim*. Red. I. Lappo. Lublin: Warsztaty Kultury w Lubliniie.

Lavlinskij Sergej, Bolotân Il'mira. 2019. *Konflikt dramatičeskij* (137–143). V: *Èksperimental'nyj slovar' novejšej dramaturgii*. Red. S. Lavlinskij, L. Mnih. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL [Лавлинский Сергей, Болотян Ильмира. 2019. *Конфликт драматический* (137–143). В: *Экспериментальный словарь новейшей драматургии*. Ред. С. Лавлинский, Л. Мних. Siedlce: Wydawnictwo Naukowe IKR[i]BL].

Lepiševa Elena. 2018. *Nacional'no-kul'turnyj komponent v russkoâzyčnoj dramaturgii Belarusi konca XX – načala XXI veka* (216–223). V: *Russkaâ i belorusskaâ literatury rubeža XX–XXI vekov (k 100-letiû A.I. Solženicyna): sb. nauč. st*. Red. S. Gončarova-Grabovskaâ. Minsk: RIVŠ [Лепишева Елена. 2018. *Национально-культурный компонент в русскоязычной драматургии Беларуси конца XX – начала XXI века* (216–223). В: *Русская и белорусская литературы рубежа XX–XXI веков (к 100-летию А.И. Солженицына): сб. науч. ст*. Ред. С. Гончарова-Грабовская. Минск: РИВШ].

Lipoveckij Mark. 1994. *Tragediâ ili malo li čto eŝe*. "Novyj mir". №10: 229–232 [Липовецкий Марк. 1994. *Трагедия или мало ли что еще*. "Новый мир" №10: 229–232].

Malûtina Natal'â. 2014. *Plastika personifikacii Golosa kak katalizator dejstviâ v sovremennoj drame* (29–46). V: *Novejšaâ drama rubeža XX–XXI vekov: problema dejstviâ*. Red. T. Žurčevoj. Samara: Samarskij universitet [Малютина Наталья. 2014. *Пластика персонификации Голоса как катализатор действия в современной драме* (29–46). В: *Новейшая драма рубежа XX–XXI веков: проблема действия*. Ред. Т. Журчевой. Самара: Издательство Самарского университета].

Medvedev Sergej. 2018. *Biopolitika avtoritarnogo tranzita. "Colta". 14.12.2018* [online] https://www.colta.ru/articles/society/20042-biopolitika-avtoritarnogo-tranzita

[dostup: 02.04.2024] [Медведев Сергей. 2018. *Биополитика авторитарного транзита. “Colta”. 14.12.2018*].

Nowa dramaturgia białoruska, t. 1–7. 2011–2018. Wybór, redakcja i wstęp A. Moskwina. Warszawa: Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej.

Pavi Patris. 1991. *Teatr političeskij*. V: *Slovar' teatra*. Per. s fr. Moskva: Progress [Пави Патрис. 1991. *Театр политический*. В: *Словарь театра*. Пер. с фр. Москва: Прогресс].

Pokolenie RU belorusskoj dramaturgii: kontekst – tendencii – individual'nosti. 2020. Red. S. Kovalev, I. Lappo, N. Ruseckaâ. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej [*Поколение RU белорусской драматургии: контекст – тенденции – индивидуальности*. 2020. Ред. С. Ковалев, И. Лаппо, Н. Русецкая. Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej].

Rudnev Pavel. 2018. *Drama pamâti. Očerki istorii rossijskoj dramaturgii. 1950–2010-e.* Moskva: Novoe literaturnoe obozrenie [Руднев Павел. 2018. *Драма памяти. Очерки истории российской драматургии. 1950-2010-е*. Москва: Новое литературное обозрение].

Rudnev Pavel. 2024. *Melanholiâ âzyka* (7–10). V: *Leteli kačeli: [P'esy]*. Moskva: Gorodec [Руднев Павел. 2024. *Меланхолия языка* (7–10). В: *Летели качели: [Пьесы].* Москва: Городец].

Stešik Konstantin. 2024. *Leteli kačeli: [P'esy].* Moskva: Gorodec [Стешик Константин. 2024. *Летели качели: [Пьесы].* Москва: Городец].

Šabloŭskaâ Iryna. 2020. *Drama absurdu ŭ slavânskih litaraturah i eŭrapejski dosved* (60–85). U: *Memoria et Gloria. Pamâc' i slava. Iryna Vikenc'eŭna Šabloŭskaâ. Da 80-goddzâ z dnâ naradžènnâ*. Minsk: BDU [Ірына Шаблоўская. 2020. *Драма абсурду ў славянскіх літаратурах і еўрапейскі досвед* (60–85). У: *Memoria et Gloria. Памяць і слава. Ірына Вікенцьеўна Шаблоўская. Да 80-годдзя з дня нараджэння*. Мінск: БДУ].

Vasilevič Anastasiâ. 2021. *Forma belorusskoj sovremennoj dramaturgii kak vyraženie avtorskoj koncepcii*. V: *Teatral'nye točki*. 17.12.2021 [online] https://theatricalpoints.com/ru/777 [dostup: 02.04.2024] [Василевич Анастасия. 2021. *Форма белорусской современной драматургии как выражение авторской концепции*. В: *Театральные точки*].

Vnutri slov: antologiâ sovremennoj belarusskoj dramaturgii. 2023. Sost. A. Vasilevič; predisl. E. Lepiševoj. Minsk: Izdatel' Cimberov R.M. [*Внутри слов: антология современной беларусской драматургии*. 2023. Сост. А. Василевич; предисл. Е. Лепишевой. Минск: Издатель Цимберов Р.М].

Zamanskaâ Valentina. 2002. *Èkzistencial'naâ tradiciâ v russkoj literature XX veka*. Moskva: Flinta [Заманская Валентина. 2002. *Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века*. Москва: Флинта].

Žurčeva Tat'âna. 2016. *«Tol'âttinskaâ dramaturgiâ» kak provincial'nyj literaturnyj proekt* (284–294). V: *Novejšaâ drama rubeža XX–XXI vv.: predvaritel'nye itogi*. Samara: Izdatel'stvo Samarskogo universiteta: [Татьяна Журчева. 2016. *«Тольяттинская драматургия» как провинциальный литературный проект* (284–294). В: *Новейшая драма рубежа XX–XXI вв.: предварительные итоги*. Самара: Издательство Самарского университета].

STRESZCZENIE: Głównym tematem artykułu jest jedna z charakterystycznych tendencji rozwoju najnowszej białoruskiej dramaturgii, określona jako “teatr wewnętrznej emigracji” obok “teatru barykadowego” (spektakle *Gloomy Sunday*, *Сабакі Эўропы* Wolnego Teatru Białoruskiego, sztuki *Обиженные. Беларусь* Andrzeja Kurejczyka,

С днем рождения, любимая! / *From Russia with love* Diany Balyko), "teatru konformizmu" (sztuki Władу Olchowskiej na scenie Teatru Kupałowskiego). Pierwsza z wymienionych tendencji została przeanalizowana na przykładzie sztuk Konstantina Steszika z różnych lat, zawartych w zbiorze *Летели качели* (Москва: Городец 2024). Przejawy "wewnętrznej emigracji" są analizowane przez pryzmat kluczowych elementów ich artystycznej struktury (bohater, konflikt, chronotop), a uzasadnienie wyboru tych elementów zostało przedstawione w artykule.

SŁOWA KLUCZOWE: współczesny dramat białoruski, "teatr emigracji wewnętrznej", "teatr barykadowy", "teatr konformizmu", egzystencjalny typ świadomości artystycznej.

АНАТАЦЫЯ: У цэнтры ўвагі артыкула – адна з яскравых інтэнцый развіцця найноўшай беларускай драматургіі, умоўна абазначаная як "тэатр унутранай эміграцыі", якая вылучаецца побач з "тэатрам-барыкадай" (спектаклі *Gloomy Sunday*, *Сабакі Эўропы* Беларускага свабоднага тэатра, п'есы *Пакрыўджаныя*. *Беларусь* Андрэя Курэйчыка, *С днём рождения, любимая*! / *From Russia with love* Дзіяны Балыка), "тэатрам канфармізму" (п'есы Улады Альхоўскай на сцэне Купалаўскага тэатра). Першая з названых інтэнцый прааналізавана на матэрыяле п'ес Канстанціна Сцешыка розных гадоў, уключаных у зборнік *Летели качели* (2024). Праявы "ўнутранай эміграцыі" аналізуюцца праз знакавыя топасы іх мастацкай структуры (герой, канфлікт, хранатоп), а іх вылучэнне абгрунтавана ў артыкуле.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: сучасная беларуская драматургія, "тэатр унутранай эміграцыі", "тэатр-барыкада", "тэатр канфармізму", экзістэнцыяльны тып мастацкай свядомасці.

Data przesłania artykułu: 25.05.2024
Data akceptacji artykułu: 20.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Alena Lepishava / Алена Лепішава – Białoruś, badaczka niezależna; doktor nauk filologicznych; specjalność naukowa: literaturoznawstwo rosyjskie, literaturoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: dramat białoruski 1970–2020, literatura białoruska XX – początku XXI w., komparatystyka.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Лепішава Алена. 2023. *Гэта новы голас. Але голас – адтуль. Рэцэнзія на кнігу Насты Кудасавай Побач*. "Дзеяслоў" № 4 (125): 230–234.
2. Лепишева Елена. 2023. *Насилие в русской и белорусской драматургии 2010-х гг.: эстетический и коммуникативный аспекты* (36–42). В: *Энергия травмы: сб. науч. ст*. Ред. Т. Автухович. Гродно: ГрГУ.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Uladzimir Lobach, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.11

Uladzimir Lobach / Уладзімір Лобач

Badacz niezależny / Independent researcher
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-1877-8107
e-mail: nordic972@gmail.com

Лес у структуры акупацыйнага ландшафту Беларусі 1941–1944 гг.[1]

The forest in the structure of the occupation landscape of Belarus 1941–1944.
Las w strukturze okupacyjnego krajobrazu Białorusi 1941–1944.

ABSTRACT: The article analyzes the functional transformations of the forest during the Nazi occupation of Belarus. The analysis of oral history materials and archival sources shows that the forest, like all elements of the cultural landscape of Belarus, is significantly changing its traditional functionality. The forest space is the only possible landscape condition for the organization of the partisan movement. At the same time, the forest is a place of salvation for the Belarusian population, as well as Jews fleeing from the ghetto. The ambivalence of the forest during the occupation period is that it embodied not only a chance for survival, but also the idea of death. The Nazis very often carried out mass executions of the civilian population, prisoners of war and Jews in the woods near cities and towns.

KEYWORDS: forest, Belarus, cultural landscape, Nazi occupation, anthropology of occupation, oral history.

Культурны ландшафт як актар вайны. У шматлікіх даследаваннях, прысвечаных падзеям Другой сусветнай вайны, можна вылучыць розную праблематыку і метадалагічныя падыходы, ад генеральных бітваў да гісторыі канкрэтнага камбатанта, ад элементарнай эмпірычнай факталогіі да антрапалогіі і псіхалогіі вайны. Але дагэтуль практычна незаўважным для навукоўцаў застаўся неверагодна значны актар як мірнага, так і ваеннага жыцця – культурны ландшафт, што трэба разумець як сукупнасць усіх прыродных і антрапагенных элементаў, засвоеных

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праграмы *the Programme support to advanced learning and training* (EU4Belarus SALT II).

пэўнай супольнасцю прагматычным, ментальным і сімвалічным чынам. Між тым, прасторавыя локусы нязменна і знакава фігуруюць абсалютна ва ўсіх нарацыях удзельнікаў ці сведкаў вайны, незалежна ад таго, пра каго вядзецца – франтавіка, працаўніка тылу альбо чалавека, які перажыў акупацыю. Сутнасна важным было, дзе чалавек апынуўся ў часе вайны, асабліва калі ён апынуўся на тэрыторыі, захопленай ворагам. У Заходняй ці Усходняй Беларусі, у горадзе ці ў вёсцы, у лясной ці бязлесай мясцовасці, паблізу нямецкага гарнізона альбо ўдалечыні ад яго. Бо ў вайну, калі сацыяльныя, маральныя, гаспадарчыя, гастранамічныя, эстэтычныя ды іншыя жыццёвыя опцыі істотным чынам трасфармуюцца, тое ж самае адбываецца і з базавымі чыннікамі сусвету – часам і прасторай.

Вайна і акупацыя радыкальна змяняюць жыццёвую прастору. Руйнуюцца звыклыя элементы культурнага ландшафту (вёскі, мястэчкі, гарады, храмы), з'яўляюцца і новыя аб'екты, нетыповыя для мірнага жыцця (гета, канцлагер, шталаг, сістэмы ўмацаванняў), якія мусяць быць асэнсаваныя мясцовым насельніцтвам. Важным становіцца тое, што і традыцыйныя элементы культурнага ландшафту розных узроўняў падчас акупацыі змяняюць сваё значэнне. Так, Заходняя і Усходняя Беларусь – гэта не проста колішнія польскія і савецкія рэгіёны, але Генеральная акруга Беларусь і Тылавы раён групы армій "Цэнтр" адпаведна, што даволі сутнасна адрознівала парадак і лад жыцця людзей на гэтых землях. Горад, які ў мірны час увасабляў сабой заможнае і камфортнае жыццё ў параўнанні з вёскай, у вайну становіцца зонай бедства, дзе пануе голад.

> У Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі і іншых буйных гарадах не дзейнічалі электрастанцыі і водаправоды, пераважная частка жыхароў засталася без даху над галавой. Пасля эвакуацыі і знішчэння харчовых запасаў навісла пагроза голаду. Пачаліся нямецкія вайсковыя рэквізіцыі і рабункі. Штодзённым клопатам для гараджан стала барацьба за выжыванне. Адзіным ратункам у такой сітуацыі былі ўцёкі на вёску, ладная частка народу пакінула гарады [Туронак 2008: 553].

Свой статус змяняе і лес – колішняя крыніца грыбоў, ягад, драўніны, бо цяпер ён трывала суадносіцца з партызанамі, а таксама з карнымі экспедыцыямі нацыстаў, калі для мірных жыхароў становіцца "другім домам". Пазначаныя метамарфозы культурнага ландшафту важныя для Homo belli (Чалавека вайны) і дазваляюць вылучыць новы напрамак даследаванняў у рамках антрапалогіі акупацыі. Паказальным ёсць сучасны вопыт заходніх гісторыкаў, якія пачынаюць вывучаць Халакост у ландшафтным кантэксце. Размова ідзе пра новую, "няўхільна растучую галіну навукі аб Халакосце, якая займаецца «тапаграфіяй» або

«геаграфіяй» Халакосту. Гэта новы і нетрадыцыйны падыход, які інтэгруе Халакост у дысцыпліны ландшафтных і экалагічных даследаванняў" [Kwiet 2019: 6]. Такі прынцып правамоцны і ў дачыненні да маштабных гістарычных з'яў, як акупацыя ці вайна ў цэлым, асабліва ў кантэксце асобных рэгіёнаў (мікрарэгіёнаў) ці краін, што ўяўляюць сабой цэльны культурны ландшафт.

Прадметам даследвання выступае прагматычная і сімвалічная функцыянальнасць лесу ў часе нацысцкай акупацыі Беларусі, адлюстраваная ва ўспамінах вяскоўцаў і апублікаваных крыніцах, у параўнанні з гаспадарчай і экстраўтылітарнай значнасцю лесу для вясковага соцыуму ў мірны час. Асноўны корпус крыніц склалі матэрыялы экспедыцый (запісаныя і транскрыбаваныя размовы), праведзеных Цэнтрам вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў перыяд 2000–2020 гг. Метадалагічная платформа даследавання мае міждысцыплінарны характар і ўлічвае тэарэтычныя напрацоўкі і практычны досвед этнаграфіі, вуснай гісторыі, ваенна-гістарычнай антрапалогіі і гуманітарнай геаграфіі.

Лес у традыцыйнай культуры беларусаў. Жыццё беларускага вяскоўца немагчыма ўявіць без лесу. Як заўважыў Казімір Машыньскі, "палешука выхаваў лес. Лес наклаў несціральны адбітак на ўсё яго жыццё і ўвесь культурны здабытак. Пачынаючы ад абутку і сканчаючы хатай, большая частка ўсялякіх прадметаў, якія яго акружаюць, паходзяць з лесу" [Moszyński 1928: 72]. У сваю чаргу, Сяргей Максімаў адзначыў, што тапаграфія вясковых паселішчаў беларусаў вельмі моцна залежыць ад размяшчэння лясных масіваў, што з'яўляецца адметнай рысай этнічнай традыцыі: "Жыццю ў лясах беларус і зараз аддае перавагу ўсякаму іншаму і этнаграфічная мяжа племені дагэтуль характэрна вызначаецца межамі гэтых мокрых лясоў. На вялікіх дарогах і берагах вялікіх рэк беларускія паселішчы трапляюцца толькі зрэдку. Беларус хаваецца па прасёлках за лясамі і ў лясах, не грэбуючы пры гэтым балотамі…" [Максимов 1876: 141]. Сам выгляд беларускай вёскі (хат) паказвае на непарыўную сувязь мясцовага чалавека з лесам. Невыпадкова, што другое значэнне слова "лес" азначае драўніну, падрыхтаваную для пабудовы хаты.

Упоравень з вялікім гаспадарчым значэннем лес меў разгорнутую сімволіку ў традыцыйнай карціне свету беларусаў і фігуруе ў павер'ях, абрадавых ды магічных практыках. Сакральны статус лесу абумоўлены яго боскім паходжаннем. "Лес сам Бог засеяў" [Federowski 1897: 164]; "Лес насеяў Бог, ніхто яго не расціў, не гадаваў..." [Шейн 1902: 20]. Статус лесу як міфарытуальнага цэнтра лакальнай супольнасці праяўляецца ў тапаграфіі аб'ектаў сакральнай геаграфіі, дакладней, у размяшчэнні г. зв. "вясковых святынь". Палявыя даследаванні, праведзеныя на тэрыторыі

Беларускага Падзвіння, паказалі, што пераважная частка культавых крыніц лакалізуецца ў лясных урочышчах.

Асаблівае месца лес займаў у знахарскіх практыках, што карэлюецца з уяўленнямі пра міфалагічных гаспадароў лесу. "Многія, пачуўшы ад лесавіка ўсялякай прамудрасці, робяцца знахарамі і знахаркамі...", "звышнатуральныя веды і багацце атрымліваюць ад лесавіка тыя, хто зробіць якую-небудзь паслугу яго дзецям, напрыклад, прыкрые іх, калі знойдзе ў лесе голых" [Васілевіч 1999: 540]. Разуменне адухоўленасці і сакральнасці лесу ляжыць у аснове прадпісанняў сучасных вясковых знахарак пры лекаванні нервовых і псіха-эмацыйных парушэнняў: "Вот нада ў лес схадзіць, па лесе нада пахадзіць, када чалавек нервный, каб ён успакаіваўся… (Лес – гэта добра?) Да, очань, очань. Нада к лесу прыслушацца, як лес гаворыць, вот тада ў чалавека ўспакаіваецца нерв" [ФА ПДУ 1]. Мноства магічных прадпісанняў і правілаў існавала для ўваходу ў лес і выхаду з яго, якія захаваліся да нашага часу.

> (А што нада гаварыць, як у лес ідзеш?) Хазяін, разьряшы зайсьці. Выходзіш з лесу: "Спасіба, Хазяін, што прынімаў, што ўстрэчаў, што благаславіў". А мы ж і жылі з лесу. Ягады, грыбы – гэта было наша. (А вот "Хазяін" – гэта хазяін лесу?) Хазяін лесу, хазяін! У каждым лясу есць Хазяін. (Ці можа пакараць, калі што дрэнна робіш?) Можат. Калі не заслужыў, дык можыць цябе вадзіць кругамі. Будзеш хадзіць да ўпаду, пака не надаесьць, пака не ўпросіш ты яго, штоб ён цябе кінуў вадзіць [ФА ПДУ 2].

З другога боку, "цёмны лес" (яловы, начны, забалочаны) у народнай культуры выступае як інфернальная сфера, звязаная з нячыстай сілай і чарадзействам. Мноства хвароб у беларускіх замовах выпраўляецца менавіта на "цёмны лес". Былічкі пра сустрэчу чалавека, які выпадкова апынуўся ў начным лесе, з рознымі прадстаўнікамі нячыстай сілы бытуюць і дагэтуль. Аптымальным часам наведвання лесу лічыцца прамежак ад узыходу сонца і да поўдня, які таксама быў небяспечнай часавай кропкай [Лобач 2013: 213].

Нягледзячы на скразную прысутнасць лесу ў культурнай прасторы вясковага свету, у ментальным плане ён супрацьпастаўляецца сферы чалавечага. Гэтая апазіцыйнасць вынікае з таго факту, што лес жыве па ўласных прыродных законах, у той час як сацыяльныя нормы ў лясной прасторы нерэлевантныя: "У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях люднеюць" [Янкоўскі 1962: 85]. Паказальна, што ў вясельнай абрадавасці страта нявестай цнатлівасці да шлюбу, г. зн. парушэнне сацыяльных нормаў, разглядалася як сведчанне яе "нялюдскага", "ляснога" выхавання: "Пад ёлкай расла, / Не дзеўкай прыйшла. / Пад ёлкаю спала, / Не дзеўкаю ўстала" [Малаш 1988: 204–205].

Лес у часе вайны. Партызаны. Ва ўмовах вайны і акупацыі, калі адбываецца глыбінная і шматузроўневая дэструкцыя свету, узаемаадносіны чалавека і лесу набываюць прынцыпова інакшы характар, чым у мірны час. Катастрофа лета 1941 г., калі нямецкая армія імкліва захапіла Беларусь, разграміўшы савецкія дывізіі, выявілася яшчэ і ў вялізарнай колькасьці палонных чырвонаармейцаў. Толькі войскі групы армій "Цэнтр" з 22 чэрвеня па 24 ліпеня захапілі ў палон 520058 савецкіх байцоў і камандзіраў [Мусял 2018: 40]. Сотні тысяч з іх апынуліся на тэрыторыі Беларусі. І менавіта ваеннапалонныя, а таксама салдаты, што адбіліся ад сваіх частак, сталі шукаць паратунку ў беларускіх лясах. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў лесе апынуліся пераважна нетутэйшыя людзі, бо па загадзе нямецкага камандавання этнічныя беларусы, украінцы, латышы, літоўцы і эстонцы ў жніўні-верасні 1941 г. адпускаліся з лагероў для ваеннапалонных дадому [Туронак 2008: 560]. Лес у той час яшчэ не разглядаўся беларускімі сялянамі як месца выратавання і жыцця.

> Нягледзячы на вайну, жыццё ў беларускіх вёсках працягвалася. Мала хто на вёсцы ў чэрвені 1941 г. планаваў сабе ў думках змаганне супраць акупацыйнае ўлады або думаў пра разбудову падпольных структураў. Пасля прыходу вермахта ў Беларусі нашмат больш спадзяваліся на добры ўраджай [К'яры 2008: 157].

Увосень 1941 г. размова яшчэ не вялася пра арганізаваны супраціў у форме партызанскага руху, бо для ўцекачоў куды важнейшым было выратаванне ўласнага жыцця. Зрэшты, надзвычай суровая зіма 1941–1942 гг. вымусіла савецкіх салдатаў пакінуць лес і шукаць прытулку па беларускіх вёсках. Другая, куды больш колькасная хваля рэлакантаў у лес здарылася ўвесну 1942 г., менавіта тады і заклалася аснова арганізаванага партызанскага руху. Гэтаму паспрыяў нямецкі загад у красавіку 1942 г. усім ваеннапалонным і акружэнцам, якія жылі па вёсках, прайсці рэгістрацыю з мэтай далейшай адпраўкі на прымусовую працу ці змяшчэння ў лагер [Мусял 2018: 150].

Абставіны запачаткавання партызанскага руху ў лясных раёнах выдатна адлюстраваныя ва ўспамінах вяскоўцаў. Адно што варта зрабіць папраўку на адмысловую кампрэсію часу (калі разнесеныя па часе падзеі трактуюцца як адзінае цэлае) і прыярытэт з'явы (падзеі) перад яе храналогіяй, якія складаюць спецыфіку ўспрыняцця, фіксацыі і рэтрансляцыі гістарычных падзей традыцыйнай свядомасцю.

> Дык вот, як паступіў так немец, як стаў убіваць, во тады яны (ваеннапалонныя) абдумаліся – і ўсе ў лес. Страляй! Аднаго застрэліш, а пяць уцячэць у лес. Токі дзе дарога кала лесу, так яны – шмыг. А Ушацкі раён наш, гэта мы Лепельскі цяпер, а там я была ва Ушацкім раёні, а там – адны

> лясы, балоты такія. Дык там накапілася гэтых салдацікаў поўна і арганізавалі парцізаншчыну [ФА ПДУ 3]; Парцізаны былі. Яны па лясу былі, у лясах. У Бабінавічах эта я вам не скажу. Яны ішлі ў парцізаны, каторыя папалі ў акружэніе [ФА ПДУ 4].

Ад пачатку акупацыі і да моманту вызвалення "партызаны" і "лес" складаюць непарыўную ландшафтную і семантычную звязку, калі адно немагчыма памысліць без другога: партызаны могуць быць толькі там, дзе ёсць лёс, а кожны буйны лясны масіў краіны па стане на пачатак 1944 г. змяшчаў у сабе партызанскія аддзелы. Паказальным ёсць і нямецкае найменне партызанаў – "лясныя бандыты" [Кершоу 2010: 269]. Там, дзе лесу не было, не было і партызанаў. "(Ці былі тут партызаны?) Асобенна ў Расонах, тамака. Тутака, тут неяк яшчэ ў нас вайна пралящела быстра. Тут яны не задзержываліся, патаму шта ў нас не было лясоў" [ФА ПДУ 5]. Непарыўная сувязь партызанаў з лесам на сімвалічным узроўні партызанскага фальклору асэнсоўвалася як своеасаблівая перакадзіроўка традыцыйных нормаў: лес становіцца "домам", а ноч – "сястрою", што было абсалютна непамысна для сітуацыі мірнага часу. "Хоць нас таміла цяжкая усталасць / Таміў нас голад, хітры ўраг іскал / На лыжах верных ў густой мы лес прабраліс, / Каторы нам раднее дома стал; / Ночка, ночка-чараўніца, / Партызанская сястра, / Нам прышлося парадніцца / У лясах каля кастра" [ІМЭФ, Ф. 8. воп. 1, спр. 1, № 82,96].

Масавы партызанскі рух азначаў і трансфармацыю традыцыйнага лесакарыстання. Лес цяпер ментальна і практычна належаў не вяскоўцам, але тысячам узброеных людзей, вельмі часта чужых і незнаёмых для лакальнай сельскай супольнасці.

Месца выратавання, "другі дом". Лес быў базавым пунктам у гістарычным кодзе самазахавання беларусаў, што яшчэ на пачатку XX ст. адзначыў вядомы беларускі географ Аркадзь Смоліч: "Праз увесь час гісторыі лясы баранілі наш народ ад чужаземных нападаў" [Смоліч 1993: 91]. Так, прынамсі, было ў часы крывавай вайны 1654–1667 гг.

> Сяляне многіх вёсак Віцебшчыны, якія прысягнулі на вернасць Аляксею Міхайлавічу, у 1655 г. пісалі ў скарзе, што маскоўскія ратнікі, прыехаўшы ў вёскі, "нас бедных бьют и увечат и достальные животишка грабят, лошади и животину отогнали и хлеб потолочили, и нас пытают и жгут и саблями рубят...", таму ўсе хаваюцца ў лесе і па вёсках не жывуць [Сагановіч 1995: 30].

У часе Другой сусветнай вайны на пашырэнне партызанскага руху ў Беларусі акупанты адрэагавалі палітыкай татальнага тэрору супраць мірнага насельніцтва.

> Галоўныя нямецкія аперацыі, пачаўшы ад сярэдзіны 1942 г., вядомыя як "Вялікія аперацыі", на самой справе мелі мэтаю забойства беларускага мірнага насельніцтва, а таксама беларускіх габрэяў. Не маючы сілаў перамагчы партызанаў, немцы забівалі людзей, якія маглі дапамагаць у барацьбе [Снайдер 2015: 319].

Найбольшай небяспецы падвяргаліся менавіта "лясныя" вёскі, якія разглядаліся немцамі як патэнцыйныя апорныя пункты партызанаў і таму падлягалі знішчэнню. Гэтую злачынную тактыку нацыстаў выдатна разумелі сведкі трагічных падзей. Адна з жыхарак Браслаўшчыны згадвае: "Прыйшлі нямецкія эсэсаўцы, каб душыць партызанаў. Але партызаны былі ў лесе і былі небяспечныя. Таму зручней за ўсё было ісці ў тыя вёскі, якія былі ў лесе, і там забіваць людзей" [АНМ, sign. 0291].

Вынікам нацысцкага тэрору сталі 5454 знішчаныя беларускія вёскі, 629 з якіх былі спаленыя разам з жыхарамі [*Гісторыя* 2007: 488]. Невыпадкова, што практычна ў кожнай лясной вёсцы старажылы згадваюць пра масавыя ўцёкі ў лес пры набліжэнні нямецкіх карных аддзелаў.

> Нашу дзярэўню ўсю спалілі. Сядзелі мы ў лясу. Лясы там в Віцебскай вобласці былі ў нашай дзярэўні несхадзімыя. І прама тады ў лесе былі. Жылі там у партызанах. Вырылі сабе яму бальшую. Лапачкі (яловыя). Зімой там сядзелі, грэліся. А партызаны ваявалі з немцамі [ФА ПДУ 6]; Лес рядам і мы ўбежалі, а немцы агледзілі пад утро і хацелі нас падпаліць, а нас няма нікога там. Тады пайшлі з фанарікамі ды з сабакамі па лясу. Но мы сядзелі недалёка ў лясу, мама агледзіла, што сабака прайшоў, а на след на наш не папаў [ФА ПДУ 7].

Камандзіраў нямецкіх карных аддзелаў злавала, што жыхары лясных вёсак умела хаваліся ад акупантаў у гушчарах. Каб прадухіліць уцёкі, выдаваліся адмысловыя інструкцыі пры правядзенні "акцый": "Вёскі, размешчаныя ў лясах, неабходна акружаць на досвітку, каб не даць магчымасці насельніцтву разбегчыся" [*Преступления* 1963: 177].

Не толькі беларусы шукалі паратунку ад нацысцкага тэрору ў лесе. У 1942 г. немцы пачынаюць планамерную ліквідацыю габрэйскіх гета на тэрыторыі ўсёй Беларусі, што спарадзіла новую хвалю ўцекачоў. Аднак, у адрозненне ад беларускіх вяскоўцаў, габрэі – жыхары гарадоў і мястэчак – не мелі вопыту ляснога жыцця, што прыводзіла людзей у стан роспачы і адчаю. Некаторыя сканчалі жыццё самагубствам ці вярталіся ў гета [Kwiet 2019: 66–67]. Выжыць у лесе можна было толькі з дапамогаю партызанаў ці мясцовага насельніцтва.

> А тады я ў грыбы хадзіла. Іду я і пад ёлкай баравікі растуць, я падзімаю ветачку, а адтуда мальчык, гадоў 18, як выскачыць і па лесе (пабег). Я яму крычу ў след, ня бойся! А тады, як ён дабіўся аж у Сяргейчыкі, і тады хадзіў

> (адзін) дзяцька ў лес і з ім спаткаўся. І ён яго доўга карміў у лесе. І тады ён сказаў, што еслі я выжыву, то я адблагадару цябе, толькі не выдавай мяне. І вот тады вайна кончылася, і ён яўляецца, малады малец, і спрашіваець, дзе Дземідзёнак Іван жывець? А яму ўжо кажуць, што ён памёр. А ён (малец) ужо прыхадзіў адблагадарыць [ФА ПДУ 8].

Іншая праблема заключалася ў падазроным стаўленні партызанаў да габрэйскіх уцекачоў. "Як правіла, старыя, жанчыны і дзеці разглядаліся партызанамі як «пагроза» або «цяжар». У многіх месцах іх рабавалі, выганялі і нават забівалі" [Kwiet 2019: 67–68]. Тым не менш, партызаны выратавалі каля 30 тысяч беларускіх габрэяў, а "злучэнні Бельскага і Зорына былі самымі буйнымі габрэйскімі партызанскімі фармаваннямі ў Еўропе" [Снайдер 2015: 315, 327–328].

У лепшай сітуацыі аказваліся тыя ўцекачы (як беларусы, так і габрэі), якія ў лесе атрымалі апеку з боку партызанаў. Але вельмі часта жанчыны і дзеці былі пакінуты на волю лёсу, бо заміналі мабільнасці партызанскіх груп. У гэтым выпадку жыццё ў лесе мела надзвычай экстрэмальны характар, асабліва што датычылася харчавання.

> Пяць гадоў у лесе жылі, траву сабіралі. Во, трава асака – скублі. А так, клевер сядзіць белы, а то красны, сушылі яго. А потом дзерава такое, ступай звалі, дырка камнем выпалена – ямачка такая, – муку так малолі. І карэнне ўсякае абтаўкалі і елі. Улетку грыбы, ягады, а к зіме гэткае толькі. Траву сабіралі. А хто дзе ў лесе свяклу пасеець – гэтую батву складавалі дзе-нібудзь, як цяпер сенаж карові, у ямачку накладуць, а потым вось з гэтай мукой і пяклі. Голад быў [ФА ПДУ 9].

Лес захоўваў сваё традыцыйнае значэнне як крыніца будаўнічага матэрыялу і харчовых рэсурсаў, але ў экстрэмальных умовах акупацыі яно вырасла ў разы. Толькі цяпер драўніна ішла на будаўніцтва не хат, а зямлянак і буданоў, а для харчавання выкарыстоўваліся не толькі ягады, грыбы, арэхі, але практычна ўсе ядомыя расліны лясной флоры.

Працяглае жыццё ў лесе, якое можна трактаваць як вымушанае выпадзенне чалавека са сферы культуры ў сферу прыроды, мела і псіха-эмацыйныя наступствы. Безабаронныя людзі, якія жылі ў візуальна абмежаванай прасторы лесу ў атмасферы пастаяннага стрэсу і страху, даставалі фобіі як адносна адкрытай прасторы, так і ў дачыненні іншых людзей (узгадайма выслоўе: "У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях люднеюць").

> (Вясной з лесу вышлі? А адкуль вы ўзналі, што выходзіць пара?) Выганялі, бой прайшоў, тады хадзілі салдаты. Ну, я не знаю, хто крычалі: "Выхадзіце вон, вайна кончылася, вас асвабадзілі, выхадзіце!" Ну, мы ня шлі, мы ўсе роўна баяліся, уцікалі дальше… Тады яшчэ каго павыводзілі салдаты, а людзі адзічэўшыя. Можа бой будзе? Яны сядзець адзічэўшыя.

> Мы тожа адзічэўшыя былі, мы ўжо баяліся. Калі чалавек загаварыў – мы ў балота, туды падальше, каб ніхто нас не нашоў. А як я немцаў баялася! [ФА ПДУ 10]

Формула пра "здзічэнне" ў лесе датычыцца не толькі цывільнага насельніцтва, але і партызанаў. Працяглае знаходжанне ў лясной прасторы, верагодна, было адным з фактараў дэвіянтных паводзінаў (гвалт, рабункі) людзей са зброяй у руках, якія траплялі са сферы прыроды ў сферу культуры (вёску) і агрэсіўна рэалізоўвалі свае жаданні, недасяжныя ў лесе.

Лес як зона смерці і страху. Уцёкі ад карнікаў з вёскі ў лес яшчэ не гарантавалі бяспекі. Знаходжанне чалавека ў лесе для немцаў азначала яго патэнцыйную сувязь з партызанамі і варожасць да акупацыйных уладаў. У нямецкай справаздачы аб карных акцыях у ваколіцах Баранавічаў у верасні 1942 г. адзначалася:

> Частка вёсак, у якіх знаходзіліся бандыцкія групоўкі, былі акружаныя, насельніцтва растралянае, а вёскі спаленыя. Падчас расстрэлу... была знішчана толькі спакойная частка насельніцтва. Тыя, сумленне якіх было нячыстым адносна нямецкіх уладаў, уцяклі ў лес... [Mironowicz 2015: 59]

Сустрэча людзей у лесе з немцамі азначала смерць альбо згон на прымусовыя працы ў Германію – іншых варыянтаў не было. І калі ў мірны час у лесе баяліся змеяў ды драпежных звяроў, для нейтралізацыі якіх выкарыстоўвалі магічныя маніпуляцыі і адмысловыя замовы, то лясны страх перыяду акупацыі меў зусім іншую прыроду. "Ад зьвяроў мы ні хавалісі, а мы хавалісі ад хвашыстаў ат етых! Мы ў лясу зьвіра ні баялісі, а мы баялісі хвашыста" [*Вайна* 2023: 49]. Асаблівую жудасць звычайным вяскоўцам даводзілася перажываць у часе карных экспедыцый, калі на людзей палявалі з сабакамі, нібыта на дзічыну.

> І чуем – гыркаюць аўчаркі і самі (немцы) – гыр-гыр-гыр. Гаргочуць усё чыста… Нас акружылі, але нас не нашлі. Абышлі гэтую амшарыну, а мы чуем, як яны гаркалі, і як павозкі нашыя пазабіралі… Да, баба гэтага рабёнка задушыла, задавіла. Адзін там мужчына з намі быў, гаворыць: "Даві яго, шчас немцы прыйдуць!" А ён крычыць, кугакаець. А яна прыціснула яго к сабе і зацісnула, і задавіла. (Задавіла дзіцёнка?) Да. Мальчык быў, а красівы які! (Гэта, каб немцы не пачулі?) Да, каб не пачулі немцы [ФА ПДУ 11].

Уцялесненымі знакамі смерці было мноства забітых падчас карных экспедыцый людзей, партызанаў і цывільных, што заставаліся ў лесе і хаваць якіх не было каму. Лес, напоўнены мёртвымі, выклікаў страх нават пры звычайным зборы ягад і грыбоў.

> (А грыбы, ягады збіралі?) Ну, гэта хадзілі ж, сабіралі. І ўжо после, як сталі ягады, сталі грыбы. Так хадзілі ж сабіралі, але і ў лес баяліся ісці. Многа ж было бітых у лесе, многа ж парцізан бітых было, і, можа, немцаў. Хто іх знаець, хто там ляжыць? Ляжыць чалавек, а хто, адкуль мы знаем? [ФА ПДУ 12]

Мноства непахаваных цел, якія разлагаліся самі сабою, ператваралі лясное паветра ў трупны смурод, які, на думку вяскоўцаў, прыносіў у свет жывых хваробы. Лес нібыта патыхаў смерцю.

> Трасца[2], яна была ўсю вайну. Як вайна кончылася, так гэта хвароба і пакацілася. Страшная. (А адкуль яна?) Ну, яна после вайны была ад во гэтага, што воздух быў такі, і людзі бітыя былі. Скрозь было, што выйці неяк было, дышаць нечым было. Сядзеш, дык вецер як адтуль пацягнець з лесу, дык дышаць неяк было. Гэта трасца, яна і называлася трасца [ФА ПДУ 1].

У часе нацысцкай акупацыі беларускі лес упершыню становіцца месцам масавых экзекуцый беларусаў, габрэяў, савецкіх ваеннапалонных. Практыка расстрэлаў у лясных урочышчах мела не спарадычны, але сістэмны характар і была рэалізаваная нацыстамі на ўсёй тэрыторыі краіны, дзе толькі гэта дазвалялі асаблівасці ландшафту. Беглы аналіз ужо апублікаваных архіўных матэрыялаў паказвае, што лясныя ўрочышчы практычна каля кожнага горада і мястэчка Беларусі ператвараліся акупантамі ў зоны смерці [*Преступления* 1963: 115, 169, 269, 279, 293, 326]. Архіўныя дадзеныя пацвярджаюцца і матэрыяламі вуснай гісторыі.

> І патом, гэта быў май месяц (1942), брат мой пахаў на полі. А там лес Крюкаўка, дзе жыдоў пастралялі. Яны выкапалі самі яму, іх туды сагналі і пастралялі. І брат прыйшоў і кажыць: "Наверна, стрэляюць жыдоў. Дужа бальшы стрэл, страляюць і страляюць [ФА ПДУ 13].

Адкрытым застаецца пытанне, у чым жа заключалася крывавая "эстэтыка" і прагматыка знішчэння людзей менавіта ў лесе? Матыў ухавання злачынства ад старонніх вачэй тут не праходзіць, паколькі нацысты вельмі часта самі зганялі людзей, каб тыя назіралі за правядзеннем экзекуцыі. Магчыма, вядзецца пра крывадушную рэалізацыю "нямецкага парадку" (Ordnung), калі забойства і ўхаванне ахвяраў не прыносілі праблем гарадской (местачковай) інфраструктуры і не адбываліся на землях, прыдатных для сельскай гаспадаркі. У выніку масавых і маштабных экзекуцый, праведзеных нацыстамі, лясная прастора Беларусі ўпершыню займела мноства локусаў, суаднесеных з ідэяй

[2] Малярыя.

гвалтоўнай смерці, якія сталіся месцамі памяці і аб'ектамі мемарыялізацыі ў паваенны час.

Беларускі лес вачыма акупантаў. Вялізарныя лясныя масівы заўсёды ўражвалі варожых салдатаў, якія воляй лёсу трапілі ў Беларусь. У 1708 г. шведскі жаўнер Густаў Адлерфэльд занатаваў у сваім дзённіку:

> Наш чытач, пэўна, ведае, што Літва[3] – гэта краіна, у якой лясоў нашмат больш за палёў. Лес, які мы прайшлі сёлета, цягнецца на сотні кіламетраў без жаднай прагаліны. Толькі зрэдку мы сустракалі невялічкія, занядбаныя вёскі, вакол якіх толькі лес <…> ніколі я не бачыў такога багацця дзікіх птушак, паляванне на якіх – незабыўны занятак для паляўнічага [Катлярчук 2002: 150].

Прыкладна такое ж уражанне ад беларускага ландшафту меў і пілот Люфтваффэ, які 22 чэрвеня 1941 г. перасёк савецкую мяжу. "Роўна ў 3 гадзіны раніцы самалёт, гудзеўшы нацяжна, на максімальнай вышыні перасёк савецкую мяжу. Унізе раскінулася бязлюдная мясцовасць – скрозь лясы ды забалочаныя нізіны" [Кершоу 2010: 68]. Але, калі дайшло да наземных аперацый і змагання з партызанамі, то адладжаная машына Вермахту давала збой, што выявілася "ў няўменні весці баявыя дзеянні ўночы і ў лясной мясцовасці" [Кершоу 2010: 49]. Змаганне з нябачным ворагам у чужых, невядомых лясах выклікала ў нямецкіх салдат трывалае пачуццё страху і псіхалагічнага дыскамфорту, што выразна бачна ў іх нататках і дзённіках.

> Дарога вяла цераз балота. Цэлы дзень – праз бясконцыя лясы. Існуе вялікая пагроза з боку партызанаў, якіх вельмі шмат і якія паводзяць сябе дзёрзка. Нават сярод белага дня робяцца напады на цэлыя калоны. Яны з'яўляюцца нават у нямецкіх мундзірах і дасканала гавораць па-нямецку – толькі дзеля таго, каб увесьці нас у зман [К'яры 2008: 202].

Асаблівую нянавісць у "цывілізаваных" немцаў, якія звыкліся да зусім іншага тыпу культурнага ландшафту, выклікалі забалочаныя лясныя масівы, дзе нават простае фізічнае перамяшчэнне чалавека было праблематычным. Нагодай для прыкрасці і злосці быў той факт, што мясцовыя партызаны выдатна арыентаваліся ў лесе і пераадольвалі любыя балоты без усякае цяжкасці. Нараканні падобнага роду былі характэрныя не толькі для шарагоўцаў Вермахту, але і спецыяльных каманд, адмыслова створаных для барацьбы з партызанамі.

> Егеры асцярожна размясціліся ля балота. Брудная ледзяная вада выклікала агіду, і Клаўс зморшчыўся ад думкі, што ў ёй прыйдзецца боўтацца.

[3] Вялікае Княства Літоўскае.

> Карл Вернер зрэзаў галінку, каб замерыць глыбіню балота. Ён са здзіўленнем выявіў, што глыбіня вялікая. Альбо партызаны карысталіся лодкамі, альбо былі чэмпіёнамі па плаванні, прытым высакакласнымі [Хартфельд 2012: 131].

Нават калі вялося пра звычайны лес, то ён усё адно выступаў для нямецкага салдата праспорай абсалютна варожай і небяспечнай. "Прачасаць лес азначала выракчы сябе на бясконцыя пакуты, фізічныя і душэўныя, гэта азначала мець жывёльны страх ад небяспекі ў любы момант атрымаць кулю" [Кершоу 2010: 362]. Злосць і нянавісць да "дзікіх" лясоў і балот, што мелі нямецкія салдаты, пераносілася на мясцовых людзей, якіх таксама называлі "дзікімі". Адпаведна, немцы займалі пазіцыю цывілізаваных людзей, у якіх першабытны ландшафт і "дзікія" людзі, што яго насялялі, выклікалі страх.

> "Я заўсёды баяўся рускіх, – прызнаваўся нямецкі салдат Эрхард Шаўман (група армій «Цэнтр»), – паколькі яны заўжды мне здаваліся дзікаватымі. Рускія заўжды адрозніваліся ўменнем паставіць прыроду сабе на службу – неабсяжныя лясы, топкія балоты, – выявіўшы пры гэтым выдатнае ўменне вядзення начных баёў. Там, дзе мы ў сілу сваёй цывілізаванасці аказваліся бяссільнымі, яны рэагавалі быццам дзікія звяры" [Кершоу 2010: 256].

У практычным сэнсе карных экспедыцый гэта азначала, што "цылівізаваны чалавек" не мусіць мець ніякай літасці да "дзікуноў". Паколькі партызаны вельмі часта заставаліся няўлоўнымі, то ўся лютасць і перажыты страх ад лясных рэйдаў крывава спаганяліся на мірнае насельніцтва вёсак. Наглядным прыкладам з'яўляецца дзейнасць карнага аддзела Waffen-SS пад камандаваннем Оскара Дырлевангера. Падраздзяленне было створана на загад Гімлера ў 1940 г. з нямецкіх крымінальнікаў, асуджаных за браканьерства. Ад самага пачатку галоўнай задачай новай часткі была барацьба з партызанамі, паколькі браканьеры мелі выдатны досвед арыентацыі ў лесе і прыцэльнай трапнай стральбы [Kuklińska 2021: 60-61]. З лютага 1942 г. па студзень 1944 г. батальён Дырлевангера браў удзел у 38 з 55 вялікіх антыпартызанскіх акцый і пакінуў на Беларусі жудасны крывавы след. Дасведчаныя ў браканьерстве садысты О. Дырлевангера прызнаваліся ў тым, што змаганне з партызанамі ў тутэйшых лясах і багнах – справа вельмі цяжкая. Жаўнер батальёна Heinz Feiertag згадваў баі з партызанамі на Прыпяцкіх балотах улетку 1942 г.:

> Гэта была летняя аперацыя. <...> гэта была цяжкая акцыя, увогуле змаганне з партызанамі досыць складанае. Але з прычыны балотных абшараў было яшчэ больш цяжка. Партызаны былі добра вывучаны, мелі адпаведнае ўзбраенне і добрыя пазіцыі на балотах. Стаялі, занураныя ў багну

> па шыю, накрытыя лісцем папараці… Падпускалі нас найбліжэй і тады адкрывалі агонь з кожнага боку. Партызаны заспявалі нас знянацку [Kuklińska 2021: 103].

Натуральна, што пры такіх раскладах куды прасцей было займацца пацыфікацыяй беларускіх вёсак і знішчэннем мірнага насельніцтва жудасным спосабам, чым змаганнем з партызанамі. "Любімы метад знішчэння О. Дырлевангера заключаўся ў тым, каб сагнаць мясцовае насельніцтва ў хлеў, падпаліць яго, а тады расстрэльваць з аўтаматаў усіх, хто спрабаваў збегчы" [Снайдер 2015: 318].

Заключэнне. Аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі і архіўных крыніц паказвае, што лес, як і ўсе элементы культурнага ландшафту Беларусі, істотна змяняе сваю традыцыйную функцыянальнасць ва ўмовах вайны і акупацыі. Лясная прастора выступае адзіна магчымай ландшафтнай умовай арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Адначасова лес з'яўляўся месцам уратавання мірнага беларускага насельніцтва, паселішчы якога трапілі ў зону правядзення антыпартызанскіх акцый нацыстаў, а таксама габрэяў, што ўцякалі з гета. У гэтым кантэксце шматкротна ўзрастае традыцыйная значнасць лесу як крыніцы будаўнічых матэрыялаў (зямлянкі) і харчовых рэсурсаў.

Амбівалентнасць лесу ў перыяд акупацыі заключаецца ў тым, што ён увасабляў не толькі шанец на выжыванне, але і ідэю смерці. Масавыя экзекуцыі мірнага насельніцтва, ваеннапалонных і габрэяў нацысты вельмі часта праводзілі ў лясных урочышчах паблізу гарадоў і мястэчак. Лясная прастора Беларусі ўпершыню набывае новыя локусы, звязаныя з масавым забойствам людзей, якія могуць быць трактаваныя як "месцы памяці" і падлягалі мемарыялізацыі ў паваенны час. Страх жыцця ў лесе быў абумоўлены шматлікімі карнымі экспедыцыямі акупантаў, якія праводзіліся менавіта ў лясных зонах краіны. Беларускі лес як база партызанскага руху разглядаўся нямецкімі салдатамі ў якасці абсалютна незнаёмай і варожай прасторы, што спараджала страх і псіхалагічны стрэс. Боязь лесу і партызанаў, якія там знаходзіліся, ператварала антыпартызанскую барацьбу нацыстаў у вайну супраць мірнага насельніцтва беларускіх лясных вёсак.

References

AHM – Archiwum Historii Mówionej (Dom Spotkań z Historią/Karta).

Chiary Berngard. 2008. *Štodzennasc' za lìnìâj frontu: akupacyâ, kalabaracyâ ì supracìŭ u Belarusì (1941–1944 gg.)*. Smalensk: Ìnbelkul't [К'яры Бернгард. 2008. *Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.)*. Смаленск: Інбелкульт].

FA PDU – *Fal'klorny arxiĭ Polackaha dzjaržaŭnaha ŭniversitèta* [*ФА ПДУ – Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*][4]:

FA PDU 1. (2006) Ž., 1932 h. n., v. Matyryna, Ušacki r-n [*ФА ПДУ 1*. (2006) Ж., 1932 г. н., в. Матырына, Ушацкі р-н].

FA PDU 2. (2011) Ž., 1925 h. n., h. Haradok [*ФА ПДУ* 2. (2011) Ж., 1925 г. н., г. Гарадок].

FA PDU 3. (2007) Ž., 1924 h.n., v. Babča Lepel'skaha r-na [*ФА ПДУ 3*. (2007) Ж., 1924 г.н., в. Бабча Лепельскага р-на].

FA PDU 4. (2015) Ž., 1931 h.n., v. Babinaviči Lëznenskaha r-na [*ФА ПДУ 4*. (2015) Ж., 1931 г.н., в. Бабінавічы Лёзненскага р-на].

FA PDU 5. (2019) Ž., 1939 h.n., h. Dzisna [*ФА ПДУ 5*. (2019) Ж., 1939 г.н., г. Дзісна].

FA PDU 6. (2021) Ž., 1926 h.n., v. Druja Braslaŭskaha r-na [*ФА ПДУ 6*. (2021) Ж., 1926 г.н., в. Друя Браслаўскага р-на].

FA PDU 7. (2013) Ž., 1935 h.n., v. Bačèjkava Bešankovickaha r-na [*ФА ПДУ 7*. (2013) Ж., 1935 г.н., в. Бачэйкава Бешанковіцкага р-на].

FA PDU 8. (2019) Ž., 1928 h.n., v. Cvecina Mërskaha r-na [*ФА ПДУ 8*. (2019) Ж., 1928 г.н., в. Цвеціна Мёрскага р-на].

FA PDU 9. (2009) Ž., 1931 h.n. v. Račnyja Dokšyckaha r-na [*ФА ПДУ 9*. (2009) Ж., 1931 г.н. в. Рачныя Докшыцкага р-на].

FA PDU 10. (2019) Ž., 1928 h.n. v. JAnkaviči Rasonskaha r-na [*ФА ПДУ 10*. (2019) Ж., 1928 г.н. в. Янкавічы Расонскага р-на].

FA PDU 11. (2017) Ž., 1934 h.n. v. Ščapernja Polackaha r-na [*ФА ПДУ 11*. (2017) Ж., 1934 г.н. в. Шчаперня Полацкага р-на].

FA PDU 12. (2020) Ž., 1933 h.n., v. Mažujki Ušackaha r-na [*ФА ПДУ 12*. (2020) Ж., 1933 г.н., в. Мажуйкі Ушацкага р-на].

FA PDU 13. (2021) Ž., 1929 h.n., v. Ikazn' Braslaŭskaha r-na [*ФА ПДУ 13*. (2021) Ж., 1929 г.н., в. Іказнь Браслаўскага р-на].

Federowski Michał. 1897. *Lud białoruski na Rusi Litewskiej*. T. I. Kraków: Wyd. Komis. Antropolog. Akad. Umiejętności.

Hartfeld Val'ter. 2012. *Odinokiye voiny. Spetspodrazdeleniya vermakhta protiv partizan. 1942–1943*. Moskva: Tsentrpoligraf [Хартфельд Вальтер. 2012. *Одинокие воины. Спецподразделения вермахта против партизан*. 1942–1943. Москва: Центрполиграф].

IMÈF – *Fal'klorny arxiĭ Instytuta mastactvaznaŭstva, ètnahrafii i fal'kloru NAN Belarusi* [*ІМЭФ – Фальклорны архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі*].

Jankoŭski Fiodar. 1962. *Bielaruskija prymaŭki, prykazki, fraziealahizmy*. Minsk: AN BSSR. [Янкоўскі Фёдар. 1962. *Беларускія прымаўкі, прыказкі, фразеалагізмы*. Мінск: АН БССР].

Kasciuk Michail (red.). 2007. *Historyja Bielarusi: U 6 t. T.5. Bielaruś u 1917–1945 hh.* Minsk: Ekapierspiektyva [Касцюк Міхаіл (рэд.). 2007. *Гісторыя Беларусі: У 6 т.* Т. 5. *Беларусь у 1917–1945 гг*. Мінск: Экаперспектыва].

Kershou Robert. 2010. *1941 god glazami nemtsev. Berezovyye kresty vmesto zheleznykh*. 2010. Moskva: Yauza [Кершоу Роберт. 2010. *1941 год глазами немцев. Березовые кресты вместо железных*. Москва: Яуза].

Kotliarčuk Andrej. 2002. *Švedy ŭ historyi i kuĺtury bielarusaŭ*. Minsk: Encyklapiedyks [Котлярчук Андрэй. 2002. *Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў*. Мінск Энцыклапедыкс].

[4] Дзеля аховы персанальных дадзеных замест прозвішча пазначаецца пол рэспандэнта: мужчынскі (М) альбо жаночы (Ж), год яго нараджэння, час і месца запісу.

Kuklińska Soraya. 2021. *Oskar Dirlewanger. SS-sonderkommando "Dirlewanger".* Warszawa: IPN.

Kurcova Vieranika (red.). 2023. *Vajna – trahiedyja i pamiać naroda: raskazvajuć sviedki padziej. Zbornik dyjaliektnych tekstaŭ*. Minsk: Bielaruskaja navuka [Курцова Вераніка (рэд.). 2023. *Вайна – трагедыя і памяць народа: расказваюць сведкі падзей. Зборнік дыялектных тэкстаў*. Мінск: Беларуская навука].

Kwiet Konrad. 2019. *Forests and the Final Solution* (41–70). In.: *Katrin Stoll Leerstelle(n)? Der deutsche Vernichtungskrieg 1941–1944 und die Vergegenwärtigungen des Geschehens nach 1989*. Berlin: Neofelis Verlag GmbH.

Lobač Uladzimir. 2013. *Mif. Prastora. Čalaviek: bielaruski tradycyjny landšaft u siemijatyčnaj pierspiektyvie*. Minsk: Technalohija [Лобач Уладзімір. 2013. *Міф. Прастора. Чалавек: беларускі традыцыйны ландшафт у семіятычнай перспектыве*. Мінск: Тэхналогія].

Maksimov Sergey. 1876. *Obitel' i zhitel'. Iz ocherkov Belorussii: Strana Krivichey.* «Drevnyaya i novaya Rossiya» № 6: 127–143 [Максимов Сергей. 1876. *Обитель и житель. Из очерков Белоруссии: Страна Кривичей*. «Древняя и новая Россия» № 6: 127–143].

Malaš Lieanila. 1988. *Viasiellie: Piesni. U 6-ci kn.* Kn. 6. Minsk: Navuka i technika [Малаш Леаніла. 1988. *Вяселле: Песні. У 6-ці кн*. Кн. 6. Мінск: Навука і тэхніка].

Mironowicz Eugeniusz. 2015. *Wojna wszystkich ze wszystkimi. Białoruś 1941–1944*. Kraków: Avalon.

Moszyński Kazimierz. 1928. *Polesie Wschodnie. Materiały etnograficzne z wschodniej części b. powiatu mozyrskiego oraz z pow. rzeczyckiego*. Warszawa: Wyd-wo Kasy im. Mianowskoego.

Musial Bogdan. 2018. *Saveckìâ partyzany ŭ 1941–1944 gg. Mìfy ì rèčaìsnasc'*. Smalensk: Ìnbelkul't [Мусял Богдан. 2018. *Савецкія партызаны ў 1941–1944 гг. Міфы і рэчаіснасць*. Смаленск: Інбелкульт].

Prestupleniya nemetsko-fashistskikh okkupantov v Belorussii. 1941–1944. 1963. Minsk: Gosizdat BSSR [*Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944*. 1963. Минск: Госиздат БССР].

Sahanovič Hienadź. 1995. *Nieviadomaja vajna: 1654–1667*. Minsk: Navuka i technika [Сагановіч Генадзь. 1995. *Невядомая вайна: 1654–1667*. Мінск: Навука і тэхніка].

Sheyn Pavel. 1902. *Materialy dlya izucheniya byta i yazyka russkogo naseleniya Severo-Zapadnogo kraya*. T. III. Sankt-Peterburg: Tip. imp. Akad. nauk [Шейн Павел. 1902. *Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края*. Т. III. Санкт-Петербург: Тип. имп. Акад. наук].

Smolič Arkadź. 1993. *Hieohrafija Bielarusi*. Minsk: Bielaruś [Смоліч Аркадзь 1993. *Геаграфія Беларусі*. Мінск: Беларусь].

Snyder Timothy. 2015. *Krovavyye zemli: Yevropa mezhdu Gitlerom i Stalinym.* Kiyev: Dulíbi [Снайдер Тимоти. 2015. *Кровавые земли: Европа между Гитлером и Сталиным*. Киев: Дуліби].

Turonak Jury. 2008. *Madernaja historyja Bielarusi*. Viĺnia. Instytut bielarusistyki [Туронак Юры. 2008. *Мадэрная гісторыя Беларусі*. Вільня. Інстытут беларусістыкі].

Vasilievič Uladzimir. 1999. *Ziamnaja daroha ŭ vyraj: Bielaruskija narodnyja prykmiety i pavierji*. Kn. 3. Minsk: Mastackaja litaratura [Васілевіч Уладзімір. 1999. *Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і*. Кн. 3. Мінск: Мастацкая літаратура].

STRESZCZENIE: Artykuł analizuje przekształcenia funkcjonalne lasu w okresie okupacji hitlerowskiej na Białorusi. Z analizy przekazów ustnych i źródeł archiwalnych wynika, że las, podobnie jak wszystkie elementy krajobrazu kulturowego Białorusi, znacząco zmienia swoją tradycyjną funkcjonalność. Przestrzeń leśna jest jedynym możliwym warunkiem krajobrazowym organizacji ruchu partyzanckiego. Jednocześnie las jest miejscem ratunku dla ludności białoruskiej, a także Żydów uciekających z getta. Ambiwalencja lasu w okresie okupacji polega na tym, że uosabiał on nie tylko szansę na przeżycie, ale także ideę śmierci. Naziści bardzo często dokonywali masowych egzekucji ludności cywilnej, jeńców wojennych i Żydów w lasach w pobliżu miast i miasteczek.

SŁOWA KLUCZOWE: las, Białoruś, krajobraz kulturowy, okupacja hitlerowska, antropologia okupacji, historia mówiona.

АНАТАЦЫЯ: У артыкуле аналізуюцца функцыянальныя трансфармацыі лесу ў часе нацысцкай акупацыі Беларусі. Аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі і архіўных крыніц паказвае, што лес, як і ўсе элементы культурнага ландшафту Беларусі, істотна змяняе сваю традыцыйную функцыянальнасць. Лясная прастора выступае адзіна магчымай ландшафтнай умовай арганізацыі партызанскага руху. Адначасова лес з'яўляецца месцам уратавання беларускага насельніцтва, а таксама габрэяў, што ўцякалі з гета. Амбівалентнасць лесу ў перыяд акупацыі заключаецца ў тым, што ён увасабляў не толькі шанец на выжыванне, але і ідэю смерці. Масавыя экзекуцыі мірнага насельніцтва, ваеннапалонных і габрэяў нацысты вельмі часта праводзілі ў лесе паблізу гарадоў і мястэчак.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: лес, Беларусь, культурны ландшафт, нацысцкая акупацыя, антрапалогія акупацыі, вусная гісторыя.

Data przesłania artykułu: 14.04.2024
Data akceptacji artykułu: 19.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Uladzimir Lobach / Уладзімір Лобач – Polska, badacz niezależny, dr hab; specjalność naukowa: etnografia, etnologia i antropologia; zainteresowania naukowe: etnosemiotyka, geografia sakralna, etnostereotypy w kulturze ludowej, antropologia wojny.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Лобач Уладзімір. 2023. *Антрапалогія калабарацыі: вобраз дапаможнай паліцыі ва ўспамінах вяскоўцаў паўночнай Беларусі пра нацысцкую акупацыю 1941–1944 гг*. "Studia Białorutenistyczne". Vol. 17: 11–25.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Zhanna Nekrashevich-Karotkaja, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.12

Zhanna Nekrashevich-Karotkaja / Жанна Некрашэвіч-Кароткая

Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu /
Adam Mickiewicz University, Poznań
ORCID: https://orcid.org/0000-0001-9544-2159
e-mail: zhanek@amu.edu.pl

Традыцыя анімалістычных гратэскаў у беларускай культурнай прасторы

The tradition of animalistic grotesques in the Belarusian cultural space
Tradycja animalistycznych grotesek w białoruskiej przestrzeni kulturowej

ABSTRACT: The subject of this study is the reception and use, as well as the artistic functions of the animalistic grotesque in the Belarusian folklore and book tradition from the second half of the 18th century to the beginning of the 20th century. The article studies folklore and literary poetic narrations from the Belarusian cultural space, in which animalistic images and motifs appear as allegories. Such narrations, widely represented in the folklore of Slavic and non-Slavic peoples, were gradually Christianized, filled with didactic content, and therefore became the basis for further processing. In literature, such plots functioned mainly as animalistic grotesques (a term inspired by the term *animal grotesque*, introduced by Czeslaw Hernas). The tradition of animalistic grotesques in the Belarusian cultural space is examined for the first time in the context of literary hermeneutics, in connection with the folk rituals and traditions (in particular, in connection with the *Ptači kwas* ritual preserved in the Lusatian Serbs). The popularity of animalistic grotesques can be seen even in the 21st century.

KEYWORDS: animalistic grotesque, folklore, literary treatment, Christianization, modeling of existential strategies.

У беларускай культурнай прасторы[1] даволі шырока прадстаўлены паэтычныя нарацыі фальклорнага і літаратурнага паходжання, у якіх выкарыстоўваюцца вобразы звяроў, птушак і кузурак у якасці алегорый.

[1] Канцэпцыя Беларусі як культурнай прасторы ў гістарычным літаратуразнаўстве [гл.: Некрашэвіч-Кароткая 2020] дае магчымасць разглядаць у адным кантэксце мастацкія з'явы, прыналежныя да гетэрагеннай (рэчыпаспалітаўскай) і ўласна

Тэксты з такімі вобразамі ды з матывам іх урачыстых або жалобных збораў на рускай (або старабеларускай[2]), лацінскай, а таксама польскай мовах набылі папулярнасць у мастацкім дыскурсе з часоў позняга Барока. У перыяд першага нацыянальнага адраджэння гэтыя тэксты прыцягнулі да сябе ўвагу даследчыкаў беларускай народнай культуры і, урэшце, выявілі сваю рэлевантнасць у творчасці аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры – Максіма Багдановіча.

Аб'ект даследавання – лацінамоўная паэма Міхала Карыцкага *Avium comitia*; запісаныя Дамінікам Рудніцкім, Янам Чачотам і Аляксандрам Рыпінскім тэксты беларускіх народных песняў з анімалістычнымі матывамі; верш М. Багдановіча *Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык*. Даследаванне анімалістычных вобразаў і матываў у паэтычнай культуры беларускага народа арыентавана ў рэчышча літаратурнай герменеўтыкі, г. зн. мае на мэце высветліць функцыю і мастацкую спецыфіку названых алегорый.

Анімалістычныя матывы ў мастацтве, з'яўляючыся ці не самымі архаічнымі і найбольш традыцыйнымі, зрабіліся з часам поліфункцыйнымі дзякуючы разнастайнасці іх семантыкі. На думку Веслава Пшыбылы (Wiesław Przybyła), жывёлы часта робяцца суб'ектам канструктыўнай камунікацыі. Даследчык падкрэслівае, што вобразы жывёл у сферы культурнай вытворчасці не носяць аўтатэлічнага характару, яны адыгрываюць ролю своеасаблівага медыярэсурсу ў працэсе пазнавальнай дзейнасці чалавека. Кожная жывёла, увасобленая ў мастацкім вобразе, выступае як частка нашай ідэнтычнасці, і праз досвед эстэтычнай свядомасці лірычны суб'ект злучаецца або гатовы злучыцца з гэтымі жывёламі ў гарманічнай еднасці [Przybyła 2011: 238–239].

Знаёмыя з дзяцінства папулярныя анімалістычныя вобразы нацыянальнага фальклору застаюцца і ў XXI ст. актыўна запатрабаванымі ў разнастайных формах рэкрэатыўнай культуры [гл.: Гуляева 2021: 196], шырока выкарыстоўваюцца ў рэкламных слоганах і кампутарных мемах. Адмысловым культурна-эстэтычным патэнцыялам валодае песенны фальклор, у якім, на думку даследчыкаў лемкаўскіх народных песняў, закадаваны нацыянальныя звычаі, вераванні, традыцыі, нормы чалавечых

нацыянальнай (беларускай) парадыгмы. Ужыванне тэрміна "культурная прастора" дазваляе ўспрымаць Беларусь не (толькі) у яе геаграфічных і/або палітычных межах, але таксама як адмысловую культурную рэальнасць у сукупнасці яе матэрыяльнага і духоўнага складнікаў.

[2] На думку аўтаркі артыкула, тэрмін "руская мова" з'яўляецца найбольш адэкватным адпаведнікам у беларускай мове для пазначэння адной з пісьмовых моў Вялікага Княства Літоўскага (польск. *język ruski*, англ. *Ruthenian language*, ням. *ruthenische Sprache*).

узаемаадносін. «По сути, фольклорная традиция отличается своеобразным символическим метаязыком, в котором отражается духовный мир человека» [Вакарюк, Панцьо 2011: 12]. Асаблівую ролю ў гэтым сэнсе адыгрываюць вобразы-сімвалы, якія ўплываюць на моўнае развіццё асобы. Так, на думку даследчыцы казацкага фальклору Галіны Мыкыціў, сімвалізацыя фальклорных вобразаў не толькі ўтварае сваю асаблівую сістэму, але і выходзіць за яе межы, пранікае ў агульнамоўную прастору, укараняецца ў ёй, фармуючы важныя асаблівасці нацыянальнай моўнай карціны свету [гл.: Микитів 2008: 152].

У фальклоры і літаратуры розных народаў свету шырока выкарыстоўваюцца вобразы разнастайных птушак, звяроў і кузурак у якасці мастацкага іншасказання. Анімалістычная сімволіка выступае ў самых разнастайных змястоўных кантэкстах і можа набываць розныя функцыі. Найбольш шырока прадстаўлены ў падобных тэкстах птушыныя матывы, і песні з імі выступаюць своеасаблівым маркёрам пэўнай этнакультурнай парадыгмы. Так, у культавым турэцкім серыяле *Бліскучае стагоддзе* (*Muhteşem Yüzyıl,* дата прэм'еры – студзень 2011) актрыса Мер'ем Узерлі ў ролі Хюрэм-султан (якая паходзіла з Крыма) спявае ўкраінскую калыханку *Люлі, люлі, люлі, налетіли гулі*. Сапраўды, беларускі, украінкі і расіянкі спявалі і спяваюць сваім дзецям калыханкі пра тое, як прыляцелі куры або галубы (гулі); пры гэтым або ставіцца пытанне, чым можна пакарміць гэтых птушак, або самі птушкі абмяркоўваюць, чым яны будуць карміць дзіця. Фактычна, ужо ў межах гэтага няхітрага мастацкага кантэнту ствараецца сацыяльна і этычна абумоўленая сітуацыя. Адпаведныя матывы фальклорнага паходжання актыўна пранікалі ў літаратуру розных славянскіх народаў.

Так, Ян Чачот (Jan Czeczot), які збіраў і апрацоўваў беларускі фальклор, адначасова насычаў птушынымі вобразамі свае ўласныя паэтычныя творы [гл.: Кохан 2011]. Адмысловую алегарычную перспектыву з выкарыстаннем анімалістычных вобразаў, шчыльна звязаных з народнай дэманалогіяй (*Biała Sroka, kot Wargin, Kobieta Insekta*), прэзентуе мастацкая проза Яна Баршчэўскага [гл.: Некрашевич-Короткая 2019: 287–288]. Фальклорны матэрыял з разнастайнымі анімалістычнымі элементамі ў XX ст. быў актыўна запатрабаваны дзіцячымі пісьменнікамі, дзякуючы чаму ў культурную свядомасць дзяцей увайшлі такія персанажы, як *Муха-Цакатуха (Муха-Цокотуха)*, *Тараканішча* (*Тараканище*; абое – з вершаванай казкі Карнея Чукоўскага), *Мушка-Зелянушка і Камарык насаты тварык* (з верша М. Багдановіча), *Koziołek Matołek* (з коміксаў Карнэля Макушынскага і Мар'яна Валентыновіча).

З этнаграфічных даследаванняў вынікае, што адзначаная папулярнасць анімалістычнай сімволікі невыпадковая. Адмысловае значэнне

ў культуры розных народаў мелі абрады і традыцыі, якія ўвасаблялі ідэю сімвалічнай жаніцьбы птушак, а таксама (радзей) звяроў і кузурак [Kawan 2010: 618–622]. У трох папярэдніх артыкулах намі былі прааналізаваныя мастацкія алегорыі абраду лужыцкіх сербаў *Ptači kwas* у сувязі з традыцыяй звярыных гратэскаў у іншых славянскіх народаў [гл.: Некрашевич-Короткая 2019], функцыянальныя аспекты бытавання такіх песняў у фальклоры паўночна-ўсходніх і ўсходніх славян [гл.: Nekraševič-Karotkaja 2022], а таксама асобныя аспекты выкарыстання мастацкага кантэнту з анімалістычнымі матывамі як паэтычнага антыдэпрэсанту і рэлевантнага элементу культурнай кампетэнтнасці (*cultural literacy*) [гл.: Некрашевич-Короткая 2023]. Былі зроблены высновы пра тыпалагічную сувязь песняў, якія суправаджалі калісьці абрад птушынага вяселля, з традыцыяй звярыных гратэскаў у культуры ўсходніх славян, а таксама пра мадэляванне ў гэтых песнях сацыяльных стратэгій і калектыўных роляў з дапамогай алегорый і сімвалаў. Гэты артыкул паўстаў як падсумаванне вынікаў ранейшых даследаванняў і мае на мэце выяўленне генетычных пачаткаў анімалістычных гратэскаў у фальклоры і літаратуры беларускай культурнай прасторы, нацыянальнай спецыфікі гэтай мастацкай з'явы на фоне славянскай культурнай традыцыі, а таксама ўсталяванне прычыны яе стабільнасці з часоў позняга Барока да перыяду "нашаніўскага" адраджэння.

Тэрмін *анімалістычны гратэск* – вытворны ад паняцця *groteska zwierzęca* Чэслава Гэрнаса (Czesław Hernas), які звярнуў увагу на названы жанр у межах даследавання так званай савізджальскай літаратуры (*literatura sowizdrzalska*). Разглядаючы помнік перыяду позняга Барока *Relacja o zwierzętach niektórych*, навуковец супаставіў яго са славянскімі песнямі пра тое, як чвартавалі камара або пра тое, як камар памёр, звалiўшыся з дуба. Параўноўваючы розныя жанры паэзіі позняга Барока, Ч. Гэрнас прыйшоў да высновы, што *Relacja...* паводле сваёй мастацкай прыроды бліжэйшая да звярыных, птушыных, камарыных гратэскаў, чым да дыялогаў каханкаў [гл.: Hernas 1957: 361]. У гэтым жа артыкуле даследчык прапанаваў некаторыя асноўныя характарыстыкі жанру гратэска:

> W grotesce popularne, oczywiste, prymitywne prawdy społeczne czy realia ulegają przekształceniu, ponieważ wchodzą w nowy kontekst językowo-semantyczny. Groteska atakuje powszechne nawyki skojarzeniowe, łamie ustalone związki przyczynowo-skutkowe, nadaje przedmiotom, czynnościom, sytuacjom atrybuty, które nie są zgodne z powszechnym doświadczeniem społecznym [Hernas 1957: 364].

Варта адзначыць, што ў выпадку разгляданых тут анімалістычных гратэскаў з беларускай культурнай прасторы не заўсёды ідзе гаворка

пра свядомае разбурэнне асацыяцый і парушэнне прычынна-выніковых сувязяў. Нашмат часцей ёсць падстава разважаць пра ролевае замяшчэнне тых сацыяльных суб'ектаў, якія ў гэтых асацыяцыях задзейнічаны. Таму і тэксты анімалістычных гратэскаў заўсёды носяць алегарычны характар.

З ліку беларускіх гісторыкаў літаратуры да іх вывучэння звяртаўся ў першую чаргу Адам Мальдзіс. Навуковец карыстаўся тэрмінам "звярыныя гратэскі", са спасылкай на артыкул Ч. Гэрнаса [гл.: Мальдзіс 1980: 117], апавядаючы пра вершы XVIII ст., аўтарам якіх лічыцца ксёндз *Societatis Jesu* Д. Рудніцкі (1676–1739). Менавіта яму прыпісаў Аляксандр Брукнер [гл.: Brückner 1916: 327] аўтарства шматлікіх вершаў у стылі гратэска.

Адным з найбольш папулярных тэкстаў са зборaў Д. Рудніцкага была гратэскная гісторыя пра камара, які ўпаў з дуба, "стоўк сабе калянішча" і ў выніку памёр, аплаканы Мухай (*Камара з дуба цяжкі ўпадак*). Гэты тэкст, да якога кампазітар Віктар Капыцько напісаў музыку, уключаны ў шматлікія зборнікі даўняй беларускай паэзіі і пачынаецца так:

Стукнула, грукнула ў лесе.
Што ж нам новага прынесе?
Упаў камарэц з дуба,
Шукаючы Галуба etc.
[цыт. па: Мальдзіс 1987: 62]

Паводле звестак А. Мальдзіса, даследчыкам вядомыя 20 розных варыянтаў гэтага тэксту. Не менш вядомы яшчэ адзін твор пад назвай *Птушыны баль*, запісаны Д. Рудніцкім:

Да ўчыніў верабей на прыпечку жніва,
Змалаціўшы, уварыў пшанічнае піва.
Паўтычыны хмелю даў, вельмі ж тога жалаваў,
Думных меў прахаці, гасцей частаваці.
[Рудніцкі 2011: 784]

Пры першасным знаёмстве з гэтымі тэкстамі падаецца даволі дзіўнай тая акалічнасць, што ксёндз-езуіт звярнуў увагу на такі, здаецца, далёкі ад хрысціянскай культуры забаўляльны песенны тэкст пра баляванне птушак. Навошта ён вырашыў апрацаваць яго? Якія скрытыя сэнсы маглі прыцягнуць увагу духоўнай асобы да жартаўлівай анімалістычнай алегорыі?

Гэта пытанне на многія гады заставалася для мяне без адказу. Разам з тым, не выклікала даверу і занадта крытычнае меркаванне А. Брукнера адносна песенных тэкстаў са збору Д. Рудніцкага: „Ta skromna muza zakonna schodzi całkiem na nutą ludową i w niej wyśpiewał

[Dominik Rudnicki. – *Ż.N.-K.*] radość uczni z powodu wakacji, babine troski o jej koziołka, wesele ptasze i tym podobne niewybredne pomysły" [Brückner 1903: 380]. Пазней аказалася, што *niewybredne pomysły* – важны элемент эстэтычнага досведу многіх славянскіх і неславянскіх народаў. У першую чаргу гэта датычыць беларускай традыцыйнай культуры (фальклору), а таксама заснаванай на ёй літаратурнай традыцыі. Менавіта з беларускіх зямель паходзіў Д. Рудніцкі, які ажыццяўляў сваё пастырскае служэнне і педагагічную дзейнасць (у якасці настаўніка калегіі) у Слуцку, Гродне, Мсціславе і іншых гарадах [Мальдзіс 1980: 75].

Аналізуючы вызначаны мастацкі кантэнт, няцяжка заўважыць, што практычна ўсе песні з анімалістычнымі матывамі алегарычна пазначаюць кантэкст чалавечых адносін. Пры гэтым адмысловае значэнне мае тая акалічнасць, што самую багатую інтэрпрэтацыйную семантыку ў выяўленчым і слоўным мастацтве набыло веснавое спароўванне птушак. У даследаваннях з галіны этнаграфіі розных народаў апісаны абрады, традыцыі, а таксама песні, якія ўвасаблялі ідэю сімвалічнай жаніцьбы звяроў, птушак або кузурак. Матыў такога вяселля асабліва папулярны ў дзіцячым фальклоры; калісьці ён быў звязаны з адпаведным рытуалам і ўяўленнем пра тое, што падчас дажджу ў суправаджэнні сонечнага святла лісы, шакалы, мядзведзі і ваўкі спраўляюць вяселле. Пры гэтым найбольш шырока ў межах дадзенай традыцыі прадстаўлена тэма птушынага вяселля. На грунце вывучэння літаратурных крыніц (паэма *The Parlement of Foules* Джэфры Чосера, камедыя *A Midsummer Night's Dream* Уільяма Шэкспіра) навукоўцы прыйшлі да высновы пра існаванне ў даўнія часы адмыслова ўсталяванага дня птушынага вяселля як абраду, у межах якога маладыя дзяўчаты і хлопцы аб'ядноўваліся папярэдне сімвалічнымі сувязямі на вобраз і падабенства птушак [Kawan 2010: 618]. У Англіі такі дзень прыпадаў на 14 лютага (сучасны дзень Св. Валянціна), у Люксембургу – на 19 сакавіка.

У малога славянскага народа лужыцкіх сербаў захоўваецца да нашых дзён у актыўным бытаванні абрад птушынага вяселля (в.-луж. *Ptači kwas,* н.-луж. *Ptaškowa swajźba*, ням. *Vogelhochzei*t). Яго святкаванне прыпадае на 25 студзеня і функцыянальна супастаўляецца з гуканнем вясны або сустрэчай птушак у іншых славянскіх народаў. На сённяшні дзень птушынае вяселле зрабілася важным элементам сербалужыцкай культурнай ідэнтычнасці, а ў шматлікіх інсцэніроўках 25 студзеня прымаюць удзел дзеці [гл.: Hose, Mirtschin, Pohontsch, Scholze, Schön (ed.). 2014: 452]. Важную ролю ў яго святкаванні (як і ў сапраўдным вяселлі) адыгрывае тэкстава-вакальнае суправаджэнне абраду.

Самая папулярная да сённяшняга дня сербалужыцкая песня пра птушынае вяселле была запісаная ў XVIII ст., а пазней апублікаваная

этнографамі Леапольдам Гаўптам і Янам Арноштам Смолерам у зборы *Pjesnički hornych a delnych Łužiskich Serbow* (1841). Пачатак гэтай песні выглядае наступным чынам: *'Lajće, nowa wjec so stała, / Slyšće, chceće zrozemić ! / Sróka je sej muža 'zała / A budže so woženić* [Hawpt, Smoler 1841: 256][3]. Хоць на пачатку актуалізуецца тэма шлюбу (сарока ўзяла сабе мужа і будзе жаніцца), з агульнага кантэксту песні вынікае, што прывязка да тэмы вяселля тут фармальная. Хутчэй за ўсё, Л. Гаўпт, які запісаў гэту песню, імкнуўся ўзмацніць сацыяльны кантэкст сюжэта, дзе прадстаўлены самыя розныя сітуацыі ўзаемадзеяння персанажаў: сумесная праца, забава, звада. Застаецца дадаць, што Л. Гаўпт быў пратэстанцкім святаром.

Калі супаставіць тэксты сербалужыцкай і цытаванай вышэй беларускай песні *Птушыны баль*, можна заўважыць, што і ў адной, і ў другой менавіта маленькая птушка верабей робіцца адказнай за выкананне надзвычай важнага задання: прыгатаванне пачастункаў [гл.: Некрашевич-Короткая 2019: 281]. І адна, і другая песня насычаны актыўным сацыяльным узаемадзеяннем, а таксама ў абедзвюх песнях прысутнічае момант канфлікту, драматычнага напружання. А. Мальдзіс справядліва адзначаў: "Птушыны баль нагадвае звычайную шляхецкую папойку" [Мальдзіс 1980: 119]. Параўнаем:

> Při tym nasta wulka zwada: / Sknadźik klesny sykorku [Hawpt, Smoler 1841: 258)[4];
> Паруець Сава Хрусцяля, опул разадрала, / А спячому Жураўлёві горла пракусала [Рудніцкі 2011: 785].

Спяваючы такія песні, дзеці не толькі аўтаматычна запаміналі назвы розных птушак, але праз іх уключэнне ў дынамічнае дзеянне (з выпіўкай, танцамі, звадай, бойкай і нават забойствам) асэнсоўвалі ўсе магчымыя (пазітыўныя і негатыўныя) варыянты сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Менавіта на гэты маральна-выхаваўчы аспект звярыных гратэскаў і звярнулі сваю ўвагу ўжо ў XVIII ст. святары, якія займаліся збіраннем і апрацоўкай фальклору. Задачай апрацоўшчыкаў было пераарыентаваць сацыяльны дыскурс анімалістычнага гратэску ў патрэбным (хрысціянскім) кірунку, а ўласна матыў вяселля з эратычнымі намёкамі як рудыментамі архаічнага абраду завуаляваць або наогул выдаліць. Менавіта гэта і зрабіў Д. Рудніцкі. У тэксце *Птушынага балю* не ідзе гаворка пра шлюб, а да з'яўлення звадлівай савы, якая падбухторыла ўсіх на бойку, птушкі мірна балявалі: *За здароўе Вераб'я елі, пілі аж два дня, / Не*

[3] "Гляньце, адбылося штосьці новае! Паслухайце, [калі] хочаце зразумець! Сарока ўзяла сабе мужа і будзе з ім жаніцца" (*серб.-луж.*). Тут і далей пераклады аўтаркі артыкула.

[4] "Тым часам здарыўся буйны канфлікт: стрынатка дала поўху сініцы" (*серб.-луж.*).

чыніўшы здрады, не дазнаўшы звады [Рудніцкі 2011: 785]. Менавіта такая мадэль сацыяльных паводзін, хутчэй за ўсё, была расцэнена ксяндзом Д. Рудніцкім як пазітыўны ўзор для наследавання.

Прадстаўленыя вышэй народныя песні з птушынымі алегорыямі, а таксама іх стылізацыі і апрацаванні, выкананыя Д. Рудніцкім, дазваляюць высветліць мастацкую традыцыю для лацінскай паэмы *Avium comitia* (*Птушыны сойм*) М. Карыцкага, які паходзіў з беларускіх земляў. Паэма была напісана, хутчэй за ўсё, непасрэдна пасля элекцыйнага сойму 1764 года, на якім абралі апошняга караля Рэчы Паспалітай – Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Зразумела, што ў паэме М. Карыцкага птушкі на сваім сойме абралі каралём арла: арол як сімвал – геральдычнае ўвасабленне каралеўскай улады ў Рэчы Паспалітай.

Паэма прысвечаная новаабранаму каралю і прадстаўляе птушыны сойм, на якім пасля доўгіх дэбатаў і шматлікіх канфліктаў Арол быў абраны каралём. *Avium comitia* толькі фармальна можна аднесці да прынагоднай палітычнай літаратуры Рэчы Паспалітай. Мар'я Гарбачова лічыла паэму арыгінальнай алегорыяй (*pomysłowa alegoria*), даводзячы, што М. Карыцкі наўрад ці рэальна цікавіўся сучаснымі яму падзеямі палітычнага жыцця, а больш быў заклапочаны стварэннем уласнай паэтычнай культуры. „I w formie, nie w treści jego wierszy, odnajdujemy główne wartości" [Garbaczowa 1980: 188] – адзначае даследчыца.

З пункту гледжання жанравай класіфікацыі *Avium comitia* не з'яўляецца ані травесційным, ані парадыйным увасабленнем формы гераічнага эпасу, на якія была надзвычай багатая літаратура позняга Асветніцтва. М. Карыцкі, складаючы вершы класічнай лацінай у дактылічных гекзаметрах, сумленна захоўвае найважнейшыя патрабаванні эпічнага канона, якія былі сфармуляваныя яшчэ Мацеем Казімірам Сарбеўскім [гл.: Niekraszewicz-Karotkaja 2024: 470]. Згаданая М. Гарбачовай фармальная вартасць *Avium comitia* заключаецца перадусім, бадай, у тым, што гэта алегарычная паэма сягае каранямі ў народную мастацкую традыцыю анімалістычных гратэскаў. Яна, бясспрэчна, была знаёмая паэту з Беларусі, які быў, да таго ж, як і Д. Рудніцкі, ксяндзом-езуітам.

Найважнейшым матывам, запазычаным з народных песняў пра шлюбнае паяднанне птушак або кузурак, быў матыў сутыкнення і канфлікту, вельмі актуальны ў сувязі з тагачасным палітычным жыццём грамадзян Рэчы Паспалітай. Таму паэма М. Карыцкага далёкая ад аптымізму, які ўласцівы панегірыкам перыяду элекцыі апошняга караля. Адсутнасць гэтых аптымістычных спадзяванняў прасочваецца найперш у характары алегорыі. Ужо ў межах кананічнага эпічнага заспеву як *argumentum* (асноўная тэма) прэзентуюцца шматлікія няшчасці птушак:

Multimodos pulsata malis, nulloque quietam
Nacta loco sedem miseranda propago volucrum
Ipsa vicem damnare suam, fatoque sinistro
Acceptas clades et conscia numina cladum
Accusare, vagum sparsis per inane querelis,
Instituit[5].

[Korycki 1817: 4]

Хоць у канцы паэмы *omnes indulgent genio* [усе выказваюць пашану герою] і *festosque triumphos concelebrant* [услаўляюць яго святочна ды ўрачыста], аднак гэтыя фармулёўкі не перадаюць агульнага настрою твора. Знакам рэальнага пазіцыянавання наратара служыць выступленне апошняй птушкі, якой не было і не магло быць у ніводным з народных гратэскаў. Пасля шматлікіх канфліктаў з удзелам жураўлёў, варон, пугачоў, лебедзяў, паўлінаў, галубоў і нават зайцоў перад птушыным соймам выступае папугай, які і прапануе выбраць Арла *summum Rectorem populi* [вярхоўным валадаром народа] [Korycki 1817: 14]. Якаў Парэцкі зрабіў у гэтай сувязі слушную выснову:

> Насмешлівы, злёгку з'едлівы тон у паэме *Птушыны сойм* адлюстроўваў сумненні Карыцкага ў магчымасці хуткага паляпшэння становішча ў краіне пасля ўступлення на трон Станіслава Аўгуста [Парэцкі 2014: 15].

Выбар М. Карыцкім птушынай алегорыі ў якасці сюжэтнай рамкі, хутчэй за ўсё, абумоўлены надзвычайным дынамізмам, уласцівым гратэскам. Гэты дынамізм быў засвоены з мастацкай практыкі адпраўлення абраду птушынага вяселля або падобнага да яго. Алесь Жлутка падкрэсліваў, што характарыстыка Арлоў у паэме М. Карыцкага адбываецца праз дзеянне, вынікае з іх актыўнасці:

> Тыпізацыя цалкам адпавядае класіцыстычнаму ідэалу кіраўніка дзяржавы: мудрасць і справядлівасць, вайсковая доблесць і адвага, клопат пра падданых. Гэтыя якасці і выяўляюцца ў галоўных падзеях *Птушынага сойму* [Жлутка 2007: 33–34].

Прыгадаем, што кожнай птушцы або кузурцы ў народных гратэсках адводзілася пэўная роля або прыпісвалася канкрэтная стратэгія сацыяльных паводзін, станоўчая ці адмоўная. У гэтым сэнсе анімалістычныя гратэскі можна разглядаць як своеасаблівы аналаг Псалтыра для простых людзей. Успомнім, што Францыск Скарына выдаў Псалтыр першай

[5] "Прыгнечанае незлічонымі бедствамі, няшчаснае птушынае племя, не маючы магчымасці спакойнага жыцця, вырашыла само паскардзіцца на свой лёс ды спагнаць страты, панесеныя праз несумленныя суды, а таксама прадставіць справаздачу пра гэтыя страты, выказаўшы шматлікія нараканні" (*лац.*).

кнігай Бібліі ў Празе ў 1517 г., а пазней друкаваў Псалтыр ізноў – у Вільні ў 1522 г., гэтым разам як частку "следаванага Псалтыру" [гл.: Некрашэвіч-Кароткая 2015: 51–54]. Усходнеславянскі першадрукар разумеў, што шматлікія алегорыі ў псалмах цара Давіда мелі сваёй найважнейшай мэтай іншасказальнае пазначэнне такіх чынаў, якія адрозніваюць пабожнага чалавека ад грэшніка. Падобную замалёўку тыпаў грамадскіх паводзін, хутчэй за ўсё, меў на мэце і ксёндз М. Карыцкі, ствараючы сваю паэму. Пры гэтым ён ведаў, што анімалістычныя гратэскі валодаюць неверагодным патэнцыялам для выражэння разнастайнай семантыкі.

За змястоўнай лёгкасцю і гумарам песняў пра ўрачыстасці птушак, жывёл і кузурак былі прыхаваныя латэнтная маралізатарская накіраванасць і выхаваўчыя інтэнцыі. Іх сюжэт мог быць звязаны з апісаннем не толькі радасных пачостак, але і жалобных падзей. Украінскі навуковец Міхайла Возняк выявіў у бібліятэцы Залускіх яшчэ адзін анімалістычны гратэск, запісаны Д. Рудніцкім. Сюжэтна гэта песня звязана не з жаніцьбай, а з хваробай вераб'я і яго наступнай смерцю:

Siw sobie worobeyczyk na kuchni,
Da oczycy iomu podpuchly.
Oy werebeyczyk, senno nemożesz,
Niewiedaiu, czy żyw budesz.
[цыт. па: Возняк 1929: 251]

На такі варыянт сюжэта ўказаў заснавальнік беларускай філалогіі Яўхім Карскі ў сваёй працы *Белорусы* [гл.: Карскі 2001: 460]. Важна, аднак, што ў апошняй страфе наратар дае параду цалкам у духу хрысціянскай этыкі:

Nepłaczte werebeyczyka, nie wyite
Ale za nieho Bohu sa molite.
Wiecznaia pamięć wierebeyczykowi,
Naszomu nehdy druhowi.
[цыт. па: Возняк 1929: 251]

Асноўны акцэнт у многіх анімалістычных гратэсках, якія надзвычай лёгка асядалі ў эстэтычнай свядомасці слухачоў, перамяшчаўся (асабліва пасля іх апрацоўкі збіральнікамі фальклору) на элементы выхаваўчай парадыгмы. Таму надалей яны ўжо прыцягвалі да сябе ўвагу не толькі святароў, але і паэтаў-рамантыкаў, а таксама этнографаў. Беларускі публіцыст і кнігавыдавец А. Рыпінскі прывёў у сваёй кнізе *Białoruś* (1840) тэкст беларускай народнай песні пра шматгадовую службу ў пана, за якую працаўнік праз пэўны час атрымліваў узнагароду:

Służyû ja û pana pòûtara leta,
Wysłużyû ja û pana – kureczku za jeta.
Maja kureczka złatapióreczka
Po dwaru chodzić, kurczat wodzić,
Chwost nadymaje, pana pocieszaje etc.
[цыт. па: Rypiński 1840: 155–156]

Аўтар кнігі суправаджае тэкст песні сваімі каментарамі, адзначаючы мноства карысных эфектаў ад выканання гэтай песні: дзіця вывучвае назвы хатніх жывёл, практыкуецца ў іх вымаўленні, развівае памяць. Шматразова паўтараючы песню, дзіця не толькі запамінала назвы жывёл і птушак, але таксама на падсвядомым узроўні засвойвала прыклады ўвасобленых у тэксце паводзінавых стратэгій – як пазітыўных, так і негатыўных. Так, апошнім падарункам пана ў згаданай вышэй песні сталася дзяўчына, якая „напілася, лезла з печы, забілася". Важная этычная тэма асуджэння п'янства і рацыянальнага выбару спадарожніка / спадарожніцы жыцця ўплятаецца ў забаўляльны анімалістычны кантэкст, асядаючы ў памяці дзіцяці. На думку А. Рыпінскага, „to pierwiastkowe wychowanie silnie wpływa na całą moralność dalszych lat życia ludzkiego" [Rypiński 1840: 161–162].

Я. Чачот уключыў у шосты том свайго песеннага збору *Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny* (1846) песню пра шчыгла, які хоча ажаніцца: *Szczyhlik niewieliki hramadu zbiraje, / Sam niechocze adzīn żyć, żenic sie maje* [Czeczot 1846: 30]. На звярыныя гратэскі звярнуў таксама ўвагу Я. Карскі. Сярод беларускіх жартаўлівых песняў навуковец заўважыў нямала такіх, у якіх прадстаўлена вяселле птушак ці кузурак або іх хаўтуры. Пры гэтым даследчык адзначаў: «Подобные песни известны и другим отраслям русского племени, а также другим славянским народам и даже неславянским» [Карскі 2001: 460]. Апрача таго, Я. Карскі прыводзіць тэкст песні пра жаніцьбу і смерць камара, шлюб якога з мухай аказаўся няўдалым. Тэкст гэтай песні запісаў у сярэдзіне XIX ст. беларускі краязнавец, гісторык і публіцыст Адам Ганоры Кіркор (1818–1886):

Камар з мухай палюбіўся,
Палюбіўшыся, пажаніўся,
Пажаніўшыся, пасварыўся.
[цыт. па: Карскі 2001: 462]

З каментароў даследчыкаў вынікае, што фантастычны зарад эмацыйнай энергіі – гэта тое, за што ўсе яны найбольш цанілі анімалістычныя гратэскі. Многія з гэтых песняў і сёння карыстаюцца папулярнасцю слухачоў. Так, варыянт песні *Птушыны баль*, якая ў XVIII ст. была запісаная Д. Рудніцкім, вядомы беларусам Падляшша:

Як выскочыв воробіей – на прыпычку дыво.
Як нажав вуон пшэнычэнькі, наробыв вуон пыва.
Штыры тычкі хмэлю дав, а потуом жаловав –
Став думку думаты і госты збыраты.
[цыт. па: Fionik 2008: 55][6]

Адчуванне вясёлай атмасферы падчас выканання песні *Курашчабятура* (сучасны аналаг *Курачкі-златапюрачкі*, зафіксаваны ў кнізе А. Рыпінскага) адзначаюць слухачы ў XXI ст. На Youtub-е можна знайсці відэазапіс выканання песні навучэнцамі мінскай гімназіі № 20. Адзін са слухачоў пакінуў каментар наступнага зместу: „Аж душачка ад парога да прыпечка заскакала!" [*Беларуская народная песня*, online].

Да апрацоўкі звярыных гратэскаў звярнуўся і класік беларускай літаратуры М. Багдановіч. Яго верш *Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык* прынцыпова адрозніваецца ад тых тэкстаў, якія запісвалі Д. Рудніцкі, Я. Чачот і Я. Карскі. Фальклярыстычныя запісы фіксавалі толькі пэўныя алегарычныя фрагменты – або сцэну балявання, або апісанне вяселля, або хваробу і смерць. Тым часам М. Багдановіч, прааналізаваўшы поўны комплекс наяўных звярыных гратэскаў, рэканструяваў цэласную сюжэтную мадэль і дадаў напаўэпічны зачын (*Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца...*). Такім чынам паэт надаў старажытнай алегорыі найбольш дасканалую форму і лагічную завершанасць, не забыўшыся пра элегантны паэтычны паралелізм на пачатку:

Захісталася сасонка баравая,
Затужыла дзяўчынанька маладая,
Жартаўлівая пяюшка-сакатушка,
А па імені – мушка-зелянушка.
[Багдановіч 1992: 279]

Як і ў арыгінальных беларускіх звярыных гратэсках, М. Багдановіч адсунуў на задні план уласна матыў шлюбу і вяселля. У канчатковы тэкст твора не ўвайшлі словы мушкі "Эх, калі б мне, мушцы, ды замуж! Стала б мужу я жонкай лагоднай" і г. д. [Багдановіч 1992: 657]. Затое ў найбольш аб'ёмістай трэцяй частцы верша паказаны надзвычай разнастайныя формы паводзін і розных жыццёвых сітуацый у форме тыповых сцэн з вясельнай абраднасці: "жаноцкая радзіна" плача, старшы дружка "рассыпаўся дробным макам перад мушкай", матылі і пчолкі праяўлялі спрыт, асабліва што да чаркі; чмяліха спявала, музыкі гралі, конікі скакалі, усе разам "п'юць-ядуць ды размаўляюць". Сама ж муха

[6] Выказваю шчырую падзяку студэнту Варшаўскага ўніверсітэта Максіму Фіёніку за прадстаўленне гэтай каштоўнай інфармацыі.

вельмі ўмела запрашала гасцей на пачостку, а пасля выдатна частавала. Затое пасля вяселля мушка аказалася благой жонкай, праз што давяла камара да смерці.

Фактычна М. Багдановіч аб'яднаў у адным вершы дзве адрозныя сюжэтныя схемы, прадстаўленыя ў розных народных гратэсках з беларускай культурнай прасторы: урачыстае баляванне і жалобнае развітанне з памерлым. Істотна, што ва ўсіх частках створанай наратарам алегарычнай выявы, як і ў арыгінальных народных песнях, прысутнічаюць важныя падказкі, як паводзіць сябе ў той ці іншай складанай у этычных адносінах сітуацыі. Так, у вершы М. Багдановіча на другі дзень вяселля наладзілі перазовы, "каб не стала аб радзіне кепскай мовы" [Багдановіч 1992: 282]; пасля смерці "кладуць камара ў дамавіну, сазываюць сяброў і радзіну" [Багдановіч 1992: 282]. Немагчыма не заўважыць падабенства ў развіцці сюжэта ў пятай частцы верша М. Багдановіча і ў тэксце песні са збору Д. Рудніцкага *Стукнула, грукнула ў лесе*, дзе таксама надаецца ўвага не толькі прыжыццёвым, але і пасмяротным здарэнням. Пры гэтым ёсць і істотнае адрозненне.

У фальклорным тэксце, запісаным М. Рудніцкім, камар пры сваім сконе дае распараджэнні, дзе і як яго пахаваць, нават што напісаць на надмагіллі:

Пахавай мяне ў полі
Пры зялёнай ролі <...>
Ды і запішы на магіле
Ку векапомнай хвілі: <...>.
[цыт. па: Мальдзіс 1987: 66]

Тым часам у вершы М. Багдановіча, які, хутчэй за ўсё, абапіраўся на тэксты, запісаныя Д. Рудніцкім, камунікатыўны дыскурс адмыслова спалучаецца з актыўным. Наратар распавядае, як паводзілі сябе не толькі блізкія і знаёмыя, але нават выпадковыя мінакі:

Ля дарогі магілу капалі
І ў ёй камара пахавалі,
У сырую зямельку зарылі,
Зверху насып вялікі зрабілі.
Людзі добрыя шляхам мінаюць,
Шапкі нізка здымаюць, пытаюць:
"Не іначай вяльможны вандроўнік, –
Генерал, ці маёр, ці палкоўнік?"
"Не, ляжыць тут камар-камарочак,
У каторага з локаць насочак".
[Багдановіч 1992: 284–285]

На працягу ўсяго верша акцэнтуецца не толькі пэўная сацыяльная роля алегарычнай істоты (што было ўласціва ўсім анімалістычным гратэскам), але таксама стаўленне да яе іншых членаў грамадскай супольнасці. Такім чынам не толькі фарміруецца ўяўленне пра канструктыўнае сацыяльнае ўзаемадзеянне (як ва ўсіх народных песнях пра пачосткі), але і ствараецца эфект эмпатычнага водгуку. Асабліва падкрэсліваюцца рэлевантныя традыцыйнай этычнай парадыгме моманты: здольнасць спачуваць слабому і хвораму, неабыякавасць да бліжняга і павага нават да таго, хто пайшоў з жыцця.

Верш М. Багдановіча пра мушку і камарыка быў апублікаваны ў траўні 1915 г., а ў красавіку гэтага ж года Германія ажыццявіла масавую хлорную атаку на Заходнім фронце ў Бельгіі. У выніку было атручана каля 15 тысяч чалавек. Няма наўпроставых падстаў звязаць гэтыя дзве падзеі. Бясспрэчна, аднак, што верш М. Багдановіча прасякнуты не толькі вясёлым задорам і радасцю, але таксама гуманістычнай ідэяй літавання над малым і слабым, якая тым больш рэльефна прагучала ў сваім алегарычным увасабленні на фоне жахлівых масавых знішчэнняў у час Першай сусветнай вайны.

Аналіз сукупнага паэтычнага кантэнту анімалістычных гратэскаў, з даўніх часоў пашыраных у традыцыйнай культуры шматлікіх народаў, прыводзіць да высновы пра рэлевантнасць гэтай традыцыі і для беларускай культуры. У тэкстах некаторых народных песняў пра баляванне і вяселле звяроў, птушак і кузурак захаваліся сляды архаічнага народнага абраду, падобнага да сербалужыцкага птушынага вяселля, аднак у фальклярыстычных запісах тэкстаў беларускіх песняў гэтыя сляды не адыгрываюць дамінантнай ролі. Надзвычайная папулярнасць анімалістычных гратэскаў спрычынілася ўжо ў XVIII ст. да выкарыстання адпаведных народных алегорый у кніжнай паэзіі беларускай культурнай прасторы. Так, М. Карыцкі прадставіў у выглядзе птушынай алегорыі найважнейшае здарэнне сучаснага яму палітычнага жыцця – элекцыйны сойм, на якім быў выбраны апошні кароль Рэчы Паспалітай. Магчымасць мадэлявання розных стратэгій сацыяльных паводзін і калектыўных роляў скіравала ўвагу паэтаў і збіральнікаў фальклору да анімалістычных алегорый. Адным з іх быў Д. Рудніцкі.

У той час як многія фальклярысты эпохі Асветніцтва толькі прыводзілі тэксты народных песняў у адпаведнасць з прынцыпамі хрысціянскай маралі, беларускія святары выпрацавалі сваю адмысловую стратэгію выкарыстання анімалістычных алегорый. У сабраных і апрацаваных ім тэкстах Д. Рудніцкі свядома, але ненавязліва, выкарыстоўваючы эстэтычна зніжаныя постаці жывёльнага свету, насычае народную алегорыю прыкладамі пазітыўных і негатыўных стратэгій

сацыяльных паводзін. Прэзентацыя фундаментальных маральна-этычных каштоўнасцяў у межах вясёлай дзіцячай песні, а таксама наданне цэнтральных канструктыўных роляў маленькім істотам (вераб'ю, сініцы, мушцы, камару) відавочна карэлюе з асноўнымі пунктамі хрысціянскай выхаваўчай парадыгмы. Такім чынам, анімалістычныя гратэскі не толькі робяцца формай рэкрэатыўнай народнай творчасці, але і набываюць выхаваўчае значэнне. М. Карыцкі, наадварот, напоўніў вядомую з народных песняў алегарычную схему актуальным грамадска-палітычным зместам, захоўваючы пры гэтым дыстанцыю ў адносінах да рэальных палітычных дыскусій і ацэнак.

Актывізацыя мастацкага дыскурсу з анімалістычнымі алегорыямі паўплывала на пазнейшую кніжную традыцыю, што знайшло адлюстраванне ў творчасці аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры М. Багдановіча. Паэт-адраджэнец аб'яднаў у адным тэксце (верш *Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык*) дзве адрозныя сюжэтныя лініі, зафіксаваныя ў запісах народных песняў: вясёлы аповед пра баляванне, а таксама журботную нарацыю пра хваробу і смерць. Сюжэтная інтэграцыя надала пругкасці, завершанасці і рэльефнасці паэтычнаму аповеду.

Як у вусна-паэтычнай, так і ў літаратурнай інтэрпрэтацыі разгледжаных алегарычных вобразаў і матываў з беларускай культурнай прасторы традыцыйная міфа-паэтычная сімволіка прэзентуецца з перспектывы мадэлявання пазітыўных экзістэнцыйных стратэгій, асуджае канфлікты і звады, прапагандуе мірную стваральную супрацу, спачуванне і неабыякавасць да блізкага. Анімалістычныя гратэскі, у якіх апавядалася пра ўзаемадапамогу, гасціннасць, шчырую прыязнасць і добрасумленныя адносіны, а таксама непрыняцце любога гвалту ў асяроддзі маленькіх Божых стварэнняў, рабіліся і робяцца нават у XXI ст. нагодай, каб кожны слухач і чытач задумаўся пра тыя асноўныя прынцыпы ўзаемадзеяння і ўзаемаадносін у супольнасці, якія дазваляюць выжываць і асобнай сям'і, і цэлай нацыі.

References

Âk vyskočyv vorobej: pesnì,kalyhankì, zabaŭlânkì ì vyličankì beloruskìh dìtì z Pudlâša. 2008. Red. Fionik Doroteusz, Fionik Elżbieta. Bielsk Podlaski: Stowarzyszenie Muzeum Małej Ojczyzny w Studziwodach.

Bahdanovič Maksim. 1992. *Poŭny zbor tvoraŭ.* U 3-x t. T. I. Minsk: "Navuka i tèxnika" [Багдановіч Максім. 1992. *Поўны збор твораў.* У 3-х т. Т. I. Мінск: "Навука і тэхніка"].

Belaruskaja narodnaja pesnja Kura-ščavjatura [*Беларуская народная песня Кура-шчабятура*] [online] https:// www.youtube.com/watch?v=ypIccxkPm4E [доступ: 02.02.2024].

Brückner Aleksander. 1903. *Dzieje literatury polskiej w zarysie*. T. I. Warszawa: Gebethner i Wolff; Kraków: G. Gebethner.

Brückner Aleksander. 1916. *Bibliografia Polska. Tom XXVI, wyd. K. Estreicher, Kraków 1915* [rec.]. „Pamiętnik Literacki", 14/1/4: 325–329.

[Czeczot Jan]. 1846. *Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy, w mowie Sławiano-Krewickiej*. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego.

Garbaczowa Maria. 1980. *Michał Korycki – elegantissimus poetarum*. "Ruch Literacki" r. XXI, z. 3 (129): 175–188.

Gulâeva Veronika 2021. *Razvitie tvorčeskogo voobraženiâ u detej doškol'nogo vozrasta sredstvami fol'klora* (195–200). V: *Artpedagogika i artpsihologiâ v vek innovacii*: materialy III Meždunarodnoj naučno-praktičeskoj konferencii v ramkah Vserossijskogo Festivalâ nauki (Moskva, 11–12 oktâbrâ 2021 g.), red. T.V. Hristidis. Moskva: MGIK [Гуляева Вероника. 2021. *Развитие творческого воображения у детей дошкольного возраста средствами фольклора* (195–200). В: *Артпедагогика и артпсихология в век инновации: материалы III Международной научно-практической конференции в рамках Всероссийского Фестиваля науки (Москва, 11–12 октября 2021 г.)*, ред. Т.В. Христидис. Москва: МГИК].

Hernas Czesław. 1957. *Proza sowizdrzalska epoki saskiej*. *Ze studiów nad literaturą staropolską*. „Studia staropolskie" t. 5. Red. Kazimierz Budzyk. Wrocław: Zakład im. Ossolińskich, Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk: 353–371.

Karskì Âŭhìm. 2001. *Belarusy*, uklad. ì kament. S. Haranìna ì L. Ljaŭšun; nav. rèd. A. Mal'dzìs. Mìnsk: Belaruskì knìhazbor [Карскі Яўхім. 2001. *Беларусы*, уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; нав. рэд. А. Мальдзіс. Мінск: Беларускі кнігазбор].

Kawan Christine Shojaei. 2010. *Enzyklopädie des Märchens. Handwörterbuch zur historischen und vergleichenden Erzählforschung*, hrsg. R.E. Brednich, Band 13. Berlin, New York: De Gruyter: 618–622.

Kochan Tacciana. 2011. *Faĺklornaja asnova vobrazaŭ ptušak u paezii Jana Čačota* (153–154). U: Faĺklor i sučasnaja kuĺtura, u 2-ch č. Red. Ivan Roŭda i inš. Minsk: BDU [Кохан Таццяна. 2011. *Фальклорная аснова вобразаў птушак у паэзіі Яна Чачота* (153–154). У: *Фальклор і сучасная культура*, у 2-х ч. Рэд. Іван Роўда і інш. Мінск: БДУ].

Korycki Michaelis, S.J. 1817. *Carmina*. Polociae, Typis Academicis SJ.

Maĺdzis Adam. 1980. *Na skryžavanni slavianskich tradycyj: Litaratura Bielarusi pie¬rachodnaha pieryjadu (druhaja palavina XVII–XVIII st.)*. Minsk: Navuka i technika [Мальдзіс Адам. 1980. *На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.)*. Мінск: Навука і тэхніка].

Maĺdzis Adam. 1987. *Z litaraturaznaŭčych vandra¬vanniaŭ: narysy, ese, dzionniki*. Minsk: "Mastackaja litaratura" [Мальдзіс Адам. 1987. *З літаратуразнаўчых вандраванняў: нарысы, эсэ, дзённікі*. Мінск: "Мастацкая літаратура"].

Mikitìv Galina. 2008. Hudožn'o-obrazna paradigma simvolìv v ukraïns'kih kozac'kih pìsnâh. „Vìsnik Zaporìz'kogo nacìonal'nogo unìversitetu. Filologični nauki" № 2: 146–152 [Микитів Галина. 2008. *Художньо-образна парадигма символів в українських козацьких піснях*. „Вісник Запорізького національного університету. Филологични науки" № 2: 146–152].

Nekraševič-Karotkaja Žanna. 2015. *Šmatmoŭnaja lìtaratura Belarusì ŭ kantèksce aktual'nyx lìtaraturaznaŭčyx kancèpcyj: dapamožnìk.* Mìnsk: BDU [Некрашэвіч-Кароткая, Жанна. 2015. *Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый: дапаможнік*. Мінск: БДУ].

Nekraševič-Korotkaja Žanna. 2019. *Hudožestvennye allegorii serbolužickogo obrjada* Ptači kwas *i tradicija zverinyh groteskov v poètičeskoj kul'ture slavjanskix narodov.* „Zeitschrift für Slavische Philologie" B. 75: 269–296 [Некрашевич-Короткая, Жанна.

2019. *Художественные аллегории серболужицкого обряда* Ptači kwas *и традиция звериных гротесков в поэтической культуре славянских народов*. „Zeitschrift für Slavische Philologie" B. 75: 269–296].

Nekraševič-Karotkaja Žanna. 2020. *Belarus' jak kul'turnaja prastora ì eŭrapejskì litaraturny pracès XVI–XIX stst.: dapamožnìk*. Mìnsk: BDU [Некрашэвіч-Кароткая Жанна. 2020. *Беларусь як культурная прастора і еўрапейскі літаратурны працэс XVI–XIX стст.: дапаможнік*. Мінск: БДУ].

Nekraševič-Karotkaja Žanna. 2022. *Der Brauch der Vogelhochzeit und Lieder mit Vogelmotiven in der Folklore der nordwest- und ostslawischen Völker: Pragmatische und funktionale Aspekte*. „Lětopis" № 1(69): 3–20.

Niekraszewicz-Karotkaja Żanna. 2023. *Animalističeskie groteski v fol'klore i literature slavjanskix narodov kak hudožestvennyj antidepressant i relevantnyj èlement kul'turnoj gramotnosti*. „Studia Rossica Posnaniensia" t. 2, № 2: 9–28 [Niekraszewicz-Karotkaja Żanna. 2023. *Анималистические гротески в фольклоре и литературе славянских народов как художественный антидепрессант и релевантный элемент культурной грамотности*. „Studia Rossica Posnaniensia" t. 2, № 2: 9–28].

Niekraszewicz-Karotkaja Żanna. 2024. *„Przypatrzcie się ptakom podniebnym": „ptasia kuchnia" opracowania piosenek ludowych w kulturze poetyckiej XVIII wieku* (460–474). W: Kowalewska Danuta i in. [red.]. *Wiek osiemnasty od kuchni. IV Kongres Badaczy Osiemnastego Wieku*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika w Toruniu.

Parèckì Jakaŭ. 2014. *Žyccë ì tvorčasc' Mìhala Karyckaga*. „Lìdskì Letapìsec" № 3 (67): 11–21 [Парэцкі Якаў. 2014. *Жыццё і творчасць Міхала Карыцкага*. „Лідскі летапісец" № 3 (67): 11–21].

Pjesnički hornych a delnych Łužiskich Serbow <…> *Prjeni džjel. Pjesnički hornych Łužiskich Serbow = Volkslieder der Wenden in der Ober- und Nieder-Lausitz* <…>. 1841. Ed. Hawpt Leopóld, Smoler Jan Ernst. Volkslieder der Wenden in der Oberlausitz. Grimma: bei J. M. Gebhardt.

Przybyła Wiesław. 2011 *Kulturowa semantyka motywu zwierząt*. „Teksty Drugie: teoria literatury, krytyka, interpretacja" № 3 (129): 238–252.

Rudnicki Daminik. 2011. *Veršy, što prypisvjucca…* U: Brazhunoŭ Aljaksandr (rèd.). *Slavjanamoŭnaja paèzija Vjalikaha Knjastva Litoŭskaha XVI–XVIII stst.* Minsk: Belaruskaja navuka [Рудніцкі Дамінік. 2011. *Вершы, што прыпісывюцца*… У: Бразгуноў Аляксандр (рэд.). *Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст*. Мінск: Беларуская навука].

Rypiński Alexander. 1840. *Białoruś. Kilka słów o poezji prostego ludu téj naszéj polskiej prowincii; o jego muzyce, śpiewie, tańcach, etc*. Paryż: w księgotłoczni J. Marylskiego.

Sorbisches Kulturlexikon. 2014. Ed. Hose Susanne, Mirtschin Maria, Pohontsch Anja, Scholze Dietrich, Schön Franz. Bautzen: Domowina-Verlag.

Vakarûk Lûdmila, Panc'o Stefanìja. 2011. *Zoonìmìčnì simvoli v etnomovnìj kartinì svìtu (na materìalì lemkìvs'koï pìsnì).* "Naukovì pracì. Ser.: Fìlologìâ. Movoznavstvo" № 136 (148): 8–12 [Вакарюк Людмила, Панцьо Стефанія. 2011. *Зоонімічні* символи в етномовній картині світу (на матеріалі лемківської пісні). "Наукові праці. Сер.: Філологія. Мовознавство" № 136 (148): 8–12].

Voznjak Mihajlo. 1929. *Ìz s'pìvanika Domìnìka Rudnic'kogo*. "Zapiski naukovogo tovaristva ìmenì Ševčenka" t. 150: 243–252 [Возняк Михайло. 1929. *Із сьпіваника Домініка Рудницького*. "Записки наукового товариства імені Шевченка" t. 150: 243–252].

Žlutka Ales'. 2007. *Mìhal Karyckì* (26–43). U: *Hìstoryja belaruskaj lìtaratury XI–XIX stahoddzjaŭ. Novaja lìtaratura: drugaja palova XVIII–XIX stahoddze*, t. 2, red. U. Marhel',

V. Čamjarycki. Minsk: Belaruskaja navuka [Жлутка Алесь. 2007. *Міхал Карыцкі* (26–43). У: *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Новая літаратура: другая палова XVIII–XIX стагоддзе*, т. 2, рэд. У. Мархель, В. Чамярыцкі. Мінск: Беларуская навука].

STRESZCZENIE: Przedmiotem badań niniejszego studium jest recepcja i wykorzystanie, a także funkcje artystyczne animalistycznej groteski w białoruskiej tradycji folklorystycznej i książkowej od drugiej połowy XVIII w. do początku XX w. W artykule zostały przeanalizowane folklorystyczne i literackie narracje poetyckie z białoruskiej przestrzeni kulturowej, w których zwierzęce obrazy i motywy pojawiają się jako alegorie. Takie narracje, szeroko reprezentowane w folklorze ludów słowiańskich i niesłowiańskich, były stopniowo chrystianizowane, wypełniane treściami dydaktycznymi, a zatem stały się podstawą do dalszego przetwarzania. W literaturze wątki takie funkcjonowały głównie jako groteski animalistyczne (termin inspirowany pojęciem groteski zwierzęcej, wprowadzonym przez Czesława Hernasa). Tradycja animalistycznych grotesek w białoruskiej przestrzeni kulturowej jest po raz pierwszy badana w kontekście hermeneutyki literackiej, w powiązaniu z ludowymi obrządkami i tradycjami (w szczególności w związku z obrządkiem *Ptači kwas* zachowanym u Serbów Łużyckich). Popularność grotesek animalistycznych da się zauważyć nawet w XXI w.

SŁOWA KLUCZOWE: groteska animalistyczna, folklor, ujęcie literackie, chrystianizacja, modelowanie strategii egzystencjalnych.

АНАТАЦЫЯ: Прадмет даследавання ў артыкуле – рэцэпцыя і бытаванне, а таксама мастацкія функцыі анімалістычных гратэскаў у беларускай фальклорнай і кніжнай традыцыі другой паловы XVIII – пачатку XX ст. Вывучаюцца фальклорныя і літаратурныя паэтычныя нарацыі з беларускай культурнай прасторы, у якіх выступаюць анімалістычныя вобразы і матывы ў якасці алегорый. Такія нарацыі, пашыраныя ў фальклоры славянскіх і неславянскіх народаў, паступова хрысціянізаваліся, напаўняліся дыдактычным зместам, таму і рабіліся грунтам для далейшай апрацоўкі. У літаратуры такія сюжэты функцыянавалі пераважна як анімалістычныя гратэскі (тэрмін, вытворны ад паняцця *groteska zwierzęca*, уведзенага Чэславам Гэрнасам). Традыцыя анімалістычных гратэскаў у беларускай культурнай прасторы другой паловы XVIII – пачатку XX ст. упершыню разглядаецца ў рэчышчы літаратурнай герменеўтыкі ў сувязі з народнымі абрадамі і традыцыямі (у прыватнасці, з абрадам *Ptači kwas*, які захаваўся ў лужыцкіх сербаў). Адзначаецца папулярнасць песняў з анімалістычнымі гратэскамі нават у XXI ст.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: анімалістычны гратэск, фальклор, літаратурная апрацоўка, хрысціянізацыя, мадэляванне экзістэнцыйных стратэгій.

Data przesłania artykułu: 29.05.2024
Data akceptacji artykułu: 21.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORCE

Zhanna Nekrashevich-Karotkaja / Жанна Некрашэвіч-Кароткая – Polska, Poznań, Uniwersytet im. Adama Mickiewicza, Instytut Filologii Wschodniosłowiańskich;

specjalność naukowa: literaturoznawstwo; zainteresowania naukowe: historia literatur słowiańskich, *cultural space studies*, hermeneutyka literacka.

Adres: Instytut Filologii Wschodniosłowiańskich UAM, Collegium Novum, al. Niepodległości 4, 61-874 Poznań, Polska

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Nekrashevich-Karotkaja Zhanna. 2023. *Хрэстаматыя па старабеларускай літаратуры пад рэдакцыяй Галіны Тварановіч у кантэксце праблемы беларускага літаратурнага канона*. "Bibliotekarz Podlaski" vol. 58, № 1: 27–42.
2. Niekraszewicz-Karotkaja Żanna. 2024. *„Przypatrzcie się ptakom podniebnym": „ptasia kuchnia" opracowania piosenek ludowych w kulturze poetyckiej XVIII wieku* (587–605). W: Kowalewska Danuta i in. [red.]. *Wiek osiemnasty od kuchni. IV Kongres Badaczy Osiemnastego Wieku*. Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika w Toruniu.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Jury Paciupa, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.13

Jury Paciupa / Юры Пацюпа

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі / Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus,
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-7009-7966
e-mail: paciupa@gmail.com

Эцюды да класіфікацыі дзеяслова: Гісторыя праблемы, катэгорыі, таксоны і карэляцыі

Studies on verb classification: History of the problem, categories, taxa and correlations
Badania nad klasyfikacją czasowników: Historia problemu, kategorie, taksony i korelacje

ABSTRACT: One of the most confusing sections of grammar has been and remains the verb classes, Slavic in general and Belarusian in particular. Throughout the 19th–20th centuries almost every linguist, addressing this issue, proposed his own version, and as a result, a convention for the numerical nomination of classes and the definition of their boundaries did not emerge. In the article the problem of verb classes is revealed taking into account their semantics, which manifests itself in the morphology and derivational valence of taxa. The object of the study was the complete corpus of Belarusian verbs, presented in the relevant lexicographic works and the Belarusian segment of the Internet. The peculiarity of the proposed approach also lies in the fact that the author of the article abandoned the numerical nomination of verb classes and turned to verbal nomination, taking into account the qualitative characteristics of each taxon. To do this, the author had to bring together the concept of class with aspectual problems, namely with the aktionsart of the verb, which are studied by functional grammar. When describing the categorical content of taxa, the author for the first time applied to the Belarusian verb the category of version, which includes not only the concept of transitivity / intransitivity, but also such subject-object relations as centrifugality / centripetality action, reachability / unattainability. To nominate taxa, both generally accepted terms and author's ones were used, for example, "illuminative" or "mediational" verbs. The article outlines a brief history of the issue, compares methods for classifying verbs, both formal and semantic, defines the categorical apparatus, outlines a complete set of taxa to be described, and describes the most representative classes of verbs: stative and

illuminative. The purpose of the article is to reveal the properties and deep laws of verb classes, which can be of practical importance for the formation and selection of vocabulary, as well as for understanding the historical processes occurring in grammar. Corpus and semantic analysis, statistical calculus and scale theory were used in the study of verb classes. The topic of the article remains incomplete, open and requires continuation until a complete description of the classes, subclasses, groups and clusters of the verb determined in the study.

KEYWORDS: verb, class, aktionsart, voice, aspect, version, transitivity, conjugation.

Дзеясловы разам з імёнамі складаюць асноўны масіў лексікі. Яны, як і ўсякая часціна мовы, неаднародныя. І, калі мы прызнаём мову сістэмаю, то, мабыць, і неаднароднасць дзеясловаў мае сістэмны характар. Калі б сістэмнасць зводзілася да фармальнай тыпалогіі, да груп аднародных з'яў, структура якіх семантычна і функцыянальна не абумоўленая, то наўрад ці ў такім разе варта было б гаварыць пра сістэмнасць. На жаль, амаль усе спробы сістэматызацыі дзеясловаў вагаюцца паміж крайнасцямі: вылучаюцца чыста фармальныя класы, якія пры ўсім жаданні не выпадае інтэрпрэтаваць у семантычным плане, або на дзеясловы накідваецца вонкавая катэгарыяльная сетка, а ў выніку – у кожнай катэгорыі апынаюцца дзеясловы з самымі рознымі фармальнымі прыметамі. Улічыўшы негатыўны досвед, варта дабіцца класіфікацыі, якая б вынікала з прэзумпцыі семантычнай абумоўленасці формы, яе сэнсоўнасці, м а т ы в а в а н а с ц і.

Адразу трэба заўважыць, беларускі дзеяслоў не унікум і не рарытэт, а варыяцыя ў кантэксце агульнаславянскага дзеяслова. Ён, само сабою, мае свае адметнасці, і часам вельмі істотныя ў прыватных выпадках, мае свае прыярытэты ў агульным развіцці, але прынцыпы класіфікацыі дзеясловаў агульныя для ўсіх славянскіх моў. Таму ўсё тое, што было зроблена ў гэтай галіне на славянскім грунце, мае значэнне для беларускай мовы, і наадварот, тое істотнае, што можна выявіць на прыкладзе беларускай мовы, будзе мець значэнне для іншых славянскіх моў.

1.1. З гісторыі класіфікацыі дзеяслова

З XVI–XVII стст., часу стварэння Лаўрэнам Зізаніем і Мялетам Сматрыцкім першых граматык царкоўнаславянскай мовы, узнікла столькі спробаў класіфікаваць дзеясловы, што іх гісторыі можна прысвяціць асобную кнігу. Як пісала Соф'я Брамлей, "няма літаральна ніводной граматыкі <…>, дзе класы дзеясловаў вылучаліся б ідэнтычна" [Бромлей 1965: 67]. З іншага боку, нельга сказаць, каб класы дзеяслова стала трымаліся ў цэнтры ўвагі сучаснага мовазнаўства. Наадварот,

яны не толькі не даследуюцца, нават прынятыя класіфікацыі практычна не фігуруюць у школьнай практыцы, не звяртаецца на іх увага і пры вывучэнні семантыкі і дэрывацыйнай валентнасці дзеяслова, што сведчыць пра інертнасць лінгвістыкі або – непрактычнасць атрыманых вынікаў.

Што да практычнасці, то далёка не ўсё так безнадзейна, шмат карыснай інфармацыі, звязанай менавіта з класамі, захоўваецца ў несістэматызаваным выглядзе, амаль у забыцці, але, як было ўжо сказана, класіфікацыяў шмат, і адна другой не роўная. Няўдачы ці, лепш сказаць, брак аднадумства С. Брамлей звязвала з "невыразнай пастаноўкай задач самой класіфікацыі" [Бромлей 1965: 67]. І ўсё ж спадзявацца, што такім спосабам мы дасягнём канвенцыі, не варта, бо задачы могуць ставіцца розныя. Розныя класіфікацыі праводзіліся на розных лагічных падставах, і часам нельга сказаць, якая падстава істотная, а якая не. Падрабязна заглыбляцца ў гісторыю пытання тут будзе лішнім, але ведаць асноўныя моманты ўсё ж варта.

Л. Зізаній і М. Сматрыцкі, арыентуючыся на антычны досвед, падзялілі славянскія дзеясловы на два спражэнні. У дачыненні да беларускай мовы тое самае зрабіў Іван Ужэвіч. Іх класіфікацыю пераняў і Міхайла Ламаносаў. Да гэтай пары падзел на два спражэнні пашыраны ў расейскай традыцыі, асабліва ў школьнай практыцы, адкуль і быў пераняты Браніславам Тарашкевічам. Аднак, калі мы звернемся да зместу тых першых падзелаў на спражэнні, то выявіцца, што нічога супольнага з сучасным школьным разуменнем спражэнняў ні ў Л. Зізанія, ні ў І. Ужэвіча не было [гл.: Зізаній 1996: 224–225; Ужэвіч 1996: 310–321]. Дзеясловы ў іх дзяліліся не паводле змянення, а паводле асноў – на галосныя і на зычныя, таму ад той класіфікацыі ў сучаснай практыцы захаваўся бінарны прынцып і нічога больш.

Падзел на два спражэнні адносіцца толькі да марфалогіі, да словазмянення і не чапае ані марфемікі, ані словаўтварэння, а тым больш семантыкі дзеяслова. Далёка не ўсім славянскім мовам ён пасуе. Аляксандар Ісачанка, прыкладам, пісаў: "Ува ўмовах славацкай школы дзяленне рускіх дзеясловаў на два спражэнні амаль нічым не абумоўліваецца" і "нам здаецца лішнім" [Исаченко 1960: 25, 26]. Варта тут дадаць, што і лік спражэнняў не быў стабільным. Расейская акадэмічная граматыка 1802 г. пад уплывам лацінскай традыцыі і *Граматыкі Пор Раяля* спрабавала ўвесці чатыры спражэнні дзеяслова (на *-ать, -еть, -ить* і *оть*), яе наследавалі Іван Рыжскі, Мікалай Грэч, Канстанцін Калайдовіч і іншыя, але ўжо Аляксандар Востокаў вярнуўся да бінарнай мадэлі [Комте 2006: 102–105]. Ён, апрача таго, вылучаў правільныя і няправільныя дзеясловы, а ў іх складзе – дзесяць "падрабязных спражэнняў" (а фактычна – класаў)

[Востоков 1831: 112–117]. У Аляксея Шахматава называюцца тры спражэнні, але разам з "няправільнымі дзеясловамі" – іх чатыры, праўда, у яго трэцяе спражэнне – гэта рудыментарныя дзеясловы, а асноўныя – таксама два [Шахматов 1952: 225–241]. Колькі ж насамрэч – два, тры ці чатыры – адразу і не скажаш.

Адным з важнейшых этапаў у сістэматызацыі славянскага дзеяслова сталася класіфікацыя Ёзафа Добраўскага, дапоўненая пазней Францам Міклашычам [гл.: Комте 2006: 102–105; Исаченко 1960: 21–23]. Ё. Добраўскі адштурхоўваўся ад г. зв. тэматычных галосных інфінітыва: 1 клас – Ø; 2 клас – *-nǫ*; 3 клас – *-ě*; 4 клас – *-i*; 5 клас – *-a*; 6 клас – *-ova*. Яго мадэль наследавалі і развівалі Аўгуст Шлейхер, Аўгуст Лескін, Паўль Дыльс, Ватраслаў Ягіч, Тадэвуш Лер-Сплавінскі і іншыя. Адным словам, калі ў расейскай традыцыі нязменна панавала бінарная мадэль падзелу на спражэнні, то ў чэшскай рана ўкаранілася плюральная мадэль падзелу на класы, заснаваная на тэматычных галосных. І, відавочна, што не без уплыву даробку Ё. Добраўскага ўзнікла знакамітая класіфікацыя Сяргея Карцэўскага [Карцевский 2004: 70–106], якая запачаткавала якасна новы этап у сістэматызацыі славянскага дзеяслова.

Да С. Карцэўскага панаваў гістарычны прынцып класіфікацыі, і А. Шахматаў побач з традыцыйнымі спражэннямі вылучаў чатыры класы і 21 "узор" («образец») дзеяслова з улікам іх гістарычных асноў [Шахматов 1952: 222–225]. С. Карцэўскі ж, згодна з новай сасюраўскай апазіцыяй сінхраніі і дыяхраніі, размеркаваў дзеясловы ў сінхранічнай перспектыве і вылучыў два вялікія, фармальна нічым не акрэсленыя масівы дзеясловаў – прадукцыйныя і непрадукцыйныя, а ў межах гэтага прынцыпу на падставе карэляцыі асноў інфінітыва (чэшская традыцыя) і цяперашняга часу (расейская традыцыя) вылучаў ужо фармальныя класы дзеясловаў, але, што характэрна і важна, назваў іх "семантычнымі", дарма што семантыка апісвалася ў яго эпізадычна. Як пазней высветлілася, падобныя вынікі атрымаў Антуан Мейе [гл.: Комте 2006].

Менавіта зварот да сінхранічнага прынцыпу і класіфікацыя паводле прадукцыйнасці ставіцца ў заслугу С. Карцэўскаму. Насамрэч прадукцыйнасць – гэта вонкавы і даволі грубы паказнік нейкіх больш глыбокіх заканамернасцяў. Што да сінхраніі, то ад яе мусілі адмовіцца ўжо наступнікі С. Карцэўскага, калі спатрэбілася больш дэталёва апісаць непрадукцыйныя дзеясловы. На нашу думку, больш перспектыўным вынікам С. Карцэўскага было выяўленне карэляцыі паміж марфалогіяй і семантыкай, хоць апошні аспект і апісаны ў яго фрагментарна. Праўда, трэба зазначыць, задоўга да С. Карцэўскага шмат цікавых назіранняў у гэтым плане зрабіў Герасім Паўскі ў сваім даследаванні "заводаў"

(«пород») дзеяслова [Павский 2012]. На жаль, вынікі Г. Паўскага былі практычна забытыя, а вынікі С. Карцэўскага ў галіне семантыкі яго паслядоўнікі не развівалі і не паглыблялі.

Затое сама класіфікацыя С. Карцэўскага пашырыліся імгненна, стаўшы ў СССР практычна ананімнай. Пік яе папулярнасці прыпадае на канец 40-х – пачатак 60-х гг. XX ст. Адметна, што амаль адразу "семантычныя класы" С. Карцэўскага ператварыліся ў "марфалагічныя класы" [гл.: Виноградов 1972; *Грамматика* 1952; *Грамматика* 1960]. А ўжо з другой паловы 60-х гг., пасля крытыкі С. Брамлей [Бромлей 1965], увага з класаў пераносіцца на спосабы дзеяння. Наступныя расейскія граматыкі апісвалі дзеясловы паводле С. Брамлей, якая не наследавала С. Карцэўскага [гл.: *Грамматика* 1970], самі класы сталі чыста рытуальным марфаналагічным апісаннем асноў. Балазе класіфікацыю С. Карцэўскага захавалі беларускія граматыкі, але хутчэй у выніку інерцыі, чым прынцыпова.

Можна заўважыць, пры вылучэнні спражэнняў бралася да ўвагі аснова цяперашняга часу, пры вылучэнні класаў – аснова інфінітыва (Ё. Добраўскі) ці суадносіны асновы інфінітыва і асновы цяперашняга часу (С. Карцэўскі), улічваліся і іншыя асновы, прыкладам, цяперашняга і прошлага часу [гл.: Сидоров 1945: 176–186]. Аднак пазней Тацяна Нікалаева [Николаева 1962], Феранц Пап [Пап 1963] і С. Брамлей [Бромлей 1965] выявілі супярэчнасці ў вылучэнні асноў. Т. Нікалаева прапанавала новую класіфікацыю: не на падставе якасці асноў ("матэрыі"), а на злічэнні іх колькасці – розныя дзеясловы ў розных формах давалі ад адной да чатырох асноў. Безумоўна, гэта быў цікавы дослед, але злічэнне правілаў і выняткаў яшчэ нічога не гаворыць пра прыроду самой з'явы. Ф. Пап адрозніваў не прадукцыйныя і непрадукцыйныя, а стандартныя і нестандартныя дзеясловы, поўную і "прыцятую" («усеченную») асновы, але праведзены ім падзел на марфемы быў досыць такі спрэчны, калі не сказаць абмыльны.

Класіфікацыю, падобную да Папавай, прапанавала С. Брамлей, паводле прынцыпу: "Фармальным паказнікам аднясення дзеясловаў да аднаго класу" сталі "канцавыя элементы дзеяслоўных асноў" [Бромлей 1965: 76]. Іронія гісторыі ў тым, што гэты прынцып, хоць і на якасна новым этапе, амаль нічым не адрозніваецца ад прынцыпу Л. Зізанія. Што істотнага пра дзеясловы могуць сказаць "канцавыя элементы" без уліку марфем і іх семантыкі? А калі мы тыпалогію пачынаем з таго, што абстрагуемся ад носьбітаў значэння, паставіўшы ў галаву вугла абсалютна другасную рэч – стык марфем – пры гэтым без разбору зваліўшы ў адну кучу каранёвыя і суфіксальныя марфемы, іх адрозненні і іх паходжанне, то вярнуцца да семантыкі не зможам ні пры

якіх умовах ці мусім шукаць семантычныя класы па-за гэтай формай, што і здарылася.

Больш як дзве траціны даследавання С. Брамлей прысвячаецца крытыцы С. Карцэўскага і ягоных паслядоўнікаў. Трэба прызнаць, што здыскрэдытаваць і надоўга знейтралізаваць канцэпцыю апанента ўдалося, але альтэрнатыва вяла ў тупік. Перавагу сваёй класіфікацыі аўтарка бачыла ў "адзінстве пакладзенай у яе аснову прыметы" [Бромлей 1965: 73]. Гэты фармальна-лагічны прынцып, рэалізацыя якога часта падаецца як вяршыня і мэта навуковага даследавання, нам не першы раз даводзіцца крытыкаваць: пры класіфікацыі часцін мовы [Пацюпа 2013: 103–104, 129–131], пры размежаванні верша і прозы [Патюпо 2018: 341–342]. Дзеля несупярэчлівай і лагічна бездакорнай класіфікацыі тут прыносіцца ў ахвяру і змястоўнасць, і практычная карысць. Перафразуючы Фрэнсіса Бэкана, можна сказаць: С. Карцэўскі падначаліў думкі прыродзе рэчаў, а С. Брамлей падначаліла рэчы словам. Яна так крытыкуе С. Карцэўскага: "У аснову выдзялення класаў былі пакладзеныя не проста суадносіны асноў, але і канкрэтны від асновы" [Бромлей 1965: 72]. Вось якраз у гэтым мы і бачым ягоную перавагу, таму наш рух наперад – гэта назад да С. Карцэўскага.

Прынцып класіфікацыі, адкрыты С. Карцэўскім, быў такі істотны, а сам кірунак, ім абраны, быў настолькі слушны, што ўсе спробы адыходу ад гэтага прынцыпу, як паказала наступная практыка, сталі крокам назад ці, у лепшым выпадку, прыватнымі і ўмоўнымі спробамі класіфікацыі дзеяслова. Зразумеўшы, у чым замыкаецца той прынцып, мы зразумеем, чаму іншыя спробы, і дагэтуль, і потым, выглядалі як даніна лінгвістычнай схаластыцы, інакш кажучы, не мелі практычнай карысці. Лічыцца, як ужо гаварылася, што класіфікацыя С. Карцэўскага грунтуецца на дачыненнях асноў, але няма, бадай, класіфікацыі, дзе так ці інакш не фігуравалі б асновы, адна, дзве, а то і больш. Асновы, як і прадукцыйнасць, – гэта вонкавы бок справы, яны ўлічваліся і ў Л. Зізанія, і ў А. Шахматава, і ў С. Брамлей.

Самы праз сябе асновы яшчэ нічога не значаць. Гаворачы пра асновы, мы вылучаем у іх розныя элементы: гукавыя, этымалагічныя, марфаналагічныя, марфемныя, а то і літарныя, часцей частку, чым цэлае. Але існасць прынцыпу класіфікацыі С. Карцэўскага не зводзіцца ні да асноў, ні да іх дачыненняў, ні тым больш да іх колькасці. Фактура асноў – толькі сімптаматыка класаў. З дапамогай розных сімптомаў трэба ўмець вылучыць галоўнае, абстрагаваўшыся ад гістарычных чаргаванняў, іншых адхіленняў, калі яны ёсць. Прынцып С. Карцэўскага грунтуецца на дзеяслоўных слова- і формаўтваральных суфіксах, і таму яму няма альтэрнатывы. Заўважым, у самога С. Карцэўскага класы дзеясловаў

фігуравалі як семантычныя і словаўтваральныя з'явы. У ягоных наступнікаў семантычны аспект быў зведзены блізу да нуля, а словаўтварэнне дзеяслова – адарванае ад класіфікацыі.

1.2. Беларускі досвед класіфікацыі дзеяслова

Завяршаючы гэты больш чым сціслы гістарычны агляд, варта апісаць і беларускі досвед. Пасля Л. Зізанія, М. Сматрыцкага і І. Ужэвіча на новым этапе станаўлення беларускай мовы першым звярнуўся да сістэматызацыі дзеясловаў Павел Шпілеўскі. Ён падзяліў іх на дзве вялікія групы: правільныя і няправільныя, сярод правільных вылучаў пяць спражэнняў: на *-аць / -яць*; на *-ець*, на *-іць*, на *-оць* і на *-уць*; сярод няправільных – дзеясловы на *-ць, -ці* і *-чы* [Шпилевский 2006: 74–85]. Нібыта тыповая для XIX ст. класіфікацыя: відаць і ўплыў А. Вастокава, і расейскай акадэмічнай традыцыі, мажліва, Ё. Добраўскага, і ў той жа час праз класіфікацыю П. Шпілеўскага (як і А. Вастокава) ужо праступаюць рысы будучага праекту С. Карцэўскага, што сведчыць пра аб'ектыўнасць шуканняў тагачасных лінгвістаў. На жаль, граматыка П. Шпілеўскага праляжала ў архіве да нашага часу і не была запатрабаваная.

У XX ст. адметную спробу адысці ад парадыгмы спражэнняў зрабіў Ян Станкевіч. У рэцэнзіі на граматыку Б. Тарашкевіча ён накідаў сістэму сямі класаў дзеяслова як альтэрнатыву школьнаму бінарнаму падзелу. Унутры пэўных класаў вылучалася ад двух да сямі падкласаў, што ў суме складала 18 кшталтаў [Станкевіч 2007: 152–158]. Гэта, безумоўна, была адна з удасканаленых версіяў сістэмы Ё. Добраўскага, Я. Станкевіч абапіраўся на досвед чэшскай школы, у якой ён атрымаў адукацыю. Вядома, на той час ужо з'явілася больш перспектыўная класіфікацыя С. Карцэўскага, але ў 1930 г., калі пісалася рэцэнзія на Б. Тарашкевіча, мінула ўсяго толькі тры гады пасля публікацыі працы С. Карцэўскага, Віктар Вінаградаў ці не першы ў 1938 г. стаў уводзіць ягоную класіфікацыю ў падручнікі [Виноградов 1938]. Дык жа Станкевічава версія была важнай падзеяй у гісторыі беларускай граматыкі, але, як і П. Шпілеўскага, засталася не заўважанай ні сучаснікамі, ні біёграфамі [гл.: Бушлякоў 2002], а рэцэнзент нават асудзіў, не разабраўшыся, што гэта такое [Запрудскі 2003: 338].

У пасляваенны перыяд, калі расейская лінгвістыка ўжо асвоіла С. Карцэўскага, беларуская таксама пераняла яе практыку. Адна за адной узнікаюць сістэмы дзеяслоўных класаў у рэчышчы гэтай традыцыі. Першым апісаў беларускі дзеяслоў паводле С. Карцэўскага Цімафей Ломцеў [Ломтев 1956: 92–100]. Больш поўную сістэматыку класаў прапанаваў Аркадзь Жураўскі [Жураўскі 1957]. Ці не найбольш пра класы

беларускага дзеяслова пісаў Павел Шуба [Шуба 1961; Шуба 1968; Шуба 1987]. Менавіта Шубава версія зрэалізавалася ў акадэмічных граматыках: [*Граматыка беларускай мовы* 1962; *Беларуская граматыка* 1985]. Версію П. Шубы можна было б назваць даведзенай да дасканаласці ў межах парадыгмы С. Карцэўскага, каб не адна акалічнасць: яна адзін у адзін паўтарала расейскую граматыку [*Грамматика русского языка* 1960: 531–576]. Як гэта ўспрымаць, як другаснасць ці як навуковую дысцыплінаванасць – сказаць цяжка. Але на фоне класіфікатарскай сваволі, не абмежаванай жаднай логікай, наследаванне сістэмы С. Карцэўскага, даведзенай да дасканаласці расейскімі лінгвістамі, мела пазітыўны вынік. І сёння, адштурхоўваючыся ад Шубавага даробку, прасцей вывучаць беларускі дзеяслоў. У нас захавалася тое, што страцілі расейскія граматыкі.

Бадай што апошняй спробай на беларускай ніве звярнуцца да традыцыі С. Карцэўскага была класіфікацыя Аляксандра Крывіцкага [Крывіцкі 1990]. Адметнасць яе ў тым, што рабілася яна ў педагагічных мэтах і таму спрошчаная. Спецыяльныя мэты ставілі перад сабой Валянціна Русак і Фёдар Піскуноў. Для апісання марфаналогіі дзеяслова В. Русак упершыню скарыстала досвед новых расейскіх граматык, зарыентаваных на С. Брамлей [Русак 2003: 260–261]. Ф. Піскуноў зрабіў арыгінальную класіфікацыю, якая працягвала традыцыі Ф. Папа і С. Брамлей і, як ён сам абазначыў, мела вузкаспецыяльнае значэнне: для кампутарнага апрацоўвання дзеяслова [Піскуноў 2008]. Варта адзначыць дасціпную класіфікацыю Тацяны Рамзы, якая таксама ў чыста педагагічных мэтах спалучыла бінарны падзел дзеяслова на спражэнні з падзелам паводле тэматычных галосных, вылучыўшы ўнутры спражэнняў па некалькі тыпаў [Рамза 2010]. Сістэма двух спражэнняў паслужыла вонкавай рамай для сістэмы класаў.

Тэматычныя галосныя і два спражэнні застаюцца канстантай, да якой рана ці позна вяртаюцца славянскія граматыкі. Можна, як Я. Станкевіч ці А. Ісачанка, сумнявацца ў дамэтнасці вылучэння спражэнняў, але ў беларускай літаратурнай мове розніца відавочная: 1-е – *ён піша, яны пішуць*, а 2-е – *ён носіць, яны носяць*. У дыялектах, вядома, можна знайсці розныя выпадкі: [гл.: Мацкевіч 1959], і часам розніца паміж спражэннямі згладжваецца: 1-е – *ён пішыць, яны пішуць*, і 2-е – *ён носіць, яны носюць*. Але і ў такіх выпадках за фанетычнай паверхняю трэба ўмець бачыць марфалогію. Спражэнні аніяк нельга звязаць з семантыкай, таму класіфікаваць дзеясловы трэба з улікам тэматычных галосных, і толькі потым спрабаваць зразумець значэнне спражэнняў. Хоць і тады яны не могуць быць рамаю для класаў, месца спражэнняў не ўнутры класаў, і нават не звонку, а паміж класамі. Спражэнні запраўды два, спробы ў XIX ст. павялічыць іх лік адбываліся ў выніку блытання ўласцівасцяў

класаў з уласцівасцямі спражэнняў, пакуль С. Карцэўскі не выявіў семантычныя класы як нешта адмысловае.

1.3. “Дзеці С. Карцэўскага” і намінацыя класаў

Калі класіфікацыя С. Карцэўскага – вяршыня ў парадкаванні дзеяслова, то ўзнікае пытанне, чаго ёй бракуе, каб на тым спыніцца, і чаму яна так і не здаволіла лінгвістаў? Для адказу трэба больш пільна ўгледзецца ў гісторыю яе станаўлення і заняпаду. С. Карцэўскі пакінуў не звершаную сістэму класаў, а праект для пабудовы сістэмы, першы, досыць прыблізны накід. Па-першае, у яго класіфікацыі амаль не апісанымі засталіся тыя дзеясловы, якія ён назваў непрадукцыйнымі. Па-другое, неакрэслены і спрэчны быў сам панятак прадукцыйнасці. І па-трэцяе, семантычны аспект, як ужо зазначалася, быў разгледжаны фрагментарна. Парадокс яшчэ ў тым, што выкананню першага пункту замінаў другі пункт, за які С. Карцэўскага хвалілі. Непрадукцыйныя дзеясловы нельга зразумець з пазіцыі сінхраніі. Ды яны, па-вялікім рахунку, мала цікавілі С. Карцэўскага, тут вучоны абмежаваўся прыёмам “лінгвістычнага сметніка”, маўляў, вось так і г. д. А чарнавую работу па ўпарадкаванні рэшты дзеясловаў давялося рабіць пераемнікам – “дзецям С. Карцэўскага”, і ключавой фігурай тут быў В. Вінаградаў.

Калі параўнаць сістэму класаў дзеяслова першага [Карцевский 2004: 70–106] і другога [Виноградов 1972: 345–360], то адразу відаць: В. Вінаградаў пачаў там, дзе С. Карцэўскі кончыў. Пры гэтым ствараецца ўражанне, што В. Вінаградаў дапаўняў С. Карцэўскага спехам, таму логікі ў парадку дадатковых дзеясловаў няма. Зусім іншае ўражанне пакідае сістэма класаў у граматыцы, выдадзенай пад рэдакцыяй В. Вінаградава [*Грамматика* 1960: 531–576], тут калі і не ўсе пазіцыі бясспрэчныя, то, прынамсі, у лагічнасці і прадуманасці ім не адмовіш. Аднак менавіта ў граматыцы праявілася тэндэнцыя да фармалізацыі класаў. Скажам, першы і другі класы, якія ў С. Карцэўскага і ў В. Вінаградава фігуравалі як асобныя, у граматыцы былі злучаныя ў адзін клас і фігуравалі ўжо як падкласы. Дарма што яны адрозніваюцца і тэматычным галосным, улічваным з часоў Ё. Добраўскага, і семантыкай. Ужо адзін толькі гэты прыклад паказвае, што ў сістэме класаў, калектыўнымі намаганням нібыта даведзенай да дасканаласці, з’явіліся такія хібы, якія вялі да поўнага ігнаравання семантыкі. Заставаўся толькі крок да сістэмы С. Брамлей. Калі семантычныя класы зрабіліся “марфалагічнымі”, то не дзіва, што неўзабаве яны мусілі пераўтварыцца ў марфаналагічныя.

Мала таго, з самага пачатку новай парадыгмы намеркаваўся разнабой у нумарацыі класаў: “...ёсць некалькі розных класіфікацыйных

Табліца 1-а. **КД паводле намінальнай шкалы адносна В. Вінаградава**

Узоры	Карцэўскі 1927	Вінаградаў 1938/1947	Ісачанка 1960	Сідараў 1945	Кузняцоў 1952	Гваздзёў 1958	Галкіна-Фед. 1957	Ломцеў 1956	Жураўскі 1957	Шуба 1952/1987	Крывіцкі 1978/1990
чытаць	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1а	П.1	П.1А	П.1
бялець	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.1б	П.2	П.1Б	П.2
гадаваць	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.2	П.3	П.3	П.3
бяліць	П.4	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.3	П.5	П.4	П.4
стукнуць	П.5	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.4	П.4	П.2	П.5
казаць	Н.1	Н.1	Н.6[1]	Н.1абв	Н.1	Н.1	Н.1	Н.2а	Н.1	Н.1	Н.1
крычаць	Н.2	Н.2	Н.7[2]	Н.1б	Н.14	Н.2	–	Н.2б	–	Н.2	Н.2б
грымець	Н.3	Н.3	Н.8[3]	Н.1в	Н.13	Н.3	–	Н.2б	Н.2	Н.2	Н.2а
сохнуць	Н.4	Н.4	Н.9[4]	Н.2	Н.6	Н.4	Н.4	Н.3	Н.4	Н.3	П.5
несці	Н.5	Н.5	Н.10[5]	Н.3аб	Н.11	Н.5	–	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3б
пячы	Н.6	Н.6	Н.10[6]	Н.3а	Н.12	Н.6	–	Н.1б	Н.7	Н.5	Н.3а
брысці	Н.7	Н.7	Н.10[5]	Н.3а	Н.11	Н.6	–	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3в
драць	–	Н.8	Н.[10]	Н.3а	Н.2	Н.8	Н.2	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3г
біць	–	Н.9	Н.[12]	Н.5,6а	Н.7	Н.11	–	Н.4	Н.5	Н.9	Н.5
мыць	–	Н.10	Н.[13]	Н.5,6а	Н.7	Н.10	–	Н.4	Н.5	Н.10	Н.5
калоць	–	Н.11	Н.[11]	Н.1а	Н.3	Н.8	Н.2	Н.1г	Н.9	Н.7	Н.4
чуць	–	Н.12	Н.[15]	Н.5	Н.8	Н.12	–	Н.4	–	Н.11а	П.3
жыць	–	Н.13	Н.[14]	Н.3б	Н.10	Н.12	–	–	Н.5	Н.11б	Н.6
даваць	–	Н.14	Н.[7]	Н.7	Н.9	Н.9	–	–	Н.3	Н.8	П.1
дзець	–	Н.15	Н.[16]	Н.2	Н.5	Н.12	–	–	Н.8	Н.11в	–
жаць	–	Н.16	Н.[8,9]	Н.4аб	Н.4	Н.7	Н.3	Н.1В	Н.8	Н.6	Н.1
(указуют)	–	Н.17	П.1	Н.6в	–	–	–	–	–	–	–
даць	–	Р.0	Р.0	Р.	Р.	Р.	Р.0			Р.0	

Табліца 1-б. **КД паводле намінальнай шкалы адносна граматыкі 1952 г.**

Узоры	**Карцэўскі 1927**	**Вінаградаў 1938/1947**	**Ісачанка 1960**	**Сідараў 1945**	**Кузняцоў 1952**	**Гваздзёў 1958**	**Галкіна-Фед. 1957**	**Ломцеў 1956**	**Жураўскі 1957**	**Шуба 1952/1987**	**Крывіцкі 1978/1990**
чытаць	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1а	П.1	П.1а	П.1
бялець	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.1б	П.2	П.1б	П.2
стукнуць	П.5	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.4	П.4	П.2	П.5
гадаваць	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.2	П.3	П.3	П.3
бяліць	П.4	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.3	П.5	П.4	П.4
казаць	Н.1	Н.1	Н.6[1]	Н.1абв	Н.1	Н.1	Н.1	Н.2а	Н.1	Н.1	Н.1
крычаць	Н.2	Н.2	Н.7[2]	Н.1б	Н.14	Н.2	–	Н.2б	–	Н.2	Н.2б
грымець	Н.3	Н.3	Н.8[3]	Н.1в	Н.13	Н.3	–	Н.2б	Н.2	Н.2	Н.2а
сохнуць	Н.4	Н.4	Н.9[4]	Н.2	Н.6	Н.4	Н.4	Н.3	Н.4	Н.3	П.5
несці	Н.5	Н.5	Н.10[5]	Н.3аб	Н.11	Н.5	–	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3б
брысці	Н.7	Н.7	Н.10[5]	Н.3а	Н.11	Н.6	–	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3в
церці	–	Н.8	Н.[10]	Н.3а	Н.2	Н.8	Н.2	Н.1а	Н.6	Н.4	Н.3г
пячы	Н.6	Н.6	Н.10[6]	Н.3а	Н.12	Н.6	–	Н.1б	Н.7	Н.5	Н.3а
жаць	–	Н.16	Н.[8,9]	Н.4аб	Н.4	Н.7	Н.3	Н.1в	Н.8	Н.6	Н.1
палоць	–	Н.11	Н.[11]	Н.1а	Н.3	Н.8	Н.2	Н.1г	Н.9	Н.7	Н.4
даваць	–	Н.14	Н.[7]	Н.7	Н.9	Н.9	–	–	Н.3	Н.8	П.1
біць	–	Н.9	Н.[12]	Н.5,6а	Н.7	Н.11	–	Н.4	Н.5	Н.9	Н.5
мыць	–	Н.10	Н.[13]	Н.5,6а	Н.7	Н.10	–	Н.4	Н.5	Н.10	Н.5
чуць	–	Н.12	Н.[15]	Н.5	Н.8	Н.12	–	Н.4	–	Н.11а	П.3
жыць	–	Н.13	Н.[14]	Н.3б	Н.10	Н.12	–	–	Н.5	Н.11б	Н.6
дзець	–	Н.15	Н. [16]	Н.2	Н.5	Н.12	–	–	Н.8	Н.11в	–
(указуют)	–	Н.17	П.1	Н.6в	–	–	–	–	–	–	–
даць	–	Р.0	Р.0	Р.	Р.	Р.	Р.0			Р.0	–

схем, і ні адна з іх не можа лічыцца агульнапрынятай. Дзіўна, што падручнік ВНУ <...>, выдадзены ў 1952 г., падае іншую класіфікацыю, чым Акадэмічная граматыка I, выдадзеная ў тым жа годзе пад той жа рэдакцыяй" [Исаченко 1960: 41]. Калі лінгвісты такім спосабам імкнуліся праявіць аўтарскі пачатак, то гэта было недарэчы. "Ствараецца ўражанне суб'ектывізму і самавольства ў фармаванні класаў, бо логіка тых ці іншых аб'яднанняў часта няясная" [Бромлей 1965: 71]. А тым часам сам С. Карцэўскі зазначаў: "Парадак, у якім мы падалі ўсе пяць класаў, не ёсць абсалютна адвольным" [Карцевский 2004: 88]. Аднак і ён не абгрунтаваў абраныя пазіцыі. З выказвання С. Карцэўскага вынікае, што дзеясловы нумаруюцца не толькі паводле намінальнай шкалы, але і паводле інтэрвальнай, праўда, апошняя ў нечым адносная. Паспрабуем ніжэй разгледзець, наколькі супадаюць намінацыя класаў і іх парадак.

Узгадніць сістэмы класіфікацыі, нават у межах наследаванняў С. Карцэўскага, няпроста, у адных выпадках класы нумаруюцца рымскімі лічбамі, у другіх – арабскімі, у трэціх – літарамі, у чацвертых – зусім не нумаруюцца. Зрэшты, калі б праблема замыкалася толькі ў гэтым, то намінацыя проста супадала б з парадкам, а ўсе разыходжанні былі б аднаго плану. Аднак прапануюцца розныя сістэмы падпарадкавання, што ў аднаго было класам, у іншага можа стаць падкласам ці групай. Найбольшую складанасць стварае нятоеснасць асацыяцыяў. І яшчэ паўбяды, калі розныя класы рознай прадукцыйнасці злучаюцца ў адзін клас, горш, калі адзін клас разрываецца паміж некалькімі. І ўсё ж мы пастараліся, наколькі гэта мажліва, уніфікаваць розныя сістэмы і прымеркаваць паміж сабою ў выглядзе табліц (1-а; 1-б; 1-в; 2-а; 2-б; 2-в). Рымскія і літарныя абазначэнні былі пераведзеныя ў арабскія, пры нястачы нумарацыі класы былі пранумараваныя ў парадку іх апісання, падкласы пазначаліся літарамі. Калі нумарацыя для прадукцыйных і непрадукцыйных дзеясловаў была скразная, яна захоўвалася.

Ніжэй у табліцах параўноўваюцца класіфікацыі, аказаныя ў наступных выданнях [Карцевский 2004; Виноградов 1972; Исаченко 1960; Сидоров 1945; Кузнецов 1952; Гвоздев 1958; Галкина-Федорук 1957; Ломтев 1956; Жураўскі 1957; *Беларуская граматыка* 1985; Шуба 1987; Кривицкий 1990]. Да параўнання ўзятыя тыя сістэмы класаў, якія так ці інакш наследавалі С. Карцэўскага. Супадзенні даюцца ў табліцах на белым тле, несупадзенні – на шэрым, а нястача таксонаў запаўняецца чорным тлом. Можна заўважыць, ува ўсіх класіфікацыях спачатку ідуць прадукцыйныя дзеясловы, потым – непрадукцыйныя з тэматычным галосным і, у самым канцы, – непрадукцыйныя без тэматычнага галоснага. Кожны з такіх комплексаў мы аддзялілі ў табліцах тоўстай паласой.

Пры параўнанні істотна, што бярэцца за норму, бо ўсё астатняе будзе аўтаматычна разглядацца як адхіленне ад нормы. Для гэтага мы абралі дзве самыя ўплывовыя версіі: В. Вінаградава, якая паўтарала і дапаўняла С. Карцэўскага, і расейскай акадэмічнай граматыкі, якую паўтарыў П. Шуба. З увагі на тое, што мы сістэматызуем менавіта беларускі дзеяслоў, версія ў табліцы пазначаецца як Шубава, хоць ён і не быў яе аўтарам. Паводле намінальнай шкалы важна, які нумар замацаваны за тым ці іншым класам дзеяслова (КД), што дазваляе абняць увесь масіў дзеясловаў (табл. 1-а і 1-б). Паводле інтэрвальнай шкалы неістотна, які нумар замацоўваецца за класам / падкласам, істотная толькі паслядоўнасць у апісанні. Прыкладам, калі два класы перастаўленыя месцамі, то гэта два несупадзенні. Супадзенні паводле інтэрвальнай шкалы (табл. 2-а і 2-б) назіраюцца ў прадукцыйных класах дзеяслова (ПКД) і тых непрадукцыйных класах (НКД), якія паспеў апісаць С. Карцэўскі (табл. 2-в), рэшту няма сэнсу параўноўваць, калі паводле інтэрвальнай шкалы колькасць супадкаў раўняецца нулю.

Як можна бачыць з табл. 1-а і 1-б, нумары класаў В. Вінаградаў наследаваў у С. Карцэўскага, а астатнія больш ці менш паслядоўна іх пераймалі. Пры нумараванні ПКД не адхіляліся ад гэтай традыцыі Уладзімір Сідараў і Аляксандар Гваздзёў. Уплыў В. Вінаградава захоўваўся і значна пазней, А. Крывіцкі, які сістэматызаваў дзеясловы незалежна ад граматычнай нормы, яшчэ ў 1978 г. скарыстаў той жа парадак. Аднак у Пятра Кузняцова, Еўдакіі Галкінай-Федарук, А. Жураўскага і А. Ісачанкі два апошнія класы памяняліся месцамі. Расейская ж акадэмічная граматыка 1952 г., а за ёй і П. Шуба, радыкальна перагледзелі нумарацыю (табл. 1-а і 1-б) і парадак (табл. 2-а і 2-б) ПКД, апынуўшыся ў аўтарытэтнай на адзіноце. Ц. Ломцеў паводле намінальнай шкалы выпадае з агульнага шэрагу, але паводле інтэрвальнай шкалы (табл. 2-а і 2-б) выяўляецца, што ён наследуе парадак В. Вінаградава, хоць першыя два класы і нумаруе згодна з акадэмічнай традыцыяй.

У нумарацыі ПКД намяркоўваюцца дзве лініі: старая, якая ідзе яшчэ ад С. Карцэўскага праз В. Вінаградава, і новая – ад граматыкі 1952 г., у беларускай версіі – ад П. Шубы. Першая дае канвенцыйнае адхіленне (А. Ісачанка і інш.) і індывідуальнае адхіленне (Ц. Ломцеў). Тут нават можна выявіць пэўную логіку, але наяўнасць некалькіх нумарацыяў збівае з тропу і не можа апраўдвацца ніякімі творчымі меркаваннямі.

Пры нумарацыі ж НКД тоеснасць прасочваецца толькі сярод першых чатырох класаў, якія маюць тэматычны галосны, і яшчэ двух, якія маюць характэрныя канчаткі на *-ці* і *-чы*. Прычым калі паводле намінальнай шкалы нумарацыя супадае не часта (гл.: табл. 1-а і 1-б), то паводле інтэрвальнай шкалы супадкаў назіраецца нават больш, чым сярод ПКД

Табліца 2-а. **ПКД паводле інтэрвальнай шкалы адносна В. Вінаградава**

Узоры	**Карцэўскі 1927**	**Вінаградаў 1938/1947**	**Ісачанка 1960**	**Сідараў 1945**	**Кузняцоў 1952**	**Гваздзёў 1958**	**Галкіна-Фед. 1957**	**Ломцеў 1956**	**Жураўскі 1957**	**Шуба 1952/1987**	**Крывіцкі 1978/1990**
чытаць	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1
бялець	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2
гадаваць	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.4	П.3
бяліць	П.4	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.5	П.4
стукнуць	П.5	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.3	П.5

Табліца 2-б. **ПКД паводле інтэрвальнай шкалы адносна граматыкі 1952 г.**

Узоры	**Карцэўскі 1927**	**Вінаградаў 1938/1947**	**Ісачанка 1960**	**Сідараў 1945**	**Кузняцоў 1952**	**Гваздзёў 1958**	**Галкіна-Фед. 1957**	**Ломцеў 1956**	**Жураўскі 1957**	**Шуба 1952/1987**	**Крывіцкі 1978/1990**
чытаць	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1	П.1
бялець	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2	П.2
стукнуць	П.5	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.3	П.5
гадаваць	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.3	П.4	П.3
бяліць	П.4	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.4	П.5	П.5	П.4

Табліца 2-в. **НКД паводле інтэрвальнай шкалы адносна С. Карцэўскага**

Узоры	**Карцэўскі 1927**	**Вінаградаў 1938/1947**	**Ісачанка 1960**	**Сідараў 1945**	**Кузняцоў 1952**	**Гваздзёў 1958**	**Галкіна-Фед. 1957**	**Ломцеў 1956**	**Жураўскі 1957**	**Шуба 1952/1987**	**Крывіцкі 1978/1990**
казаць	Н.1	Н.1	Н.1	Н.1;2;3	Н.1	Н.1	Н.1	Н.5	Н.1	Н.1	Н.1
крычаць	Н.2	Н.2	Н.2	Н.2	Н.14	Н.2	–	Н.6	–	Н.2	Н.3
грымець	Н.3	Н.3	Н.3	Н.3	Н.13	Н.3	–	Н.7	Н.2	Н.3	Н.2
сохнуць	Н.4	Н.4	Н.4	Н.4	Н.6	Н.4	Н.4	Н.8	Н.4	Н.4	~~Н.5~~
несці	Н.5	Н.5	Н.5	Н.5	Н.11	Н.5	–	Н.1	Н.6	Н.5	Н.5
пячы	Н.6	Н.6	Н.6	Н.6	Н.12	Н.6	–	Н.2	Н.7	Н.6	Н.4

(гл.: табл. 2-в). Цікава, што парадак першых шасці НКД супадае і паводле лініі С. Карцэўскага, і паводле акадэмічнай. Адхіленні ад інтэрвальнай шкалы бачым у тых мовазнаўцаў, якія ці адвольна апісвалі класы (П. Кузняцоў, Ц. Ломцеў), ці давалі няпоўную парадыгму (А. Жураўскі, Е. Галкіна-Федарук), ці спрабавалі скараціць колькасць КД (А. Крывіцкі), ці сістэматызавалі паводле сваіх адмысловых крытэраў (У. Сідараў). У. Сідараў хоць і не адхіляецца ад агульнапрынятага парадку (калі не лічыць сумяшчэння ў першым класе розных КД), але сама прыналежнасць яго да парадыгмы С. Карцэўскага – пад пытаннем.

Цяпер, нарэшце, падлічым, колькі ёсць супадкаў у нумарацыі паводле розных шкалаў. Дзеля зручнасці падзелім дзеясловы на тры ўмоўныя катэгорыі, якія, так ці інакш, і надалей будуць мець значэнне: 1) прадукцыйныя, 2) непрадукцыйныя з тэматычным галосным і 3) непрадукцыйныя без тэматычнага галоснага. Паводле намінальнай шкалы з 50 ПКД адносна В. Вінаградава супадае 36 нумароў (72 %), а адносна П. Шубы – 25 нумароў (50 %). З 40 НКД з тэматычным галосным паводле намінальнай шкалы адносна В. Вінаградава супадае 19 нумароў (48 %), адносна П. Шубы – 17 нумароў (43 %). Сярод НКД без тэматычных галосных адносна В. Вінаградава супадае 11 нумароў (9 %), а адносна П. Шубы – усяго толькі 3 нумары (2 %).

Паводле інтэрвальнай шкалы з 50 ПКД адносна В. Вінаградава назіраецца 40 супадкаў (80 %), адносна П. Шубы – 24 супадкі (48 %). З 40 НКД з тэматычным галосным паводле інтэрвальнай шкалы ёсць 19 супадкаў (48 %), а з 20 НКД (на *-ці* і на *-чы*) без тэматычнага галоснага супадае 10 (50 %). Астатнія НКД паводле інтэрвальнай шкалы зусім не супадаюць. Трэба адзначыць, што некаторыя НКД у А. Крывіцкага далучаныя да ПКД.

Нягледзячы на ўвесь разнабой, у класіфікацыі дзеясловаў усё ж прасочваюцца пэўныя заканамернасці. І нават вылучаюцца канстанты. Найперш трэба адзначыць стабільнасць 1-га прадукцыйнага класу на *-аць*, ён аднолькава нумаруецца ўва ўсіх разгледжаных сістэмах, як паводле намінальнай, так і інтэрвальнай шкалы. І гэта заканамерна, ужо хаця б таму, што дзеясловы на *-аць* – самыя прадукцыйныя. Амаль ува ўсіх, з выняткам Ц. Ломцева, паводле намінальнай шкалы, захоўваецца і найменне 3-га прадукцыйнага класу на *-ваць* – хутчэй выпадкова, чым заканамерна. А паводле інтэрвальнай шкалы другое месца (пасля *-аць*) займаюць прадукцыйныя дзеясловы на *-ець*, дзеясловы на *-ваць* трацяць трэцяе месца ў акадэмічнай класіфікацыі. Непрадукцыйныя дзеясловы збольшага паўтараюць той самы кругабег: на *-аць* 1-га скланення, на *-аць* 2-га скланення, потым на *-ець*, і замыкаецца гэты шэраг дзеясловамі на *-нуць* з беглым *-ну-*. НКД без тэматычнага галоснага

зазвычай апісваюцца ў паслядоўнасці: перш – на *-ці*, а потым – на *-чы*. У традыцыі нумаравання ёсць пэўная логіка: чым вышэйшая прадукцыйнасць, тым меншы нумар. Але гэты крытэр вытрымваецца не заўсёды, дый ён занадта павярхоўны, каб на ім грунтавацца.

Сістэме С. Карцэўскага, апрача ўсяго іншага, С. Брамлей прыпісвае яшчэ адну загану: "Улік усіх формаў словазмянення ні ў адной з класіфікацыяў не ажыццяўляецца, і зразумела чаму: гэта зрабіла б і без таго даволі грувасткія класіфікацыі зусім неабсяжнымі" [Бромлей 1965: 71]. Інакш кажучы, паводле С. Брамлей, брак сістэмнасці нібыта выклікаецца неэканомнасцю класіфікацыі. Ці так гэта і ці можна дабіцца эканоміі ў класіфікацыі? А калі можна, то якім спосабам? З кагнітыўнага гледзішча эканомія – важная характарыстыка ўсякай тэорыі, неэканомныя сістэмы горш засвойваюцца. Таму паспрабуем вымераць набыты досвед у лічбах і параўнаем, колькі агрэгацыяў узнікала пры сістэматызацыі дзеяслова ў самых розных аўтараў, асабліва ў такіх знакавых, як А. Вастокаў, А. Шахматаў, Я. Станкевіч, В. Вінаградаў, А. Ісачанка, С. Брамлей і інш.

А. Вастокаў (1831): правільныя і няправільныя дзеясловы, сярод правільных – 2 спражэнні, 10 кшталтаў («различий»), разам з ухіламі («уклонениями») – 24, усяго – **25** [Востоков 1831, 112–117].

Г. Паўскі (1842): 2 раздзелы («разряда»), у 1-м раздзеле – 7 заводаў («пород») першавобразных дзеясловаў, у 2-м – 8 заводаў вытворных дзеясловаў, якія могуць дзяліцца на больш дробныя, усяго – **21** [Павский 2012: 47–50].

А. Шахматаў (1913): 4 класы (у 1-ым класе раздзелы («разряды») А, Б, В) і **21** узор («образец») [Шахматов 1952: 222–225].

Я. Станкевіч (1930): 7 класаў, 18 з падкласамі, і "самагуковыя" дзеясловы, усяго – **19** [Станкевіч 2007: 55–58].

У. Сідараў (1945): 5 прадукцыйных класаў і 7 непрадукцыйных, з улікам груп і ізаляваных дзеясловаў – **20** (з улікам падгруп – 30) [Сидоров 1945, 176–187].

В. Вінаградаў (1947): 5 прадукцыйных класаў і 17 непрадукцыйных, 3 ізаляваныя групы дзеясловаў, усяго – **25** (з падгрупамі – 33) [Виноградов 1972: 352–355, 356–359].

А. Ісачанка (1960): 5 прадукцыйных класаў і 5 непрадукцыйных, 7 груп непрадукцыйных і 5 груп ізаляваных дзеясловаў – усяго **22** (з малымі тыпамі, групамі, падгрупамі, адхіленнямі, няправільнымі і ізаляванымі дзеясловамі – 44) [Исаченко 1960: 40–126].

П. Кузняцоў (1952): 5 прадукцыйных класаў і 14 непрадукцыйных, адна група "па-за спражэннямі" і адна "па-за класамі", усяго – **21** [Кузнецов 1952: 270–283].

П. Шуба (1962): 4 прадукцыйныя класы і 11 непрадукцыйных, усяго, з улікам падкласаў і 4-х груп ізаляваных дзеясловаў, – **22** [Шуба 1987: 203–209].

С. Брамлей (1965): 7 суперкласаў, **24** класы (і 37 падкласаў) [Бромлей 1965: 76–83].

Які б метад сістэматызацыі мы ні абралі, заўсёды (без дробных таксонаў) выходзіць аптымальны лік класаў дзеяслова – ад **20** да **25**. І ў С. Брамлей выйшла не самая эканомная класіфікацыя, а калі зважаць на падкласы, то адна з самых неэканомных. І не дзіва, бо натуральныя класы, разарваныя вонкавым фармальным падзелам, заяўляюць пра сябе па некалькі разоў у штучных агрэгацыях. Лікі класаў, атрыманыя эмпірычна, цікава было б параўнаць тут з досведам аксіяматычнага апісання: "Тэарэтычна магчымы **64** семантычныя класы дзеясловаў" [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967: 6]. А ў беларускай мове, пішуць аўтары, рэалізаваліся толькі **8** класаў гэтай мадэлі [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967: 6]. І з эмпірычнага і аксіяматычнага досведу вынікае: калі мы хочам мець поўную карціну парадыгмы дзеяслова, то патрэбная не "эканомная", а аптымальная сістэма класаў. А эканомія чыста дзеля эканоміі толькі ўскладняе і без таго няпростую рэчаіснасць.

1.4. Класы дзеяслова і семантычнае вымярэнне

Даследаванняў аб семантыцы дзеяслова значна больш, чым аб класах, і колькасць іх штогод расце. Некаторыя з іх нічым паміж сабой не звязаныя, некаторыя, наадварот, занадта стэрэатыпныя. Праблема тэорыяў семантыкі – у адрыве ад формы, ад пэўнай мовы, у прэтэнзіі на ўніверсалізм. Дзеясловам могуць прыпісвацца экстралінгвістычныя катэгорыі, уся ўніверсальнасць якіх часта зводзіцца да таго, што яны ўваходзяць у філасофскі, лагічны ці лінгвістычны наратыў. Але ўсякая спроба вынайсці катэгарыяльны апарат граматыкі па-за граматыкай няўхільна вядзе да эсэнцыялізму і благой бясконцасці ўсё новых і новых тэорыяў. Разгледзім некалькі апісанняў семантыкі дзеяслова, узятых амаль наўздагад.

Гэтак "прынцып дыстрыбуцыйнага аналізу словаўтваральных фармантаў" дзеяслова прапануе цытаваная тут кніга Віктара Мартынава, Паўла Шубы і Мікалая Ярмаша [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967]. У кнізе апрыёры ў якасці канстантнай семантычнай структуры пастулюецца "ядзерная канструкцыя SAO, дзе S – суб'ект дзеяння, A – дзеянне, O – аб'ект дзеяння" [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967: 5]. А ў якасці пераменных даюцца характарыстыкі SAO: "наяўнасць або адсутнасць самога кампанента, наяўнасць або адсутнасць змен у ім" [Мартынаў,

Шуба, Ярмаш 1967: 5]. Аўтары сцвярджаюць: “прыпісваючы кампанентам SAO па дзве характарыстыкі, мы атрымліваем 64 магчымыя камбінацыі гэтых кампанентаў” [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967: 6]. У цэлым мадэль прыгожая і нібыта лагічная. Але, па-першае, дзе гарантыя, што натуральная мова будзе такой лагічнай, што захоча адпавядаць гэтай мадэлі? Па-другое, дзе гарантыя, што мадэль не выпускае з-пад увагі нешта куды больш істотнае для натуральнай мовы? І, нарэшце, па-трэцяе, дзе гарантыя, што накладанне гэтай аксіяматычнай мадэлі на натуральную мову не прывядзе да такой класіфікацыі дзеясловаў, якая пераразмяркуе рэальныя класы па іншых катэгорыях? Апошняе, дарэчы, і здарылася.

Яшчэ больш пытанняў выклікае тое “абагульненне” класаў дзеяслова, якое прапанавалі аўтары [Мартынаў, Шуба, Ярмаш 1967: 9]. На якіх падставах можна злучыць два розныя дзеясловы на *-аць* (*пісаць* і *галадаць*) з яшчэ больш адрозным ад іх на *-аваць* (*дэталізаваць*) у адзін клас? Або дзеясловы на *-іць* (*цямніць*) – з двума зусім рознымі дзеясловамі на *-нуць* (*кіснуць* і *свіснуць*)? І адначасна адарваць ад дзеясловаў на *-аць* дзеясловы на *-ваць* (*нараскручваць*), якія адносяцца да аднаго класу? Калі можна такое, тады можна ўсё, тады ніякіх класаў не існуе. Між іншым, калі ўжо злучаць, то шмат супольнага ёсць паміж дзеясловамі на *-іць* і дзеясловамі на *-аваць*. Але, здаецца, аўтараў больш цікавіла фанетычнае падабенства суфіксаў, чым іх семантыка. Дзіўна, што гэтая мадэль зусім не лічыцца з той сістэмай “марфалагічных” класаў, якую апісваў адзін з аўтараў кнігі [Шуба 1968].

Георгій Сільніцкі прапанаваў аналітычны падыход (“ад часткі да цэлага”) да даследавання семантыкі дзеяслова, заснаваны на вылучэнні “працэсуальнага рэферэнта”, які дзеліцца на “фазавыя” кампаненты, дзе належыць адрозніваць “рэлевантныя семантычныя адзнакі ад нерэлевантных” [Сильницкий 1986: 3–4]. Прапанаваная “семантычная мадэль мае двухроўневую іерархічную структуру”, першы ровень – дэнататыўны, другі – сігніфікатыўны, апошні ў дачыненні да першага выступае “ў ролі пэўнага кшталту «метазначэння»”, а апісаная мадэль уяўляецца аўтарам як трохроўневая сістэма, калі ўлічваць і “выточны ровень аб’ектыўных рэферэнтаў” [Сильницкий 1986: 4]. “З гэтага гледзішча ўсякае дзеяслоўнае значэнне змяшчае або адзін стан (простае дзеяслоўнае значэнне), або некалькі станаў, злучаных паміж сабой хронаструктурнымі (тэмпаральнымі) дачыненнямі (складанае дзеяслоўнае значэнне)” [Сильницкий 1986: 6–7]. Станы дзеляцца на статычныя і дынамічныя, а далей дынамічны стан дзеліцца яшчэ на тры станы “градуальныя”, якія адрозніваюцца паслядоўным узмацненнем ці паслабленнем, на “ітэратыўныя”, якія “імплікуюць серыю паўтораў”, і “флуктуатыўныя”, якія “характарызуюцца найменшай семантычнай аднароднасцю” [Сильницкий 1986:

7–9]. Апошні стан, між іншым, – прыклад чарговага “лінгвістычнага сметніка”, куды спісваецца ўсё тое, што “не можа быць эксплікавана хоць неяк адназначна” [Сильницкий 1986: 8].

Аўтар семантычнай тэорыі ўрэшце падагульняе: “Статычныя станы характарызуюцца найбольшай адпаведнасцю дэнататыўнага значэння сігніфікатыўнаму, флуктуатыўныя – яго найбольшай адпаведнасцю працэсуальнаму рэферэнту”, “варыяцыйныя станы (градуальныя і ітэратыўныя)” – прамежкавыя [Сильницкий 1986: 8]. На аснове прапанаванай вышэй камбінаторыкі вылучаюцца “кантынуальныя” і “стацыянарныя” станы, “паводле набору актантаў і паводле тыпу лучнасці паміж станамі” складаныя дзеяслоўныя значэнні дзеляцца на “каўзатывы” і “працэсівы” [Сильницкий 1986: 10]. Несправядліва казаць, што гэтая мадэль не апісвае дзеяслоў, але наколькі яна ўніверсальная – асобнае пытанне. Абедзве аказаныя тут семантычныя мадэлі больш нагадваюць інструкцыі па ўкладанні граматыкі штучнай мовы, чым інструмент для вывучэння семантыкі дзеясловаў натуральнай мовы.

Тым часам на чарзе новая альтэрнатыўная тэорыя семантыкі. Алена Гарбова ў семантыцы дзеяслова вылучае такі ракурс, які атрымвае ў яе назву “характар дзеяслоўнага дзеяння” [Горбова 1999]. “Выточным пунктам паслужыла класіфікацыя дзеясловаў, распрацаваная З. Вендлерам на матэрыяле ангельскай мовы” [Горбова 1999: 2]. “Мяркуецца, што класіфікацыя характараў дзеяння, у адрозненне ад груповак спосабаў дзеяння, павінна мець універсальны характар” [Горбова 1999: 1]. Пры гэтым аўтарка тут жа прызнаецца, “што на матэрыяле расейскіх і гішпанскіх дзеясловаў вендлераўская класіфікацыя «не працуе» без даволі істотнай яе трансфармацыі” [Горбова 1999: 2]. Тым самым ставіцца пад сумнеў яе ўніверсальнасць. Пад характарам дзеяслоўнага дзеяння разумеюцца “аспектуальна-семантычныя класы дзеяслова” [Горбова 1999: 1]. Для вылучэння іх ужываюцца наступныя працэдуры: 1) “праверка дзеяслова на мажлівасць яго ўжывання ў прагрэсіве”, а таксама – 2) “на спалучальнасць дзеяслова з інклюзіўнымі акалічнасцямі часу” і, урэшце, 3) “стаўлянне дзеясловаў розных характараў дзеяння ў форму аорыста” [Горбова 1999: 2]. У межах тэорыі вылучаюцца класы: “агентыў”, “статыў”, “маментатыў”, “тэрмінатыў” і “інгрэсіў” [Горбова 1999: 3]. Не сказаць, што падобных катэгорыяў няма ў дзеяслове, але незразумела, як іх сістэма суадносіцца з падобнай да яе сістэмай Г. Сільніцкага і менш падобнай да абедзвюх сістэмай В. Мартынава, П. Шубы і М. Ярмаша.

Мы апісалі тры тэорыі семантыкі дзеяслова, якія практыкуюць розныя працэдуры аналізу і розныя сістэмы катэгорыяў. Пры гэтым усе прэтэндуюць на ўніверсальнасць. Можна заўважыць, семантычныя

класы, у адрозненне ад фармальных класаў, амаль не маюць пунктаў перасячэння, калі не лічыць некаторых супольных тэрмінаў, такіх як "статыў". І калі ўсе тры тэорыі слушныя, то для іх мусіць існаваць адзіная метатэорыя, калі ж не, то трэба шукаць слушную ці пусціцца ў чыстую эмпірыку. І тут варта заўважыць, што *характар дзеяслоўнага дзеяння* – гэта, фактычна, адгалінаванне *сістэмы спосабаў дзеяння*, якой толькі што было адмоўлена ў універсальнасці і якая, аднак, за апошнія дзесяцігоддзі стала перспектыўнай галіной семантычных даследаванняў, успомнім яе перадгісторыю.

У 1908 г. шведскі славіст Сігурд Агрэль, характарызуючы польскі дзеяслоў, упершыню ўвёў панятак *aktionsart* – *спосаб дзеяння* [Агрель 1962], які па-расейску часам перадаюць як *совершаемость* [Исаченко 1960: 209]. Беларуская мова дазваляе ўжыць больш эканомны тэрмін – ***чын*** (параўнайма: *чыніць, чыннасць, якім чынам = якім спосабам*). Прапанаваны тэрмін гарманічна ўпісваецца ў шэраг іншых тэрмінаў для характарыстыкі дзеяслова – *стан*, *лад*. Не будзем высвятляць статусу гэтага панятку ў граматыцы, зазначым толькі, чын (ці спосаб дзеяння) адносіцца да сферы аспекталогіі. Як доўгі час класы блыталі з спражэннямі, так чы́ны блыталі з трываннямі. Яшчэ да з'яўлення тэрміна *aktionsart* чыны («подвиды») звярталі на сябе ўвагу лінгвістаў [Ульяновъ 1895; Фортунатовъ 1899; Шахматов 1941: 472–476; Маслов 1948; Маслов 1958], актыўна ж спосабы дзеяння сталі распрацоўвацца з 1960-х гг. [Исаченко 1960: 209–344; Маслов 1962; Холодович 1963: 3–11; Бондарко, Буланин 1967: 14–29]. За апошнія дзесяцігоддзі ўзнікла нямала даследаванняў на тэму аспекту і дыятэзы [Авилова 1976; Шелякин 1983; Маслов 1984; *Теория функциональной грамматики* 1987; Шелякин 2001; Падучева 2004; Князев 2007: 258–581; Palosi 2013; Горбова 2017].

Спосабы дзеяння – з'ява дзеяслоўнай семантыкі. Іх вывучэнне не зводзіцца да той ці іншай тэорыі, гэта сфера эмпірыкі дзеяслова. Аднак усё, што трапляе ў поле зроку распрацовак спосабаў дзеяння, адносіцца ў асноўным да прыставак. Суфіксацыя застаецца па-за ўвагай функцыянальнай граматыкі, якая займаецца чынамі дзеяслова. Вынятак складаюць толькі некалькі класаў: мультыплікатыўныя (на *-аць*), ітэратыўныя (на *-ваць*) і маментатыўныя (на *-нуць*). Усе яны адносяцца да самых прадукцыйных класаў, а з усяго шэрагу класаў толькі іх можна аднесці не да слова-, а да формаўтварэння. Праўда, і суфіксы, і прыстаўкі для функцыянальнай граматыкі не ёсць пунктам адліку, семантычныя агрэгацыі могуць азначацца самымі рознымі марфемамі і нават зусім без марфем. І ўсё ж, сканцэнтраванасць на прыстаўках не можа не кідацца ў вочы. Не можа не кідацца ў вочы і перасячэнне класаў з чынамі.

На дадзены момант у мовазнаўстве склалася парадаксальная сітуацыя: з аднаго боку – класы дзеяслова, з другога боку – чыны дзеяслова. Класы з кожным разам усё больш фармалізуюцца, чыны вывучаюцца ў адрыве ад формы. Класы маюць у аснове суфіксы, чыны разгортваюцца вакол прыставак і некалькіх суфіксаў, істотных і для класаў. Класы апісвае традыцыйная граматыка, а чыны даследуе функцыянальная. У класах выкарыстоўваецца лічбавая намінацыя, у чынах – слоўная. Класы імкнуцца да эканоміі, хоць і беспаспяхова, а колькасць чынаў штораз расце, і гэта зусім не бянтэжыць мовазнаўцаў, а ў нечым нават цешыць. Класы трываюць у межах славістыкі, чыны прэтэндуюць стаць універсаліямі. Дык ці не ёсць гэта два бакі аднаго медаля, і таму кожны з іх няпоўны? Якраз непаўната, аднабаковасць падыходаў і завяла класіфікацыю дзеясловаў у фармалістычны тупік, а чыны, наадварот, кінула ў благую бясконцасць эмпірычных апісанняў ды памнажэння тэарэтычных эсэнцыяў.

У звязку з усім гэтым парадоксам хацелася б прытачыць дзве прынцыпова важныя заўвагі, узніклыя пры вытоках даных наратываў. С. Карцэўскі, назваўшы класы дзеясловаў "семантычнымі", зрабіў прызнанне: "Мы мусілі адмовіцца ад нашага намеру сістэматычна вывучаць дзеяслоўныя прыстаўкі з пункту гледжання іх семантычнага значэння" [Карцевский 2004: 67]. А. Ісачанка ж, характарызуючы раннія работы Юрыя Маслава, якія закладалі падмурак функцыянальнай граматыкі, заўважыў: "Найбольш спрэчная ў гэтым азначэнні адмова аўтара ад вонкавых (фармальных) паказнікаў «спосабу дзеяння»" [Исаченко 1960: 216]. Такім парадкам, С. Карцэўскі разумеў, што класы дзеяслова і суфіксацыя – гэта толькі першая прыступка ў даследаванні семантыкі, наступным крокам мусяць стаць прыстаўкі, а пачынаць з прыставак, не вывучыўшы суфіксаў, – гэта значыць будаваць дом з даху. А. Ісачанка, сваім парадкам, усведамляў небяспеку разыходжання граматычнай семантыкі з фармальнымі сродкамі яе выражэння, што прывядзе да экстрапаляцыі на граматыку прадметных значэнняў ці нашых суб'ектыўных уяўленняў.

Абедзве гэтыя заўвагі мы пастараемся тут улічыць, чым і мае адрозніваць наш падыход ад тых, якія мы крытычна прааналізавалі, але без якіх не было б і гэтага даследавання. Граматыка ў кожнай мове адна [Пацюпа 2013: 100–102], а "традыцыйная" ці "функцыянальная", "тэарэтычная" ці "практычная", урэшце, "акадэмічная" ці "школьная" – неістотна, гэта толькі спосабы яе выканання.

2.1. Сістэма класаў і катэгарыяльны апарат

Першым крокам на шляху трансфармацыі сістэмы С. Карцэўскага павінен стаць адыход ад лічбавай і пераход да слоўнай намінацыі, якая б характарызавала ўласцівасці класаў дзеясловаў. На справе гэта не так проста зрабіць, бо знайсці патрэбны тэрмін, здольны абняць усе ўласцівасці аб'екта, асабліва, калі той супярэчлівы, можна толькі пасля ўсебаковага вывучэння. Дый некаторыя патэнцыйныя тэрміны "захопленыя" функцыянальнай граматыкай. На сённяшнім этапе нам бачыцца перспектыўным сустрэчны рух традыцыйнай і функцыянальнай граматык, набліжэнне класаў дзеяслова да сістэмы спосабаў дзеяння. Урэшце, прынцып функцыянальнай граматыкі "ад зместу да формы" не павінен быць голай дэкларацыяй, да формы трэба ўсё ж некалі дайсці. Вядома, змена асноў намінацыі класаў не можа не выклікаць частковага перагляду і ўдакладнення сістэмы класаў і чынаў.

Каб аб'ект аналізу і кола звязаных з ім праблем не ўяўляліся цьмянымі і надуманымі, варта ўвесці чытача ў тэму. Кажучы словамі І. Канта, перш чым аналізаваць дзеясловы, трэба ўяўляць іх сінтэтычна – зрабіць прэвентыўны цэласны агляд класаў дзеяслова, як і рабілі многія класіфікатары. Спосаб не самы зручны і не самы эканомны, але апрабаваны. Ужо чыста эмпірычнае знаёмства з дзеясловамі выяўляе некаторыя заканамернасці, мы не можам не звяртаць на іх увагі, але не можам і растлумачыць. Скажам, што значыць наступная карэляцыя: *піць – паіць, гніць – гнаіць, ссаць – саіць*? Ці ёсць тут нейкі закон, а калі ёсць, то чаму мала падобных пар? Значэнне тэматычнага галоснага ў карэляцыях: *бялець – бяліць, галець – галіць, касець – касіць* – відавочнае, але наколькі паслядоўна яно абумоўліваецца формаю дзеяслова, мы не ведаем. У чым розніца паміж дзеясловамі *рубаць* і *рубіць*, *ламаць* і *ламіць*, *гібаць* і *гнуць*, *раўнаць* і *раўняць*, а побач – *раўнаваць*? Які вынік аманіміі і паранімііі каранёў: *гадаць – гадзіць – га́дзіць* і *гадаваць*? Урэшце, якая логіка ў тым, што ў беларускай мове норма – *танцаваць* і *лячыць*, а узус час ад часу выдае адваротнае: *танчыць* і *лекаваць*? Усе даныя апазіцыі – фармальныя, але нельга не бачыць у іх семантычных адрозненняў.

Семантыка класаў дзеяслова рэалізуецца ў сферах аспекту і дыятэзы. Першая ахапляе працэсуальна-часавыя дачыненні, другая – суб'ект-аб'ектныя. Аспект у вузкім значэнні – трыванне, у шырокім – сістэма чынаў. Дыятэза – гэта дачыненні актантаў, у цэнтры ўвагі стан дзеяслова і звязаная з ім пераходнасць. Але стан і пераходнасць не перадаюць усіх зменаў дыятэзы, варта ўвесці яшчэ адну катэгорыю, якая б паказвала кірунак дзеяння адносна суб'екта, удакладняючы пераходнасць і не

зводзячыся да яе. У актыўных і эргатыўных мовах падобная катэгорыя вядомая як *версія* [гл.: Тестелец 1990], праўда, там версія характарызуе змены дыятэзы, звязаныя з ускосным, а не беспасярэднім дапаўненнем. З іншага боку, у індаеўрапейскіх мовах, пачынаючы з антычнасці, раз за разам узнікала праблема сярэдняга стану – медыуму [*Античные*… 1936: 126–128]. Медыум то дапаўняўся станамі "сярэднім", "агульным", "адкладальным", то адмаўляўся як такі ў прынцыпе, але так і не дасягнуў яснага разумення. Якраз у ім і хавалася інтуіцыя тых уласцівасцяў дзеяслова, якія не ўкладваюцца ў стан і раскрываюцца ў асобнай катэгорыі. Катэгорыя *версіі* (а можна выкарыстаць у якасці тэрміну і беларускае слова ***згіб***) дазваляе абняць паняткі *пераходнасці / непераходнасці* і дапоўніць іх тым, што выпадае з-пад вока.

С. Карцэўскі лічыў катэгорыю стану "самай заблытанай", якая "змяшчае насамрэч дзве розныя сістэмы дачыненняў": пераходнасці і непераходнасці, аб'екта і дзеяча [Карцевский 2004: 107]. Бінарызм катэгорыі стану (актыў / пасіў), шлях да якога быў пакручасты і супярэчлівы [Мучник 1971: 11–45], хоць і апраўданы, але не ахапляе ўсе дзеясловы. З аднаго боку, трэба адрозніваць прыватныя значэнні зваротных дзеясловаў ад зваротнасці ў цэлым, каб не парушаць іерархіі. З іншага боку, у дачыненні актыву і пасіву не варта замешваць тыя дзеясловы, якія ляжаць па-за гэтай апазіцыяй. Тое, што мы тут назвалі версіяй, не зводзіцца ні да актыву / пасіву, ні да зваротнасці / незваротнасці, ні да транзітыўнасці / інтранзітыўнасці. Было б не рацыянальна адпрэчваць ідэю версіі і, рэанімаваўшы разгалінаваную сістэму станаў: "сярэдняга", "агульнага", "адкладальнага" і г. д., яны толькі зацямнялі б існасць праблемы. Не будзе тут выйсцем і дуалізм С. Карцэўскага, бо праблема пераходнасці, стану і дачыненняў суб'екта і аб'екта – гэта ўсё ж адна сфера. Версія праясняе якраз тое, што было недыферэцыявана ў загадкавым медыуме, і паказвае, як яно лучыцца з актывам і пасівам.

Семантыку дзеяслова можна ўявіць у выглядзе канструктару катэгорыяў: трыванняў і станаў, пераходнасці і непераходнасці, а таксама прапанаваных версіяў: а д ц э н т р о в а й, д а ц э н т р о в а й і н е й т р а л ь н а й, якія на дзіва канкрэтна праяўляюцца ў розных класах, асабліва ў непрадукцыйных, нібыта "мёртвых", што насамрэч не адпавядае запраўднасці.

Прадукцыйнасць як характарыстыка класаў дзеяслова, пэўна ж, мае значэнне, але не такое вялікае, як лічылі дагэтуль. Па-першае, гэта катэгорыя не граматычная, а статыстычная – колькі дзеясловаў мусіць налічваць клас, каб лічыцца прадукцыйным? Хто і на падставе чаго гэты лік вызначае? Па-другое, называючы клас прадукцыйным, мы не

бяром да ўвагі тое, што самы прадукцыйны 1-ы клас на *-аць, -яць, -ваць* (мультыплікатывы і ітэратывы) і 2-і (ці 5-ы) прадукцыйны на *-нуць* (маментывы) адносяцца да формаўтварэння, а астатнія класы – словаўтваральныя (якая б ні была расплывістая мяжа паміж тым і другім). Формам наканавана быць "прадукцыйнымі", а самастойных слоў з тым ці іншым значэннем (колькі б мы іх ні маглі ўтварыць) патрабуецца аптымальная колькасць, не больш і не менш. Па-трэцяе, у прадукцыйных класах ёсць непрадукцыйныя групы, на што звярталі ўвагу С. Карцэўскі і ягоныя наступнікі. Таму прадукцыйнасць як панятак трэба вынесці па-за межы характарыстык класа і стасаваць да больш дробных груп. Нас больш цікавіць маркіраванасць / немаркіраванасць дзеясловаў і семантыка маркераў.

Маркерамі класаў (праўда, у першым набліжэнні) насамрэч ёсць тэматычныя галосныя, якія атрымалі не зусім слушнае найменне, функцыя іх не фармальная, а семантычная. Калі глянуць на структуру марфем не надта строга, то можна заўважыць: у іменных фармантах маюць значэнне зычныя фанемы, а дзеяслоўнасць перадаецца амаль цалкам праз галосныя. "Зычныя" і "галосныя" суфіксы – як зямля і вада ў метафізічных сістэмах, адны – жорсткія, другія – плыўкія. Тэматычныя галосныя могуць і змяняцца, і пры формазмяненні зусім знікаць, але іх цякучасць мае заканамернасці, якія таксама служаць для адрознення марфем. Гэтая цякучасць і не бралася ў разлік у ранніх класіфікацыях дзеяслова. Тэматычны галосны інфінітыва – перадае адзін з некалькіх патэнцыйных суфіксаў, у залежнасці ад варыянтаў трансфармацыі. Пасля, у аддзеяслоўных імёнах, тэматычныя галосныя трываюць як знак інкарпараванай у іх дзеяслоўнасці.

Дзеясловы, якія маюць тэматычны галосны, – маркіраваныя, незалежна ад прадукцыйнасці, якія не маюць тэматычнага галоснага – немаркіраваныя. Таму першыя, згодна з іх маркерамі, могуць быць ахарактарызаваныя і названыя, другія не могуць характарызавацца ў прынцыпе, хоць гэта зусім не значыць, што яны не імплікуюць пэўнага набору катэгорыяў. Дзеясловы з тэматычным галосным таксама не заўсёды могуць інтэрпрэтавацца адназначна. Найбольшую праблему сярод апошніх стварае самы шматлікі 1-ы клас (на *-аць, -яць, -ваць*) і, у меншай меры, – 4-ы (на *-іць*), яны занадта аб'ёмныя, каб упісацца ў адзіную формулу, гэта нават не зусім класы, а кангламераты таксонаў рознага ўзросту, значэння і статусу. У немаркіраваных дзеясловах праблемы стварае сінанімія формаў, а ў прадукцыйных – аманімія, якая вядзе да іх нейтралізацыі.

Табліца 3. **Класы і падкласы дзеясловаў**

Класы	Падкласы	Прыклады	Т.	А.	V.
афарматыўныя	–//–	*даць, стаць, грэць, гніць, піць, жаць, няць, калоць, церці, везці, сапці, грэбці, пячы, легчы*	+/–	I. (P.)	↔
медыятыўныя I	–//– (*para-* –//–)	*казаць, пісаць, сеяць, рэзаць, араць, баяць, ткаць, лгаць*	+/–	I.	→ (←)
	іміта-тыўна-інтэ-нсіўныя	*лапатаць, грукатаць, шаптаць, екатаць*	–	I.	↑
статыўныя	–//– (*anti-* –//–)	*віснуць, мокнуць, гаснуць, пахнуць, смагнуць*	–	I.	←
ілюмінатыўныя	–//– (*quasi-* –//–)	*спаць, ляжаць, гнаць, гучаць; вісець, ляцець, шумець, глядзець*	±	I. (P.)	↑
	іміта-тыўна-акцэле-ратыўныя	*лапацець, грукацець, шапацець, мігацець*	–	I.	↑
фактытыўныя	–//– (*para-* –//–)	*рабіць, вазіць, гнаіць, ставіць, лажыць, рубіць, лячыць, лжыць, гадзіць, стрэліць, грабіць*	+	I. (P.)	→
	транслятыў-ныя	*бяліць, вузіць, дубіць, касіць, раўніць, п'яніць*	+	I.	→
	(*quo-* –//–)	*віхрыць, галасіць; гаспадарыць,*	–	I.	↑
трансфарматыў-ныя	–//–	*бялець, вузець, дубець, касець, раўнець, п'янець*	–	I.	←
медыятыўныя II	мультатыўныя	*імаць, кідаць, чытаць, рубаць, раўнаць; ганяць, раўняць, стаўляць, страляць*	+/–	I.	→ ←
	(*post-*)ітэра-тыўныя	*чуваць; бываць; даваць*	+/–	I.	→ ←

Класы	Падкласы	Прыклады	Т.	А.	V.
	іміта-тыўна-рэтар-датыўныя	*лопаць, грукаць, сыкаць, гукаць, выкаць, грабаць, драпаць, лётаць*	–	I.	←
маментыўныя	дырэктыўныя	*гнуць, цягнуць, пнуць, тануць*	+/–	I.	→
	–//–	*кінуць, стануць, рубнуць, лопнуць, гукнуць, смагнуць, грабнуць, драпнуць, стрэльнуць*	+/–	P.	→ ←
	гіпермаментыўныя	*кідануць, рубануць, стралянуць, грабануць, пекануць, драпануць, шапянуць*	+/–	P.	→ ←
практытыўныя	–//–	*злаваць, каваць; гадаваць, кіраваць, раўнаваць, лекаваць, гаспадараваць, галасаваць, вешчаваць*	+/–	I. / P.	→ ←

Таксаномія дзеяслова мае некалькі вымярэнняў, таму падача яе ў адной плашчыні, вядзе да супярэчнасцяў, а звядзенне сістэмы да аднаго прынцыпу дзеля зняцця супярэчнасцяў робіць класіфікацыю бессэнсоўнай. У агульнай масе дзеясловаў варта адрозніваць к л а с ы, п а д к л а с ы і г р у п ы, а таксама больш абагульненыя ўтварэнні – я р у с ы, т ы п ы і к л а с т а р ы.

Асноўная таксанамічная адзінка дзеяслова – клас, ён становіць сабой фармальна-семантычны таксон. Клас апраўдвае сабой сам факт існавання фармальнай дыферэнцыяцыі дзеясловаў, перакідае масток ад вонкавых праяў да нутраных уласцівасцяў. Далей у межах класаў вылучаюцца падкласы, яны адрозніваюцца не толькі тым, што клас абымае іх прыватныя адрозненні, але і больш размытымі граніцамі. Падкласы могуць мець суфіксальныя, акцэнтныя ці катэгарыяльныя адрозненні, але збольшага ўпісваюцца ў межы класа. Групы таксама вылучаюцца ў межах класаў, але адрозніваюцца ад падкласаў не як больш дробныя, а як чыста фармальныя таксоны. Адным словам, калі класы абавязкова маюць і фармальныя, і семантычныя адрозненні, падкласы могуць зводзіцца да семантычных, то размаітасць груп зусім

не карэлюецца з семантыкай. Класы і падкласы ёсць сэнс менаваць на падставе іх семантыкі, а групы, наадварот, лепш толькі нумараваць і не ставіць у адзін лагічны шэраг з класамі і падкласамі.

Пад ярусамі мы разумеем стадыяльныя адрозненні класаў – паследкі іх гістарычнага станаўлення, вылучэнне ярусаў не канечнае для разумення класаў. Тыпы абагульняюць семантычныя ўласцівасці класаў, з'яўляючы сабой іх квінтэсэнцыю. І, нарэшце, розныя класы і падкласы могуць аб'ядноўвацца ў кластары на падставе карэляцыі іх семантыкі.

У табл. 3 падаецца асноўная інфармацыя пра класы дзеяслова. Класаў усяго дзевяць, парадак размяшчэння не мае прынцыповага значэння, але ён і не зусім выпадковы: верхні радок займае архаічны клас (першы ярус), а апошні – найноўшы клас (трэці ярус), астатнія (другі ярус) размяшчаюцца ці паводле храналагічнага прынцыпу, ці з улікам іх карэляцыі. У першых калонках даюцца найменні класаў і падкласаў. У сярэдняй – прыклады, значная іх частка – аднакаранёвыя, каб можна было назіраць, як прыналежнасць да класу мяняе значэнне дзеяслова. У трох апошніх калонках раскрываецца семантыка класаў – катэгарыяльны канструктар, пра які ішлося вышэй. Пад скаротам «Т.» (транзітыўнасць) знакам «+» пазначаюцца пераходныя дзеясловы, знакам «–» – непераходныя. Пад скаротам «А.» (aspectus) – літарай «Р.» (perfectum) – дакончанае трыванне, а літарай «І.» (imperfectum) – недакончанае. Пад «V.» (versio) – стрэлкай, скіраванай управа (→), пазначаецца адцэнтровая (або адцэнтрова-аб'ектная) версія, стрэлкай скіраванай улева (←) – дацэнтровая (або суб'ектная) версія, уверх (↑) – нейтральная (або адцэнтрова-безаб'ектная) версія, а ўправа-ўлева – (↔) – дзеясловы, якія здольныя мяняць версію. На змесце катэгорыяў падрабязней спынімся ў працэсе далейшага знаёмства з класамі.

Традыцыйна і само апісанне, і нумарацыю класаў пачынаюць з "прадукцыйных", "правільных" ці "стандартных" дзеясловаў, але гэта зручна толькі пры павярхоўным падыходзе, калі не звяртаць увагі на семантыку і сістэмныя лучнасці. Каб зразумець семантыку і сістэмныя дачыненні класаў, іх варта разгортваць ад больш архаічных з'яў да больш новых, нават калі пільнуешся сінхраніі. Дыяхранія, хочам мы таго ці не хочам, настойліва напамінае пра сябе, хай сабе і ў "знятым", трансфармаваным выглядзе. Аднак і архаічныя дзеясловы, форма якіх цалкам страціла матывацыю, не спяшаюць раскрываць свае глыбока схаваныя ўласцівасці. Пра іх мы так мала ведаем, што нават такія выдатныя лінгвісты як С. Карцэўскі і В. Вінаградаў нічога не жадалі бачыць у даўнейшых дзеясловах апрача хаосу формаў ці, як яны пісалі, "граматычнага пылу" [гл.: Виноградов 1972: 359; Карцевский 2004: 100]. А найноўшыя прадукцыйныя дзеясловы занадта нейтральныя, каб быць

узорамі значальнасці формы. Таму апісанне ўсё ж зручней пачынаць "з сярэдзіны", з тых класаў, якія становяць тыпалагічна чыстыя ўзоры, дарма што такі прыём можа падацца нелагічным.

Асабліва пільна і сур'ёзна трэба ставіцца да выбару найменняў класаў і падкласаў. З аднаго боку, трэба ўлічваць ужо вядомыя назвы чынаў, прынамсі, калі яны адпавядаюць уласцівасцям класа, іначай мы рызыкуем быць незразуметымі. З іншага боку, непажадана ўжываць старыя найменні ў новым значэнні, калі чыны не супадаюць з класамі. Трэба ўхіляцца і ад чыста ўмоўных найменняў, называць рэчы "сваімі імёнамі", бо іначай слоўная намінацыя не будзе мець перавагі над лічбавай. І класы, і найменні, аказаныя ў табліцы, не роўныя: найменш адпавядаюць панятку класа як цэласнага аб'екта а ф а р м а т ы ў н ы я дзеясловы, крыху ўмоўнае найменне маюць м е д ы я т ы ў н ы я - І. І вынікае гэта не з непрадуманасці нашай сістэмы, а з складанасці і супярэчлівасці аб'екта. Прызнаць жа праект класіфікацыі ўтапічным, калі ёсць такія яскравыя класы (і з боку формы, і з боку семантыкі), як с т а т ы ў н ы я, і л ю м і н а т ы ў н ы я, т р а н с ф а р м а т ы ў н ы я і м а м е н т ы ў н ы я, значыла б ігнараваць факты. У працэсе апісання нам не раз давядзецца сутыкацца з праблемай умеркавання лагічных шэрагаў, бо семантыка адных таксонаў чыста граматычная, а другіх (кластар імітатыўных дзеясловаў) – больш натуралістычная.

2.2. Статыўныя дзеясловы

Статыўнымі мы называем дзеясловы з беглым суфіксам ***-ну-***, якія абазначаюць стан ці пераход у іншы стан як нутраное дзеянне, скіраванае на суб'ект. Гэта ці не сама кампактны і рэльефны таксон, які можа служыць узорам класу як такога. Апрача таго, статыўныя дзеясловы – архаічныя, і зварот да іх на пачатку выкладу адпавядае логіцы гістарычнага станаўлення класаў. Аднак гэта самы нетыповы клас, калі можна так сказаць, – самы "недзеяслоўны". Што да самога тэрміна *статыўныя дзеясловы*, то ён запазычаны з моў актыўнага ладу [гл.: Климов 2009], дзе статыў, проціпастаўлены актыву, займае значна большае месца, чым у мовах намінатыўнага ладу.

У даследаваннях аб спосабах і характары дзеяння статыўныя дзеясловы таксама вылучаюцца – ужо як універсалія. Аднак не трэба забывацца: "За вонкава падобным тэрміналагічным апаратам гэтых даследаванняў нярэдка хаваецца істотна адрозная сістэма паняткаў" [Климов 2009: 52]. І тыя дзеясловы, якія мы тут называем статыўнымі, не заўсёды супадаюць з універсалісцкімі ўяўленнямі пра статыў, скажам, да названага класу адносяцца дзеясловы *мокнуць*, *пáхнуць*. Але сюды

ніяк не стасуюцца ні *сядзець*, ні *стаяць*, ні нават *спаць*, якія найчасцей падаюцца як прыклады статыўных дзеясловаў. Далей мы ўпэўнімся, што гэта невыпадкова. Варта падкрэсліць, статыўнасць – не значыць нязменнасць, дзеянне адбываецца “ўнутры” суб’екта, гэта “стан, які працякае ў часе”, “ці паступовы пераход у нейкі стан” [Исаченко 1960: 81], “паступовае ўзмацненне нейкага стану” [Виноградов 1972: 349]. А. Ісачанка ў гэтых дзеясловах адзначае і “«мутатыўнае» значэнне” [Исаченко 1960: 81]. І гэта слушна, але яно не заўсёды ім уласцівае (пар. *пахнуць*) і, галоўнае, не ўтрымвае градуальнасці, уласцівай класу трансфарматыўных дзеясловаў, больш новых, але семантычна блізкіх да статыўных. Адрозненне добра відаць, калі параўнаць дэрываты *пасохнуць* – ад статыўнага і *пасушэць* – ад трансфарматыўнага.

З боку формы статывы розняцца ад астатніх класаў на *-нуць* тым, што маюць націск на корані і ніколі – на суфіксе, зазвычай – на першым складзе (калі двухскладовыя). Найяскравейшая іх рыса – чаргаванне ***-ну- / Ø***, у прошлым часе суфікс ***-ну-*** страчваецца: *мокнуць – мокла, тухнуць – тухла*. З семантычнага боку яны адметныя не ў меншай меры: усе непрэфіксаваныя статыўныя дзеясловы маюць недакончанае трыванне, і ўсе яны – непераходныя з д а ц э н т р о в а й версіяй, сінанімічнай пасіву. Інакш кажучы, суб’ект скіроўвае дзеянне на сябе, а каб такую скіраванасць дзеяння абазначыць, не патрабуецца постфікс *-ся*, які далучаюць актыўныя дзеясловы пры змене версіі. Асноўныя характарыстыкі данага класу вядомыя здаўна [гл.: Павский 2012: 39, 44; Карцевский 2004: 97; Виноградов 1972: 349; Исаченко 1960: 84–85], але пры гэтым не ўлічвалася іх версія, і дэрывацыйная валентнасць, абумоўленая версіяй, была незразумелая. А якраз у гэтай сферы і выяўляюцца ўласцівасці, якія рэзка вылучаюць статыўныя дзеясловы сярод астатніх класаў.

У левых табл. 4-а і 4-б[1] паказваецца граматычная парадыгма класу статыўных дзеясловаў, у правых табл. 4-а і 4-б – аднакаранёвыя дэрываты ды паралелі. Першае, на што нельга не звярнуць увагі, – гэта блакаванне пасіву – дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу з суфіксамі ***-т-*** і ***-н-***. Гэтаксама, і нават у большай меры, тут блакуюцца працэсуальныя назоўнікі (ці дзеяназоўнікі) на ***-цце, -нне*** і ***-енне*** – усе

[1] Лексіка, выкарыстаная ў табліцах, апрача слоў, пазначаных *, была спраўджаная паводле анлайн-рэсурсу Slounik.org, размешчаных там слоўнікаў [ГСД; ГСН; ГСП]. Словы, пазначаныя *, былі выяўленыя намі ў беларускім сегменце інтэрнэту. Іх шуканне чынілася мэтна, у адпаведнасці з матрыцый табліцы, і іх аказіянальнасць у нашым выпадку не загана, а пацверджанне жывасці (дзейснасці і сэнсоўнасці) глыбінных алгарытмаў беларускага словаўтварэння.

Табліца 4-а (л.). **Формы статыўнага дзеяслова**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Мінулы час, ж.р.	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
мокнуць	мокне	мокнуць	мокла	мокні
ціхнуць	ціхне	ціхнуць	ціхла	ціхні
глухнуць	глухне	глухнуць	глухла	глухні
слепнуць	слепне	слепнуць	слепла	слепні
гуснуць	гусне	гуснуць	гусла	гусні
жоўкнуць	жоўкне	жоўкнуць	жоўкла	жоўкні
слабнуць	слабнуць	слабнуць	слабла	слабні
ліпнуць	ліпне	ліпнуць	ліпла	ліпні
брыднуць	брыдне	брыднуць	брыдла	брыдні
мякнуць	мякне	мякнуць	мякла	мякні
гразнуць	гразне	гразнуць	гразла	гразні
а-слізнуць	а-слізне	а-слізнуць	а-слізла	а-слізні
вязнуць	вязне	вязнуць	вязла	вязні
яркнуць	яркне	яркнуць	яркла	яркні
крэпнуць	крэпне	крэпнуць	крэпла	крэпні
горкнуць	горкне	горкнуць	горкла	горкні
ёлкнуць	ёлкне	ёлкнуць	ёлкла	ёлкні
зябнуць	зябне	зябнуць	зябла	зябні
пахнуць	пахне	пахнуць	пахла	пахні
грузнуць	грузне	грузнуць	грузла	грузні
прагнуць	прагне	прагнуць	прагла	прагні
моўкнуць	моўкне	моўкнуць	моўкла	моўкні
бледнуць	бледне	бледнуць	бледла	бледні

калонкі з дзеназоўнікам паслядоўна не запоўненыя. Больш складаная сітуацыя з дзеепрыметнікамі. Калі пасіўныя дзеепрыметнікі на ***-т-*** і ***-н-*** тыпу ~~*мокнуты*~~ ці ~~*мокнены*~~ – немажлівыя ў прынцыпе, а актыўныя на ***-ўш- / -ш-*** і ***-уч- / -юч-*** – **мокнуўшы*, **мокнучы* – супалі з дзеепрыслоўямі і таму перасталі ўжывацца, як у дыялектнай, так і ў літаратурнай мове, то, выходзіць, для дзеепрыметнікаў не застаецца

Табліца 4-а (п.). **Дэрываты і паралелі ст. дз.**

Іменныя формы			**Паралельныя класы дзеясловаў**		
Дзеепрым.	**G.**	**Прым.**	**Мульт.**	**Факт.**	**Ілюм.**
змоклы	–	мокры	намакаць	мачыць	–
заціхлы	–	ціхі	заціхаць	цішыць	–
заглухлы	–	глухі	заглухаць	глушыць	–
аслеплы	–	сляпы	асляпаць*	сляпіць	–
загуслы	–	густы	–	гусціць	–
пажоўклы	–	жоўты +	–	жаўціць	–
аслаблы	–	слабы +	–	сл**а**біць	–
зліплы	–	ліпкі	~~зліпацца~~	ляпіць	~~ліпець~~
абрыдлы	–	брыдкі	абрыдаць	брыдзіцца	–
размяклы	–	мяккі	размякаць	мякчыць	–
загразлы	–	гразкі	загразаць	[~~грязнить~~]	–
аслізлы	–	слізкі	~~слізгаць~~	слізіць	–
увязлы	–	вязкі	~~вязаць~~	[więzić]	–
–	–	яркі	–	ярчыць*	–
скрэплы	–	крэпкі	–	[~~крепить~~]	–
згорклы	–	горкі	–	гарчыць↑	–
з’ёлклы	–	ёлкі	–	ялчыць↑	–
азяблы	–	зябкі +	–	зябіць↑	–
прапахлы	–	пахкі+	–	–	–
загрузлы	–	грузны +	загрузаць	грузіць	–
апраглы*	–	прагны	–	пражыць	–
змоўклы	–	моўкны*	змаўкаць	–	маўчаць
збледлы	–	бледны+	–	–	–

і месца? Але ёсць яшчэ адзін варыянт дзеепрыметнікаў, з суфіксам ***-л-***, і менавіта беларуская мова прымушае звярнуць увагу на гэты, сама загадкавы і ці не сама занядбаны граматыкамі фармант дзеяслова.

Вядома, што “дзеепрыметнік на *л* паступова набываў і набыў форму таго прошлага часу, які ўжываецца ўва ўсіх усходнеславянскіх мовах” [Янкоўскі 1989: 225]. Аднак ранейшая функцыя захавалася, і “сінонімамі

Табліца 4-б (л.). **Формы статыўнага дзеяслова**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Мінулы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
вянуць	вяне	вянуць	вяла	вянь
гібнуць	гібне	гібнуць	гібла	гібні
дохнуць	дохне	дохнуць	дохла	дохні
кіснуць	кісне	кіснуць	кісла	кісні
мерзнуць	мерзне	мерзнуць	мерзла	мерзні
нікнуць	нікне	нікнуць	нікла	нікні
пухнуць	пухне	пухнуць	пухла	пухні
смягнуць	смягне	смягнуць	смягла	смягні
сохнуць	сохне	сохнуць	сохла	сохні
стынуць	стыне	стынуць	стыла	стынь
гаснуць	гасне	гаснуць	гасла	гасні
тухнуць	тухне	тухнуць	тухла	тухні
меркнуць	меркне	меркнуць	меркла	меркні
віснуць	вісне	віснуць*	вісла*	вісні*
сіпнуць	сіпне	сіпнуць	сіпла	сіпні
хрыпнуць	хрыпне	хрыпнуць	хрыпла	хрыпні
блякнуць	блякне	блякнуць	блякла	блякні
бракнуць	бракне	бракнуць	бракла	бракні
брызгнуць	брызгне	брызгнуць	брызгла	брызгні
зызнуць	зызне	зызнуць	зызла	зызні
чэзнуць	чэзне	чэзнуць	чэзла	чэзні
чахнуць*	чахне	чахнуць*	чахла*	чахні*
жухнуць	жухне	жухнуць	жухла	жухні
друзнуць	друзне	друзнуць	друзла	друзні
прахнуць	прахне	прахнуць	прахла	прахні
скарузнуць	скарузне	скарузнуць	скарузла	скарузні
шэрхнуць	шэрхне	шэрхнуць	шэрхла	шэрхні
растануць	растане	растануць	растала	растань
звыкнуць	звыкне	звыкнуць	звыкла	звыкні
ускрэснуць	ускрэсне	ускрэснуць	ускрэсла	ускрэсні
захраснуць	захрасне	захраснуць	захрасла	захрасні
прасмерднуць	прасмердне	прасмерднуць	прасмердла	прасмердні

Табліца 4-б (п.). **Дэрываты і паралелі ст. дз.**

Іменныя формы			**Паралельныя класы дзеясловаў**		
Дзеепрым.	**G.**	**Прым.**	**Мульт.**	**Факт.**	**Ілюм.**
завялы	–	вялы	завядаць	вяліць	–
згіблы	–	гіблы	пагібаць*	губіць	–
здохлы	–	дохлы	здыхаць	душыць	–
скіслы	–	кіслы	скісаць	кісліць	–
змерзлы	–	мерзлы	замярзаць	марозіць	–
зніклы	–	ніклы+	знікаць	нішчыць	–
спухлы	–	пухлы+	апухаць	пушыць	–
асмяглы	–	смяглы	асмягаць*	смажыць	–
засохлы	–	сохлы+	засыхаць	сушыць	–
астылы	–	стылы	астываць	студзіць	–
згаслы	–	гаслы*	згасаць	гасіць	–
затухлы	–	тухлы	затухаць	тушыць	–
змерклы	–	мерклы*	~~змяркацца~~	марочыць	–
абвіслы	–	віслы	абвісаць	–	вісець
асіплы	–	сіплы	асіп**а**ць	–	сіпець
ахрыплы	–	хрыплы	ахрыпаць	–	хрыпець
збляклы	–	бляклы	збляк**а**ць*	–	–
набраклы	–	браклы*	набракаць	–	–
абрызглы	–	брызглы	абрызгаць	–	–
азызлы	–	зызлы*	азызаць	–	–
счэзлы	–	чэзлы	счазаць*	–	–
счахлы	–	чахлы	зачахаць*	–	–
пажухлы	–	жухлы	пажухаць*	–	–
адрузлы	–	друзлы	–	–	–
спрахлы	–	прахлы*	–	–	–
заскарузлы	–	карузлы	–	–	–
сшэрхлы	–	шэрхлы	–	–	–
расталы	–	талы	раставаць	тапіць	–
звыклы	–	–	звыкацца	вучыць	–
ускрэслы	–	–	ускрасаць	ускрасіць	–
захраслы	–	–	захрасаць	–	–
прасмердлы	–	–	–	смуродзіць	смярдзець

дзеепрыметнікаў на *-ўшы, -шы-* часта выступаюць <…> дзеепрыметнікі з суфіксам *-л-*“ [Каўрус 2011: 107]. А апошнім часам яны “ўсё шырэй ужываюцца ў літаратурнай мове і ў радзе выпадкаў выцясняюць дзеепрыметнікі на *-ш-* і *-ўш-*” [*Граматыка беларускай мовы* 1962: 378]. Часам нават сцвярджаецца, нібыта “на цяперашнім этапе дзеепрыметнікі з суфіксам *-л-* усведамляюцца як асноўныя” [Каўрус 2011: 107]. У тым, што гэта далёка не так, лёгка ўпэўніцца. Насамрэч суфікс ***-л-*** спалучаецца далёка не з усімі класамі дзеяслова, але арганічны ён якраз пры статыўных дзеясловах. Беларуская мова, захаваўшы дзеепрыметнікавасць ***-л-***, нават актуалізаваўшы яго на сучасным этапе, прыадкрывае нам заслону над загадкавым суфіксам, дазваляючы зразумець яго адмысловае значэнне і нават гістарычны лёс. Гэты суфікс даволі спецыфічны і можа разглядацца як аналаг не толькі ***-ш-*** і ***-ўш-***, але і як апазіцыя да ***-т-*** і ***-н-*** – ён не актыўны і не пасіўны, а р э ф л е к с і ў н ы.

Як відаць з табл. 4-а (п.) і 4-б (п.), адметнасць статыўных дзеясловаў у тым, што ад іх рэгулярна ўтвараюцца дзеепрыметнікі з суфіксам ***-л-***: *змоклы, аслеплы, пасохлы*, – але не беспасярэдне, а толькі ад прыстаўкавых дэрыватаў, г. зн. дзеепрыметнікі паходзяць толькі ад перфектываў. А нерэгулярныя ўтварэнні ад першасных дзеясловаў [табл. 4-б (п.)] *вялы, гіблы, кіслы* – наўрад ці могуць быць залічаныя да дзеепрыметнікаў, гэта ўжо прыметнікі, дый прыстаўкавыя ўтварэнні з ***-л-*** часта трактуюцца як прыметнікі. Прыметнікі з суфіксам ***-л-***, у адрозненне ад дзеепрыметнікаў, утвараюцца нерэгулярна, у асноўным ад тых статыўных дзеясловаў, якія не матывуюцца прыметнікамі. З улікам прыметнікаў яны змяшчаюцца ў табліцах. Але размеркаванне статыўных дзеясловаў па дзвюх табліцах зусім не сведчыць пра іх падзел на падкласы ці групы, розніца паміж тымі і другімі досыць умоўная.

Статыўныя дзеясловы ў табл. 4-а (л.), і 4-б (л.) амаль нічым не розняцца, ані семантычна, ані фармальна. Мы нават не будзем тут вызначаць, ні ў сінхранічнай перспектыве, ні ў дыяхранічнай, які чым матывуецца. Проста падзелім іх на тыя, пры якіх ёсць самастойныя аднакаранёвыя прыметнікі (правая табл. 4-а), і тыя, ад якіх прыметнікі ўтвараюцца з дапамогай суфікса ***-л-*** (правая табл. 4-б) або зусім не ўтвараюцца. У тым выпадку, калі статыўныя дзеясловы карэлююць з бяссуфіксавымі прыметнікамі *ціхі, глухі, сляпы* ці з суфіксам ***-к-і***: *ліпкі, мяккі, вязкі, пахкі*; ***-н-ы***: *грузны, прагны*, – у стварэнні яшчэ аднаго прыметніка як бы няма патрэбы – ён будзе збытным. Калі ж прыметніка няма, то пры патрэбе ён утвараецца ад дзеяслова: *віслы, вялы, кіслы, тухлы, чахлы*. Аднак гэта толькі тэндэнцыя, а не правіла, ёсць і паралельныя ўтварэнні (пазначаюцца знакам +): *жоўты – жоўклы, ніцы – ніклы, пухкі – пухлы, сухі – сохлы, зябкі – зяблы*. Зрэшты, і тут аддзеяслоўныя прыметнікі

адрозніваюцца, яны перадаюць не сталую прымету, а ўзніклую як вынік папярэдняга працэсу, толькі без часавых адзнак. З пяці прыметнікаў на ***-л-*** да якасных адносіцца толькі адзін – *пухлы*. У ніжнім сегменце табл. 4-б (л. і п.) мы згрупавалі звязаныя дзеясловы, якія не ўжываюцца без прыставак, таму ад іх не могуць утварыцца беспрыстаўкавыя прыметнікі на ***-л-*** (і нават *талы* – не вынятак, бо паходзіць ад *таяць*).

Ад статыўных дзеясловаў, як і ад іншых класаў, утвараюцца другасныя мультатыўныя формы, але, як бачым з табл. 4-а (п.) і 4-б (п.), далёка не ад усіх. Тут ні ў якім разе нельга блытаць мультатывы з цвёрдай асновай (на ***-аць***): *заглухаць, асляпаць, здыхаць, загрузаць, размякаць,* – якія ўтвараюцца ад статываў, і з мяккай асновай (на ***-яць***), што ўтвараюцца ад аднакаранёвых фактытываў на ***-іць***: *заглушаць, асляпляць, здушаць, загружаць, размякчаць*. Першыя – непераходныя, як і выточныя статывы, другія, як і выточныя фактытывы, – зазвычай пераходныя. Да вытворных хіба што не адносяцца беспрыстаўкавыя мультатывы *слізгаць* і *вязаць* як самастойныя паралельныя ўтварэнні. Выклікаюць сумневы ў якасці трывальных параў і такія дзеясловы, як *змяркацца, зліпацца*, бо статывы не дапускаюць фарманта зваротнасці – постфікса *-ся*. Чаму ўсё ж мультатывы ад статываў нерэгулярныя? Мабыць, у тых няма пільнай патрэбы. Апрача таго, большая частка статываў, якія не карэлююць з мультатывамі, маюць як паралельныя ўтварэнні трансфарматывы: *гуснуць – гусцець, слабнуць – слабець, яркнуць – ярчэць, горкнуць – гарчэць, ёлкнуць – ялчэць, прахнуць – парахнець* і г. д. Яны ў поўнай меры перадаюць паступовасць дзеяння, уласцівую шматкротным дзеясловам.

Суіснаванне паралельных мультатываў рознага паходжання вымагае паказаць карэляцыю статываў з аднакаранёвымі дзеясловамі іншых класаў. З трох апошніх калонак табл. 4-а (п.) і 4-б (п.) можна бачыць, што паралельна з статывамі і вытворнымі ад іх мультатывамі фігуруюць яшчэ два класы – фактытыўны і ілюмінатыўны. Ніводзін клас не дае рэгулярных паралеляў, але і пашырэнне іх не ўсюды аднолькавае. Статывы ў табл. 4-а (п.) даюць менш мультатываў, чым у табл. 4-б (п.), затое першыя маюць амаль поўны набор паралеляў з фактытывамі і ілюмінатывамі, а ў табл. 4-б (п.) – усё наадварот: амаль рэгулярна ўтвараюцца мультатывы, але значна менш паралельных класаў. І гэта натуральна, клас фактытываў паходзіць ад прыметнікаў, а ўласна дзеяслоўныя асновы, мабыць, часцей утвараюць мультатывы. Пры нястачы беларускіх фактытываў у дужках у якасці ілюстрацыі былі падстаўленыя аналагі з расейскай і польскай моў. Аднак тыя ўзоры, якія не адпавядаюць семантыцы, закрэсленыя. Прыкладам, беларускаму статыву *крэпнуць* ‘мерзнуць’ не зусім адпавядае расейскі фактытыў *крепить* ‘мацаваць’.

Табліца 4-в (л.). **Формы антыстатыўнага дзеяслова**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Мінулы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
прасякнуцца	прасякнецца	прасякнуцца	прасяклася	прасякніся
спасцігнуць	спасцігне	спасцігнуць	спасцігла	спасцігні
пазбегнуць	пазбегне	пазбегнуць	пазбегла	пазбегні

Ілюмінатываў, паралельных з статывамі, – няшмат, але іх наяўнасць сама праз сябе паказальная, бо, як вышэй зазначалася, на ролю статыўных дзеясловаў прэтэндуюць ілюмінатыўныя. І розніца паміж *віснуць* і *вісець* амаль не канцэптуалізуецца, але яна ёсць, і прынцыповая, а нам важна яе зразумець. Асабліва цікавы той момант, што статывы, маючы ў якасці паралеляў ілюмінатывы: *віснуць* – *вісець, моўкнуць* – *маўчаць, сіпнуць* – *сіпець, хрыпнуць* – *хрыпець*, – ужо не маюць у гэтай якасці аднакаранёвых фактытываў, ці наадварот. Ёсць, праўда, і выняткі: *ліпнуць* – *ляпіць* – *ліпець* і *смерднуць* – *смуродзіць* – *смярдзець*, але гэта тлумачыцца пабочнымі прычынамі, прыкладам, *ліпець* мае падвоеную этымалогію [ЭСБМ-5: 316], чым апраўдваецца яго дваякае выкарыстанне. Мабыць, чым мацнейшая семантычная лучнасць паміж каранямі дзеясловаў, тым менш падстаў суіснавання фактытыва з ілюмінатывам.

Сярод фактытываў ёсць некалькі непераходных дзеясловаў і таму семантычна блізкіх да ілюмінатываў – квофактытывы: *гарчыць, ялчыць* і *зябіць*. На іх не варта тут спыняцца, але зазначым, што ў рамцы другога спражэння фактытывы (каўзатывы і квофактытывы), з аднаго боку, а ілюмінатывы, – з другога, складаюць пэўную апазіцыю. На фоне статываў і ўтвораных ад іх мультатываў, якія адносяцца да першага спражэння, гэта вельмі добра відаць. Тут упершыню пачынае праясняцца роля спражэння як пэўнай рамы, фармальнага кластара, у межах якога існуюць семантычна скарэляваныя класы і падкласы.

Цяпер, калі раскрытыя асноўныя характарыстыкі статыўных дзеясловаў, узнікае пытанне, ці можна растлумачыць іх унікальную і адметную фармальную рысу – адсячэнне суфікса ***-ну-*** ў прошлым часе: *мок<л>, мокла*; *слеп<л>, слепла*? Калі ўспомнім, што дзеепрыметнікі з рэфлексіўным суфіксам ***-л-*** утвараюцца амаль вылучна ад статыўных дзеясловаў, то стане зразумела: ужо сам факт далучэння гэтага суфікса паказвае на статыўнасць дзеяслова, і наяўнаць суфікса ***-ну-*** робіцца таўталагічнай. Гэтаксама на паштовых марках Англіі (у адрозненне ад астатніх краін) не змяшчаецца найменне краіны, а толькі малюецца партрэт караля ці каралевы. Трансфарматыўныя ж дзеясловы (*бялець, сырэць*), якія

Табліца 4-в (п.). **Дэрываты і паралелі антыст. дз.**

Іменныя формы		**Мультатыў**
Дзеепрым.	**Дзееназ. (G.)**	
прасякнуты, прасякнены	прасякненне	прасякаць
спасцігнуты	спасціжэнне	спасцігаць
пазбегнуты	–	пазбягаць

ўзніклі значна пазней, таксама далучаюць суфікс ***-л-***, але ўжо не маюць такой прывілеі і адрозніваюць сябе яшчэ і фарматывам ***-е-/-э-***. Аднак жа і тады, калі статыўныя дзеясловы з семантычных ці фанетычных прычын (частая з'ява ў беларускай мове) не адсякаюць ***-ну-*** (*гуснуў, ціхнуў*), гэта не значыць, што яны пераходзяць у іншы клас і што нібыта гэты клас разбураецца. Статыўныя дзеясловы займаюць вельмі спецыфічную нішу, таму амаль не паддаюцца ўплывам збоку, хоць і тут ёсць выняткі.

У якасці выняткаў вядомыя тры дзеясловы (гл.: табл. 4-в [л. і п.]): *спасцігнуць, прасякнуцца* і *пазбегнуць*. Фармальна, паводле сваіх адмен, яны нічым не розняцца ад астатніх статываў, і нават больш паслядоўныя за *гуснуць*, *ціхнуць*, якія не адсякаюць ***-ну-***. Але ўсе тры – пераходныя, яны памянялі версію на адваротную і цалкам змянілі дэрывацыйную валентнасць: ад іх нельга ўтварыць дзеепрыметнікі на ***-л-***, затое свабодна ўтвараюцца дзеепрыметнікі з суфіксамі ***-т-*** і ***-н-***: *прасякнуты* і *прасякнены*, *спасцігнуты, пазбегнуты*. Ад іх утвараюцца дзееназоўнікі: *прасякненне, спасціжэнне*. Ёсць нават зваротная форма: *прасякнуцца*. Гэтыя дзеясловы азначым як а н т ы с т а т ы ў н ы я, каб падкрэсліць, з аднаго боку, іх арганічную еднасць з класам статываў, а з другога – іх нутраную процілегласць. Здавалася б, яны разбураюць намеркаванае адзінства зместу і формы. Аднак, мы лічым, анамалія толькі падкрэслівае, што ўсе апісаныя ўласцівасці невыпадковыя, а збой у семантыцы слоў аўтаматычна цягне за сабой змяненне і іх фармальнага патэнцыялу. Гэта як бы адваротны бок таго самага, яго антыпод. Важна тое, што адцэнтровая версія з суфіксамі ***-т-, -н-*** і дацэнтровая з суфіксам ***-л-*** тут у адной лексеме не сумяшчаюцца.

Шуканне прычын анамальных статываў не ўваходзіць у нашы заданні, але напомнім, у расейскай мове такога кшталту "дзеясловы адносяцца да царкоўнаславянскага пласта" [Исаченко 1960: 84]. А беларускі пурызм слова *пазбегнуць* кваліфікуе як кальку з расейскай мовы, "дзе неўласцівая беларускай мове прыстаўка *из-* замененая на *па-*" [Сцяцко 1999: 155]. Матывуючы тым, што "слоўнікі 20-х гадоў не фіксавалі слова

Табліца 5-а (л.). **Формы квазіілюмінатыўнага дзеяслова**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
відзець	відзіць	відзяць	відзеў	відзь
глядзець	глядзіць	глядзяць	глядзеў	глядзі
дзяржаць	дзержыць	дзержаць	дзяржаў	дзяржы
гнаць	гоніць	гоняць	гнаў	гані
вярцець	верціць	верцяць	вярцеў	вярці
хацець	хоча	хочуць	хацеў	хаці
імчаць–	імчыць	імчаць	імчаў	імчы

Табліца 5-б (л.). **Формы ілюмінатыўнага дзеяслова (1-я гр.)**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
спаць	спіць	спяць	спаў	спі
ляжаць	ляжыць	ляжаць	ляжаў	ляжы
стаяць	стаіць	стаяць	стаяў	стой
сядзець	сядзіць	сядзяць	сядзеў	сядзі

пазбягаць" [Сцяцко 1999: 155; Станкевіч 1994: 50]. Калі б усё зводзілася да царкоўнаславянскай мовы, то анамалію можна было б залічыць да падобных, пашыраных у ёй адхіленняў. Але дзеяслоў *прасякнуцца* не мае да яе дачынення. Не можа анамалія тлумачыцца і тым, што ўсе тры дзеясловы не ўжываюцца без прыставак і страцілі лучнасць з сваім класам, хоць яны не адзіныя сярод статываў маюць звязаную аснову. Як бы там ні было, перад намі або рудымент, або гібрыд розных класаў. Падобныя выняткі не раз будуць трапляцца на маргінезе кожнага класа.

2.3. Ілюмінатыўныя дзеясловы

Да ілюмінатыўных мы адносім дзеясловы II-га спражэння з суфіксам ***-е- (-э-)*** і з суфіксам ***-а-***. Гэтае найменне намі прапануецца ўпершыню, хоць дзеясловы данага класу не раз аналізавалі [Павский 2012: 35–39, 65–66; Карцевский 2004: 93–96; Виноградов 1972: 357; Исаченко 1960: 77–80].

Табліца 5-а (п.). **Дэрываты і паралелі квазііл. дз.**

Іменныя формы дзеяслова			**Прыметнікі**	
пасіў	**герунд.**	**актыў**	***-лів-, -ляв-***	***-к-, -н-, -ом-***
відзён	відзенне	відушчы	–	відомы, відны
гледжаны	глядзенне	–	–	нязгледны
адзержаны	дзяржанне	–	–	няўздзержны
гнаны	гнанне (гнаццё)	–	–	гонкі
заверчаны	вярчэнне	–	вяртлявы	вёрткі
–	хаценне	–	хотлівы	–
–	імчанне	–	імклівы	–

Табліца 5-б (п.). **Дэрываты і паралелі іл. дз. (1-я гр.)**

Іменныя формы дзеяслова			**Прыметнікі**	
пасіў	**герундыум**	**актыў**	***-лів-, -ляв-***	***-к-, -н-, -ом-***
–	спаннё	спячы	санлівы	–
–	ляжанне	ляжачы	–	–
–	стаянне	стаячы	–	стойкі
–	сядзенне	сядзячы	–	–

Асноўны масіў ілюмінатываў – гэта дзеясловы гучання – *звінець, сіпець, крычаць*, таксама дзеясловы святла – *гарэць, блішчаць*, паху – *смярдзець*, адчуванняў – *балець*, часам геаметрычна-прасторавыя – *вісець, стаяць* і, нарэшце, “негатыў” усіх названых дзеянняў – *спаць, ляжаць, маўчаць*, сюды ж далучаюцца і дзеясловы зроку (што лагічна, калі ўспомніць беларускі народны выраз “вочы не свецяць”) *глядзець, відзець* і г. д. Ілюмінатыўныя дзеясловы як бы “выпраменьваюць” дзеянне, яно існіцца суб’ектам, але не дасягае і ніколі не можа дасягнуць аб’екта. Пераважная большасць ілюмінатыўных дзеясловаў – непераходныя, калі не лічыць невялікай групы архаічных *відзець, дзяржаць* і да т. п.

Ілюмінатыўныя дзеясловы, у параўнанні з статыўнымі, больш разнародныя, яны дзеляцца на падкласы і групы, дзе вылучаюцца два асноўныя падкласы: меншы і больш архаічны падклас – уласна ілюмінатыўныя (левыя табл. 5-б, 5-в, 5-г.), большы і менш архаічны – імітатыўна-акцэляратыўныя (левая табл. 5-д). Найбольш выбіваюцца з параметраў

Табліца 5-в (л.). **Формы ілюмінатыўнага дзеяслова (2-я гр.)**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
гарэць	гарыць	гараць	гарэў	гары
грымець	грыміць	грымяць	грымеў	грымі
дымець	дыміць	дымяць	дымеў	дымі
звінець	звініць	звіняць	звінеў	звіні
гудзець	гудзіць	гудзяць	гудзеў	гудзі
рыпець	рыпіць	рыпяць	рыпеў	рыпі
свярбець	свярбіць	свярбяць	свярбеў	свярбі
сіпець	сіпіць	сіпяць	сіпеў	сіпі
хрыпець	хрыпіць	хрыпяць	хрыпеў	хрыпі
нудзець*	нудзіць	нудзяць	нудзеў	нудзі
смярдзець	смярдзіць	смярдзяць	смярдзеў	смярдзі
цярпець	цярпіць	церпяць	цярпеў	цярпі
шумець	шуміць	шумяць	шумеў	шумі
шыпець	шыпіць	шыпяць	шыпеў	шыпі
ляцець	ляціць	ляцяць	ляцеў	ляці
балець	баліць	баляць	балеў	балі
вісець	вісіць	вісяць	вісеў	вісі
кіпець	кіпіць	кіпяць	кіпеў	кіпі
карпець	карпіць	карпяць	карпеў	карпі
курэць	курыць	кураць	курэў	куры
шчымець	шчыміць	шчымяць	шчымеў	шчымі
дудзець	дудзіць	дудзяць	дудзеў	дудзі
імжэць	імжыць	імжаць	імжэў	імжы
ірдзець	ірдзіць	ірдзяць	ірдзеў	ірдзі
карцець	карціць	карцяць	карцеў	карці
кішэць	кішыць	кішаць	кішэў	кішы
ліпець	ліпіць	ліпяць	ліпеў	ліпі
смылець	смыліць	смыляць	смылеў	смылі
шасцець	шасціць	шасцяць	шасцеў	шасці

Табліца 5-в (п.). **Дэрываты і паралелі іл. дз. (2-я гр.)**

Іменныя формы дзеяслова			**Прыметнікі і назоўнікі**		
пасіў	**герунд.**	**quasi-актыў**	**-лів-**	**-к-, -н-**	**-Ø, -а**
+	гарэнне	гаручы	гарлівы	гаркі	гар
–	грыменне*	грымучы	грымлівы	[громкий]	гром
–	дымленне*	дымучы*	дымлівы	дымкі	дым
–	звіненне*	звінючы	званлівы*	звонкі	звон
–	гудзенне	гудучы*	гудлівы*	гудкі	гуд
–	рыпенне	рыпучы	рыплівы	рыпкі	рып+
–	свярбенне*	свярбучы*	свярблівы*	свербкі	сверб
–	сіпенне	сіпучы*	сіплівы*	сіпкі	сіп(-аты)
–	хрыпенне	хрыпучы*	хрыплівы	хрыпкі	хрып(-аты)
–	нудзенне*	нудзючы	нудлівы	нудны	нуда
–	смярдзенне*	смярдзючы	смуродлівы	смуродны	смурод
–	цярпенне	цярпючы*	цярплівы	нясцерпны	–
–	шуменне*	шумлючы*	шумлівы	шумны	шум
–	шыпенне	шыпучы	шыплівы*	–	шып
+	ляценне*	лятучы	–	лёткі	лёт
+	баленне*	балючы	–	–	боль
–	вісенне	вісючы*	–	–	–
+	кіпенне	кіпучы	–	–	–
–	карпенне*	–	карплівы*	–	–
+	курэнне	–	курлівы*	–	–
–	шчыменне*	–	шчымлівы	–	–
–	дудзенне	–	–	–	дуда
–	імжэнне*	–	–	–	імжа
–	ірдзенне	–	–	–	іржа
–	карценне*	–	–	–	–
–	кішэць	–	–	–	–
–	ліпенне*	–	–	–	–
–	смыленне	–	–	–	–
–	шасценне	–	–	–	–

класу к в а з і і л ю м і н а т ы ў н ы я дзеясловы [табл. 5-а (л.)], яны – самыя архаічныя і розняцца ад астатніх як фармальна, так і семантычна. Сам факт існавання такой дыферэнцыяцыі сведчыць пра тое, што панятак прадукцыйнасці досыць адносны, калі яго стасаваць да класу агулам. З фармальнага боку ілюмінатыўныя дзеясловы адрозніваюцца сталым месцам націску, на суфіксальных фармантах ***-е- (-э-)***, ***-а-*** ў інфінітыве, які застаецца нязменным і ў асабовых формах дзеяслова. Націск на суфіксе – не выпадковая з'ява, разгледзеўшы дзеясловы II-га спражэння сістэмна, мы пераканаемся: яго пазіцыя звязаная з дыятэзаю. З семантычнага боку ілюмінатыўныя дзеясловы, як і статыўныя, – непераходныя, але гэта іншая непераходнасць, слабейшая, калі дапусціць тут градацыю, і адпаведна менш устойлівая. Розніца ж вынікае з версіі дзеясловаў.

Рэч у тым, што ілюмінатыўныя дзеясловы ў адрозненне ад статыўных маюць н е й т р а л ь н у ю версію (якую іначай можна назваць а д ц э н т р о в а й н е д а с я г а л ь н а й). Як было сказана, гэта дзеянне, якое не замыкаецца на суб'екце і ў той жа час не мае аб'екта стасавання, таму, згодна з логікай рэчаў, дзеяслоў не можа мець і скразнога дапаўнення. Аднак ёсць адна акалічнасць, калі зададзенасць парушаецца. Дапаўненне ўзнікае тады, калі дзеянне само спараджае аб'ект. Прыкладам, *крычаць* – непераходны дзеяслоў, але ў выразах *крычаць песню, крычаць "біс"* ён набывае статус пераходнасці. Такую з'яву можна лічыць к в а з і п е р а х о д н а с ц ю, яна адрозніваецца ад паўнавартай пераходнасці, тут у ролі скразнога дапаўнення не можа быць агенса. І ў той жа час у параўнанні з "ускоснай пераходнасцю" – псеўдапераходнасцю – тут няма сумневу ў ідэнтычнасці катэгорыі. Больш поўна пераходнасць рэалізуецца ў дзеясловах зроку: *глядзець* можна і *фільм*, і *хвораga*. Статывы ў адрозненне ад ілюмінатываў не дапускаюць у прынцыпе падобных ваганняў пераходнасці, бо пазіцыя аб'екта ў статыве ўжо занятая – гэта сам суб'ект. Як бачым, класы дзеясловаў, якія пры павярхоўным паглядзе здаюцца падобнымі, на справе становяць поўны адварот, што праяўляецца і ў дэрывацыйнай валентнасці.

Калі стабільны галосны ***-е-(-э-)*** і лабільны ***-а-/-э-*** адрозніваюць групы, то праявы ілюмінатыўнасці ў гэтых групах супадаюць: націск стаіць на тэматычным галосным у інфінітыве, цяперашнім і прошлым часе, захоўваецца ў дзеепрыметніку і нават у прыстаўкавых дэрыватах. Усе першасныя дзеясловы – непераходныя, калі не лічыць апісаных вышэй выпадкаў кантэкстуальнай транзітывацыі. Абедзве групы рэгулярна ўтвараюць герундыум і рэгулярна блакуюць пасіў у форме дзеепрыметнікаў. Аднак у 2-й групе ёсць выняткі: ад дзеяслова *гарэць* усё ж утвараецца прыметнік *гарэлы*. Мабыць, таму, што дзеяслоў мае розныя значэнні: 'свяціць' (ілюмінатыўнае дзеянне) і 'тлець, цепліцца' (статыўнае

дзеянне), прыметнік вынікае з апошняга. Таму *гарэць* – гэта семантычны гібрыд. Іншыя ілюмінатыўныя дзеясловы таксама зрэдку ўтвараюць дзеепрыметнікі на ***-л-***: *збалелы, абляцелы, закурэлы*. У калонцы "пасіў" правай табл. 5-в такія выпадкі пазначаюцца знакам +.

Дэрывацыйная валентнасць ілюмінатываў даных груп – гэта комплекс агульных рысаў, якія збліжаюць гэтыя дзеясловы паміж сабой і адрозніваюць ад астатніх. Большая палова ілюмінатываў 2-й групы ўтварае прыметнікі на ***-уч-ы***, у 3-й групе такія дэрываты таксама ёсць, але іх лік невялікі. Лічыцца, што прыметнікі з гэтым суфіксам – былыя дзеепрыметнікі, якія захаваліся як атавізм. Аднак нашы назіранні над сучасным маўленнем паказваюць, што прыметнікі падобнага тыпу ўтвараюцца і дагэтуль: *гудучы, цярплючы* і да т. п. (нават калі лічыць іх за аказіяналізмы). Каб быць дзеепрыметнікамі, дэрыватам на ***-уч-ы*** бракуе інгрэдыента дзеяслоўнасці – тэматычнага галоснага, які адсякаецца пры іх утварэнні. Ці мела гэта значэнне ў старажытнасці – невядома. Побач з атавістычнымі прыметнікамі на ***-уч-ы*** ад ілюмінатываў 2-й групы аднолькава часта ўтвараюцца і інтэнсіяльныя прыметнікі з суфіксам ***-лів-***. І найчасцей яны існуюць паралельна, а дамінаваць пры гэтым можа толькі адзін з іх. Калі параўнаць *звінючы* і *званлівы*, *дымучы* і *дымлівы*, то ў першым разе і норма, і узус аддаюць перавагу дэрывату на ***-уч-ы***, а ў другім – на ***-лів-ы***. Для 3-й групы інтэнсіяльныя прыметнікі таксама ўласцівыя, і іх, у адрозненне ад "атавізмаў" на ***-уч-ы***, не менш, чым у 2-й групе.

Для паўнаты карціны разгледзім карэляцыю ілюмінатываў з аднакаранёвымі прыметнікамі на ***-к-і*** (на фоне статываў), з іншымі прыметнікамі і элементарнымі назоўнікамі. З табл. 5-в (п.) і 5-г (п.) бачым: прыметнікавыя суфіксы ***-к-*** і ***-н-*** з каранямі ілюмінатыўных дзеясловаў спалучаюцца рэдка, асабліва мала паралеляў да 3-й групы, і гэта невыпадкова. У 2-й групе пераважаюць старажытныя асновы, матывацыя якіх даўно страчаная, а ў 3-й – дамінуюць гукаперайманні (апрача *тырчаць* і *маўчаць*, якія яўна выбіваюцца з групы, асабліва апошні). У адрозненне ад прыметнікаў на ***-уч-ы*** і ***-лів-ы***, прыметнікі на ***-к-і*** і ***-н-ы*** матывуюцца назоўнікамі, як відаць з табл. 5-в (п.) і 5-г (п.), апошнія і ўзнікаюць там, дзе ёсць адпаведны элементарны назоўнік, і да ілюмінатываў маюць ускоснае дачыненне. Цікава яшчэ звярнуць увагу на парцыяльныя прыметнікі з суфіксам ***-ат-***: *сіпаты* і *хрыпаты*. Яны таксама здаюцца тут выпадковымі, і гэта запраўды так, але ў кантэксце мовы іх з'яўленне невыпадковае. Бо якраз дзеясловы *сіпець* і *хрыпець* разам з *сіпнуць* і *хрыпнуць* перадаюць уласцівасці чалавечага голасу, таму прыметнікі *сіпаты* і *хрыпаты* ў комплексе з падобнымі да іх прыметнікамі – *насаты, вусаты, лупаты, зрынаты* – займаюць адпаведную нішу.

Табліца 5-г (л.). **Формы ілюмінатыўнага дзеяслова (3-я гр.)**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
маўчаць–	маўчыць	маўчаць	маўчаў	маўчы
крычаць–	крычыць	крычаць	крычаў	крычы
блішчэць+	блішчыць	блішчаць	блішчэў	блішчы
трашчаць–	трашчыць	трашчаць	трашчаў	трашчы
вішчаць–	вішчыць	вішчаць	вішчаў	вішчы
дрыжаць+	дрыжыць	дрыжаць	дрыжаў	дрыжы
пішчаць–	пішчыць	пішчаць	пішчаў	пішчы
сычэць+	сычыць	сычаць	сычэў	сычы
верашчаць–	верашчыць	верашчаць	верашчаў	верашчы
гручаць–	гручыць	гручаць	гручаў	гручы
гырчаць*	гырчыць	гырчаць	гырчаў	гырчы
гучаць+	гучыць	гучаць	гучаў	гучы
брынчэць+	брынчыць	брынчаць	брынчэў	брынчы
бурчэць+	бурчыць	бурчаць	бурчэў	бурчы
вурчаць–	вурчыць	вурчаць	вурчаў	вурчы
журчэць+	журчыць	журчаць	журчэў	журчы
гурчаць+	гурчыць	гурчаць	гурчаў	гурчы
дрынчэць+	дрынчыць	дрынчаць	дрынчэў	дрынчы
свірчэць–	свірчыць	свірчаць	свірчэў	свірчы
турчаць–	турчыць	турчаць	турчаў	турчы
фырчаць–	фырчыць	фырчаць	фырчаў	фырчы
шуршэць+	шуршыць	шуршаць	шуршэў	шуршы
дзюрчэць+	дзюрчыць	дзюрчаць	дзюрчэў	дзюрчы
мычаць–	мычыць	мычаць	мычаў	мычы
сквірчэць–	сквірчыць	сквірчаць	сквірчэў	сквірчы
тырчаць–	тырчыць	тырчаць	тырчаў	тырчы
цурчэць+	цурчыць	цурчаць	цурчэў	цурчы
шабуршэць+	шабуршыць	шабуршаць	шабуршэў	шабуршы

Табліца 5-г (п.). **Дэрываты і паралелі іл. дз. (3-я гр.)**

Іменныя формы дзеяслова			**Прыметнікі і назоўнікі**		
пасіў	**герунд.**	**quasi-актыў**	**-лів-**	**-к-, -н-**	**- Ø**
–	маўчанне	–	маўклівы	–	–
–	крычанне	крыкучы	крыклівы	–	крык+
–	блішчэнне	бліскучы	–	–	бляск+
–	трашчанне	траскучы	трасклівы	–	трэск+
–	вішчанне	візгучы*	віскліві	–	віск+
–	дрыжанне	дрыгучы	дрыжлівы*	дрогкі	[дрожь]
–	пішчанне	піскучы*	пісклівы	–	піск+
–	сычэнне	сыкучы*	сыклівы	–	сык+
–	верашчанне	–	верасклівы	–	вераск
–	гручанне	–	груклівы	–	грук+
–	гырчанне	–	гырклівы	–	гырк+
–	гучанне	–	гуклівы*	гучны	гук+
–	брынчэнне	–	брынклівы*	–	+
–	бурчанне	–	бурклівы	–	+
–	вурчанне	–	вурклівы*	–	+
–	журчанне	–	журклівы*	–	+
–	гурчанне	–	–	–	+
–	дрынчэнне	–	–	–	+
–	свірчэнне	–	–	–	+
–	турчанне	–	–	–	+
–	фырчанне	–	–	–	+
–	шуршэнне	–	–	–	+
–	дзюрчанне	–	–	–	–
–	мычанне	–	–	–	–
–	сквірчэнне	–	–	–	–
–	тырчанне	–	–	–	–
–	цурчанне	–	–	–	–
–	шабуршэнне	–	–	–	–

Табліца 5-д (л.). **Формы імітатыўна-акцэлератыўнага дзеяслова**

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
балбацець*	балбаціць	балбацяць	балбацеў	балбаці
бліскацець	бліскаціць	бліскацяць	бліскацеў	бліскаці
браскацець	браскаціць	браскацяць	браскацеў	браскаці
булькацець	булькаціць	булькацяць	булькацеў	булькаці
буркацець*	буркаціць	буркацяць	буркацеў	буркаці
віскацець*	віскаціць	віскацяць	віскацеў	віскаці
вуркацець*	вуркаціць	вуркацяць	вуркацеў	вуркаці
грукацець*	грукаціць	грукацяць	грукацеў	грукаці
дрыгацець	дрыгаціць	дрыгацяць	дрыгацеў	дрыгаці
зіхацець+	зіхаціць	зіхацяць	зіхацеў	зіхаці
лапацець	лапаціць	лапацяць	лапацеў	лапаці
ляскацець	ляскаціць	ляскацяць	ляскацеў	ляскаці
мігацець+	мігаціць	мігацяць	мігацеў	мігаці
муркацець*	муркаціць	муркацяць	муркацеў	муркаці
рыпацець*	рыпаціць	рыпацяць	рыпацеў	рыпаці
слізгацець	слізгаціць	слізгацяць	слізгацеў	слізгаці
стракацець	стракаціць	стракацяць	стракацеў	стракаці
стукацець	стукаціць	стукацяць	стукацеў	стукаці
траскацець	траскаціць	траскацяць	траскацеў	траскаці
тупацець	тупаціць	тупацяць	тупацеў	тупаці
хлюпацець	хлюпаціць	хлюпацяць	хлюпацеў	хлюпаці
шалясцець	шалясціць	шалясцяць	шалясцеў	шалясці
шапацець	шапаціць	шапацяць	шапацеў	шапаці
шарахцець	шарахціць	шарахцяць	шарахцеў	шарахці
шаргацець	шаргаціць	шаргацяць	шаргацеў	шаргаці
шархацець	шархаціць	шархацяць	шархацеў	шархаці
гукацець*	гукаціць	гукацяць	гукацеў	гукаці
плюхацець*	плюхаціць	плюхацяць	плюхацеў	плюхаці
плюхцець	плюхціць	плюхцяць	плюхцеў	плюхці
туркацець*	туркаціць	туркацяць	туркацеў	туркаці

Табліца 5-д (п.). **Дэрываты і паралелі ім.-акц. дз.**

Іменныя формы дзеяслова		**Назоўнікі і прыметнікі**	
пасіў	**герундыум**	**-ат**	**-лів-, -к-, -енн-**
–	балбаценне*	болбат*	бабатлівы
–	бліскаценне*	бліскат*	бліскатлівы*
–	браскаценне*	бразгат	бразгатлівы*
–	булькаценне	булькат	булькатлівы*
–	буркаценне	буркат	буркатлівы
–	віскаценне*	віскат	віскатлівы*
–	вуркаценне*	вуркат*	вуркатлівы
–	грукаценне*	грукат	грукатлівы
–	дрыгаценне	дрогат*	дрыгатлівы
–	зіхаценне	зіхата	зіхатлівы
–	лапаценне	лопат	лапатлівы
–	ляскаценне*	ляскат	ляскатлівы*
–	мігаценне	мігат*	мігатлівы
–	муркаценне*	муркат*	муркатлівы*
–	рыпаценне*	рыпат*	рыпатлівы*
–	слізгаценне	слізгат*	слізгатлівы*
–	стракаценне*	строкат	стракатлівы*
–	стукаценне*	стукат	стукатлівы*
–	траскаценне*	трэскат*	траскатлівы
–	тупаценне	тупат	тупатлівы
–	хлюпаценне	хлюпат	хлюпатлівы*
–	шалясценне	шэлест	шалестлівы*
–	шапаценне	шэпт	шапатлівы*
–	шарахценне*	шорах	шарахлівы*
–	шаргаценне	шоргат	шаргатлівы*
–	шархаценне	шорхат	шархатлівы*
–	гукаценне*	гукат*	–
–	плюхаценне*	плюхат*	–
–	плюхценне*	плюхат*	–
–	туркаценне*	туркат*	–

Працяг табл. 5-д (л.).

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
храбусцець	храбусціць	храбусцяць	храбусцеў	храбусці
хрыбусцець	хрыбусціць	хрыбусцяць	хрыбусцеў	хрыбусці
шалахцець	шалахціць	шалахцяць	шалахцеў	шалахці
шурхацець*	шурхаціць	шурхацяць	шурхацеў	шурхаці
мільгацець	мільгаціць	мільгацяць	мільгацеў	мільгаці
шалпацець	шалпаціць	шалпацяць	шалпацеў	шалпаці
шамацець+	шамаціць	шамацяць	шамацеў	шамаці
бубацець	бубаціць	бубацяць	бубацеў	бубаці
дыхцець	дыхціць	дыхцяць	дыхцеў	дыхці
капацець	капаціць	капацяць	капацеў	капаці
пыхцець	пыхціць	пыхцяць	пыхцеў	пыхці
рабацець	рабаціць	рабацяць	рабацеў	рабаці
тарахцець	тарахціць	тарахцяць	тарахцеў	тарахці
трупцець	трупціць	трупцяць	трупцеў	трупці
трымцець	трымціць	трымцяць	трымцеў	трымці
рагацець*	рагаціць	рагацяць	рагацеў	рагаці
сакацець*	сакаціць	сакацяць	сакацеў	сакаці
брынкацець*	брынкаціць	брынкацяць	брынкацеў	брынкаці
гаўкацець*	гаўкаціць	гаўкацяць	гаўкацеў	гаўкаці
гуркацець*	гуркаціць	гуркацяць	гуркацеў	гуркаці
дрынкацець*	дрынкаціць	дрынкацяць	дрынкацеў	дрынкаці
піскацець*	піскаціць	піскацяць	піскацеў	піскаці
пырскацець*	пырскаціць	пырскацяць	пырскацеў	пырскаці
трапацець*	трапаціць	трапацяць	трапацеў	трапаці
фыркацець*	фыркаціць	фыркацяць	фыркацеў	фыркаці
карпацець*	карпаціць	карпацяць	карпацеў	карпаці
зіркацець*	зіркаціць	зіркацяць	зіркацеў	зіркаці
сіпацець*	сіпаціць	сіпацяць	сіпацеў	сіпаці
грамацець*	грамаціць	грамацяць	грамацеў	грамаці
плюскацець*	плюскаціць	плюскацяць	плюскацеў	плюскаці

Працяг табл. 5-д (п.).

Іменныя формы дзеяслова		**Назоўнікі і прыметнікі**	
пасіў	**герундыум**	**-ат**	**-лів-, -к-, -енн-**
–	храбусценне	хробаст*	–
–	хрыбусценне*	хробаст*	–
–	шалахценне	шолах	–
–	шурхаценне*	шурхат*	–
–	мільгаценне	–	мільгатлівы*
–	шалпаценне*	шолпат	шалпатлівы
–	шамаценне	–	шаматлівы
–	бубаценне*	–	–
–	дыхценне*	–	–
–	капаценне*	–	–
–	пыхценне*	–	–
–	рабаценне*	–	–
–	тарахценне	–	–
–	трупценне*	–	–
–	трымценне	–	–
–	–	рогат	рагатлівы*
–	–	сокат	сакатлівы
–	–	брынкат*	–
–	–	гаўкат*	–
–	–	гуркат*	–
–	–	дрынкат*	–
–	–	піскат*	–
–	–	пырскат*	–
–	–	тропат	–
–	–	фыркат*	–
–	–	–	карпатлівы
–	–	–	зіркатлівы*
–	–	–	сіпатлівы*
–	–	–	–
–	–	–	–

Працяг табл. 5-д (л.).

Інфінітыў	3-я асоба, цяпер. час		Прошлы час	Загадны лад
	адз. л.	мн. л.		
тахкацець*	тахкаціць	тахкацяць	тахкацеў	тахкаці
цуркацець*	цуркаціць	цуркацяць	цуркацеў	цуркаці
якацець*	якаціць	якацяць	якацеў	якаці
яўкацець*	яўкаціць	яўкацяць	яўкацеў	яўкаці
хрумсцець+	хрумсціць	хрумсцяць	хрумсцеў	хрумсці
летуцець	летуціць	летуцяць	летуцеў	летуці

Асаблівасць класу ілюмінатыўных дзеясловаў у тым, што ад іх утвараюцца не толькі працэсуальныя назоўнікі *рыпенне, трашчанне, бурчанне, пішчанне*, рэзультатыўныя назоўнікі *рып, трэск, піск*, але і рэзультатыўна-серыйныя – *трэскат, буркат, піскат, бляскат, дрога*т і нават *крыкат, гукат*. Варта падкрэсліць: рэзультатыўна-серыйныя дэрываты значна прадукцыйнейшыя за папярэднія. Зрэшты, 2-я група практычна не ўтварае рэзультатыўна-серыйныя назоўнікі, затое ад дзеясловаў 3-й групы яны ўтвараюцца блізу рэгулярна. Няма такіх дэрыватаў хіба толькі ад негукапераймальных дзеясловаў *маўчаць, тырчаць*, не знайшлося і ад *дзюрчэць, цурчэць*, але гэта не значыць, што ад апошніх не могуць знайсціся. Калі ж знаходзім рэзультатыўна-серыйныя дэрываты, ў 2-й групе, накшталт *рыпат* (адзіны, які нам вядомы), то ён таксама паходзіць ад гукапераймальных дзеясловаў.

А ўжо ад рэзультатыўна-серыйных назоўнікаў, сваім парадкам, утвараюцца другасныя ілюмінатывы, якія становяць асобны падклас імітатыўна-акцэлератыўных дзеясловаў *бліскацець, траскацець* і г. д. Каб не перагружаць табл. 5-в (п.) і 5-г (п.), мы азначылі наяўнасць рэзультатыўна-серыйных дэрыватаў знакам + у апошняй калонцы, а іх узоры падалі ў табл. 5-д (п.), тым самым перакінуўшы масток паміж першаснымі і другаснымі ілюмінатывамі. Няма бадай што ніводнага выпадку, каб рэзультатыўна-серыйны назоўнік не стаў прыступкай да ўтварэння імітатыва. Напомнім, імітатыўныя дзеясловы вылучаюцца ў трох розных класах і становяць сабой міжкласавы кластар, але ў клас ілюмінатыўных уваходзяць толькі акцэлератыўныя, якія перадаюць самы хуткасны паўтор дзеяння. Іх характарыстыкі, як фармальныя, так і семантычныя, можна не называць, бо яны ідэальна рэалізуюць ілюмінатыўнасць як такую: і націск на тэматычным галосным ***-е-***, і непераходнасць пры нейтральнай версіі, і немажлівасць пасіўных

Працяг табл. 5-д (п.).

Іменныя формы дзеяслова		**Назоўнікі і прыметнікі**	
пасіў	**герундыум**	**-ат**	**-лів-, -к-,-енн-**
–	–	плюскат	–
–	–	цуркат*	–
–	–	ёкат*	–
–	–	–	–
–	хрумсценне*	хрумст*	хрумсткі
–	летуценне	–	летуценны

дзеепрыметнікаў пры рэгулярным утварэнні дзееназоўнікаў, хоць і не да кожнага дзеяслова апошнія знайшліся.

Трэба зазначыць, што імітатыўна-акцэляратыўныя дзеясловы патэнцыйна – даволі прадукцыйныя, толькі іх не патрабуецца вялікая колькасць. Выпадкі, пазначаныя ў табл. 5-д (л.) знакам*, не фіксуюцца ў ГСД, няма ў нарматыўных слоўніках і дзееназоўнікаў, назоўнікаў ды прыметнікаў, пазначаных у табл. 5-д (п.)*, але ўва ўжытку іх колькасць штодня расце, нам без намаганняў удалося ледзь не падвоіць спіс ГСД. Кваліфікаванне ілюмінатыўных дзеясловаў, асабліва найактыўнейшай часткі – імітатыўна-акцэляратыўных, як непрадукцыйных не спрыяе іх разуменню. “Неўзаконеных” жа іменных дэрыватаў знайшлося яшчэ больш. У табліцах дзеясловы і іменныя дэрываты падаюцца па меры вычэрпвання і ў парадку спадання рэгулярнасці: дзееназоўнікі, потым назоўнікі і нарэшце – прыметнікі.

Наагул дзееназоўнікі не мусяць вычэрпвацца, вычэрпваюцца, як можна заўважыць, ад тых дзеясловаў, якія не падаюцца ў ГСД, г. зн. нечастотных. Да дзеясловаў з ГСД, адпаведна, не заўсёды знаходзяцца ў ГСН дзееназоўнікі, давялося браць іх з інтэрнэту. Інакш кажучы, калі дзеяслоў частотны, то дзееназоўнік да яго не заўсёды частотны, а калі дзеяслоў нечастотны, то дзееназоўніка можа не знайсціся зусім, хоць ніякіх перашкод да яго ўзнікнення як бы няма. А для рэзультатыўна-серыйных назоўнікаў могуць здарацца і перашкоды, семантычныя ці фанетычныя. Нягледзячы на тое, што імітатыўна-акцэляратыўныя дзеясловы паходзяць ад рэзультатыўна-серыйных назоўнікаў, не да ўсіх знайшліся выточныя словы, да пэўных дзеясловаў, як *мільгацець, бубацець, зіркацець, сіпацець* мабыць, ніколі і не існавала адпаведных назоўнікаў, што, як і ў выпадку з ***-нн-е***, сведчыць пра самастойнасць фарманта ***-ц-е-***. Затое прыметнікі з суфіксам ***-лів-***, мабыць, утвараюцца

ад усіх імітатыўна-акцэлератыўных дзеясловаў, хоць і не ўсе патэнцыі мелі рэалізацыю. Цікава назіраць на фоне стабільнасці ***-лів-***, што суфікс ***-уч-*** з дзеясловамі 2-й групы спалучаўся часта, з дзеясловамі 3-й групы – рэдка, а ў імітатыўна-акцэлератыўных дзеясловах дэрываты з ***-уч-***, як выявілася, немажлівыя. У цэлым прыметнікі на ***-уч-ы*** і ***-лів-ы***, мабыць, конгеніяльныя ілюмінатыўным дзеясловам, але пакуль што спыняцца на гэтым не будзем.

Два ніжнія радкі табл. 5-д (л.) займаюць дзеясловы *хрумсцець* і *летуцець*, якіх там не павінна быць у прынцыпе, гэтыя дзеясловы мусілі б знаходзіцца ў табл. 5-в (л.) (хоць і там яны будуць выбівацца з агульнага стандарту). Яны падобныя да імітатыўна-акцэлератыўных дзеясловаў, а насамрэч *хрумст* не рэзультатыўна-серыйны назоўнік, а проста рэзультатыўны, іначай ён мусіў бы мець выгляд **~~хрумкат~~* ці **~~хрумат~~*, дэрыват жа быў бы – **~~хрумкацець~~*. А дзеяслоў *летуцець* мусіў бы мець форму **~~летацець~~* і матываваць назоўнікам **~~лётат~~*, тады ад яго ўтвараўся б прыметнік **~~летатлівы~~*. Аднак у рэальнасці нічога падобнага няма, і мы ад назоўніка *хрумст* маем прыметнік *хрумсткі*, а ад *летуценне* – прыметнік *летуценны*. Гэтая неадпаведнасць паказвае, якая істотная розніца між першаснымі і другаснымі ілюмінатывамі, а таксама паказвае, як прыналежнасць да розных падкласаў уплывае на дэрывацыйную валентнасць дзеясловаў. Усведамленне гэтай розніцы дапаможа зразумець і анамаліі ілюмінатываў з табл. 5-а і 5-б (і левых і правых), для гэтага вернемся ў самы пачатак раздзелу.

Дзеясловы з табл. 5-а (л.) – пераходныя, і гэта, здавалася б, так падрывае карэляцыю зместу і формы, што спасылка на іх архаічнасць слаба ратуе. Але гэтыя дзеясловы адрозніваюцца ад апісаных вышэй ілюмінатываў не толькі зместам. Дзеяслоў *відзець* мае націск не на тэматычным галосным, а на корані. Нібыта ён адзін такі, але, калі возьмем формы цяперашняга часу, то націск на корані выявім у іншых квазіілюмінатыўных дзеясловах: *верцяць, дзержаць, хочуць, гоняць*. А калі дадамо сюды і прыстаўкавыя перфектывы, то націск на корані знойдзецца і ў рэшты, у тым ліку ў ілюмінатывах 1-й групы: *угледзіць, улежыць, устоіць, наседзіць*. Нічога падобнага няма ў 2-й і 3-й групах, перфектывы: *зазвініць, накрычыць* – ува ўсіх формах захоўваюць націск на суфіксе. Толькі самы нетыповы дзеяслоў з 3-й групы – *змоўчаць* – перажывае змену месца націску. А значыць, як квазіілюмінатывы, так і ілюмінатывы 1-й групы выбіваюцца з свайго класу фармальна, а за гэтымі праявамі формы стаяць і змястоўныя адрозненні, некаторыя з іх не адразу кідаюцца ў вочы. І зусім невыпадкова ўсе анамальныя дзеясловы – архаічныя.

Ёсць заканамернасць: калі ў інфінітыве націск стаіць на корані (*відзець*), то ў астатніх формах ён ніколі не пераходзіць на суфікс, а калі

ў інфінітыве націск на суфіксе, то ён можа як перамяшчацца на корань (*вярцець*), так і стала заставацца на суфіксе (*звінець*). І ніколі не бывае так, каб націск, які стаяў у інфінітыве на корані, у цяперашнім часе перайшоў на суфікс. Гэтае правіла слушнае як для ілюмінатыўных дзеясловаў, так і для фактытыўных. Націск на тэматычным галосным сігналізуе пра дуратыўнасць дзеяння, пра недакончанасць трывання і пра непераходнасць дзеяслова, а перанос націску на корань звязаны з перфектыўнасцю дзеяння, дакончаным трываннем і пераходнасцю дзеяслова. Гэтая заканамернасць істотная для разумення беларускага дзеяслова, але яна – неадназначная, можна сказаць, дыялектычная, і часам пераходзіць у сваю супраціўнасць.

Возьмем, прыкладам, дэрываты з прыстаўкай ***на-*** (тою, якую С. Карцэўскі назваў "адзінай строга пераходнай" [Карцевский 2004: 114]) ад дзеясловаў 1-й групы *стаяць, сядзець, ляжаць* (тлумачэнні слоў даюцца паводле ТСБМ у скарочаным выглядзе):

1) ***настаяць*** 'ператварыць подсціл у гной' – к у м у л я т ы ў;
2) ***настояць*** 'зрабіць настойку або настой' – к а ў з а т ы ў;
3) ***насядзець***, гл. *наседзець*;
4) ***наседзець*** а) 'сагрэць яйкі' – к а ў з а т ы ў;
б) 'нажыць хваробу' – к у м у л я т ы ў;
5) ***наляжаць*** 'атрымаць пралежні' – к у м у л я т ы ў;
6) ***належаць*** 'быць уласнасцю' – р э л я ц ы й н ы дзеяслоў.

Усе няцотныя прыклады маюць націскі на суфіксе, цотныя – на корані, іх значэнні, згодна з ТСБМ, у двух выпадках не супадаюць, а ў адным нібыта супалі. Аднак і пры супадзенні кумулятыўны чын больш пасуе дзеяслову з націскам на суфіксе. Калі гэта так, то дзеясловы з націскам на суфіксе ўва ўсіх трох выпадках – гэта перфектывы да *стаяць, сядзець, ляжаць*, і чыны ўва ўсіх трох выпадках супадаюць. У цотных прыкладах з націскам на корані ў двух першых выпадках утвараюцца каўзатыўныя дзеясловы, а ў апошнім – рэляцыйны. І калі ў першых двух выпадках пераходнасць узмацняецца (бо каўзатыўная пераходнасць наймацнейшая), то ў апошнім выпадку – усё наадварот, утвараецца дзеяслоў *належаць*, які не толькі непераходны, але і не можа быць пераходным, дый не можа мець дакончанага трывання. Гэта той выпадак, пра які А. Шахматаў пісаў: "Спачатку ўсе складзеныя з прыймёнамі дзеясловы мелі значэнне дакончанага трывання", пакуль не "былі парушаныя выточныя ўмовы адрознівання відаў з прычыны неалагізмаў, новых штучных утварэнняў" [Шахматов 1952: 207].

Фактычна ў цотных прыкладах перад намі дзеясловы, якія не могуць ужо разглядацца як перфектывы да *стаяць, сядзець, ляжаць*. Праўда, калі ў першых двух выпадках новы іншай прыроды дзеяслоў

сяк-так прыстасоўваецца да старых, захоўваючы з імі і семантычную, і граматычную лучнасць, ужыўляецца ў іх, то ў апошнім адбываецца поўны адрыў ад значэння першаснага дзеяслова. Дыялектыка тут у тым, што пераходнасць, якая мусіла б узрасці, пры адрыве не ўзнікае, відаць, таму, што не адбываецца перфектывацыя.

Квазіілюмінатыўныя дзеясловы (пераходнасць якіх задаецца ад пачатку і абумоўліваецца іх лексічнай семантыкай), натуральна, здольныя ўтвараць пасіўныя дзеепрыметнікі прошлага часу, але не сказаць каб тут назіралася нейкая паслядоўнасць. Ад *відзець* маем толькі кароткую форму *відзён* ды атавістычны прыметнік (былы пасіў цяперашняга часу) – *відомы*, ад *дзяржаць* і *вярцець* – толькі пасівы ў форме перфектываў – *адзержаны* ды *заверчаны*, ад аднаскладовага *імчаць (мчаць)* і рознаспрагальнага *хацець* дзеепрыметнікаў няма зусім, і толькі ад *гнаць* (дэфармаванага фактытыва *гони́ть*) і *глядзець* маем *гнаны* і *гледжаны*. Інакш кажучы, пераходнасць тут не вельмі спрыяе ўтварэнню пасіўных дзеепрыметнікаў. Дый аднакаранёвыя прыметнікі – *відны, няўздзержны, гонкі, вёрткі, вяртлявы, імклівы* – не даюць дакладнага словаўтваральнага алгарытму – тыповы выпадак “здрабнення” і “рассейвання” [Виноградов 1972: 356] граматычных формаў. Прыклад квазіілюмінатыўных і імітатыўна-акцэлератыўных дзеясловаў паказвае, як у абсягах аднаго класу могуць суіснаваць атавістычныя непрадукцыйныя з’явы і новыя прадукцыйныя.

Ёсць свае вартыя ўвагі адметнасці і ў дэрывацыйным атачэнні ілюмінатываў 1-й групы. З аднаго боку, яны не моцна розняцца ад 2-й і 3-й груп: дзеясловы 1-й групы таксама ўтвараюць герундыум і не ўтвараюць пасіў. З іншага боку, ад іх не ўтвараюцца прыметнікі на ***-уч-ы (-юч-ы)***, тыповыя для 2-й групы, затое ёсць дэрываты на ***-ач-ы (-яч-ы)***: *спячы, ляжачы, стаячы, сядзячы*. Гэта таксама прыметнікі, а не дзеепрыметнікі, але, у адрозненне ад утварэнняў на ***-уч-ы***, яны маюць уласцівасці і дзеепрыметнікаў, таму могуць ужывацца ў гэтай якасці. Таксама варта звярнуць увагу на тое, што названыя дзеепрыметнікі не супадаюць з дзеепрыслоўямі: *сплючы́, ле́жачы, стоячы, се́дзячы*. А значыць, няма падстаў для неўжывання дзеепрыметнікаў, бо менавіта супадзенне іх з дзеепрыслоўямі паслужыла падставай для элімінацыі такіх дзеепрыметнікаў з літаратурнай мовы [Чорны 1973: 112]. Цікава, што і іншыя ілюмінатывы могуць утвараць падобныя дзеепрыметнікі: *вісячы, сіпячы, ляцячы, крычачы, дрыжачы, пішачы*, якія не супадаюць ні з дзеепрыслоўямі: *вісючы́, сіпучы́, летучы́, крычучы́, дрыжучы́, пішучы́*, ні з прыметнікамі: *лятучы, крыкучы, дрыгучы, піскучы*. Гэтыя факты ў значнай меры пацвярджаюць меркаванні тых лінгвістаў, якія выступалі за ўжыванне актыўных дзеепрыметнікаў [гл.: Бузук 1928: 111–116]. Але

пакінем гэтую пабочную праблему адкрытай, бо яна мае разглядацца асобна, і то практычна.

Анонс у якасці замкнення

У канцы даследавання традыцыйна прынята рабіць высновы, аднак наша апісанне класаў дзеяслова далёкае ад завершання. Мы апісалі два класы, а не апісанымі застаюцца яшчэ сем, аб'ёмнейшыя ды складанейшыя за кампактныя і празрыстыя класы разгледжаных тут дзеясловаў. І таму замест падагульнення зробім невялікую анатацыю таго, што стане працягам гэтага артыкула.

Раздзел *2.4. Медыятыўныя дзеясловы (I)* будзе пачынацца словамі:

> Цяпер мы звернемся да класу дзеясловаў, які можна назваць анталагічным пачаткам усіх класаў (бо статыўныя выканалі ролю гнасеалагічнага пачатку). У сінхраніі дзеясловы першага спражэння з тэматычным галосным ***-а-*** могуць выступаць як немаркіраваныя. І гэта не адзін клас, а два: прадукцыйныя дзеясловы з чаргаваннем ***-а- / -аj-***, накшталт *чытаць / чытае*, і непрадукцыйныя з чаргаваннем ***-а- / Ø***, накшталт *пісаць / піша*. Прадукцыйны клас на ***-а-*** запраўды мусіць называцца медыятыўным, бо гэта "мора, дзе зліваюцца ўсе рэкі" – няма такога класу, які б не ўліўся ў яго, а непрадукцыйныя дзеясловы на ***-аць*** (якраз яны стаяць на чарзе) – гэта нешматлікі атавістычны клас, і ў яго не пераходзяць астатнія класы пасля прэфіксацыі. І ўсё ж, нельга не ўлічваць таго, што паміж абодвума класамі адбываецца сталая канверсія – зазвычай непрадукцыйныя дзеясловы на ***-аць*** пераходзяць у прадукцыйныя (ці наадварот). Пры гэтым канверсія практычна не адбіваецца на семантыцы – ці таму, што паміж класамі проста не існуе семантычнай розніцы, ці таму, што суфікс ***-а-*** не нясе ніякай спецыфічнай семантыкі і абодва класы немаркіраваныя. З гэтай прычыны пажадана, каб абодва класы мелі супольную назву.
>
> Дагэтуль апісваныя класы былі непераходныя. А медыятывы сярод усіх непрадукцыйных дзеясловаў з тэматычным галосным – адзіны клас, які ў асноўнай масе – пераходны. Гэта, можна сказаць, "самыя дзеяслоўныя" з разгляданых дагэтуль дзеясловаў, бо без пераходнасці славянскі дзеяслоў у прынцыпе не можа адбыцца як часціна мовы. У гэтым і палягае анталагічнае значэнне медыятываў-I. Праўда, пераходнасць – з'ява не абсалютная, менш стабільная за непераходнасць (што асабліва заўважаецца на тле абсалютыўнасці статыўных дзеясловаў), таму сярод медыятываў сустракаюцца і непераходныя, а адзін з падкласаў у іх цалкам непераходны.

А раздзел *2.5. Афарматыўныя дзеясловы* пачнецца так:

> Афарматыўныя, ці інакш атэматычныя [Исаченко 1960: 86], дзеясловы – адзіныя, якія не ёсць класам у поўным значэнні гэтага слова, яны становяць сабой комплекс архаічных груп. У адных – "аснова інфінітыва зусім адарваная ад асновы цяперашняга часу" [Виноградов 1972: 355],

у другіх “выяўляецца пэўны паралелізм з прадукцыйнымі класамі” [Виноградов 1972: 356]. Аднак і гэтыя “не ўплываюць паводле аналогіі на іншыя дзеясловы” [Карцевский 2004: 88]. Дык “ці варта вылучаць такія дзеясловы ў асобныя класы ці проста разглядаць як адзінкавыя” [Кузнецов 1952: 272]? А калі яны фармальна супадаюць з тэматычнымі, то ці варта першыя далучаць да другіх на падставе вонкавага падабенства? Далучэнне толькі разбурае семантычнае адзінства тэматычных класаў. Сумнеў выклікае нават тое, што атэматычныя дзеясловы маглі служыць прататыпамі для тэматычных, хутчэй яны супалі выпадкова.

Агулам афарматыўныя дзеясловы дзеляцца на тыя, у якіх безафіксная аснова сканчаецца на зычныя (кансанантныя), і тыя, у якіх аснова канчаецца на галосныя (вакалічныя), але гэтая апазіцыя не мае семантычных карэлятаў. Кансанантныя дзеясловы з’яўляюць нават адметнае фанетычнае аблічча: на *-ці* (*церці*) і на *-чы* (*пячы*), якое не мае аналагаў у іншых класах. Але тут гармонію “псуюць” вакалічныя з іх анархіяй і “паралелізмам” з тэматычнымі класамі. Калі і ў А. Вастокава, і ў А. Шахматава асноўная колькасць таксонаў узрастала якраз за кошт атэматычных дзеясловаў, то С. Карцэўскі нават не ставіўся да іх усур’ёз, калі В. Вінаградаў мусіў знайсці для іх месца сярод тэматычных класаў, то А. Ісачанка вылучаў па-за класамі як асобныя групы і “ізаляваныя дзеясловы” [Исаченко 1960: 97–126]. Мы, не маючы намеру пераймаць нейчы досвед, прыйшлі да выніку, падобнага як у А. Ісачанкі, з тою толькі розніцай, што аб’ядналі гэтыя групы ў адзін клас. Для гэтага ёсць не толькі фармальныя падставы (кансанантныя дзеясловы), але і семантычныя, на якіх далей варта будзе спыніцца асобна.

Фрагменты анансаванага працягу паказваюць, у якім кірунку мае развівацца наша даследаванне. Ведаць гэта важна не толькі дзеля перспектывы, але і дзеля больш глыбокага разумення ўсяго сказанага вышэй. Бо значэнне кожнага класа дзеясловаў раскрываецца ў яго апазіцыі да астатніх класаў. Аналіз усіх класаў павінен завершыцца сінтэзам у кластарах, што ўспаміналася вышэй, і толькі тады мы будзем мець уяўленне пра сістэму беларускага дзеяслова, а ўжо на гэтай аснове можа рабіцца апісанне чынаў[2].

References

Agrell’ Sigurd. 1962. *O sposobah dejstviâ pol'skogo glagola* (35–39). V: *Voprosy glagol'nogo vida*. Moskva: Izdatel'stvo inostrannoj literatury [Агрелль Сигурд. 1962. *О способах действия польского глагола* (35–39). В: *Вопросы глагольного вида*. Москва: Издательство иностранной литературы].

Antichnyye teorii yazyka i stilya. 1936. Moskva – Leningrad: OGIZ-SOTSEGIZ [*Античные теории языка и стиля*. 1936. Москва – Ленинград: ОГИЗ-СОЦЭГИЗ].

Avilova Natal’ya. 1976. *Vid glagola i semantika glagol’nogo slova*. Moskva: Nauka [Авилова Наталья. 1976. *Вид глагола и семантика глагольного слова*. Москва: Наука].

[2] Гэтае даследаванне стала мажлівым дзякуючы матэрыялам з корпусу дзеяслова, ласкава ўзычаным аўтару светлай памяці Фёдарам Піскуновым.

Bielaruskaja hramatyka ŭ dzviuch častkach. 1985. Č. 1. *Fanalohija. Arfaepija. Marfalohija. Slovaŭtvarennie. Nacisk*. Red. M.V. Biryla, P.P. Šuba. Minsk: Navuka i technika [*Беларуская граматыка ў дзвюх частках*. 1985. Ч. 1. *Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск*. Рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба. Мінск: Навука і тэхніка].

Bondarko Aleksandr, Bulanin Lev. 1967. *Russkiy glagol*. Leningrad: Prosveshcheniye [Бондарко Александр, Буланин Лев. 1967. *Русский глагол*. Ленинград: Просвещение].

Bromley Sof'ya. 1965. *Printsipy klassifikatsii glagola v sovremennom russkom yazyke*. "Voprosy yazykoznaniya" № 5: 67–83 [Бромлей Софья. 1965. *Принципы клас–сификации глагола в современном русском языке*. "Вопросы языкознания" № 5: 67–83].

Bušliakoŭ Juraś. 2002. *Jan Stankievič jak ideoliah bielaruskaha moŭnaha puryzmu* (534–578). U: Jan Stankievič. *Zbor tvoraŭ u 2 tamoch*. T. 2. Minsk: Encyklapiedyks: [Бушлякоў Юрась. 2002. *Ян Станкевіч як ідэоляг беларускага моўнага пурызму* (534–578). У: Ян Станкевіч. *Збор твораў у 2 тамох*. Т. 2. Мінск: Энцыклапедыкс:].

Buzuk Piotr. 1928. *"Kuĺtura movy" ŭ "Uzvyššy"*. "Maladniak" № 5–6: 111–116 [Бузук Пётр. 1928. *"Культура мовы" ў "Узвышшы"*. "Маладняк" № 5–6: 111–116].

Čorny Kuźma. 1973. *Zbor tvoraŭ u 8-i tamach*. T. 8. Minsk: Mastackaja litaratura [Чорны Кузьма. 1973. *Збор твораў у 8-і тамах*. Т. 8. Мінск: Мастацкая літаратура].

DABM *(Dyjaliektalahičny atlas bielaruskaj movy).* Minsk: Vydaviectva AN BSSR, 1963 [*ДАБМ (Дыялекталагічны атлас беларускай мовы)*. Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1963].

ESBM-5 *(Etymalahičny sloŭnik bielaruskaj movy*. T. 5. K–L). Red. V.U. Martynaŭ. 1989. Minsk: Navuka i technika [*ЭСБМ-5 – Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*. Т. 5. К–Л. Рэд. В.У. Мартынаў. 1989. Мінск: Навука і тэхніка].

Fortunatov Filipp. 1899. *O zalogakh russkago glagola*. Sankt-Peterburg: Tipografíya Imperatorskoy Akademii Nauk [Фортунатовъ Филиппъ. 1899. *О залогахъ русскаго глагола*. Санкт-Петербургъ: Типографія Императорской Академіи Наукъ].

Galkina-Fedoruk Yevdokiya. 1957. *Sovremennyy russkiy yazyk: Leksikografiya. Fonetika. Morfologiya*. Moskva. Uchpedgiz [Галкина-Федорук Евдокия. 1957. *Современный русский язык : Лексикография. Фонетика. Морфология*. Москва: Учпедгиз].

Gorbova Yelena. 1999*. Opyt razrabotki universal'noy klassifikatsii kharakterov glagol'nogo deystviya* (7–13). V: *Materialy XXVIII mezhvuzovskoy nauchno-metodicheskoy konferentsii prepodavateley i aspirantov*. Vyp. 16. *Sektsiya obshchego yazykoznaniya*. Chast' 1. Sankt-Peterburg: Izdatel'stvo Sankt-Peterburgskogo universiteta [Горбова Елена. 1999. *Опыт разработки универсальной классификации характеров глагольного действия* (7–13). В: *Материалы XXVIII межвузовской научно-методической конференции преподавателей и аспирантов*. Вып. 16. *Секция общего языкознания*. Часть 1. Санкт-Петербург: Издательство Санкт-Петербургского университета].

Gorbova Yelena. 2017. *Grammaticheskaya kategoriya aspekta i kontekst (na materiale ispanskogo i russkogo yazykov)*. Sankt-Peterburg: Izdatel'stvo Sankt-Peterbgskogo universiteta [Горбова Елена. 2017. *Грамматическая категория аспекта и контекст (на материале испанского и русского языков)*. Санкт-Петербург: Издательство Санкт-Петербгского университета].

Grammatika russkogo yazyka v 2 tomakh. 1952. T. I. Red. V.V. Vinogradov, Ye.S. Istrina, S.G. Barkhudarov. Moskva: Izdatel'stvo AN SSSR [*Грамматика русского языка в 2 томах*. 1952. Т. I. Ред. В.В. Виноградов, Е.С. Истрина, С.Г. Бархударов. Москва: Издательство АН СССР].

Grammatika russkogo yazyka v 2 tomakh. 1960. T. I. Red. V.V. Vinogradov, Ye.S. Istrina, S.G. Barkhudarov. Moskva: Izdatel'stvo AN SSSR [*Грамматика русского языка*

в 2 томах. 1960. Т. I. Ред. В.В. Виноградов, Е.С. Истрина, С.Г. Бархударов. Москва: Издательство АН СССР].

Grammatika sovremennogo russkogo literaturnogo yazyka. Red. N.Yu. Shvedova. 1970. Moskva: Nauka [*Грамматика современного русского литературного языка*. Ред. Н.Ю. Шведова. 1970. Москва: Наука].

Gvozdev Aleksandr. 1958. *Sovremennyy russkiy literaturnyy yazyk*. Ch. 1: Fonetika. Morfologiya. Moskva: Uchpedgiz [Гвоздев Александр. 1958. *Современный русский литературный язык*. Ч. 1: *Фонетика. Морфология*. Москва: Учпедгиз].

Hramatyka bielaruskaj movy ŭ 2 tamach. 1962. T. 1: *Marfalohija*. Red. K.K. Atrachovič, M.H. Bulachaŭ. Minsk: Vydaviectva AN BSSR [*Граматыка беларускай мовы ў 2 тамах*. 1962. Т. 1: *Марфалогія*. Рэд. К.К. Атраховіч, М.Г. Булахаў. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

HSD *(Hramatyčny sloŭnik dziejaslova: A–Ja)*. 2013. Minsk: Bielaruskaja navuka [ГСД *(Граматычны слоўнік дзеяслова: А–Я*. 2013. Мінск: Беларуская навука].

HSN (*Hramatyčny sloŭnik nazoŭnika: A–Ja*). 2013. Minsk: Bielaruskaja navuka [ГСН *(Граматычны слоўнік назоўніка: А–Я)*. 2013. Мінск: Беларуская навука].

HSP (*Hramatyčny sloŭnik prymietnika, zajmiennika, ličebnika, prysloŭja: A–Ja*). 2013. Minsk: Bielaruskaja navuka [ГСП *(Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя: А–Я)*. 2013. Мінск: Беларуская навука].

Isachenko Aleksandr. 1960. *Grammaticheskiy stroy russkogo yazyka v sopostavlenii s slovatskim. Morfologiya*. Ch. 2. Bratislava: Izdatel'stvo Slovatskoy Akademii Nauk [Исаченко Александр. 1960. *Грамматический строй русского языка в сопоставлении с словацким*. Морфология. Ч. 2. Братислава: Издательство Словацкой Академии Наук].

Jankoŭski Fiodar. 1989. *Histaryčnaja hramatyka bielaruskaj movy*. Minsk: Vyšejšaja škola [Янкоўскі Фёдар. 1989. *Гістарычная граматыка беларускай мовы*. Мінск: Вышэйшая школа].

Kartsevskiy Sergey. 2004. *Sistema russkogo glagola* (31–205). V: *Kartsevskiy Sergey. Iz lingvisticheskogo naslediya*. T. II. Moskva: Yazyki slavyanskoy kul'tury [Карцевский Сергей. 2004. *Система русского глагола* (31–205). В: Карцевский Сергей. *Из лингвистического наследия*. Т. II. Москва: Языки славянской культуры].

Kaŭrus Aliaksiej. 2011. *Da svajho slova: Pytanni kuĺtury movy*. Minsk: RIVŠ [Каўрус Аляксей. 2011. *Да свайго слова: Пытанні культуры мовы*. Мінск: РИВШ].

Kholodovich Aleksandr. 1963. *O predel'nykh i nepredel'nykh glagolakh (po dannym koreyskogo i yaponskogo yazykov)*. V: *Filologiya stran Vostoka*. Leningrad: Izdatel'stvo Leningradskogo universiteta [Холодович Александр. 1963. *О предельных и непредельных глаголах (по данным корейского и японского языков)*. В: *Филология стран Востока*. Ленинград: Издательство Ленинградского университета].

Klimov Georgiy. 2009. *Tipologiya yazykov aktivnogo stroya*. Moskva: Knizhnyy dom «LIBROKOM» [Климов Георгий. 2009. *Типология языков активного строя*. Москва: Книжный дом «ЛИБРОКОМ»].

Knyazev Yuriy. 2007. *Grammaticheskaya semantika: Russkiy yazyk v tipologicheskoy perspektive*. Moskva: Yazyki slavyanskikh kul'tur [Князев Юрий. 2007. *Грамматическая семантика: Русский язык в типологической перспективе*. Москва: Языки славянских культур].

Komte Rozhe. 2006. *O klassifikatsii slavyanskogo glagola v pervoy polovine XX veka: Pol' Buayye, Sergey Kartsevskiy i Antuan Meyye*. "Voprosy yazykoznaniya" № 1: 102–122 [Комте Роже. 2006. *О классификации славянского глагола в первой половине XX века: Поль Буайе, Сергей Карцевский и Антуан Мейе*. "Вопросы языкознания" № 1: 102–122].

Krivitskiy Aleksandr. 1990. *Morfologiya* (80–219). V: Krivitskiy Aleksandr, Mikhnevich Arnol'd, Podluzhnyy Aleksandr. *Belorusskiy yazyk dlya govoryashchikh po-russki*. Minsk: Vysheyshaya shkola [Кривицкий Александр. 1990. *Морфология* (80–219). В: Кривицкий Александр, Михневич Арнольд, Подлужный Александр. *Белорусский язык для говорящих по-русски*. Минск: Вышэйшая школа].

Kuznetsov Potr. 1952. *Glagol*. V: *Sovremennyy russkiy yazyk. Morfologiya (Kurs lektsiy)*. Red. V. Vinogradov. Moskva: Izdatel'stvo Moskovskogo universiteta: 251–361 [Кузнецов Пётр. 1952. *Глагол*. В: *Современный русский язык. Морфология (Курс лекций)*. Ред. В. Виноградов. Москва: Издательство Московского университета: 251–361].

Lomtev Timofey. 1956. *Grammatika belorusskogo yazyka: posobiye dlya universitetov i pedagogicheskikh institutov*. Moskva: Uchpedgiz [Ломтев Тимофей. 1956. *Грамматика белорусского языка: пособие для университетов и педагогических институтов*. Москва: Учпедгиз].

Mackievič Juzefa. 1959. *Marfalohija dziejaslova ŭ bielaruskaj movie*. Minsk: Vydaviectva AN BSSR [Мацкевіч Юзэфа. 1959. *Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове*. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Martynaŭ Viktar, Šuba Paviel. Jarmaš Mikalaj. 1967. *Marfiemnaja dystrybucyja ŭ bielaruskaj movie: Dziejasloŭ*. Minsk: Navuka i technika [Мартынаў Віктар, Шуба Павел. Ярмаш Мікалай. 1967. *Марфемная дыстрыбуцыя ў беларускай мове: Дзеяслоў*. Мінск: Навука і тэхніка].

Maslov Yuriy. 1948. *Vid i leksicheskoye znacheniye glagola v russkom yazyke*. "Izvestiya Akademii nauk SSSR. Seriya literatury i yazyka". T. 7. Vyp. 4: 303–316 [Маслов Юрий. 1948. *Вид и лексическое значение глагола в русском языке*. "Известия Академии наук СССР. Серия литературы и языка". Т. 7. Вып. 4: 303–316].

Maslov Yuriy. 1958. *Rol' tak nazyvayemoy perfektivatsii i imperfektivatsii v protsesse vozniknoveniya slavyanskogo glagol'nogo vida*. Moskva: Izdatel'stvo Akademii nauk SSSR [Маслов Юрий. 1958. *Роль так называемой перфективации и имперфективации в процессе возникновения славянского глагольного вида*. Москва: Издательство Академии наук СССР].

Maslov Yuriy. 1962. *Voprosy glagol'nogo vida v sovremennom zarubezhnom yazykoznanii* (7–32). V: *Voprosy glagol'nogo vida: sbornik*. Red. Yu.S. Maslov. Moskva: Izdatel'stvo inostrannoy literatury [Маслов Юрий. 1962. *Вопросы глагольного вида в современном зарубежном языкознании* (7–32). В: *Вопросы глагольного вида: сборник*. Ред. Ю.С. Маслов. Москва: Издательство иностранной литературы].

Maslov Yuriy. 1984. *Ocherki po aspektologii*. Leningrad: Izdatel'stvo LGU [Маслов Юрий. 1984. *Очерки по аспектологии*. Ленинград: Издательство ЛГУ].

Muchnik Iosif. 1971. *Grammaticheskiye kategorii glagola i imeni v sovremennom russkom literaturnom yazyke*. Moskva: Nauka [Мучник Иосиф. 1971. *Грамматические категории глагола и имени в современном русском литературном языке*. Москва: Наука].

Nikolayeva Tat'yana 1962. *Klassifikatsiya russkikh glagolov po kolichestvu osnov i ikh raspredeleniyu po kategoriyam* (96–102). V: *Strukturno-tipologicheskiye issledovaniya: sbornik statey*. Red. T. N. Moloshnaya. Moskva: Izdatel'stvo Akademii nauk SSSR: 96–102 [Николаева Татьяна 1962. *Классификация русских глаголов по количеству основ и их распределению по категориям* (96–102). В: *Структурно-типологические исследования: сборник статей*. Ред. Т.Н. Молошная. Москва: Издательство Академии наук СССР].

Paciupa Jur. 2013. *Anons: kvadrat tekstaŭ*. Minsk: I. P. Lohvinaŭ [Пацюпа Юр. 2013. *Анонс: квадрат тэкстаў*. Мінск: І. П. Логвінаў].

Paducheva Yelena. 2004. *Dinamicheskiye modeli v semantike leksiki*. Moskva: Yazyki slavyanskoy kul'tury [Падучева Елена. 2004. *Динамические модели в семантике лексики*. Москва: Языки славянской культуры].

Palosi Ildikó. 2013. *Kolichestvennaya aspektual'nost' v russkom yazyke v zerkale kolichestvenno-predel'nykh sposobov glagol'nogo deystviya* [online] [доступ: 05.01.2019] [Palosi Ildikó. 2013. *Количественная аспектуальность в русском языке в зеркале количественно-предельных способов глагольного действия*].

Papp Ferents. 1963. *Klassifikatsiya russkikh glagolov*. V: "Russkiy yazyk v shkole" № 4: 98–101 [Папп Ференц. 1963. *Классификация русских глаголов*. В: "Русский язык в школе" № 4: 98–101].

Patyupo Yuriy. 2018. *Otnosheniye stikha k grafike i chitke: Voprosy ontologii stikhotvornoy rechi* (301–350). V: *Missiya vypolnima: Perspektivy izucheniya fol'klora*. Red. M. Kyyva, T. Volodina. Tartu: Nauchnoye izdatel'stvo ELM [Патюпо Юрий. 2018. *Отношение стиха к графике и читке: Вопросы онтологии стихотворной речи* (301–350). В: *Миссия выполнима: Перспективы изучения фольклора*. Ред. М. Кыйва, Т. Володина. Тарту: Научное издательство ЭЛМ].

Pavskiy Gerasim. 2012. *Filologicheskiye nablyudeniya nad sostavom russkogo yazyka. 3-e rassuzhdeniye: O glagole*. Moskva: Knizhnyy dom «LIBROKOM» [Павский Герасим. 2012. *Филологические наблюдения над составом русского языка. 3-е рассуждение: О глаголе*. Москва: Книжный дом «ЛИБРОКОМ»].

Piskunoй Fiodar. 2008. *Klasifikacyja dziejaslovaй: Kampjuterna-linhvistyčny padychod*. "Rodnaje slova" №10: 61–65 [Піскуноў Фёдар. 2008. *Класіфікацыя дзеясловаў: Камп'ютэрна-лінгвістычны падыход*. "Роднае слова" №10: 61–65].

Ramza Tat'yana. 2010. *Tipy spryazheniya v belorusskom yazyke na fone russkogo*. "Przegląd Wschodnioeuropejski" № 1: 425–446 [Рамза Татьяна. 2010. *Типы спряжения в белорусском языке на фоне русского*. "Przegląd Wschodnioeuropejski" № 1: 425–446].

Rusak Valiancina. 2003. *Marfanalohija sučasnaj bielaruskaj movy*. Minsk: Bielaruskaja navuka [Русак Валянціна. 2003. *Марфаналогія сучаснай беларускай мовы*. Мінск: Беларуская навука].

Russkaya grammatika v 2 tomakh. 1982. T. 1. *Fonetika. Fonologiya. Udareniye. Intonatsiya. Slovoobrazovaniy*e. Morfologiya. Red. N.Yu. Shvedova. Moskva: Nauka [*Русская грамматика в 2 томах*. 1982. Т. 1: *Фонетика. Фонология. Ударение. Интонация. Словообразование. Морфология*. Ред. Н.Ю. Шведова. Москва: Наука].

Sciacko Paviel. 1999. *Prabliemy lieksičnaha narmavannia bielaruskaj movy*. Hrodna: HrDU [Сцяцко Павел. 1999. *Праблемы лексічнага нармавання беларускай мовы*. Гродна: ГрДУ].

Shakhmatov Aleksey. 1941. *Sintaksis russkogo yazyka*. Leningrad: Uchpedgiz [Шахматов Алексей. 1941. *Синтаксис русского языка*. Ленинград: Учпедгиз].

Shakhmatov Aleksey. 1952. *Iz trudov A.A. Shakhmatova po sovremennomu russkomu yazyku (ucheniye o chastyakh rechi)*. Moskva: Uchpedgiz [Шахматов Алексей. 1952. *Из трудов А.А. Шахматова по современному русскому языку (учение о частях речи)*. Москва: Учпедгиз].

Shelyakin Mikhail. 1983. *Kategoriya vida i sposoby deystviya russkogo glagola (teoreticheskiye osnovy)*. Tallin: Valgus [Шелякин Михаил. 1983. *Категория вида и способы действия русского глагола (теоретические основы)*. Таллин: Валгус].

Shelyakin Mikhail. 2001. *Funktsional'naya grammatika russkogo yazyka*. Moskva: Russkiy yazyk [Шелякин Михаил. 2001. *Функциональная грамматика русского языка*. Москва: Русский язык].

Shpilevskiy Pavel. 2006. *Kratkaya grammatika belorusskogo narechiya* (56–88). B: Pryhodzič Mikalaj. *Bielaruskaje movaznaŭstva: vučebny dapamožnik*. Minsk: BDU [Шпилевский Павел. 2006. *Краткая грамматика белорусского наречия* (56–88). В: Прыгодзіч Мікалай. *Беларускае мовазнаўства: вучэбны дапаможнік*. Мінск: БДУ].

Sidorov Vladimir. 1945. *Morfologiya*. V: Avanesov Ruben, Sidorov Vladimir. *Ocherk grammatiki sovremennogo russkogo literaturnogo yazyka*. Ch. 1. Moskva: Uchpedgiz. [Сидоров Владимир. 1945. *Морфология*. В: Аванесов Рубен, Сидоров Владимир. *Очерк грамматики современного русского литературного языка*. Ч. 1. Москва: Учпедгиз].

Sil'nitskiy Georgiy. 1986. *Semanticheskaya struktura glagol'nogo znacheniya* (3–15). V: *Problemy strukturnoy lingvistiki 1983*. Moskva: Nauka [Сильницкий Георгий. 1986. *Семантическая структура глагольного значения* (3–15). В: *Проблемы структурной лингвистики 1983*. Москва: Наука].

Slounik.org: Bielaruskija sloŭniki i encykliapedyi [*Slounik.org: Беларускія слоўнікі і энцыкляпэдыі* [online] https://slounik.org/ [доступ: 05.01.2019]].

Stankievič Jan. 2007. *Jazyk i jazykavieda*. Viĺnia: Instytut bielarusistyki [Станкевіч Ян. 2007. *Язык і языкаведа*. Вільня: Інстытут беларусістыкі].

Stankievič Stanislaŭ. 1994. *Rusifikacyja bielaruskaje movy ŭ BSSR i supracij rusifikacyjnatu pracesu*. Minsk: Navuka i technika [Станкевіч Станіслаў. 1994. *Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу*. Мінск: Навука і тэхніка].

Šuba Paviel. 1961. *Razburennie sistemy niepraduktyŭnych klasaŭ dziejaslovaŭ u sučasnaj bielaruskaj movie* (226–233). U: *Pracy Instytuta movaznaŭstva AN BSSR*. Vyp. VIII. Minsk: Vydaviectva AN BSSR [Шуба Павел. 1961. *Разбурэнне сістэмы непрадуктыўных класаў дзеясловаў у сучаснай беларускай мове* (226–233). У: *Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР*. Вып. VIII. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Šuba Paviel. 1968. *Dziejasloŭ u bielaruskaj movie*. Minsk: Vyšejšaja škola [Шуба Павел. 1968. *Дзеяслоў у беларускай мове*. Мінск: Вышэйшая школа].

Šuba Paviel. 1987. *Sučasnaja bielaruskaja mova: Marfanalohija*. Marfalohija. Minsk: Univiersiteckaje [Шуба Павел. 1987. *Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія*. Мінск: Універсітэцкае].

*Teoriya funktsional'noy grammatik*i. T. 1: *Vvedeniye. Aspektual'nost'. Vremennaya lokalizovannost'. Taksis*. Red. A.V. Bondarko. 1987. Leningrad: Nauka [*Теория функциональной грамматики*. Т. 1: *Введение. Аспектуальность. Временная локализованность. Таксис*. Ред. А.В. Бондарко. 1987. Ленинград: Наука].

Testelets Yakov 1990. *Versiya* (83). V: *Lingvisticheskiy entsiklopedicheskiy slovar'*. Red. V.N. Yartseva. Moskva: Sovetskaya entsiklopediya [Тестелец Яков 1990. *Версия* (83). В: *Лингвистический энциклопедический словарь*. Ред. В.Н. Ярцева. Москва: Советская энциклопедия].

Ul'yanov Grigoriy. 1895. Z*nacheniya glagol'nykh osnov v litovsko-slavyanskom yazyke*. Ch. II: *Osnovy, oboznachayushchiya razlichiya po vidam*. Varshava: Tipografíya Varshavskago uchebnago okruga [Ульяновъ Григорий. 1895. *Значенія глагольныхъ основъ въ литовско-славянскомъ языкѣ*. Ч. II: *Основы, обозначающія различія по видамъ*. Варшава: Типографія Варшавскаго учебнаго округа].

Uževič Ivan. 1996. "*Hramatyka slavienskaja" Ivana Uževiča. 1645. Arski rukapis* (261–346). U: Jaskievič Aliena. *Starabielaruskija hramatyki: Da prabliemy ahuĺnafilalahičnaj celasnasci*. Minsk: Bielaruskaja navuka [Ужэвіч Іван. 1996. *"Граматыка славенская" Івана Ужэвіча. 1645. Арскі рукапіс* (261–346). У: Яскевіч Алена. *Старабеларускія граматыкі: Да праблемы агульнафілалагічнай цэласнасці*. Мінск: Беларуская навука].

Vinogradov Viktor. 1938. *Sovremennyy russkiy yazyk*. Moskva: Uchpedgiz [Виноградов Виктор. 1938. *Современный русский язык*. Москва: Учпедгиз].

Vinogradov Viktor. 1972. *Russkiy yazyk (grammaticheskoye ucheniye o slove)*. Moskva: Vysshaya shkola [Виноградов Виктор. 1972. *Русский язык (грамматическое учение о слове)*. Москва: Высшая школа].

Vostokov Aleksandr. 1831. *Russkaya grammatika po nachertanίyu yego zhe sokrashchennoy Grammatiki polnъe izlozhennaya*. Sankt-Peterburg: Tipografíya Imperat. RA [Востоков Александр. 1831. *Русская грамматика по начертанію его же сокращенной Грамматики полнъе изложенная*. Санкт-Петербургъ: Типографія Императ. РА].

Zaprudski Siarhiej. 2003. *Niejubiliejnyja dumki z nahody jubiliejnych vydańniaŭ movaznaŭčaj spadčyny*. "Bielaruski histaryčny ahliad". T. 10. Sš. 1–2: 319–352 [Запрудскі Сяргей. 2003. *Неюбілейныя думкі з нагоды юбілейных выданьняў мовазнаўчай спадчыны.* "Беларускі гістарычны агляд". Т. 10. Сш. 1–2: 319–352].

Zizanij Laŭrencij. 1996. *"Hramatyka slavienska" Laŭrencija Zizanija*. *1596* (175–260). U: Jaskievič Aliena. *Starabielaruskija hramatyki: Da prabliemy ahuĺnafilalahičnaj celasnasci*. Minsk: Bielaruskaja navuka [Зізаній Лаўрэнцій. 1996. *"Граматыка славенска" Лаўрэнція Зізанія. 1596* (175–260). У: Яскевіч Алена. *Старабеларускія граматыкі: Да праблемы агульнафілалагічнай цэласнасці*. Мінск : Беларуская навука].

Žuraŭski Arkadź. 1957. *Klasy dziejaslovaŭ* (193–203). U: *Kurs sučasnaj bielaruskaj litaraturnaj movy. Marfalohija: padručnik dlia studentaŭ filalahičnych fakuĺtetaŭ univiersitetaŭ i piedahahičnych instytutaŭ*. 1957. Minsk: Dziaržaŭnaje vučebna-piedahahičnaje vydaviectva: 193–203 [Жураўскі Аркадзь. 1957. *Класы дзеясловаў* (193–203). У: *Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія: падручнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў універсітэтаў і педагагічных інстытутаў*. Мінск: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва].

STRESZCZENIE: Jednym z najbardziej skomplikowanych działów gramatyki były i pozostają klasy czasowników, w ogóle słowiańskich, a białoruskich w szczególności. Przez cały wiek XIX–XX niemal każdy językoznawca podejmując tę kwestię, proponował własną wersję, w efekcie czego nie powstała konwencja numerycznej nominacji klas i określenia ich granic. W artykule ukazana została problematyka klas czasowników z uwzględnieniem ich semantyki, która przejawia się w morfologii i walencyjności derywacyjnej taksonów. Przedmiotem badań był kompletny korpus czasowników białoruskich, prezentowany w odpowiednich opracowaniach leksykograficznych oraz białoruskim segmencie Internetu. Specyfika proponowanego podejścia polega również na tym, że autor artykułu odszedł od numerycznej nominacji klas czasowników na rzecz nominacji słownej, biorąc pod uwagę cechy jakościowe każdego taksonu. Aby tego dokonać, autor musiał połączyć pojęcie klasy z problemami aspektowymi, a mianowicie z aktionsart czasownika, które bada gramatyka funkcjonalna. Opisując zawartość kategoryczną taksonów, autor po raz pierwszy zastosował do białoruskiego czasownika kategorię wersji, która obejmuje nie tylko pojęcie przechodniości / nieprzechodniości, ale także takie relacje podmiot-przedmiot, jak odśrodkowość / dośrodkowość, osiągalność / nieosiągalność. Do określenia taksonów używano zarówno terminów ogólnie przyjętych, jak i autorskich, na przykład czasowniki „iluminatywny" lub „mediatywny". W artykule przedstawiono krótką historię zagadnienia, porównano sposoby klasyfikacji czasowników zarówno formalnych, jak i semantycznych, określony aparat kategorii, zarysowano pełny zbiór taksonów podlegających opisowi oraz opisano najbardziej reprezentatywne klasy czasowników: statywne i iluminatywne. Celem artykułu jest ukazanie właściwości i pogrążonych praw klas czasowników, które mogą mieć praktyczne znaczenie dla

tworzenia i doboru słownictwa, a także dla zrozumienia procesów historycznych zachodzących w gramatyce. Do badania klas czasowników wykorzystano analizę korpusową i semantyczną, rachunek statystyczny i teorię skali. Tematyka artykułu pozostaje niepełna, otwarta i wymaga kontynuacji do czasu pełnego opisu ustalonych w badaniu klas, podklas, grup i skupień czasownika.

SŁOWA KLUCZOWE: czasownik, klasa, aktionsart, głos, aspekt, wersja, przechodniość, koniugacja.

АНАТАЦЫЯ: Адным з самых заблытаных раздзелаў граматыкі былі і застаюцца класы дзеяслова, славянскага ў цэлым і беларускага ў прыватнасці. На працягу XIX–XX стст. амаль кожны лінгвіст, звяртаючыся да гэтай праблематыкі, прапаноўваў уласную версію, а ў выніку так і не склалася канвенцыя лічбавай намінацыі класаў і вызначэння іх граніц. У артыкуле праблема класаў дзеяслова раскрываецца з улікам іх семантыкі, якая праяўляецца ў марфалогіі і дэрывацыйнай валентнасці таксонаў. Аб'ектам даследавання быў поўны корпус беларускага дзеяслова, аказаны ў адпаведных лексікаграфічных працах і беларускім сегменце інтэрнэту. Адметнасць прапанаванага падыходу замыкаецца яшчэ і ў тым, што аўтар артыкула адмовіўся ад лічбавай намінацыі класаў дзеяслова і звярнуўся да слоўнай намінацыі з улікам якасных характарыстык кожнага таксона. Для гэтага аўтару давялося зблізіць панятак класа з аспектуальнай праблематыкай, а менавіта: з чынамі (ці спосабамі дзеяння) дзеяслова, якія даследуе функцыянальная граматыка. Пры апісанні катэгарыяльнага зместу таксонаў аўтар уперышню застасаваў да беларускага дзеяслова катэгорыю версіі, якая абымае не толькі панятак пераходнасці / непераходнасці, але і такія суб'ект-аб'ектныя дачыненні, як адцэнтровасць / дацэнтровасць дзеяння, дасягальнасць / недасягальнасць. Для намінацыі таксонаў выкарыстоўваліся як агульнапрынятыя тэрміны, так і аўтарскія, прыкладам, "ілюмінатыўныя" ці "медыятыўныя" дзеясловы. У артыкуле падаецца кароткая гісторыя пытання, параўноўваюцца спосабы класіфікацыі дзеяслова, як фармальныя, так і семантычныя, акрэсліваецца катэгарыяльны апарат, вызначаецца поўны набор таксонаў, падлеглых апісанню, апісваюцца найбольш паказальныя класы дзеяслова: статыўны і ілюмінатыўны. Мэта артыкула – раскрыць уласцівасці і глыбінныя законы класаў дзеяслова, што можа мець практычнае значэнне для стварэння і адбору лексікі, а таксама для разумення гістарычных працэсаў, якія адбываюцца ў граматыцы. Пры даследаванні класаў дзеяслова практыкаваўся корпусны і семантычны аналіз, статыстычныя злічэнні і тэорыя шкалаў. Тэма артыкула застаецца незавершанай, адкрытай і вымагае працягу да поўнага апісання класаў, падкласаў, групаў і кластараў дзеяслова, вызначаных у даследаванні.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: дзеяслоў, клас, чын (aktionsart), стан, аспект, версія, пераходнасць, спражэнне.

Data przesłania artykułu: 06.05.2024
Data akceptacji artykułu: 10.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Юры Пацюпа / Jury Paciupa – Białoruś, Narodowa Akademia Nauk Białorusi, Centrum Badań nad Kulturą, Językiem i Literaturą, Instytut Studiów Artystycznych, Etnografii i Folkloru im. Kondrata Krapiwy; specjalność naukowa: folklorystyka; zainteresowania naukowe: wersyfikacja folkloru, poetyka, estetyka, gramatyka, kultura mowy, literatura białoruska XIX – początku XX w.

Adres: Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, Мінск, Беларусь.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Пацюпа Юры. 2023. *Другі ікт у тэтраметры: Да незавершанай палемікі з Ігарам Жуком* (40–56). У: *Шляхам яго жыцця: успаміны, роздумы, доследы: матэрыялы круглага стала памяці праф. І. Жука*. Гродна : Юрсапрынт.
2. Пацюпа Юры. 2023. *Пазлы незавершанай мазаікі: Беларускі фальклорны верш у працах XIX – пачатку XX ст.* (125–153). У: *Беларускі фальклор: Матэрыялы і даследаванні: зборнік навуковых прац*. Мінск: Беларуская навука.
3. Пацюпа Юр. 2023. *Рой: тэксты і інтэрпрэтацыі*. Мінск: Выдавец Цымбераў Р.М.
4. Пацюпа Юры. 2024. *Цэзура як функцыя метрыкі: Кумулятыўная цэзура фальклорнага 8-складовіка* (107–130). У: *Беларускі фальклор: Матэрыялы і даследаванні : зборнік навуковых прац*. Мінск : Беларуская навука.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Olena Pogrebnyak, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.14

Olena Pogrebnyak / Алена Пагрэбняк

Київський національний університет імені Тараса Шевченка /
Taras Shevchenko National University of Kyiv
ORCID: http://orcid.org/0000-0002-7509-1352
e-mail: alenapogrebnyak@ukr.net

Літаратурны вобраз сучаснага беларуса ў люстэрку імагалогіі (на матэрыяле ўкраінамоўных тэкстаў і перакладаў)

The literary image of a modern Belarusian in the mirror of imagology (on the material of Ukrainian-language texts and translations)
Literacki obraz współczesnego Białorusina w zwierciadle imagologii (na materiale tekstów i tłumaczeń ukraińskojęzycznych)

ABSTRACT: The article examines the image of a Belarusian based on the material of modern works of art, namely: Ukrainian prose of the 2000s (Y. Andruhovich, O. Zabuzhko, O. Irvanets, S Syngaivskyi), the novel by the Belarusian-Ukrainian writer N. Babina *Bodai Budka* (2019), artistic translations (I. Karpovich, J. Topol). Ukrainian translations of the works of S. Aleksievich, L. Rublevska, V. Orlov, and others are also involved in the review of the stated problems. An attempt was made to analyze the image image of a Belarusian (based on the material of the specified tests) as a conceptual model, the components of which are considered to be literary versions of self-image, hetero-image, and meta-image in the paradigm from Self-Other to Own-Other-Stranger. The basic concepts of imagology are chosen as the initial aspects of the analysis: the problem of identity / self-identification and the context of the cultural tradition, in the womb of which the literary image of the Other arises. Therefore, the literary works, ideas and images they convey are considered against the background of the tradition of Belarusian-Ukrainian intercultural relations of the post-Soviet era.

KEYWORDS: literary image, Belarus, Belarusian, imagology, identity, Belarusian-Ukrainian relations.

Паводле вызначэння ўкраінскага кампаратывіста Дзмітра Наліваўкі, літаратурны імагалагічны вобраз – гэта мастацка-эстэтычны феномен, які карэлятыўна рэпрэзентуе і н ш ы нацыянальны тып

у творчасці пісьменніка – прадстаўніка пэўнай культуры; з'ява, якая "ўвайшла ў прастору гэтай культуры, захаваўшы ў той ці іншай ступені аўтахтонны змест і структуру" [Наливайко 2006: 102]. У той жа час бельгійскі вучоны, заснавальнік сучаснай імагалогіі як асобнага раздзела параўнальнага літаратуразнаўства Хуго Дзізерынк у артыкуле *Імагалогія і пытанне этнічнай ідэнтычнасці* ўказвае на неабходнасць улічваць ролю суб'ектыўных фактараў, нацыянальна-гістарычных уплываў на імагалагічную перспектыву літаратурных вобразаў як канцэптуальных мадэляў, якія змяняюцца ў гістарычным часе: "...іміджы і імагатыпічныя структуры не з'яўляюцца адлюстраваннем ці адбіткам рэальных калектыўных рыс супольнасцяў («нацыя», «народ» і да таго падобнае), а толькі фікцыямі, гэта значыць ідэямі, якія фарміруюцца ў краінах або супольнасцях у пэўны час, на пэўных гістарычных этапах" [Дизеринк 2011: 389]. Гаворка ідзе ў тым ліку пра карэляцыю аўтавобраза, зыходным аспектам аналізу якога з'яўляецца пытанне самаідэнтыфікацыі супольнасці, і гетэравобраза / гетэравобразаў (паводле тэрміналогіі Х. Дзізерынка – аўтаіміджу і гетэраіміджу), якія ўзнікаюць і трансфармуюцца ў рэчышчы культуры-рэцыпіента. Збліжэнне гэтых імагатыповых структур, скарачэнне дыстанцыі паміж апазіцыямі "С в о й" і "Ч у ж ы" з'яўляецца неабходнай умовай для пераадолення ўзаемнага напружання паміж імі, узнікнення канцэпту "І н ш ы" і яго дыялагічнага ўспрымання як на міжкультурным, так і на вышэйшых узроўнях. У дадзеным даследаванні ўлічаны два ракурсы – перцэпцыя літаратурнага вобраза беларуса як "нечужога Іншага" вачыма ўкраінцаў і яе адпаведнасць / ступень набліжэння да сучаснага праекта самаідэнтыфікацыі беларусаў, замацаванага ў творах 2000-х гг. Метадалагічным падмуркам аналізу з'яўляюцца працы ўкраінскіх і замежных навукоўцаў – тэарэтыкаў імагалогіі В. Буднага, Х. Дзізерынка, Дж. Лірсена, Дз. Налівайкі, Д.А. Пажо; даследчыкаў імагалагічнай праблематыкі ў мастацкай літаратуры Ю. Барабаша, Т. Свярбілавай, Г. Сівачэнка і інш. Аб'ектам аналізу з'яўляюцца арыгінальныя ўкраінскамоўныя творы і ўкраінскія пераклады замежных мастацкіх твораў, цытаты з гэтых тэкстаў падаюцца на ўкраінскай мове. Цытаты з навуковых прац прыведзеныя ў перакладзе на беларускую мову.

Вобраз беларусаў і Беларусі ва ўкраінскай літаратуры і культурнай свядомасці за апошнія дзесяцігоддзі істотна трансфармаваўся. Зафіксаваны ў свой час Святланай Алексіевіч вобраз беларуса як "чырвонага чалавека" або homo soveticus (*Час second-hand (канец чырвонага чалавека*, 2013) у творах Алеся Ганчара, Сяргея Сынгаіўскага і нават Юрыя Андруховіча заставаўся носьбітам не нацыянальна маркіраваных рыс, а такіх, якія сведчылі аб прыналежнасці да гістарычнай супольнасці

“савецкі народ”. Такімі былі афіцэр Чырвонай Арміі беларус Юрый Бранскі з трылогіі А. Ганчара *Сцяганосцы* (*Прапароносці,* 1946–1948), перакладчык-міжнароднік з Мінска 1980-х гг. Косцік Шалевіч у рамане С. Сынгаіўскага *Дарога на Асмару* (*Дорога на Асмару,* 2016) і нават сучасныя беларусы ў прозе Ю. Андруховіча.

У зборніку апавяданняў Ю. Андруховіча *Лексікон інтымных гарадоў. Адвольны даведнік па геапаэтыцы і касмапалітыцы* (*Лексикон інтимних міст. Довільний посібник з геопоетики та космополітики*, 2012) Мінск – Горад Сонца – апісаны аўтарам як “жахліва” чысты, але насамрэч безаблічны і пусты. Стэрыльнасць гарадской прасторы Ю. Андруховіч звязвае з адсутнасцю ўласнага аблічча, нацыянальнага каларыту, уніфікаванасцю гарадскіх рэалій, якія можна было сустрэць у любым савецкім горадзе. Асабліва адчувальна посткаланіяльная свядомасць пісьменніка рэагуе на маркеры агульнаімперскага мінулага. Аўтабіяграфічны лірычны герой спыняецца ў гасцініцы “Беларусь” каля Камсамольскага возера і вуліцы Камуністычнай. У калідорах гатэля ён сустракае тоўстых беларускіх прастытутак, якія ўсе пахнуць духамі “Чырвоная Масква”, працуюць на КДБ і мараць выйсці замуж за замежніка [Андрухович 2012]. Гэтыя назіранні становяцца імагалагічным прысудам аўтара гораду. Змрочны негатыўны модус успрымання і перадачы беларускіх топасаў і вобразаў падаецца прыкметным з улікам таго, што эпоха СССР ментальна і гістарычна засталася для ўкраінскага пісьменніка ў мінулым [Погребняк 2019].

Імагалагічную перспектыву ў дадзеным выпадку варта разглядаць у межах спецыфікі савецкага літаратурнага праекта “як унутраную рэпрэзентацыю ідэнтыфікацыйнага рэлятывізму герояў” [Свербілова 2020: 117], бо гаворка ідзе пра вобразы, якія адпавядаюць пэўнай культурна-гістарычнай эпосе (а ў выпадку з трылогіяй А. Ганчара – таксама асобе аўтара). Прынцыповая ўстаноўка на пралетарскі інтэрнацыяналізм у савецкім тыпе культурнага прадукту не прадугледжвала стварэння яркіх ці хоць бы пазнавальных нацыянальных характараў. Як адзначае Таццяна Свярбілава,

> развіццё нацыянальных культур, якія ўваходзілі ў склад савецкай цывілізацыі, фармальна падтрымлівалася, але канчатковай мэтай сацрэалістычнага культурнага праекта была асіміляцыя і растварэнне іншага ў касмапалітычным дыскурсе, які першапачаткова атаясамліваўся з дыскурсам рускай культуры. Такім чынам, імагалагічная праблема тоеснасці аўтаматычна зводзілася да атаясамлівання савецкага чалавека толькі з адной з існых ідэнтычнасцяў [Свербілова 2020: 116].

Затое пісьменніца Аксана Забужка робіць спробу зірнуць на Беларусь і беларусаў з больш глыбокай гістарычнай перспектывы. У цыкле эсэ

Беларускі дыптых (Білоруський диптих, 2016) А. Забужка разважае пра мову польска-беларускага памежжа, знаходзячыся на прэм'еры спектакля паводле свайго твора *Казка пра каліновую дудку (Казка про калинову сопілку, 2000, 2013)* у Беластоку, горадзе, які гіпнатызуе аўтарку сваімі "літовсько-руськими лініями і формами" [Забужко 2015: 368]. А. Забужка акцэнтуе культурныя топасы перыяду Вялікага Княства Літоўскага, прапануючы адрозніваць імагалагічную канстанту вобраза беларуса як спадчынніка сярэднееўрапейскай ідэнтычнасці ад каранёвай сістэмы і агульнакультурнай прасторы Савецкага перыяду і часу Расійскай імперыі. Галоўнай тэмай эсэ *Україна – не Беларусь, або пасляслоўе да візіту Святланы Алексіевіч у Кіеў* (*Україна не Білорусь, або післяслово до київського візиту Світлани Алексієвич*) [Забужко 2015: 372–379] стала іранічнае пераасэнсаванне вобраза-стэрэатыпа "меншага брата" з распаўсюджанага ў часы СССР прапагандысцкага клішэ пра сяброўства трох брацкіх народаў – рускага, украінскага і беларускага. Пісьменніца аналізуе не толькі моўна-культурную сітуацыю ў сённяшняй Беларусі, але і перспектывы развіцця беларускай літаратуры, разважае пра шансы ўкраінцаў зразумець не толькі сваіх бліжэйшых суседзяў, але і саміх сябе.

Сябра таварыства Бу-Ба-Бу і добры знаўца сучаснай беларускай літаратуры пісьменнік Алесь Ірванец прапануе гульнёвы падыход да асэнсавання як імагалагічнай перспектывы вобраза Беларусі, так і перспектыў нацыянальных літаратур, краін і іх гістарычных шляхоў увогуле. Бурлескна-карнавальная паэтыка рамана А. Ірванца *Харкаў 1938* (*Харків 1938*, 2017) вызначае адпаведныя канатацыі вобраза беларуса на старонках гэтага рамана. У тэксце, напісаным у жанры альтэрнатыўнай гісторыі, аўтар прапануе арыгінальную версію развіцця не толькі ўкраінскай, але і беларускай дзяржаўнасці. Іншыя жанравыя абазначэнні, якія былі ўзгаданыя ў анатацыі, – буфанада, антыўтопія, шпіёнскі трылер. Падзеі ў рамане адбываюцца пасля перамогі Украінскай рабоча-сялянскай рэспублікі (УРСР). Краіна мяжуе з незалежнай Вялікай Літвой: "...з північного заходу в нас Вялікая Літва з молодим президентом, цілком цивільним чоловічком зі смішними борідкою й черевцем" [Ірванець 2017: 224]. Гэтая краіна, аднак, перажывае цяжкі палітычны перыяд: "...кривавий тристоронній польсько-литвинсько-лієтувіський конфлікт. Президент Великої Литви Андрей Хадановіч скликав у Менську термінове засідання Кабінету міністрів, <…> у Вільні точаться запеклі бої" [Ірванець 2017: 14]. Цэнтральным топасам у рамане з'яўляецца топас Карнавалу, які рэалізуецца на ўсіх узроўнях яго структуры – стылі, сюжэце, вобразнасці, мове герояў. Нацыянальныя адметнасці гістарычных асоб, выдуманых герояў і іх рэальных прататыпаў падаюцца ў тэксце іранічна, з ужываннем кросінтэртэкстуальных адсылак, напрыклад: "...замість української секції

радіо «Кіровоград» увімкнулася литвинська й дикторка Вєля Бурсак почала дзвінко дзєкати в ефір про тристоронні бої у Вільні" [Ірванець 2017: 62]. У рамане ўмела змяшаныя часавыя і геаграфічныя вымярэнні, а палітычныя дзеячы, літаратары мінулага і сучаснасці свабодна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, што надае падзеям і аповеду ўвогуле метаіранічны постпостмадэрнісцкі характар.

Для аўтара тэксту як стваральніка вобраза Іншага пошук крэатыўных рашэнняў адносна гэтага вобраза і спосабу яго рэпрэзентацыі штораз залежыць ад асабістай матывацыі, мастацкай абумоўленасці, нацыянальнай карціны свету і ўласнага культурнага далягляду. На скрыжаванні гэтых і іншых аспектаў складваюцца дыялектычныя адносіны паміж катэгорыямі Сваё – Чужое – Іншае як у межах аднаго твора, так і ў плоскасці гісторыка-літаратурнага кантэксту і інтэнсіўнасці міжкультурнага ўзаемадзеяння.

Беларуска-ўкраінскі міжкультурны дыялог цягнецца з часоў Сярэднявечча. Увогуле, ёсць падставы казаць пра яго існаванне з пачатку фіксаванай пісьмовай традыцыі абедзвюх літаратур. Аднак менавіта перыяд 1990-х – пачатак 2000-х гг., калі Беларусь і Украіна атрымалі свабоду ў вызначэнні прыярытэтаў палітычнага і культурнага развіцця, стаў найважнейшым у працэсе фарміравання сучасных нацыянальных праектаў – беларускага і ўкраінскага. У гэты час узрасла інтэнсіўнасць асабістых кантактаў паміж прадстаўнікамі навуковых і літаратурных колаў, роля прыватнай ініцыятывы ў рэалізацыі розных форм культурнага супрацоўніцтва. Дыялогі ўкраінскай аўдыторыі з беларускімі пісьменнікамі на фестывалях, кніжных кірмашах, прэзентацыях, творчых сустрэчах як "ужывую", так і анлайн пачасціліся дзякуючы хуткаму распаўсюджанню інтэрнэт-тэхналогій. Пазалітаратурная сітуацыя першых дзесяцігоддзяў 2000-х гг., цеснае эканамічнае і сацыяльна-культурнае супрацоўніцтва актывізавалі мастацкія пераклады сучаснай беларускай паэзіі і прозы. Такая інтэнсіўная сувязь спрыяла фарміраванню пазітыўнага іміджу Беларусі і беларусаў ва ўкраінскіх інтэлектуальных колах і ў масавай свядомасці, пра што сведчаць адпаведныя сацыялагічныя апытанні [Ківа 2021: 10].

Паводле новай метадалогіі кампаратывістыкі, пераклад мастацкіх тэкстаў з мовы "донара" на мову "рэцыпіента" трэба разглядаць і даследаваць як праяву і вынік *культурнага трансферу*. Пераклад – гэта перанос аб'екта перакладу (тэксту, вобраза ці комплексу ідэй) з адной культурнай сітуацыі ў іншую, які, трапляючы ў іншы кантэкст, набывае новы сэнс. Пры гэтым абодва бакі глыбока ўплываюць адзін на аднаго, а сам аб'ект культурнай перадачы падвяргаецца непазбежным зменам і трансфармацыям у асяроддзі ўспрымання. Паводле Г. Сівачэнка,

культурны абмен – гэта не цыркуляцыя нязменных канстант, прадметаў і ідэй як яны ёсць, а іх пастаянная рэінтэграцыя, пераасэнсаванне. Сучасны падыход да вывучэння культурнага трансферу трактуе мастацкі пераклад як актыўны сродак трансфармацыі тэксту ў яго бясконцым падарожжы па эпохах і культурах. Паколькі ў розны час "актуалізуюцца розныя кантэксты" [Сиваченко 2020: 394–396], найноўшы этап у гісторыі мастацкага перакладу беларускай літаратуры на ўкраінскую мову важна разглядаць у дыяхраніі як гісторыю ўзаемапранікнення кожны раз іншых культурных сэнсаў, у тым ліку гісторыю дэканструкцыі ідэалагічна састарэлых стэрэатыпаў масавай свядомасці.

Яскравым прыкладам перакладчыцкай і аўтарскай сінэргіі ў межах культурнага трансферу, а таксама сведчаннем узаемнага дыялагічнага разумення Іншага, усведамлення ў іншым Свайго, з'яўляецца шэраг двухмоўных беларуска-ўкраінскіх паэтычных выданняў 2000-х гг. Варта ўспомніць зборнік В. Стралка *Непагасны агонь = Непогасний вогонь* (2003), у які ўвайшлі творы класікаў Тараса Шаўчэнкі, Лесі Украінкі і Івана Франко ў беларускамоўных варыянтах, а таксама Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча – ва ўкраінскім перакладзе. У анталогію беларускай і ўкраінскай паэзіі *Сувязьразрыў = Зв'язокрозрив* (2006) увайшлі творы 12 сучасных украінскіх і 12 беларускіх паэтаў (украінцы: А. Лішэга, В. Герасімюк, Ю. Андруховіч, А. Ірванец, В. Небарак, І. Андрусяк, Г. Петрасаняк, М. Кіяноўская, М. Саўка, С. Жадан, А. Бондар, А. Слівінскі; беларусы: У. Арлоў, А. Глобус, С. Адамовіч, І. Бабкоў, Л. Вольскі, С. Мінскевіч, А. Хадановіч, В. Бурлак, В. Жыбуль, М. Баярын, М. Барадзіна, В. Морт).

Вынікам супрацоўніцтва тандэму А. Хадановіч – С. Жадан сталі двухмоўныя кнігі *Беларускі мужчына* і *Украінскія авіялініі*, якія ўбачылі свет у 2015 годзе ў выдавецтве *Крок*. Двухмоўная анталогія *Сто сонетів білоруських поетів = Сто санетаў беларускіх паэтаў (2019)* была падрыхтавана і выдадзена прафесарам Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі Анатолем Майсіенкам. У 2021 г. у Мінску ўбачыла свет кніга *Акрыленыя родным словам: Ларыса Косач-Квітка (Леся Украінка) і Алаіза Пашкевіч (Цётка) = Окрилені рідним словом: Лариса Косач-Квітка (Леся Українка) та Алоїза Пашкевич (Цьотка).*

Вобраз Беларусі пратэстнай, актыўнай, Беларусі, якая смела змагаецца за дэмакратычныя свабоды з таталітарным рэжымам, увайшоў у культурную прастору ўкраінскага грамадства летам 2020 г. Традыцыйныя вобразы беларусаў, нашых блізкіх суседзяў, атрымалі новае асэнсаванне дзякуючы намаганням прадстаўнікоў украінскай культуры, якія доўгі час працавалі на ніве беларуска-ўкраінскага міжлітаратурнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння (А. Ірванец, А. Слівінскі, В. Лявіцкі,

І. Ківа, С. Жадан, Д. Лазуткін, Д. Гладун, М. Кіяноўская, Н. Бельчанка, В. Вакуленка і многія іншыя).

Дзіцячы пісьменнік, паэт і перакладчык Уладзімір Вакуленка стаў ініцыятарам і каардынатарам выдання альманаха *ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ! За нашу і вашу свабоду*! (2020). У кнігу ўвайшла сучасная беларуская паэзія (33 аўтары) у перакладзе на ўкраінскую, крымска-татарскую, літоўскую, ідыш-беларускую, латышскую і польскую мовы. Сам У. Вакуленка, які пераклаў для анталогіі творы М. Скоблы, М. Адама, А. Спрынчан, А. Плоткі, быў забіты расейцамі ў 2022 г. падчас акупацыі Харкаўшчыны.

У 2021 г. у Кіеве прайшла прэзентацыя двухмоўнага выдання *«Бум-Бам-Літ»: антологія білоруської поетичної революції = «Бум-Бам-Літ»: анталёгія беларускае паэтычнае рэвалюцыі* (укладальнік і аўтар аналітычнага пасляслоўя – В. Лявіцкі, прадмову напісаў С. Жадан). Кніга ахоплівае творчасць васямнаццаці "бумбамлітаўцаў" (А. Бахарэвіча, В. Морт, В. Акудовіча, Л. Вольскага, В. Жыбуля, С. Мінскевіча, М. Башуры, Ю. Барысевіча, З. Вішнёва, У. Гарачкі, А. Кіені, А. Кавалеўскага). Разам з В. Лявіцкім над перакладамі працавалі С. Патаранскі, І. Сін, Г. Ціханава, А. Туровіч, Дз. Хвастоўскі, маладыя ўкраінскія паэты І. Астапенка, Я. Гадзінскі, Д. Гладун, Д. Лазуткін, Л. Панасюк і інш. Кніга знаёміць украінскага чытача з творчасцю незалежных беларускіх паэтаў, якія рэпрэзентуюць сваю краіну і нацыянальную культуру як гульнёвую, арыгінальную па стылі і спосабе самавыяўлення, радыкальна рэвалюцыйную па настроі.

Значна больш мастацкіх перакладаў сучасных беларускіх паэтаў на ўкраінскую мову выходзіла ў традыцыйных аднамоўных кнігах і асобных публікацыях, аднак іх аналіз выходзіць за рамкі дадзенага даследавання і патрабуе дадатковай увагі.

Вобразы сучасных беларусаў са сваім светапоглядам, характарам, менталітэтам паўстаюць і ў празаічных перакладах: У. Арлова [зборнік празаічных твораў *Пейзаж з ментолавым пахам* (*Краєвид з ментоловим пахом*, 2021), зборнік аповесцей і апавяданняў *Рэквієм па бензапіле* (*Реквієм для бензопилки*, 2005, 2021) у перакладзе А. Ірванца]; Н. Бабінай [украінамоўнае эсэ *Тут была Украіна* (*Тут була Україна*, 2005), апавяданні 2008–2009 гг. у перакладзе А. Іўчанкі, раман *Рыбгорад* (*Рибгород*, 2013) у перакладзе Б. Антаняк, раман *Бодай будка* (2019, па-ўкраінску)]; у зборніку прозы *Гульня ў Альбарутэнію* (*Гра в Альбарутенію*, 2012) Л. Рублеўскай, пераклад А. Сандыгі. У 2015 г. выйшаў зборнік *Як рыба аб лёд: сучасная беларуская аповесць (Як риба об лід: Сучасне білоруське оповідання)*, перакладчыкі – аўтарскі калектыў, у тым ліку Б. Жолдак, В. Лявіцкі, В. Парцяк і інш. У анатацыі да зборніка адзначаецца:

> Для сучаснай беларускай аповесці характэрныя высокая культура пісьма, паглыбленасць у чалавечую прыроду, высвятленне прычын глыбокага палітычнага крызісу ў краіне і яго сувязі з нацыянальным характарам. Гэта еўрапейская літаратура народа, памяць якога сціралі стагоддзямі, але пры гэтым ён не страціў сваёй чалавечай годнасці і высокіх мастацкіх вартасцей [*Як риба об лід. Антологія сучасного білоруського оповідання* 2015].

Зборнік пазіцыянуецца як анталогія. Тут сабраны творы трыццаці пісьменнікаў, якія дэкларуюць сваю апазіцыйнасць палітычнаму рэжыму, у прыватнасці, апавяданні А. Аблажэя, І. Бабкова, Н. Бабінай, Г. Багданавай, В. Быкава, П. Васючэнкі, Л. Вольскага і інш.

Найбольш поўна ва ўкраінскіх перакладах прадстаўлена творчасць С. Алексіевіч. Кнігі С. Алексіевіч на ўкраінскай мове выходзілі ў апрацоўках Лесі Лысенка, Уладзіміра Рафеенкі, Дзвінкі Тарахтушка (Любові Бурак), Аксаны Забужка і інш. А. Забужка, гаворачы пра мастацкае значэнне творчасці беларускай пісьменніцы, створаныя ёю вобразы сваіх суайчыннікаў, называе *Пяцікніжжа* С. Алексіевіч "остаточним виходом із кругу Великої Імперської Літератури" і ўдакладняе:

> Ціле XX століття література намагалась, услід за фільмом, "спортретувати масу", "дати голос мільйонам" – але старими, традиційними засобами це все одно ні в кого не виходило, бо література все одно мислить в категоріях не маси, а особи, вона завжди – "від людини до людини". А Алексієвич, зберігши людину – щоразу "ось цю", живу – одночасно дає "колективний портрет" плюс історію з "великого наративу": жінки, діти на війні, Афганістан, Чорнобиль, пострадянські самогубці… Це ж все в дійсності дуже тонко змонтовані автором літературні сюжети, тільки в "піксельному розділенні" окремих доль. А це вже література 21-го століття, коли хочете [Забужко 2015].

На думку А. Забужка, унёсак С. Алексіевіч у дэканструкцыю ментальных траўм і гістарычнай спадчыны свайго народа варта разглядаць у наднацыянальным вымярэнні, у абсягу ўсёй усходнееўрапейскай гісторыі.

У красавіку 2023 г., на другі год поўнамаштабнага ўварвання, Пошта Украіны выпусціла маркі і канверты з выявамі беларускіх нобелеўскіх лаўрэатаў Святланы Алексіевіч і Алеся Бяляцкага. Годам раней, у чэрвені 2022 г., імя Уладзіміра Караткевіча было прысвоена былой вуліцы Дабралюбава ў Кіеве, ініцыятарам перайменавання быў В. Лявіцкі. Беларускія кнігі ў арыгінале прапануюць украінскія кнігарні, у прыватнасці, у *Кнігарні "Е"* можна набыць творы І. Бабкова, С. Дубаўца, У. Караткевіча, Е. Вежнавец, У. Някляева.

Значнай крыніцай пашырэння межаў вобраза беларуса ва ўкраінскім культурным кантэксце 2000-х з'яўляюцца мастацкія пераклады

іншых замежных аўтараў, якія звяртаюцца да беларускай тэматыкі. У 2010 г. у Чэхіі прэмію імя Яраслава Сэйферта ў намінацыі "Проза" і прэмію Міжнароднага ПЭН-клуба атрымала кніга Яхіма Топала *Халоднай зямлёй* (*Chladnou zemí*), напісаная годам раней; ва ўкраінскім перакладзе раман выйшаў пад назвай *Майстерня диявола*. Кніга апавядае пра лёс чэшскага і беларускага народаў у Другой сусветнай вайне, пра месцы масавых забойстваў мірнага насельніцтва, што сталі мемарыяламі (Тэрэзін і Хатынь) або засталіся безназоўнымі "ямами із трупами" ў краіне, дзе "по розмоклих полях ходять ворони і клюють черепи" [Топол 2016: 207].

Посттаталітарнае мінулае і чалавечыя ахвяры, пераасэнсаванне сваіх і чужых гістарычных траўмаў, усходнееўрапейская ідэнтычнасць і памяць пакаленняў – вядучыя матывы рамана, а яго галоўная ідэя гучыць як цытата са *Слова пра паход Ігараў*: "Доки мертві не знайдуть спокою, не бути живим без ганьби" [Топол 2016: 159]. Вобраз беларускай сталіцы пабудаваны аўтарам як своеасаблівы імагалагічны парадокс. Герой-чэх успрымае Мінск як прамавугольны канструктар, дзе ўсюды холадна і няма дзе схавацца, а ў дварах і пераходах бегаюць пацукі. Затое беларуска Марушка называе свой горад Сонечным, "це був проект для майбутніх щасливих людей", де "могли жити не всі" [Топол 2016: 118]. Такое прачытанне топасу беларускай сталіцы адсылае да ўтопіі Т. Кампанэлы і сацыяльных антыўтопій XX ст. (Я. Замяцін, О. Хакслі, Дж. Оруэл), прапануе сучасны варыянт сацыяльнага эксперыменту – грамадства ўніфікаванага шчасця і поўнага кантролю над асобай. Я. Топал працуе ў жанры гістарычна арыентаванага псіхалагічнага трылера і ў традыцыйным для чэшскай літаратуры спектры постмадэрнісцкай праблематыкі мяжы стагоддзяў. Апакаліптычная візія дэгуманізаванага грамадства разгортваецца ў дэкарацыях крывавых падзей беларускай гісторыі і геапалітычных каардынатах уяўнага канструкту – Усходняй Еўропы, якую немагчыма знайсці на карце. Палітычны крызіс у постсавецкай Беларусі становіцца фонам для дэманстрацыі амаральнасці ўладаў і абясцэньвання чалавечага жыцця пры любых рэжымах. Абсалютны таталітарызм вядзе да фетышызацыі смерці як найцікавейшага маркера беларускасці [Погребняк 2019]. Менавіта гэта павінна прыцягваць інвестараў і турыстаў: "Ми потрапимо на всі карти світу через мішки наших кісток, клунки крові й гною" [Топол 2016: 158], "найглибші братські могили" [Топол 2016: 211]. Аповед пра падарожжа чэха ў Беларусь паўстае як антрапалагічная і культурная практыка, якая даследуе і апісвае носьбіта іншай ментальнасці і культуры ў каардынатах уласнай сістэмы каштоўнасцей, нацыянальных традыцый і індывідуальных інтэнцый апавядальніка-вандроўніка.

Сюжэт рамана-балады *Сонька* (*Sońka*, 2014) польскага пісьменніка Ігната Карповіча пра каханне беларускай сялянкі з польска-беларускага памежжа і нямецкага афіцэра СС заснаваны на рэальных падзеях і адбываецца ў гістарычных кулісах Другой сусветнай вайны і польскай сучаснасці.

Ідэнтыфікацыйная мадэль феміннасці, сэксуальнасці галоўнай гераіні, на долю якой выпала смерць маці, інцэст з боку бацькі, каханне з нямецкім афіцэрам, замужжа з выпадкова названым мужчынам, асуджэнне аднавяскоўцаў – абумоўлівае яе сацыяльную іншасць, чужасць, маргіналізуе і зрэшты выракае на адзіноту. Што да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, то беларускасць гераіні ў тэксце зрэдукавана да "тутэйшасці": "ми – нічиї, ми – самі по собі" [Карпович 2016: 23], гэта значыць ідэнтычнасці выключна рэгіянальнай, як у большасці беларусаў, якія не ідэнтыфікуюць сваю этнічнасць або адмаўляюцца ад яе, выдаючы сябе толькі праз беларускую гаворку на гэтых беларуска-польскіх "крэсах".

У тэксце ўзаемна адлюстроўваюцца імагалагічныя праекцыі вобраза Сонькі і вобраза сталічнага тэатральнага рэжысёра Ігара, які вядзе з ёй дыялог падчас разгортвання сюжэта. Усвядоміўшы іншасць гераіні, якую тая не хавае, апавядальнік (alter ego аўтара) адчуў і пазнаў уласную іншасць. Беларус па паходжанні, ён даўно змяніў прозвішча і імя на такія, якія гучалі б па-польску, адмовіўся ад роднай мовы, адмовіўся ад уласнай ідэнтычнасці, "абрубаў карані", каб авалодаць дыскурсам улады, які патрэбна было прыладаваць да ўласнага жыцця, каб дасягнуць поспеху:

> Ігор старанно приховував і закреслював своє дитинство, незмінно соромився його й намагався забути, витіснити і поховати. Дитинство, проведене з дідусем і бабусею в селі неподалік. Село й зараз називають так само, як і тоді, – Висранка, бо там, де жили прадіди, закінчувався світ [Карпович 2016: 18].

Драматызм сітуацыі сутыкнення іншасці гераіні з яго ўласнай прыхаванай іншасцю вырашаецца аўтарам літаральна – у рамане апавядаецца пра пастаноўку драмы паводле споведзі Сонькі. Галоўным рэжысёрам драмы з'яўляецца Ігар-Ігнат, а цэнтральны канфлікт рамана праецыруецца на ўнутраны канфлікт героя, канфлікт асобасных ідэнтычнасцей – набытай сацыяльнай ролі і этнічнага паходжання, што ў канчатковым выніку прыводзіць да катарсісу.

Аўтабіяграфічная сюжэтная лінія, спавядальная шчырасць аўтара ў гэтым падарожжы "ўглыб уласнай біяграфіі", паводле рэцэнзіі перакладчыка А. Слівінскага [Карпович 2016: 171], абумовілі пазнавальны пераканаўчы характар мастацкіх вобразаў. На першы план у творы выводзіцца трагедыя адзінокай жанчыны, якая дзеля ўсеахопнага

пачуцця здольная добраахвотна прыняць стыгму, пайсці насуперак усім абставінам, у тым ліку супраць сям'і і хатняга асяроддзя. Імагавобраз Сонькі падаецца з пазіцый ідэнтыфікацыйнага рэлятывізму. Яна ўсведамляе сваю іншасць у грамадстве, якое радыкальна асуджае любыя сувязі з прадстаўніком варожай арміі і варожай нацыі, імкнецца засвоіць варожы ёй дыскурс, але ў той жа час прагне захаваць уласную годнасць і ідэнтычнасць. Але гэта аказваецца занадта складана.

Польская і чэшская імагаверсія вобразаў беларусаў, іх этна-, сацыякультурных і антрапалагічных характарыстык адлюстроўваюць не толькі светапоглядныя арыенціры саміх творцаў, кантэкст эпохі, да якой мае дачыненне твор, але і кантэкст "хатняга" асяроддзя з пэўнымі сфармаванымі ўяўленнямі пра сябе і пра Іншых. Шматлікасць супярэчлівых уяўленняў, як сцвярджае І. Бабкоў, была і застаецца характэрнай рысай беларускай сітуацыі на працягу апошніх двух стагоддзяў [Бабкоў 2005]. Творчасць беларуска-ўкраінскай пісьменніцы Н. Бабінай, у прыватнасці яе раман *Бодай будка* (2019), напісаны на ўкраінскай мове, можна лічыць чарговай спробай асэнсавання прычын гістарычных і псіхалагічных супярэчнасцей у самаідэнтыфікацыйных працэсах унутры сучаснага беларускага грамадства [Бабіна 2019].

Каларытная мова твораў Н. Бабінай густа перасыпана дыялектызмамі, характэрнымі для берасцейска-пінскіх гаворак. Мастацкі аўтарскі стыль мае прыкметы магічнага рэалізму, а героі і гераіні, нашыя сучаснікі і сучасніцы, з'яўляюцца носьбітамі складанай фрагментаванай ідэнтычнасці, сімбіёзу культурных кодаў, якія адгукаюцца ў лёсах пакаленняў продкаў і ўплываюць на іх жыццё. Сціраючы межы паміж Сваім і Чужым, Н. Бабіна канструюе спецыфічную форму памежнай ідэнтычнасці[1], якая ўласцівая этнакультурнай прасторы Берасцейшчыны. Яе гераіня збянтэжана азіраецца ў пошуках надзейнай апоры, якая б засцерагла мясцовых жыхароў ад смяротнай зброі прышэльцаў-нелюдзей. Ці можа такою апорай стаць украінская мова як мова традыцыі і глебы, а магчыма, менавіта рускамоўныя героі і гераіні рамана працуюць на "захаванне ўнутранай дыялектыкі" [Барабаш 2020: 103] рэгіянальнай ідэнтычнасці, як яе "інавацыйнага фактару"? Самаідэнтыфікацыйныя трансфармацыі і самаідэнтыфікацыйная турбулентнасць у сярэдзіне грамадства сталі відавочнымі наступствамі траўматычнай гісторыі беларускага народа, якая працягваецца і фіксуецца ў мастацкіх тэкстах.

У 2021 г. ва ўкраінскім выдавецтве "Кнігі–XXI" выйшла кніга *Мы прачнемся іншымі: размовы з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі пра*

[1] Тэрмін "памежжа" ў разуменні зоны інтэнсіўнага міжкультурнага ўзаемадзеяння ўжываецца паводле А. Сухамлінава, Я. Дашкевіча, Ю. Барабаша [Барабаш 2020].

мінулае, цяперашняе і будучыню Беларусі (*Ми прокинемось іншими: розмови з сучасними білоруськими письменниками про минуле, теперішнє і майбутнє Білорусі*) накладам у 1000 экземпляраў. Аўтарка праекту і ўкладальніца – Ія Ківа. У арыгінальнае, па-мастацку афармленае выданне ўвайшлі інтэрв'ю з дзесяццю беларускімі літаратарамі ў перакладах І. Ківы, Н. Бельчанка, А. Ірванца і інш. Аналітычныя разважанні і вершы Т. Нядбай, Г. Севярынец, А. Бахарэвіча, М. Мартысевіч, Дз. Строцава, Ю. Цімафеевай, У. Лянкевіча, А. Хадановіча, В. Морт і У. Арлова – гэта спроба прадставіць украінскай аўдыторыі Чужое праз прызму Свайго, візію сучаснай Беларусі з яе выразнымі нацыянальнымі адметнасцямі і гістарычным шляхам, растлумачыць складаныя дынамічныя працэсы, якія адбываюцца ў яе культурна-грамадскім жыцці. У анатацыі сфармулявана мэта і задача праекта:

> <...> убачыць і зразумець Беларусь у працягласці: з яе гісторыяй, традыцыямі і нацыянальнымі асаблівасцямі. У чымсьці вельмі падобную да Украіны, а ў чымсьці радыкальна ад яе адметную. Для ўсіх, хто гатовы прыняць чужую трагедыю як сваю і раздзяліць радасць суседа як уласную [Ківа 2021].

На нашу думку, разважанні і аповеды беларускіх пісьменнікаў таксама з'яўляюцца важнай часткай самаідэнтыфікацыйнага працэсу дэканструкцыі ўласных нацыянальных міфаў і стэрэатыпаў, развітання з гістарычнымі наратывамі пра абяздоленых, бедных, цярплівых беларусаў, беларусаў-інтравертаў, беларусаў-партызан (Т. Нядбай), памяркоўных і заўсёды стрыманых, апалітычных, людзей, якія яшчэ нядаўна былі абыякавыя да сваёй гісторыі, мовы і культуры (А. Бахарэвіч). Вальжына Морт так сфармулявала самаідэнтыфікацыйную трансфармацыю, якую перажыло беларускае грамадства падчас пратэстаў 2020 г.: "...щойно ми себе побачили, то відразу себе полюбили" [Ківа 2021: 199].

Выданне прапануе ўкраінскім чытачам абноўлены вобраз сучаснага беларуса, рысамі якога з'яўляюцца актыўнасць, згуртаванасць і каласальная ўзаемадапамога (Т. Нядбай) [Ківа 2021: 20], нязломнасць, цвёрдасць, дух свабоды (Т. Нядбай) [Ківа 2021: 9]. "Ми цінні й цікаві, ми талановиті й гарні, ми працьовиті, ми не гірші за інших", "ми – білоруси і ми неймовірні", "іронічні і веселі", – пераконвае чытача і самога сябе А. Бахарэвіч [Ківа 2021: 64-65]. Беларускія пратэсты 2020 г. нечакана паказалі свету вобраз зусім іншай Беларусі. Паводле А. Бахарэвіча: гэта Беларусь "людей небайдужих, творчих, тих, хто завжди був у <...> опозиції до режиму, людей з міцною національною ідентичністю й шенгенськими візами, романтиків із вищою освітою" [Ківа 2021: 67]. Грамадзянская салідарнасць, арыентацыя на агульныя мэты і каштоўнасці далі

грамадству “дивовижне розуміння і відчування одне одного – як у мурашнику чи бжолиному рою”, прыводзіць выразнае параўнанне Г. Севярынец [Ківа 2021: 50], садзейнічалі пераасэнсаванню ўласнай ідэнтычнасці ў рамках канструявання актуальных аўтавобразаў і найноўшага метаіміджу (тэрмін Х. Дзізерынка).

Падборка аналізаваных тэкстаў не прэтэндуе на ўсёабдымнасць і паўнату, але паказвае парадыгму характэрных мастацкіх рашэнняў (як аўтарскіх, так і перакладчыцкіх), якія ўяўляюцца знакавымі і відавочнымі ў дыскурсе беларуска-ўкраінскага міжкультурнага дыялогу сучаснай эпохі. Такім чынам, імагалагічны вобраз беларуса ва ўкраінскай літаратуры і ўкраінскіх мастацкіх перакладах 2000-х гг. паўстае найперш як тэкставы канструкт, які варта разглядаць з пазіцый распазнавальнасці, адпаведнасці штодзённым, аўтарскім і кантэкстуальным стратэгіям рэпрэзентацыі сваёй іншасці, але пры тым варта звяртаць увагу на верагоднасць, праўдзівасць яго рэпутацыі. Памылковыя ці недакладныя, перакручаныя альбо штампаваныя імагавобразы любога народа, якія цыркулююць у публічным дыскурсе, незалежна ад іх мадальнасці, з’яўляюцца ў аднолькавай ступені небяспечнымі. Стэрэатыпізацыя ўвогуле працуе як інструмент прапаганды, міфалагізуе “веліч” адных народаў і маргіналізуе “чужасць” іншых, правакуе канфліктнасць паміж Сваім і Чужым не толькі ў тэкставай плоскасці, але і далёка за яе межамі.

Развіццё самаідэнтыфікацыйнай праблематыкі ў беларускай літаратуры і шматвектарная трансляцыя аўтавобраза праз пераклады, грамадскую дзейнасць прадстаўнікоў культуры і творчай інтэлігенцыі на сусветных пляцоўках служыць важнай мэце фарміравання яго адэкватнай версіі, альтэрнатыўнай клішэ, памылковым ўяўленням, якія ўплываюць на міжкультурныя адносіны. Аўтавобраз у такім дыскурсе можна разглядаць як спробу абвергнуць метаімідж, у разуменні таго, як суб’ект уяўляе ўласны імагавобраз у вачах Іншага. Адной з стратэгій вырашэння гэтай задачы, на наш погляд, можа стаць пераклад сучаснай высокамастацкай беларускай прозы на замежныя мовы, у тым ліку на ўкраінскую. У гэтым бачыцца перспектыва, якая дазволіла б украінцам наблізіцца да разумення беларуса як Іншага, а не Чужога – у перакладчыцкай працы, літаратурным асэнсаванні, пераадоленні ментальных бар’ераў і грамадска-палітычнага супрацьстаяння, у захаванні прасторы паразумення паміж народамі.

References

Andruhovič Ûrìj. 2012. *Leksikon ìntimnih mìst. Dovìl'nij posìbnik z geopoetiki ta kosmopolìtiki.* Kam'ânec'-Podìl's'kij: Meridian Czernowitz [Андрухович Юрій. 2012. *Лексикон інтимних міст. Довільний посібник з геопоетики та космополітики.* Кам'янець-Подільський: Meridian Czernowitz].

Âk riba ob lìd. Antologìâ sučasnogo bìlorus'kogo opovìdannâ. 2015. Kiïv: Prosvìta [*Як риба об лід. Антологія сучасного білоруського оповідання*. 2015. Київ: Просвіта].

Babìna Natalka. 2019. *Bodaj Budka*. Harkìv: Folìo [Бабіна Наталка. 2019. *Бодай Будка.* Харків: Фоліо].

Babkoŭ Ihar. 2005. *Hienealiohija bielaruskaj idei (Ź liekcyjaŭ dlia Bielaruskaha Kaliehijumu)*. "ARCHE". №3 (37): 149–150 [Бабкоў Ігар. 2005. *Генэалёгія беларускай ідэі (Зь лекцыяў для Беларускага Калегіюму).* "ARCHE". № 3 (37): 149–150].

Barabaš Ûrìj. 2020. *Čuže – Ìnakše – Svoê*. Kiïv: Tempora [Барабаш Юрій. 2020. *Чуже – Інакше – Своє*. Київ: Темпора].

Dizerink Hugo. 2011. *Ìmagologìâ ta pitannâ etnìčnoï ìdentičnostì*. "Lìteraturna komparativìstika". Vip. IV (Ч. II): 382–395 [Дизеринк Хуго. 2011. *Імагологія та питання етнічної ідентичності*. "Літературна компаративістика". Вип. IV (Ч. II): 382–395].

Ìrvanec' Oleksandr. 2017. *Harkìv 1938*. Kiïv: Laurus [Ірванець Олександр. 2017. *Харків 1938.* Київ: Laurus].

Karpovič Ìgnacìj. 2016. *Son'ka*. Pereklad ìz pol's'koï Ostapa Slivìns'kogo. Kiïv: KOMORA [Карпович Ігнацій. 2016. *Сонька.* Переклад із польської Остапа Сливінського. Київ: КОМОРА].

Kìva Ìâ. 2021. *Mi prokinemos' ìnšimi: rozmovi z sučasnimi bìlorus'kimi pis'mennikami pro minule, teperìšnê ì majbutnê Bìlorusì.* Černìvcì: Knigi – XXI [Ківа Ія. 2021. *Ми прокинемось іншими: розмови з сучасними білоруськими письменниками про минуле, теперішнє і майбутнє Білорусі*. Чернівці: Книги – XXI].

Nalivajko Dmitro. 2006. *Lìteraturna ìmagologìâ: predmet ì strategìï. Teorìâ lìteraturi j komparativìstika.* Kiïv: Vid. dìm Kiêvo-Mogilâns'ka akademìâ [Наливайко Дмитро. 2006. *Літературна імагологія: предмет і стратегії. Теорія літератури й компаративістика*. Київ: Вид. дім Києво-Могилянська академія].

Pogrebnyak Olena. 2019. *Ìmagologìčnij potencìal obrazu bìlorusa v sučasnih slov'âns'kih lìteraturah.* «EZIKOV SVÂT». Tom 17 (Kn.1): 118–125 [Погребняк Олена. 2019. *Імагологічний потенціал образу білоруса в сучасних слов'янських літературах.* «ЕЗИКОВ СВЯТ». Том 17 (Кн.1): 118–125].

Sivačenko Galina. 2020. *Kul'turnij transfer – nova metodologìâ komparativìstiki. Metodologìï sučasnoï lìteraturnoï komparativìstiki*. Red. G. Sivačenko Kiïv: Ìnstitut lìteraturi ìm. T. G. Ševčenka NAN Ukraïni [Сиваченко Галина. 2020. *Культурний трансфер – нова методологія компаративістики. Методології сучасної літературної компаративістики*. Ред. Г. Сиваченко Київ: Інститут літератури ім. Т.Г. Шевченка НАН України].

Sverbìlova Tetâna. 2020. *Ìmagologìâ âk metodologìâ reprezentacìï postnacìonal'nih ìdentifìkacìjnih modelej. Metodologìï sučasnoï lìteraturnoï komparativìstiki.* Red. G. Sivačenko Kiïv: Ìnstitut lìteraturi ìm. T.G. Ševčenka NAN Ukraïni [Свербілова Тетяна. 2020. *Імагологія як методологія репрезентації постнаціональних ідентифікаційних моделей. Методології сучасної літературної компаративістики*. Ред. Г. Сиваченко Київ: Інститут літератури ім. Т.Г. Шевченка НАН України].

Topol Âhim. 2016. *Majsternâ diâvola.* Kiïv: Tempora [Топол Яхим. 2016. *Майстерня диявола.* Київ: Темпора]. Zabužko Oksana. 2016. *Ì znov â vlìzaû v tank...* Kiïv: Komora [Забужко Оксана. 2016. *І знов я влізаю в танк...* Київ: Комора].

Zabužko Oksana. 2015. *Začuhanij provìncìalìzm – ce koli v Kiêvì tìl'ki "perešivaût'" te, šo v Moskvì nosât' (povna rozmova*) [Забужко Оксана. 2015. *Зачуханий провінціалізм – це коли в Києві тільки "перешиваютъ" те, що в Москві носять (повна розмова)*] [online] https://rozmova.wordpress.com/2015/10/08/oksana-zabuzko-14/ [доступ: 28.04.2024]**.**

STRESZCZENIE: W artykule podjęto problematykę wizerunku Białorusina na materiale prozy ukraińskiej pierwszej dekady XXI w. (J. Andruhowycz, O. Zabużko, O. Irvanets, S. Singayivskyi), powieści *Bodaj Budka* (2019) białorusko-ukraińskiej pisarki Natałki Babiny, tłumaczeń artystycznych (I. Karpowicz, J. Topol). W celu omówienia analizowanego zagadnienia posłużono się ukraińskimi tłumaczeniami dzieł S. Aleksijewicz, L. Rublewskiej i U. Arłoua i innymi. Podjęto próbę analizy obrazu wizerunkowego Białorusina jako modelu konceptualnego, którego komponentami są literackie odmiany auto-, hetero- i metaobrazu w paradygmacie od „ja-inny" do „swój-inny-obcy". Jako początkowe aspekty analizy wybrano podstawowe pojęcia imagologii: problem tożsamości / samoidentyfikacja oraz kontekst tradycji kulturowej, w której pojawia się literacki obraz innego. Dlatego dzieła sztuki, obrazy i idee, które one przekazują, zaliczane są do tradycji białorusko-ukraińskich stosunków międzyliterackich epoki postradzieckiej.

SŁOWA KLUCZOWE: obraz literacki, Białoruś, Białorusin, imagologia, tożsamość, stosunki białorusko-ukraińskie.

АНАТАЦЫЯ: У артыкуле разглядаецца вобраз беларуса на матэрыяле ўкраінскай прозы 2000-х гг. (Ю. Андруховіч, А. Забужка, А. Ірванец, С. Сынгаіўскі), рамана беларуска-ўкраінскай пісьменніцы Н. Бабінай *Бодай будка* (2019), мастацкіх перакладаў (І. Карповіч, Я. Топал). Да разгляду пастаўленай праблематыкі далучаны таксама ўкраінскія пераклады твораў С. Алексіевіч, Л. Рублеўскай, У. Арлова і інш. Зроблена спроба аналізу імагалагічнага вобраза беларуса як канцэптуальнай мадэлі, кампанентамі якой лічацца літаратурныя разнавіднасці аўта-, гетэра- і метаіміджу ў парадыгме ад Я-Іншы да Свой-Іншы-Чужы. У якасці зыходных аспектаў аналізу абраны базавыя канцэпты імагалогіі: праблема ідэнтычнасці / самаідэнтыфікацыі і кантэкст культурнай традыцыі, ва ўлонні якой паўстае літаратурны вобраз Іншага. Таму мастацкія творы, ідэі і вобразы, якія яны транслююць, разглядаюцца ў рэчышчы традыцыі беларуска-ўкраінскіх міжлітаратурных узаемасувязяў постсавецкай эпохі.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: літаратурны вобраз, Беларусь, беларус, імагалогія, ідэнтычнасць, беларуска-ўкраінскія ўзаемасувязі.

Data przesłania artykułu: 05.05.2024
Data akceptacji artykułu: 21.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Olena Pohrebniak / Алена Пагрэбняк– Ukraina, Kijowski Uniwersytet Narodowy im. Tarasa Szewczenki, Instytut Filologii, Katedra Filologii Słowiańskiej; dr nauk filologicznych, docent; specjalność naukowa: literatura porównawcza; zainteresowania naukowe: historia literatur słowiańskich, międzysłowiańskie stosunki literackie i kulturalne, literatura porównawcza, problemy intermedialności, studia postkolonialne.

Adres: Kijowski Uniwersytet Narodowy im. Tarasa Szewczenki, бульвар Тараса Шаўчэнкі, 14, Кіеў, 01601, Украіна.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Погребняк Олена. 2023. *Новітня білоруська література у взаєминах з українською літературою. Навчальний посібник.* Київ: Бланк-Прес.
2. Погребняк Олена. 2023. *Тарас Шевченко і білоруський культурний канон*. "Філологічні семінари. Канон літературної історії та жанрові канони": ВПЦ "Київський університет" Вип. 23–25: 105–120.
3. Погребняк Олена. 2023. *Творчість В. Короткевича в сучасній Україні: до проблеми українсько-білоруського діалогу культур*. "Ucrainica X. Současná ukrajinistika. problémy jazyka, literatury a kultury": Univerzita Palackého v Olomouci: 414–420.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Mikołaj Petryga, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.15

Mikołaj Petryga

Uniwersytet Warszawski /
University of Warsaw
ORCID: https://orcid.org/0009-0001-6789-6951
e-mail: m.petryga@student.uw.edu.pl

„Biełsat" o kryzysie humanitarnym na polsko-białoruskiej granicy. Analiza językowa wybranych artykułów z 2023 r.

"Belsat" on the humanitarian crisis on the Polish-Belarusian border. A linguistic analysis of selected articles from 2023

"Белсат" пра гуманітарны крызіс на польска-беларускай мяжы. Лінгвістычны аналіз выбраных артыкулаў 2023 г.

ABSTRACT: The subject of the research described in the article are selected texts from the Internet portal "Belast," which refer to exile from the Middle East via Belarus to Poland. The emerging humanitarian crisis on the Polish–Belarusian border is one of the most frequently discussed topics in the Polish media sphere, and the press materials related to it are characterized by high emotionality. The research aims to analyse the attitude of independent Belarusian–speaking publicists toward the given subject, primarily how they conceptualise the image of a *refugee*. The method of linguistic analysis, based on Przemyslaw Lozowski's concept of postmodern ethnolinguistics and Maciej Kawka's discourseology, takes into account the study of the structure, function, semantics, and styles of language, as well as the relationship of the text to social life, particularly in terms of the axiology of knowledge stored in language. The interpretation of lexical means – such as idiomatic phrases, and elements of grammar – regarding the realization of the informative and impressive function of the text shows that the articles are dominated by the informative function. This is evident from the presence of specific stylistic procedures: numerous references to the semantic field of *administration*, the dominance of simple developed sentences, and the multiplicity of extralinguistic elements. The impressive function is realized indirectly, through the emphasis or omission of certain messages and the use of lexemes only seemingly unemotional. *Refugees* are conceptualised as *illegal* and *lacking agency*.

KEYWORDS: "Belast," ethnolinguistics, Polish–Belarusian border, refuge, sociolinguistics.

W sierpniu 2021 r. polska straż graniczna zatrzymała ponad 300 uchodźców z Iraku i Afganistanu, którzy przeszli białorusko-polską granicę. Według zachodnich, m. in. polskich i amerykańskich domów prasowych, zostali oni przewiezieni w ramach zorganizowanej akcji białoruskiego rządu [Кубік 2023; Charlish 2021] (co innego twierdzą białoruskie media rządowe, które odpowiedzialnością obarczają Unię Europejską [Кубік 2023]). Po tym wydarzeniu Straż zapowiedziała, że nie będzie wpuszczać uchodźców na terytorium Polski [Potocki 2021]. Od tamtej pory sukcesywnie stosuje tzw. *pushbacki*, czyli zmusza migrantów do powrotu do Białorusi [*Sytuacja na granicy*…]. W 2022 r. polski rząd rozpoczął budowę systemu fortyfikacji, który uniemożliwia przejście granicy [*180 km długości*…]. Informacje o chęci zdemontowania bariery nie pojawiają się, mimo zmiany krajowej władzy [*Wyniki wyborów*…].

W związku z tym, że opisywany temat kryzysu humanitarnego na polsko-białoruskiej granicy charakteryzuje się wysokim nacechowaniem emocjonalnym, jestem ciekawy, w jaki sposób białoruskie media się do niego ustosunkowują. W niniejszej pracy zwracam uwagę na to, jak za pomocą środków leksykalnych, jak np. frazeologizmy, oraz elementów gramatyki ukazywane jest podejście autorów do omawianego zagadnienia. Dostrzegam przede wszystkim jednostki językowe, które świadczą o impresywnej i informatywnej funkcji tekstów.

Do napisania artykułu na temat postrzegania uchodźctwa zainspirowała mnie myśl Emmanuela Lévinasa o transcendentalnej trosce w poznawaniu Innego: „twarz [Innego], wydarzająca się jako epifania i wzywająca mnie, odrywa się od świata, który może być nam wspólny i którego możliwości, rozwijające się w naszej egzystencji, zapisane są w naszej naturze" [Lévinas 2002: 229]. Autor apeluje o to, żeby każdego człowieka postrzegać jednostkowo, jako nosiciela możliwych i niemożliwych do poznania doświadczeń, a nie jako część stereotypizowanej zbiorowości.

Metodologia

Perspektywa, którą przyjmuję w badaniu omawianych tekstów, opiera się na koncepcji etnolingwistyki postmodernistycznej Przemysława Łozowskiego. Autor twierdzi, że „generalizacje, które żeby były sądami, a nie stwierdzeniami faktów, muszą uwzględniać zamocowanie lingwo-kulturowe tych, którym te sądy się przypisuje, jak i tych, którzy te sądy zgłaszają" [Łozowski 2022: 59]. W analizie jednostek nacechowanych emocjonalnie, szczególnie pod względem aksjologicznym, odnoszę się więc do wiedzy zapisanej w języku – unikam jednak konstruowania obrazu autorów tekstów, a wykazuję jedynie tendencje charakteryzujące wybrany zbiór artykułów prasowych, osadzonych

w konkretnych realiach czasowo–przestrzennych. Jednocześnie skupiam się na sposobie, w jaki autorzy kreują obraz indywiduów-osób uchodźczych.

Korzystam z zaproponowanej przez Macieja Kawkę metodologii analizy dyskursu medialnego. Ta metodologia uwzględnia badanie struktury, funkcji, semantyki i stylów języka, związku tekstu z życiem społecznym, analizy reprezentacji mentalnych nadawcy, stopnia rozumienia tekstu jako narzędzia dominacji oraz jego zgodności z prawdą [Kawka 2014: 166]. W związku z ograniczonym materiałem źródłowym i filologicznym charakterem pracy skupiam się na językowych, społecznych i politycznych aspektach badania dyskursu.

Co do elementów językowych, analizuję leksykę, frazeologię, składnię i stylistykę pod kątem obecności augmentatywów, synonimii, terminologii, neologizmów, zapożyczeń, onimów, elementów niewerbalnych oraz ich nacechowania emocjonalnego. Taki sposób badania tekstów proponuje warszawska socjolingwistka Svitlana Romaniuk [Romaniuk 2016: 121–301]. Aspekty pozajęzykowe badam pod kątem obecności przemocy symbolicznej w rozumieniu Pierre'a Bourdieu – działań, które nakładają na adresatów wizje rzeczywistości nadawcy:

> [t]he word [...] and all the stereotyped or ritual forms of expression are programmes of perception and different, more or less ritualized strategies for the symbolic struggles of everyday life [...] imply a certain claim to a symbolic authority as the socially recognized power to impose a certain vision of the social world [...] [Bourdieu 1991: 106].

Analizę jednostek leksykalnych opisywanych artykułów pod kątem tego, w jaki sposób realizują one informatywną oraz impresywną funkcję tekstu, opieram na podziale stosowanym przez Romana Jakobsona. Za Grażyną Habrajską, parafrazującą myśl rosyjskiego językoznawcy, funkcja informatywna (przedstawieniowa, poznawcza, ideacyjna) „wiązana jest z prezentowaniem przez mówiących fragmentów realnej rzeczywistości na mocy powiązania znaków językowych z utrwalonymi w pamięci modelami wyobrażeniowymi" [Habrajska 2005: 92]. Za to funkcja impresywna (konatywna) „pojmowana jest jako wpływanie na odbiorcę" [Habrajska 2005: 92]. O tym, w jaki sposób są one realizowane, piszę na przykładach zawartych w omawianych artykułach prasowych.

Na źródło analizy omawianego tematu wybrałem portal internetowy „Biełsat" – znajduje się tam wiele artykułów, których tematyka jest związana z Polską (o czym świadczy choćby obecność polskiej wersji językowej serwisu [*Пра нас*]), w tym polsko-białoruską granicą [*Беларуска-польская мяжа*]. Serwis powstał bowiem z inicjatywy Telewizji Polskiej, uzyskuje finansowanie Ministerstwa Spraw Zagranicznych Rzeczypospolitej [*Пра нас*]. Ponadto „Biełsat" jest jednym z najczęściej przeglądanych białoruskich serwisów

internetowych, w lipcu 2022 r. liczba odwiedzin serwisu wyniosła ponad 700 tys. [*Рейтинг новостных сайтов*]. Świadczy to o jego wadze dla kształtowania się białoruskiego dyskursu medialnego.

W związku z zainteresowaniem badawczym i tematem konferencji korzystałem jedynie z materiałów w języku białoruskim. Szukałem artykułów prasowych oznaczonych tagiem *беларуска-польская мяжа*, zawierających w treści co najmniej jeden wyraz graficzny należący do paradygmatu leksemu *бежанц-*, *мігрант-* lub *уцякач-*. Wybrane rekordy ograniczyłem do tekstów, które powstały nie wcześniej niż w październiku 2023 r. – powyższe kryterium zastosowałem z uwagi na to, że w tamtym miesiącu średnia temperatura po raz pierwszy od wiosny spadła poniżej 16°C [*Archiwum pogodowe Białowieża*], czyli najniższej temperatury pokojowej [Ważna 2022], co zaś znacząco wpływa na zdrowie osób migranckich zmuszonych do przebywania na świeżym powietrzu. To, jak zakładam, mogło przyczynić się do polaryzacji opinii autorów w odniesieniu do osób migranckich – stosowania zabiegów stylistycznych świadczących o trosce lub dehumanizacji, co zaś przełożyłoby się na większą różnorodność materiału badawczego pod względem nacechowania emocjonalnego.

Po nałożeniu wszystkich ograniczeń otrzymałem cztery rekordy, poniżej w kolejności chronologicznej:

- *Экзітпол: толькі 2,2% удзельнікаў рэферэндуму ў Польшчы ўхвалілі знос агароджы на мяжы з Беларуссю* [Крот 2023],
- *Польскія памежнікі зафіксавалі з пачатку года каля 22 000 спробаў незаконнага пераходу мяжы з боку Беларусі* [Міраш 2023],
- *На польска-беларускай мяжы быў падстрэлены мігрант* [Шавель 2023],
- *Упершыню за два гады Польшча не зафіксавала спробаў парушэння мяжы з Беларуссю* [Кубік 2023].

Экзітпол: толькі 2,2 % удзельнікаў рэферэндуму ў Польшчы ўхвалілі знос агароджы на мяжы з Беларуссю [Крот 2023]

Artykuł Siarhieja Krota przedstawia wstępne wyniki referendum ogólnokrajowego, które odbyło się w Polsce 15 października 2023 [*Referendum Ogólnokrajowe 2023 r.*]. Prezentuje odpowiedzi Polaków na wszystkie cztery pytania, ze szczególnym uwzględnieniem problemu bariery na polsko-białoruskiej granicy (por. tytuł artykułu).

Tekst, będący w dużej mierze parafrazą komunikatu prasowego Polskiej Agencji Prasowej, jest ubogi we frazeologię. Kolokacje, które można odnaleźć w artykule, por. “выступіць за ліквідаванне агароджы”, “не падтрымаць продажу”, “выступіць супраць павышэння пенсійнага ўзросту”, prezentują

metaforę *zmiana to ruch*, należą do pól semantycznych *polityka* i *administracja* – odnoszą się do przeprowadzonego referendum. Tak samo zapożyczenia, por. *экзітпол*, *рэферэндум*, *актывы*, *структуры*, *мігранты*.

Artykuł jest obfity w jednostki należące do terminologii naukowej, związanej ze statystyką – np. "экзітпол: толькі 2,2%", *„Ipsos"* – i politologią, por. *выбары*, *рэферэндум*, *грамадзяне*, "кіроўная партыя «Закон і справядлівасць»", "ліквідаванне агароджы". Biorąc to pod uwagę, ale też ubogość w synonimię (jedynie *агароджа = плот*) i inne środki stylistyczne; zarówno obecność wielu elementów niewerbalnych (liczby, cudzysłowy, hiperłącze) oraz zdań prostych rozwiniętych, jak i brak onimów (z wyjątkiem nazw państw, domów medialnych i ośrodka badania opinii społecznej), można stwierdzić, że artykuł prezentuje przede wszystkim funkcję informatywną. Jak twierdzi S. Romaniuk, o właściwości tekstu świadczy „informacyjność (zawartość w tekście informacji, odpowiednio przedstawionej, m. in. za pomocą środków językowych)" [Romaniuk 2016: 58], a więc przede wszystkim to, co w jak najmniejszej objętości tekstu przekazuje jak najwięcej treści. Do tych należą powyższe przykłady.

Korzystając z analizy danych pozajęzykowych, ciekawi mnie zabieg dokonany przez autora, polegający na nieuwzględnieniu pewnych informacji związanych z przeprowadzeniem referendum. Autor artykułu nie wspomina o dyskusji, toczącej się w Polsce, o legalności i zasadności opisywanego referendum, o czym świadczy choćby stanowisko organizacji pozarządowych [Kryński 2023]. W polskiej sferze medialnej szeroko opisywane było bowiem to, czy zachowania polskich władz na granicy są w ogóle legalne [*Sytuacja na granicy polsko-białoruskiej*]. Przychylam się do tezy Carol A. Kidron o tym, że milczenie jest znaczące: „the majority [of the reminiscences] would be sufficed by the silent presence of surviving remnants" [Kidron 2009: 6]. Poza tym za G. Habrajską zabieg ten można uznać za przejaw perswazji informacyjnej, jednego ze środków realizacji funkcji impresywnej, por. „[i]stotne jest, aby odbiorca wiedział jedynie to, co zdaniem nadawcy powinien wiedzieć, a co nie mogłoby utrudnić skuteczności perswazji" [Habrajska 2005: 114].

Chcę pochylić się też nad semantyką wyrazu *мігранты* [*migranci*], użytego w kontekście synonimicznego *бежанцы* [*uchodźcy*]. Istnieje subtelna, lecz istotna znaczeniowo różnica między dwoma leksemami. Jak czytamy na stronie Komisji Praw Człowieka Organizacji Narodów Zjednoczonych,

> [p]ojęcie „uchodźcy" zostało wyraźnie zdefiniowane w prawie międzynarodowym, które zapewnia uchodźcom ochronę. Uchodźcy to osoby przebywające poza swoim krajem pochodzenia z powodu obawy przed prześladowaniem, z powodu konfliktu, przemocy lub innych okoliczności poważnie zakłócających porządek publiczny, które – na skutek powyższego – wymagają „ochrony międzynarodowej". […] Na poziomie międzynarodowym nie ma jednolitej

> definicji prawnej pojęcia „migrant". […] Zacieranie różnic pomiędzy pojęciami „uchodźcy" i „migranci" odwraca uwagę od szczególnej ochrony prawnej, jakiej wymagają uchodźcy, takiej jak ochrona przed wydaleniem lub zawróceniem (refoulement) oraz przed podleganiem karze za przekroczenie granicy bez zezwolenia w poszukiwaniu bezpieczeństwa [*Uchodźca czy migrant?*…].

Tymczasem, zgodnie z raportem Helsińskiej Fundacji Praw Człowieka, na białorusko-polskiej granicy pojawiają się uchodźcy [*Sytuacja na granicy polsko-białoruskiej*, online]. Użycie słowa o innej konotacji świadczy o ukrytej realizacji funkcji impresywnej.

Польскія памежнікі зафіксавалі з пачатку года каля 22 000 спробаў незаконнага пераходу мяжы з боку Беларусі [Міраш 2023]

Artykuł autorstwa Zmiciera Mirasza opisuje próby przejścia przez granicę białorusko-polską. Konkretnie odnosi się do ich liczby – przytacza dane dotyczące takich przekroczeń od stycznia do października ubiegłego roku. Pojawia się wiele liczb oraz informacji o *nielegalności* przechodzenia przez granicę.

Tak jak poprzedni tekst, artykuł jest na wskroś informatywny. Mimo że nie stanowi parafrazy komunikatu prasowego, jego budowa odpowiada poprzedniemu tekstowi. Do elementów wspólnych obu artykułów należą: ubogość synonimów, frazeologii i leksemów nacechowanych emocjonalnie. Onimy odnoszą się jedynie do państw oraz organów kontroli granicznej ("Памежная ахова Польшчы" i "Падляская памежная ахова"). Praktycznie nie ma różnorodności stylistycznej, o czym świadczy chociażby niezmienne występowanie zdań prostych rozwiniętych, złożonych współrzędnie łącznych i synonimicznych (niezwykła częstotliwość jak na tak krótki tekst).

Czytelnik od razu zwróci uwagę na zapis liczbowy występujący z konotowanymi rzeczownikami (por. "470 чалавек", "37 выпадкаў незаконнага пераходу мяжы", "186-кіламетровы", "5,5 метра"). Ponadto pojawia się wiele powtórzeń i parafraz: "незаконны пераход", "нелегальны пераход", "нелегальнае перасачэнне мяжы". Wszystkie dotyczą wąskiego fragmentu pola semantycznego *administracja* (tak jak zapożyczenia, por. *патруль*, *аўтамабіль*, *кур'еры*).

Podobnie jak w poprzednim artykule za sugestywne można uznać zarówno występowanie leksemu *мігранты*, jak i powtarzającej się wzmianki o *nielegalności* przekraczania granicy (wysokie nacechowanie emocjonalne). Autor stosuje ubezpodmiotawiającą kolokację *наплыў мігрантаў*, która to odbiera desygnowanym uchodźcom cechy decyzyjności. *Наплыў* – w pierwotnym znaczeniu – konotuje *ciecze*, tj. rzeczy w rozumieniu ontologicznym pozbawione sprawczości. Zdaniem Moniki Nowickiej

> [z]miana celu komunikatu z informacyjnego na impresyjny wymaga bardziej ostrego języka, który uwydatnia dychotomiczny, czarno-biały podział politycznego świata na tych, którzy są z „nami" oraz tych, którzy są przeciwko „nam". Język jest narzędziem pozwalającym opisać ów dwuwymiarowy świat oraz nazwać wrogów tak, aby sprawiali wrażenie realnego zagrożenia [Nowicka 2013: 125].

Pozbawienie sprawczości w języku, a więc stworzenie dychotomii pomiędzy *sprawczymi nami* i *nie-sprawczymi nie-nami*, jest realizacją impresywnej funkcji tekstu, w tym przypadku – poprzez dehumanizację. O umniejszającej funkcji wyrazu *наплыў* świadczy

> „metafora wodna", korzystająca z takich słów jak: zalew, fala, napływ migrantów lub uchodźców […] rozbudza skojarzenia z klęską żywiołową, zdarzeniami związanymi z ekstremalnymi zjawiskami naturalnymi, których nie da się zatrzymać i na które człowiek nie ma wpływu [Cieślikowska 2016].

We fragmentach dotyczących działań polskiej władzy Z. Mirasz nie stosuje zabiegów dehumanizujących mimo np. pokusy przejścia ze strony czynnej na stronę bierną, zabiegu wydłużającego przyjęcie komunikatu [Kurcz 1976: 172], a więc utrudniającego, czyli negatywnie wpływającego na jego odbiór. Sformułowania "было зафіксавана" oraz "былі затрыманыя" pojawiają się jednokrotnie, w innych częściach możemy przeczytać o tym, że "Памежная ахова Польшчы паведамляе…", "Польшча пабудавала…".

Sądzę, że autor wpisuje się w dyskurs przemocy symbolicznej, który, za P. Bourdieu, upodmiotawia desygnaty-podmioty (również w pozajęzykowym znaczeniu) pozostające w stosunku władzy [Bourdieu 1991: 106].

На польска–беларускай мяжы быў падстрэлены мігрант **[Шавель 2023]**

Tekst Ramana Szawiela opisuje sytuację, która wydarzyła się 3 listopada 2023 roku w okolicy Dubicz Cerkiewnych. Chodzi o postrzelenie syryjskiego uchodźcy przez polskiego strażnika granicznego. Autor odnosi się do wywiadu TVN24 z przedstawicielem prokuratury wojskowej, który twierdzi, że strzał był *nieszczęśliwym wypadkiem*. Pojawia się informacja o śledztwie i stanie zdrowia uchodźcy.

Artykuł niewątpliwie przypomina poprzednie. Widzimy krótkie akapity, w tym przypadku złożone przede wszystkim ze zdań prostych rozwiniętych, które podkreślają informatywną funkcję tekstu. Synonimia jest prawie nieobecna, tak samo terminologia i nazwy własne odnoszą się przede wszystkim do pól semantycznych *prawo* i *administracja*, por. *інцыдэнт*, *следзтва*, *зняволенне*, *справа*, "Вайсковая пракуратура Польшчы", "намеснік пракурора па вайсковых справах", "салдат Войска польскага",

“вайсковы аддзел Акруговай пракуратуры ў Варшаве”, “неасцярожнае абыходжанне са зброяй”, “ненаўмыснае прычыненне цялесных пашкоджанняў”, “пазбаўленне волі”. W artykule brak frazeologizmów. Omawiany tekst jest podobny do poprzednich artykułów pod względem liczby elementów niewerbalnych – enumeracji i hiperłączy.

Tym, co wyróżnia tekst na tle pozostałych, jest obecność leksemów należących do pola *medycyna*, por. “стан стабільны”, “жыццю нічога не пагражае”; te jednostki językowe odnoszą się do stanu zdrowia postrzelonego uchodźcy. Możemy też zauważyć bogactwo leksemów nacechowanych ekspresywnie, co nie dziwi ze względu na emocjonalny temat artykułu. Poniżej przykłady, por. *незаконна*, *інцыдэнт*, *здарэнне*, ***нелегал***, *зняволенне*, “падстрэлены мігрант”, “неасцярожнае абыходжанне са зброяй”, “ненаўмыснае прычыненне цялесных пашкоджанняў”, “пазбаўленне волі”.

Tak samo jak w artykule Z. Mirasza, w opisywanym tekście zarysowuje się linia stosunku władzy, zgodna z myślą P. Bourdieu o przemocy symbolicznej [Bourdieu 1991: 106]. Widać to szczególnie przy określaniu tragedii jako *інцыдэнт* i *здарэнне*, co poniekąd zdejmuje winę ze strażnika, oraz użyciu wobec uchodźcy słowa ***нелегал***, jeszcze bardziej negatywnie nacechowanego w stosunku do wcześniej wybieranego *мігрант* (przeniesienie uwagi z powodu ucieczki i zasadności poszukiwania schronienia na niezgodność z prawem faktu przekroczenia granicy). Podobnie jak w poprzednim artykule opisowi przekraczania granicy towarzyszy nieodłączny epitet stały *незаконна*.

Упершыню за два гады Польшча не зафіксавала спробаў парушэння мяжы з Беларуссю [Кубік 2023]

Treść artykułu odpowiada jego tytułowi. Autor przytacza ponadto wypowiedzi przedstawicieli białoruskiej i polskiej władzy, które stanowią ważny element interpretacyjny pozostałych artykułów.

Terminologia i nazwy własne należą do tych samych pól semantycznych, co w poprzednich tekstach. Sciapan Kubik nie urozmaica artykułu synonimami ani związkami frazeologicznymi. Tekst jest ubogi w zdania rozwinięte, pojawia się za to wiele liczb oraz hiperłącza. Na osobną uwagę zasługuje ostatni akapit tekstu:

> Варшава называе крызіс на мяжы “штучна створаным шляхам нелегальнай міграцыі”, а ў Менску кажуць, што “Еўропа сама паклікала гэтых людзей”, расказваюць пра “зверствы” памежнікаў з суседніх краінаў ЕЗ, паведамляюць пра выпадкі смерці мігрантаў у памежных раёнах.

Zakończenie przekazuje informacje, które zdają się uzupełniać treści poprzednich artykułów. Autor nazywa przedstawioną sytuację *kryzysem*,

w wypowiedziach przedstawicieli władz obu krajów obecne jest wiele leksemów nacechowanych emocjonalnie, por. "**штучна** створаны шлях **нелегальнай** міграцыі", "Еўропа сама **паклікала** гэтых людзей". Te cytaty świadczą o odbieraniu sprawczości uchodźcom. Zdaje się, jakoby obie strony przerzucały się odpowiedzialnością za reakcję na wzmiankowany kryzys, nie uznając go za humanitarny, a jedynie polityczny. Świadczy o tym obecność jednostek z pola semantycznego *polityka* (por. "гібрыдная вайна" z wypowiedzi polskich władz). Potrzeby *nielegalnych* uchodźców (por. "незаконнае пранікненне" – stwierdzenie autorstwa S. Kubika), pozbawionych imion, nie są brane pod uwagę zarówno przez autora, jak i cytowane osoby.

Autor nie polemizuje z cytowanymi osobami, uzupełnia ich wypowiedzi, por. "[у] ведамстве пры гэтым адзначылі, што «гібрыдная вайна на мяжы не спыняецца» і сёння, 28 лістапада, група «агрэсіўна настроеных замежнікаў» атакавала польскія патрулі, кідаючы камяні і галіны".

Podsumowanie

Opisywane artykuły wykazują tożsamość pod względem treści i formy. Wszystkie odnoszą się do sytuacji na polsko-białoruskiej granicy, co wynika z zastosowanych kryteriów doboru źródeł. Teksty są ubogie w synonimię i frazeologię. Terminologia, w tym należące do niej nazwy własne i zapożyczenia, odnoszą się przede wszystkim do pola semantycznego *administracja*. Wypowiedzenia złożone pojawiają się rzadko, najczęściej w postaci zdań złożonych współrzędnie łącznych, czasem też synonimicznych; dominują wypowiedzenia proste rozwinięte, zawarte w krótkich akapitach. Teksty obfitują w elementy pozajęzykowe, takie jak hiperłącza i cudzysłowy, przede wszystkim jednak – enumeracje. Wszystko to świadczy o dominacji funkcji informatywnej omawianych artykułów.

Funkcja impresywna ujawnia się zaś niebezpośrednio, poprzez pomijanie niektórych informacji (dyskusji o legalności i zasadności referendum w artykule S. Krota [Крот 2023]), podkreślanie innych (wykorzystywanie epitetu stałego w tekście R. Szawiela [Шавель 2023]) i używanie leksemów nacechowanych emocjonalnie (np. *нелегал* tamże [Шавель 2023]). We wszystkich tekstach, najczęściej nie wprost, *uchodźca* jawi się jako *nielegalny* i *niesprawczy*. Te refleksje zdaje się zawierać ostatni akapit artykułu S. Kubika, w którym autor nie polemizuje z wypowiedziami białoruskiej i polskiej władzy [Кубік 2023].

References

180 km długości, stalowe słupy i kamery. Tak będzie wyglądał mur na granicy z Białorusią [online] https://www.polityka.pl/tygodnikpolityka/kraj/2142026,1,180-km-dlugosci-stalowe-slupy-i-kamery-tak-bedzie-wygladal-mur-na-granicy-z-bialorusia.read[dostęp: 12.03.2024].

Archiwum pogodowe Białowieża [online] https://www.meteoblue.com/pl/pogoda/ historyclimate/weatherarchive/bia%C5%82owie%C5%BCa_polska_776092?fcstlength=1m&year=2023&month=10[dostęp: 12.03.2024].

Belaruska-pol'skaâ mâža [*Беларуска-польская мяжа*] [online] https://belsat.eu/tag/belaruska-polskaya-myazha[dostęp: 12.03.2024].

Bourdieu Pierre. 1991. *The Social Institution of Symbolic Power*. W: *Language & Symbolic Power*. Cambridge: Polity Press.

Charlish Alan. 2021. *Poland reports record number of migrants at Belarusian border* [online] https://www.reuters.com/world/europe/poland-reports-record-numb er-migrants-belarusian-border-2021-08-09/[dostęp: 12.03.2024].

Cieślikowska Dominika. 2016. *Jak rozmawiać o uchodźcach – komentarz do scenariuszy lekcji (cz. II)* [online] https://opolityce.ceo.org.pl/wp-content/uploads/sites/ 4/2023/10/uch_2_mat-metodyczny_1_1-1.pdf[dostęp: 12.03.2024].

Habrajska Grażyna. 2005. *Nakłanianie, perswazja, manipulacja językowa* „Acta Universitatis Lodziensis. Folia Litteraria Polonica". T. 7. № 2: 92.

Kawka Maciej. 2014. *O badaniu języka dyskursu medialnego*. „Media i społeczeństwo". № 4: 166.

Kidron Carol. 2009. *Toward an Etnography of Silence*. „Current Anthropology". T. 50. № 1: 6.

Krot Sârgej. 2023. *Èkzitpol: tol'ki 2,2% udzel'nikaŭ rèferèndumu ŭ Pol'ščy ŭxvalili znos aharodžy na mjaży z Belarussju* [Крот Сяргей. 2023. *Экзітпол: толькі 2,2% удзельнікаў рэферэндуму ў Польшчы ўхвалілі знос агароджы на мяжы з Беларуссю*] [online] https://belsat.eu/news/15-10-2023-ekzitpol[dostęp: 12.03.2024].

Kryński Eryk. 2023. *Głosuj w wyborach, nie w referendum! Deklaracja organizacji pozarządowych!* [online] https://mamprawowiedziec.pl/czytelnia/artykul/glosuj-wyborach-nie-w-referendum-deklaracja-organizacji-pozarzadowych[dostęp: 12.03.2024].

Kubìk Scâpan. 2023. *Uperšynû za dva gady Pol'šča ne zafiksavala sprobaŭ parušènnâ mâžy z Belarussû* [Кубік Сцяпан. 2023. *Упершыню за два гады Польшча не зафіксавала спробаў парушэння мяжы з Беларуссю*] [online] https://belsat.eu/ news/28-11-2023-polshcha-ne-zafiksavala-sprobau-parushennya-myazhy[dostęp: 12.03.2024].

Kurcz Ida. 1976. *Struktura języka a procesy przetwarzania wiedzy przez człowieka*. W: *Psycholingwistyka. Przegląd problemów badawczych*, Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

Lévinas Emmanuel. 2002. *Twarz i etyka*. W: *Całość i nieskończoność. Esej o zewnętrzności*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

Łozowski Przemysław. 2022. *Indywidualizacja, czyli etnolingwistyka na miarę postmodernizmu: od narodu i ludu w stronę człowieka, jednostki, obywatela*. „Etnolingwistyka. Problemy Języka i Kultury" № 34: 59.

Mìraš Zmìcer. 2023. *Pol'skìâ pamežnìkì zafiksavalì z počatku goda kalâ 22 000 sprobaŭ nezakonnaga perahodu mâžy z boku Belarusì* [Міраш Зміцер. 2023. *Польскія памежнікі зафіксавалі з пачатку года каля 22 000 спробаў незаконнага пераходу мяжы з боку Беларусі*] [online] https://belsat.eu/news/22-10-2023-polskiya-pamezhniki-zafiksavali-z-pachatku-goda-kalya-22-000-sprobau-nezakonnaga-perahodu-myazhy-z-boku-belarusi[dostęp: 12.03.2024].

Nowicka Monika. 2013. *Dyskurs o dyskursie, czyli o mowie wrogości… mową wrogości*. W: *To oni są wszystkiemu winni… Język wrogości w polskim dyskursie publicznym*. (Red.) X. Bukowska, B. Markowska. Warszawa: Trio.

Potocki Michał. 2021. *Migracyjny impas na granicy. Straż Graniczna nie będzie wpuszczać imigrantów z terenu Białorusi* [online] https://www.gazetaprawna.pl/wiadom osci/kraj/artykuly/8228631,kryzys-migracyjny-imigranci-z-afganistanu.html[dostęp: 12.03.2024].

Pra nas [*Пра нас*] [online] https://belsat.eu/about[dostęp: 12.03.2024].

Referendum Ogólnokrajowe 2023 r. [online] https://referendum.gov.pl/referendum 2023/pl[dostęp: 12.03.2024].

Rejting novostnyh sajtov Belarusi v iûle 2022 [*Рейтинг новостных сайтов Беларуси в июле 2022*] [online] https://bolkunets.org/news/reyting-novostnykh-saytov-belarusi-v-iyule-2022[dostęp: 12.03.2024].

Romaniuk Svitlana. 2016. *Ukraiński dyskurs polityczny w latach 2010–2014. Analiza lingwistyczna*. Warszawa – Iwano-Frankiwsk: Katedra Ukrainistyki, Wydział Lingwistyki Stosowanej Uniwersytetu Warszawskiego.

Sytuacja na granicy polsko-białoruskiej: „To jest kryzys humanitarny" [online] https://hfhr.pl/aktualnosci/sytuacja-na-granicy-polsko-bialoruskiej-to-jest-kryzys-humanitarny-[dostęp: 12.03.2024].

Šavel' Raman. 2023. *Na pol'ska-belaruskaj mâžy byŭ padstrèleny mìgrant* [Шавель Раман. 2023. *На польска-беларускай мяжы быў падстрэлены мігрант*] [online] https://belsat.eu/news/05-11-2023-na-polska-belaruskaj-myazhy-byu-zastrelenymigrant[dostęp: 12.03.2024].

Uchodźca czy migrant? Tłumaczymy różnice i wyjaśniamy ich sens. [online] https://www.unhcr.org/pl/365-plwiadomosci2016uchodzca-czy-migrant-tlumaczymy-roznice-i-wyjasniamy-ich-sens-html.html[dostęp: 12.03.2024].

Ważna Magda. 2022. *Jaka powinna być idealna temperatura w mieszkaniu? Eksperci podają konkrety* [online] https://www.medonet.pl/zdrowy-dom,jaka-powinna-byc-idealna-temperatura-w-mieszkaniu--eksperci-podaja-konkrety,artykul,30927053.html[dostęp: 12.03.2024].

Wyniki wyborów do Sejmu [online] https://tvn24.pl/wybory-parlamentarne-2023[dostęp: 12.03.2024].

STRESZCZENIE: Przedmiotem badań opisanych w artykule są wybrane teksty z portalu internetowego „Biełsat", które odnoszą się do uchodźctwa z Bliskiego Wschodu przez Białoruś do Polski. Powstały kryzys humanitarny na polsko-białoruskiej granicy jest jednym z najczęściej podejmowanych tematów w polskiej sferze medialnej, związane z nim materiały prasowe charakteryzują się wysokim nacechowaniem emocjonalnym. Za cel badania przyjmuje się analizę stosunku niezależnych białoruskojęzycznych publicystów do omawianego tematu, przede wszystkim tego, w jaki sposób konceptualizują obraz *osoby uchodźczej*. Metoda analizy językowej, oparta na koncepcji etnolingwistyki postmodernistycznej Przemysława Łozowskiego i dyskursologii Macieja Kawki, uwzględnia badanie struktury, funkcji, semantyki i stylów języka oraz związku tekstu z życiem społecznym, w szczególności pod kątem aksjologii wiedzy zapisanej w języku. Interpretacja środków leksykalnych – takich jak frazeologizmy, oraz elementów gramatyki – pod względem realizacji informatywnej i impresywnej funkcji tekstu wykazuje, że w artykułach dominuje funkcja informatywna. Jest to widoczne dzięki obecności konkretnych zabiegów stylistycznych: licznych odniesień do pola semantycznego *administracja*, dominacji wypowiedzeń prostych

rozwiniętych i wielości elementów pozajęzykowych. Funkcja impresywna realizuje się niebezpośrednio, poprzez podkreślanie lub pomijanie niektórych wiadomości oraz stosowanie leksemów jedynie z pozoru nienacechowanych emocjonalnie. *Osoby uchodźcze* konceptualizowane są jako *nielegalne* i *niesprawcze*.

SŁOWA KLUCZOWE: „Biełsat", etnolingwistyka, granica polsko-białoruska, socjolingwistyka, uchodźctwo.

АНАТАЦЫЯ: Прадметам даследавання ў артыкуле з'яўляюцца выбраныя тэксты з інтэрнэт-партала "Белсат", якія тычацца ўцекачоў з Блізкага Усходу праз Беларусь у Польшчу. Узніклы гуманітарны крызіс на польска-беларускай мяжы з'яўляецца адной з найбольш часта згадваных тэм у польскіх СМІ, а матэрыялы прэсы, звязаныя з ім, вельмі эмацыйныя. Мэта даследавання – прааналізаваць стаўленне незалежных беларускамоўных публіцыстаў да разгляданай тэмы, у прыватнасці тое, як яны канцэптуалізуюць вобраз *бежанца*. Метад лінгвістычнага аналізу, заснаваны на канцэпцыі постмадэрнісцкай этналінгвістыкі Пшэмыслава Лазоўскага і дыскурсалогіі Мацея Каўкі, уключае даследаванне структуры, функцыі, семантыкі і стыляў мовы, а таксама сувязі паміж тэкстам і сацыяльным жыццём, у прыватнасці ў адносінах да аксіялогіі ведаў, зафіксаваных у мове. Інтэрпрэтацыя лексічных сродкаў – фразеалагізмаў і граматычных элементаў – з пункту гледжання інфарматыўнай ды імпрэсіўнай функцый тэксту паказвае, што ў артыкулах дамінуе інфарматыўная функцыя. Гэта відаць праз прызму наяўнасці спецыфічных стылістычных прыёмаў: шматлікіх зваротаў да семантычнага поля *адміністрацыя*, дамінавання простых развітых сказаў і вялікай колькасці пазамоўных элементаў. Імпрэсіўная функцыя выконваецца апасродкавана, шляхам падкрэслівання або пропуску пэўных паведамленняў і выкарыстання лексем, якія, здавалася б, не маюць эмацыянальнага значэння. *Бежанцы* ўспрымаюцца як *нелегальныя* і *супрацьпраўныя.*

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: "Белсат", бежанства, польска-беларуская мяжа, сацыялінгвістыка, этналінгвістыка.

Data przesłania artykułu: 10.05.2024
Data akceptacji artykułu: 25.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Mikołaj Petryga – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki.

Adres: Kolegium Międzydziedzinowych Indywidualnych Studiów Humanistycznych i Społecznych, ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Valery Varanovich, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.16

Valery Varanovich / Валеры Варановіч

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы /
Yanka Kupala State University of Grodno
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-4288-9560
e-mail: walery.woronowicz@gmail.com

Да праблемы вызначэння дзейніка і выказніка ў сказах з марфалагічна раўназначнымі складнікамі граматычнай асновы

On the problem of determining the subject and the predicate in sentences with morphologically equivalent components of the subject-predicate pair
O problemie ustalenia podmiotu oraz orzeczenia w zdaniach o morfologicznie równoważnych składnikach związku głównego

ABSTRACT: The subject of the study is the problem of determining the subject and the predicate which are expressed grammatically in independent forms: as a noun in the nominative case or as a noun and an infinitive, in a two-part sentence with a zero link-verb. The relevance of the research topic lies in the fact that over the past few decades and up to this day, various sources describing syntax within the framework of the traditional doctrine of sentence members, such as academic grammars, university manuals, scientific and scientific-methodological articles, offer different approaches to determining the subject and the predicate in a sentence of this type. These approaches lead to opposite decisions when analyzing many sentences. And besides it also causes problems in the educational process when teaching syntax. The purpose of the study was to determine the optimal general approach for the mentioned problem, as well as to identify specific solutions as the most appropriate for sentences with separate features in their structure. Due to this reason, the article reveals advantages and disadvantages of the two most common approaches in Belarusian and Russian studies to determining the subject and the predicate in sentences of this type and their corresponding methods. As a result, the expediency of choosing an integrated approach in determining the subject and the predicate is substantiated. Not only the separate aspects of the sentence are taked into account, but everything as a whole, including the communicative aspect which determines the semantic features of a sentence associated with its actual division. The highlight of the article is the substantiation that relying on the formula of grammatical transformation of the sentence *X з'яўляецца Y-ам* 'X is Y' cannot act as a universal and mandatory way of determining the subject and the predicate in a sentence.

KEYWORDS: subject, predicate, principal parts of the sentence, grammatical transformation of the sentence, logical subject, logical predicate, logical-semantic structure of the sentence.

Яшчэ ў XX ст. у тэорыі сінтаксу склаўся цэлы шэраг розных канцэпцый, альтэрнатыўных традыцыйнаму вучэнню пра члены сказа, прычым альтэрнатыўных настолькі, што ў некаторых універсітэцкіх падручніках не толькі стала заяўляцца пра тое, што "ў сучаснай навуцы вучэнне пра члены сказа не займае таго месца, якое яно займала ў мінулым" [*Современный русский язык* 1989: 695], але пры раскрыцці паняццяў членаў сказа ўжо перастала выкарыстоўвацца звыклая іх сістэматыка і адпаведныя ёй тэрміны [*Современный русский язык* 1989: 697–704], а пры захаванні паняццяў выказніка і дзейніка аналіз сказаў пэўнага тыпу з двума галоўнымі членамі прадугледжвае, напрыклад, пры наяўнасці выказніка адсутнасць дзейніка (тады гэтак званы "прэдыкатыўны мінімум сказа" складаюць выказнік і "інфінітыўны непрэдыкатыўны галоўны член") [*Современный русский язык* 1989: 699].

Нельга не прызнаць таго, што альтэрнатыўныя канцэпцыі члянення сказа дапаўняюць яго бачанне праз вельмі істотныя і важныя дадатковыя аспекты, а карэнная "мадэрнізацыя" самога традыцыйнага вучэння пра члены сказа спрыяе больш аб'ектыўнаму адлюстраванню асаблівасцей структуры сказа, дазваляе дасягнуць яго больш дасканалай характарыстыкі, увогуле абумоўлівае лепшае разуменне гэтага моўна-маўленчага феномена. Але мы ўпэўненыя таксама і ў тым, што традыцыйны, класічны спосаб раскрыцця граматычнай структуры сказа ніколькі не страціў сваёй значнасці. На наш погляд, калі новае бачанне дазваляе лепш зразумець сутнасць сказа, то традыцыйны падыход мае вялікае значэнне ў лінгвадыдактыцы, дапамагаючы ў апоры на звыклыя паняцці членаў сказа развіваць маўленчыя навыкі вучняў у школе, удасканальваць кампетэнцыі студэнтаў-філолагаў у справе культуры маўлення праз засваенне сінтаксічных нормаў у тыповых праблемных выпадках пабудовы словазлучэнняў і спараджэння сказаў, бо нарматыўнасць і дакладнасць маўлення вельмі шчыльна звязаны з заканамернасцямі ў фармальнай арганізацыі сказа.

Для ажыццяўлення ж навучальнага працэсу падчас заняткаў, прысвечаных праблемам сінтаксісу, неабходна, каб настаўнік (выкладчык) меў магчымасць абапірацца на тэарэтычна-метадалагічную базу, максімальна пазбаўленую няпэўных, спрэчных сітуацый, наяўнасць якіх у рэчышчы традыцыйнага вучэння пра члены сказа абумоўлена імкненнем яго заснавальнікаў да комплекснага ўліку характарыстык

членаў сказа і ідэяй пра ў цэлым сіметрычны характар суадносінаў паміж фармальным і сэнсавым бакамі сказа. Згаданая ж сіметрыя далёка не заўсёды вытрымліваецца і можа быць парушанай нават у тыповых сінтаксічных канструкцыях, таму спрэчных сітуацый у традыцыйнай тэорыі членаў сказа нямала.

Адна з такіх сітуацый увасабляецца ў сказах тыпу *Сталіца Чэхіі – Прага*, гэта значыць у такіх, у якіх абодва галоўныя члены выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне або адзін з іх – інфінітывам. І ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве да гэтага часу застаецца спрэчнай сінтаксічная кваліфікацыя складнікаў граматычнай асновы падобных сказаў. Пры гэтым трэба зазначыць, што спрэчнымі з'яўляюцца не ўсе сказы з падобнай структурай. Да прыкладу, у вызначэнні дзейніка і выказніка ў сказе *Прага – сталіца Чэхіі* ніякіх разыходжанняў сярод сінтаксістаў няма: для любога даследчыка, якой бы пазіцыі ён ні трымаўся, *Прага* тут з'яўляецца дзейнікам, а *сталіца* – выказнікам. Разыходжанні ўзнікаюць, калі адзначаныя словы ідуць у адваротным парадку, як гэта мае месца ў сказе, прыведзеным у пачатку гэтага абзаца.

Сутнасць жа разыходжанняў фактычна зводзіцца да таго, што для адных тэарэтыкаў сінтаксісу змяненне парадку слоў у падобных сказах мае істотнае значэнне з пункту гледжання размеркавання роляў паміж імі (якое з іх дзейнік, а якое – выказнік), паколькі ў такім выпадку для тых самых слоў вельмі часта мяняюцца іх функцыі як тэмы і рэмы выказвання, разам з чым мяняецца і ў цэлым яго камунікацыйнае прызначэнне (і, такім чынам, у адным са сказаў сцвярджаецца пра тое, што Прага мае статус сталіцы, а ў другім – што сталіцай Чэхіі з'яўляецца менавіта Прага, а не які-небудзь іншы горад). Для другіх жа сінтаксістаў парадак слоў не мае значэння (або мае неістотнае), паколькі, як яны мяркуюць, паміж назоўнікамі застаюцца нязменнымі логіка-семантычныя суадносіны, якія можна адлюстраваць формулай "X з'яўляецца Y-ам". І сапраўды, у якім парадку ні размясціць галоўныя члены сказа, у кожным выпадку быццам бы справядліва было б сцвердзіць, што Прага з'яўляецца сталіцай (Чэхіі), і наадварот, як бессэнсоўнае выглядае сцверджанне "Сталіца з'яўляецца Прагай".

У гэтай сувязі, напрыклад, у дапаможніку М. Яўневіча і П. Сцяцко *Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы* ў сказе *Навінка тут – трактары, грузавікі* назоўнік *навінка* кваліфікуецца як выказнік, хоць і з'яўляецца відавочнай тэмай выказвання ("Навінка тут выяўлялася ў чым / уяўляла сабой што?"). Гэтае рашэнне абгрунтоўваецца тым, што ў сказе "назоўны склон назоўніка ў ролі выказніка можна замяніць творным склонам: <…> *Навінкай тут (былі) трактары, грузавікі*" [Яўневіч, Сцяцко 2006: 46].

Агульнаметадалагічную аснову пад апошнюю пазіцыю (назавем адпаведны падыход “вузкафармальным”) метадам “ад проціleглага” заклаў І. Распопаў, паспрабаваўшы давесці, што пры “традыцыйным «граматычным разборы» сказа” (ніжэй мы яго будзем называць комплексным падыходам) парушаецца адзін з асноўных прынцыпаў пабудовы навуковай тэорыі – прынцып кансеквентнасці. Непаслядоўнасць адзначанага падыходу, на яго думку, у тым, што пры такім разборы дзейнік і выказнік у розных паводле складу і будовы сказах вызначаюцца па-рознаму.

Так, з аднаго боку, у двухсастаўных сказах з дзеясловам-выказнікам або сказах іменнага ладу, у складзе якіх пры дапамозе звязкі злучаюцца назоўны (у функцыі дзейніка) і творны (у функцыі выказніка) склоны назоўнікаў, пры вызначэнні дзейніка і выказніка камунікацыйнае прызначэнне выказвання цалкам ігнаруецца. Таму, падкрэслівае даследчык, сказы *Все дети с интересом читают произведения Маршака* і *Произведения Маршака с интересом читают все дети* кваліфікуюцца як тоесныя паводле свайго складу і будовы. Аналагічным чынам суадносяцца сказы *Иванов был командиром отряда* і *Командиром отряда был Иванов* (у выніку ў абодвух сказах першай пары, што натуральна, дзейнікам трэба прызнаваць словазлучэнне *все дети*, у другой – прозвішча *Иванов*).

> Аднак зусім інакш, – адзначае І. Распопаў, – трактуюцца сказы іменнага і змяшанага (дзеяслоўна-іменнага) ладу, у складзе якіх галоўныя пазіцыі займаюць два назоўныя склоны назоўнікаў (параўн.: *Учитель – мой брат* і *Мой брат – учитель*), або інфінітыў і назоўнік (параўн.: *Поехать на Север – его мечта* і *Его мечта – поехать на Север*) <…>. Тут на першы план выступае ўжо момант камунікацыйнага прызначэння, і з улікам таго, пра што і што іменна ў іх паведамляецца, сказы, якія параўноўваюцца, кваліфікуюцца як розныя (нятоесныя) паводле свайго складу. Такім чынам, узнікае відавочная супярэчнасць: калі, грунтуючыся на прынятай трактоўцы апошніх прыкладаў, мы можам сцвярджаць, што дзейнік – гэта член сказа, які абазначае прадмет выказвання (тэму выказванага паведамлення), то ў адносінах да шэрагу першых прыкладаў (такіх, як: <…> *Командиром отряда был Иванов*) мы гэтага сцвярджаць ужо не можам (ясна, што ў падобных выпадках прадмет выказвання абазначаецца зусім не дзейнікам), г. зн. мае месца яўнае парушэнне прынцыпу кансеквентнасці [Распопов 1976: 21–22].

Натуральна, што, адмаўляючы “непаслядоўную” пазіцыю, І. Распопаў мусіў прапанаваць нейкі, на яго погляд, найбольш рацыянальны і несупярэчлівы падыход у справе вызначэння дзейніка і выказніка. Гэты падыход быў выкладзены ім яшчэ ў папярэдняй кнізе і быў заснаваны на прызнанні канструкцый тыпу *Поехать на Север – его мечта* і *Его мечта – поехать на Север* узаемна тоеснымі, а становішча ў іх

інфінітыва і назоўніка з пункту гледжання іерархіі сувязей, а таксама адносін, якія выражаюцца паміж інфінітывам і назоўнікам, – аналагічнымі тым, якія характарызуюць б я с с п р э ч н ы я дзейнік і выказнік у канструкцыях шэрагу іншых тыпаў. Пры гэтым заяўленая аналогія "пацвярджаецца магчымым пераўтварэннем (пры выкарыстанні наяўнай звязкі) назоўнага склону назоўніка ў творны (параўн.: *Поехать на Север было его мечтой*. – *Его мечтой было поехать на Север*) паводле падабенства пераўтварэнняў накшталт *Он инженер*. – *Он был инженером* і г. д." [Распопов 1970: 54].

Магчымасць ажыццяўлення паказанай трансфармацыі, натуральна, мае пад сабой пэўны аб'ектыўны тэарэтычны грунт. Яго сутнасць у тым, што гэтая трансфармацыя абумоўліваецца логіка-семантычным значэннем кампанентаў структурнай схемы сказа. Гэтае значэнне раскрывае В. Бабайцава на прыкладзе аналагічнага сказа *Самое большое сокровище Сибири – леса*: "…слова *леса* абазначае суб'ект лагічнага суджэння, выражае прыватнае, з'яўляецца носьбітам прыметы, а слова *сокровище* – гэта прэдыкат, агульнае, прымета, кваліфікацыя" [Бабайцева 2011: 78].

Таму не выглядае выпадковым той факт, што ў наступныя гады фармальная магчымасць замены формай творнага склону аднаго з галоўных членаў сказа, выражаных граматычна незалежнымі формамі, стала ўспрымацца і выкарыстоўвацца шэрагам мовазнаўцаў як першасны і практычна адзіны крытэрый і сродак выяўлення выказніка ў сказах падобнага тыпу. У выніку некаторыя з сінтаксістаў у наш час на значнасці формулы "X з'яўляецца Y-ам" у справе вызначэння дзейніка і выказніка ў сказах разгляданага тыпу настойваюць катэгарычна і безапеляцыйна. Праілюстраваць гэта можна сцверджаннямі расійскага мовазнаўцы В. Чупашавай. Яна лічыць, што паколькі "пазіцыю дзейніка здольны займаць назоўнік толькі ў назоўным склоне, а пазіцыю выказніка – і ў назоўным, і ў творным (гэтак званы творны прэдыкатыўны)", значыць, "для распазнавання галоўных членаў трэба пераўтварыць сказ так, каб адзін з назоўных склонаў назоўнікаў замяніўся творным: гэты назоўнік і будзе выказнікам". А далей у яе ідзе самае паказальнае: "Уводзім у сказ звязку *являться* (толькі яе!): <…> *Их* [аспірантаў. – *В. Ч.*] *специальность – русская литература.* (А. Эфрос) – *Русская литература является их специальностью* (няправільна: *Специальность является русской литературой*). Значыць, *литература* – дзейнік, а *специальность* – выказнік" [Чупашева 2005] (з шэрагу прыкладаў, прыведзеных аўтаркай, мы пакінулі адзін – найбольш праблемны і паказальны).

Але трэба адзначыць, што фармальна прынцып кансеквентнасці пры вырашэнні разгляданай праблемы не парушаюць і сінтаксісты, якія ў сказах, аналагічных апошняму, дзейнік і выказнік вызначаюць

з адваротным вынікам. Так, калі Л. Бурак сцвярджае, што "граматычная функцыя парадку слоў заключаецца ў тым, што ад месца, якое займае тое ці іншае слова ў сказе, залежыць яго сінтаксічная функцыя" [Бурак 1987: 136], то ён прыходзіць да высновы, што ў сказе "*Мінск – сталіца БССР* на першым месцы знаходзіцца дзейнік, на другім – выказнік; пры адваротным парадку слоў *Сталіца БССР – Мінск* папярэдні выказнік становіцца дзейнікам, а дзейнік – выказнікам" [Бурак 1987: 137]. Дарэчы, на важнасці парадку слоў пры вызначэнні дзейніка і выказніка рабілі акцэнт і іншыя мовазнаўцы, параўн.:

> Яго [парадку слоў. – *В. В.*] роля тым важнейшая, чым менш маецца іншых сродкаў, якія пазначаюць форму выказніка (творны склон назоўніка, дзеяслоўныя звязкі ў спрагальных формах, часціцы-звязкі). Асабліва важны парадак слоў пры нулявой форме звязкі *быць* і назоўным склоне назоўніка; напрыклад: – *Вообще изучать краски и свет, милый вы мой, – наслаждение* (Пауст.). У такіх сказах адноснае становішча дзейніка і выказніка (прэпазіцыя дзейніка) з'яўляецца граматычна значным [Лекант 1986: 52].

Праўда, калі Л. Бурак быў схільны бачыць парадак слоў у тым ці іншым сказе проста як факт, то П. Лекант адрозніваў сказы з "натуральным" парадкам слоў ад тых, дзе ўзаемнае размяшчэнне дзейніка і выказніка падпала свядомай інверсіі (за якой і трэба бачыць зыходны, "сапраўдны" парадак)[1]. І таму калі Л. Бурак у сказе *Вялікае шчасце для чалавецтва – будаваць* слова *шчасце* вызначае як дзейнік, а *будаваць* – як выказнік [Бурак 1987: 55], то П. Лекант у аналагічным сказе *Наслаждение – изучать краски и свет* першае слова ўважае за выказнік, а ўжо інфінітыў лічыць дзейнікам (пры ўмове моцнага інтанацыйнага падкрэслівання слова *наслаждение*) [Лекант 1986: 52–53].

І сярод двух азначаных супрацьлеглых рашэнняў лагічным, мэтазгодным, а таму і слушным варта прызнаць другое (з дэталёвым абгрунтаваннем яго яўнай перавагі можна азнаёміцца ніжэй). А гэта падказвае нам, што замыкацца на нейкай адной прыкмеце, адным аспекце сказа (на адной "формуле рашэння") пры вызначэнні дзейніка і выказніка, выражаных граматычна раўназначнымі формамі, нельга. Таму ў гэтай справе неабходны к о м п л е к с н ы падыход.

---

[1] Трэба мець на ўвазе, што не кожнае ўзаемнае перамяшчэнне галоўных членаў у сказе можна лічыць інверсіяй. Так, у адным з акадэмічных выданняў беспадстаўна падаецца як прыклад інверсіі другі сказ адносна першага, а таму і выказнік у другім сказе вызначаецца без пераканаўчых аргументаў, параўн.: "У сказе, дзе абодва галоўныя члены выражаны назоўнікам у назоўным склоне, выказнік звычайна знаходзіцца ў постпазіцыі: *Мінск – сталіца БССР*. Аднак пры інверсіі ён аказваецца ў прэпазіцыі: *Сталіца БССР – Мінск*" [*Беларуская граматыка* 1985–1986, II: 130].

Такі падыход, у прыватнасці, вынікае з распрацаванага В. Бабайцавай кірунку сінтаксісу, названага ёю структурна-семантычным.

> Спецыфічнай асаблівасцю структурна-семантычнага кірунку, якая адрозніває яго ад аднааспектных даследаванняў, з'яўляецца ш м а т а с п е к т н а е даследаванне і апісанне сінтаксічных адзінак, у прыватнасці простага сказа. <…> Асноўныя ўласцівасці простага сказа выяўляюцца пры апісанні яго лагічнага, структурнага, семантычнага і камунікацыйнага аспектаў [Бабайцева 2010: 64].

Як зазначае аўтарка,

> з чатырох аспектаў сказа найбольш важныя для кваліфікацыі сказаў / выказванняў структурны і семантычны, аб'яднанне якіх і дазволіла вызначыць разгляданы кірунак як структурна-семантычны, улічваючы, што лагічны аспект сказа знаходзіць выражэнне ў структуры і семантыцы, а камунікацыйны – дапаўняе семантыку сказа актуалізацыяй камунікацыйнага цэнтра [Бабайцева 2010: 67].

Пры гэтым

> члены сказа суадносяцца ў нейкіх уласцівасцях і з кампанентамі лагічнай фразы, і з кампанентамі структурных схем, і з кампанентамі семантычнай структуры сказа, і з кампанентамі актуальнага чляненне сказа, але не могуць быць атаясамлены ні з першым, ні з другім, ні з трэцім, ні з чацвёртым [Бабайцева 2010: 68].

Як бачым, гэта якраз тая пазіцыя, пры якой улічваецца камунікацыйнае прызначэнне выказвання. Прычым паказальна, што такі падыход дазваляе не толькі размяжоўваць, "бачыць па-рознаму" сказы з тым самым наборам словаформаў, але з рознай іх паслядоўнасцю, а і мець розныя рашэнні нават для цалкам аднолькавых структур з аднолькавым іх лексічным напаўненнем. Так, В. Бабайцава мяркуе, што сказы тыпу *Самое большое сокровище Сибири – леса* або *Лучший подарок – книга* не дапускаюць адназначнага рашэння па-за кантэкстам, а значыць, у розных кантэкстах адны і тыя ж словы ў іх могуць быць то дзейнікам, то выказнікам [Бабайцева 2011: 78–79]. Безумоўна, магчымасць такой тонкай дыферэнцыяцыі сказаў апрыёры выглядае, прынамсі ў пэўных адносінах, як выйгрышны фактар.

У рэчышчы тэорыі В. Бабайцавай знаходзяцца і падыходы шэрагу іншых сінтаксістаў, прэзентаваныя як у навучальных дапаможніках, так і ў спецыяльных даследаваннях (ва ўсякім разе, тыя падыходы, якія далей будуць намі адзначаны, у поўнай меры або ў сваёй аснове не супярэчаць тэорыі В. Бабайцавай – галоўным чынам таму, што ў іх улічваецца камунікацыйная скіраванасць сказа, яго тэма-рэматычны

падзел). Больш за тое, у некаторых працах прапануюцца пэўныя рашэнні для канкрэтных тыповых сітуацый і нават амаль вычарпальныя методыкі вызначэння дзейніка і выказніка з улікам розных нюансаў.

Так, заслугоўвае ўвагі праца З. Данільчык, якая сцвярджае, што ў сказах, дзе адзін з галоўных членаў – інфінітыў, а другі – назоўнік у назоўным склоне, пры вызначэнні дзейніка і выказніка "неабходна <…> ўлічваць: 1) семантыку назоўнікаў, што ўступаюць у прэдыкатыўныя адносіны з інфінітывам; 2) наяўнасць пры гэтых назоўніках розных дадатковых элементаў (часціц, атрыбутыўных кампанентаў); 3) ролю інтанацыі" [Данільчык 1995: 68]. Пры гэтым яна заўважае:

> …сярод назоўнікаў, якія разам з інфінітывам выступаюць у ролі галоўных членаў сказа, вылучаюцца дзве семантычныя групы: 1) назоўнікі са значэннем эмацыянальнай, якаснай ацэнкі (*прыемнасць*, *радасць*, *шчасце*, *пакута*, *бяда*, *гора*, *гонар* і інш.); 2) абстрактныя назоўнікі з лексічна аслабленым значэннем, якія функцыянуюць як з атрыбутыўнымі кампанентамі, так і без іх (*абавязак*, *задача*, *занятак*, *звычай*, *мэта*, *падзея*, *работа*, *рэч*, *справа*, *штука* і інш.). Назоўнікі першай групы, якія ўступаюць у прэдыкатыўныя адносіны з інфінітывам, выконваюць ролю выказніка незалежна ад размяшчэння назоўніка адносна інфінітыва, бо значэнне якаснай ацэнкі выступае выразна і вылучае гэты субстантыў як камунікатыўны цэнтр. Напрыклад: "Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным, удача – знайсціся ў патрэбе са смелым, шчасце – жыць, працаваць з чалавекам сумленным" (М. Танк) [Данільчык 1995: 68–69].

Што да назоўнікаў другой групы, то яны, паводле слушнага меркавання даследчыцы, не заўсёды выконваюць функцыю выказніка. Таму, каб размежаваць сінтаксічную ролю інфінітыва і назоўніка, патрэбна ўлічваць наступныя акалічнасці:

> Па-першае, калі назоўнік займае постпазіцыйнае становішча адносна інфінітыва, то ён заўсёды выконвае ролю выказніка незалежна ад спосабу выражэння атрыбутыўнага кампанента пры ім. <…> Па-другое, калі атрыбутыўны кампанент пры назоўніку, што займае прэпазіцыйнае становішча адносна інфінітыва, выражаецца адносным прыметнікам, прыналежным займеннікам або назоўнікам, то гэтае спалучэнне не выдзяляецца лагічным націскам, не вылучаецца як камунікатыўны цэнтр, гэта значыць не выконвае функцыі выказніка. Гэтую ролю будзе выконваць інфінітыў. Напрыклад: "<…> Наша задача – усямерна дапамагаць Чырвонай арміі" (М. Лобан). Па-трэцяе, тое ж адбываецца і ў сказах, калі прэпазіцыйны назоўнік зусім не мае пры сабе атрыбутыўнага кампанента. Напрыклад: "Задача – разведаць, ці стаіць каля кнігаўскага млына варта: калі так, без шуму зняць яе" (І. Гурскі). Іншы малюнак назіраецца ў канструкцыях, дзе назоўнікі маюць пры сабе атрыбутыўныя кампаненты, выражаныя якаснымі прыметнікамі. Спалучэнні "назоўнік + атрыбутыўны кампанент"

> (ці “атрыбутыўны кампанент + назоўнік”) заўсёды выконваюць функцыю выказніка незалежна ад размяшчэння іх адносна інфінітыва, бо менавіта ацэначныя атрыбутыўныя кампаненты “дапамагаюць” спалучэнню стаць выказнікам. Напрыклад: “Цяжкі абавязак – быць мужам студэнткі” (І. Шамякін) [Данільчык 1995: 70].

Прымаючы ў цэлым выкладзеныя вышэй сцверджанні, мусім усё ж адно з іх удакладніць: як нам бачыцца, у сказах накшталт *Наша задача – рыхтаваць сабе кадры* ў адпаведным кантэксце можна-такі паставіць лагічны націск на прыналежным займенніку, а ў такім разе менавіта прэпазіцыйны кампанент будзе выказнікам, а інфінітыў у постпазіцыі – дзейнікам. Таму парады, распрацаваныя З. Данільчык, было б дарэчы дапоўніць універсальным палажэннем іншага плану, прапанаваным М. Панюшавай:

> Калі адзін з галоўных членаў выражаны інфінітывам, а другі – назоўнікам у назоўным склоне, то дзейнік вызначаецца ў залежнасці не ад парадку слоў, а ад сэнсу сказа. Напрыклад, у сказе “Какое же счастье быть земским врачом! <…>” сцвярджаецца, што быць земскім урачом – гэта ёсць шчасце, а не наадварот [*Современный русский язык* 1979: 32–33].

Такім чынам, можна зрабіць наступнае прамежкавае падагульненне: на працягу апошніх больш чым пяці дзясяткаў гадоў ва ўсходнеславянскім мовазнаўстве склаліся і супрацьстаяць адзін другому два асноўныя падыходы ў размеркаванні сінтаксічных роляў паміж двума назоўнікамі, якія выражаны формамі назоўнага склону (або назоўнікам і незалежным інфінітывам) і складаюць граматычную аснову двухсастаўнага сказа. Адзін з падыходаў замыкаецца на логіка-семантычным аспекце сказа і мае ў якасці перавагі (ва ўсякім разе, так сцвярджаюць яго прыхільнікі) магчымасць падвядзення любых лексічных камбінацый галоўных членаў сказа пад адзіную стандартную формулу “X з’яўляецца Y-ам”, што ў сваю чаргу дае ўжо магчымасць лёгка, на фармальнай аснове ажыццяўляць іх сінтаксічную кваліфікацыю праз названую формулу.

У межах жа другога падыходу бяруцца пад увагу ўсе аспекты сказа, у тым ліку камунікацыйны, што дае магчымасць праз вызначэнне дзейніка і выказніка выяўляць канкрэтную мэту выказвання, а дзякуючы гэтаму – і яго рэальны сэнс; дазваляе прэзентаваць галоўныя члены сказа практычна з вычарпальнай іх характарыстыкай.

Суадносячы два гэтыя падыходы чыста абстрактна з мэтай абрання аднаго з іх як больш мэтазгоднага, дарэчы было б дапусціць, што ў якасці такога мог бы быць прызнаны другі як больш ахопны, а таму яго можна было б ацэньваць як падыход, што характарызуецца найбольшай вытлумачальнай сілай. Але пры гэтым неабходна было б упэўніцца

ў тым, што апора гэтага падыходу на шматаспектнасць не прыводзіць да ўнутрана супярэчлівых, непаслядоўных рашэнняў.

Што да апошніх, то нельга не адзначыць, што ў некаторых аўтараў, якія дэкларатыўна ці хоць бы няяўна ўлічваюць тэма-рэматычны падзел выказвання пры вызначэнні дзейніка і выказніка, сапраўды назіраюцца выпадкі непаслядоўнасці. Напрыклад, у дапаможніку Н. Валгінай для абодвух сказаў з пары *Логика – наука о законах мышления* і *Наука о законах мышления – логика* дзейнікам лічыцца прэпазіцыйны кампанент, паколькі менавіта ён з'яўляецца тэмай выказвання. Але ў сказе *Самое трудное – принять решение*, які мы схільныя бачыць як граматычна аднатыпны ў адносінах да ўсіх тых сказаў, якія з'яўляюцца аб'ектам разгляду ў гэтым артыкуле, паколькі форма найвышэйшай ступені параўнання прыметніка *самое трудное* з'яўляецца тут субстантываванай, аўтарка лічыць прэпазіцыйны кампанент ужо выказнікам. З такім размеркаваннем роляў паміж складнікамі сказа можна было б і пагадзіцца, калі дапусціць, што ў ім мае месца інверсія, якую абазначаў бы цалкам магчымы лагічны націск на слове *трудное*, што рабіла б гэты прыметнік рэмай выказвання. Аднак жа Н. Валгіна сама адзначае, што выказнік *самое трудное* з'яўляецца тут тэмай [Валгина 2003: 144, 146][2].

Таксама незразумелую для нас непаслядоўнасць у кваліфікацыі адпаведных кампанентаў сказа як дзейніка і выказніка сустракаем у адной з прац І. Шумскай. Так, калі даследчыца размяжоўвае дзве групы назоўнікаў, якія ўступаюць у прэдыкатыўныя адносіны з інфінітывам, і пры гэтым канстатуе, што "прэпазіцыйныя назоўнікі з нейтральным значэннем часцей выступаюць у якасці дзейніка, асабліва калі ўжываюцца без азначэнняў: *задача*, *мэта*, *дэвіз*, *абавязак*, *загад*, *занятак*, *талент*, *указанне* і інш." [Шумская 1977: 30], – то гэта лагічна (гл. вышэй ацэнку падобных назоўнікаў, дадзеную ім З. Данільчык). Таксама лагічна, калі кваліфікуюцца ўжо як выказнікі назоўнікі з ацэначным значэннем – напрыклад, назоўнік *шчасце* ў сказе *Якое шчасце – вызнаць мару і чуць заўжды яе агонь!* (К. Кірэенка) [Шумская 1977: 30]. Аднак неапраўданым бачыцца меркаванне І. Шумскай, паводле якога аднесеныя ёю да асобай групы "назоўнікі, якія страцілі сваё першапачатковае значэнне: *справа*, *рэч*, *правіла*, *шутка* (напэўна, маецца на ўвазе *штука*. – *В. В.*), *звычай*, *падзея*, *мудрасць* і інш.", – пры інфінітыве-дзейніку "заўсёды

[2] Дарэчы, В. Бабайцава ў падобным сказе *Самое главное – здоровье* прадказальна, а таму, як на наш погляд, лагічна і апраўдана дзейнікам лічыць тэму выказвання, а выказнікам – рэму. Праўда, заснавальніца структурна-семантычнага сінтаксісу дапускае, зноў жа слушна, што вызначыць, што́ ў пададзеным сказе з'яўляецца тэмай, а што – рэмай, без уліку кантэксту немагчыма (гэта мы ўжо адзначалі вышэй у некалькі інакшай падачы) [Бабайцева 2011: 79].

выконваюць функцыю выказніка". Як неапраўданы і сказ-прыклад, якім ілюструецца ўжыванне назоўніка *правіла* нібыта ў функцыі выказніка: *Па-мойму, галоўнае правіла, якога трэба трымацца паэту і цяпер, як і тады, – старацца пісаць прасцей* (І. Мележ. *Подых навальніцы*) [Шумская 1977: 31].

Напрошваецца дапушчэнне, што неапраўданыя, з нашага пункту гледжання, сцверджанні ў Н. Валгінай і І. Шумскай вынікаюць з таго, што пры вызначэнні сінтаксічнай функцыі назоўніка як аднаго з галоўных членаў сказа яны перабольшваюць ролю якасных прыметнікаў як азначэнняў пры гэтых назоўніках, кваліфікуючы апошнія ў выніку як выказнікі. Бо "нельга лічыць, што ўсе якасныя прыметнікі змяшчаюць ацэначны кампанент" [Мао 2018: 143]. І нават той ці іншы прыметнік, які ў адным кантэксце выступае як ацэначны, у іншым можа не выражаць ацэнкі і нават ужывацца ў значэнні адноснага. Таму і яшчэ адзін сказ, прыведзены І. Шумскай з мэтай даць прыклад прэпазіцыйнага назоўніка ў функцыі выказніка, не выглядае дарэчным. Хоць тэма і рэма ў сказе *Святы закон медыцыны – рабіць усё магчымае і немагчымае, каб уратаваць жыццё чалавеку незалежна ад таго, у якім стане ён трапіў у бальніцу* з улікам магчымых для яго кантэкстаў, як мы лічым, могуць быць вызначаны па-рознаму – з супрацьлеглымі вынікамі, у сувязі з чым пры адным з вынікаў слова *закон* можна-такі прызнаць выказнікам, але гэты сінтаксічны статус для названага назоўніка будзе абумоўлівацца зусім не наяўнасцю пры ім прыметніка *святы*. Бо ні ў водным выпадку (ні пры якім варыянце тэма-рэматычнага падзелу), насуперак сцверджанню даследчыцы, лагічны націск у прыведзеным сказе не падае на згаданае азначэнне. А менавіта ж за кошт гэтага лагічнага падкрэслівання, як сцвярджаецца ў артыкуле і што лагічна само па сабе, "камунікатыўная значнасць спалучэння [якаснага прыметніка і назоўніка. – *В. В.*] узрастае" [Шумская 1977: 30], што і павінна сведчыць пра функцыю выказніка для адпаведнага назоўніка. Што ж да семантыкі прыметніка *святы* і яе сувязі з адсутнасцю лагічнага вылучэння гэтага азначэння, то відавочна, што ў прыведзеным сказе слова *святы* ўжыта ў значэнні, пазбаўленым ацэначнай канатацыі: 'непарушны; такі, які патрабуе безумоўнага выканання'.

На кантрасце з прыведзенымі вышэй двума апошнімі сказамі як непрыдатнымі ў якасці прыкладаў для прэпазіцыйнага назоўніка ў якасці выказніка, у якіх названая сінтаксічная роля субстантыва нібы абумоўліваецца якасным прыметнікам пры ім, варта паглядзець на сказы, якімі апісаная сітуацыя ілюструецца ў згаданым вышэй артыкуле З. Данільчык:

Ох, і нялёгкая ж гэта справа – купіць (М. Ткачоў); *Не хацелася выходзіць з камеры, бо не вялікая прыемнасць пражыцца на сонцы і глытаць гарачае паветра* (М. Машара); *Самая цяжкая хвароба – згубіць сям'ю, а тым больш адначасна і жонку, і дзяцей* (П. Кавалёў); *Найскладанейшая задача – такога сома злавіць* (А. Савіцкі); *Увогуле, прыгожы і добры гэта звычай – дарыць кветкі* ("Маладосць") [Данільчык 1995: 71].

Даволі відавочна, што ў кожным з гэтых сказаў якасны прыметнік пры назоўніку ў назоўным склоне патрабуе інтанацыйна-сэнсавага вылучэння, і гэта абумоўлена тут тым, што кожны з гэтых якасных прыметнікаў яшчэ і выразна ацэначны. А, са свайго боку, ацэначнасць і факт сэнсава-інтанацыйнага вылучэння абумоўліваюць і функцыю адпаведнага атрыбутыўна-субстантыўнага спалучэння – быць для выказвання інфармацыйным цэнтрам, выступаць кваліфікатарам у адносінах да прадмета паведамлення, што, у сваю чаргу, лагічна стасуецца з прызначэннем выказніка, характарам і прынцыпам яго суадносінаў з дзейнікам.

Разам з тым відавочны і той факт, што наяўнасць ацэначнай канатацыі ў атрыбутыўна-субстантыўных спалучэнняў у сказах падобнага тыпу шчыльна стасуецца з выкананнем імі функцыі рэмы выказвання. А таму калі для абодвух галоўных членаў сказа іх фармальная выражанасць не дыктуе іх кваліфікацыі як нейкіх іншых членаў сказа, рацыянальным рашэннем было б вызначаць выказнік і дзейнік у тым ліку на падставе тэма-рэматычнага падзелу выказвання. Прычым для многіх сказаў улік іх камунікацыйнай скіраванасці можа адыгрываць вырашальную ролю. Зрэшты, менавіта на гэтым настойвае В. Бабайцава, што намі адзначалася пры прадстаўленні яе падыходу і што, у прынцыпе, павінна выключаць любыя праявы непаслядоўнасці ў вызначэнні дзейніка і выказніка пры аналізе сказаў разгляданага тут тыпу з любым іх лексічным напаўненнем. А значыць, комплексны падыход у справе вызначэння дзейніка і выказніка ёсць падставы лічыць цалкам мэтазгодным. Дарэчы, выпадкі непаслядоўнасці пры выкарыстанні названага падыходу ў гэтай справе адзначаюцца якраз у тых спробах аналізу сказаў, у якіх у недастатковай ступені бярэцца пад увагу фактар тэма-рэматычнага падзелу выказвання.

Але, як ужо адзначалася вышэй, пэўнасць у вызначэнні тэмы і рэмы выказвання нярэдка можа быць дасягнута толькі пры ўліку кантэксту, у якім ужыты той ці іншы сказ. Разам з тым нельга не адзначыць і таго, што кантэкст насамрэч абумоўлівае і іншыя характарыстыкі сказа, прычым мы лічым неабходным сцвердзіць, што ў тым ліку і тыя, якія бяруцца за аснову пры вызначэнні дзейніка і выказніка прадстаўнікамі "вузкафармальнага" падыходу. У прыватнасці, як мы лічым, асаблівасцямі

кантэксту нярэдка можа вызначацца логіка-семантычная структура сказа, а разам з ёю і формула яго граматычнай трансфармацыі, праз якую можна праясніць функцыі галоўных членаў сказа: які з іх з'яўляецца дзейнікам, а які – выказнікам.

З апошняга нашага сцверджання вынікае дапушчэнне, што ў працэдуры ідэнтыфікацыі граматычна незалежных кампанентаў сказа як дзейніка і выказніка можна не абмяжоўвацца як праверачнай толькі формулай трансфармацыі "X з'яўляецца Y-ам", як на гэтым катэгарычна настойвае, напрыклад, В. Чупашава, а, наадварот, варта задзейнічаць і альтэрнатыўныя формулы. Але перш чым прапанаваць якую-небудзь з такіх альтэрнатыўных формул, прапануем уявіць наступны, досыць імаверны, дыялог:

– Дзе ўладкаваўся на працу твой калега?
– У сталіцы Турцыі.
– О, цудоўна! Мне таксама давялося пабываць у Стамбуле.
– Але сталіца Турцыі не Стамбул!
– Ты хочаш сказаць, што туркі называюць гэты горад трошкі інакш – Істанбулам?
– Не. Проста сталіца Турцыі – гэта зусім іншы горад.
– Вось як! Але я іншых турэцкіх гарадоў не ведаю. То якая сталіца ў Турцыі? Як яна называецца?
– Сталіца Турцыі называецца Анкарой.
– Што ж, цяпер буду ведаць. Сталіца Турцыі – Анкара!

Як бачым, два апошнія сказы, што маюць у сваім складзе словазлучэнне *сталіца Турцыі*, паводле рэальных суадносінаў у межах пададзенага дыялогу выяўляюць ідэнтычны змест, а таму, паколькі абодва яны, калі не ўлічваць звязку, маюць аднолькавае лексічнае напаўненне, адзін з іх можа быць прызнаны г р а м а т ы ч н ы м трансформам другога. Гэта можна сцвярджаць у тым ліку на той падставе, што ўжытая трансфармацыя (абазначым яе формулай "X называецца Y-ам") не можа быць ацэнена як прынцыпова больш "насычаная" зместам у параўнанні з трансфармацыяй "X-ом з'яўляецца Y", паколькі кампаненты формул *называецца* і *з'яўляецца* ў праекцыі на сказ, у якім прэдыкатыўны цэнтр складаюць словы *сталіца* і *Анкара*, узаемавыключальныя, тады як, напрыклад, для сказаў накшталт *Такія паводзіны называюцца свінствам* звязкі *называцца* і *з'яўляцца*, наадварот, могуць быць узаемазамяняльнымі. Разам з гэтым першая з названых формул трансфармацыі значна больш адэкватна перадае рэальны змест зыходнага сказа ў параўнанні з альтэрнатыўнай, якая дае трансформ *Сталіцай Турцыі з'яўляецца Анкара*.

Якая можа быць падстава, каб сцвярджаць, што змест зыходнага сказа *Сталіца Турцыі – Анкара*, асабліва з улікам кантэксту, у якім

ён у нас разглядаецца, не зусім адэкватна перадаецца трансформам *Сталіцай Турцыі з'яўляецца Анкара*? Мы мяркуем, што, для таго каб сцвярджаць, што нешта з'яўляецца чымсьці, неабходна ведаць пра гэтае нешта як пра факт, а інакш проста не будзе прадмета думкі, якому ў прыведзеным апошнім сказе павінен адпавядаць назоўнік *Анкара*. Але адзін з суразмоўцаў, як вынікае з дыялогу, пра існаванне Анкары як горада не ведаў, таму, прамаўляючы заключны сказ дыялогу, ён фактычна канстатаваў для сябе суаднесенасць з тэмай выказвання (канцэптам "сталіца Турцыі") не самога канкрэтнага горада, а толькі яго назвы. І гэта зусім лагічна стасуецца і з формай зададзенага ім пытання (*Як яна называецца?*), і з адказам яго суразмоўцы (*Сталіца Турцыі называецца Анкарой*).

Такім чынам, сказы накшталт *Сталіца Турцыі – Анкара*, як бачым, могуць граматычна трансфармавацца не толькі паводле адной формулы, паколькі паміж іх галоўнымі членамі могуць выражацца розныя сэнсавыя адносіны, што вымагае выкарыстання і розных звязак. Магчымасць жа задзейнічання альтэрнатыўнай формулы пераўтварэння сказа, у прыватнасці такой, як "X называецца Y-ам" для згаданага вышэй сказа, паказвае, што і пры выкарыстанні граматычнай трансфармацыі ў якасці верыфікацыйнага прыёму можна атрымаць вынік, пры якім той з галоўных членаў сказа, які ў суадносінах з іншым галоўным членам "знешне" выглядае як яго кваліфікатар (у нашым выпадку – *сталіца (Турцыі)*), тым не менш вымагае прызнання сябе як граматычнага дзейніка.

Да гэтага трэба дадаць, што калі мы вышэй сцвярджалі пра тое, што трансформ *Сталіца Турцыі называецца Анкарой* больш адэкватна перадае рэальны змест зыходнага сказа *Сталіца Турцыі – Анкара* ў параўнанні з трансформам *Сталіцай Турцыі з'яўляецца Анкара*, то пад рэальным зместам мы мелі на ўвазе ў тым ліку логіка-семантычную структуру сказа. І гэтым мы хочам сказаць, што ў зыходным сказе *Сталіца Турцыі – Анкара* (прычым узятым ужо нават не толькі ў кантэксце прыведзенага дыялогу) лагічны прэдыкат увасабляецца зусім не ў словазлучэнні *сталіца Турцыі*, а ў назоўніку *Анкара*. Гэта пацвярджаецца таксама найбольш адпаведным для гэтага сказа-сцвярджання пытаннем (гл. пададзены вышэй згенераваны намі дыялог): "Якáя сталіца Турцыі?". Параўнаем з аналагічнымі пытаннямі і адпаведнымі ім сцверджаннямі: "Якога росту Андрэй?" – "Андрэй высокі"; "Якога колеру фламінга?" – "Фламінга ружовы"; "Якая твая сястра?" – "Мая сястра добрая". І калі хтосьці не прымае нашага меркавання пра аналагічны характар пар прыведзеных тут сцверджанняў і пытанняў да іх, то мы вымушаны выказаць наступную заўвагу, якая мае прынцыповае значэнне ў падыходзе да разгляданай праблемы: не прызнаваць

аднолькавай логіка-семантычнай структуры для пытанняў "Якая твая сястра?" і "Якая сталіца Турцыі?", а таксама для сцверджанняў "Мая сястра добрая" і "Сталіца Турцыі – Анкара" – значыць ацэньваць **не логіка-семантычны** бок гэтых пытанняў і сцверджанняў, а іх **дэнататыўны** бок.

Гэтым мы хочам сказаць, што калі спараджаецца выказванне, моўца не заўсёды мае намер адлюстраваць тую рэальную сітуацыю, ад якой ён адштурхоўваецца, самым непасрэдным чынам, у яе першаснай, самай істотнай сутнасці. Таму пазамоўная рэальнасць не заўсёды становіцца сапраўдным зместам выказвання, у якім бы аспекце мы ні разглядалі сказ, акрамя дэнататыўнага. Так, калі мы спараджаем сказ *Анкара – сталіца Турцыі*, то суадносіны паміж лагічным суб'ектам і прэдыкатам адпаведнага гэтаму сказу суджэння адлюстроўваюць рэальную сітуацыю, грунтуюцца на ёй непасрэдна. Але калі спараджаецца сказ *Сталіца Турцыі – Анкара*, то гэта сведчыць пра тое, што моўца выкарыстоўвае аб'ектыўную пазамоўную сітуацыю толькі як зыходны "матэрыял", а "канфігурацыя" суадносінаў лагічнага суб'екта і прэдыката суджэння (гэтак званая прапазіцыя) зведвае пераразмеркаванне іх роляў адносна таго стану, пры якім суб'ект і прэдыкат больш "шчыльна" былі "прыкладзены" да адпаведных дэнататаў.

У якасці прыкладу, які пацвярджае, што "дрэйф" лагічнага суб'екта і прэдыката, "прывязаных" да адной і той жа дэнататыўнай сітуацыі, у прынцыпе магчымы, можна прывесці выпадак, які ў логіцы называецца канверсіяй суджэння. Так, суджэнне "Усе акулы з'яўляюцца рыбамі" можа быць пераўтворана ў новае без змянення зыходнага "стану рэчаў": "Некаторыя рыбы з'яўляюцца акуламі". Тое, што змяненне аднаго суб'екта на іншы суправаджаецца заменай квантара "ўсе" на квантар "некаторыя", лічыцца неістотным для структуры суджэння, паколькі логіка "не бярэ пад увагу змест мыслення і займаецца толькі яго формай" [Гусев 2003: 50]. Можна прывесці прыклад і трошкі іншага плану, без замены квантараў: "Чалавек смертны" > "Смерць – прыкмета ўсіх людзей" (тут трэба мець на ўвазе, што форма адзіночнага ліку назоўніка *чалавек* у сказе, якім выражаецца першае суджэнне, не супярэчыць множнаму характару адпаведнага дэнататa). А пара суджэнняў "Скончыўся жнівень" > "Пачаўся верасень" увогуле дэманструе магчымасць выкарыстання зусім іншых суб'екта і прэдыката для выражэння той самай дэнататыўнай сітуацыі. Такім чынам, гэта ўсё азначае, што і пару сказаў *Анкара – сталіца Турцыі* vs *Сталіца Турцыі – Анкара* трэба разглядаць як два розныя суджэнні з рознымі прапазіцыямі, дзе з адным і тым жа дэнататам "Анкара" суадносіцца ў адным выпадку лагічны суб'ект суджэння (і таму назоўнік *Анкара* слушна лічыцца дзейнікам у адпаведным сказе), а ў другім – лагічны

прэдыкат суджэння (і таму назоўнік *Анкара* ў другім сказе яшчэ і з гэтай прычыны варта кваліфікаваць як выказнік).

Калі вярнуцца да пары сказаў *Поехать на Север – его мечта* vs *Его мечта – поехать на Север*, якія аналізаваліся І. Распопавым, і таксама разгледзець іх як прыклад канверсіі суджэння, то для апошняга з іх можна атрымаць, напрыклад, такія граматычныя трансформы: *Его мечта заключается в поездке на Север*; *Его мечта – это поездка на Север* або *Его мечта заключается в том, чтобы поехать на Север* (у апошнім выпадку мае месца заўважнае ўскладненне фармальнай структуры сказа пры атрыманні трансформа, тым не менш яно не пазбаўляе трансфармацыю выключна граматычнага характару). Што ж да акцэнтавання ўвагі І. Распопавым на магчымасці пераўтварэння зыходнага сказа *Его мечта – поехать на Север* перш за ўсё ў трансформ *Его мечтой было поехать на Север*, то, як сведчаць выкладзеныя вышэй прыклады трансформаў, такі спосаб з'яўляецца ўсяго адным з некалькіх і таму н і ч о г а н е д а к а з в а е. Як нельга нічога даказаць, напрыклад, магчымасцю пераўтварэння сказа *Знакаміты архітэктар праектуе палац* у трансформ *Палац праектуецца знакамітым архітэктарам*, бо і тут лагічны суб'ект "архітэктар", застаючыся ім у абодвух выказваннях, у адным выпадку выконвае функцыю граматычнага дзейніка, а ў другім "не супраць" набыць форму творнага склону і выступіць у ролі дапаўнення. І гэты апошні сказ з'яўляецца хрэстаматыйным прыкладам магчымасці несупадзення гэтак званай глыбіннай структуры суджэння з яго паверхневай структурай, г. зн. ужо з граматычнай структурай сказа.

З другога ж боку, калі, засноўваючыся на "вузкафармальным" падыходзе, пры аналізе такога сказа, як, напрыклад, *Ідэя архітэктара – паказаць велічнасць асобы героя*, паспрабаваць абаперціся на яго трансформ *Паказ велічнасці асобы героя з'яўляецца ідэяй архітэктара*, то мы, па-першае, сутыкнемся фактычна з ненатуральным сказам (хутчэй, нават з бессэнсоўным), а па-другое, такі сказ выразна нам пакажа, што кваліфікаваць слова *ідэя* (як у зыходным сказе, так і ў яго трансформе) як выказнік было б гэтак жа ненатуральна, паколькі яно не нясе ў сабе ніякага сэнсу, ва ўсякім разе, дастатковага для выказніка. Каб гэта даказаць, возьмем для параўнання "дапоўнены" варыянт трансформа: *Паказ велічнасці асобы героя з'яўляецца в ы д а т н а й ідэяй архітэктара*. Як бачым, з дададзеным прыметнікам (заўважым: якасным і ацэначным!) і трансформ набывае натуральнасць, і, галоўнае, калі мы будзем вызначаць у ім выказнік, то толькі з прыметнікам у яго складзе: *з'яўляецца выдатнай ідэяй* (як у сказе *Іван быў адказным чалавекам* немагчыма і недарэчна вылучыць у якасці выказніка спалучэнне *быў чалавекам*). Разам з тым зыходны сказ *Ідэя архітэктара – паказаць велічнасць асобы героя* не

выглядае бессэнсоўным і без прыметніка пры слове *ідэя*, але аналіз яго трансформа паказвае, што ўспрыняцце такога сказа як натуральнага магчымае толькі пры той умове, калі слова *ідэя* не лічыць выказнікам.

Паказальнай для гэтага сказа будзе таксама спроба яго трансфармацыі за кошт дадавання ўказальнай часціцы *гэта*, якая выразна адзначае ў сказе выказнік. І тады выяўляецца наступнае: названую часціцу можна падставіць да другога з галоўных членаў, калі інфінітыў трансфармаваць у назоўнік (*Ідэя архітэктара – гэта паказ велічнасці асобы героя*), і немагчыма – да першага (**Гэта ідэя архітэктара – паказаць велічнасць асобы героя*; або: **Гэта ідэя архітэктара – паказ велічнасці асобы героя*; або: **Паказаць велічнасць асобы героя – гэта ідэя архітэктара*). І толькі калі зноў жа дадаць да назоўніка *ідэя* якасны прыметнік, сказ набудзе натуральную структуру і напаўненне: *Гэта выда́тная ідэя архітэктара – паказаць велічнасць асобы героя* (інтанацыйнае вылучэнне прыметніка абавязковае, інакш і ў такой версіі сказ застанецца ненатуральным). Гэта ўсё сведчыць пра тое, што ў сказе *Ідэя архітэктара – паказаць велічнасць асобы героя* выказнікам з'яўляецца інфінітыў, а назоўнік *ідэя* выказнікам можа стаць, толькі калі будзе мець пры сабе якасны прыметнік. А гэтая ўмова якраз прадугледжваецца комплексным падыходам пры вызначэнні выказніка. У выніку ж адзначанае становішча ў чарговы раз засведчыла, што выкарыстанне формулы трансфармацыі "Хз'яўляецца Y-ам" не можа з'яўляцца ўніверсальным і абавязковым спосабам вызначэння выказніка ў сказе.

Падводзячы агульную выснову нашага даследавання, можна сцвердзіць наступнае. Параўноўваючы два альтэрнатыўныя падыходы да вызначэння дзейніка і выказніка ў двухсастаўных сказах, абодва галоўныя члены якіх выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне або адзін з галоўных членаў выражаны інфінітывам, перавагу варта аддаць таму з іх, што мае комплексны характар, будучы заснаваным на ўліку праяў сказа ў розных яго аспектах. Перавага комплекснага падыходу вынікае з таго, што ў такім выпадку ёсць магчымасць улічыць рэальныя асаблівасці зместу сказа аж да тонкіх нюансаў, якія нярэдка знаходзяцца ў шчыльнай сувязі з граматычнай семантыкай сказа. Разам з тым контрпадыход, "вузкафармальны", уяўная перавага якога заснавана на магчымасці абапірацца пры вызначэнні дзейніка і выказніка на выразны фармальны крытэрый, можа даваць неадэкватныя вынікі, у пэўных выпадках спрашчаючы погляд на рэальную семантыку сказа і тым самым скажаючы бачанне сапраўдных роляў яго галоўных членаў.

Пры гэтым крытычная заўвага з боку прадстаўнікоў "вузкафармальнага" падыходу адносна падыходу комплекснага, нібы ў апошнім

выяўляюцца выпадкі непаслядоўных рашэнняў, не мае пад сабой грунту, таму што кваліфікацыя ўнутрана складанага аб'екта, фактар якога, дарэчы, і сам па сабе абумоўлівае неабходнасць комплекснага падыходу, ажыццяўляецца на падставе і е р а р х і з а ц ы і аспектаў. Таму, напрыклад, калі ў сказе *Сталіцай Турцыі з'яўляецца Анкара* адзін з галоўных членаў выражаны назоўнікам ва ўскосным склоне, то гэты назоўнік кваліфікуецца як выказнік (яго частка) з улікам адзначанай яго граматычнай характарыстыкі. Але калі мы маем сказ *Сталіца Турцыі – Анкара*, то форма назоўнага склону, якую маюць абодва галоўныя члены (гэта значыць, адсутнасць фактару граматычнай характарыстыкі), дазваляе прыняць пад увагу іншыя аспекты сказа, тым больш што пры спробе ўзнавіць (нібы) прыхаваную граматычную структуру сказа праз яго трансфармацыю не ў кожным выпадку можна мець пэўнасць, якая іменна формула трансфармацыі будзе адэкватнай рэальнаму зместу сказа, у тым ліку калі змест разглядаецца ў граматычным аспекце.

Дарэчы, тут рэзонна і паставіць пытанне, наколькі карэктна ўвогуле зыходзіць з таго, што граматычная трансфармацыя таго ці іншага сказа можа служыць спосабам выяўлення сінтаксічных роляў яго членаў. Бо, па-першае, граматычная структура сказа не заўсёды знаходзіцца ў карэляцыі з яго логіка-семантычнай структурай. А па-другое, калі і не браць пад увагу логіка-семантычную структуру сказа, а засяроджвацца толькі на граматычнай, то трэба ўсведамляць, што фактычна пэўны сказ і яго трансформ з'яўляюцца самастойнымі сінтаксічнымі адзінкамі – у тым сэнсе, што кожны з іх мае сваю ўласную граматычную структуру, так што ў гэтым плане пэўны сказ і яго трансформ хутчэй з'яўляюцца с а м а д а с т а т к о в ы м і, чым адзін з іх паказальным для другога. І з гэтай самадастатковасці граматычных структур мэтазгодна зыходзіць у тым ліку і пры вызначэнні дзейніка і выказніка ў кожным сказе.

Refereces

Âŭnevìč Mìhaìl, Scâcko Pavel. 2006. *Sìntaksìs sučasnaj belaruskaj movy*. Mìnsk: Aversèv [Яўневіч Міхаіл, Сцяцко Павел. 2006. *Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы.* Мінск: Аверсэв].

Babajceva Vera. 2010. *Strukturno-semantičeskoe napravlenie v sovremennoj rusistike*. V: Babajceva Vera. *Izbrannoe. 2005–2010: Sbornik naučnyh i naučno-metodičeskih statej*. Moskva – Stavropol': Izd-vo SGU [Бабайцева Вера. 2010. *Структурно-семантическое направление в современной русистике*. В: Бабайцева Вера. *Избранное. 2005–2010: Сборник научных и научно-методических статей*. Москва – Ставрополь: Изд-во СГУ].

Babajceva Vera. 2011. *Sistema členov predloženiâ v sovremennom russkom âzyke*. Moskva: Flinta – Nauka [Бабайцева Вера. 2011. *Система членов предложения в современном русском языке*. Москва: Флинта – Наука].

Belaruskaâ gramatyka ŭ 2 častkah. 1985–1986. Rèd. M. Bìryla, P. Šuba. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka [*Беларуская граматыка ў 2 частках.* 1985–1986. Рэд. М. Бірыла, П. Шуба. Мінск: Навука і тэхніка].

Burak Leanìd. 1987. *Sučasnaâ belaruskaâ mova: Sìntaksìs. Punktuacyâ*. Mìnsk: Unìversìtèckae [Бурак Леанід. 1987. *Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя.* Мінск: Універсітэцкае].

Čupaševa Ol'ga. 2005. *Grammatičeskaâ osnova predloženiâ: problemy i rešeniâ*. "Russkij âzyk". № 13 [Чупашева Ольга. 2005. *Грамматическая основа предложения: проблемы и решения.* "Русский язык". № 13] [online] https://rus.1sept.ru/article.php?ID=200501306 [доступ: 26.02.2024].

Danìl'čyk Zìnaìda. 1995. *Sìntaksìčnaâ rolâ ìnfìnìtyva*. "Rodnae slova" № 7: 67–77 [Данільчык Зінаіда. 1995. *Сінтаксічная роля інфінітыва*. "Роднае слова" № 7: 67–77].

Gusev Dmitrij. 2003. *Kratkij kurs logiki: Iskusstvo pravil'nogo myšleniâ*. Moskva: Izd-vo NC ÈNAS [Гусев Дмитрий. 2003. *Краткий курс логики: Искусство правильного мышления*. Москва: Изд-во НЦ ЭНАС].

Lekant Pavel. 1986. *Sintaksis prostogo predloženiâ v sovremennom russkom âzyke*. Moskva: Vyssaâ škola [Лекант Павел. 1986. *Синтаксис простого предложения в современном русском языке*. Москва: Высшая школа].

Mao Ân'. 2018. *Ocenočnost' kačestvenno-otnositel'nyh prilagatel'nyh v sovremennom russkom âzyke*. "Filologičeskie nauki. Voprosy teorii i praktiki" № 1, č. 1: 143–148 [online] https://www.gramota.net/materials/2/2018/1-1/37.html [доступ: 09.04.2024] [Мао Янь. 2018. *Оценочность качественно-относительных прилагательных в современном русском языке*. "Филологические науки. Вопросы теории и практики" № 1, ч. 1: 143–148].

Raspopov Igor'. 1970. *Stroenie prostogo predloženiâ v sovremennom russkom âzyke*. Moskva: Prosveŝenie [Распопов Игорь. 1970. *Строение простого предложения в современном русском языке.* Москва: Просвещение].

Raspopov Igor'. 1976. *Metodologiâ i metodika lingvističeskih issledovanij (Metody sinhronnogo izučeniâ âzyka)*. Voronež: Izd-vo Voronežskogo universiteta [Распопов Игорь. 1976. *Методология и методика лингвистических исследований (Методы синхронного изучения языка)*. Воронеж: Изд-во Воронежского университета].

Sovremennyj russkij âzyk. Čast' 2. Sintaksis. 1979. Red. D. Rozental'. 3-e izd., ispr. Moskva: Vyssaâ škola [*Современный русский язык. Часть 2. Синтаксис.* 1979. Ред. Д. Розенталь. 3-е изд., испр. Москва: Высшая школа].

Sovremennyj russkij âzyk 1989. Red. V. Belošapkova. 2-e izd., ispr. i dop. Moskva: Vyssaâ škola [*Современный русский язык* 1989. Ред. В. Белошапкова. 2-е изд., испр. и доп. Москва: Высшая школа].

Šumskaâ Ìryna. 1977. *Kanstrukcyì z ìnfìnìtyvam-dzejnìkam u belaruskaj move*. "Belaruskaâ lìngvìstyka". Vyp. 11: 29–34 [Шумская Ірына. 1977. *Канструкцыі з інфінітывам-дзейнікам у беларускай мове*. "Беларуская лінгвістыка". Вып. 11: 29–34].

Valgina Nina. 2003. *Sovremennyj russkij âzyk: Sintaksis*. 4-e izd., ispr. Moskva: Vyssaâ škola [Валгина Нина. 2003. *Современный русский язык: Синтаксис.* 4-е изд., испр. Москва: Высшая школа].

STRESZCZENIE: Przedmiotem badań jest problem ustalenia podmiotu i orzeczenia wyrażonych przez gramatycznie niezależne formy: rzeczownik w mianowniku lub rzeczownik oraz bezokolicznik w zdaniu dwuczęściowym z łącznikiem zerowym. Aktualność tematu badawczego polega na tym, że różne źródła opisujące składnię w ramach tradycyjnej teorii części zdania, takie jak gramatyki akademickie, podręczniki

uniwersyteckie, artykuły naukowe i naukowo-metodyczne, w ciągu ostatnich kilku dekad proponowały i nadal proponują różne sposoby wyróżnienia podmiotu i orzeczenia w zdaniach określonego typu, które wpływają na odmienne rezultaty rozbioru wielu zdań, co powoduje problemy w nauczaniu składni. Celem badania było nakreślenie ogólnego podejścia jako optymalnego w ramach powyższego problemu wraz z oznaczeniem konkretnych rozwiązań jako najbardziej racjonalnych dla zdań o odrębnych cechach w ich strukturze. W związku z tym artykuł ujawnia zalety i słabe strony dwóch najczęstszych sposobów wyodrębniania podmiotu i predykatu w białorutenistyce i rusycystyce w zdaniach określonego typu oraz odpowiadających im metodyk. W rezultacie uzasadnia się celowość wyboru kompleksowego podejścia w ustaleniu podmiotu i orzeczenia, które uwzględnia nie poszczególne aspekty zdania, lecz wszystkie razem, w tym komunikacyjny, wpływający na znaczenie zdania i jego aktualne rozczłonkowanie. Punktem kulminacyjnym artykułu jest uzasadnienie tezy, że formuła transformacji gramatycznej zdania *X з'яўляецца Y-ам* ('X jest Y-iem') nie może służyć jako uniwersalny i jedyny sposób wyróżnienia podmiotu i orzeczenia w zdaniu.

SŁOWA KLUCZOWE: podmiot, orzeczenie, podstawowe części zdania, transformacja gramatyczna zdania, podmiot logiczny, predykat, logiczno-semantyczna budowa zdania.

АНАТАЦЫЯ: Прадметам даследавання з'яўляецца праблема вызначэння дзейніка і выказніка, выражаных граматычна незалежнымі формамі: назоўнікамі ў назоўным склоне або назоўнікам і інфінітывам, – у двухсастаўным сказе з нулявой звязкай. Актуальнасць тэмы даследавання палягае на тым, што ў розных крыніцах, якія апісваюць сінтаксіс у межах традыцыйнага вучэння пра члены сказа: акадэмічных граматыках, універсітэцкіх дапаможніках, навуковых і навукова-метадычных артыкулах, – на працягу апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў і да гэтага часу прапануюцца розныя падыходы да вызначэння дзейніка і выказніка ў сказах названага тыпу, якія абумоўліваюць супрацьлеглыя рашэнні пры аналізе многіх сказаў, што, акрамя іншага, выклікае праблемы ў навучальным працэсе пры выкладанні сінтаксісу. Мэтай даследавання было акрэсліць аптымальны агульны падыход у межах названай праблемы разам з адзначэннем прыватных рашэнняў як найбольш мэтазгодных для сказаў з паасобнымі асаблівасцямі ў сваёй структуры. У сувязі з гэтым у артыкуле выяўляюцца вартасці і недахопы двух найбольш распаўсюджаных у беларусістыцы і русістыцы падыходаў да вызначэння дзейніка і выказніка, а таксама адпаведных ім методык. У высновах абгрунтоўваецца мэтазгоднасць абрання комплекснага падыходу ў справе вызначэння дзейніка і выказніка, пры якім бяруцца пад увагу не паасобныя аспекты сказа, а ўсе разам, у тым ліку камунікацыйны, які абумоўлівае асаблівасці семантыкі сказа, звязаныя з яго актуальным падзелам. Адметнасцю артыкула з'яўляецца абгрунтаванне таго, што апора на формулу граматычнай трансфармацыі сказа "X з'яўляецца Y-ам" не можа выступаць як універсальны і абавязковы спосаб вызначэння дзейніка і выказніка ў сказе.

КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ: дзейнік, выказнік, галоўныя члены сказа, граматычная трансфармацыя сказа, лагічны суб'ект, прэдыкат, логіка-семантычная структура сказа.

Data przesłania artykułu: 14.05.2024
Data akceptacji artykułu: 21.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Valery Varanovich / Валеры Варановіч – Białoruś, Grodzieński Uniwersytet Państwowy im. Janki Kupały, Katedra Filologii Białoruskiej; dr nauk filologicznych, docent; specjalność naukowa: językoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: słowotwórstwo białoruskie; fonologia, morfonologia w zakresie języków wschodniosłowiańskich oraz polskiego; krajoznawstwo filologiczne Grodzieńszczyzny; opracowywanie zadań konkursowych w zakresie języka białoruskiego dla uczniów.

Adres: Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, кафедра беларускай філалогіі, вул. Ажэшка, 23, 230023 Гродна, Беларусь.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Варановіч Валеры. 2023. *Феномен вулічных прозвішчаў вёскі Пракопавічы Індурскага сельсавета* (127–133). У: *Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: Зборнік навуковых прац*. Рэд. А. Садоўская. Гродна: ГрДУ.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Katarzyna Węgorowska, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.17

Katarzyna Węgorowska

Uniwersytet Zielonogórski / University of Zielona Góra
ORCID: http://orcid.org/0000-0001-5851-706X
e-mail: k.wegorowska@ifp.uz.zgora.pl

Wyróżniki dawnego kobiecego stroju bielsko-hajnowskiego zwerbalizowane w dwóch etnograficznych opracowaniach popularnonaukowych

Distinguishing features of the ancient women's costume of Bielsko-Hajnowy verbalized in two ethnographic popular articles
Характэрныя рысы старога жаночага бельска-гайнаўскага строю, вербалізаваныя ў двух этнаграфічных навукова-папулярных даследаваннях

ABSTRACT: This article is a continuation of the consideration of the linguocultural distinctive features of the old traditional costume of Bielsko-Hajnowskie. This time the items of traditional female dress from the Bielsko Podlaskie and Hajnówka areas are taken into linguo-culturological consideration. Their reconstruction was based on two popular scientific ethnographic publications by Elżbieta Piskorz-Branekova (2007) and Jarosław Górski (2013). Owing to an insightful study of both readings, the elements that co-create one of the most "archaic and simple", yet "elegant and peculiar in form and character" old regional "costumes" were established. The names fixed in them are: 1) ornaments and headgear (ribbons, flowers, Tibetan kerchiefs), 2) shirts (soroczki), 3) different types of skirts (andarak, sajan), 4) different types of stockings (połka, pudpołnik), 5) winter sheepskins, 6) footwear and related footraps (footwear, tufli), 7) jewellery (real beads, inner tubes), 8) embroidery and other "costume" decorations (Janina stitch, tulle ribbon). These also demonstrate that traditional folk costumes are representative denotes of individual regional small homelands, whose local linguistic heritage saves the linguistic and cultural legacy of the nation from being forgotten.

KEYWORDS: women's Bielsko-Podlaskie costume, ethnography, linguoculturology, verbalisation, nomenclature, cultural and linguistic interference.

Jaki kraj, taki strój. To ludowe przysłowie utrwalone przez Ojca polskiej etnografii – Oskara Kolberga [Kolberg 1977: 440] uwydatnia jedną z bardziej istotnych kulturowych prawidłowości, według której odpowiedni tradycyjny ubiór regionalny stanowi reprezentatywny wyróżnik konkretnego regionu.

Relacja *konkretny region charakterystyczny dlań tradycyjny ubiór regionalny* dotyczy także, stanowiącego przedmiot niniejszych rozważań „archaicznego i prostego" [Górski 2013: 4], „a mimo to eleganckiego i swoistego w formie i charakterze" [Piskorz-Branekova 2007: 109], powstałego pod wpływem kultury białoruskiej, dawnego kobiecego, zarówno codziennego, jak i świątecznego, stroju bielsko-hajnowskiego.

Pomimo, że

> zainteresowanie kulturą ludową i jej ochrona przypada na początek XIX wieku. Począwszy od powstania kościuszkowskiego, szczególnie zaś listopadowego, zaczęto dostrzegać istnienie warstwy chłopskiej jako takiej oraz jej rolę, jaką odgrywa w całej kulturze narodowej. Skonstatowano fakt, iż warstwa chłopska jest nie tylko podmiotem produkcji, ale również współtwórcą i nosicielem kultury narodowej, która pielęgnowana i podtrzymywana przez wiele pokoleń przybrała swoiste oblicze, właściwe dla ludu polskiego [Szałygin 2005: 131].

„kostium" ten, podobnie jak dawny męski strój bielsko-hajnowski, nie został nigdy, również pod względem lingwokulturologicznym [Węgorowska 2023], wystarczająco opisany i „nie doczekał się zbyt bogatej kolekcji" [Piskorz-Branekova 2007: 112].

Odnośnie do owego północnokresowego ubioru odpowiednie jest też kolejne polskie przysłowie: *Każdy strój ma swój krój* [Masłowska, Masłowski 2003: 400], które uwydatnia jego modową niepowtarzalność i modowy indywidualizm.

Owa modowa regionalna tożsamość oraz modowy regionalny indywidualizm widoczne są już bowiem w dwóch wstępnych, ogólnych jeszcze, charakterystykach żeńskich ubiorów z okolic Bielska Podlaskiego i Hajnówki, które, podobnie jak męski strój tego obszaru, wykreowane były z naturalnych lokalnych surowców: lnu, wełny, konopi, słomy, sitowia, bydlęcych, świńskich oraz baranich skór i pozostawały pod wpływem narodowej kultury białoruskiej.

Na podstawie pierwszej, dość zdawkowej, relacji wiadomo, że bielsko-hajnowski „strój kobiecy w swej podstawowej wersji składał się z nakrycia głowy (chustki, czepka), koszuli, spódnicy, zapaski, kożucha i obuwia" [Piskorz-Branekova 2007: 119].

Autor drugiej z nich wymienia z kolei i opisuje jego zwizualizowane na fotografii komponenty, jak:

> czerwony czepek składający się z szerokiego otoku często zdobionego haftem, koronką lub tasiemką i miękkiej główki; chusta naramienna w kolorowe kwiaty; *pudpołnik* (zapaska) marszczona u góry, rozszerzająca się ku dołowi, na dole obszyta tasiemką, fabryczną koronką lub paskiem tiulu; *soroczka* koszula o kroju przyramkowym, z bufiastymi rękawami i haftowaną stójką z rozcięciem na środku zapinanym na małe guziczki; spódnica z samodziału, najczęściej w kratę czerwono-żółto-czarną, rzadziej prążkowana, na tle czerwonym; czarne trzewiki na obcasiku [Górski 2013: 5].

Jednak świadomość obojga przywoływanych tu etnografów, że „inaczej ubierały się dziewczęta, inaczej mężatki" [Karwicka 1995: 37], sprawia że wymieniane przez nich wyróżniki podlaskich kobiecych ubiorów zostają werbalnie / językowo ubogacone, a tym samym uszczegółowione / doprecyzowane.

Przedmiotem, a zarazem celem niniejszego opracowania, będącego kontynuacją rozważań poświęconych wyróżnikom dawnych tradycyjnych strojów bielsko-hajnowskich zwerbalizowanym w dwóch przytoczonych powyżej, dopełniających się, etnograficznych popularnonaukowych publikacjach – *Polskie stroje ludowe, cz. 2* autorstwa Elżbiety Piskorz-Branekovej z 2007 r. oraz *Bielszczanka* autorstwa Jarosława Górskiego z 2013 r. – są zatem bardziej szczegółowe, bardziej doprecyzowane, językowe świadectwa / językowe detale / językowe szczegóły[1] / „dane językowe"[2], pozwalające na lingwistyczną i kulturologiczną zarazem rekonstrukcję żeńskich, tym razem, niezwykle ciekawych, dawnych północnokresowych strojów ludowych, które noszone były jeszcze w okresie dwudziestolecia międzywojennego.

Owo językowo-„kostiumowe" uszczegółowienie widoczne jest w uwagach dotyczących:

1) ozdób i nakryć głowy panien:

> Dziewczęta z okolic Bielska Podlaskiego chodziły najczęściej z odkrytą głową, eksponując plecione warkocze ozdobione wstążkami lub kwiatami [Górski 2013: 6]. Przywilejem panien było chodzenie z odkrytą głową, jedynie w chłodne dni zakładały chustki takie same, jak nosiły kobiety zamężne [Piskorz-Branekova 2007: 115];

---

[1] *Językowy detal*, *językowy szczegół* – termin zaproponowany przez autorkę rozważań, wprowadzony do językoznawstwa w 2004 roku i stosowany przez nią na określenie nazwy – leksemu będącego elementem charakteryzującym i dopełniającym pojęcie główne, stanowiące centrum pola semantycznego, <fr. *détail* 'szczegół, część większej całości> [Węgorowska 2004: 39].

[2] Zdaniem Stanisława Gajdy „lingwistyka była i będzie nauką empiryczną. Nie może istnieć bez danych językowych, ale te dane to nie tylko fakty o charakterze zewnętrznym (materiał językowy), lecz także – jak w lingwistyce kognitywnej – struktury wiedzy. Charakterystyka języka wymaga sięgnięcia do myślenia, odwołania do kontekstu społecznego i kulturowego. I na odwrót – w miarę pełna eksplikacja tych ostatnich nie jest możliwa bez przywołania języka" [Gajda 2005: 34].

2) czepków noszonych wyłącznie przez mężatki, które

> ukrywały włosy pod czerwonym czepkiem składającym się z dość szerokiego otoku i miękkiej wystającej spoza niego główki [Górski 2013: 6]. Do pierwszej wojny światowej obowiązkowym nakryciem głowy mężatki od dnia oczepin był czepek (*czepeć*, *czapiec*), potem chustki. Czepki starszego typu szyte były z czerwonego fabrycznego płótna bawełnianego gładkiego lub w bardzo drobne, zwykle czarne wzory. Otok czepka ściśle okalał czoło i skronie, natomiast główka w kształcie czapeczki, ściągana z tyłu sznureczkiem lub tasiemką, lekko odstawała od głowy, tworząc nad czołem dwa niewielkie rożki [Piskorz-Branekova 2007: 116];

3) różnego rodzaju chustek noszonych na głowie latem, w dni chłodniejsze oraz zimą, wykonanych z:
a) płótna lub sukna:

> Latem był to najczęściej płócienny płatok (kosynka) wiązany do tyłu na karku [Piskorz-Branekova 2007: 115]. W chłodniejsze dni dziewczęta z okolic Bielska Podlaskiego wiązały na głowie płatok, czyli chustkę z samodziałowego płótna lub sukna [Górski 2013: 6];

b) tybetu:

> Od końca XIX wieku w powszechnym użyciu były już fabryczne barwne chustki tybetowe [Górski 2013: 6]. W dni chłodniejsze noszono chustki z tybetu w ostrych kolorach, z wyraźnym kontrastowym wzorem kwiatowym (szlak drobnych motywów wzdłuż wszystkich czterech boków, większe kwiatki i bukieciki pośrodku). Ich boki wykończone były gładko lub plecionymi frędzlami, wiązano je raczej pod brodą [Piskorz-Branekova 2007: 116];

c) wełny:

> W chłodniejsze dni na czepek i chustkę można było narzucić chustkę z grubszej wełny [Górski 2013: 6]. Zimą, w czasie mrozów kobiety zakładały duże, grube chusty, kraciaste w ciemnych stosunkowo barwach. Przed założeniem składano je po przekątnej, następnie najdłuższy bok powstałego trójkąta, zwijano tworząc około 15 centymetrową zakładkę. Tak przygotowaną chustkę zakładano na głowę, krzyżowano pod brodą, a jej końce wiązano na plecach [Piskorz-Branekova 2007: 116];

4) pragmatycznych koszul, które

> tak, jak męskie zwane soroczkami, o bufiastych rękawach i kroju przyramkowym były najczęściej wpuszczane pod spódnicę i zapaskę. Ze względów oszczędnościowych ich widoczną, górną część szyto z cienkiego, dobrze wybielonego płótna dobrej jakości, a dolną od pasa do kolan, z szarego grubego samodziału. […] Kobiece koszule miały haftowaną stójkę, a wzmocnione, zapinane na małe guziczki rozcięcie umiejscowione było centralnie i mogło sięgać aż do brzucha, co miało znaczenie praktyczne, kiedy kobieta karmiła piersią [Górski 2013: 6–7].

Koszule kobiece (*soroczki*) podobnie jak i męskie miały krój przyramkowy. Szyto je także z tkanin lnianych, część dolną z płótna grubego, gorszego gatunkowo, natomiast górną widoczną z samodziału cienkiego starannie bielonego. Na piersiach miały one głębokie rozcięcie, wzmocnione pasami płótna, przy szyi kołnierzyk – stójkę (kownier, kowner), rękawy przymarszczone i wszyte w mankiet. Zapinano ją na drobne szklane guziczki (białe, kremowe, granatowe) przyszyte na mankietach oraz po lewej stronie rozcięcia koszuli i stójki [Piskorz-Branekova 2007: 116];

5) różnych rodzajów spódnic, które

dopóki używano tkanin samodziałowych, były raczej kraciaste. Na wyraźnym, czerwonym tle widoczne były delikatne kraty żółte, czarne, granatowe lub zielone. Spotykało się tu również spódnice prążkowane, także na tle czerwonym (prążki mogły biec zarówno wzdłuż, jak i w poprzek spódnicy). Tkaniny na spódnice gładkie miały często czarną osnowę i czerwony lub żółty wątek [Górski 2013: 7]. Spódnice (*spódnicia*) najczęściej szyte były z tkanin samodziałowych kraciastych, pasiastych lub gładkich. Samodziały pasiaste i kraciaste miały najczęściej tło w kolorze czerwonym, natomiast gładkie tkaniny miały osnowę i wątek w dwóch kontrastowych kolorach (osnowa była zwykle czarna), dzięki temu lekko się mieniły. Spódnice miały swoje indywidualne nazwy takie jak *sajan* czy *andarak*. Spódnice starszego typu były szersze, szyto je z czterech szerokości tkaniny, natomiast na te noszone po pierwszej wojnie światowej przeznaczano już tylko trzy szerokości samodziału. Spódnica miała w obwodzie około 210 cm [Piskorz-Branekova 2007: 116];

6) odmiennych rodzajów zapasek:

Na spódnicę zakładano zapaskę. Codzienną, pełniącą funkcję roboczego fartucha nazywano *połką*. Zwykle szyto ją z jednobarwnej tkaniny niezbyt dobrej jakości. Zapaska świąteczna nazywała się *pudpołnik*, była marszczona na górze, rozszerzała się ku dołowi, często na dole obszywano ją tasiemką, fabryczną koronką albo paskiem tiulu [Górski 2013: 7]. Zapaski (*pudpołniki*, *pudpolniki*, *pudpoliki*) noszono do stroju świątecznego niekiedy codziennego, natomiast zapaską wybitnie roboczą była *półka* (*połka*). *Podpołniki* starszego typu szyto z kraciastych tkanin samodziałowych. Przeznaczano na nie pas samodziału szerokości około 70 cm i długości około 98 cm. Jego dłuższy bok po ułożeniu w drobne zakładki wszywano w pasek – oszewkę, często ze specjalnie w tym celu utkanego samodziałowego paska tkaniny. Późniejsze zapaski były nieco węższe (około 80 cm) i szyto je z gładkich cienkich tkanin wełnianych produkcji fabrycznej lub białego płótna bawełnianego. […] Zapaski płócienne krojono z jednego kawałka płótna, ale zszywano je tak, że sprawiały wrażenie krojonych z trzech klinów. Dzięki pionowym zaszewkom miały kształt trapezu, wszywano je w pasek z tej samej tkaniny [Piskorz-Branekova 2007: 119];

7) zimowych kożuchów i kożuszków:

Zimą kobiety zakładały obszerne kożuchy podobne do męskich (czasem też pożyczone do męża). Bogatsze gospodynie wybierały kożuszki o kobiecym

> kroju i obcisłym stanie, rozszerzające się na dole i sięgające do połowy łydek. Szyto je ze skóry wyprawionej na żółto i obszywano haftem z wełnianej nici [Górski 2013: 7]. Zimowym okryciem wierzchnim kobiet były kożuchy identyczne z noszonymi przez mężczyzn [Piskorz-Branekova 2007: 119];

8) obuwia i związanych z nim onuc:

> Latem zarówno mężczyźni, jak i kobiety nosili łapcie (*postoły*) plecione z łyka na drewnianej podeszwie. […] Tutaj, inaczej niż w innych regionach kraju, nikogo nie dziwił widok wieśniaków w łapciach uczestniczących we mszy lub tańczących na weselu. Takie łapcie szybko się zużywały, więc niemal w każdym domu był ktoś, kto umiał je pleść i strugać nożem podeszwy. […] Jednak większość kobiet nosiła tradycyjne spódnice, do których pasowały łapcie sznurowane na onucach sięgających do kolan [Górski 2013: 6–7]. Do stroju codziennego noszono najczęściej postoły z łyka, mocowane do stopy sznurkiem konopnym przewlekanym przez uszka znajdujące się wzdłuż ich boków. W wypadku braku łyka używano też postołów z pasów plecionej w warkocz słomy [Piskorz-Branekova 2007: 115];

9) biżuterii, która „pełniła różne funkcje, przede wszystkim zdobiła ubiór odświętny i stanowiła jednoznaczny, widoczny dowód zamożności, świadczyła więc o wysokiej pozycji kobiety w lokalnej, wiejskiej społeczności" [Piskorz-Branekova 2008: 5; por.: Minksztym 2010, Węgorowska 2019], i o której wiadomo, że

> Podlasianki bardzo lubiły ozdoby. W święta zakładały po kilka sznurów barwnych, szklanych paciorków, czasem także nosiły korale z dętego szkła. Rzadko spotyka się tu prawdziwe korale czy bursztyny, na które mogły sobie pozwolić tylko bardzo zamożne gospodynie [Górski 2013: 7]. Do stroju kobiecego okolic Bielska Podlaskiego i Hajnówki niezbyt powszechnie noszono tanie koraliki z różnych mas plastycznych [Piskorz-Branekova 2008: 231];

10) haftów i innych „kostiumowych" dekoracji:

> Dół otoku mógł być zdobiony haftem, wąską fabryczną koronką lub tiulową tasiemką. […] Kobiece koszule miały haftowaną stójkę. […] Zapaskę często na dole obszywano tasiemką, fabryczną koronką albo paskiem tiulu. […] Kożuszki o kobiecym kroju obszywano haftem z wełnianej nici [Górski 2013: 6–7]. Kożuchy wzdłuż obu przodów kieszeni, niekiedy na rękawach zdobiły rzędy haftu wykonanego ściegiem Janina w kolorach najczęściej żółtym, zielonym i brązowym. […] Czepek w części znajdującej się blisko twarzy zdobiły odszycia z wąskiej koroneczki i rzędy kolorowej pasmanterii. […] Koszulę na piersiach, stójce przy szyi i mankietach zdobiły pasy czerwono-czarnego haftu krzyżykowego lub liczonego, dominowały w nim zgeometryzowane motywy roślinne. […] Dolny brzeg zapaski był gładki lub wykończony odszyciem z pasa fabrycznego haftu angielskiego, zdobił go także często szlak czerwono-czarnego haftu krzyżykowego, którego motywem była esowato ułożona gałązka z kwiatkami i listkami. […] Zapaski wełniane w części dolnej zdobiły

> ozdobne naszycia, z kolorowej pasmanterii, wstążek lub białej bawełnianej koronki, po ułożeniu w zakładki wszywano je w wąski pasek-oszewkę [Piskorz-Branekova 2007: 114, 116–117, 119].

Modowa prawidłowość, według której „strój podlegał zmianom i przeobrażeniom, które nie dokonały się w izolacji od wpływów zewnętrznych" [Piskorz-Branekova 2006: 5] wpłynęła natomiast na fakt, że

> na przełomie XIX i XX wieku osoby najbardziej zamożne i hołdujące nowinkom w dziedzinie mody nosiły ubiory szyte, co prawda, z tkanin samodziałowych, ale krojone i zdobione według mody miejskiej [Piskorz-Branekova 2007: 110], a na początku XX wieku bogatsze mieszkanki Bielska Podlaskiego chętnie nosiły w święta miejskie spódnice długie do kolan z niewielką turniurą i rozszerzane ku dołowi. Do takich spódnic zakładało się ciemny kaftanik, także o miejskim kroju, i sznurowane ciemne trzewiczki na obcasiku [Górski 2013: 7].

Przywołana powyżej E. Piskorz-Branekova uszczegóławia ową „miejską" tendencję w tradycyjnej bielsko-hajnowskiej modzie ludowej, wskazując na charakterystyczne dla niej *spódnice*, które

> szyto zgodnie z modą miejską z tkanin pasiastych, kraciastych lub gładkich, przeważnie w ciemnych spokojnych kolorach. Krojono je z klinów, miały prosty przód i boki, natomiast ułożone na tyle zakładki upodabniały ją do turniury. Spódnice te zdobiły podkreślające krój naszycia z pasów aksamitu, nie noszono na nich zapasek [Piskorz-Branekova 2007: 118].

oraz zakładane do nich *kaftaniki*

> krojone według tych samych zasad, niekiedy z tej samej materii, co spódnica, częściej jednak z cienkiej tkaniny fabrycznej. Zdobiły je naszycia z czarnego aksamitu [Piskorz-Branekova 2007: 119].

Autorka „Polskich strojów ludowych" werbalizuje również dodatki owego ludowo-miejskiego ubioru, którego

> uzupełnienie stanowił czepek lub półczepek i niekiedy jedwabny szal. […] Oprócz tych czepków używano niekiedy półczepków szytych z tiulu, białego płótna lub batystu zdobionego najczęściej haftem maszynowym, czasem ręcznym. Półczepki noszono wyłącznie do ubioru wzorowanego na modzie miejskiej przełomu XIX i XX wieku, czasem ich miejsce zajmował jedwabny szal w kolorze kremowym [Piskorz-Branekova 2007: 116, 119].

Pozostałe, równie bogate, ale bardziej doprecyzowane, nacechowane metajęzykowo, „dane językowe" dowodzą, że stanowiący przedmiot niniejszych lingwokulturologicznych refleksji kobiecy strój bielsko-hajnowski skomponowany był z: 1) naturalnych tworzyw i materiałów, jak: *łyko* – miękka, lekko wilgotna, mięsista warstwa drzew i krzewów, znajdująca się pod korą,

[14] У кнізе Юліяны Вітан-Дубейкаўскае (1886–1970) *Мае ўспаміны* чытаем: "...амаль усю рэдакцыйную працу рабіў Антон Луцкевіч; І в а н ч а с а м і р а б і ў н а к і д ы а р т ы к у л а ў, а А н т о н і х а п р а ц о ў в а ў (вылучэнне нашае. – *М. Х.*). Калі газэта пачала выходзіць і лацінскай і гражданкай, Антон ня мог сам справіцца з карэктай і гэтую працу перадаў Аляхновічу" [Вітан-Дубейкаўская, online]. Як бачым, Ант. Адамовіч, схвавана цытуючы адзін сказ Ю. Вітан-Дубейкоўскае, невядома на падставе якіх крыніцаў "тлумачыць" паходжанне псеўданіма "Іван Мялешка".

[15] *Прамова Мялешкі* шмат разоў друкавалася ў працах польскіх, расейскіх і ўкраінскіх навукоўцаў.

[16] У арыгінале: "Denkmäler der weissrussischen Rhetorik" – помнікі беларускае рыторыкі.

Гэтая нататка, скіраваная да беларускае інтэлігенцыі і беларускае вёскі, з'явілася, відаць, пасля таго, як браты Луцкевічы падрыхтавалі для рэдактара Аляксандра Касцялянскага строга акадэмічны раздзел для калектыўнае навуковае манаграфіі *Формы національнаго движенія въ современныхъ государствахъ: Австро-Венгрія. Россія. Германія*, што меўся быць друкаваны ў Пецярбурзе[17]. Якраз дзеля гэтае працы быў падабраны псеўданім – Антон Новіна/Навіна, якім А. Луцкевіч пачне актыўна карыстацца хіба з 1912 г.[18].

У 1908 г. артыкулы пра народы Расейскае імперыі, як сцвярджае А. Касцялянскі [гл.: Кастелянскій 1910: I], былі ўжо ў складальніка[19]; а г. зн., што на падставе нарыса *Бѣлоруссы* браты (?) Луцкевічы падрыхтавалі публікацыі дзеля прапаганды беларушчыны за мяжою і дзеля іншамоўнага чытача. З іх мы ведаем наступныя друкаваныя працы, падпісаныя псеўданімам "Антон Новіна"[20]:

Novina Anton. 1909. *Národni probuzeni Bělorusů* (159–163). „Slovanský přehled: Sborník statí, dopísův a zpráv ze života slovanskeho", ročník XI, číslo 4, 8 ledna.

Новина Антонъ. 1909. *Національное возрожденіе бѣлорусов*. «Московскій еженедельникъ», № 9 (29.02).

Nowina Antoni. 1909. *Odrodzenie narodowe białorusinów*. „Litwa: Dwutygodnik illustrowany litewski w języku polskim", nr 4 (15 marca): 50–54.

Артыкул А. Новіны ў чэшскім зборніку Адольфа Чэрнага (1864–1952) выявіў у 1927 г. у Museum Regni Bohemiae Францішак Грышкевіч (1904/1906–1946) і прапанаваў „za dwa hady (u 1929 h.) <…> światkawać dwaccacihodździe našaje zahraničnaje prapahandy" [Hryškiewič 1927, nr 29: 1–2].

А. Луцкевіч, пазнаёміўшыся з публікацыяй Ф. Грышкевіча ў газеце "Беларуская Крыніца", палічыў патрэбным удакладніць маладога паэта і навукоўца:

---

[17] У зборнік артыкул пра ўкраінцаў напісаў прафесар Міхал Грушэўскі (1866–1934), пра палякаў – Людвік Кшывіцкі (1859–1941), а таксама Міхал Ромэр (1880–1945), пра летувісаў – Андрэй Булат (Andrius Bulota, 1872–1941).

[18] Так, напрыклад, падпісаны артыкул *На дарозі да новаго жыцьця* ў альманаху "Маладая Беларусь" (1912). Гэты артыкул з'явіўся на падставе шэрагу публікацый 1909 г. Антона Новіны і Івана Мялешкі за мяжою. Звернем увагу, што ў 1909–1915 гг. А. Луцкевіч у "Нашай Ніве" падпісваў свае публікацыі крыптанімамі "Г. Б.", "А. Н-а" і "а-н-а".

[19] Зборнік убачыў свет у 1910 г., але значна раней з'явіліся адбіткі асобных артыкулаў. У № 12 (19.03/1.04) "Нашае Нівы" за 1909 г. паведамлялася, што ў рэдакцыі газеты можна набыць "брошуру Ант. Новіны *Бѣлоруссы*". А ў маі 1909 г. Янук Журба пазнаёміў чытачоў "Нашае Нівы" са зместам гэтае працы Антона Луцкевіча [гл.: Журба 1909, № 19: 279–281].

[20] І, як гаварылася раней, яшчэ тры артыкулы, падпісаныя псеўданімам "Iwan Meleschka", былі надрукаваныя ва ўкраінскім нямецкамоўным штомесячніку „Ukrainischen Rundschau".

> У імя праўды мушу адзначыць, што чэсьць п е р ш а г а выступленьня ў замежнай прэсе аб беларускім пытаньні належыць ня мне, а н я б о ж ч ы к у Івану Л у ц к е в і ч у, які шмат раней зьмясціў сваю першую стацьцю аб беларусах у выдаваным у Вене журнале „Ruthenische Revue" (пасьля перайменаваным у „Ukrainische Rundschau" пад рэдакцыяй ведамага ўкраінскага дзеяча Уладзіміра Кушніра. Не магу толькі прыпомніць точна году: ці гэта было ў 1904 г. (мо пачатку 1905 года), калі Ів. Луцкевіч быў у Вене, дапаўняючы сваю архэалягічную веду, ці – пазьней. Падпісаў ён свой артыкул псэўданімам: Heban Palissander" (гэтым імем яго называлі ў партыйнай перапісцы Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады). Ів. Луцкевіч першы завязаў зносіны з замежнымі ўкраінскімі дзеячамі і чэхамі (А. Чэрны), падрыхтаваўшы грунт і для маіх пазьнейшых артыкулаў у „Ukrinische Rundschau"[21], „Slovansky Prehled" ды інш. Паўтараю: магчыма, што першыя крокі Івана Луцкевіча ў замежнай прэсе былі зроблены і пазьней, чым у 1904 года, – мо' ў аднэй з пазьнейшых падарожжаў, але ўсё-ж не пазьней 1908 году. Мо' грам. Грышкевіч, карыстаючыся сваей бытнасьцяй заграніцай, пастараецца пакапацца ў гадавіках „Ruthenische Revue" і „Ukrainische Rundschau" ад 1904 да 1908 году, бо-ж можа акажацца, што нам трэба гатавацца да абходу не 20, а 25-лецьця прэсавае акцыі [Навіна 1927, № 31: 4].

Такім чынам, А. Луцкевіч здолеў тут прыгадаць (у адрозненне ад нарыса з 1920 г. *Жыцьцё і праца Івана Луцкевіча*) шэраг важных акалічнасцяў, звязаных з публікацыяй першага ў нямецкамоўным друку артыкула пра беларускае нацыянальнае пытанне. Цяпер ён дакладна называе тытул выдання, псеўданім, якім была падпісаная публікацыя, і даволі правільна акрэслівае час, калі яна друкавалася. Істотна тое, што ён расшыфроўвае іменную частку псеўданіма, якую пазней марна будзе спрабаваць зразумець Ант. Адамовіч:

> ані беларускага, ані нямецкага ймя, якое пачыналася-б з "Гэб.", знайсці нельга, гэта хіба пачатак нейкага, але цяжка сказаць якога, слова зь нейкім самастойным значэньнем [Адамовіч 1983: 26].

І сапраўды, "гэбан" – гэта слова з тае самае галіны, што і "палісандар": каштоўныя пароды дрэў, "знан[ыя] антыквару Івану Луцкевічу" [Адамовіч 1983: 26]. Усё гэта, а таксама тое, што І. Луцкевіча "называлі ў партыйнай перапісцы Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады" Гэбанам Палісандэрам можа быць сведчаннем на карысць ягонага аўтарства артыкулу ў "Ruthenische Revue".

Падобна на тое, што апрача братоў Луцкевічаў ніхто ў тагачаснай Літве-Беларусі не ведаў пра публікацыю артыкулаў пра беларускае

---

[21] Вельмі імаверна, што тут ідзе гаворка пра артыкулы *Zur weissrussischen Frage*, *Weissrussen und Polen* і *Neuer Versuch einer Vivisektion an dem weissrussischen Volke*. Тым самым А. Луцкевіч дае знаць, што псеўданім "Іван Мялешка" належыць толькі яму.

адраджэнне ў "Ruthenischen Revue" і ў „Ukrainischen Rundschau". З прычыны антыцарскага характару гэтае выданне, пэўна ж, не распаўсюджвалася ў Расейскай імперыі. Невядома таксама, ці Ф. Грышкевіч выканаў просьбу А. Луцкевіча: адшукаў у Празе "Ruthenischen Revue", скапіраваў *Das totgesagte Weissrussland* ды прыслаў копію ў "Беларускі Музэй у Вільні".

Больш за тое, даследнікі беларускага нацыянальнага руху былі знаёмыя толькі з успамінамі А. Луцкевіча *Жыцьцё і праца Івана Луцкевіча* (1920), дзе шмат недакладнасцяў у справе з'яўлення ў друку вышэй згаданае публікацыі. Недаступнаю была доўгі час і сама публікацыя.

Невыпадкова, што Алесь Каваль [Аляксей Каўка] і Юры Туронак падчас "ніўскае" дыскусіі 1981 г. так і не змаглі вырашыць пытанне: у якім "часопісе" быў надрукаваны артыкул *Das totgesagte Weissrussland* і ці можна даць веры, што яго аўтарам быў Іван Луцкевіч? [гл.: Каваль 1981a, № 23; Туронак 1981a, № 25; Туронак 1981b, № 35; Каваль 1981b, № 46]. Праўда, Анатоль Сідарэвіч аўтарытэтна сцвердзіў, што

> Кропку ў гэтай спрэчцы, здаецца, паставіў Ант. Адамовіч. Ён піша пра часопіс "Ruthenische Revue", у якім (у № 19 за першую палову кастрычніка 1904 г.) і быў зьмешчаны артыкул І. Луцкевіча *Das totgesagte Weissrussland*. Назву гэтага артыкулу Ант. Адамовіч пераклаў як *Мёртваю абвешчаная Беларусь*. Ён жа паведамляе, што гэты артыкул у сьнеж. 1904 г. надрукаваны ў часопісе "The Anglo-Russian" пад загалоўкам *The White-Russians. A Nation driven back into the Middle Ages under Muscovite rule* (*Беларусы. Нацыя, адкінутая назад у сярэднія вякі пад маскавіцкім панаваннем*). Тэкст гэты, дадае Ант. Адамовіч, выявіў В. Кіпель [Сідарэвіч 2007: 66].

І ўсё ж – кропку ў гэтай справе, на нашую думку, паставіў яшчэ раней А. Луцкевіч сваім артыкулам *Маленькая папраўка* ў малазнанай заходнебеларускай газеце Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады "Наша праўда", якая выдавалася ад вясны да восені 1927 г. у Вільні два разы на тыдзень пад фармальнай рэдакцыяй (№№ 20–34) Марыі Гічан.

Ужо няма ніякіх сумненняў, што першы артыкул пра беларускія нацыянальныя справы ў нямецкамоўным часопісе належыць пяру І. Луцкевіча. Што датычыць аўтарства трох нямецкамоўных артыкулаў ва "Ukrainische Rundschau" (1909), падпісаных псеўданімам "Іван Мялешка", дык нягледзячы на тое, што Ант. Адамовіч сцвярджаў, нібыта гэтым псеўданімам падпісвалі свае супольныя артыкулы браты Луцкевічы, варта лічыць іх публікацыямі Антона Луцкевіча.

Друкуецца ў перакладзе з нямецкае мовы паводле першапублікацыі: Heb. Palisander, *Das totgesagte Weissrussland*, „Ruthenische Revue" 1904, nr 19, s. 533–538.

Названая мёртваю Беларусь[22]

Heb. Palisander (Слуцак)

Узяўшы тут слова, хачу скарыстацца з гасціннасці „Ruthenischen Revue", каб пазнаёміць чытачоў гэтага выдання з сітуацыяй маіх суайчыннікаў, беларусаў. Многія іншаземцы са здзіўленнем прачытаюць гэтыя радкі і спытаюць: што гэта за такі малы народ, пра існаванне якога ім нагадваюць? Але ж беларускае пытанне ўзнікла не ў апошнія гады! Яно такое ж старое, як літоўскае, польскае і ўкраінскае (русінскае).

Нават украінскі народ малавядомы ў Заходняй Еўропе. Але заходнееўрапейскія навукоўцы, прынамсі, філолагі і гісторыкі, ведаюць, што ёсць украінскі (русінскі) народ, які мае сваю гісторыю, сваю мову і літаратуру, а таксама вельмі багатую народную паэзію, дык з гэтае прычыны не тоесны расейскаму народу. Між іншым, „Ruthenische Revue" ўжо шмат зрабіла ў гэтай галіне і з апытання[23], арганізаванага гэтым выданнем, відаць, што сярод найвыдатнейшых прадстаўнікоў заходнееўрапейскай культуры ёсць людзі, якія з гарачай сімпатыяй ставяцца да эмансіпацыйных намаганняў украінскага народа, што, вядома, выклікае дыскамфорт у колах расейскіх панславістаў. І хоць русіфікацыя Украіны – гэта адна з самых запаветных мараў панславістаў, але ўсе адукаваныя славяне сёння ведаюць, што гэтая русіфікацыя адно *pium desiderium*[24], прыгожая ўтопія.

Значна горшая сітуацыя з беларускімі справамі. Тут таксама вялікую ролю адыгрывае назва. У той час, калі ўкраінскі народ сам сябе называе "ўкраінцы", а ў Заходняй Еўропе ён уважаецца за "русінаў", дык нашая адзіная праўдзівая назва – беларусы. Ці гэта адпавядае планам панславістаў? Пра гэта сведчаць намаганні расейскага ўрада надаць русінам выдуманую назву "маларосы". Іншаземцы схільныя палучаць сапраўдных расейцаў з беларусамі і "маларосамі". З гэтае прычыны беларусаў нават славяне лічаць расейцамі і гэтым павялічваюць колькасць прадстаўнікоў расейскага народа ў славянскай статыстыцы.

Беларусы насяляюць большую частку тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага, якая цяпер называецца «Сѣверо-Западнымъ краемъ». Расейскі ўрад не хоча прызнаваць адметнае назвы гэтае краіны: называе беларусаў "русскими Сѣверо-Западнаго края". У той час як вышэйзгаданы ўрад, нягледзячы на панславянскія тэндэнцыі, п р ы з н а е

---

[22] У друку можна сустрэць іншыя варыянты перакладу нямецкамоўнага тытулу артыкула на беларускую мову: *Прыгавораная да смерці Беларусь* (Ю. Туронак) і *Мяртвою абвешчаная Беларусь* (Ант. Адамовіч).

[23] Параўн. „Ruth[enische] Revue", год II, № 11–17. (*Заўвага аўтара.*)

[24] Пабожнае жаданне (*лац.*).

нацыянальную адрознасць русінаў і стала называе іх "маларосамі", ён адмаўляецца даваць беларусам якую-небудзь адметную назву і, як я ўжо казаў, называе іх проста "русскими Сѣверо-Западнаго края". Агульная колькасць беларусаў паводле афіцыйнае статыстыкі[25], праведзенай дзеля навукова-этнаграфічных мэтаў, складае дзесяць мільёнаў[26]. Большасць народу, блізу васьмі мільёнаў, вызнае праваслаўную веру, да якое належыць таксама шмат беларусаў-уніятаў, якіх у 1839 г. урад цара Мікалая I далучыў да праваслаўных, як і шматлікіх католікаў пасля стлумлення польскага паўстання 1863 г., у якім бралі ўдзел і беларусы. Астатнія 1 800 000–2 000 000 беларусаў і сёння з'яўляюцца рыма-каталікамі. Гэтых апошніх урад звычайна называе рускімі каталіцкага веравызнання, хоць апошнім часам назіраецца тэндэнцыя залічваць іх да палякаў, а не лічыць асобным народам.

Самастойна кіраваная ў першыя стагоддзі свайго гістарычнага існавання на аснове дэмакратычных, народна-абшчынных прынцыпаў, Беларусь у часе свайго найвышэйшага культурнага росквіту ў XVI ст. уваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага, у некалькі разоў перасягаючы этнаграфічную Літву памерамі і насельніцтвам. Пераважаючы ў культурных адносінах над сваімі заваёўнікамі[27], беларусы змаглі аказаць на іх такі вялікі ўплыў, што пры дварах вялікіх князёў літоўскіх панавала беларуская мова і беларускія звычаі. Беларуская мова была дзяржаўнаю на ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага з канца Сярэднявечча да 1696 г.[28], на ёй таксама былі напісаны літоўскі Судзебнік[29], Статуты Вялікага Княства Літоўскага[30].

Пасля заняпаду культурнага цэнтру літоўскай сталіцы, Вільні, у эпоху каталіцкае рэакцыі, беларускія асветнікі пераехалі ў Кіеў, у Магілянскую

---

[25] У Расеі перапіс насельніцтва праводзіцца паводле рэлігійнае прыналежнасці. (*Заўвага аўтара*.)

[26] Вельмі імаверна, што аўтар карыстаецца звесткамі з працы Я. Карскага *Бѣлорусы* (1903) [гл.: Карскій 1903: 185–191].

[27] Тут і далей аўтар ідзе ўслед за канцэпцыяй расейскіх навукоўцаў пра літоўскае заваяванне Русі ў XIII–XIV стст.

[28] Тут аўтар мае на ўвазе пастанову канвакацыйнага Сойму 1696 г.: "Dekreta wszystkie Polskim ięzykiem odtąd maią być wydane" ("Усе дэкрэты з гэтай пары павінны выдавацца на польскай мове"), якая касавала патрабаванне Статута 1588 г.: "А пісар земскі маець па-руску літарамі і словы рускімі ўсі лісты, выпісы і позвы пісаці, а не іншым языком і словы".

[29] Маецца на ўвазе напісаны на старабеларускай мове *Судзебнік 1468 года* – зборнік норм права XV ст., складзены на загад вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча.

[30] Маюцца на ўвазе напісаныя на старабеларускай мове *Першы* (1529), *Другі* (1566) і *Трэці* (1588) *Статуты Вялікага Княства Літоўскага* – зводы заканадаўчых актаў дзяржавы.

акадэмію[31]. З гэтага часу беларускія навукоўцы перасталі працаваць на карысць Бацькаўшчыны. У канцы XVII ст. яны бралі ўдзел у станаўленні расейскае літаратуры, развіваючы ў ёй новы кірунак і ўзбагачаючы сваімі творамі. Варта толькі згадаць Сымона з Полацка[32] альбо Радзівіла[33]. Але больш за ўсё беларусам могуць дзякаваць палякі. Беларусы ўзбагацілі польскую літаратурную мову беларускімі элементамі, беларусы далі палякам самую яркую зорку іхняе літаратуры – Адама Міцкевіча. Таксама шмат іншых славутых палякаў, як паэт Сыракомля, які таксама пісаў беларускія вершы, як вялікі арганізатар першага польскага паўстання Тадэвуш Касцюшка, былі беларусамі з паходжання.

Гэта асобныя звесткі з беларускае гісторыі. А цяпер давайце паглядзім на цяперашнюю сітуацыю беларусаў. З матэрыяльнага пункту гледжання яна зусім незайздросная. У Беларусі ў асноўным вільготная глеба, шмат пяску і балотаў пасярод першабытных лясоў, якія сёння высякаюцца з прычыны спусташальнае эканомікі, якая цалкам знаходзіцца ў руках ураду. Рэгіён населены беларускім людам і паланізаванымі панамі, якія бязлітасна эксплуатуюць народную працоўную сілу. Неабсяжныя латыфундыі знаходзяцца ва ўладанні ўрада, які альбо пакідае іх пусткаю, альбо размяркоўвае сярод каланізатараў-расейцаў, не звяртаючы ўвагі на тубыльцаў, якія масава эмігруюць у Амерыку і Сібір. Варта згадаць пра нізкі культурны ўзровень народа, чаму, бадай, няма роўных у Еўропе. Наўрад ці 8–10 % умеюць чытаць, а толькі 6–8 % – пісаць[34]. Афіцыйная народная адукацыя заснаваная на навучанні расейскай тэхніцы чытання і пісьма, на навучанні чытанню царкоўнаславянскіх імшалаў, на завучванні ўсіх членаў царскае фамілії, на практыкаваннях у чатырох матэматычных дзеяннях і на запамінанні найбольш важных падзей

---

[31] Гаворка пра заснаваны ў 1632 г. праваслаўным мітрапалітам Пятром Магілаю Кіеўскі калегіум, празваны ў гонар заснавальніка Кіева-Магілянскім. У 1701 г. калегіуму былі нададзены правы і тытул акадэміі.

[32] Маецца на ўвазе Сімяон Полацкі (Самуіл Пятроўскі-Сітняновіч, 1629–1680), які ў 1664 г. (падчас вайны Расеі з Рэччу Паспалітай у 1654–1667 гг.) быў вывезены ў Маскву.

[33] У арыгінале: "Radziwiłłowitsch". Цяжка сказаць, каго мае на ўвазе аўтар.

[34] Невядома, на падставе якіх крыніцаў аўтар падае гэтыя звесткі пра ўзровень пісьменнасці на тэрыторыі Беларусі. У артыкуле Антона Луцкевіча *Школы і граматнасць у Беларусі* ["Наша Ніва" 1911, № 35 (1/14 верас.)] на падставе вынікаў Усеагульнага перапісу насельніцтва Расейскае імперыі 1897 г. пададзеныя іншыя, значна вышэйшыя, паказчыкі пісьменнасці. Найбольш поўныя звесткі пра школьную справу ў Беларусі XIX – пачатку XX ст. гл. у працы Міколы Улашчыка *Пісьменнасць у дарэвалюцыйнай Беларусі* [Улашчык Мікола. 2019. *Збор твораў*. Т. 2. Смаленск: Інбелкульт, с. 995–1011).

з расейскае гісторыі. Асновы праваслаўя таксама з'яўляюцца абавязковымі для каталіцкіх школьнікаў у малодшых класах. Але нават калі не браць пад увагу палітычныя, нацыянальныя і рэлігійныя аспекты гэтага навучання, колькасць школаў настолькі малая, а само навучанне такое кепскае, што, правучыўшыся ў школе два-тры гады, вучань праз год ужо не можа чытаць. А пра пісьмо і гаворкі няма. Прычынаю гэтага сумнага відовішча з'яўляецца тое, што ўрокі вядуцца на незразумелай расейскай мове. Настаўнікам пачатковых класаў забараняецца выкладанне на беларускай мове пад пагрозаю неадкладнага звальнення. Нядзіва, што ў гэтых умовах народная асвета амаль не развіваецца, хутчэй занепадае, што пасля 30 гадоў інтэнсіўнае русіфікатарскае працы больш за 90 % беларусаў цалкам непісьменныя. Усе культурна-асветніцкія выданні на беларускай мове забароненыя, як і рэвалюцыйныя. Дазваляецца перадрукоўваць толькі асобныя літаратурныя творы ў навуковых мэтах, а таксама збіраць этнаграфічны матэрыял, усё, зразумела, расейскім шрыфтам і расейскім правапісам. Тэксты, надрукаваныя лацінскімі літарамі, нават калі яны маюць чыста навуковы характар, як, напрыклад, этнаграфічная праца *Lud białoruski* Міхала Федароўскага[35], выдадзеная Кракаўскаю акадэміяю навук, не прапускаюць ў Расею.

У праваслаўных цэрквах апрача царкоўнаславянскае мовы выкарыстоўваецца толькі расейская мова (беларусы-ўніяты апрача царкоўнаславянскае мовы карысталіся беларускай). На расейскай мове чытаюцца пропаведзі, на гэтай жа мове адбываюцца споведзі і г. д. Урад спрабаваў увесці расейскую мову ў каталіцкіх святынях; але з тае прычыны, што люд і беларуская інтэлігенцыя супраціўляліся гэтаму двацаць гадоў, ён мусіў адмовіцца ад свае задумы. Аднак ён перашкодзіў планам тагачаснага мітрапаліта[36], які хацеў дазволіць беларускую мову ў духу папскае булы, у якой запісана, што "кожны народ павінен ужываць сваю родную мову ў сакраментах"; урад палічыў за лепшае замест беларускае, якой карысталіся да 1863 г., увесці польскую мову!

У сваім русіфікатарскім запале расейскі ўрад правёў поўную забарону беларускае мовы. І гэтая забарона распаўсюджваецца не толькі на афіцыйнае выкарыстанне, не толькі на царкву, школу і дачыненні з уладамі, але таксама і на прыватнае жыццё. Пастанова Міністэрства

[35] Гаворка пра выдадзеныя ў Кракаве ў 1897, 1902 і 1903 гг. тры тамы „materiałów do etnografii słowiańskiej" *Lud Białoruski na Rusi Litewskiej* Міхала Федароўскага (1853–1923).

[36] Статус мітрапаліта мелі ў Расейскай імперыі Магілёўскія архіепіскапы, якія звычайна знаходзіліся ў Санкт-Пецяргурзе і кіравалі каталіцкім касцёлам Імперыі. Невядома, каго з мітрапалітаў другое паловы XIX ст. мае на ўвазе аўтар.

ўнутраных спраў забараняе выкарыстанне беларускай мовы ў прыватных кампаніях; жаўнерам не дазваляецца атрымліваць беларускамоўныя лісты з радзімы, а студэнтаў проста выключаюць за выкарыстанне роднае мовы ў дачыненнях з калегамі.

Аднак русіфікатарска-праваслаўны дух не абмяжоўваецца культурным прыгнётам, а распаўсюджваецца і на эканамічную сферу. Перш за ўсё, беларуская каталіцкая шляхта пазбаўленая права набываць ворную зямлю ў сваім краі. Ёй таксама забаронена займаць дзяржаўныя пасады на радзіме. Беларускім сялянам-католікам дазваляецца купляць зямельныя ўчасткі, але не больш за 60 дзесяцін[37] і толькі ў тым выпадку, калі яны будуць апрацоўваць іх сваімі рукамі. Урад імкнецца падтрымаць варожае стаўленне беларускіх сялян да апалячанае беларускае шляхты; гэта існуе з часоў польскага паўстання 1863 г., у якім удзельнічала і згаданая шляхта. Гэта дасягаецца шляхам забароны камасацыі фальваркавых і сялянскіх палёў, а таксама шляхам прадухілення часта выгаднага для сялянаў абмену сервітутамі. (Сервітуты таксама былі ўведзены адмыслова дзеля гэтае мэты ў 1860-я гады). Праваслаўнае духавенства – падахвочанае ўрадам – падбухторвае народ супраць інтэлігенцыі. Нядаўна пайшла ў народзе чутка, што паны, жыды і ўсе католікі вывозяць золата, порах і харчы японцам, а калі японцы перамогуць[38], то з дапамогай апошніх будзе ўведзена паншчына. Дык абавязкам кожнага селяніна з'яўляецца ахвяраваць на Добраахвотны флот[39] і Чырвоны Крыж, а ўсіх падазроных людзей, напрыклад антываенных агітатараў, здаваць уладам. Усё гэта было даказана ў судзе падчас працэсу, прадметам якога быў напад падбухтораных сялянаў на асобных падарожных. Сяляне палічылі падарожных японскімі шпіёнамі, збілі іх і звязанымі завялі ў турму. Сяляне пачынаюць пагражаць, што заб'юць усіх паноў, жыдоў і католікаў з-за іх нібыта сімпатый да японцаў. Апошнім часам наступствы гэтае агітацыі выяўляюцца ў выглядзе падпалаў. Праваслаўнае духавенства маўкліва дапускае ўсё гэта.

На заканчэнне хачу падаць некаторыя звесткі з гісторыі беларускае літаратуры і нацыянальнага адраджэння беларускага народа ў 40–60-я гады мінулага стагоддзя. Беларуская літаратура, заснаваная на фальклорных элементах, развівалася хуткімі тэмпамі. Доказам гэтаму з'яўляецца

---

[37] Дзесяціна мае 2400 сажняў. (*Заўвага аўтара*). Паводле метрычнай сістэмы, 1 дзесяціна роўная 1,09 га.

[38] Расейска-японская вайна пачалася ў лютым 1904 г.

[39] Акцыянернае суднаходнае таварыства, утворанае ў 1878 г. дзеля таварна-пасажырскіх зносінаў і садзейнічання развіццю расейскага гандлю.

пераклад найвялікшае польскае паэмы Адама Міцкевіча *Пан Тадэвуш*, які ўзнік у тыя часы. Тады ж узнік беларускі тэатр і вядомы польскі кампазітар Манюшка, таксама беларус з паходжання, напісаў музыку да лібрэта оперы *Ідылія*, аўтарам якога быў вядомы беларускі паэт Марцінкевіч. Адбылося гэта ў 50-я гады мінулага стагоддзя. Але забарона Мураўёвым выкарыстоўваць лацінку[40] ў беларускіх творах спыніла гэта адносна паспяховае развіццё літаратуры. Расейскі алфавіт ў Беларусі, дзе палякі ўвялі сваё пісьмо[41], быў у тыя часы проста невядомы. Далейшыя рэпрэсіі працягваліся ў тым жа духу блізу 50 год. Народ вымушаны быў вярнуцца да даўніх песень і паданняў, якія і да сённяшняга дня замяняюць яму адсутнасць друкаванага слова. Сёння ў гэтым кірунку зроблена сёе-тое, што паклала пачатак барацьбе з афіцыйным адурманеннем народа. З гэтаю мэтаю ўтвараюцца ўсё новыя і новыя літаратурна-асветніцкія таварыствы, дзейнасць якіх пачалася ў апошнім дзесяцігоддзі XIX ст. 25–30 нелегальнымі выданнямі, некаторыя з іх друкаваліся кірыліцай для праваслаўных, некаторыя – лацінскімі літарамі для каталікоў. Гэтыя выданні карыстаюцца такім попытам і прызнаннем, што нават непісьменныя людзі з задавальненнем слухаюць іх і вучаць на памяць. Такім чынам многія беларускія вершы сталі здабыткам народа і ў якасці народных песень увайшлі ў этнаграфічныя зборнікі. Дык самы час не забараняць жыццёва важнае, а дазволіць друкаванне не толькі этнаграфічных матэрыялаў, але і іншых карысных кніг, як кірыліцай, так і лацінкай. У адваротным выпадку два мільёны беларусаў-каталікоў мусілі б карыстацца адно польскімі ці нелегальнымі беларускімі тэкстамі, што таксама не спадабалася б расейскім уладам. Расея ўжо мела сумны досвед у гэтым плане ў літоўскім пытанні.

Гэта карціна народа, які жыве ў Еўропе, гэта самая цёмная карта змрочнае Расеі. І ўсё ж менавіта гэты народ пасля заваявання Украіны татарамі, пасля разгрому паўночных рэспублік[42] маскавітамі меў з XVI ст. цесныя дачыненні з Заходняю Еўропаю, і нават перанёс на сваю глебу ейныя рэфарматарскія ідэі. І гэты народ, які доўгі час быў культурным

[40] Расейскія ўлады забаранілі беларускую (польскую) лацінку пастановаю Галоўнае ўправы цэнзуры ад 26 верасня 1859 г.: «Не допускать употребления польского алфавита при печатании сочинений на белорусском наречии, книгу *Pan Tadeusz* Мицкевича, в белорусском переводе Дунина-Марцинкевича, отпечатанную польским шрифтом, не выпускать в свет» [гл.: Шлюбскі 1928: 303–337]. Забарона друку лацінкаю была ўспрынята як забарона беларускага друку наогул. Як не прадугледжаная законам, забарона на друк у беларускай мове (як лацінкаю, гэтак і кірыліцаю) была знята на падставе ўказа Мікалая II ад 12.12.1904 г.

[41] Відаць, аўтар мае на ўвазе пастанову канвакацыйнага Сойму 1696 г. Гл. вышэй.

[42] Меліся на ўвазе далучэнне да Масковіі Ноўгарадскае і Пскоўскае зямель.

цэнтрам для цяперашняе Расеі аж да Ламаносава, сёння пазбаўлены самых элементарных правоў. Яго трымаюць у жахлівай цемры; ён, "дзякуючы" стогадоваму кіраванню белых цароў[43], мае менш школаў, чым меў у XVI ст. Расейская ўлада адкінула беларускі народ на тры стагоддзі назад ад XVI ст., каб сёння ён жыў у сапраўды сярэднявечных умовах.

References

A. J. 1892. *Słoŭco ad tłumacza* (3–5). U: Mickiewicz Adam. *Tan Tadeusz*. Lwoŭ.

A. N. 1926. *Metropolita Szeptycki a ruch białoruski*. (Przekład z kwart. „Bohosłowija"). „Przegląd Wileński" nr 9: 5–6.

Adamovič Anton. 1983. *"Jak dux zmahan′nja Belarusi"*: *Da 100-x uhodkaĭ naradžèn′nja Ivana Luckeviča*. N′ju-Ërk [Адамовіч Антон. 1983. *"Як дух змаганьня Беларусі": Да 100-х угодкаў нараджэньня Івана Луцкевіча*. Нью-Ёрк].

Ananim. 1908. *Kolki słou ab nacjonalnym adradzeńniu zabytaho narodu*. „Nasza Niwa" Nr 20 (25[8] sienciabra): 1–2.

Anonim. 1905. *Die Petersburger Akademie der Wissenschaften über die ruthenische Frage*. „Ruthenische Revue" nr 18: 451.

Buraczok Maciej. 1891. *Dudka białaruskaja*. Kraków.

Die Redaktion. 1906. *Von der Redaktion*. "Ukrainische Rundschau" nr 1: 1.

Die Redaktion 1909. [*Das Anmerkung*]. "Ukrainische Rundschau" nr 6: 271.

Hryškiewič Francišak. 1927. *Z pryčyny byćcia ŭ Prazie Rektara Mienskaha Ŭniwersytetu, praf. Pičety*. „Biełaruskaja Krynica", nr 29 (15 lipnia): 1–2.

Karskij Evfimij. 1903. *Bѣlorussy*. T. I: *Vvedenie v" izučenie âzyka i narodnoj slovesnosti. Varšava* [Карскій Евфимій. 1903. *Бѣлоруссы*. Т. I: *Введеніе въ изученіе языка и народной словесности*. Варшава].

Kastelânskij Aleksandr". 1910. *Predislovie* (I–XIII). V: *Formy nacional'nago dviženiâ v" sovremennyh" gosudarstvah": Avstro-Vengriâ. Rossiâ. Germaniâ*. Pod" red. A.I. Kastelânskago. S.-Peterburg" [Кастелянскій Александръ. 1910. *Предисловіе* (I–XIII). В: *Формы національнаго движенія въ современныхъ государствахъ: Австро-Венгрія. Россія. Германія*. Подъ ред. А.И. Кастелянскаго. С.-Петербургъ].

Kaval′ Ales′. 1981a. *Ivan Luckevič. 1881–1981*. "Niva" № 23 (7 čèrvenja) [Каваль Алесь. 1981a. *Іван Луцкевіч. 1881–1981*. "Ніва" № 23 (7 чэрвеня)].

Kaval′ Ales′. 1981b. *Jaščè ab Ivane Luckeviču*. "Niva" № 46 (15 listapada) [Каваль Алесь. 1981b. *Яшчэ аб Іване Луцкевічу*. "Ніва" № 46 (15 лістапада)].

Kirkor Adam Honory. 1874. *O literaturze pobratymczych narodów słowiańskich*. Kraków.

Luckievič Anton. 1920. *Žyćcio i praca Ivana Luckieviča* (5–27). U: *Pamiaci Ivana Luckieviča ŭ pieršyje ŭhodki śmierci jaho. (20.VIII.1919–20.VIII.1920)*. Viĺnia [Луцкевіч Антон. 1920. *Жыцьцё і праца Івана Луцкевіча* (5–27). У: *Памяці Івана Луцкевіча ў першые ўгодкі сьмерці яго. (20.VIII.1919–20.VIII.1920).* Вільня].

Meleschka Iwan. 1909. *Zur weissrussischen Frage*. "Ukrainische Rundschau", nr 6: 271–276.

Mykytiak Andreas. 1904. *Die Ruthenen im Lichte der neuesten anthropologischen Forschungen* (662–665). „Ruthenische Revue" 1904, nr 24.

[43] Так з XVI ст. тытулавалі маскоўскага цара прадстаўнікі цюркскіх і мангольскіх народаў, кубанскія казакі. Вобраз белага цара сустракаецца ў расейскай духоўнай паэзіі.

Navina Anton. 1927. *Malieńkaja paprajka: Piśmo ŭ redakcyju*. "Naša praŭda" № 31 (20 lip.) [Навіна Антон. 1927. *Маленькая папраўка: Пісьмо ў рэдакцыю*. "Наша праўда" № 31 (20 ліп.)].

Palisander Heb. 1904. *Das totgesagte Weissrussland*. „Ruthenische Revue" nr 19, s. 533–538.

Peaker Carol. 2006. *We are not Barbarians: Literature and the Russian Émigré Press in England, 1890–1905*. "19: Interdisciplinary Studies in the Long Nineteenth Century" 3 [online] www.19.bbk.ac.uk[date of access: 01.06.2024].

Rapisardi Mario. 1904. *Das Verbot der ukrainischen Sprache in Russland. Eine Enquete.* „Ruthenische Revue" 1904, nr 11, s. 4 (244).

Reut Halina. 1994. *Biblijahrafija* (106–111). U: *Bielaruskija piśmienniki: Bijabiblijahrafičny sloŭnik u 6 tamach*, t. 4, Minsk [Рэут Галіна. 1994. *Бібліяграфія* (106–111). У: *Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік у 6 тамах*, т. 4, Мінск].

Sidarevič AnatoĺI. 2007. *Kamientary* (65–76). U: Sidarevič AnatoĺI (uklad.) *Pra Ivana Luckieviča: Uspaminy, śviedčańni*. Minsk [Сідарэвіч Анатоль. 2007. *Каментары* (65–76). У: Сідарэвіч Анатоль (уклад.) *Пра Івана Луцкевіча: Успаміны, сьведчаньні*. Мінск].

Slatter John. 1984. *Jaakoff Prelooker and The Anglo-Russian* (49–66). In: *From the Other Shore: Russian Political Emigrants in Britain, 1880–1917*. London.

Šliubski Aliaksandar. 1928. *Adnosiny rasijskaha ŭradu da bielaruskaj movy ŭ XIX st.* (303–337). U: *Zapiski Addzielu humanitarnych navuk*, kn. 2: *Pracy kliasy filioliohii*, tom 1. Miensk [Шлюбскі Аляксандар. 1928. *Адносіны расійскага ўраду да беларускай мовы ў XIX ст*. (303–337). У: *Запіскі Аддзелу гуманітарных навук*, кн. 2: *Працы клясы філёлёгіі*, том 1. Менск].

Turonak Jury. 1981a. *Pa plionach paznajecie ich*. "Niva" № 25 (21 červienia) [Туронак Юры. 1981a. *Па плёнах пазнаеце іх*. "Ніва" № 25 (21 чэрвеня)].

Turonak Jury. 1981b. *List da Aliaksandry Bierhman*. "Niva" № 35 (30 žniŭnia) [Туронак Юры. 1981b. *Ліст да Аляксандры Бергман*. "Ніва" № 35 (30 жніўня)].

Vitan-Dubejkaŭskaja Julijana. *Mae ŭspaminy* [online] https://knihi.com/Julijana_Vitan-Dubiejkauskaja/Maje_uspaminy.html[date of access: 01.06.2024] [Вітан-Дубейкаўская Юліяна. *Мае ўспаміны*].

Xaŭstovič Mikola. 2019. *Dasledavanni i matèryjaly: Litaratura Belarusi XIX – pačatku XX stahoddzja*. Tom pjaty. Warszawa [Хаўстовіч Мікола. 2019. *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя*. Том пяты. Warszawa].

Data przesłania artykułu: 01.06.2024
Data akceptacji artykułu: 10.09.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Mikałaj Chaustowicz / Мікола Хаўстовіч – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; prof. dr hab.; specjalność naukowa: literaturoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: literatura białoruska w XIX wieku, polsko-białoruskie związki literackie.

Adres: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa, Polska.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Хаўстовіч Мікола. 2023. *Да пытання пра беларускамоўную творчасць Юльяна Ляскоўскага* (91–96). [У:] *Шляхам яго жыцця: успаміны, роздумы, доследы:*

матэрыялы круглага стала, прысвеч. памяці І.В. Жука, рэд. Н.П. Чукічова, Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы.
2. Хаўстовіч Мікола. 2023. *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя*, том дзявяты. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.
3. Хаўстовіч Мікола. 2023. *Псеўданімы Юльяна Ляскоўскага* (117–123). [У:] *Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі: зборнік навуковых артыкулаў па выніках IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай памяці Пятра Васючэнкі*. Мінск: МДЛУ.
4. Хаўстовіч Мікола. 2023. *Юльян Ляскоўскі як беларускамоўны літаратар.* „Studia Białorutenistyczne" 17: 125–137.
5. Хаўстовіч Мікола. 2024. *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX стагоддзя*, том дзясяты. Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Magdalena Lajewska, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.19

Magdalena Lajewska

Badaczka niezależna / Independent researcher
ORCID: https://orcid.org/
e-mail: mlajewska@gmail.com

Cykl *Miłość i śmierć* Maksima Bahdanowicza, jego recepcja w Polsce oraz propozycja tłumaczenia

The series Love and Death by Maksim Bahdanovich, its reception in Poland and translation proposal
Нізка Каханне і смерць Максіма Багдановіча, яе рэцэпцыя ў Польшчы і прапанова перакладу

W 1973 roku ukazały się *Poezje wybrane* Maksima Bahdanowicza [Bahdanowicz 1973] pod redakcją Jana Huszczy, do dziś jest to jedyny zbiór wierszy białoruskiego klasyka w języku polskim. Utwory zostały przetłumaczone przez następujących poetów: Jana Huszczę (55 utworów), Tadeusza Chróścielewskiego (9 wierszy), Wiktora Woroszylskiego (7 wierszy) oraz Jana Koprowskiego (2 wiersze). Wybór zawiera najważniejsze utwory poetyckie oraz prozatorskie, to niewątpliwie przełomowy moment w recepcji twórczości Maksima Bahdanowicza w Polsce[1]. Szczegółowej analizy wyboru poezji dokonała Zofia Skibińska w artykule *Poezja Maksima Bahdanowicza w polskich przekładach* [Skibińska 1994]. Badaczka udowodniła, że na tle wszystkich tłumaczeń wyróżniają się przekłady W. Woroszylskiego, najodważniej, najlepiej oddają warstwę muzyczną i semantyczną. Pozostałe tłumaczenia są wierne oryginałowi pod względem ideowym, jednak nie oddają melodyjności warsztatu Bahdanowicza, zastępują sylabotonizm wierszem sylabicznym. Z. Skibińska ostrożnie postawiła następującą tezę: „Przekłady Wiktora Woroszylskiego mogą być – jak sądzę – wzorem dla przyszłych tłumaczy poezji tego oryginalnego białoruskiego poety" [Skibińska 1994: 54].

[1] Pierwszy przekład wiersza *Tkaczki słuckie* na język polski ukazał się we „Wsi Ilustrowanej" w 1913 r. pióra Józefa Wierzyńskiego.

Antologia J. Huszczy jest kamieniem milowym w polskiej recepcji M. Bahdanowicza, jednak pokazuje ona tylko fragment twórczości tego pisarza. Myśl tę chciałabym rozwinąć w oparciu o cykl *Miłość i śmierć*.

Cykl ten nie został opublikowany w *Wianku* w 1913 r., lecz dopiero po śmierci poety, w 1927 r. Z listów do redaktora tomu, Wacława Łastouskiego, wiemy, że poeta miał zamiar umieścić go w rozdziale pt. *Madonny*. Nie wiadomo, dlaczego W. Łastouski ostatecznie zrezygnował z tego pomysłu [Багдановіч 1992, т. I: 612–613]. Wiersze były pisane od sierpnia do października 1912, kiedy poeta miał zaledwie 21 lat. Do antologii J. Huszczy trafiły tylko dwa z nich: *Ciemnemu uczuciu podległa* oraz *Leży cała w potach, jak biały śnieg blada*.

Z pewnością warto je interpretować w kontekście całego cyklu, ponieważ jest on swoistym dziennikiem lirycznym. Pierwszy wiersz (****Choć i byliśmy sami w ten czas*) opowiada o relacji zakochanych, która rozwinęła się niespodziewanie. Miłość jest porywcza i jednocześnie dziecinna, pocałunki kończą się banalnymi rymowankami. Drugi wiersz (*Ciemnemu uczuciu podległa*) traktuje o nocy poślubnej i obawach z nią związanych. Napięcie buduje silny, naturalny, żywiołowy instynkt (*Jedno wdarło się pragnienie, by całym ciałem, sobą wchłonąć burzliwe męskie nasienie*) i zgoda na konsekwencje aktu, na ból, a nawet śmierć przy porodzie. Trzeci wiersz to scena, gdy ojciec dowiaduje się o ciąży (****Ciemne niebo w nocy*). Poeta bawi się kontrastem nocy i wewnętrznego światła, schowanego życia. Czwarty utwór (*Brzemiennej*) to ciąża, szczęśliwa, senna, prawdziwy opis drugiego trymestru. Wiersz piąty, *Triolet*, przybliża czytelnika do trzeciego trymestru, kobieta się zaokrągla, przypomina jajeczko, podmiot liryczny opisuje ją ciepło i serdecznie. Szósty wiersz pokazuje radość z poruszania się malucha, który niby pisklę trzepocze skrzydłami we wnętrzu matki (****Jak dobrze, kiedy dziecię*). Siódmy utwór (*Przekleństwo brzemiennej*) przerywa idyllę, Cyganka przeklina kobietę, mówi, że urodzi martwe dziecko. Ósmy wiersz (****Z jękiem dziecię rodzisz*) przedstawia sytuację, w której kobieta ciężarna odczuwa skurcze. Mężczyzna wyrzuca sobie, że jest przyczyną cierpienia. Dziewiąty utwór (****Leży cała w potach, jak biały śnieg blada*) to fotografia już po porodzie – zakrwawione łóżko, a na nim noworodek, ssący pierś, zestawienie obok siebie słabości ciała i wielkości ducha. Dziesiąta część (****Po porodzie marniejesz z dnia na dzień*) to okres poporodowy, kobieta marnieje z każdym dniem. Jedenasty wiersz (****Dla nich sławy wieńce surowe*) to śmierć kobiety. Dwunasty (****Biały krzyż, płyta, pod nią – mogiła*) to wyniesienie takiej śmierci do rangi bohaterstwa, śmierć, która daje życie, jest bardziej bohaterska niż śmierć żołnierza na polu bitwy! Ostatnia stacja to cmentarz, krzyż, kwiaty i pamięć o ukochanej.

Podobne zestawienie to ogromne uproszczenie. Tylko język poetycki jest w stanie przekazać wszystkie odcienie oraz paradoksy jednoczesnych narodzin

i śmierci, miłości i rozpaczy, bezsilności i herozimu, poświęcenia i tragicznego losu. Motywy te są dobrze znane francuskiej poezji modernistycznej, z której czerpał poeta. Fundament filozoficzny obecnych w jego tekstach dychotomii, dialektycznego spojrzenia na rzeczywistość zawarty jest w myśli Arthura Schopenhauera. Tamara Czaban rozpatruje cykl *Miłość i śmierć* w kontekście twórczości rosyjskich symbolistów – Konstantego Balmonta, Walerija Briusowa, Władimira Sałłoguba oraz Fiodora Tiutczewa. Motyw miłości jako fatalnego uczucia, które prowadzi do śmierci, był modny w kręgu wyżej wymienionych poetów [Bahdanovič 1992: 516]. M. Bahdanowicz jednak wychodzi poza kanon dekadentyzmu, wprowadza wątki ewangeliczne. Jak przekonuje Tamara Czaban:

> Cykl *Miłość i śmierć* jest głęboko i bezpośrednio związany obrazem Madonny z gawędami poetyckimi *Na wsi* i *Weronika*. W obrazach wiejskich dziewczynki i Weroniki Madonna pojawia się tylko na chwilę, jako ideał, nadzieja, obietnica, a w *Miłości i śmierci* to właśnie wypełnia się ta obietnica, mamy do czynienia z uosobieniem Madonny. To swojego rodzaju Ewangelia według Madonny – unikatowe w literaturze światowej odkrycie duchowe i estetyczne Maksima Bahdanowicza [Bahdanovič 1992: 515].

Badacze białoruscy fenomen dojrzałości podmiotu lirycznego tłumaczą również biografią M. Bahdanowicza. Matka umarła na gruźlicę, kiedy poeta miał pięć lat, nastąpiło to wkrótce po urodzeniu czwartego dziecka – córki Niny. Po porodzie zmarła także pierwsza macocha, Aleksandra Wołżyna, która urodziła syna Aleksandra (1899 r.). W takiej atmosferze żył poeta i genialnie, prawdziwie ją przekazał [Петрушкевіч 2011: 276–277].

Trudności translatorskie chciałabym pokazać na przykładzie wiersza *Triolet*. Po pierwsze – tylko w kontekście całego cyklu można zruzumieć jego sens. Po drugie – triolet ma trudne do spełnienia wymagania formalne. To strofa 8-wersowa o dwóch rymach i schemacie rymowym: ABaA abAB, w której wers pierwszy powtarza się jako czwarty i siódmy, a drugi jako ósmy. Triolet Bahdanowicza to czterostopowy trochej. Akcent w języku białoruskim jest ruchomy, w języku polskim – paroksytoniczny. Słowa – mimo swojego podobieństwa – nie zawsze tłumaczą się literalnie. Na przykład białoruskiego *чалавечка* można zastąpić polskim *człowieczkiem*, jednak bardziej pasuje *ludzik*, który z kolei nie rymuje się z *jajeczkiem*. Z tego powodu zdecydowałam się na pewną modyfikację semantyczną i zastosowałam rym *jajeczko-dzieciąteczko*, bardziej dokładny niż *jajeczko-człowieczka*. Długie poszukiwania odpowiedniej melodyjności skłoniły mnie do wykorzystania częściowego sylabotonizmu, który w moim zamiarze miał dodać naturalności pośród wyżej wymienionych ograniczeń formalnych. Podobne trudności napotykałam przy tłumaczeniu każdego wiersza.

Каханне і смерць

* * *

Хоць мы былі адны ў той час, –
Я і зірнуць ня сьмеў на Вас,
І тое, што тады зрабілася,
Зьнянацку вышла, але ўраз.

Ня помню, як – я ручку ўзяў,
Ня помню, як – пацалаваў,
Ціхутка пальчыкі цалуючы,
Як да дзіцёнка, ў лад казаў:

“Сарока-варона кашку варыла,
Дзетак карміла;
Гэтаму дала, гэтаму дала,
А гэтаму ня дала:

Ты мал, глуп, табе кашка на палічцы
Ў чарапічцы.
Шух, шух, паляцелі,
На другую ручку селі”.

Miłość i śmierć

* * *

Chociaż byliśmy sami w ten czas,–-
Nie śmiałem spojrzeć na pani blask,
To, co się wtedy wydarzyło,
Znienacka wyszło, z nagła tak.

Nie pamiętam, jak rękę wziąłem,
Nie pamiętam, jak ją musnąłem,
Cichutko paluszki całując,
Jak do dziecka szepnąłem:

„Sroczka kaszkę warzyła,
Swoje dzieci karmiła;
Temu dała, temu dała,
A temu najmniejszemu nic nie dała:

tylko ogonkiem zamieszała
i fruuuuuu poleciała”.

Пачуццю цёмнаму падлеглая

Ты ўжо рассталася з уборам
І ў ложка шлюбнае лягла,
Свой сорам, свой жаноцкі сорам,
Дрыжачая, перамагла.

І ведаеш, табе мучэнні
І нават мо канец жыцця
Сабой накліча пры раджэнні,
Ірвучыся на свет, дзіця.

Ды абяссіленай душою
Ты можаш аднаго жадаць, -
Каб семя бурнае муское
У нетрах цела пахаваць.

Таксама без надзей да спыну
У пропасць чалавек ляціць
І сквапна ўніз, на дно страмніны,
З салодкай жудасцю глядзіць.

Ciemnemu uczuciu podległa

Ty już rozstałaś się ze strojem,
Żeby ślubne dzielić łoże,
Przemogłaś wstydy wszystkie swoje,
Cała drżąca, lecz w pokorze.

Wiesz, że skazujesz się na męki,
Grozi ci życia utrata,
A sprawić może to maleńkie
Dziecię, rwące się do świata.

Lecz w duszę, strachem przepełnioną,
Jedno wdarło się pragnienie,
By całym ciałem, sobą wchłonąć
Burzliwe męskie nasienie.

Tak jak człowiek, gdy się opuści,
Nie wierząc, że coś się zmieni,
Skwapliwie w dół, na dno czeluści
Patrzy w słodkim przerażeniu.

(Tłumaczenie Jana Huszczy)

* * *

Цёмна неба начное, –
Ноч даўно пераважыла дзень.
Ад свячы у пакоі
Ужо бясшумна хістаецца плямамі цень.

Ты дасюль не заснула, –
Напружона у ложку ляжыш,
Быццам сквапна і чула
Узіраешся ў гэтую цёмную ціш.

Вось няпэўна і глуха,
Ледзь раскрыўшы румяны свой рот,
Мне шапнула: "Паслухай", –
І кіўнула, зардзеўшыся, ўніз на жывот.

О, як дрогнула сэрца!
Я паняў. Я каленямі стаў
Прад табой на каберцы
І да гібкага чэрава шчыльна прыпаў.

А яно ўжо дрыжала
У глыбі затаёным жыццём, –
І душа празіяла
Незгасімым ніколі свяшчэнным агнём.

* * *

Ciemne niebo w nocy, –
Noc dawno pokonała dzień.
W pokoju od świecy mocy
Bezgłośnie drży plamami cień.

A ty nie możesz zasnąć wciąż, –
przejęta w łóżku leżysz,
wpatrujesz się uparcie w kąt,
w tę najciemniejszą z wszystkich cisz.

Cała niepewna i milcząca,
Ledwie wydobyłaś głos ze swych ust,
Szepnęłaś mi: „Posłuchaj do końca", –
I pokazałaś, zawstydzona, na brzuch.

O, jak drgnęło na sercu!
Pojąłem. Uklęknąłem
Przed tobą na kobiercu
I do łona szczelnie przylgnąłem.

A ono już drżało
W głębi tajemnym życiem, –
I dusza zajaśniała
Niegasnącym świętym ogniem.

Да вагітнай

Ціха ідзеш ты, у нетрах дзіцёнка хадою калышаш,
Цёмнай і цёплай яму служыш калыскай цяпер.

Дзіцё, што ў коласе зярно,
Пад сэрцам у цябе ўсё спее,
І сэрца цёмнае святлее,
І шчырым робіцца яно.

Ужо нічога ў ім няма,
Адно ёсць – рупнае каханне,
Салодка-соннае бажанне,
Салодка-сонная дума.

Brzemiennej

Cicho idziesz, we wnętrzu dzieciątko chodzeniem kołyszesz,
jesteś dla niego teraz ciemną i ciepłą kołyską.

Dziecko, niczym w kłosie ziarno,
Pod sercem twoim dojrzewa,
I serce blaskiem zalewa,
I szczerość kładzie na dno.

Nie targają nim emocje,
Tylko gorliwe kochanie
Słodko-senne pragnienie,
Słodko-senne dywagacje.

Трыялет

Дзераўлянае яечка
Ты ўдаеш сабой зусім.
Адчыні яго, – а ў ім
Дзераўлянае яечка.
Гэтак сама чалавечка
Затаіўшы ў нетрах, тым
Дзераўлянае яечка
Ты ўдаеш сабой зусім.

* * *

Як хораша, калі дзіцё
Пад сэрцам ціха зварухнецца,
І ўраз па целу разліецца
Яшчэ нязвычнае чуццё.
Душа – ў салодкім палусне,
І кажуць знакі чалавечка:
“Я – пценчык, ты – маё гняздзечка,
Не руш, не руш, не руш мяне!”

Triolet

Drewniane, małe jajeczko
Mi przypominasz na wskroś.
Otworzysz – a tam drobny ktoś,
Drewniane, małe jajeczko.
Tak właśnie dzieciąteczko
We wnętrzu zataiło się.
Drewniane, małe jajeczko
Mi przypominasz na wskroś.

* * *

Jak dobrze, kiedy dziecię
Pod sercem poruszy się cichutko,
po ciele rozlewa się szybciutko
takie niezwykłe uczucie,
Dusza - w słodkim półśnie,
I szepczą znaki człowieczka:
„Ja – pisklę, a ty – gniazdeczko,
Nie ruszaj, nie ruszaj mnie”.

Праклятце вагітнай

К твайму аконцу каля ганка
Падходзіць варажыць цыганка
Ў лахмане зрэбным і нячыстым
Са срэбрам ззяючым маністам.
І, чуючы твае адмовы,
Шыпіць праклятця злыя словы
З паглядам у пагляд упёртым:
“Каб ты дзіцё радзіла мёртвым!”
І, засмяяўшыся нясмела,
Ты задрыжэла і збляднела.

* * *

З енкам дзіцё ты раджаеш,
Болю не змогшы сцярпець,
Стогнамі сэрца ўражаеш...
Што я магу зразумець?

Шчыра мяне ты любіла,
Шчыра цябе я кахаў,
Але давёў да магілы,
Сам на мучэнні аддаў.

Przekleństwo brzemiennej

Do twojego okna obok ganku
Podchodzi wróżyć Cyganka
W łachmanie zgrzebłym i śmierdzącym,
Z blaskiem srebra mamiącym.
A słysząc twoje odmowy,
Szepcze przekleństwa złymi słowy
Z wzrokiem utkwionym zacięcie:
„Żebyś urodziła martwe dziecię!”
Ty zaś, zaśmiejawszy się nieśmiało,
Zadrżałaś i wnet zbladłaś cała.

* * *

Z jękiem dziecię rodzisz,
Nie mogąc bólu wytrzymać,
Stękami serce trwożysz...
Jak to rozumieć mam?

Szczerze mnie lubiłaś,
Szczerze ciebie kochałem,
Lecz doprowadziłem do śmierci,
Sam na męki oddałem.

* * *

Без сіл, уся ў пату, як белы снег,
блядна,
На злітаю крывёй і змятай караваці
Ляжыць цічаслівая і жалкая яна,
І аб адным у ёй цяпер дума: "Я – маці".

Яна збалела ўся. Ёй, можа, ўжо не
жыць.
І ўсё ж ткі радасцю бязмежнай ззяюць
вочы,
А на яе тугіх грудзях ужо ляжыць
Чырвоны, цёпленькі і неяк смешна
смокча.

* * *

Пасля радзін ты ўсё штодня марнееш:
Асунулася цела, зблякла твар,
Засмяглі і растрэскаліся губы;
На іх парой няпэўна прабяжыць
Пасмех – і знікне, жалкі і пужлівы;
Як сцені, сіняватыя кругі
Навокала вачэй ляглі, а вочы
Як быццам просяць злітавацца ўсіх.

Так крохкая, пушыстая багатка
Пад ветрам аблятае, каб магло
Яе насенне узрасці і кветнуць,
І толькі кволае сцябло пасля
Гаворыць аб жыцці, дзіцям адданым.

* * *

Тым вянкі суворай славы,
Што за край свой у баю
Жрэбі вынулі крывавы,
Напаткалі смерць сваю.

Ды слаўней вагітнай доля, –
Ў сэрцы маючы любоў,
За дзіцё зазнаці болі,
За дзіцё праліці кроў.

Слава тым, хто сілу мае
Смерць, не дрогнуўшы, спаткаць,
Хто ў мучэннях памірае,
Каб жыццё дзіцёнку даць!

* * *

Leży cała w potach, jak biały śnieg blada,
Na zmiętej pościeli, co krwią
przesiąknięta,
Tak bardzo szczęśliwa. I, choć z sił opada,
O tym, że jest matką, jedynie pamięta.

Straszliwie zbolała, że może nie przeżyć,
Lecz radość bezmierna w jej oczach
błyszczących,
Bo przy prężnej piersi niespokojnie leży
Ktoś ciepły, różowy, zabawnie smokczący.

(Tłumaczenie Jana Huszczy)

* * *

Poród już minął, marniejesz co dzień:
Osłabło ciało oraz zbladła twarz,
Zaschły i popękały twe usta;
Na nich czasem niepewnie zagości
Uśmiech – i zniknie, marny i strachliwy;
Jak cienie sine, ciemne kręgi
Dookoła oczu legły, a oczy
Jak gdyby prosiły o litość wszystkich.

Tak kruchy, puszysty dmuchawiec
Unosi się na wietrze, by mogło
Jego nasienie urosnąć i zakwitnąć,
I tylko słaba łodyga zostaje
I mówi o życiu, dzieciom oddanym.

* * *

Dla nich sławy wieńce surowe,
Co za kraj swój w boju
Losy wyciągnęli krwawe,
ponieśli śmierć na bitwy polu.

Sławniejsza wszak brzemiennej dola, –
W sercu swym kochając na wskroś,
Za dziecko zaznała bólu,
Za dziecko przelała krew.

Chwała tym, kto wybiera
Bez wahania śmierci cios,
Kto w męczarniach umiera,
By dziecku dać życia los!

* * *

Белы крыж, пліта, пад ёй – магіла;
Мілым кветам рожа зацвіла.
Тут калісьці ты, мой друг, спачыла, –
Спарадзіла ў муках і лягла.

Ўсё мінулася – і боль, і гора, –
Ўсё кудысь далёка адышло;
Але строгі надпіс: "Disce mori"
Нагадае, што з табой было.

* * *

Biały krzyż, płyta, pod nią – mogiła;
Miłym kwiatem róża zakwitła.
Tu kiedyś, przyjaciółko, spoczęłaś,-
Narodziłaś w mękach i poległaś.

Wszystko minęło – i ból, i mrok, –
Wszystko dokądś daleko odeszło;
Ale srogi napis: „Disce mori"
Przypomina naszą wspólną przeszłość.

References

Bahdanowicz Maksim. 1973. *Poezje wybrane*. Łódź.

Bahdanovič Maksim. 1992. *Poŭny zbor tvoraŭ*. T. I. Minsk [Багдановіч Максім. 1992. *Поўны збор твораў*. Т. І. Мінск].

Petruškevič Ala. 2011. *Kachanne i smerc*. U: Maksim Bahdanovič: Ènciklapedyja. Rèd. Mikoła Trus. Minsk [Петрушкевіч Ала. 2011. *Каханне і смерць*. У: *Максім Багдановіч: Энцыклапедыя*. Рэд. Мікола Трус. Мінск].

Skibińska Zofia. 1994. *Poezja Maksima Bahdanowicza w polskich przekładach* (49–54). W: *W kręgu kultury białoruskiej*. Olsztyn.

Data przesłania artykułu: 10.05.2024
Data akceptacji artykułu: 30.08.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Magdalena Lajewska – Polska, Uniwersytet Adama Mickiewicza w Poznaniu, mgr; zainetresowania: glottodydaktyka, związki literatury polskiej i białoruskiej, współczesna poezja polska i białoruska.

Wybrane publikacje:

1. Лаеўская Магдалена. 2023. *Дабраславёная нерухомасць рэчаў*. „Літаратурная Беларусь" № 9 (205).
2. Лаеўская Магдалена. 2023. *Шуфляда. Вершы.* „Дзеяслоў" № 1 (122).

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Maryla Chaustowicz, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.20

Maryla Chaustowicz / Марыля Хаўстовіч

Uniwersytet Warszawski / University of Warsaw
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-3094-1365
e-mail: m.khaustovich2@uw.edu.pl

Старабеларуская *Аповесць пра Трох Каралёў*

Old Belarusian Tale of Three Kings
Starobiałoruska Opowieść o Trzech Królach

Узнікненне ў 1364 г. апакрыфічнай *Аповесці пра Трох Каралёў* (*Liber de gestis ac trina beatissimorum trium regum translatione*) звязваюць з угодкамі перанясення астанкаў трох біблейскіх каралёў у Кёльн у 1164 г. Твор, напісаны нямецкім манахам з ордэну кармелітаў Ёаганам з Гільдэсгайма на лацінскай мове, цешыўся вялікай папулярнасцю. У XV ст. з'явіліся пераклады твора на еўрапейскія мовы, у тым ліку і на старабеларускую.

Поўнае апісанне найстарэйшай вядомай версіі старабеларускага перакладу зрабіў у 1897 г. Яўхім Карскі [гл.: Карский 1897], які таксама падае звесткі пра два рукапісы Маскоўскай Сінадальнай бібліятэкі. Навуковец сцвярджае, што рукапісы Сінадальнай бібліятэкі маюць шмат агульнага між сабой, але значна адрозніваюцца ад рукапісу Імператарскай бібліятэкі: іх мова адзначаецца царкоўнаславянскім ўплывам.

У 1903 г. *Аповесць…* была надрукаваная Уладзімірам Пратцам паводле рукапісу Імператарскай публічнай бібліятэкі Q. 1. № 391, які па палеаграфічных прыкметах належыць да XV ст.[1]. Твор знаходзіцца на аркушах 38–97 [гл.: Перетц 1903]. У адным з *Аповесцю…* манускрыпце маюцца яшчэ дзве перакладныя аповесці: *Пакуты Хрыстовы* (да 38 арк.) і *Жыціе Аляксея, чалавека Божага* (пасля 97 арк.). Дадзены рукапіс быў ахарактарызаваны У. Пратцам як «помникъ стараго бѣлорусскаго нарѣчія».

[1] Рукапіс Q. 1. № 391 колісь быў датаваны, аднак пазней (?) месца з годам перастварэння (?) было наўмысна выскабленае.

Заўважым яшчэ, што ў Імператарскую публічную бібліятэку (сёння: Расейская нацыянальная бібліятэка ў Санкт-Пецярбурзе) рукапіс трапіў з Бібліятэкі Залускіх.

У савецкую эпоху беларускія навукоўцы не часта звярталіся да *Аповесці пра Трох Каралёў*. Яна фактычна застаецца недаследаваная; пра яе амаль не згадваецца ў мовазнаўчых працах. Прапануем невялікі фрагмент твора на мове арыгінала і ў перакладзе на сучасную беларускую мову. Цалкам твор будзе неўзабаве апублікаваны асобным выданнем.

Аповесць пра Трох Каралёў

(фрагмент)

Дале^{и} коли^{ж} та^{к} тело мспера моурина третего короля з острова было пренесено. да ины^{м} тело^{м} двоу^{х} короле^{в}. было прилоучоно. тогды така» вонѧ. и та^{к} велїкїй запахъ и смакъ ѿ нихъ вышо^{ѧ}. иже люди здалека смачнего запах^{ѵ} были напо^{ѧ}нены шхложены и оуздоровены. тогды велебна гелена ты^{х} тре^{х} короле тела. оу местечко богатше болше и шлехетнейше. с҃на своего место которе заложи^{ѧ} бы^{ѧ} оу костѧнтинополи^{м}. котора есть матка грецко з҃мли. и с силною радостїю и чтїю. и съ иными розманты-ми релїквиѧми. которе та^{м} индїе выпросила и собрала была, то ѵ҃се оу тоё место пренесла. да што все^{х} тамъ того дела собраны^{х} и созваны^{х} с петьёмъ и с хвалами. какъ прислоухало. велми почливе соу^{т} прияты. а тамото оу ц҃ркви с҃тои софеи почесне соу^{т} положены. и што всехъ честованы. да маетъ быти ведомо иже ц҃ркве с҃вты софеи оу констѧнтинополи^{м}. надъ вси ц҃рквы на свете есть велика велми и широка. и такъ иже соу^{т} соу^{ѧ} велїкїи корабль вси пароусы або жакгле рос-тѧгноувши и по^{ѧ}нявши оу той ц҃ркви можетъ красне се оу неи шбрачати и по неи кроужити. да тоую ц҃ркве зовоутъ тамо ц҃ркве с҃вты зофеи. а то по грецки говорѧтъ вербикгена ка^{к} ис слова нароженыи. которою ц҃ркве костѧнсти^{н} заложи^{ѧ}. а ее сто^{ѧ}пи мармоурове вельми велики. з божей помоци и з дитѧтко^{м} самъ по^{ѧ}нима^{ѧ}. и иными розманты-ми шкрасами шкраси^{ѧ}. да оу тои ц҃ркви есть соукна б҃жїа нешита». и гвоздъ б҃жїи. и часть столпа к которомоу їсоу^{с} былъ привѧза^{н} и бичова^{н}. и многе почесне ине релквїеве. ѡ которыхъ грекове не^{ѧ}баютъ. да часовъ лодвика короля. францьскего. короуна тернова» оу ней была зостала. да тогды тоуркове и сараценове констѧнтинополимъ. и цесарьство грецке были велми сказили. тогды цесарь помоци wдъ с҃втго лодивика проси^{ѧ} которыи многе речи страчоне и скажоне з божьею помоцью направи^{ѧ} и wдьврати^{ѧ} тогды за его стравоу цесарь с҃втмоу лодивикоу тоую комороу да^{ѧ}. и записа^{ѧ}. которая з грецки^{м} велїки^{м} жалованїимъ и з сранцкою радостїю. заоутра по с҃втомъ лаврине оу корабль была проважона и до мѣста

париского пренесена к к^{о}торей се грекове ещо надеваю^{т} штобы се к ни^{м} навратила. а^{ж} до нинеишого д҃нѧ те^{ж} оу тои ц҃ркви с҃втое софеи стои^{т}. великїи сто^{л}пъ каменый мармоуровыи. да на не^{м} стои^{т} ѡбразъ цесарскїй на кони тонкїй. а чисте позолочоныи да держи^{т} оу левеи роуце кроугло ѧблоко. ѡбычаемъ цесарскимъ да проти^{в} оустока сердиты^{м} сараценомъ как бы грозѧ правицею. да возле как бы по^{д} ты^{м} сто^{л}по^{м}. велебнаѧ гелена ты^{х} трехъ короле^{в} тела. оу гробе^{х} розмаите ѡкрашоныхъ почесне а ѡсобне положила да коли ты^{х} тре^{х} короле тела оу томже мѣсте были положены тогды з далеки^{х} сторо^{н} и з҃мль ѡто все^{х} людей набожне и п҃окрне были навѣшщаны. и на до^{л}ге часы честованы да къ ихь реликвїамъ приходѧщи^{м} бо^{г} дары своего мл^{с}рдїа. розмаите выдава^{л}. да чере^{з} ни^{х} и многе девы чини^{л}. иже всехъ которые оу вере и в набоженстве помоци ихъ пожадали ѿ которонь коли оутисненїа. на з҃мли албо на мори были оуздержаны. чере^{з} ихъ заслоуги бо^{г} оусе^{х} выбави^{л} да по смерти славного костѧнтина и велебное гелены. коли їоулїаноу^{с} апостота албо ѿщепенець королева^{л}. тогды болванство и поганство. розмноживалосе и тѧжкое преследованїе мечове на хрестїаны и м҃чнки. на долге часы какъ оу моука^{х} розмаиты^{х}. м҃чениковъ. и в ыны^{х} книга^{х} сполней наидеть. але коли тое преследованїе проти^{в} м҃чнковъ престовало. тогды ѡпѧ^{т} на ве^{с} светъ иное з нову почало быти преследованїе. да кажоуть иже бо^{л}ше и твердеише, нижли первое преследованїе мечове ижь то было преслѧдонїе кацерьске. и ѡдъщепенце. такъ што вера хрестїанска. какъ пшеница тереблена. што бы ни ѡдинъ поро^{х} блоудоу в не^{и} пото^{м} не зоста^{л}. да оу то^{м} оутисненїю грекове хотѧ держали многе с҃вте и выборне мистры и римске бискоупы из греко^{в} нарожене. да ве^{ж}ды ѿ ц҃ркви римскои в челонцехъ вѣры ѿстоупили. какъ нижей ѡ то^{м} мало оуслышите. да собе ѡпришного патрїархоу оучинили и выбрали. коли^{ж} ѿ того часоу ве вси^{х} чересъ оуси речи какъ мы ѿцю папе аж до нинеишого д҃нѧ томоу патрїарсе послоушни были. да ꙋ то^{м} замешанїи тела и релїквїе ты^{х} тре^{х} короле^{в} безъ оусѧкое ч҃ти и безъ всеи печали та^{м} лежали тогды бо^{г} грецкоую з҃млю и арменскоую выда^{л} выда^{л} в роуце сараценo^{м} и парсїано^{м}. которые з҃мле ве^{л}ми и которе манрициоу^{с} первыи цесарь римскїи и грецкїи и медїѡланскїи ѡправи^{л}. тогды ка^{к} кажоу^{т}. с того^{ж} радою ты^{х} тре^{х} короле^{в} тела и съ иными релїквїами по маломъ часе были пренесены да чтетсе иже маноуелъ грецкїй цесарь. еоусторгїа моужа законного и моудрого рожае^{м} грека оу посо^{л}стве до медиѡла^{на} посла^{л}. да иже ростропныи бы^{л} да оу цесарѧ преможо^{н} и его въ архиепископа медиѡланского выбрали. да с побоуженьи^{м} ихъ прозбь тыи тела тре^{х} короле^{в} ѡ которы^{х} се никто тогды не печалова^{л} тотъ архїепископ^{п} ѿ цесарѧ выпроси^{л} да с собою до медолана почесне пренеслъ. да оу ц҃ркви опришнеи котора нине есть братеи казнодеевъ с петьемъ и с хвалами со вси^{м} людо^{м} почесне положи^{л} та^{м} те^{х} на ихъ

заслоуги на до^лге часы ка^к оу первы^х местца и многїе дивы и чоуда чини^л. да оу ^лѣтех бжьего нароженїа тисѧцю сто^м шестїю деся^т и четырми место медаланске. фредирика первого цесара. не слоухало. а емоу какъ бы ѿповѣдало. которе цесарь сказити оумысли^л. и шблеглъ. его тогды лѣпшїи и шлехетнеишїи и болшїи оу месте панове. оузвшесѧ оу мале ты^х тре^х королевъ тела. велми таемно похоронили. да коли цесарь с помоцью реино^лда архїепископа коленско^г палаць а шо^н з веже которего зе все^х ненавиде^л взѧ^л и ѵшо^л и во свои роуце wдержа^л которыи па^н аже проси^л штобы его таемно до рейно^лда архиепископа. препоустили. коли^ж безпече^н и таемно до архиепископа пришо^л тогды его проси^л коли бы емоу лаского оу цесара моглъ албо хотелъ выпросити. тогды бы емѵ тела тро^х короле^в ис ыными релїквїами. хоте^л выдати. а схронене оуказати. да коли реино^лдоу^с архиепископу^п тое ѡ што проси^л оучини^л и выправи^л тогды емоу тые релїквїе да^л и оуказа^л. которе оузвши чере^з свое вернеише и таемнеише послы до колна посла^л да то пото^м цесареви сказа^л да тогды перво ты^х релїквїи оу цесара проси^л и выпроси^л. да wдложи^л бы^л тое перво до цесара иже не надеїа^л абы таке почесне релїквїе оу цесара моглъ выпросити тогды архиепископу^п. ринолъдоу^с ты^х тре^х королевъ тела. авне и почесне. ис ыными реликвїами. до ко^лна пренеслъ. да што всего люда оу петью и оу хваленїю. принате оу цркви свтого петра тамото ихъ по^чливе положи^л. чере^з которе бо^г велики дивы и чоуда тамото а^ж до нинеишого дня чини^т, да ѿ кнжатъ и пано^в и ѿ розмаиты^х людей соу^т оу велїкой чти. да з далекихъ велми змль и сторонъ. и з великими честѧми люди ихъ ишчоу^т и навѣщаютъ. и чьтетьсѧ ѵ некоторыхъ книга^х. иже пото^м ты^х тре^х королевъ. тела ис констѧтинополи^м. до медолана зо встѵкоу на запа^л были пренесены иже тогды оусехъ кацеревъ. и ѿщепеньце^в блоуды. и жебраки которыми люмбардїа тоусїа ї асполїа. и всѧ была зарожена чере^з wдволанїе и выкладанїе тре^х даро^в которе тыи три короли с^ноу офероали зосромочены были. и преможены ис коренїа оу нивешто wбернены. иже оу золоте ладане мирре чере^з ты^х трехъ даро^в. рожаи в wдномъ кристоусе божьскаѧ велможность. и королевскаѧ сила и чл̑вченскаѧ смертелность знаменоуетьсе иже лада^н знаменѵетсѧ коу слоужбе бжен. золота к дани а мирра коу погребенїю залежи^т оумерлы^х всехъ ты^х речїи стаѧ вѣра х^ва оферовати непреставаеть коли оу вѣрного б^га правого короля. и правого чл̑вка вѣроуеть. в оферованїи ладана изганбенъ есть аррианоу^с иже wдномоу бо^гу ѿщю слоужбоу ладоно^м оферовати вызнава^л. в оферованїю моурры поганбенъ есть манїхеюсъ который х^са за наше збанїе верне оумерлого не вѣрова^л. да оу золоте посполоу wба два соу^т поганбены. иже манихею^с ис племена давыдова подлоу^г тела кристоуса короля нароженого не вѣрова^л. арїаноусъ иже единородному с̑ноу бо^гу прироженоую слоужбоу. променити конаеть. про

то^{ж} непознаеть королѧ, ѿ которого бы за гре^{х} недовѣрьства скажо^{н} бы^{л}. иже ѡд одного велможность б҃жства. да ѡд дроугого вѣрность и истность тела запрена есть. оу ты^{х} те^{ж} даре^{х} нескорїе бы^{л} поганбе^{н}. которыи х^{с}а на двѣ парсоуне дѣлити хоте видить иже королеве не иномꙋ бо^{г}у да инномоу ч҃лвкоу тые дары набо^{ж}не оферовали. про то^{ж} не маеть быти розделе^{н} оу даре^{х}. того делѧ ѡди^{н} и истине^{н} бо^{г} и ч҃лвкъ. маеть вызнаванъ быти. далеи те^{ж} оу какеи и в какъ велїкой чти три короли которыи г҃^{с}ноу дары дали, во всехъ з҃млѧхъ и королевствахъ были. и такъ ѡто всехъ королевъ и к҃нжатъ и пано^{в}. и ѡто все^{х} людей честованы были.

Пераклад

Калі астанкі мурына Яспера[2], трэцяга караля, з вострава былі прынесены і далучаны да астанкаў іншых двух каралёў, дык такая духмянасць ды такі моцны пах і водар ад іх пайшоў, што людзей здалёк гэты цудоўны пах атачаў, ахалоджваў і лячыў. І вось вялебная Гэлена астанкі гэтых трох каралёў у места больш багатае і шляхетнае (горад свайго сына – Канстанцінопаль, які з'яўляецца маці зямлі грэцкае) з вялікай радасцю і пашанай, з іншымі рознымі рэліквіямі, якія ў Індыі выпрасіла і сабрала, – усё ў той горад прынесла. Усе, сабраныя і скліканыя туды дзеля гэтае справы, з песнямі і з хваламі, як належыць, вельмі пачціва прынялі іх. І там, у царкве святое Сафіі, яны з гонарам былі пакладзеныя, і ўсе іх ушаноўвалі.

Трэба ведаць, што царква святое Сафіі ў Канстанцінопалі – большая за ўсе цэрквы на свеце. Яна такая, што вялікі карабель, усе ветразі расцягнуўшы і падняўшы, у той царкве мог бы паварочвацца і па ёй кружляць. Вось гэтую царкву завуць там царквою святое Сафіі, а па-грэцку гавораць "вербігена" – г. зн. "са слова народжаная".

Царкву заклаў Канстанцін; ейныя вельмі вялікія мармуровыя слупы з дапамогай Бога і Дзіцятка ён сам падымаў; таксама іншымі рознымі ўпрыгожаннямі аздобіў. У царкве ёсць боскае няшытае адзенне, і цвік боскі, і частка слупа, да якога Ісус быў прыбіты і бічаваны, ды шмат якія яшчэ шанаваныя рэліквіі, пра якія грэкі не дбаюць. Да часоў Людовіка, караля французскага, цярновая карона ў той царкве захоўвалася. А калі туркі і сарацыны атакавалі Канстанцінопаль і грэцкае цэсарства, цэсар прасіў дапамогі ў святога Людовіка, які многія рэчы, страчаныя і папсаваныя, з божай дапамогай направіў і вярнуў. За гэты чын цэсар святому Людовіку тую карону аддаў і запісаў. Да вялікага жалю грэкаў і радасці франкаў, на наступны дзень пасля святога

[2] Відаць, Каспера, хоць мурынам з Эфіопіі, паводле легенды, быў Балтазар.

Лаўрына карона была занесеная на карабель і ў горад Парыж дастаўленая. Грэкі яшчэ і сёння маюць надзею, што яна да іх вернецца.

У той царкве святой Сафіі стаіць вялікі слуп, каменны, мармуровы, а на ім – пакрытая чыстым золатам статуя цэсара на кані. Цэсарскім звычаем ён трымае ў левай руцэ дзяржаву[3], а правай рукой нібы пагражае на Усход лютым сарацынам. Пад тым слупом вялебная Гэлена астанкі трох каралёў у шыкоўна ўпрыгожаных трунах з гонарам і пасобку паклала. Калі астанкі трох каралёў у тым месцы былі пакладзены, дык з далёкіх краёў і зямель пабожныя людзі іх наведвалі і доўгі час ушаноўвалі.

Тым, хто прыходзіў да гэтых рэліквій, Бог даваў разнастайныя дары сваёй міласэрнасці ды многія цуды чыніў. Праз заслугі трох каралёў Бог выбаўляў усіх, хто ў веры і ў набожнасці дапамогі іхняе шукаў, ад любой бяды на зямлі або на моры.

Пасля смерці слаўнага Канстанціна і вялебнае Гэлены, калі каралеваў Юліян адступнік[4], або адшчапенец, ідалапаклонства і паганства пачало пашырацца; доўгі час быў цяжкі збройны пераслед хрысціянаў і пакутнікаў. Больш пра гэта можна прачытаць у жыццяпісах пакутнікаў і ў іншых кнігах. Калі той збройны пераслед пакутнікаў спыніўся, дык зноў на ўсім свеце пачаўся іншы пераслед, ды, кажуць, што быў ён больш люты, чым першы, а быў гэта пераслед ерэтыкоў і адшчапенцаў.

Веру хрысціянскую, як пшаніцу, малацілі, каб аніякага пылу аблуды ў ёй не засталося. У тым наступе грэкі, хоць мелі шматлікіх святых і дасканалых магістраў ды рымскіх, грэцкага паходжання біскупаў, аднак ад правілаў веры рымскай царквы адступіліся, як ніжэй трошкі пра гэта вы пачуеце, і сабе асобнага патрыярха зрабілі і выбралі. З таго часу аж да сёння яны ва ўсім, як мы Папу, таму патрыярху паслухмяныя. І вось у тым замяшанні астанкі і рэліквіі трох каралёў без усялякае пашаны і без апекі ляжалі, а Бог грэцкую і армянскую зямлю аддаў у рукі сарацынам і персіянам. Пазней гэтыя землі вызваліў Маўрыкій, першы цэсар рымскі, грэцкі і міланскі. Як кажуць, паводле яго загаду астанкі трох каралёў разам з іншымі рэліквіямі перанеслі.

Можна прачытаць, што Мануэль, грэцкі цэсар, Еўсторгія[5], мужа мудрага, родам грэка, з пасольствам у Мілан паслаў, бо ён кемлівы быў, і яго міланскім архібіскупам абралі. Прыслухаўшыся да просьбаў, ён

---

[3] У арыгінале – *кроугло яблоко*. Так (лац. globus cruciger) у сярэднявеччы называўся адзін з сімвалаў каралеўскай улады.

[4] Гаворка пра Флавія Клаўдыя Юльяна (Юльяна Адступніка, 331–363) з дынастыі Канстанціна, апошняга паганскага рымскага імператара.

[5] Гаворка пра Эўсторгія (памёр блізу 355 г.), біскупа Мілана. З ягоным імем звязаная легенда пра перанос астанкаў трох каралёў з Канстанцінопаля ў Мілан.

астанкі трох каралёў (пра якія ніхто тады не дбаў) у цэсара выпрасіў ды з сабою ў Мілан з гонарам перанёс і ў царкве асобнай, якая сёння належыць дамініканцам, з песнямі і хваламі, у прысутнасці вялікае колькасці людзей пачэсна паклаў.

Доўгі час праз іхнія заслугі, як і ў ранейшых месцах, многія дзівосы і цуды там чыніліся. Але ў 1164 годзе ад Божага нараджэння горад Мілан не падпарадкаваўся Фрыдрыху[6], першаму цэсару, дык цэсар узяў яго ў аблогу і задумаў знішчыць. Дык лепшыя і самыя шляхетныя ў горадзе паны, сабраўшыся разам, астанкі трох каралёў таемна перанеслі і пахавалі. А калі цэсар з дапамогай Райнальда[7], архібіскупа кёльнскага, захапіў палац Ашона з Вежаў, якога ненавідзеў, дык той пан прасіў, каб яго таемна да архібіскупа Райнольда прапусцілі. І калі ён бяспечна і таемна да архібіскупа прыйшоў, то прасіў, каб яму ласку ў цэсара той выпрасіў, дык ён астанкі трох каралёў з іншымі рэліквіямі мог бы выдаць і месца пахавання паказаць. Калі архіепіскап Райнальд гэтага дамогся, то яму тыя рэліквіі былі паказаныя; забраўшы іх, ён з дапамогаю сваіх надзейных людзей у Кёльн адправіў. І толькі пасля тыя рэліквіі ў цэсара пачаў прасіць і выпрасіў, а не спадзяваўся, што такія пачэсныя рэліквіі ад цэсара мог атрымаць.

Тады архіепіскап Райнальд астанкі трох каралёў адкрыта і пачэсна з іншымі рэліквіямі ў Кёльн перанёс, і там іх пачціва паклаў у царкве святога Пятра, дзе яны прынятыя былі ўсім людам са спевамі і хвалою.

Праз іх Бог вялікія дзівы і цуды там аж да сённяшняга дня чыніць, князі і паны і розныя людзі моцна іх шануюць, з вельмі далёкіх зямель і краёў людзі іх наведваюць і сваю пашану ім аддаюць.

У некаторых кнігах можна прачытаць, што пасля таго, як астанкі трох каралёў былі перанесеныя з Канстанцінопаля ў Мілан, з Усходу на Захад, дык Ламбардыя і Таскана былі заражаныя аблудаю ерэтыкоў і адшчапенцаў, але праз тлумачэнне дароў, якія тры каралі Богу ахвяравалі, усе яны былі прысаромленыя і пераможаныя.

У золаце, ладане, міры, тых трох дарах Хрысту, выяўляецца і Боская вяльможнасць, і каралеўская моц, і чалавечая смяротнасць, бо ладан – гэта сімвал служэння Богу, золата – даніны, а міра – пахаванняў памерлых. Усе гэтыя рэчы святая вера Хрыстовая прызнаваць не перастае, калі ў адзінага і праўдзівага бога, караля і чалавека верыць.

---

[6] Гаворка пра Фрыдрыха Барбароса (1122–1190), імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі (1155–1190).

[7] Гаворка пра Райнальда фон Даселя (1124–1167), архібіскупа Кёльна (з 1159) і архіканцлера Італіі.

Ахвяраваннем ладана пераможаны Арыянус[8], што аднаму Богу-бацьку службу з ладанам правіць прызнае. Ахвяраваннем міры пераможаны Маніхеюс[9], які не верыў, што Хрыстос за нашае збаўленне памёр. А ў золаце абодва яны пераможаныя, бо Маніхеюс не верыў, што Хрыстос – кароль з роду Давіда, а Арынянус, што Ён – адзінародны сын Божы; так грэх недавярства быў пераможаны, бо адзін вяльможнасць Боскую, а другі сапраўднасць цела адмаўляў. Гэтымі таксама дарамі быў пераможаны Нясторый[10], які бачыў у Хрысце дзве асобы, але каралі не асобна Богу і не асобна чалавеку тыя дары пабожна ахвяравалі, дык адзіны і сапраўдны Бог і чалавек мае быць вызнаваны.

Далей мы таксама раскажам, у якой пашане тры каралі, якія Богу прынеслі дары, ва ўсіх землях і каралеўствах былі, і як ад усіх каралёў, князёў, паноў і ад усіх людзей шанаваныя былі.

Reference

Karskij Evfimij. 1897. *Zapadnorusskij sbornik XV-go veka, prinadležašij Imperatorskoj Publičnoj biblioteke. Q. 1. № 391. Paleografičeskie osobennosti, sostav i âzyk rukopisi*. S.-Peterburg [Карский Евфимий. 1897. *Западнорусский сборник XV-го века, принадлежащий Императорской Публичной библиотеке. Q. 1. № 391. Палеографические особенности, состав и язык рукописи*. С.-Петербург].

Peretc Vladimir. 1903. *Povest' o trëh korolâh-volhvah v zapadno-russkom spiske XV veka*. S.-Peterburg [Перетц Владимир. 1903. *Повесть о трёх королях-волхвах в западно-русском списке XV века*. С.-Петербург].

Data przesłania artykułu: 17.08.2024
Data akceptacji artykułu: 12.09.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Maryla Chaustowicz / Марыля Хаўстовіч – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; mgr, wykładowca; specjalność naukowa: historia języka białoruskiego; zainteresowania naukowe: język białoruski w XVI–XVIII w.

Adres: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa, Polska.

Wybrane publikacje (2023–2024):

1. Марыля Хаўстовіч. 2023. *Беларускамоўныя казанні са зборaў Мяніцкіх*. „Acta Albaruthenica" t. 23: 337–361.

[8] Гаворка пра Арыя (блізу 256–336), раннехрысціянскага святара, заснавальніка арыянства.

[9] Гаворка пра Мані (216–273), персідскага святара, заснавальніка маніхейства.

[10] Гаворка пра Нясторыя (384–451), манаха і тэолага з Сірыі.

2. Марыля Хаўстовіч. 2024. *Ці быў Вінцэнт Мяніцкі аўтарам беларускамоўных казанняў?* (121–150). У: Мікола Хаўстовіч. *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX стагоддзя*. Том дзясяты. Warszawa.
3. Марыля Хаўстовіч. 2024. *Ліст Адама Плуга да Фелікса Пяткевіча*, перакл. з пол. (203–278). У: Мікола Хаўстовіч. *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX стагоддзя*. Том дзясяты. Warszawa.

ACTA ALBARUTHENICA 24: 2024
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Siamion Saladounikau, 2024
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-
-Bez utworów zależnych 3.0 PL (CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.24.21

Siamion Saladounikau / Сямён Саладоўнікаў

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы /
Janka Kupala State University of Hrodna, Belarus
ORCID: https://orcid.org/0009-0007-3182-5776
e-mail: irbis1863@gmail.com

Бабруйскі сшытак

The note of Babrujsk
Zeszyt bobrujski

Важнае месца ў беларускіх даследаваннях займае фальклярыстыка. Нягледзячы на неспрыяльныя для навуковай дзейнасці абставіны, цягам апошніх гадоў унутры краіны з'явілася вялікая колькасць навуковых прац, прысвечаных вывучэнню розных жанраў беларускай вуснай народнай творчасці. Сёння іх каштоўнасць павялічваецца, бо колькасць носьбітаў фальклору ў апошнія гады імкліва скарачаецца: вёска – спрадвечнае асяроддзе бытавання фальклору – занепадае, моладзь у пошуках дабрабыту перабіраецца ў горад, а дзеці былых вяскоўцаў, станаўленне якіх адбываецца ў пераважна расейскамоўным культурным полі гарадоў, разам з беларускай мовай страчваюць і сувязь з вуснай традыцыяй сваіх продкаў. Асабліва неабароненымі ў гэткіх умовах становяцца замовы, захаванне і перадача якіх наступным пакаленням апрача раней названых прычын ускладняецца яшчэ і нежаданнем саміх носьбітаў адкрываць іх для "непадрыхтаваных" асоб, што звязана з сакральным зместам, які ўкладаецца ў замовы [Барташэвіч (уклад.) 1992: 6].

У нашыя рукі трапіў сшытак, у якім змешчана пэўная колькасць перапісаных ад рукі напачатку 1980-х гг. замоваў, якія паходзяць з ваколіцаў Бабруйска.

Гісторыя сшытка наступная. На ўсходняй ускраіне Бабруйска, якую і цяпер насяляюць пераважна перасяленцы з навакольных вёсак, жыла Вера Базарэўская, якая ўмела "загаворваць" хваробы. Са слоў самой В. Базарэўскай, навучылася гэтаму яна ў роднай вёсцы ад старэйшай кабеты, якая разам з магічнымі ведамі перадала ёй сшытак з запіса-

нымі беларускімі замовамі і малітвамі на царкоўнаславянскай мове. Яго змест мог назаўжды быць страчаным, калі б не адна акалічнасць: з асаблівай заўзятасцю ў сілу замоўнага слова верылі ў сям'і Лаўрыкаў, што стала прычынай сяброўства з В. Базарэўскай, дзякуючы якому з'явілася магчымасць перапісаць сшытак для ўласных патрэб і такім чынам захаваць яго змест да нашага часу. Каштоўнасць сшытка для навукі бясспрэчная: ён уяўляе сабой зборнік замоваў на ўсе выпадкі жыцця, у якіх спалучыліся як народныя традыцыі, так і еўрапейскія, якія траплялі на беларускія землі з рукапіснымі "аракуламі" або "саламонамі" [Барташэвіч (уклад.) 1992: 7–8]. Уплыў еўрапейскай замоўнай традыцыі на беларускую апісала Таццяна Валодзіна ў сваёй працы *Нямецкія лекавыя замовы*. Асаблівая паэтычнасць замоваў з сшытка, язычніцкая сімволіка і адметная мова – усё гэта не магло не прыцягнуць нашай увагі.

Замовы ў сшытку занатаваныя з непаслядоўнай перадачай акання і якання, з выкарыстаннем літары "в" для гука [ў], з іншымі асаблівасцямі напісання, пунктуацыі і падзелу на радкі:

Первым разом добрым часам
Господу богу помолюся святой прочистой
Поклонюся, зори, зорницы, божие помощницы,
Приступите Люде ночников
Говорить помогите ночники-сошники
Чтоб в жару и в попели
Ноги попекли в дёгти потопилися
Де днявали там и начуйте а Люде
Сну не псуйте, адни люди, адна
Земля адна вада месечка
Сонейка и неба а вы люди
Живите як треба.

Да ўсталявання савецкай улады на Бабруйшчыне не існавала беларускіх школ. Чалавек, які першы запісаў са слоў носьбіта замовы, відавочна, не быў знаёмы з правіламі беларускага правапісу, таму перадаў сярэднебеларускую гаворку так, як гэта мог зрабіць той, хто авалодаў пісьмом у царкоўнапрыходскай школе, дзе адзінай мовай навучання была расейская. Менавіта гэтым можна патлумачыць асаблівасці арфаграфіі замоў з нашага сшытку. І толькі ў адной з іх – *Ад увярэду* – "ў нескладовае" перадаецца на пісьме звыклым нам чынам. Выкажам здагадку, што запіс ажыццяўляўся ў міжваенны час:

Через поле стежачка
Через море кладачка тудою
Ишоў пеўник як этаму пеўнику

Яичак не несци и детак не водить
Так у Оли руцця увяреду не бываць
Белай кости не ломать красной
крови не сушить синих жил
Не марить боли аслабадить
Ды першым здаровьечкам
Олю наделить.

У нашай публікацыі дзеля лепшага ўспрымання першапачатковы правапіс замоў мадэрнізуецца, але з захаваннем усіх асаблівасцяў мясцовай гаворкі:

Круг-круг, лезь на сук, штоб ты косці не ламіў, сэрца не таміў, мозгі не круціў, мокры і сухі, штоб ты саскрабіўся – на суках астанавіўся.

Злучнік "штоб", пашыраны ў замовах сшытка замест агульнаўжывальнага "каб", сустракаецца, напрыклад, і ў творах Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які паходзіў з Бабруйскага павета:

У ўдавы жа Агрыпіны,
Апрыч дачкі Кацярыны,
Болей не было сваіх;
Яна з Усцінняй, кумою,
Жыла як рука з рукою,
Адна дума была ў іх:
Штоб сваіх дзетак сасватаць,
Штоб худобку ім прыпратаць,
Штоб, як сядуць на сваём,
Яны весела зажылі,
Без патрэбы не тужылі,
Не рупілі ні аб чом.
[Марцінкевіч 2001: 121–122]

Сярод замоў маецца *Pozdrowienie anielskie*. Малітва гэтая, відаць, часта пераказвалася, дык на момант запісу амаль страціла сваё польскамоўнае аблічча. Нават прызначэнне яе, зыходзячы з назвы, змянілася: ёю належала лячыць дзіця ад пераляку.

Замовы

1. Начнікі

Першым разам добрым часам. Госпаду Богу памалюся, святой прачыстай пакланюся, зоры-зарніцы, божыя памочніцы, прыступіце Людзе начнікоў, гаварыць памажыце начнікі-сошнікі, штоб у жару і попелі ногі папяклі, у дзёгці патапіліся. Дзе днявалі – там і начуйце, а Людзе сну

не псуйце, адны людзі, адна зямля, адна вада, месечка, сонейка і неба, а вы, людзі, жывіце як трэба.

2. Залатнік

Першым разам добрым часам. Папрашу святога дзянька ўторніка, папрашу я Госпада Бога і Мацеры святой, прачыстую божую Мацер, зоры-зарніцы, божыя памочніцы і святы дзянёк уторнік, прыступіце, памажыце С. залатнік гаварыць. Залатнік цару па жывату, не хадзі, бакоў не падпіраць, кос не распускаць, стаць на месцечку, у залатым крэслечку, гдзе бабка пупок вязала – там табе і месцечка, мацер божыя, спусціся з неба, ты ж нам трэба, з залатымі замочкамі, з шаўковымі шнурочкамі, будзеш ты ўсё ліха замыкаць, С. здароўечка на месца стаўляць, белай косці не ламіць, сіняй жылы не марыць, краснай крові не сушыць, першым здароўечкам Соню надзяліць.

3. Ад каўтуна

Першым разам добрым часам. Зоры-зарніцы, божыя памочніцы, прыступіце О. каўтун, гаварыць памажыце, Госпадзі Божа, прыступі, памажы мне, хрышчонай, малечанай, каўтун угаварыць. Угаварываю: каўтунічку божаю памочнічку, я цябе спрашываю, я цябе ўгажаю, штоб ты па касцях не хадзіў, касцей не ламіў і сэрца не нудзіў, крыві не замірaў і жыў – не спачываў, сядзь на месцечку, і дзе матка нарадзіла і бабка благаславіла, шаўковую нітачку прышчапіла.

4. Каўтун

Ля сіняга мора стаіць дванаццаць дубоў, дванаццаць дубоў, дванаццаць дубоў. Для тых дубоў дванаццаць канцоў, дванаццаць канцоў, дванаццаць канцоў. Канец у канец, канец у канец, канец у канец. Для тых канцоў дванаццаць камнёў, дванаццаць камнёў, дванаццаць камнёў. Камень у камень, камень у камень. Для тых камней дванаццаць маладцоў, дванаццаць маладцоў, дванаццаць маладцоў. Маладзец у маладзец, маладзец у маладзец. Волас у волас, голас у голас, глаз у глаз, з глазу ў глаз. У глаз прыдзіце, вазьміце ад Олі каўтун, з хаты дымам, з двара ветрам – унясіце ў сіне мора, у сінем моры дастаньце пяску, а Олю стану пастаўце.

(*здымаць каўтун*)

Із сіняга мора пташыкі выляталі, ад Олі каўтун адразалі, у сіне мора на дно кідалі. Ля сіняга мора стаіць дуб, а там вароны навілі гняздоў, і нанеслі яец і баўтуноў. Каб так у Олі не было каўтуноў, ні самак, ні самцоў.

5. Загаворваць двор

Прашу Бога, малю Бога, святое благавешчанне, святое Ягорыя. Святы Ягорыя, бяры сваё кап'ё, садзіся ў сваю залатую каляску. Святы Ягорыя, памагаеш двару, Чажае сваё кап'ё – забівае. Божая Матка ў варотах сядзіць, грабнічныя свечы дзержыць. Как эта кап'ё не ўзяці, і свечы не тушыце, так злому духу на дварэ не бываць, маіх варот не падкрываць, маю скацінку, чорную-белую, не нарушаць (раздзвенскі дзень).

6. Ад нуды

I

Ігрушка-пяскушка, не стой пад акном, зайдзі ка мне ў хату і пасватайся, і пабяромся, а ты, ігрушка-пасялушка, вазьмі ў маей Олі нуду за сваю нуду замуж, хай твая нуду, а мая Оля спаць і гуляе. Харошыя мыслі маю нуду забіваюць, і крыклівы, і нудлівы, і слухлівы, і сярлівы, як ты ўзнялася, каб так узнелася, а табе, Оля, спаць і гуляць, і харошыя мыслі імець. Я са словам, а Бог з помаччу.

II

Дарожка з дарожкай, бярозка з бярозкай, вада з бядой, а мая Оля са мной. Я не знаю, што ў гэтым сяле дзіцятка, хай не знае ніякае ліха. Свяці зорачка і месечка на ўсё неба, штоб майму дзіцятку не было ніколі ніякай балезні, так як і трэба. На небе відна і маёй Олі дабра. Я са словам, а Бог з помаччу.

III

Святы пераход, давай жывушчае слова ўпярод. Святая Панна, бяры яго слабасці да свае хворасці, а целу дай жывыя косці, штоб маё дзіцятка не хварэла і не балела, а ўсякіх дзяцей ад плахіх дзяцей і ад Госпада Бога. Гасподзь са словам, а я з помаччу.

VI

Папрашу Госпада Бога і цябе, Духа Святога, прыступіце, памажыце Олі станоце і ўрокі, прыгавор лячыць. Як ёй стала, так і перастала, ад Олі станоце і ўрачэнне стала, не ўрочнага, не малочныя, не ўсякіх вачэй і не паганых, і не блядскіх дзяцей, а чыі рэчы ім у плечы, іхныя падумкі ім у жалудкі, іхныя адвароты ім у жывоты. Штоб яны Олі пускай Гасподзь трымае з хаты дымам, а з двара ветрам, а з плавіка ногі пусць ім заверне, на патыліцу глаза, а душу ўрывай і нясі на камочую горушку, сарочку растрапайце раба божага, а ў маёй Олі спаць і гуляць, і станьце ўрокі не бываць. Я са словам, а Бог з помаччу.

7. Ад жыцця

Месяц мой прыўратнік, прысвіўся ты мне, ва сне паявіўся, у ночы кацісь, мой месечак, за завулкі, за перавулкі, за тынкі, за агароды, кацісь, мой месечак, рабу божаму Алегу ў жывот, у сэрца, вазьмі яе за валаса, за галаса, за буйную галаву, за рацівае сэрца, за белыя рукі, за скорыя ногі, штоб ён мяне, дзевіцу, рабу божую Олю ў ядзе не заеў, у хадзе не захадзіў, у мыслях не мысліў, крэпкім сном не засыпаў, как тошна, млосна рыбе без вады, мертвяцу без зямлі, а младзенку без грудзі, штоб было тошна рабу божаму А., памілей і ў нескалька раз мілосней, і красней краснага сонца, ясней яснага месяца, лучшэ паюшчага салаўя і мілей усяго света, і лучшэ раднога айца і роднай мацеры, добры моладзец станеш. Нікуды не ўвойдзеш і будзеш мой, как ключ на небе, замок у моры – станеш у памяць.

8. Грыжа

Госпадзі, дапамажы! Памалюся, святой прачыстай, пакланюся, не сама я з сабой – з прачыстай маткай святой. Прыступіце, памажыце мне, сіраце, залатнік угаварываць, залатнік-залатнічку ўпрамы чалавеку, чаго ты ўзыграўся, чаго ўсхадзіўся, ад яды ілі хады, ад вады, ад подыму ілі ад подзіўку, не шумець, не балець, ідзі на сваё мясцечка, на залатое крэслечка, там табе, залатніку, піць і гуляць, вялікай раскочы маць у М. не бываць.

9. Скула з ятрэсцю

Ты скула-скуліца, ты мая сястрыца, у касцях не сядзі і косці не ламі, і кроў не тамі, і сэрцу дасады не дзелай, і скулу з ятрэсцю ўгаварывай, штоб ты не балела і не калола, і не абветрывалась, ні маладзіком, ні поўнікам, ні сходнімі днямі. Я са словам, а Бог з помаччу.

10. Скула да века

Прашу Госпада Бога і цябе, прачыстая Мацер, прыступіце і памажыце маёй О. давека лячыць. Ішоў Ісус Хрыстос, устрэціў правасуда-правасуду: што ў вас чутно, што ў вас чутно? У вас чутно, у вас чутно людзі балеюць, чым яны балеюць? І вушы-вочы падпірае, і глотку затыкае, я стану, правасуду ячменю жменю дам і кругом яе абнясу, і пад нос паднясу, вочы атачыняю, а правасуду фігу пад нос паднясу. Свецяць зоркі і сонейка, і месяц на ўсё неба, штоб скула не балела, так как і трэба.

11. Загавор ад рожы

I

Рожа простая, рожа сіняя, жоўтая, вадзяная-ўрочная, патуль ты гуляла, пакуль ты іграла, пакуль я цябе, раба божая О., сваім лёгкім духам захваціла, мезяным пальцам не зачарпала, не пушчай ты, рожа, свой цвет і гарашчую кроў, пускай ты, рожа, сваю боль у белы камень, пускай ты, рожа, пускай ты, рожа, пускай ты, рожа, цвет у белы свет. Амін.

II

Мае словы – гасподскі дух, штоб Олі Бог памог, вадзічка-крынічка, я цябе ўмаўляю, я цябе ўпрашаю, прыступі і Олі здароўечка надзялі, ты і я, і мы з табою ўдваём эта ліха перамагаем, а Олю на ногі настаўляем, падмываеш ты, і варочаеш ты камні і паленне, змой ты ад Олі эту балезнь, штоб не гарэла, штоб не балела і не ацятрывалася.

12. Ад зубоў

I.

Маладзік малады на моры купаўся, на сонцы сушыўся, как тваім рагам не гарэць, так у О. зубам не балець.

II.

Над морам стаіць дуб, пад дубам стол, за сталом сядзяць тры дзявіцы, каторыя не могуць ні чытаць, ні пісаць, толькі ад яды ўгаварываць. Ляжыць гад на дарозе, каторы не прапускае ні людзей, ні звярэй. Прашу свайго рта не адкрываць, свайго яда не пускаць, плыві за вадой, там табе будзе піценне і ядзенне, харошае пасадзенне, зоры-зарніцы, божыя памочніцы, памагаеце людзям, памажыце і мне, штоб я ніякай хваробы не мела. Амін.

13. Нерв

Першым разам добрым часам. Прашу Госпада Бога і Духа Святога (*назваць гадавых празнікаў: святога дзянёчка*...), прысвятой божай Мацеры, у маём дзеле памажыце ўгаварыць нерв Олі. А вы, нервы, не зрывайцесь, жылачкі – не падымайцесь, я вас, нервы, прашу і малю, з белай косці і краснага мяса, з краснай крові зганяю. Госпадзі Божа, памажы, а вы, нервы, прымоўныя, прыгаворныя, ветраныя, насланыя, я ж вас, О. нервы, умаўляю, упрашаю, з белай косці, з краснага мяса зганяю: на цёплыя воды, на нікшыя лозы зганяю. Там вам мыцца, купацца і век векаваць, а О. у касці не стаяць, косці не ламаць, сэрца не валнаваць. Я вас, нервы, прашу, малю, О. нервы спаць пакладу. На цёплых водах, на нікшых лозах. На тых лозах ляжыць камень, на тым камне шла гасподня

божа Маці і гаварыла: как таго камня не падняць, так Олі нервы нікому не ўзарваць: ні прыяцелю, ні пастаяцелю, ні жаночаму, ні дзявочаму, ні мужчынскаму, ні хлапоцкаму, ні самой сабе, ні ад сябе. Я ж вас, О. нервы ўсе сабрала, О. нервы спаць паклала. Амінь, амінь, амінь. Госпадзі Божа, памажы, на крэпкім здароўі пастанаві.

14. Ад жыцця

Годзі гуляць, спаць нада, уставаць, мяне ўстрачаць, цалаваць, мілаваць, у пары са мной спаць, Госпада Бога прашу, на помач вызываю любячага Ігара, к сабе вызываю ранняю і вячэрняю зарою, штоб я, Люба, стала вернаю жаною. На небе тры звязды – усе родныя сёстры. Гаворыць, сядзела божая Маці на прыстоле, дзержыць кнігу ў прыполе. Яна кнігу чытае і яркія свечы разжыгае, усё падвей не дапускае. Ні ветраныя, ні прыстрэчныя. Вас, падвей, усякія твары, сабірайцеся, пажэхі акон адкрыйце, на ліхія воды, на жоўтыя пяскі, на зялёныя травы. Вы, арлы, сабірайцеся на сінем моры. Заграбіце, крыллямі замяціце.

15. Ад болю ў жываце

Першым разам добрым часам. Папрашу я святога дзянёчка і самога Госпада Бога. Госпадзі Божа, памажы Н. паясніцу пашаптаць. Саяшні́цы вы саяшні́цы, вы гуляеце па маіх ярах, па зялёных лугах, выйдзі, выступі із буйнога жывата. Тут вам не стаяць, зялёных жыл не сцягаць. Прасвятая Матушка Багародзіца, высылай саяшні́цы із буйнога жывата, з ясных вачэй, з жоўтых касцей, з белага цела – на чорта, на балота, на зялёныя луга, на красную княгіню, гдзе куды не ноюць, добры моладзец каня не сядлае, красная дзевіца касу не пляце.

16. Ад непрыяцеля

Еду я на гаду і паганяю харашэ, устрачаю я плахое і пазадзі астаўляю, і ворагаў сваіх перамагаю, рот ім замыкаю, вочы засланяю, штоб яны не відзелі нас і нашага нічога, ні днём, ні ноччу, штоб днём былі ініем, а ноччу кустом.

17. Ад воласа

Волас-волас, выйдзі на колас, штоб ты косці не ламіў, штоб ты вылiваўся із жыл, із касцей, на трох пучках коласа астанавіўся (*нагаворваць тры разы над цёплай вадой*).

18. Ад кругоў

Круг-круг, лезь на сук, штоб ты косці не ламіў, сэрца не таміў, мозгі не круціў, мокры і сухі, штоб ты саскрабіўся – на суках астанавіўся.

19. Загавор ад скулы

З-пад цёмнага лесу, з-пад цёмнай хмаркі, і вецер усё і вецер павявае, дожджык расу ўкрапляе, а ў М. скула і рожа прападае: і ветраная, і падумная. Як ты, скула, узялася – кожа ўзнялася. Я ж цябе, скула-рожа ўгаварываю: з касцей, із машчэй, із усялякіх жыл, із жоўтага мозгу. Тут табе, скула-рожа, не бываць, і М. спакой даваць. Я са словам, а Бог – з помаччу.

20. Сурокі

Прачыстая Матка з поля ішла, слала рослы лён з прыпола. Як таму льну росламу з горкай зямлі не ўстаць, так у М. ятрэсці не бываць: і не туключай, і не лізучай, і не ацятручай, не агнём і не мячом. Свецяць зорачнік і сонейка на ўсё неба, штоб у М. у панскі не было, як і трэба. Я са словам, а Бог з помаччу.

21. Ад галаўнога болю

Госпадзі Божа, памажы супраціўнік Олі пашаптаць: із глаз серых, із глаз белых, ветраных; ідзе Гасподзь Ісус Хрыстос устрачаць Маці божую:

– Куды ідзе Маці божая?

– Да Олі, народжанай, малітвеннай, хрышчонай, высылаць супраціўніка.

Налётны, паскутны, выдзі і выступі з буйной галавы і ясных вачэй, тут табе не стаяць, зялёных жыл не сцягаць, краснай крыві не піць з буйной галавы – салёных вачэй. Прасвятая Матушка Багародзіца, высылайце супраціўнік і пераполах на зялёныя лясы, на сінія моры, на красную княгіню. Дзе куды не ліюць вады, добры моладзец каня не сядлае, красна дзевіца русу косу не пляце.

22. Ад сэрца

Дзе сонейка ўсходзіць і там госпаду ходзіць, прачыстая божая Маці сваёй рукою незум адкрывала і сваім духам сэрца ўнімала. Як зорачка ўпала – так і сэрца балець і дрыжаць не стала. Свеціць зорачка, сонечка і месечка, на яе штоб у Олі сэрца не балела ніколі.

23. Павага ў клубе

Просім святога дзянька ўторніка і самога Госпада Бога. Дай мне, Госпадзі, добрую часінку, добрую гадзінку – загаварываць мне гэты загавор. Стану я ў хаце, Богу памалюся, выду на вуліцу, крастом абнясуся, выйду ў чыста поле, пасматру на ўсе чатыры стараны: на васточнай старане святая цэркаў: як на эту цэркаў людзі божыя зеркаюць, так на мяне, Веру, штоб людзі зеркалі: маладыя парні, красныя дзевіцы,

маладыя маладцы, старыя старыкі. Будзь маё слова крэпкае і ёмкае, як кругі падзямельныя.

24. Ад стоцця

Першым разам добрым часам, Госпаду Богу памалюся. Зоры-зарніцы, божыя памочніцы, прыступіце Любе стоцця і подумак, гаварыць памажыце. Белай косці не ламіце, краснай крові не сушыце, сіняй жылы не марыце, ад болі асвабадзіце, першым здароўем надзяліце. Яе говару Ганна гаворыць, – пакойніца з таго света, царства ёй нябеснае, подумкі і подзіўкі: жаноцкія, мужчынскія, дзявоцкія, хлапоцкія, дарожныя і падпарожныя, кладавыя і стаццявыя, смешныя і пасмешныя, падумныя і памышлёныя. Жаноцкія пад чапец, дзявоцкія пад вянец, хлапоцкія пад шапку, парабоцкія пад страхец. Тут вам не бываць, белай касці не ламаць, краснай крові не сушыць, жылы не марыць, ад болі асвабадзіць ды першага здароўя надзяліць.

25. Калючка (у сярэдзіне)

Скакаў пан і паня торнаю дарогаю, і везлі вады збан – набілася вада, разлілася, і ў Любы ўсярэдзіне і ў нутрах, і ў жываце калючка перастала. Каб ты не балела і не муліла, і бакоў не закладала, і на двор не ганяла, і сэрцу дасады не давала. На небе відна, а мне з Госпадам Богам і з прачыстаю Маткаю ад усякіх балезняў: і ад насланых, і ад пасланых, і ад прамаўляных – каб у Любы болі не было ніколі, так як і трэба. Я са словам, а Бог з помаччу.

26. Ад няпрыяцеля (адсушка без крыжа)

Вароты-суварот ляжыць камень-алтар, што на том камні-алтары сядзіць сатана і сатанёнак. Пайду я, пакланюся вам, сатане і сатанёнку. Ёсць у вас сто чарцей, бярыце вы па сто прутоў ды біце вы майго ўрага-злабіцеля і няпрыяцеля, біце вы яго прутамі, нажамі рэжце, жыгаламі каліце, штоб ён у ядзе не праядаў, у думах не прадумляў, у хадзе не прахадзіў, у вадзе не прапіў, і штоб ён на Любу забыў, штоб ён Л. не прырабляў ды на Любу забываў. Старшыя сядзіце, а младшыя ўкажыце, Л. урагоў-няпрыяцеляў і злабіцеляў ад яе адвярніце ды іх на сколькі палажыце. Як ішла бура, вярцела-круціла – вывернула хвойкі. Бярыце галінку дуба і клёна, калінку, рабінку, малінку і ёлку, штоб так урага-няпрыяцеля і злабіцеля скруціла і палажыла, як тое дзерава (*два разы*).

27. Пераход

Святы пераход, давай жывушчае слова ўпярод. А слабае не пускайце, і да Олі не пускайце. Святая Ганні і Пана, бяры яго слабасці ды свае хворасці, а Олі цела давай яго, яно на жывыя косці. А Олі спаць і гуляць, і ўсярэдзіне пераходу не маць. Прачыстая божая Мацер у цэркві стаяла, перад царскімі дзвярамі ангелы падымала, і Олі ўсярэдзіне, і ў нутрах, і ў печані пераходу не мала. Я з Госпадам Богам Ісусам Хрыстом і святым касункам – прыступіце, Олі ўсю балезню ўніміце. Я словамі, а прачыстая божая Мацер Ісусам Хрыстом і з святым касункам.

28. Ад жыцця

Ясная зорка, ясная зарніца, родная сястрыца, пасцель бела. Пайду я ў гроб, сарву я доску, накіну-наброшу на І. нуду і таску. Любіш ты маё цела, бела ліцо, чорныя вочы. Ты маё цела, бела ліцо, чорныя вочы і чорныя бровы да длінных валос, а за маё гэта дзела аддай ты мне сваю душу і цела.

29. Ад увярэду

Госпаду Богу памалюся, святой прачыстай пакланюся. Зоры-зарніцы, божыя памочніцы, прыступіце ад увярэду гаварыць, памажыце Олі. Белай косці не ламіце, краснай крові не сушыце, сіняй жылы не марыце, ад болі асвабадзіце – першым здароўем надзяліце. Цераз поле сцежачка, цераз мора кладачка, тудою ішоў пеўнік, як этаму пеўніку яечак не несці і дзетак не вадзіць, так у Олі руцця ўвярэду не бываць, белай касці не ламаць, краснай крові не сушыць, сіняй жылы не марыць, ад болі аслабадзіць ды першым здароўечкам Олю надзяліць.

30. Ад жыцця

